Бібліятэка
дзіцячай літаратуры
народаў СССР

ВЯСНЯНКА



ВЯСНЯНКА

Вам на памяць Серп і Молат
Даравала доля,
Каб з вас кожны быў, як волат,
Не гнуў плеч ніколі.

Вам у спадчыну ад роду
Засталіся песні,
Каб быць нашай асалодай
У жыцця прадвесні.

Каб вы пелі, не сціхалі
Ў радасці і ў горы,
Гаманілі, нібы хвалі
У бурлівым моры.

ЯНКА КУПАЛА

(з верша «Арлянятам», 1923)

Бібліятэка
дзіцячай літаратуры
народаў СССР

ВЯСНЯНКА

Вершы, апавяданні, казкі
беларускіх пісьменнікаў

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1983

Бел 2
В 99

РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:

Эдзі Агняцвет, Рыгор Барадулін,
Янка Брыль, Васіль Вітка,
Артур Вольскі, Уладзімір Гніламёдаў,
Анатоль Грачанікаў, Васіль Зуёнак,
Павел Кавалёў, Яўген Каршукоў,
Анатоль Клышка, Уладзімір Ліпскі (укладальнік),
Міхась Лазарук, Валянцін Лукша,
Уладзімір Машкоў, Барыс Сачанка,
Аляксандр Шэвераў.

4803010200-021
В———————— 47-82
М 307(05)—83

© Выдавецтва «Юнацтва», 1983.

АД САМАЙ КАЛЫСКІ...



Беларуская дзіцячая літаратура... Вялікі і багаты на здабыткі шлях прайшла яна ад кніжкі «Першае чытанне для дзетак беларусаў», выдадзенай Цёткай у 1906 годзе, па сённяшні дзень. Але вытокі нашай дзіцячай літаратуры, як і літаратуры наогул, трэба шукаць значна раней, у тых незапомных часах, калі людзям не было яшчэ знаёма ніякае пісьменства. Закалыхвала маці малое і напявала калыханку. А мелодыя і словы нараджаліся тут жа, нібы самі па сабе. Пра што? Вядома пра што. Пра цяжкую долю, пра тое, што чакае дачушку ці сыночка наперадзе.

Люлі-люлі-люлі,
Усе дзеткі паснулі,
А ты, мой сыночак,
Не спіш, не гуляеш,
З катком размаўляеш
Аб мужыцкай долі
У панскай няволі
Без хлеба, без солі...

Гэта толькі адзін з выдатных узораў народнай творчасці, якія дайшлі да нас. А колькі іх згубілася ў цемрадзі даўно адышоўшых часоў!

Мы па праву ганарымся тым, што першадрукаром у землях усходніх славян быў наш зямляк Францыск Скарына. Менавіта ён з'явіўся і пачынальнікам пісьмовай беларускай літаратуры для дзяцей. Гаворачы пра першую сваю кнігу, выдадзеную роўна 465 гадоў таму назад, сам выдатны асветнік адзначаў, што яна — «детем малым початок всякое доброе наукы, дорослым помножение в науце».

Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю беларускай мовы і літаратуры ў мінулым. На працягу некалькіх стагоддзяў нацыянальная культура беларусаў знаходзілася пад забаронай.

Толькі Вялікі Кастрычнік, сарваўшы ланцугі прыгнёту з працоўных усяе Расіі, адкрыў велізарныя магчымасці для развіцця культуры і літаратуры беларускага народа. Працоўныя Савецкай Беларусі ў дружнай сям'і братніх народаў рашуча пакрочылі ленінскім шляхам у светлае будучае. Вось як натхнёна пісаў пра гэта народны паэт Беларусі Якуб Колас:

Празорлівым зрокам
Трыбуна-прарока
Асветлены Леніным шлях.
Ён скованай сіле
Даў волю і крылле —
Шырокі, магутны размах.

Новы час, новы лёс, новае жыццё нараджаюць і новыя песні. Таму зусім натуральна, што сапраўднага росквіту наша дзіцячая літаратура дасягае разам з усёй літаратурай у паслякастрычніцкую эпоху.

У краіне развітога сацыялізма, дзе вышэйшай мэтай з'яўляецца няўхільнае павышэнне дабрабыту і культурнага ўзроўню жыцця працоўных, дзе ў Вялікай Хартыі правоў — Канстытуцыі СССР — значнае месца адводзіцца развіццю духоўнай культуры, усё больш узрастае роля літаратуры і мастацтва, якія закліканы сцвярджаць высокія камуністычныя ідэалы, спрыяць фарміраванню асобы чалавека з такімі якасцямі, як ідэйная перакананасць, партыйная мэтаімкнёнасць, інтэрнацыянальнае пачуццё дружбы і адказнасці не толькі за свае справы, але і за лёс краіны і ўсяго чалавецтва. Гэтую выхаваўчую місію выконвае ўся наша літаратура, усе яе роды і жанры. Аднак асаблівае месца тут займаюць творы, адрасаваныя юнаму чытачу. Літаратура для дзяцей і юнацтва валодае сілай выключнага эмацыянальнага ўздзеяння, бо яна імкнецца адкрыць і ўвасобіць свет тых, хто ўступае ў жыццё, хто фармуе

свой светапогляд і характар, хто ў пошуках свайго месца ў жыцці і ў грамадстве абапіраецца на тыя духоўныя і маральныя каштоўнасці, якія выпрацаваны папярэднімі пакаленнямі.

Гэта літаратура прывівае любоў да сваёй культуры, мовы, да гісторыі нашай краіны, да прагрэсіўных традыцый мінулага і да таго, што народжана новым сацыялістычным ладам у атмасферы ленінскай дружбы народаў. Таму гэта літаратура павінна быць сапраўды, без ніякіх скідак, высокаідэйнай і высокамастацкай. Бо калі недапушчальна абыякім зернем засяваць поле, дык яшчэ больш клапатліва мы павінны падыходзіць да таго, якія зерні кідаем у чулыя сэрцы дзяцей, моладзі, як загартоўваем сілы новага пакалення, яго волю, гатоўнасць да барацьбы супраць розных жыццёвых нягод і выпрабаванняў. Мы павінны помніць, што гэта літаратура ў пару найбольшага ўспрымання акаляючага свету на ўсё жыццё пакідае свой след у душах і розуме маладой змены, памагае фарміраванню, станаўленню характару моладзі, выяўленню і развіццю яе прыроджаных здольнасцей.

У сваім выступленні на XVIII з'ездзе ВЛКСМ, гаворачы аб праблемах выхавання падрастаючага пакалення, Леанід Ільіч Брэжнеў зазначаў: «Тут асабліва нецярпімы праяўленні бяздушнасці і фармалізму. Пара ўсім работнікам ідэалагічнага фронту пакончыць з нязжытай яшчэ там-сям практыкай механічнага, бяздумнага паўтарэння прапісных ісцін, са слоўнай траскатнёй. Пара зрабіць правілам — гаварыць з людзьмі простай і даходлівай мовай, пісаць, укладваючы ў кожную фразу жывую думку і пачуцці. Гэта таксама пытанне якасці і эфектыўнасці, прычым на такім важным участку будаўніцтва камунізма, як выхаванне новага чалавека».

Гэтыя словы сталі праграмай для тых пісьменнікаў, хто прысвяціў свой талент стварэнню кніг для дзяцей і юнацтва. Наша літаратура за апошнія гады дасягнула прыкметнага плёну ва ўсіх жанрах — у прозе, паэзіі, драматургіі. Многія творы беларускіх аўтараў упрыгожваюць паліцы дзіцячых

бібліятэк не толькі рэспублікі, але і ўсёй нашай краіны і нашых шматлікіх замежных сяброў. Працягваючы слаўныя традыцыі нашай шматнацыянальнай савецкай літаратуры, традыцыі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі, Янкі Маўра, Міхася Лынькова, Алеся Якімовіча, сучасныя беларускія пісьменнікі ў сваіх творах для юнага чытача адкрываюць складаны і багаты свет краіны маленства, паказваюць непаўторнасць аблічча тых, хто выходзіць з яе, каб заняць сваё дастойнае месца ў шэрагах будаўнікоў камунізма.

Пра гэта сведчыць і першая ў «Бібліятэцы дзіцячай літаратуры народаў СССР» кніга «Вяснянка», якая знаёміць чытача з творамі беларускіх пісьменнікаў для дзяцей.

МАКСІМ ТАНК,
народны паэт Беларусі

ЯНКА КУПАЛА

Народны паэт Беларусі
(1882—1942)

ДЗЕНЬ ДОБРЫ, МАСКВА!..

Дзень добры, Масква, як вясна, маладая!
Дзень добры, крамлёўскія зоры!
Мы песню табе, Масква наша, складаем,
А песня аб шчасці гавора.

І песня гавора, як цяжка жылі мы,
Як чахлі ў прыгонныя ночы,
Як нас гадавалі галодныя зімы,
Як цемра сляпіла нам вочы.

*

Дзень добры, Масква, наша доля і воля!
З табою жыць радасна людзям.
Цябе не забудуць народы ніколі,
Як песні ніхто не забудзе.

Табе шлюць прывет нашы пушчы, крыніцы,
Калгасныя нівы і хаты,
Бо, дзякуй табе, маладая сталіца,
Мы хлебам і шчасцем багаты.

*

Дзень добры, Масква! Як жа ясна ты свеціш
На ўсе чыста свету староны.

Шляхі да шчаслівасці казачнай меціш
І пішаш, як сонца, законы.

Сама ў сонцы сонцам навек валадаеш,
Зганяеш туманы з прагалін.
Дзень добры, Масква, як вясна, маладая!
Дзень добры, крамлёўскія зоры...

1939

ХЛОПЧЫК І ЛЁТЧЫК

— Мой мілы таварыш, мой лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне!
Я — ведай — вялікі ўжо хлопчык
І ўмею ўжо лётаць у сне.

Мне мама сягоння казала,
Што стукнула мне ўжо сем год.
Табе гэта, можа, і мала,
А мне ляцець толькі ў палёт.

Мне ўжо надакучыла дома —
Ў дзіцячы хадзі адно сад,
А так паглядзеў бы, вядома,
На іншы парадак і лад.

Вазьмі ж мяне, лётчык, хачу я
Пабыць у людзях, паглядзець,
Як месяц на небе начуе,
Як блукае ў лесе мядзведзь.

Як свецяцца ночкаю зоры,
А днём не відаць іх чаму,
Як рэчкі ў далёкія моры
Улетку плывуць і ўзіму.

На моры зірнуць хоць раз вокам,
Як ходзяць па іх караблі,
Ляцеці далёка, высока
Ды так пабываць і ў Крамлі...

Вось гэтак у добрым здароўі
Мы будзем ляцець і ляцець.
Вазьмі ж мяне, лётчык, з сабою,
Не будзеш ты клопату мець!

1935

АЛЕСЯ

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Гадавала матуля
Дачушку Алесю.

Гаманіў бор сасновы
У вечары і ранкі,
Над калыскай ліповай
Пела калыханкі.

— Спі, засні, мая дзетка,
Птушкі ўжо заснулі,
Спі, засні, мая кветка,
Люлі, люлі, люлі.

Спі, не ведай трывогі,
Надыдзе часінка,—
На свае ўстанеш ногі,
Мая ты дзяўчынка.

Будзеш кужаль ты прасці,
Будзеш ткаці кросны,

Выглядаць долі, шчасця
Ў маладыя вёсны.

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

Як набралася моцы
Матчына дачушка,
Паляцела да сонца
Пералётнай птушкай.

Паляцела дзяўчына
Самалётам гонкім
Над шчаслівай краінай,
Над роднай старонкай.

Адчыняе вароты
Нябесным маршрутам
Ці, як ястраб, з высотаў
Скача з парашутам.

І да сонца праз хвілю,
А ўсё вышай, вышай!
Самалётавым крыллем
Воблакі калыша.

Стара маці днём, ночкай
Марыць ля аконца:
Ужо к прасніцы дочка
Не зляціць з-пад сонца.

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

1935

ЮРАЧКА

1

Ой ты, Юрачка,
Што не вучышся?
Так да невукаў
Ты далучышся.

А як вырасцеш
Ты няўмекаю,
Усе высмеюць
Недарэкаю.

А ў нашага Юрачкі
З'елі сала шчурачкі,
Як пабег ён у лясок,
Каб схавацца ад кніжок.

А ў нашага Юрачкі
У капоце дзюрачкі,
Нарабіў ён іх сабе,
Як стаў лазіць па вярбе.

2

Ой ты, Юрачка,
Што лянуешся,
Хаткі нашае
Не пільнуешся?

Толькі бегаеш,
Забаўляешся,
Гэтак з кпінамі
Напаткаешся.

*

А ў нашага Юрачкі
Пагублены гузічкі,—
Ён тады іх пагубляў,
Як з садочка уцякаў.
А з нашага Юрачкі
Сталі кпіць і курачкі,
Што не мыўся цэлы дзень
І бубніць, як авадзень.

3

Ой ты, Юрачка,
Кінь ляніціся
Ды надумайся
Ты вучыціся.
Будзем цешыцца,
Што ты вучышся
І да невукаў
Не далучышся.

1932

БАЙ

Бегаў бай па сцяне
У чырвоным кафтане,
Байку баіў: Ай, лю-лі!
Жылі пчолкі у вуллі...
Баіць ці не?
— Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Шла вясна па вясне,
Жылі пчолкі з году ў год,
Бралі ў соты з кветак мёд...
Баіць ці не?
— Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Ніхто пчолак не кране;
Самі мёд збіраюць той,
Самі ласваюць зімой...
Баіць ці не?
— Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
У той самай старане
Пустапасам трупень жыў,
Неяк з пчолкамі здружыў...
Баіць ці не?
— Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Трупень кажа: «Дайце мне
Глянуць, пчолкі, у вуллёк,
Паспытаці ваш мядок!..»
Баіць ці не?
— Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Ці так добра, ці так не,—
Пчолкі добрымі былі,
Трутня ў госці прынялі...
Баіць ці не?
— Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Трупень пальцам не кіўне;
Пчолкі мёд нясуць да сот,
Трупень есць ды есць той мёд...
Баіць ці не?
— Не!

1921

ЯКУБ КОЛАС

Народны паэт Беларусі
(1882—1956)

ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХАМ

Празорлівым зрокам
Трыбуна-прарока
Асветлены Леніным шлях.

Ён скованай сіле
Даў волю і крылле —
Шырокі, магутны размах.

Краіна Саветаў
Паўстала над светам,
Як новае сонца зямлі.

Ні громы, ні буры,
Ні грозы-віхуры
Адолець яе не змаглі.

У постаці гордай
Стаіць яна цвёрда,
Як волат, як міру скала.

Ці ж зверне з дарогі
Яе свет убогі,
Дзе густа навісла імгла.

Над нашай Радзімай
Агнём незгасімым
Нам ленінскі свеціць прамень.

Вядзе ж яе партыя
Ў светлыя далі,
У новы, у радасны дзень.

Ляжыць перад намі
Умыты агнямі
Чароўны, бяскрайні разлог...

Між нас жыве Ленін,
Як з геніяў геній,—
Да новых заве перамог.

1952

ДВА МАРАЗЫ

Гулялі па полі два маразы, два родныя браты: мароз Сіні-нос і мароз Чырвоны-нос.

Гуляюць-пагульваюць маразы, адзін аднаго пахвальваючы. А ноч ясная-ясная. Прасторна маразам на волі. А ціха, так ціха, нібы жывой душы не засталося на свеце. Перабеглі маразы з поля на лес. Бегаюць, палускваюць, з дрэва на дрэва пераскокваюць, зайчыкаў палохаюць. З лесу ў вёску заскочылі і давай па даху страляць.

— Эге,— кажа мароз Сіні-нос,— усе пахавалі-ся, баяцца на двор вылезці.

— Няхай толькі вылезе хто: задамо яму страху,— адказвае мароз Чырвоны-нос.

Пачало развідняцца. Паваліў з комінаў дым густы. Заскрыпелі калодзежы. Павыходзілі мужчыны з хат. Хто малаціць пайшоў, хто ў лес па дровы збіраецца.

— Стой жа, брат,— сказаў мароз Чырвоны-нос.— Пабяжым жа мы на дарогу ў поле.

І пабеглі яны зноў у поле, стаяць, прытуліўшыся, падарожных чакаюць.

Заскрыпелі сані на дарозе. Зазваніў дзесь званочак пад дугою. У санях селянін сядзіць, коніка паганяе. А ззаду за ім зухаўскі вазок плыве. Званочак пазвоньвае.

— Ну чакайце ж вы,— кажа мароз Сіні-нос.— Ты бяжы за мужыком, а я за панам паганюся.

І пабеглі яны падарожных марозіць. Доўга бег мароз Сіні-нос, пакуль пана дагнаў. Нарэшце дагнаў, пад футра залез, цяпло выганяе адтуль. Паціскаецца пан, ногі зябнуць, холад па целе пайшоў, панскі нос пасінеў. А мароз Сіні-нос толькі пасмейваецца. Ледзь да смерці пана не замарозіў. А мароз Чырвоны-нос дагнаў селяніна і давай яго марозіць.

— Эге, мароз не жартуе,— кажа селянін. Злез ён з саней, бяжыць, нагамі тупае, рукамі аб плечы б'е. Прабег так з паўвярсты, аж горача стала яму. Сеў сабе на сані, едзе — і гора мала.

— Ну пачакай ты, брат: прайму я цябе, як ты дровы сячы будзеш.

Заехаў чалавек у лес. А мароз Чырвоны-нос выперадзіў яго, у лесе чакае. Выпраг коніка селянін, сякеру ўзяў ды як пачаў секчы — горача стала яму. Скінуў кажух. А мароз і ўзрадаваўся: залез у кажух і давай там белыя кросны ткаць.

Зрабіўся кажух белы як снег. Насек дроў чалавек, да кажуха ідзе, а ён увесь абмёрз.

— Эге, браток, дык ты тут!

Узяў пугаўё ды як стаў малаціць — ледзь жывы выскачыў мароз Чырвоны-нос ды драла ў лес.

Узлаваўся мароз Чырвоны-нос на селяніна, але ніякай рады даць яму не можа.

1928

ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

(1840—1900)



КАЛЫХАНКА

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі;
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваёй маткі;
А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госці,
Ой, то будзе ёй радосці!..
Сядзе матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ёй паставе,
Ручкі, ножкі пацалуе,
Памілуе, пажалуе;
Пачастуе мядком сытным,
Блінком мякенькім падсітным,
Піражочкам і з начынкай,
Верашчачкай, гарачынкай...
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Бо ўжо курачкі паснулі!..
Ой, то будзе рада матка,
Хоць і простая салдатка,
А усякі шапку здыме,
Як дазнаецца аб сыне.
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Бо ўжо курачкі паснулі!..
Можа, будзеш калі панам

Ці вялікім капітанам,
Людцаў, можа, будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці;
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад бога.
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Бо ўжо курачкі паснулі!
Тагды матка прыйдзе ў госці,
Сын выкіне стары косці;
Жабруючы, пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць матку боску,
Каб забыцца ёй аб сыне,
Каб не ведаць, дзе ён згіне.
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Бо ўжо курачкі паснулі!
Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваёй маткі!..

1894

ЦЁТКА

(1876—1916)

СІРАЦІНКА

У кашульцы чорнай, зрэбнай.
Тварык сплаканы, мурзаты;
Ані бацькі, ані маткі;
Дзядзька выгнаў з роднай хаты.

На узмежку сядзіць, плача,—
Куды дзецца — знаць не знае;
Гадок шосты пайшоў толькі...
А тут ночка... страх... змяркае...

Не плач, сірацінка,
Беларуская дзяўчынка!
Спяць сном вечным бацька, матка,—
Не пачуюць ця, дзіцятка.

Не памогуць твайму плачу,
Не траць сілы дарагія:
Жыта сіва спаць ця прыме,
Дожджык цёплы шчочкі змые,

Пасцель мякку трава ўсцеле,
Пырнік ножкі ўкрые босы;
Сном забудзешся спакойным,
Вецер вольны спляце косы.

Каласочак ця накорміць,
Сонка яснае прыгорніць,

Крыж расстайны будзе таткай,
Ралля чорна — роднай маткай.

Ўстань з узмежка, не плач горка,
Глянь у неба: зорка ясна,
Што найдалей свеціць міла,—
Твая гэта, твая ўласна.

Вер: не згінеш, сірацінка,
Беларуская дзяўчынка!
Ў нашым краі многа гэтак
Ў людзі выйшла сірат — дзетак...

Мы належым да народу,
Што ад свету да заходу
Кожны з гора ўтрое гнецца,
Аднак гору не даецца.

Крыжам ляжа ў крыві ўласнай,
А ўсё ж верыць зорцы яснай.
Наш народ наўздзіў трывалы!
Шмат прыдбаў чужынцам славы...

Аб сабе адно забыўся,
Толькі вось цяпер збудзіўся.
Хоць шмат латак, хоць без хлеба —
Жыць і крэпнуць і нам трэба.

Беларусы! Больш нікому
Не ўступайце вы загону
Свайго жніва, сваёй працы.

Сіраціна! Страх дзіцячы
Зглушы ў сэрцы, расці жвава —
Цябе жджэ народна справа!

1914

ЖУРАВЕЛЬ І ЧАПЛЯ

Жылі сабе па абодвух канцах балота Журавель і Чапля.

После стала ім надта маркотна жыць, і вось уздумаў Журавель да Чаплі ў сваты ісці. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Чапляў двор.

— Як маешся, Чапля?

— Здароў, Журавель.

— Ці не пойдзеш, Чапля, за мяне замуж?

— А твае ногі доўгі, пер'е каротка; дужа ты брыдкі... Ідзі сабе, дзе быў!

Журавель перабраўся ізноў цераз балота дый прыйшоў у свой двор.

Раздумалася Чапля, што за Жураўля замуж не пайшла. «Дай,— кажа,— пайду да яго і перапрашу».

Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Жураўлёў двор.

— Здароў, Журавель!

— Як маешся, Чапля?

— Вазьмі мяне замуж за сябе.

— Твая шыя доўга, і сіня, і крывая, і сама ты гарбатая; такой мне не патрэбна.

Хаця было і стыдна, аднак Чапля паплялася цераз бор назад у свой двор.

Шкада стала Жураўлю, што не ўзяў Чаплю бедную, ізноў пайшоў ён тою самаю дорогаю. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху...

Так цэлы век хадзілі яны адзін да аднаго ў сваты, і так на абодвух канцах балота асталіся іх хаты.

1906

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

(1891—1917)

МУШКА-ЗЕЛЯНУШКА І КАМАРЫК НАСАТЫ ТВАРЫК

Вельмі жаласная гісторыя,
выкладзеная згодна з праўдай
беларускім вершам

Блізка рэчкі Самацечкі камары таўкуцца,
І «таўкачыкі» спяваюць і у скокі тнуцца:
«Гэй, гоп, таўкачыкі,
Гэй, гоп, асінавы,
Ды работы Максімавы...»
А Максім ляжыць на траўцы, сонна пазірае,
Камарок за камарочкам да яго шыбае,
І пясняр з усіх найлепшы ўжо звініць ля вуха,
Як камарыка няўмысне загубіла муха.

I

Захісталася сасонка баравая,
Затужыла дзяўчынанька маладая,
Жартаўлівая пяюшка-сакатушка,
А па імені — мушка-зелянушка:
«Ой, чаму ж ды не судзілася мне долі,
Што мяне і не сваталі ніколі?
А пасагу прыбагатага я маю:
Куст шыпшыны ад краю і да краю,
Шчэлка ў яблыні — пры ветры каб хаваццa,
Лісць альховы — на ночку накрывацца,
Ды да краю поўны мёдам кацялішча
З жалудзёвай вялізнай скарлупішчы.
Калі гэты мёд у місачку кладзецца,
Ажно сліна ў роце набярэцца».

Як пачуў тыя жаласці камарык —
Паскрабаў і насочак ён і тварык:
«А чаму бы мне ды з ёй
не пажаніцца?
Пэўна, пойдзе, каб болей не журыцца.
Хоць насаценькі я, шэры, хударлявы,
Дык у скоках затое жа рухавы...»
І схапіўся камарочак прыбірацца,
Каб ля мушкі-пяюшкі увіхацца.

II

Прыляцела мушка дахаты,—
Аж у яе камарык насаты.
Сватоўя-хрушчы уссядаюць,
З бацькам-маткай штось размаўляюць:
«Мы — стральцы, шукаем куніцу,
Не куніцу, але дзявіцу».
Гаманілі болей гадзіны
Ды гавораць так да дзяўчыны:
«Ці да смаку наш госць багаты?»
«Запытайце ў мамы і таты».
Тут гарэлкай усё змацавалі,
А пасля і заручын даждалі.
Браў жаніх ад мушкі-дзяўчыны
Дарагі ручнік з павучыны,
Што яна на траўцы сцяліла
І на ясным сонцы бяліла.
У нядзелю будзе вяселле,
Захадзіў камар, як з пахмелля,—
І пяе, і скача паціху,
Ды як сыпне ураз «шырсцяніху»:
«Шырсцяніха, шырсцяніха мая.
Пакахала камара-гультая.
А камар не зважае на яе,
Толькі лётае ды песні пяе».

III

Загудзела, расшумелася дубрава:
Аб вяселлі у дубраве стала слава.
Як вянок на муху свацейкі надзелі,
Ўсе навокала аж вочы праглядзелі.
А калі бацькам журылася дзяўчына,
Аж заплакала жаноцкая радзіна:
«Ускланяюся татачцы і матачцы,
Калі ўжо апрыкрала ім у хатачцы.
І чаму ж вы мяне гадавалі
Ды ў чужую сямейку аддалі?»
Ў каравайніцы вулітак запрасілі,
І яны дзяжу на продзіў замясілі
Авадзень быў камаровым старшым дружкай
Й рассыпаўся дробным макам перад мушкай.
Матылькі — баяры, пчолачкі — баяркі —
Спрытны, шпаркі, асабліва як да чаркі.
А найстаршая баярачка-чмяліха
Так спявала, аж баяр пабрала ліха:

«Ой, багаты баяры, багаты,
Ды забыліся ўзяць грашаняты.
Хоць не шмат грашанят яны маюць,
Дык затое свой гонар трымаюць:
Хто капейку дае — грыўняй ліча яе,
А хто грыўню паклаў — што рубля дараваў».
А як сыпнулі-урэзалі музыкі,
Дык узняўся разам гоман там вялікі.
Чмель пузаты на басолі гучна грае,
А на йскрыпцы ёмка пчолка падсякае.
І знайшоўся мушанёнак нейкі малы,
Што званіў-такі не кепска у цымбалы.
Лоўка конікі у скоках выціналі,
У гару стрыбалі, звонка падпявалі:
«Камары скакаць
Выракаюцца:

Ногі доўгія —
Паламаюцца».
Гэтак скачуць — хто патроху, хто памногу.
Нейкі конік адтаптаў чмяліне ногу.
Госці спорна п' юць-ядуць ды размаўляюць.
А музыкі граюць, дыхту заўдаваюць.
Ўмела муха на вяселлі запрашаці,
Ды над тое лепей ўмела частаваці.
Усяго стаяла досыць для гасціны:
Нават мёд быў і чмяліны і пчаліны.
Хрушч вялізны так гарэлкі насмактаўся,
Што звaліўся ды ў куточку высыпаўся.
Восы ў шатах чорных з жоўтымі стракамі
Проста елі мушку злоснымі вачамі.
А яна ля мужа скромненька сядзела
І зялёненькай спаднічкай зіхацела.
Мураўёўна нізка звесіла галоўку,
Бо занадта зацягнулася ў шнуроўку.
Ды як скрыкнула, як ахнула раптоўна:
Ў кроплі дожджыка танула мураўёўна.
Ўсё сцямнела, кроплі шпарка застукалі,
У дупло, дзе мушка жыла, пападалі.
Пахаваліся ўсе госці у куточкі:
Так спынілася вяселле сярод ночкі.
А назаўтра ўсе як толькі ўсталі, зрання,
Дык пайшлі да камара на баляванне.
І былі яшчэ нарэшце перазовы,
Каб не стала аб радзіне кепскай мовы.

IV

Абляцелі кветачкі
Не ў пару.
Невясёла шэраму
Камару.
Як пачаў ён параю
З мушкай жыць —

Давялося, беднаму,
Патужыць.
Не умее мушачка
Працаваць.
Толькі ўмее з хлопцамі
Жартаваць;
Ані выткаць кросенкі,
Ані шыць,
Ані стравы хораша
Наварыць.
Паштурхаў камарычак
Галаву:
«Як я з гэтай жонкаю
Пражыву?
Дзе я вочы, брацікі,
Меў свае,
Як сабе за жоначку
Браў яе?»
Паляцеў ён плакацца
У лясок,
Сеў на дуб зялёненькі
Пад лісток.
Пахіліў галовачку,
Уздыхнуў,
Песню сумна, жудасна
Зацягнуў:
«Выйду ў поле ды разважу тое гора,
Гэй, гаротнае, маркотнае!
Ты шырока, маё полейка.
Ад кусточка да кусточка разлягаешся,
Ты глыбока, сэрца, краешся.
Дзе цяпер я смерць сваю спаткаю:
Ці у моры, ці у рэчцы, ці ў ставочку,
Што капытам пры дарозе быў прабіты
І да краю буйным дожджыкам наліты?»

V

«Што за шум у бары учыніўся?»
«А камарык там з дуба зваліўся».
Грымнуў ён на зямлю з высакосці
І пабіў-паламаў сабе косці.
Цеслі дошкі з дубоў пілавалі,
Габлявалі, труну змайстравалі,
Ўсю чырвонай кітайкай аббілі,
Йстужкай чорнай з краёў адтачылі.
Гэй, кладуць камара ў дамавіну,
Сазываюць сяброў і радзіну.
Камары над труной затрубілі,
Светлячкі лепей зорак свяцілі.
«Вы паціху, музыкі, зайграйце,
Маё сэрца украй не ўражайце!»
Горка мушка-удава галасіла,
Скорай смерці ў бога прасіла:
«Мой мужочак, а мой камарочак,
Ты падай мне з труны галасочак.
Ах, ніхто над табой не заплача,
Толькі хмарачка дробнымі дажджамі,
Толькі мушачка горкімі слязамі».
Палажылі дамоўку на мары,
Паняслі праз лугі ды папары.
Ля дарогі магілу капалі
І ў ёй камара пахавалі,
У сырую зямельку зарылі,
Зверху насып вялікі зрабілі.
Людзі добрыя шляхам мінаюць,
Шапкі нізка здымаюць, пытаюць:
«Не іначай вяльможны вандроўнік —
Генерал, ці маёр, ці палкоўнік?»
«Не, ляжыць тут камар-камарочак,
У каторага з локаць насочак».

1915

ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Народны паэт Беларусі
(1905—1980)



МАЯ АЙЧЫНА

Мая Айчына —
Поле, нівы,
Над Нёманам зялёны гай,
Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы —
Ўся Беларусь ад краю ў край.

Люблю яе бары, азёры...
Ды, як бы іх ні шанаваў,
Калі б не знаў другіх прастораў,—
Напэўна б, я засумаваў.

Я палюбіў навечна
Шчыра
Алтай, Палтаўшчыну і Крым...
Ад Ленінграда да Паміра,
Радзіма, ў сэрцы ты маім!

1948

РОДНЫЯ СЛОВЫ

Яны даспадобы мне, хай і старыя,
Не толькі ў гучанні хвалюючы змест,
Як многа гавораць мне назвы такія —

Мінск,
Пінск,
Брэст.
Калі паразважыш, няцяжка дазнацца,
Бо сведчаць на ўсю неабсяжную шыр,
Што продкі любілі спакойную працу,—
Шклоў,
Клецк,
Мір.
А вораг находзіў,— бязлітасна білі,
Трываць не хацелі абразы і слёз,
І разам з Бярозаю катаў тапілі —
Пціч,
Друць,
Сож.
Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была, як агонь.
У сёлаў імёны, як гукі цымбалаў,—
Блонь,
Струнь,
Звонь!

1959

ГАРНІСТ

Гарніст у гальштуку чырвоным,
Сяброў склікаеш на касцёр —
Твой горн калыша бор зялёны,
Твой кліч узносіцца да зор.
Накіраваны да планетаў
Твой горн у наш касмічны час,
Як быццам кажа зорам свету:
«Чакайце! Узляцім да вас!»

1969

А ТЫ ХОЦЬ ДРЭВА ПАСАДЗІЎ?..

Дзе дваццаць год таму назад
Ляжаў дзірван акамянелы,—
Расцвіў прыгожы, буйны сад,
Паплыў удаль, як ветразь белы...

Нямала тут вясновых дзён
Папрацавалі слаўна людзі,
Каб кожнай яблыняю ён
Усхваляваў нам сёння грудзі.

Ён так святло сваё разліў,
Глядзіш, нацешыцца няможна...
— А ты хоць дрэва пасадзіў? —
Няхай сябе спытае кожны.

1953

ЯНКА БРЫЛЬ

Народны пісьменнік Беларусі
(нарадзіўся ў 1917 г.)

СНЯЖОК І ВОЛЕЧКА

Вельмі выразна і прагна, як той, хто стаміўся ад смагі, успамінаю драўлянае вядро, даверху поўнае празрыстай, халоднай вады. Мама нясе яго па двары, а са страхі злятае мой голуб Снежок і садзіцца на край вядра. Вада ў вядры калыхаецца, і піць яе нязручна. Ды голуб п'е, а мама смяецца і ставіць вядро на зямлю.

Мама змарылася, жнучы ад рання, спяшалася дахаты падаіць Падласку, пакарміць мяне, і зноў спяшаецца ў поле. Мы жывём першае лета без таты, і маме цяжка, а я — сірата. Ды я — мужчына і хачу быць яшчэ большы і ўсё рабіць, каб маме было лягчэй. Я добра пасу, скрабу ўвечары бульбу, хаджу па дровы...

Бывае, праўда, і так, што я трошкі нашкоджу і мама злуецца. Аднойчы так засядзеўся над рэчкаю з вудай, што мама поцемку сустрэла мяне на лузе. Падласка сама прыйшла дахаты, і мама вельмі спалохалася, куды я падзеўся. А то мы раз з Міхасём, маім сябрам, пачалі віць адразу дзве пугі, і не было каму патрымаць нам вяровачкі, дык мы падлажылі абодва канцы пад вазон. Мы сабе толькі паплёўвалі ў рукі, вілі, а вазон усё ехаў на падаконніку, пакуль не гупнуўся на падлогу. Мама злавала зноў, а я зноў абяцаў, што не буду нягодны. І я стараюся, а мама верыць мне, што я хачу быць добры. Бо мама вельмі добрая сама.

2 Зак. 2563

Гэта ведае і Сняжок. Вада ў вядры памалу перастае калыхацца, і ён п'е, не адымаючы дзюбы.

— Перадыхнуў бы хоць! — гаворыць мама.— От дзе хіба рассохся. І праўду кажуць, што «цягнеш, як голуб».

Яна смяецца. Я сяджу ля вядра на зямлі, і гэтак мне добра глядзець на вясёлую маму. Таксама добра глядзець, што мой Сняжок сядзіць на краечку вядра, учапіўшыся за гэты край чырвонымі маршчыністымі ножкамі, а ў вадзе, чым больш яна аціхае, усё выразней адлюстроўваецца яго белае волле.

І вось ён нарэшце напіўся. Паглядзеў на нас, нашурпіўся, нібы са злосці, і скочыў у ваду.

— О, гэта дык гэта! — замахнулася мама.

— Ты не гані яго,— крычу я,— не гані! Няхай пакупаецца!..

Кажу таксама, што я і сам прынясу, ды мама зноў смяецца.

— Ну, дзе там — ты прынясеш!..— гаворыць яна.— Здаравяка знайшоўся. І сама прынясу. Ды ён вады не замуціць: ён чысценькі.

Сняжок вады не замуціў. Калі ён скончыў купацца і мама паднесла вядро на парог хлява, Падласка зусім спакойна пачала піць. П'е яна, таксама як голуб, прагна. Пакуль ён піў, яна глядзела з хлява, з-пад дручка, якім завалены дзверы, і нават раз замычэла ад зайздрасці.

Падласка п'е, а мне прыемна глядзець, як хутка апускаецца ў вядры вада. Пасля карова чмакае пысай, цягнучы рэшткі вады, і ласа ліжа драўлянае мокрае дно шурпатым, казытлівым языком. Я люблю гэтае казытанне і таму падстаўляю малую далонь пад халодную мокрую пысу Падласкі.

— Я прынясу яшчэ,— кажу я,— прынясу!..

Ды мама не дае мне вядра.

— Прынясу я й сама.

А мой Сняжок тым часам ужо на страсе.

Ён ужо дакарае за нешта сваю галубку, сварыцца на галубянят. Яны сядзяць на тым баку страхі, ад сонца, і мне іх з двара не відаць. Відаць толькі Сняжок, які на самым хрыбце страхі. Ён надзімаецца, і кружыцца ваўчком, і пад'язджае, як індык, і ўсё вурчыць, вурчыць!.. Я разумею, што ён кажа. Ён сварыцца на сваю белую сяброўку Волечку, якая залішне песціць малых.

«Нат-тур-ра, нат-тур-р-ра! — сварыцца ён.— Ім, гультаям, і нар-р-руку, а ты ім пат-тур-р-рай!..»

«Не гультаі, не гультаі, а гу-а, гу-а, гуленькі»,— гудзе ў адказ далікатная, ціхая Волечка. Яна ўжо выйшла на хрыбет страхі і вытанцоўвае вакол свайго сварлівага гаспадара. «Куды лятаць, чаго лятаць,— стараецца абараніць дзяцей.— Яшчэ каршун, яшчэ каршун, а гу-а, гу-а, гуленькі!..»

«Які кар-р-ршун? Які кар-р-ршун?» — яшчэ больш абураецца Сняжок.

Нарэшце, нібы выказаўшы ўсё, што ён хацеў сказаць, Сняжок узняўся, залопаўшы ў крыллі. За ім узляцела яго паслухмяная Волечка, а ўслед за імі — маладыя.

Маладых двое, і я нікому не кажу, што ўсё яшчэ ніяк не магу распазнаць, якое з іх — голуб, якое — галубка... Яны яшчэ пішчаць і часта лезуць да дзюбы бацькоў. Сняжок дарэмна бурчыць на іх, што гультаі,— яны лятаюць вельмі ахвотна.

Ды Сняжок ужо не злуе. Ён уздымаецца вышэй, вышэй, вышэй!.. Пасля спыняецца і, нібы ўчапіўшыся лапкамі за нейкую нябачную вяровачку, нацягнутую ў небе, пачынае заўзята куляцца. Куляецца ён вельмі спрытна, цераз спіну.

Вяровачка, за якую ён учапіўся, мусіць, не адна,— яны нацягнуты, як тэлеграфныя драты. Сняжок, пачаўшы ад верхняй драціны, чапляецца за кожную — ніжэй, ніжэй, ніжэй! — а потым, усе перабраўшы, уздымаецца ўверх. Побач з ім куляецца і кружыць белай пушынкай на ветры малая спрытная Волечка.

Толькі малыя «гультаі», як называе іх Сняжок, не могуць яшчэ куляцца. Яны нясмела прысядаюць на распушаныя хвасты, патрымцяць крыллямі, як жаўрукі, і зноў пачынаюць лятаць...

А я гляджу, не магу наглядзецца.

* * *

Ён быў смелы і горды, мой голуб Сняжок. Зімой, калі я, гразнучы ў тугіх сумётах, ішоў з суседняй вёскі і нёс яго за пазухай са звязанымі крыллямі і нагамі, я ніколі не думаў, што ён — ды такі забіяка.

Дагэтуль у нас галубоў не было. Волечку даў мне, на два дні раней, Міхась. Дзядзька Сцяпан, мамін брат, даючы мне Сняжка, гаварыў, што першую пару найлепш прывучаць у хаце. І ў нашай хаце стала вельмі весела.

Сняжок і Волечка хутка знайшлі сабе зручны, зацішны куточак у запечку і пачалі рабіць гняздо. Тут ужо я дапамог,— церушыў ім ля печы салому. І вельмі пацешна было, як яны валачылі яе, узяўшы саломінку ў дзюбу.

— Будуюцца,— казала мама.— Нібыта дзеравякі з лесу возяць.

А неўзабаве, усадзіўшы ў запек руку, я абмацаў пад голубам малое цёпленькае яйцо. Праўда, дабрацца да яго было не проста. Сняжок злосна гудзеў, кляваў мяне дзюбай і хлёстка, пякуча

хвастаў крылом па руцэ. Але гэтым мяне не адгоніш.

А вось на другую зіму ён праз смеласць сваю і загінуў.

Яшчэ быў люты, холадна было нават у хляве, дзе стаяла Падласка, а галубы ў старым, дзіравым кошыку, падвязаным пад лацінай, высядзелі галубянят... Пару маладых я ўвосені аддаў Міхасю, як мы і дамаўляліся з ім, калі ён даваў мне Волечку, і зімавала ў мяне толькі пара старых. Галубянят я заўважыў не адразу, хоць і прыходзіў у хлеў штодня. Прыходзіў спачатку ўдзень, а пасля, калі наша Падласка прывяла цялятка, прыходзіў з мамай і ноччу. Мы зачыняліся ў хляве, я трымаў лямпу, а мама даіла карову. Як прыемна было пазіраць, што на чыстай саломе ляжаў, падкурчыўшы ножкі, расставіўшы вушы, пярэсты бычок! Як прыемна было слухаць, што ў даёнку дзюрчыць сыradой, які я хутка буду есці з хлебам, што над намі, устрывожаныя шумам і святлом, варушацца і гудуць у кошыку галубы!.. Днём я заўсёды прыходзіў глядзець, калі мама паіла Падласку або прыносіла ёй есці. А то заходзіў і так.

І вось аднойчы я пачуў у кошыку пад лацінай знаёмы піск... «Няўжо малыя?!» — усцешыўся і здзівіўся. Дык вось чаму яны, Сняжок і Волечка, апошнім часам усё сядзелі на змену ў кошыку, чаму адтуль чуваць было іх радаснае гудзенне!

З катуха, у які мы клалі Падласцы трасянку з саломы і сена, мне ўжо не вельмі цяжка было дабірацца да бэлькі, а з бэлькі я, аберуч трымаючыся за кроквіну і ступіўшы на адну, тады на другую лаціну, далазіў да галубінага кошыка. Адной рукой трэба было трымацца, каб не ўпасці, а другой я палез у гняздо. Гэта было не

проста,— Сняжок балюча дзёўбаўся і біўся крылом. А ўсё ж я абмацаў пад ім, на сагрэтай саломе, два цёпленькія, мяккія камочкі!.. Ад радасці я ўжо не злазіў з бэлькі на катух, а проста скочыў на гной і пабег з такой весткай у хату, а потым — да Міхася.

Ды радасць наша была не доўгая. Яе забраў Сымонаў кот Жандар.

Жандарам яго называла мая мама. Ён быў вялікі, пануры, вусаты і шкодны. Мы з Міхасём не любілі яго і ганялі, абы дзе сустрэўся.

Зладзюга ведаў, што акенца ў нашым хляве зімавала без шкла і мы затыкалі яго саломай. Падласцы было ад гэтага цяплей, але затое цёмна. Яшчэ горш было сядзець у цемры, узаперці галубам. Калі адліжыла і засвяціла сонца, я выняў з акенца салому, каб усім у хляве стала лепш — і Падласцы с пярэстым бычком, і галубам з галубянятамі... І вось Жандар прыпільнаваў, што я вярнуўся з коўзанкі позна, забыўся заткнуць акенца саломай, і ён залез у хлеў.

Сняжок загінуў з боем. Дзівак! Ён думаў, як і ад маёй рукі, адбіцца ад ката маленькай дзюбай і крыллямі...

Уранні я заўважыў ля хлява на снезе белы пух і пер'е, якога яшчэ больш было на гнаі, куды яно ападала з кошыка.

У кошыку былі адны галубяняты. Відаць, што кот залез туды на досвітку, бо галубяняты яшчэ не змерзлі, жылі, асаблі́ва адно.

Яно і выжыла. Я накарміў яго з рота, сагрэў у руках і пасадзіў у запеку. Тады пабег да Міхася. Мы разам з ім падумаем, што тут рабіць. Галоўнае — злавіць і адвучыць Жандара.

Калі я выйшаў з хаты на двор, са страхі хлява ўзляцела, залопаўшы крыллямі, Волечка. Яна спалохалася нават і мяне.

Яна паляцела кудысьці, відаць, не могучы асмеліцца ўляцець у акенца хлява, і не вярнулася, мабыць, загінула недзе, бо я больш не бачыў яе, хоць і вельмі хацеў, каб злавіць і прынесці ў запечак.

* * *

Зноў вясна.

Зноў наш двор пацярушаны пялёсткамі белага цвету, што асыпаецца з вішань. Падласка ляжыць каля плота, на сонейку, спакойна глядзіць і перажоўвае жвайку. Яна заўсёды жуе, хоць не заўсёды ёсць што жаваць. Сёння мы з Міхасём пастараліся вельмі ўдала,— прыпасвалі сваіх кароў на панскім лузе. Падласка і цяпер маўчыць, як змоўшчыца, як і зімой, калі я цішком дадаваў ёй у трасянку больш сена. Тады мама аднойчы злавіла мяне і палаяла, а цяпер я прызнаўся і сам, пахваліўся ёй нашай удачай.

«Асцерагайся, сынок,— сказала яна.— Пападзешся ім у рукі — не памілуюць...»

Ды я не баюся. Што гэты луг не панскі, а наш, вясковы,— я ўжо чуў, і не раз. Што паноў усё роўна не будзе — за год ці за два,— я ведаю таксама. Аб гэтым у нас і гавораць, і песні спяваюць. Іх не будзе, а нашы каровы цяпер ужо хочуць, каб мы іх напасвілі, і таму сёння мы з Міхасём — малайцы.

Я ўжо большы, чым быў летась, я сам выкручваю са студні вялікае драўлянае вядро з вадою, сам нясу яго поўнае ў хату і сам смяюся, успамінаючы хлопчыка Алеся, пра якога мы нядаўна чыталі ў вершы Якуба Коласа:

Ён дзяцюк, хлапчына,
Носіць ён вядро з вадою,
Як стары мужчына.

І вось я, мужчына, нясу ад студні поўнае драўлянае вядро вады, а са страхі злятае мой Сняжок і садзіцца... ужо не на край вядра, а проста мне на плячо. Бо гэта ўжо не той Сняжок, а сын яго, якога я выкарміў сам.

Я стаўлю вядро на зямлю і падстаўляю голубу далонь. Сняжок, нібы па тоўстай кладцы-бервяне, ідзе па маёй руцэ ад пляча на далонь і, спыніўшыся на далоні, пачынае вурчаць. Ён надзімаецца і кружыцца ваўчком, і ўсё вурчыць, вурчыць мне проста ў твар!.. Я разумею, што ён кажа. Ён скардзіцца мне на сваю белую Волечку, якую я прынёс яму ад Міхася.

«Нат-тур-р-ра! Нат-тур-р-ра! — вурчыць, сярдуецца мой белы гадунец, гаворачы пра палахлівую сяброўку.— Ты не кар-р-ршун! Ты не кар-р-р-ршун!..»

— Не, не каршун,— смяюся я і гладжу Сняжка, каб супакоіць яго.

А маладая Волечка глядзіць на нас са страхі і, нібы ёй дрэнна відаць, паднімае раз-поразу ўверх сваю маленькую чубатую галоўку.

Эх ты, Сняжок! Ну, што за дзіва, што ты не баішся мяне? Ці даўно гэта было, як ты, яшчэ не могучы лятаць, хадзіў за мной па хаце, пішчаў і кланяўся, растапырыўшы крыллі, прасіўся на рукі? А ці даўно ты, ужо на двары, таксама злятаў са страхі да мяне на плячо і лез з дзюбай у рот, прасіў есці? А сёння ты — вялікі гаспадар, герой, мужчына!

І ты ўжо кружышся, вурчыш, як твой бацька, вечна нездаволены буркун. А ну, пайшоў!

Я падкідаю Сняжка далоняй уверх. І разам з ім са страхі, палахліва залопаўшы ў крыллі, узлятае і Волечка.

І вось яны кружаць пад чыстым блакітным небам. Дабраўшыся да тых, нацягнутых уверсе

і нікому нябачных дратоў, мой белы прыгажун чапляецца чырвонымі лапкамі за драціну і пачынае куляцца. Побач з ім куляецца і кружыць вакол яго белай пушынкай на ветры малая, ціхая, спрытная Волечка.

Няхай куляюцца! Ім будзе весела ў мяне, спакойна, добра. Жандар больш не разбурыць іх гнязда: мы з Міхасём адвучылі нягодніка. Мы парабілі цяпер такія галубнікі, што ніхто не далезе, ніхто не дастане!

Гляджу — не магу наглядзецца...

1952

ВАСІЛЬ БЫКАЎ

Народны пісьменнік Беларусі
(нарадзіўся ў 1924 г.)

СВАЯКІ

— Не! — сказала яна, стукнуўшы аб падлогу вілачнікам.— І не думайце!

Седзячы ля стала, яны пераглянуліся. Старэйшы — высокі, худы, па-юнацку нязграбны Алесь адразу нахмурыўся і зацяўся ў сабе, а на зусім яшчэ хлапечым пухлаватым твары пятнаццацігадовага Сёмкі мільганула нешта ўпартае і злоснае:

— Усё роўна пойдзем!

— Паспрабуйце! Паспрабуйце, ірады! Бач, удумалі! Смаркачы няшчасныя! Я вам пакажу партызанаў!

Гэта была пагроза, але ў ёй адчувалася не так сіла і ўпэўненасць, як бездапаможнасць, ад якой яна ўсхліпнула і з вілачнікам падскочыла да хлопцаў. Яны павінны былі б разбегчыся, як гэта рабілі заўжды дагэтуль, але цяпер нават не крануліся з месца, і гэта зусім раззлавала яе. Сёмка толькі ўзняў руку, яна выцяла яго некалькі разоў, не гледзячы куды, потым адзін раз — Алеся. Старэйшы прыняў яе ўдар з каменнай абыякавасцю на змрочным худым твары, нават не ўздрыгнуў, толькі мацней сцяў вусны, і яна зразумела, што ўсё гэта — дарма. Дарма ўвесь яе гнеў, яе лаянка, яе запазнелая спроба вярнуць сваю ўладу над хлопцамі. Роспач адразу падламіла яе, і, кінуўшы вілачнік, яна выйшла ў сенцы.

Некалькі пакутных хвілін яна корчылася на сундуку ад бездапаможнасці і крыўды, не ў стане зразумець, чаму яны такія ўпартыя ў гэтым відавочным і пагібельным сваім намеры? Яна зразумела і нават апраўдвала, калі на гэта ішлі дарослыя — акружэнцы і свае мужыкі, але што ў той калатнечы магло прывабіць падлеткаў, амаль што дзяцей? Што яны зробяць у лесе, апроч як па-дурному загінуць, як загінуў той, што тыдзень назад з ночы ляжаў да поўдня на аколіцы, застрэлены нямецкай засадай, такі маладзенькі, прыгожы дзяцюк, у акрываўленай вайсковай сарочцы. Так і яны будуць валяцца дзенебудзь, і на іх будуць страхавіта глядзець незнаёмыя людзі, і п'яныя паліцаі будуць перакочваць іх сваімі падкутымі ботамі, а па іх босых нагах будуць апантана бегаць прагныя веснавыя мухі...

Не, ужо таму не быць! Хопіць таго, што без пары, без часу склаў галаву бацька, а ў іх яшчэ, слава богу, ёсць маці, яна не можа дапусціць іхняй пагібелі. Ёй пэўна вядома, хто падбіў іх на гэтую гібельную справу, яна знойдзе яго і не пакіне ніводнай валасіны ў ягонай фасоністай белай чупрыне.

З раптоўнай рашучасцю яна падхапілася з сундука, выбегла на падворак, але тут жа вярнулася, сюды-туды кінулася па сенцах, шукаючы якой падпоркі, і не знайшоўшы нічога зручнага, сарвала з крука карамысла. Ахопленая помслівым зларадствам, яна туга падперла карамыслам дзверы ў хату і кінулася на вуліцу, на бягу трохі аправіла касынку і ўжо не выціралa слёз, якія ўсё яшчэ цяклі па яе шчоках.

Яна бегла па вуліцы, разганяючы пад платамі курэй, босымі нагамі ўзнімаючы ў доле пыл, і галаву яе распірала ад гнеўных, народжаных яе,

мацярынскаю, крыўдаю слоў. Яна скажа гэтаму Яхіму, што ён душагуб, ірад бязлітасны, яна дапытае, навошта яму спатрэбіліся гэтыя зялёныя хлапчукі. Калі ўжо ўдумаў, дык хай бы сабе і ішоў сам, куды толькі яму захочацца — хоць у партызаны, хоць у паліцыю ці самому д'яблу ў зубы, толькі без іх. Хай ён зараз жа аб'явіць ім, што нікога з сабою не возьме, інакш яна паламае на ягонай галаве ўсе чапельнікі, збэсціць яго на ўсю вёску.

Са злосці яна дужа штурхнула дзверы гэтай старэнькай пакаселай хаціны, не зачыняючы іх, ірванула за клямку другія — з хаты патыхнула прахалодай земляной падлогі і бязлюднаю цішынёй. Тады яна тузанула пасцілку ў запеччы — з кучы цёмнага ашмоцця прыўзнялася белая галава старога Лукаша, ягоныя падслепаватыя вочы хваравіта заміргалі насустрач.

— Дзе завадатар ваш?

— Гэта Яхімка, ці што? А хто ж яго ведае. Хіба цяперака дзеці пытаюцца ў бацькоў...

— А ўночы ён спаў дома?

— Не ведаю я. Быдта не чутно было.

Вядома ж, што мог сказаць ён, гэты амаль аслеплы, забыты богам стары, мусіць, Яхіма не так проста было злавіць, яна адчула, што ўвесь запас яе гневу вось-вось мінецца без жаднай карысці, і зноў не стрымала сябе. Праўда, слёз ужо не было, былі толькі ўдушлівыя камякі ў грудзях, і пакуль яна, прыпёршыся да печы, перасільвала іх, Лукаш цярпліва стагнаў у запеччы, спакучаны ўласнай хворасцю.

І ўсё ж яна іх не аддасць, яны — яе дзеці, яна — для іх маці і не пагодзіцца на іх пагібель, хутчэй сама ляжа трупам на гэтым іх вар'яцкім шляху, але засцеражэ іх ад смерці.

Яна ўвесь час амаль бегла — праз вёску, міма

пунь, хлеўчыкаў, свіронкаў, з дзяцінства знаёмых хацінак, пасля — па выгане з маладой вясновай траўкай, уздоўж свежа і весела прыбранага першай веснавой зелянінай раўка. Як за апошнюю сваю магчымасць, яна ўчапілася цяпер за думку — прасіць Дразда, што жыў у суседняй цераз поле вёсцы. Праўда, ад зімы ён хадзіў паліцаем, з выгляду быў па-начальніцку важны і строгі, але яна ведала яго маці ды і яго ад самага дзяцінства, усё ж ён ёй дваюрадны пляменнік, не абы-хто чужы. Яна раскажа яму аб сваім горы, і ён павінен чымсь пасабіць як мужчына, і галоўнае — свой чалавек. Хай ён іх напалохае, пасадзіць на колькі дзён у свіронак, хай нават нядоўга патрымае ў турме, але каб толькі не сышлі ў лес і на старасці не асірацілі яе.

Яна толькі баялася, каб Дрозд не паехаў куды, не быў заняты, не адмовіў і тым не адабраў у яе апошнюю магчымасць утрымаць іх. Але сонца апусцілася ўжо нізка, марудна садзілася ўдалечыні за шырокую хмару над лесам,— у такую пару, ведала яна, служачыя ў мястэчку разыходзіліся з устаноў і займаліся сваімі справамі. Праўда, яна спахапілася, што нічога не ўзяла з сабой, усё ж трэба б прынесці які-небудзь гасцінец ды і бутэльку таксама. Але за ёй не прападзе, няхай толькі паможа.

Ён быў дома, яна адразу сцяміла гэта, як толькі збочыла з вуліцы ў вузенькі абсаджаны вішаннікам завулак да яго ладнай з трысценкам дамоўкі. З двух расчыненых вокнаў неслася гучная музыка, і за радам вазонаў на падаконніку варушылася нечае мужчынскае з пагонам плячо.

Яна яшчэ раз паправіла на галаве хусцінку, скарэлымі ад заўсягдашніх мазалёў рукамі крадком выцерла вочы і, як мага цішэй, узышла на ганак. Дзверы ў хату былі расчынены, ён сядзеў

на ўслоне і адразу павярнуў да яе насаты голены твар, на якім перш-наперш адзначылася здзіўленне.

— Што табе, цётка?

Тое, што ён назваў яе звыкла па-вясковаму цёткай, надало ёй смеласці, пад ягоным строгім, нібыта нават зласнаватым позіркам яна ступіла па засцілцы ад парога і сказала:

— Прыйшла да цябе, Пятровіч, па дзелу.

Патэфон на канцы стала змоўк, хтось павярнуў у ім блішчасты рычаг, і некалькі мужчын з насцярожанаю ўвагай уставіліся ў яе. Яна крыху збянтэжылася пад гэтымі поглядамі і не ведала, як ёй вытлумачыць сваю такую, здавалася, простую і зразумелую патрэбу. Недзе ў адчуванні яе на імгненне варухнулася прыкрасць, нават шкадаванне, што прыйшла сюды, але якога іншага выхаду на запас у яе не было.

— Ды я каб параіцца. Сыны ў мяне...

— Што сыны? Гавары канкрэтна.

Яна пакутліва шукала словы, каб як мага карацей і зразумела растлумачыць ім, што яе прывяло сюды.

— Ну гавары, гавары, не бойся. Тут усе свае.

— Сыны ў мяне... Нядобрае ўдумалі.

— Што, з бандытамі знюхаліся?

Яны ўсе разам нібыта страпянуліся за сталом, павярнуліся да яе, а Дрозд рашуча ўскочыў — рослы цяжкі мужчына ў сподняй блакітнай майцы,— і дошкі ў падлозе хістка зазыбаліся пад ім.

— Ну, гавары!

Яна, выразна разумеючы, што павінна адважыцца на самае галоўнае, дзеля чаго гатова была на ўсё, амаль узмалілася:

— Пятровіч, родненькі, толькі ж прашу: не зрабі ж ім благога. Ну, можа, напалохай іх, не карай толькі. Маладыя ж яшчэ, блазнота зусім,

старэйшаму васемнаццаты пайшоў са ўздзвіжання. Хіба ж яны разумеюць...

— Ага! Так-так. Ну ясна. Дзе яны цяпер?

— Дома. Я ж запёрла іх.

— Запёрла? Маладзец, цётка. Хадзем!

Ён таропка нацягнуў на сябе свой паліцэйскі мундзір, сарваў са сцяны вінтоўку. Іншыя таксама вылезлі з-за стала, і ў хаце адразу зрабілася цесна. Яна адступіла, усярэдзіне ў яе нешта здрыганулася і апала, і пакуль Дрозд падпярэзваўся тоўстай вайсковай дзягай, яна, сашчапіўшы на грудзях рукі, прасіла:

— Пятровіч, сынок, толькі ж вы па-харошаму каб...

— Мы па-харошаму! Культурна! Барсук, прыхапі канец.

Яны выйшлі на двор і, каб было бліжэй, хутка пусціліся па мяжы ў поле. Сонца ўжо схавалася за хмарай, па-вясноваму голае шэрае поле тужліва азмрочылася, але яшчэ было відно і ціха.

Тут, на волі, яна лепш разгледзела іх. Апроч Дразда яшчэ двое былі ў нямецкіх мундзірах і пілотках, а адзін, задні, у сваім — пінжаку і шэрых картовых штанах навыпуск. Гэты, у штацкім, здалося, быў ёй знаёмы, і яна, забегшы трохі наперад, спытала:

— Гляджу гэта і пазнаю быдта. Ці не з Залесся будзеце?

— З Залесся, матка,— проста адказаў ён басам, але размовы не падтрымаў. Яна прыгледзелася да астатніх дзвюх крутых стрыжаных патыліц, але гэтыя, бадай, былі чужыя.

Так яны перайшлі пагорак, клін сенажаці, мінулі лазовыя зараснікі ля ручая. Каля балотца выгарыны калупаўся з плугам кульгавы Пракапчук, селянін з іх вёскі, ён прыпыніў каня і

доўга глядзеў здаля на жанчыну і чатырох паліцаяў з вінтоўкамі. Яна нічога не сказала яму, нават не азвалася і прайшла міма, але зараз жа ёй стала ніякавата ад гэтай насцярожанасці знаёмага чалавека. Праўда, яна тут жа перасіліла ў сабе гэта непрыемнае страхавітае адчуванне. Хай, хай папалохаюць, не заб'юць жа, бо немцам яны благога яшчэ не зрабілі, завошта ж караць іх?

Яна ўвесь час бегла ззаду, у полі і на выгане, і толькі калі зайшлі на падворак, ля калодзежа Дрозд прапусціў яе ўперад і нават лёгенька штурхануў, маўляў, ідзі, а мы следам. Яна звыкла і рухава, як і заўжды, прыступіла на шырокі пляскаты камень, затым на парог і ў той жа час зразумела, што падпорка яе не ўтрымала, карамысла валялася ў доле, і дзверы ў хату былі расчынены. Аднак зараз жа яна згледзела Сёмку, і яе ўразіў выраз сполаху, бадай што жаху, на яго яшчэ вельмі дзіцячым твары. Нагнуўшыся, сын стаяў над кубёлкам, у якім яны хавалі мясное, з кавалкам сала ў руцэ. Каля ног хлопца ляжала тарбінка з завязкамі, згледзеўшы якую, яна ўсё зразумела і коратка зларадна сабе ўсміхнулася. Але ў той жа час Сёмка крыкнуў, выпусціў сала і, угнуўшы голаў, кінуўся ў дзверы, на бягу моцна штурхануўшы яе ў бок. Ззаду закрычалі — Дрозд або хто іншы, і ў той жа момант аглушальна грымнулі адзін, другі, трэці стрэлы. У ёй усё абвяла, абмякла, яна пахіснулася, але стрымала сябе і, адчуўшы, як нешта крута збочыла да недарэчна і непатрэбна страшнага, выбегла з сенцаў.

— Сыночак! Сыночак! Пастой!

Яна кінулася да паліцая ў шэрай нямецкай пілотцы, які стаяў з карабінам каля паркана, хоць ужо не страляў. Ён апусціў карабін долу, выла-

яўся, груба адштурхнуў яе і палез цераз перакладзіну ў гарод. Яна не разумела яго, як не разумела нічога з таго, што тут адбываецца. Сёмкі нідзе не было, і толькі калі паліцай шырока пакрочыў наўкось па забаранаваным гародзе, яна ўбачыла сынаву галаву, плечы і раскіданыя ў бакі рукі — ён нерухома ляжаў на глеі ў трох кроках ад буйна квітнеўшага на ўзмежку вішанніку.

Тады яна закрычала і рухнула на прапахлы ўсімі дваровымі пахамі дол, усведамленне велізарнай несправядлівасці збіла яе з панталыку, яна ўжо не магла сцяміць, як здарылася такое. Яна білася галавой аб цвёрдую, як бетон, утаптаную зямлю падворка, біла яе сваімі, не па-жаночы вялікімі кулакамі, зайшоўшыся ў амаль здзічэлай, шалёнае роспачы ад такой непапраўнай бяды. З гэтага стану яе вырваў знаёмы і ў той жа час зусім нейкі інакшы голас яе старэйшага сына.

— Халуі прадажныя!

Усё яшчэ не ўстаючы з долу, яна ўзняла голаў і праз слёзы ўбачыла, як Дрозд і з ім два паліцаі вывалаклі сына з сенцаў і пачалі груба круціць яго рукі, каб звязаць іх вяроўкай — канцом, што ўзялі ў Дразда.

— Бобікі. Будзе і на вас вяроўка!

— Маўчаць, шчанюк!

Паліцай, які быў у штанах навыпуск, коратка і моцна штурхануў яго каленам у жывот, Алесь хіснуўся, але не ўпаў, і яна, зусім ужо губляючы над сабой уладу, закрычала:

— Сыночак!

Ён, аднак, нават не зірнуў у яе бок, твар яго быў гняўлівы і цвёрды, ён матнуў нагой у бацінку і выцяў паліцая.

— Смерць Гітлеру!

— Ах так, шчанюк!

Дрозд дужа ўдарыў яго прыкладам, і ён упаў — няўклюдна, са звязанымі рукамі, плячмі на пляскаты ля парога камень. Яна падскочыла да пляменніка і, хапаючы яго за ногі ў брудных нячышчаных ботах, спрабавала спыніць, не даць біць сына. Але гэтыя ногі выцялі і адкінулі яе самую. Яна перавярнулася, захлынуўшыся ад болю ў грудзях.

— Ах так, шчанюк! — сказаў Дрозд.— Да сценкі яго!

Тыя два дужа рванулі сына за звязаныя рукі з долу, размашыста кінулі да патрэсканых бёрнаў сцяны, а Дрозд узняў свой карабін. Яна зноў падхапілася з месца, у гэты раз — ужо да сына, але над галавой яе грымнула, аглушыла. Алесь неяк от дзіўна і жахліва напружыўся, вусны яго скрывіліся і галава бездапаможна ўпала падбародкам на грудзі. Ён споўз спіной па сцяне і ў недарэчна скурчанай позе застыў ля падмурка.

Тады яна зразумела, якую недаравальна жахлівую бяду наклікала на іх і на сябе таксама, ухапіла ля парога першае, што трапіла ёй на вочы — хварасціну, якой выганяла ўранку карову, і з безагляднаю лютасцю накінулася на Дразда.

— Гад, пошасць, забойца! Што ты нарабіў! Ірад, нечалавек!..

Яна меціла па галаве і па твары паліцая, але той увабраў галаву ў плечы, засланіўся локцем, і яна біла яго па гэтым ненавісным з паласатай павязкаю лакцю, па чорнай пілотцы, пакуль Дрозд цяжкім прыкладам не адкінуў яе да паркана.

— Прэч, гадаўка!

Аглушаная, яна зайшлася ад болю і змоўкла. Паліцай прывалок з гарода распластанае цела

Сёмкі, кінуў яго на падворку і, задышліва адкашляўшыся, палез у кішэнь за махоркай.

— А здорава ты яго — пад дых! — ваўкавата пахваліў яго Дрозд. Паліцай злосна вылаяўся:

— А што ж, туды-т яго враз! Не знаў ад каго. Ад міня не ўцекёць!

Задаволена мацюкаючыся, яны ўзяліся закурваць. Яна корчылася на маладой мураўцы, усё бачыла, але бадай нічога не заўважала і ні на што не рэагавала. Потым, калі трохі пацішэў балючы звон у галаве, паднялася, спачатку на калені, затым на свае босыя, скарэлыя ногі, акінула няцямным, здзічэлым позіркам двор з нерухомымі целамі яе сыноў. У яе ўжо вельмі нямнога засталося сілы, яна трымалася за паркан і так, перабіраючы рукамі, знясілена пайшла па-над ім да вуліцы. Паліцаі яе не спынялі і не крычалі, ды яна і не прыслухоўвалася ўжо ні да чаго ў гэтым свеце, страх яе сканаў увесь без рэшты. Яна дабрыла да калодзежа, упала жыватом на край яго прысадзістага аслізлага зруба і, убачыўшы ў ягонай глыбі далёкі проблеск святла, нібы за няздзейсненай справядлівасцю, таропка рынулася ў змрочную зыбкую пройму.

1966

КАНДРАТ КРАПІВА

Народны пісьменнік Беларусі
(нарадзіўся ў 1896 г.)



З НОВЫМ ГОДАМ

Год за годам — карагодам,
І ўжо сёння з Новым годам
Я сардэчна, ад душы
Вас віншую, малышы!
А чаго ж я вам жадаю?
Зараз, зараз прыгадаю...
Каб бадзёрымі былі вы,
Каб разумнымі раслі вы,
Каб прынёс вам Новы год
Многа радасных прыгод
І здароўя ў вашы хаты,—
Каб былі здаровы самі,
Каб былі здаровы мамы,
Каб былі здаровы таты,
Каб не ведалі напасці,
Каб і я за вас быў рад.
З Новым годам!
З новым шчасцем!
Вас віншуе дзед Кандрат.

1979

ЖАБА Ў КАЛЯІНЕ

Пагода — проста нібы дым,
У вёсцы рух, у вёсцы ўздым:
Упарта кліча сенажаць.
І ні старым, ні маладым
Тут некалі ляжаць.
Грабель мільганнем, звонам кос
Трымцяць лілёвыя прасторы,
І вось, нібы ў зялёным моры,
Плыве бухматы воз.
Далонню ўцёршы потны лоб,
Як паміж рыфаў, паміж коп
Лахматы капітан яго вядзе.
Ён важнасць твару надае,
І, каб не стала, загадзе
Сваёй адзінай «конскай сіле»,
Якая й так напружвае ўсё жылле,
Ён пугай пары паддае.
Яно хоць «сілы» троха й шкода,
Ды некалі — стаіць пагода,
Аж смагне, ныючы, асірацелы куст.
А Жабе гэта не пад густ:
І сонца горш цяпер пячэ,
Скарэй і бусел напаткае,
І як яна тут ні ўцякае,
Як ні скача,
У цень нікуды не ўцячэ.
Ад крыўды Жаба ледзь не плача.
А ўсё двухногі гэты госць
З сваім вялізным возам!
Апанавала Жабу злосць,
І падказаў ёй жабін розум:
«Ага, ну-ну!
Ты пажыві яшчэ хвіліну,—
Вось толькі сяду ў каляіну,
Плячом пад кола таркану

І к чорту воз перавярну.
Тады — капут, і ты мяне не зловіш,
Бо галаву, напэўна, зломіш».
І — скок Жабоцька смела
Ды ў каляіну села.
Тут колам — хрась!..
І кроў і гразь...

. . . . . .

Пад кола, жаба, не падлазь.

Ці не такі ж і кожнай жабы лёс,
Што пнецца на хаду кульнуць савецкі воз?

1927

САВА, АСЁЛ ДЫ СОНЦА

Сава лятала паначы,
З сабою птушкам смерць насіла,
Хаўтурны спеў ім пеючы,—
Сама там драла іх, сама ж і галасіла,
Ды так не ўбачыла, як нахапіўся дзень,
І Сонца яркага прамень
Да рэшты асляпіў ёй вочы.
Сава ўцячы тут хоча,
Ды толькі вось ляцець не можа,
А паблізу няма дупла нідзе.
Заплакала Сава ў бядзе —
Ну, хто ж Саве паможа?
На шчасце, ёй тут лёс паслаў
Знаёмага Асла.

І кажа ён: — Не плач, сястрыца,
Ды надта не бядуй,—
З бяды мы вырабімся самі,
І Сонцу нам не прыйдзецца скарыцца:
Я вушы доўгія на Сонца навяду
І засланю яго вушамі.
Як цемра ўсю пакрые галу,
Як згіне прыкрае святло,
Дык ты й ляці сабе ў дупло
Тады памалу.
І наш Асёл за працу ўзяўся шчыра:
Як можна вушы свае шырай
Ён растапырыў, распрастаў
І проці Сонца стаў.
Калі ж налева глянуў коса —
Святла там яркая палоса.
Ён — гоп у левы бок.
Пасля глядзіць — святло і справа;
Тады назад ён — скок.
Нарэшце бачыць — дрэнна справа:
Скакаў, скакаў і ўжо насілу ходзіць,
А Сонцу ўсё ніяк не шкодзіць,—
Ні каплі не памог Саве,
А вочы пасляпіў сабе.
І вось Аслу нарэшце ясна стала:
Каб Сонца засланіць — вушэй асліных мала.

Вось гэту праўду едкіх слоў
Нясу, абураны, я на фашысцкіх соў
І іх заступнікаў-аслоў.

1927

АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ

Народны паэт Беларусі
(1914—1978)

КАМСАМОЛЬСКІ БІЛЕТ

Цвёрда трымаўся юнак на дапросе,
Тоячы словы і думкі свае.
Немец-жандар дакурыў папяросу
І камсамольскі білет аддае.

— Вось і білет твой,—
сказаў ён ласкава,—
І ад яго на вачах у людзей
Ты адцурайся; выгодная справа:
Жыць застанешся,— жыццё даражэй.

Што ў ім карыснага? Кніжка, не болей.
Кніжку спалі, і размовам канец!
— Не, не спалю! —
адказаў камсамолец.—
Хай лепей сэрца мне спаліць свінец.

— Ты не згаджаешся? Вельмі шкадую.
Кінь свой білет у палонку тады.
— Не, я не кіну ў ваду ледзяную,
Сам лепш зайдуся ад лютай вады.

— Добра, хай будзе па-твойму.— На гэтым
Доўгі і нудны спыніўся дапрос.
І юнака з камсамольскім білетам
Босага гоняць на люты мароз.

Там ён, абліты вадой ледзяною,
К сэрцу рукою білет прыціскаў,
Быццам білет пад сцюдзёнай вадою
Сэрцу юнацкаму стыць не даваў.

Так і стаяў, смеючыся над катам,
Доўга па целу сцякала вада;
Так і застаўся стаяць каля хаты,
Быццам з чысцюткага літы ільда.

Так і стаіць, як жывы, перад намі,
Так і стаіць, прыціскае білет,
І не развітваецца з сябрамі,
І прастаіць яшчэ тысячы лет.

Ды не карой ледзяною пакрыты,
Ды не абліты вадой ледзяной,—
Выліты з бронзы і сонцам абліты,
Будзе ён вечна стаяць над зямлёй.

1943

СЛОВА НЕВЯДОМАГА САЛДАТА

Ты кожнаму слову, патомак,
Што я гавару табе, вер.
Спачатку,
салдат невядомы,
Ляжаў я не тут, дзе цяпер.
Забіты я быў пад Масквою
І там, не пазнаны нікім,
Засыпаны роднай зямлёю
Быў з імем забытым маім.
Па воінскаму абавязку
На могілку каска лягла.
Ах, вечны грудок мой ды каска,

Пясчаны грудок ды імгла!
Не проста салдату падняцца
З апошніх пазіцый сваіх...

А толькі са мной не згаджацца
Ёсць права такое ў жывых.

Сягонняшні схоў мой не знае
Нябыту ў глухім бур'яне,
І той, хто ў сталіцы бывае,
Цяпер не мінае мяне.
Праходзіць жывая жанчына,
Што недзе далёка жыве,
І ціха, як роднага сына,
Мяне да сябе пазаве.
Лютуе на вуліцы сцюжа,
А нехта — адкуль жа мне знаць! —
Прыпыніцца, іменем мужа
Пакліча з-пад каменя ўстаць.
Я рос сіратою, прызнацца,
Ні жонкі не меў, ні малых...

А толькі са мной не згаджацца
Ёсць права такое ў жывых.

Вякі праляцяць за вякамі,
Пазбыўшы вайну назаўжды,
І, можа, гранёны мой камень
Грудку пазайздросціць тады,—
Калі ўжо ні сына, ні мужа
Ніхто не пакліча ў бядзе
І памяці колкая ружа
На зорку яго не ўпадзе;
Калі з безназоўных пазіцый
Скрозь каскі праб'ецца імгла,
А лес ёй насення пазычыць,
А сонца — агню і святла.

Я мог бы сасной ці вярбою
Шумець паміж дрэў дарагіх...

Але не згаджацца са мною
Ёсць права такое ў жывых.

1972

ВОБЛАКА

Уткнуўшы ў бераг вудзільно,
Я вуджу раніцою.
А воблака? Плыве яно
І небам, і вадою.

Нарэшце клюнула разок —
І рыбка немалая! —
З пяром гусіным паплавок
Пад воблака ныpae.

Стаіў дыханне. Цішыня...
Убок
Рукой умелай
Я падсякаю галаўня,
Цягну з хмарынкі белай.

Вада ў кругах,
Вада ў кругах,
І неба ў ёй не тое...
А воблака? Яно ў руках
Трапечацца жывое.

1937

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ

Народны пісьменнік Беларусі
(1899—1975)



ВАСІЛЬКІ

Стаяў той асабліва прыгожы дзень, якія бываюць звычайна ў канцы жніўня, калі даўно скончана жніво, звезена жыта ў гумны і над апусцелым полем дружна ўзлятаюць стайкі шпакоў — прадвеснікаў блізкае восені. Зямля здаецца лёгкай, бязважкай, яна ўся дыхае цішай, спакоем. Усё відаць як на далоні: і кожнае дрэва на шляху, і калодзежны жураў у дальняй вёсцы, і зубчасты край лесу, і бялявы дымок далёка-далёка, дзе праходзіць чыгунка. Нават бачыш, як трапечацца зжаўцелы ліст на бліжняй бярозе, як высока-высока ў небе ляціць невядома куды самотная павуцінка.

Над купчастай імшарынай пацешна ўзнімаецца бусел, паважна ляціць над полем, выцягнуўшы ўперад сваю задуменную дзюбу.

— Наш бусел! — ганарыста гаворыць Міколка.

— Хваліся! — смяюцца хлапчукі.— Што ні бусел, дык твой.

— А вот жа наш... Глядзіце! Хочаце аб заклад, на ўсе баравікі...

І Міколка ўзмахвае сваім кошыкам. Поўная ліпаўка баравікоў — жаўцявых, чырванаватых, цёмных, нібы вылітых з медзі,— самыя што ні на ёсць грыбы баравыя. Зверху лісты папараці, каб не трапіў пыл у кошык, ды некалькі запазнелых васількоў, якія сарваў Міколка на ўзмежку поля.

Васількі — для сястрычкі. Яна хацела пайсці разам з ім у лес, але маці не пусціла: трохі прыхворвае малая.

— Ну што ж, спужаліся, грыбоў шкада! — наступае Міколка на хлапчукоў, размахваючы перад імі ліпавым кошыкам.

Бусел ляціць проста на высокую грушу-дзічку, што стаіць на ўскраі сяла, высокая, разгалістая, з буславым гняздом на самай вяршыні. За грушай Міколкава хата.

— Ага! Я ж казаў вам...— задзірыста гаворыць Міколка і пераможна шмыгае кірпаўкай носа, якая аж залаціцца пад ранішнім зыркім сонцам. Прыжмурыўшы вока, Міколка ўглядаецца ў далёкую грушу, і лёгкая хмурынка прабягае па яго жывым твары.

— Ізноў нехта бусла пужае... От спаймаю каторага,— дам!

Усе бачаць, як бусел наважыўся быў ужо сесці на гняздо, але раптам узляцеў угору і доўга лятаў, робячы ўсё большыя і большыя кругі, узнімаючыся вышэй і вышэй, пакуль не ператварыўся ў маленькую белую мецінку. І тая знікла,— відаць, паляцеў бусел на сіні лес, што за ракой.

Хлапчукі ўздыхнулі. Нехта задуменна сказаў:

— От бы самалёты такія пабудаваць, як буслы. Хочаш сесці на хвою, сеў на хвою, на дуба — на дуба, а то і на хату высокую можна сесці.

— Нашто табе такія самалёты?

— Немца каб біць зручней...

— То ж надумаўся... У нас, брат, яшчэ хітрэйшыя самалёты ёсць. Рр-а-аз — і няма сотні немцаў. Рр-а-а-з — і другой нямашака... Немцы, яны хітрушчыя, а мы яшчэ хітрэй...— рэзка абарваў Міколка хлапчука, марыўшага пра такія дзі-

восныя самалёты, якія махаюць крыламі і садзяцца, дзе хочуць, як буслы.

Усе задумаліся.

Немцы. Ніхто з хлапчукоў яшчэ не бачыў іх. Праўда, ужо колькі дзён, як ціхімі вечарамі глуха гудзе зямля, і гэты гул нарастае штодня. А ўчора былі частыя ўспышкі на захадзе. Старэйшыя, калі лезлі і чапляліся да іх з запытаннямі дзеці, проста адказвалі:

— Гэта ж паблісквaюць заранкі...

— А чаму грыміць?

— Чаму, чаму... Навальніца будзе. Кладзіцеся спаць...

Хлапчукі, аднак, добра ведаюць пра гэтыя заранкі. Самі ж яны, хлопцы, дапамагалі выганяць жывёлу, якую пагналі на ўсход, каб не дасталося часам дабро ворагу. Жывёлу пагнаў сам старшыня. Міколкаў бацька, ды яшчэ другія калгаснікі. Яны яшчэ не вярнуліся да хат. А перад гэтым прасачыў раз Міколка, як бацька яго разам з другімі дзядзькамі нешта ездзілі ў лес поначы і адтуль прыехалі з пустымі драбінамі. Вазьмі і запытайся тады Міколка:

— То вы гранаты і кулямёты вазілі ў лес хаваць, відаць, пад тыя старыя яліны... Ты ўсё прыглядаўся да іх, калі мы з табою былі ў лесе...

Бацька быў аж здрыгануўся неяк, пацямнеў тварам, але потым спакойна падышоў да Міколкі і, гледзячы яму проста ў вочы — сінія, хітрушчыя,— сурова прашаптаў некалькі слоў:

— Ты глядзі ў мяне, паганец... Калі дзе-небудзь і калі-небудзь ты ляпнеш якое слова, то я... я выцягну даўгі твой язык і павешу цябе на гэтай вось штуцы...— бацька выразна паказаў на крук. Гэта быў звычайны драўляны крук, убіты ў сцяну яшчэ нябожчыкам дзедам. Крук быў смалявы,

жоўты, як воск, адпаліраваны, як костка. Харошы быў крук, моцны. Зірнуў на яго спадылба Міколка, моўчкі адышоў ад бацькі. Кепскія жарцікі з ім, з гэтым старым партызанам. А харошы ўсё ж бацька... Трошкі пабойваўся яго Міколка, а любіў яшчэ болей.

...Хлопчыкі падышлі ўжо блізка да агародаў, як учуялі плач на ўскраі вёскі. Прыслухаліся — плач раздаваўся і ў другім месцы, і ў трэцім...

— Галосяць...— спуджана сказаў адзін, і хлапчукі разбегліся, раскідаліся, як спалоханыя вераб'і, па сваіх гародах і загуменнях, кожны да свайго двара.

Міколка бачыў ужо з-за плота старую грушу на сваім двары. Паасобныя лісткі трымцелі і свяціліся, як медзь. Уся груша пад сонцам была радаснай і святочнай, ля буславага гнязда не змаўкаў вясёлы птушыны шчэбет: у шчылінах буславага гнязда заўсёды знаходзіла прытулак дробнае птаства.

Заглядзеўся на грушу Міколка, спрытна пераскочыў цераз плот. Некалькі баравікоў упала з кошыка. Ён падняў іх, старанна абцёр ад пылу, палажыў назад. Сінія васількі асцярожна схаваў за пазуху, то-та ж будзе радасці малой, калі іх выняць знянацку. Намагаючыся надаць свайму твару самы сур'ёзны выраз сталага працавітага чалавека,— хаця і крывіла вусны гэтая здрадніцкая дзіцячая ўсмешка,— Міколка ступіў крок, другі і раптам затрымцеў, як ліст, збялеў увесь.

Ля ганка, непадалёчку ад грушы, ляжала маці на сырой зямлі. Адна рука была падкурчана, другой яна прыхіліла і моцна прыціскала да сябе, нібы абараняючы ад каго, Міколкаву сястрычку. Твару сястрычкі не відаць. У мацеры ж такія

дзіўныя вочы, нібы глядзяць і не бачаць яго, яе Міколку.

Ліпавы кошык ціха ўдарыўся аб зямлю, бязгучна рассыпаліся грыбы —колькі радасці было ў гэтых баравіках у лесе. Дзе ж падзелася, дзе памеркла гэтая радасць? І здаецца Міколку, нібы лес гудзе, страшна-страшна. Нібы хістаюцца злосна дрэвы, нібы сама груша нахілілася раптам, хоча ўпасці на яго, прыціснуць да халоднага пяску. Страпянуўся Міколка, удыхнуў паветра глыбей і, упаўшы на калені, прынік да маці.

— Мам... а мам... ну чаго ж ты маўчыш?

Дакрануўся да матчынай рукі, яна была халоднай як лёд, цяжкай.

Заплакаць бы Міколку, на ўвесь свет заплакаць. Ды чуе ён галасы ў хаце, чужыя словы. Хіба можна слёзы свае чужым людзям паказваць? Гулка бразнулі дзверы. З хаты выйшлі людзі. Яны груба адштурхнулі Міколку ад ганка. Яны нешта неслі, ці то матчыны коўдры, ці то новае бацькава паліто. Яны некуды спяшаліся, гэтыя людзі ў нязвыклым адзенні, у нязвыклым для Міколкі абутку. Нібы на конскіх капытах, паблісквалі цвікі на падэшвах іх ботаў.

«Немцы...» — мільганула страшная думка.

І ён не глядзеў на іх, не хацеў глядзець, пакуль не заціхлі іх цяжкія крокі. Ён убачыў кроў. У крыві была рука сястрычкі. Міколку стала вельмі горача, падкошваліся ногі. Але ён устаў, выцер успацелы лоб, стараючыся зразумець, што ж адбылося з ім, што адбылося з маці, з яго маленькай сястрычкай. Узрушана шалахцела дзедаўская груша-дзічка, самотныя пчолы ляталі, кружыліся вакол спелых груш-гнілушак. Трывожна шчабятала дробнае птаства, і толькі сонца спакойна ўгравала саламяную страху, чырвоныя вяргіні пад акном. А на сэрцы было пуста і чорна,

нібы ўзяў хто маленькае Міколкава сэрца і выціснуў з яго ўсю гарачую кроў. Ды каменем павісла над ім неадчэпная думка: нешта ж трэба зрабіць.

Нешта ж трэба зрабіць...

Ён перайшоў вуліцу, зайшоў на двор дзеда Нупрэя. То ж стары чалавек, яму год дзевяноста, ён дапаможа, параіць. Стары сядзеў на прызбе. Заўважыўшы Міколку, ён кінуўся завіхацца ля новага грабільна. Пачаў стругаць яго нажом, і ўсё гэта рабіў з такім сярдзітым выглядам, што аж варушыліся, тапырыліся густыя сівыя бровы. Міколку стала нязручна. Ён маўчаў.

— Ну, чаго ты? — не гледзячы на яго, запытаўся дзед.

— Мамцы худа... Відаць, нежывая... Яна і сястрычка...

— А ты не пужайся... Мамку тваю немцы забілі... афіцэры... Ды не ў цябе аднаго...

— Што ж рабіць нам, дзеду?

Дзед Нупрэй так усхадзіўся з нажом, што нечакана аж перарэзаў грабільна і, плюнуўшы злосна, кінуў яго за плот, узрушаны чымсьці, прысеў на прызбу.

— От што, братачка...

А гаварыў ён «братачка» толькі сталым ды паважаным людзям, а не якому-небудзь падшывальцу Міколку.

— Садзіся от... Ну, што мы з табой — адно старое, другое малое... ці мы што зробім? Пачакай от — прыйдзе бацька твой. Мы дамо тады рады... ім... Ды ты пастой! Не хадзі туды... у хату. Начуй у мяне.

Але Міколка пайшоў. Стары праводзіў яго доўгім позіркам, сказаў сам сабе:

— Ну што ж... Упартае хлапчанё, у бацьку пайшоў. Няхай ідзе, хоць выплачацца малое...

І Міколка плакаў. Зашыўшыся ў каноплі, ён праляжаў усю ноч, пакуль не выплакаў усіх слёз. Не на людзях жа слёзы пускаць Міколку, яму ж трынаццаць год, ён жа мужчына. А раніцай бачылі людзі, што ён хадзіў чагосьці ў лес. Потым доўга распытваў старых, па якой дарозе і куды пайшлі немцы.

Потым доўга корпаўся ў хаце, збіраючыся ў дарогу. Цяжка было знайсці патрэбныя рэчы. Разбітыя талеркі, парваныя партрэты, адзенне, яго кніжкі, сшыткі —усё гэта ляжала параскідана злой рукой на падлозе.

Ён узяў сваю старую школьную торбачку, якую пашыла яму маці, калі быў ён яшчэ ў першым класе. Напакаваў яе, усунуў туды і стары абгрызены пенал, любімы сшытак. Пастаяў з хвіліну пад роднай грушай, клапатліва прыкрыў старэнькай, але чыстай скацеркай твары мацеры, сястрычкі і пайшоў, не азіраючыся, агароднай сцяжынкай.

* * *

Яго бачылі потым у мястэчку, праз якое праходзіў бальшак.

Ён стаяў, прыхіліўшыся да тэлефоннага слупа, усё ўглядаўся на дарогу. Нехта паспрабаваў пакпіць над ім: «Ці не ў школу ты, хлопча, сабраўся, дзе ж віданы цяпер тыя школы».

Міколка нічым не азваўся на гэты голас.

Перад ім праходзілі ўзброеныя людзі — купкамі, калонамі, у адзіночку. Узнімаючы пыл, імчаліся грузавікі, грукацелі гарматы на каменным бруку. І ўсё — чужыя людзі, чужыя машыны, чужыя гарматы. Ён часам ажыўляўся на секунду, адрываўся ад слупа, але зноў гарэў запылены твар, бяссільна апускаліся рукі. І вось ён прый-

шоў, гэты доўгачаканы час. Цяпер не можа быць ніякага сумнення: гэта яны, гэта тыя, што замучылі яго маці, яго сястрычку, адабралі ад яго светлае сонца.

Уперадзе коннікаў ціха пасоваўся вялізны аўтобус. Яшчэ не выцвіў лак на ім, не пасцерліся незразумелыя жоўтыя літары і знакі. Праз адкрытыя вокны бачыў ён чорныя мундзіры, чорныя шапкі з чырвонымі кантамі. І на шапках і на мундзірах людскія чарапы, скрыжаваныя косці. Нехта з гэтых людзей гучна гаварыў, нехта смяяўся. П'яную песню цягнулі ехаўшыя ззаду коннікі, і песня была шэрай, як пыл, цяжкай, як камень на сэрцы.

Міколка падцягнуўся ўвесь, сцяўся ў пругкі камяк і ў імгненне вока апынуўся ля самых вокан машыны.

— Наце ж вам... за маці, за сястрычку маю!

Ён проста перакінуў у акно нейкі скрутак, загорнуты ў газету. Асляпляючы слуп агню і жалеза адкінуў яго далёка на прыдарожны пыл. Выскаліўшы пеністыя храпы, уздыбіліся коні. Пазляталі шапкі з коннікаў, сёй-той бразнуўся вобзем. Чуліся разгубленыя каманды. З перакошанымі ад страху тварамі беглі салдаты з насілкамі, з лапатамі. Рэшткі машыны дагаралі на дарозе, дыміліся, тлелі на каменні чорныя мундзіры. Да Міколкі падскочыў спешаны коннік, сівы нямецкі вахмістр. Ён выстраліў некалькі раз у Міколку і потым, нібы спужаўшыся чагосьці, хутка схаваў у кабуру задымлены рэвальвер і, ссутуліўшыся, унікаючы зірнуць у Міколкавы вочы, падаўся прэч, да тых, што расчышчалі дарогу, сям-там пасыпаючы яе жоўтым пяском.

Міколка не чуў гэтых стрэлаў, яму было ўжо ўсё роўна. Нерухомым позіркам ён углядаўся ў

блакітнае неба, нібы прыслухоўваўся да былых сваіх думак: аб нянавісці, аб помсце. Застылы твар стаў калючым, суровым, нібы пражыў Міколка доўгія дзесяткі год, усё перажыў, усё пабачыў на свеце. І толькі на вуснах засталіся — ні агонь, ні жалеза не змаглі іх сцерці — сляды ўсмешкі, слаўнай, дзіцячай.

Побач ляжала яго торбачка з раструшчаным пад салдацкім ботам пеналам. Ды выпалі з-за пазухі і ляжалі ў пыле запазнелыя восеньскія васількі.

Сінімі васількамі адцвіталі і вочы хлопчыка.

1942

ІВАН МЕЛЕЖ

Народны пісьменнік Беларусі
(1921—1976)

ЗДАРЭННЕ

Добра летам было Валодзьку. Добра ўсюды, але, можа, нікуды не вабіла яго так, як у хмызняк за сялом. Ён прыходзіў сюды ледзь не кожны вольны дзень, часам і не адзін раз. У іншыя дні, здаралася, забываўся пра дом, пра маці, пра яе наказы, пра ўсё на свеце, толькі змрок, што ўпаўзаў між кустоў і рабіў хмызняк незразумела страшным, выганяў яго дахаты.

Чаго ні было ў гэтым хмызняку, што цягнуўся за Куранямі, здавалася Валодзьку, без канца-краю. У нізкіх з клейкім лісцем алешынах таіліся птушыныя гнёзды, між алешын нярэдка траплялiся стройныя тонкія крушыны, з якіх добра было рабіць кавенькі. Патрымаеш дручок над агнём, так, каб ён прапацеў, прапрэў, і бяры, гні з яго палазок-кавеньку! Можна такую кавеньку выгнуць, што, калі выйдзеш з ёю, як дзед, на вуліцу, усе хлопцы пазайздросцяць.

А колькі тут усялякай расліны, і горкай прагоркай, такой, што калі возьмеш у рот, куснеш, дык язык нібы агнём апячэ, потым увесь дзень будзе гарэць, і пахучай валяр'янаўкі, за якую ў кааперацыі нават грошы даюць. Трава ў хмызняку такая высокая і густая, што праз яе церабіцца цяжка, як праз каноплі. Але самае цікавае ўсё ж зараснікі. Алешыны, крушына, лаза тут амаль усюды так густа пераплецены, што лезці ў іх мала

хто і наважыцца. Дарослыя, ды і Валодзькавы сябры, тыя звычайна стараюцца ісці сцежкамі.

У гэты дзень Валодзька доўга сядзеў каля копані. Валодзькава мама казала, што копань тут не сама па сабе, а яе выкапалі, толькі Валодзьку ў гэта неяк слаба і верыцца. Як жа паверыць у гэта, калі яна ўся аброслая, так што і падступіцца цяжка.

Бераг у копані круты, гэта Валодзька ведае. Адзін раз тарфяная грудка, на якой ён стаяў, адламалася і Валодзька так шухнуў у ваду, што ледзь не схаваўся з галавой. Яму ўдалося ўхапіцца за лазіну, і ён утрымаўся, спалохана адчуваючы, што ногі яшчэ не дастаюць дна.

З таго дня Валодзька пабойваўся копані, яе вады. Але, можа, якраз таму так і цягнуў да сябе загадкавы зарослы астравок, што купчасціўся сярод копані. Чаго там, якіх цудаў ні ўяўляў сабе Валодзька! Вось і сёння сядзеў ён на беразе са сваім дружком Хведзькам, пазіраў на зялёную пялёнку раскі, такую густую і нібы цвёрдую, што, здавалася збоку, хоць ты ступай і ідзі сабе, як па сухому. З раскі то там, то тут цяжка выпоўзвалі зялёныя брыдкія лягушкі.

— Вунь,— сказаў Хведзька і замахнуўся. Камячок чорнай зямлі ціха сцепнуў, слаба варухнуўшы зялёную паверхню, і лягушка лена, неахвотна знікла.

— Не папаў! Цалко! — Валодзька знайшоў зялёны бугорчык лягушкі і шпурнуў камячок. Яшчэ да таго як камячок упаў на раску, Валодзька, пасачыўшы за ім, зразумеў — пералёт. З гэтай прычыны на Валодзькавым твары адразу паявіўся абыякавы, нудлівы выраз.

Хведзька задаволена падскочыў:

— Сам — цалко!

— Вельмі мне трэба! — працадзіў Валодзька.— Каб я хацеў, я адразу б...

— Ты — адразу б? Хвалько!..

— Я — хвалько? — устаўшы, перапытаў Валодзька з рашучым выглядам, такім рашучым, што Хведзька прамаўчаў.— Не ведаеш, дык і не кажы!

Яны пастаялі, памаўчалі, насцярожаныя адзін да аднаго, нібы чужыя. Можа быць, яны б і разышліся, затаіўшы кожны лёд у сэрцы, але вакол было так цёпла, мірна і ў саміх было так бесклапотна, што лёд гэты не трымаўся. Спрачацца зусім не хацелася.

— Ну, гля́дзі...— мякчэй, хоць і з вельмі хмурным выглядам, прамовіў Валодзька. Ён паглядзеў на астравок, на загадкавы зараснік, і хмурнасць раптам сышла.— Ведаеш, давай знойдзем алешыну сухую!

— Нашто?

— Пакладзем туды. Адсюль туды —і перабяромся!..

— Уга, пакладзеш туды! — Хведзька тут жа літасціва згадзіўся.— Ну, давай!

Валодзька звярнуў са сцежкі і палез у зараснік. Хведзька з выглядам адвагі пацерабіўся за ім. Гэты выгляд быў недарма на Хведзькавым твары,— з галлём і гушчынёй лісця тут цесна абступала іх невядомасць. Усюды былі, чапляліся за рукі, за ногі высокая трава, галлё, гнілое, не віднае ў траве і зялёнае на дрэвах, шыю халадзіў сыры цяністы прыцемак, ад якога па спіне прабягалі мурашкі. Чамусьці здавалася, што нехта з гэтай гушчыні назірае, цікуе, і ў галаву мімаволі лезлі страшныя гісторыі з казак, якія расказваў хворы Валодзькаў дзед Ігнат. Ці ж дзіўна, што Хведзька меў такі адважны выгляд.

Валодзьку таксама было страшнавата, але ён і

знаку гэтага не падаваў Хведзьку. Разам з тым, жыло ў ім, спрачалася са страхам і іншае. Яго цягнула да сябе гэтая страшнаватая загадкавасць, што, здавалася, таілася ў змроку і гушчыні зараснікаў. Цікаўнасць, дапытлівасць былі, можа быць, самымі моцнымі рысамі яго дзіцячай натуры. Яму чамусьці заўсёды хацелася ўсё бачыць, хацелася да ўсяго падысці пабліжэй, дакрануцца, калі можна, рукамі, паспытаць...

— Во! — гукнуў ззаду Хведзька.

Валодзька вярнуўся да яго. Хведзька, задаволены, выцягваў з травы мокры, даволі тоўсты, з добры чалавечы кулак, камель алешыны. Дрэва было чорнае, і тонкая кара на ім пад Хведзькавымі пальцамі лёгка спаўзала.

— Склізкая! — паскардзіўся Хведзька, пачырванелы ад натугі, учэпліваючы ў яе пальцы.

— Гнілая! Сказаў! Яна яшчэ — як зялеза!

Кусты і трава, што трымалі алешыну, раптам адпусцілі яе, і яна лёгка папаўзла на прагалінку. Кінуўшы камель, прыяцелі агледзеліся і заўважылі, што яна вельмі кароценькая, пераламаная. Тут была толькі палавіна дрэва.

— Не хопіць! —заключыў Валодзька.

Хведзька ўздыхнуў. Ці то згадаўшы несправядлівую заўвагу сябра, ці то каб суцешыць сябе, наступіў з усёй сілай на дрэва, прамовіў:

— А так яна — як зялеза!

Падаліся далей. Неўзабаве трапілі на хліпкую забалочаную мясцінку, збочылі, абыходзячы яе, управа і неспадзявана для сябе выбраліся к канаве. Канава, выкапаная ў даўнія часы і ўжо аброслая кустамі лазы і алешнікам, пераразала амаль увесь хмызняк. Яна ішла ўсцяж сяла, пакуль не ўпадала ў другую, большую. Гэтая большая і перабівала грэбельку, што злучала Курані з Алешнікамі.

У канаве і ў балотах абапал грэблі, у шматлікіх затончыках вадзілася нямала дробнай рыбы.

Валодзька раптам забыўся пра нядаўні клопат, запаліўся новым:

— Хадзем на рыбу! К грэблі!

— Хадзем! — лёгка згадзіўся Хведзька. Ён адразу разважыў, што ісці на балота куды лепш, як бадзяцца, поўзаць па мокрым зарасніку.

Беражок канавы быў сухі, ад насыпанай калісьці зямлі крыху вышэйшы за іншую паверхню ўзболатку. Тут весела зелянеў па-веснавому маладзенькі муражок. У гэтым муражку і бегла ўсцяж канавы прамая, утаптаная сцежка, па якой цяпер хутка тупалі двое куранёўскіх прыяцеляў.

Каля аднаго куста, што кідаў на ціхую ваду зеленаваты цень, пастаялі некалькі хвілін, назіраючы за плотачкай, што нібы драмала ў зацішку.

— Во каб баўтуху! — пашкадаваў шэптам Валодзька.

Ён раптам затупацеў, шумнуў, і рыбінка ўміг знікла. Неўзабаве дайшлі да другой канавы, павярнулі берагам яе да няблізкай грэблі. Абодва ішлі ў гэтых мясцінах адны ўпершыню і адчувалі сябе нельга сказаць, каб вельмі ўпэўнена. Тут недалёка былі алешніцкія хаты, і лёгка маглі напаткацца самі малыя алешнікаўцы — напаткацца і надаваць у каршэнь. Такія падзеі былі не ў навіну каля Алешнікаў, як і — у дачыненні да алешніцкіх хлопцаў — каля Куранёў.

Ішлі таму з хуткасцю павялічанай, быццам хто-небудзь падганяў. Каб хутчэй дапасці да сваіх, збочылі на сцежку, што вяла напрасткі да балота. Хведзька часта соп, ледзь упраўляючыся за большым прыяцелем, час ад часу пераходзіў на дробны жарабячы трушок. Ён, аднак, не скар-

дзіўся, не прасіўся прыпыніцца. Абы хутчэй да ўзболатку, да сваіх.

Хмызняк ужо канчаўся, калі Валодзька спыніўся так рэзка, што Хведзька ткнуўся тварам у яго спіну. Яшчэ не разумеючы, што здарылася, чаго баяцца, ён збочыў услед за прыяцелем у кусты. Прысеў наўколенцах на траву, зморана аддыхваўся. Мяркуючы па Валодзькавым твары, устрывожаным і насцярожаным, яны ледзь не трапілі ў бяду, і гэтая бяда наперадзе, на сцежцы. Хто там, алешніцкія?

Хведзька асцярожна выглянуў з-за куста. Не, там былі не алешніцкія хлопцы, але тое, што ён убачыў, здзівіла і ўразіла так, як не ўразіў бы цэлы гурт алешніцкіх. Каля канавы стаяла двое незнаёмых. Адзін быў па-гарадскому апрануты, у пінжаку і ў кепцы, з сумкай цераз плячо. Другі, у зрэбным, трымаў нейкі брус.

Гарадскі ўздымаў на плечы нешта вельмі дзіўнае, проста незразумелае.

— А-а! — пачуўся неспадзеўкі поруч злавесны голас. Не ўправіўся Валодзька скочыць убок, як чыясьці моцная рука ўзяла яго за локаць, сціснула.— Куды?

Валодзька спалохана, зверавата азірнуўся. Страшны, нечаканы незнаёмец, па адзенні гарадскі, падобны да першага з тых двух, толькі без кепкі, вельмі весела, гарэзна смяяўся. Ні смех гэты, ні сам воблік чалавека, нязлосны нібы, добры, не супакоілі Валодзьку. Ён паспрабаваў вырвацца. Незнаёмы трымаў моцна.

— Ты што гэта нелюдзім такі? — зноў засмяяўся незнаёмы, здавалася, злавесным смехам.

З-за кустоў пачулася:

— З кім ты там, Паўлік?

— Звярка злавіў!.. Зайца!

Ён павёў Валодзьку да двух сваіх таварышаў.

Падышоўшы да іх, Валодзька заўважыў, што яны толькі што адпачывалі, падмацоўваліся і цяпер выкіроўвалі ў дарогу. Той, што трымаў на плячах дзіўную рэч, чарнявы, сутулы, спусціў яе зноў на зямлю, сказаў спачувальна:

— Напалохаўся хлапчына. Ахвота табе было палохаць яго,— як дзіця!..— Ён зірнуў на Валодзьку.— Ты адкуль? З Алешнікаў?

Валодзька адказаў не адразу, сабраўся з духам, наважыўся.

— Хто ты? Як зваць?

— Валодзька,— смялей адказаў ён. Пасля роздуму дадаў: — Дзяцел.

Той, што прывёў, Павел, зарагатаў:

— А я думаў — заяц! Пераблытаў звярка з птушкай!

Засмяяліся і іншыя. Павел, які дасюль ішоў босы, сеў на траву і пацягнуў да сябе вялікія боты з дзіўнымі даўжэзнымі халявамі. Гэтыя боты так зацікавілі хлопчыка, што ён, забыўшыся на свой стан і трывогу, толькі і глядзеў на іх, як на дзіўнае дзіва.

— Што, можа, табе надзець? — улавіў яго позірк чарнявы.

Валодзька заматаў галавою: не, ён у такім абутку з галавой схаваецца, хіба дзядзька не ведае гэтага? Павел жа, загарнуўшы цыгарку доўгімі пальцамі, выцягнуў тонкую, з кадыком, шыю, пусціў праз ноздры дым і сказаў, што ў гэтых вашых багнах і з такімі халявамі ногі вечна мокрыя. Валодзька на гэта шчыра сказаў, што лепш за ўсё басанож.

— Мы так і робім! — згадзіўся дзядзька, што паставіў ужо на зямлю незразумелую рэч. Валодзька заўважыў, што ён, як і Валодзька, стаіць босы, з падкасанымі штанамі. Ногі яго — худыя, з рудымі валасамі — былі памыты, але на іх яшчэ

трымаліся разводы ўедлівай твані. Штаны да самага пояса таксама афарбоўвала твань, плямы яе, падсохлыя, клеіліся да вышмальцаванага пінжачка з падкасанымі рукавамі. Твань сядзела крапінкамі і на зямлістым твары.

Усё гэта не здзівіла Валодзьку, яно было вельмі звычайным, рабіла гарадскіх з выгляду незнаёмцаў зразумелымі, свойскімі. Трэці ж, увесь у зрэбным, з такімі ж, як у Валодзькі, цурбалкамі-палачкамі замест гузікаў, быў зусім свой, можа, алешнікавец. Валодзька асмялеў. Ён ужо не баяўся незнаёмых і нават пра Хведзьку ўспомніў, паклікаў:

— Ідзі сюды! Не бойся!.. Свае!

Але Хведзька не адгукаўся. «Уцёк, значыцца»,— рашыў Валодзька. Ён больш не думаў пра сябра, аддаўся ўвесь блізкім цікавым праявам. Калі Павел устаў, чарнявы дзядзька, якога ён звaў Сцяпанам Іванавічам, узняў на сутулыя плечы дзівосную прыладу, аб'явіў:

— Што ж, рушылі?..

Ён нічога не сказаў да Валодзькі — ісці з імі ці не ісці,— і Валодзька на момант задумаўся. Але яшчэ да таго, як развагі зрабілі вывад, ногі яго нібы павяло за людзьмі.

Праз дзесяткі паўтара крокаў, каля ўваткнутай у мокрую траву на багністым беразе галінкі-меткі, Сцяпан Іванавіч зняў сваю прыладу, расставіў ёй ножкі, а чалавек з размаляваным брусам і дзядзька Павел сталі перабірацца на другі бок. З таго боку пайшлі далей, цягнучы тонкую жалезную стужку, адмяраючы адлегласць.

Хмызнячок тут быў рэдкі і нізкаслы, і нават Валодзьку быў добра відаць над ім верх размаляванага бруска, на які дзядзька Сцяпан наводзіў трубачку сваёй прылады. Паглядзеўшы, ён выняў з сумкі заплямлены сшытак і штосьці напісаў.

— А, дзяцел? — заўважэў ён Валодзьку.— Памагаць рашыў?

Валодзька ўгукнуў, і дзядзька Сцяпан сказаў, што гэта вельмі добра, што памочнікі ім патрэбны. Валодзьку страх як захацелася зазірнуць у таямнічую трубачку, паглядзець, што ж там, якія цуды бачыць у ёй дзядзька. Але прасіць ён не наважыўся, а Сцяпан Іванавіч сам здагадацца пра гэта не даўмеўся.

Узняўшы на плечы прыладу, дзядзька Сцяпан палез у твань, у той бок, дзе ўжо былі іншыя. Ішоў ён цяжка, сутулячыся пад сваёй, відаць нялёгкай, ношай, багна моцна трымала валасатыя ногі і выпускала неахвотна, незадаволена хлюпаючы. Валодзька ішоў за ім, як зачараваны.

— Вот, брат дзяцел,— дабрадушна гаварыў дзядзька, расстаўляючы зноў сваю трыногу,— несалодкая гэта справа — дыбаць па вашай багнюцы... Але нічога, трэба!.. Загад такі!..

— А што ето вы робіце? — не ўтрываў нарэшце Валодзька.

— Што, кажаш? Пакуль нічога... Справа потым будзе...— ён зрабіў націск на «потым».— Гэта — так...

Ён маўчаў, глядзеў у сваю трубачку, расставіўшы худыя ногі. Калі даставаў сшытак, заўважыў, якімі вачыма глядзеў Валодзька на прыладу, сказаў:

— Ну што, паглядзі, калі ўжо рашыў памагаць.

Валодзька аж затаіў дух, становячыся на цыпкі, каб дастаць да трубачкі. Яна была высакавата, але і тое, што куранёўскі хлопчык убачыў у гэты момант, здалося яму незвычайна важным, асаблівым. Ён убачыў, і да таго ж кепска, ледзь дацягваючыся да трубкі, яркую купку куста, брусок, нейкія незразумелыя рыскі. Кусты былі вельмі блізка, быццам перад самымі вачыма, і гэта разам

з такімі загадкавымі рыскамі, са знакамі на бруску проста ашаламіла яго. Яму здавалася, нібы ён загляну ў не проста ў трубачку, а ў нейкі зусім інакшы свет, нічым не падобны да ўсяго таго, што ён дасюль ведаў. Ён нібы зазірнуў за мяжу, за якой пачыналіся дзівы і цуды. Гэты нязведаны свет адразу запаланіў яго...

Момант, што мільгануў перад ім цяпер, урэзаўся яму ў памяць на многія, многія гады. Усё жыццё потым не раз успамінаў ён гэты момант, з якога пачыналася, можа, самае галоўнае ў яго жыцці...

Дзядзька Сцяпан згарнуў сшытак і, не заўважаючы, што робіцца з хлопчыкам у зрэбным, сказаў абыякава:

— Што ж, брат дзяцел, далей рушым?

1956

ПІМЕН ПАНЧАНКА

Народны паэт Беларусі
(нарадзіўся ў 1917 г.)

Я ЎНУКА ВЯДУ Ў МАЎЗАЛЕЙ

З высокай нязменнай любоўю
Між добрых надзейных людзей
Да Леніна крочу ізноў я
І ўнука вяду ў Маўзалей.

Яго павучаць не хачу я,
А проста вяду к Ілычу.
Убачыць — і сэрцам адчуе
Усё, што і сам я адчуў.

Няма тут на плошчы галоўных,
Няма паміж нас радавых —
Спакойная годнасць і роўнасць
І сэрца адно на усіх.

Запомні, унук мой, да скону:
Тут сонцу заўжды палымнець
На гэтым граніце чырвоным,
На гэтай чырвонай сцяне.

А варта падцягнута строга,
А сонца гарыць над Масквой,
І чыстае сэрца малога
Стукоча ў далоні маёй.

Да ўсіх дакранулася вечнасць,
Чысцейшымі сталі усе.

І горкую гэту сустрэчу,
І светлую гэту сустрэчу
Унук праз жыццё пранясе.

Бо той, хто тут раз пабывае,
Журботнай ракой праплыве,
Адгэтуль жыццё пачынае
І з Леніным вечна жыве.

1981

САЛОДКАЯ ЛЯЧЭБНІЦА

Як толькі за Оршай
Направа павернеш —
Прыедзеш у вёску
Пад назвай Цукерня.

Бабулі ласкавыя
Добра там лечаць
Дзяцей, што цукеркамі
Зубы калечаць.

Тут мыюцца толькі
Салодкай вадою,
І весела ўсім
За салодкай ядою.

З вішнёвым варэннем
Тут вараць ірыскі,
Густы мармелад
Наліваюць у міскі.

На сонечным мёдзе
Пірожныя смажаць.

Гузы, сінякі
Тут марожаным мажуць.

З лугоў навакольных
Злятаюцца пчолы
І робяць ласунчыкам
Дзесяць уколаў...

Ды хутка ўсе дзеці
Пытаюць трывожна:
— Ізноўку цукеркі?
— Не хочам пірожных!

Ні хлеба, ні мяса,
Ні кроплі гарчыцы.
Як цяжка лячыцца —
Цяжэй, чым вучыцца.

І плачуць, і просяць
Ласкавых бабулек:
— Ах, дайце, бабулі,
Хутчэй нам цыбулі!

Нам хочацца хлеба,
І супу, і кашы:
Прайшла ўжо хвароба
Салодкая наша.

1967

ДЗЕЦІ НАД ВОЗЕРАМ

Гуляюць дзеці каля возера,
А неба з сонцам — у вадзе.
Дзяцей шматвопытныя позіркі
Заваражыў пагодны дзень.

Яны прыехалі ўсе з горада
І ўпершыню пад птушак спеў
Накінуліся, нібы з голаду,
На дзіўны свет і траў і дрэў.

Тут столькі нечаканай радасці:
Расінка — сіні аганёк,
Асколачкам вясновай радугі
На сонцы блісне акунёк.

Па-над гладышыкамі лотаці,
Над жоўтым кветкавым кастром —
Стракозы, быццам верталёцікі:
Ім кожны ліст — аэрадром.

Вось дзьмухне вецер — і вяршаліны
Асін паціху закіпяць...
Ляснік з суседняе імшарыны
Сюды каня прывёў купаць.

І захапленне плешча голасна:
Якая грыва, патрымай!
Праехацца б, ды крыху боязна:
Табе, брат, гэта не трамвай.

Як гэткі конь імчаў Будзённага!
Як бліскаў срэбраны клінок!..
Ім тэлевізар — абыдзёншчына,
Прасцей глытка вады — кіно.

Амаль з калыскі дакранаецца
Да цудаў веку гэты люд.
А век не мае часу раіцца,
Дзе сёння цуд, а дзе не цуд.

А мы раслі пад песні жніўныя,
З бярозавіку пілі квас.

І першы трактар — дзіва дзіўнае —
На ўсё жыццё уразіў нас.

Я не збянтэжан той адноснасцю,
Змяшчэннем поглядаў і дзіў.
Адно хачу, каб сіняй роснасцю
Наш добры век часцей хадзіў.

Быць гэтым дзецям у палёце!
І ў цішыні касмічных трас
Стракозы, быццам верталёцікі,
Ім прыгадаюцца не раз.

1963

ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ

На гранітнай трыбуне — бяссмертны Ільіч,
Так стаяў у дваццатым ён перад байцамі...
Сэрца, сёння мінулыя годы пакліч,
Што прайшлі пад яго баявымі сцягамі.

Родны Ленін!
Як дораг мне воблік яго,
За усіх ён бліжэй...
Я з таго пакалення,
Над калыскай чыёй з першых дзён,
з першых год
Клапатліва схіляўся з усмешкаю Ленін.

У той дзень, калі я ўпершыню павязаў
Гальштук юнага ленінца, яркі, барвовы,
Я на плошчу прыйшоў і, здалося, сказаў
Мне Ільіч: — Будзь гатоў!
— Я заўсёды гатовы!

Камсамольцам на фронт ў сорак першым
ішоў,
Зняў пілотку ля помніка з думай суровай.
І пытаўся Ільіч: — Бараніць ты гатоў
Дарагую Радзіму?
— Заўсёды гатовы!

Камуністам вярнуўся з вайны я дамоў,
Мінск убачыў разбіты ушчэнт, да асновы.
Пакланіцца прыйшоў Ільічу.
— Ты гатоў
Будаваць родны горад?
— Заўсёды гатовы!

Камуністы ўпустую прысяг не даюць —
Ты і я, мы усе.
Паглядзі, правадыр наш,
На узнятую к сонцу сталіцу маю,
На шчаслівы народ наш, адважны і мірны.

Мы са шляху твайго не сышлі ні на крок,
Нас на подзвіг працоўны вяло тваё слова.
І не страшна, што недзе згушчаецца змрок,
Наш дэвіз і сягоння:
— Заўсёды гатовы!

1954

МАКСІМ ТАНК

Народны паэт Беларусі
(нарадзіўся ў 1912 г.)

ПІЯНЕРСКІ ГАЛЬШТУК

Мой гальштук чырвоны, бо ў шоўку яго
Зары незгасальнай палае агонь.
Зары той, што Ленін на шчасце нам даў,
У слаўны Кастрычнік над светам узняў.
Мой гальштук чырвоны, бо ззяюць на ім
Крамлёўскія зоры праменнем сваім
І сонцам кладзецца святло на яго
Ад сэрца Радзімы, ад сцяга майго.
Мой гальштук чырвоны, бо вытканы ён
Для славы юнацкай, для радасных дзён,
Для дружбы і песень, праслаўляў і хваль,
Для смелых палётаў да сонца, удаль.

1947

ІГРАЙ, ГАРНІСТ

Іграй, гарніст! Іграй штодзённа!
Пад звонкі гук трубы тваёй
Край прачынаецца, гамоніць,
Зара палае над зямлёй.
Юнацкі лагер ажывае,
І, быццам агнякрылы птах,
На мачту высака ўзлятае
Чырвоны піянерскі сцяг.
Чакаюць нас вяршыні, горы,

Каб мы паліць кастры ішлі,
А нашы рэкі і азёры,—
Каб мы свой ветразь узнялі.
Чакаюць нас лясы, даліны,
Каб рэха песень перадаць,
Шляхі бясконцыя краіны,—
Каб весці ў сонечную даль.
Каб весці ўдаль вясёлых, дружных,
Каб кожны з нас свой край пазнаў,
Каб вецер твары нам асмужыў
І з намі песні запяваў.
Іграй, гарніст! Іграй штодзённа!
Няхай пад звон трубы тваёй
Край прачынаецца, гамоніць,
Палае сонца над зямлёй.

1948

ЕХАЎ КАЗАЧНІК БАЙ

— Ехаў казачнік Бай
Цераз сёлы і гай.
Баіць ці не?
— Бай!

— Ён пытаўся ў мяне,
Што даць дзецям у сне?
Баіць ці не?
— Бай!

— Я прасіў: дзецям дай
Казку-песеньку, Бай!
Баіць ці не?
— Бай!

— Казку,— кажа,— я дам,
Толькі выберу сам.—

Баіць ці не?
— Бай!

— А найлепшую з іх
Дам для самых малых.—
Баіць ці не?
— Бай!

— Тым, хто любіць мяне
І хто першы засне.—
Баіць ці не?
— Не!

1952

ГАЛІНКА І ВЕРАБЕЙ

— Галінка-вярбінка,—
Прасіў верабей,—
Мо пакалыхала б
Маіх ты дзяцей?

Галінка не хоча
Дзяцей калыхаць.
— Ідзіце, казулі,
Галінку ламаць!

Казулі не хочуць.
— Ідзіце, ваўкі,
Лавіці, караці
Казуляў такіх,
Якія не хочуць
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць.

Ваўкі не схацелі.
— Прыходзьце, стральцы,

Каб непаслухмяных
Ваўкоў правучыць,
Якія не хочуць
Казуляў караць,
Якія ляняцца
Галінку ламаць,
Якая не хоча дзяцей калыхаць...

Пайшлі паляўнічыя
Ў лес на ваўкоў:
Спалохана зверы
Пабеглі з дуброў,
Пабеглі казуляў
Лавіць і караць;
Казулі пабеглі
Галінку ламаць,
Галінка ж вярбінка
Са страху хутчэй
Давай калыхаць
Вераб'іных дзяцей.

З тых дзён без спачынку,
Каб кожны быў рад,
Калыша галінка
Малых птушанят.

1945

ЖУК І СЛІМАК

Пагожым летнім ранкам
На лузе за сялом
Сустрэўся жук аднойчы
З рагатым слімаком.

— Здарова! — жук вітае.—
Куды, браток, ідзеш

І з ракавіны хатку
Нашто з сабой нясеш?

Абцёр слімак пот з твару,
Гаворыць так жуку:
— Нямала перажыць мне
Прыйшлося на вяку.

То сцюжа, то марозы,
То навальніца, дождж,
То, часам, у дарозе
Захопіць змрок і ноч.

Шукай тады начлегу
Пад нейкім пад кустом...—
Вядуць размову гэтак
І раптам чуюць — гром.

Ударыў дождж краплісты.
І жук пабег шукаць
У засені цяністай
Шырокага лістка.

Але на цэлым лузе
Няма страхі нідзе,
І мокры, ледзь жывы, ён
Да слімака ідзе.

— Пусці, браток, пагрэцца,
Змок дужа на лугу,
Насіць за гэта хатку
Табе дапамагу.

У ракавіне шчыльнай
Вандроўнікі сядзяць.
Іх нават дождж краплісты
Не зможа ў ёй дастаць.

Але мінулі хмары,
І сонца ўстала зноў.
Жук хатку слімакову
Пакінуў і пайшоў.

Забыўся пра нягоды
І не наўме жуку,
Што абяцаў паднесці
Ён хату слімаку.

1950

ІВАН ШАМЯКІН

Народны пісьменнік Беларусі
(нарадзіўся ў 1921 г.)



МАТРОС З «АЛЕГА»

Паднялі нас па сігналу баявой трывогі. Хоць час быў неспакойны — на Доне, на Волзе ўзнімалася контррэвалюцыя, а побач, у Фінскім заліве, нахабна плавалі немцы, паказвалі сваю сілу,— крэйсер наш даўно ўжо не выходзіў у адкрытае мора, стаяў на Кранштацкім рэйдзе, а таму мы, матросы, кажучы па-простаму, троху разленаваліся. Не верылі ў марскі бой. Англійскія буржуі ў заліў не пасунуцца: пабаяцца нас і немцаў.

Тыя з братвы, каму не па нутру была стаянка на якары, запісваліся ў сухапутныя атрады, каб пайсці на фронт.

Права выбіраць камандзірамі сваіх жа матросаў не магло не адбіцца на флоцкай дысцыпліне. Некаторыя лічылі, што галоўнае — разбурыць усё старое, што напрыдумлялі паны афіцэры, а тады, маўляў, нам мора па калені, тады адразу запалім пажар сусветнай рэвалюцыі.

Але трывожныя ўдары карабельнага звону, ад якіх пачалі адвыкаць, падхапілі людзей у адзін міг. Ніхто не ішоў у развалку — ляцелі так, што ад тупату ног па жалезных лесвіцах гудзеў бранявы корпус крэйсера. Гул гэты электрычным токам біў у сэрца, калі я, пераскокваючы цераз пяць усходцаў, узбіраўся ў артылерыйскую вежу.

Што здарылася? Чаму трывога? Адкуль наступае вораг?

Я камандаваў насавой вежай буйнога калібру, да рэвалюцыі на гэтай пасадзе лейтэнант быў.

Далажылі аб гатоўнасці гармат к бою. Але куды страляць, калі карабель мёртва стаіць на якары? Няўжо вораг падышоў да Кранштата? Чаму ж маўчаць машыны? Чаму не выходзім у мора? З такімі пытаннямі наступалі на мяне матросы. Але я ведаў столькі ж, колькі і яны.

Ды прагучалі яшчэ больш незразумелыя каманды: адбой баявой трывогі і адразу ж — сігнал пастраення на верхняй палубе, чаго, між іншым, таксама даўно не было, бо такое пастраенне лічылі афіцэрскай выдумкай і на мітынгі збіраліся проста так — па сігналу сэрцаў, па клічу камісараў.

Аднак у той дзень ніхто слова не прамовіў пра «аднаўленне старых парадкаў». Пастроіліся хутчэй, чым да рэвалюцыі, калі была палачная дысцыпліна, можа, нават хутчэй, чым год назад, у верасні семнаццатага, калі рускія караблі пайшлі ў Рыжскі заліў, да Маанзундскіх астравоў, насустрач нямецкаму флоту. Тады матросы не бранёй, а грудзьмі сваімі перагарадзілі кайзеру дарогу на рэвалюцыйны Петраград.

Няўжо зноў немцы? Ці, можа, паднялі паўстанне недабітыя буржуі, тут, у Петраградзе, каб падтрымаць контррэвалюцыю на Волзе?

Каманда крэйсера ў той час была няпоўная: пайшлі атрады на фронт, неслі каравульную службу ў Піцеры. Чалавек чатырыста застыла ў шарэнгах на палубе, гатовыя на бой і на смерць. Ніводнага слова. Толькі вочы, позіркі выдавалі нецярплівасць: што здарылася? Кажы хутчэй, камісар!

Камандзір крэйсера, камісар, члены судавога камітэта і чалавек у цывільным — пэўна, ён прывёз трывожную навіну! — стаялі перад строем,

каля парэнчаў, такія ж засяроджаныя, але не пабаявому напружаныя, а як бы прыбітыя бядой, горам.

Гаварыць пачаў камісар. Голас, заўжды спакойны, перарываўся, быццам у твар яму біў дзевяцібальны вецер і чалавек захлынаўся ад гэтага ветру.

— Таварышы матросы! Браткі! — так ніколі раней ён не звяртаўся, бо прыйшоў на крэйсер з завода.

Такі зварот яшчэ больш насцярожыў нас.

— Сусветная буржуазія, унутраная контррэвалюцыя, каледзінцы, аляксееўцы, белачэхі ды іншая контра хацелі нанесці ўдар у самае сэрца нашай рэвалюцыі, у самае сэрца працоўнага народа Савецкай Расіі. Учора яны ўзнялі сваю злачынную руку...— тут камісар зноў як бы захлынуўся.

— На Леніна? — вырвалася ў мяне.

Строй калыхнуўся, парушыў роўнасць шарэнгі. Цяпер ужо да мяне быццам здалёк, праз свіст ветру і грукат буры, даляцеў камісараў голас:

— Але. На таварыша Леніна. На Уладзіміра Ільіча... правадыра сусветнай рэвалюцыі.

— Не цягні, камісар. Скажы: жывы? — крыкнуў нехта з матросаў.

Ступіў ад парэнчаў цывільны, узняў руку, просячы ўвагі:

— Жывы таварыш Ленін! Жывы!

Як з адных грудзей, вырваўся ўздых. Паламаная шарэнга пачала выпрамляцца, быццам па камандзе «смірна!». Не было такой каманды, але яе дало сэрца кожнага.

Гэта было не звычайнае паведамленне, няхай нават самае трывожнае, як, напрыклад, нядаўнія — пра эсэраўскі мяцеж у Маскве і бунт чэха-славацкага корпуса. Гэта было такое, што не про-

ста кранула сэрцы, а ўдарыла ў іх, як самы нечаканы і магутны — не на адзін карабель — на ўвесь свет! — сігнал баявой трывогі.

Гаварыў цывільны, пасля зноў — наш камісар чытаў афіцыйнае паведамленне ЦВК. Змова контррэвалюцыянераў шырокая: пра забойства Урыцкага мы пачулі яшчэ ўчора ўвечары. Караблі салютавалі на смерць старшыні Петраградскай ЧК жалобнымі гудкамі. У змроку жнівеньскага вечара тут, на палубе, праводзілі мітынг.

Цяпер гэтыя падзеі звязваліся ў адзін ланцуг. Я стаяў у шарэнзе, слухаў камісара і ў думках сплятаў звенні гэтага ланцуга, прыгадваючы многія падзеі таго першага года рэвалюцыі. Перш за ўсё ўспомніўся адзін вельмі памятны мне дзень.

Роўна восем месяцаў назад я нёс службу ў каравульнай камандзе пры Смольным. І была ў мяне мара: трапіць як-небудзь вартавым на пост, які мы ў думках, у размовах паміж сабой называлі галоўным — каля кабінета Старшыні Саўнаркома Леніна. Хацелася мне ўбачыць правадыра зблізку, сустрэцца, як кажуць, тварам у твар, можа, нават пагутарыць. А хто тады не марыў пагутарыць з Леніным! Расказвалі тыя, хто стаяў на гэтым пасту, што Ленін заўсёды знаёміўся з кожным новым вартавым, вітаўся і гутарыў. Я ж да таго бачыў Леніна толькі здалёк — слухаў выступленне ў Марыінскім палацы і аднойчы з акна Смольнага ўбачыў, як Ленін садзіўся ў аўтамабіль. Але трапіць на ўнутраны пост ніяк не шанцавала ні мне, ні маім сябрам. Там стаялі чырвонагвардзейцы. Нам, матросам, даручалі знешнюю ахову Смольнага, а таксама тэлефоннай станцыі, тэлеграфа. Хто-ніхто выказваў крыўду, што, маўляў, нам не вельмі давяраюць пасля анархісцкага бунту ў другім флоцкім экіпажы. Але я так не думаў. Хіба меншая адказнасць ахоўваць увесь

будынак, дзе размяшчаўся Савецкі ўрад? А тэлефон, тэлеграф, праз якія ўрад, Ленін звязваюцца з усёй Расіяй? Толькі непісьменны які пехацінец мог не разумець гэтага, а я меў чатыры класы прыходскай школы і тры гады служыў на флоце.

Я не траціў надзеі, што калі-небудзь стану такі на той пост і... сустрэнуся з Леніным.

Пасля абеду на Новы год я пайшоў каравульным да цэнтральнага пад'езда. Гэта быў цікавы пост, час тут праходзіў хутка, бо вартавых было два, і яны не стаялі без справы: людзей праходзіла мноства, самых розных — правяраеш пропускі, прыглядваешся да наведвальнікаў, перакідваешся словамі з імі і не заўважаеш, як ляціць час. У той дзень я стаяў з чырвонагвардзейцам пуцілаўскага завода, гэткім жа, як я, маладым і гаваркім хлопцам. Між іншым, можа, таму, што па старым звычаі петраградцы адзначалі Новы год, наведвальнікаў было менш, чым звычайна. Але ў Смольным усе працавалі, усе наркаматы.

На парадны ганак выйшлі камендант будынка і начальнік усяго смольненскага каравула. Начальнік сказаў нам:

— Трымайце, хлопцы, насы вышэй. Зараз будзем прымаць усю сусветную буржуазію.

Мы ведалі, што камандзір наш — чалавек вясёлы, і засмяяліся з яго жарту.

— Глядзі — не вераць. Не хочуць мець ніякіх спраў з буржуазіяй,— таксама смеючыся, сказаў ён каменданту і зноў да нас: — Пропускаў у буржуяў не будзе, мы з таварышам камендантам іх правядзём.

Тут я зразумеў, што чакаецца нешта цікавае і загадкавае. Сапраўды, хвілін праз колькі да Смольнага адзін за адным пачалі пад'язджаць чорныя аўтамабілі са сцяжкамі. Штук дваццаць падышло. Я ведаў сцягі дзяржаў — вучылі на

караблі, убачыў на першай машыне амерыканскі, на другой — французскі, далей — англійскі, шведскі... і адразу сцяміў, што гэта — паслы. Але што ім спатрэбілася, калі я ведаў з газет, з палітычных дакладаў, што дзяржавы тыя не прызналі Савецкую ўладу?

З аўтамабіляў вылазілі паважныя паны ў багатых футрах. Сабраліся ў чараду, як тыя ваўкі ў піліпаўку, нешта забалбаталі па-свойму.

Усе наркомы віталіся з вартавымі. Гэтыя ж паны прайшлі, нават не глянуўшы на нас. Але затое я добра абмацаў вачамі кожнага з іх. Футры іх не падабаліся мне. Пад такімі сабалямі не толькі рэвальвер — кулямёт можна схаваць. Мой напарнік-чырвонагвардзеец спытаў, калі за панамі зачыніліся дзверы:

— Хто гэта?

— Паслы.

— Што ім трэба?

— Чорт іх ведае.

— Можа, прыехалі павіншаваць таварыша Леніна з Новым годам?

Я засмяяўся: наіўны хлопец, захацеў ад буржуяў такой далікатнасці!

Паны выйшлі назад не такія паважныя, нават некаторыя футры не зашпілілі, былі ўзбуджаныя, гаманілі гучна, нібы спрачаліся паміж сабой. З камендантам і начальнікам каравула, якія праводзілі іх, не развіталіся.

«Культура!» — плюнуў я ўслед машынам. Спытаў у камандзіра, што буржуям трэба было.

— Чулі, што румыны акружылі нашы войскі, арыштавалі рэўком фронту, забілі камісара? У адказ на гэта Ленін загадаў арыштаваць і пасадзіць у Петрапаўлаўку румынскага пасла. Дык вось гэтыя прыязджалі прасіць Леніна, каб вызваліў румына.



Мастак А. ВОЛКАЎ

М. Лынькоў «Міколка-паравоз»



Мастак А. ДЗЯМАРЫН

І. Шамякін «Флагі над штыкамі»

— А дулю не хацелі? — абурыўся чырвонагвардзеец.— Усіх бы іх, гадаў, пасадзіць! Ведалі б, як страляць у салдат!..

Начальнік каравула засмяяўся:

— Не быць табе, Пятро, дыпламатам. А я хацеў парэкамендаваць цябе паслом у каралеўства дацкае.

Пасля змены я прылёг на падлозе ў каравульным пакоі і задрамаў — намёрзся на пасту.

Разбудзіў крык дзяжурнага: «Трывога!» Што здарылася? Растлумачыў камандзір нашай флоцкай каравульнай каманды: адбылося пакушэнне на таварыша Леніна.

І вось гэтак жа, як тут, на караблі, спыталі тады матросы: «Жывы?» І гэтак жа ўздыхнулі, калі даведаліся, што кулі не кранулі правадыра.

Я адразу падумаў пра паслоў: яны! Сказаў пра гэта сябрам, тыя згадзіліся, што недарэмна яны прыязджалі ўсёй бандай; папрасіць за румына мог бы прыехаць адзін. Нават пасля таго, як даведаліся, што ў машыну стралялі на вуліцы, калі Ленін вяртаўся з мітынгу, я ўсё адно быў пераканаы, што такое подлае злачынства рабілася не без удзелу паслоў. Таму і прыехалі: паглядзець на Леніна жывога, бо ведалі, што ў той дзень яго заб'юць.

Каравул паднялі па трывозе, каб узмацніць варту вакол Смольнага і ў самім будынку, бо невядома было, што яшчэ рыхтуюць змоўшчыкі.

Бывае ж шчасце, калі яго зусім не чакаеш. На маю долю выпала самае ганаровае ў тую ноч — тое, пра што я доўга марыў. Мне і майму сябру Амяльяну Гайдаенку камандзір загадаў патруляваць у калідоры таго крыла, дзе размяшчаўся 81-шы пакой — кабінет Старшыні Саўнаркома. Каб у выпадку чаго тут жа, уміг, памагчы вартавым, якія стаялі каля кабінета. Больш таго — за-

гадаў: калі Ленін пойдзе да сябе, на кватэру, спусціцца следам за ім і гэтак жа патруляваць на другім паверсе, правяраць ва ўсіх пропускі.

Як на крыллях, узляцелі мы з сябрам на трэці паверх. І там... разгубіліся. У калідоры, перад пакоямі Саўнаркома, тоўпіліся людзі. Многа людзей. Праўда, некаторых з іх мы ведалі ў твар — работнікі наркаматаў. Але ў такім натоўпе і вораг можа схавацца. Як жа нам паводзіць сябе? У каго правяраць пропускі? Нам уяўлялася, што тут пуста, а хто з'явіцца — з таго мы не спусцім вока. Ажно каля кабінета Леніна трохі што не мітынг.

Мы з Амяльянам уціснуліся ў гэты натоўп і тут даведаліся падрабязнасці: у машыну стралялі на мосце цераз Фантанку. Побач з Леніным сядзеў швейцарскі камуніст, пасля першага стрэлу ён нахіліў галаву Уладзіміра Ільіча, і куля прабіла Платэну палец рукі. На паўвяршка ніжэй... Нехта сказаў пра гэта — і ўсе прыціхлі. А ў мяне халодны пот выступіў. З галавы ўсё яшчэ не выходзілі паслы. Хацеў сказаць пра іх гэтым людзям — не адважыўся: побач стаялі вядомыя бальшавікі, якіх я слухаў на мітынгах.

Падышоў задыханы стары, відаць, бягом узбіраўся па лесвіцы. Спытаў з ходу:

— Дзе Ільіч?

— Вядзе Саўнарком, — адказала жанчына.

— Вядзе Саўнарком? — здзівіўся і ўзрадаваўся, уздыхнуў лёгка, выхапіў з кішэні хустачку, прылажыў да вачэй, пасля ўсміхнуўся ўсім: — Пазнаю, пазнаю. Нішто яго не можа выбіць з каляіі. Нішто! Такі Ленін!

Тады і да мяне дайшоў сэнс радасці і гонару старога бальшавіка. Але, такі ён, наш Ленін! Толькі што ў яго стралялі, а ён спакойна кіруе пасяджэннем першага ў свеце ўрада рабочых і сялян.

Падумаў я пра гэта і адразу адчуў упэўненасць, быццам пасля марской качкі ступіў на цвёрдую зямлю. Праўда, трывога, павышаная пільнасць засталіся. Але ворага сярод людзей, што сабраліся перад кабінетам Леніна, я больш не шукаў. Паверыў: не можа яго быць тут. Не адважыцца такі падлюга падняцца ў баявую рубку. Такія страляюць з-за вугла.

Патроху людзі пачалі разыходзіцца, і наш каравульны абавязак стаў больш пэўны — такі, як мелі яго на ўвазе людзі, што на ўсялякі выпадак узмацнілі ў тую ноч варту.

Саўнарком засядаў позна, гадзін да адзінаццаці. Але і пасля таго, як наркомы разышліся, Ленін доўга яшчэ не выходзіў. Я нават спалохаўся, што прапусціў, як ён выйшаў. Але чырвонагвардзеец, які стаяў каля дзвярэй, на маё запытанне позіркам: «Там?» — гэтак жа без слоў адказаў: «Там».

Не ведаю чаму, але мне так хацелася ў той вечар сустрэцца з Ільічом, нібы ад сустрэчы той залежала маё жыццё, мой лёс. Я хваляваўся, як дзяўчына: хадзіў па калідоры і не крокі свае чуў, а грукат сэрца.

Ленін выйшаў з кабінета апоўначы з дзвюма жанчынамі. (Пасля я даведаўся: з сястрой Марыяй Ільінічнай і сакратаром, якая вяла пратакол.)

Мы чакалі яго, аднак усё адно былі захоплены знянацку.

Ленін ішоў да нас, і мы з Гайдаенкам прыціснуліся да сцен калідора, адзін насупраць аднаго, сталі ва фронт, хоць адчувалі недарэчнасць такога пастраення. Мелі ж загад патруляваць непрыкметна. І вось на табе!

Уладзімір Ільіч прывітаўся:

— Добры вечар, таварышы,— і раптам спы-

ніўся, агледзеў нас, напэўна, зразумеўшы, з якой прычыны мы стаім, нахмурыўся, спытаў: — Вас паставілі тут?

Я разгубіўся. Што адказаць? Ніякіх інструкцый на гэты конт нам не далі.

Сябар мой Гайдаенка выявіў большы спрыт і знаходлівасць:

— Не, таварыш Ленін. Правяраем каравулы.

— Каравулы на месцы?

— Так точна!

— Можна спакойна спаць? — вочы ў Леніна весела бліснулі: усё разумеючы, ён жартаваў.

— Так точна. Можна.

— Ідзіце спаць, таварышы. Позна ўжо. Добрай ночы,— і працягнуў руку Гайдаенку, пасля — мне.

Тады я падумаў, што Ленін не ваенны чалавек і не ведае, што зняць вартавых мае права толькі начальнік каравула.

Ашаломленыя, мы доўга стаялі моўчкі, і сябар мой гэтак жа, як і я, прыціскаў правую руку да грудзей, пэўна, жадаючы зберагчы назаўсёды поціск ленінскай далоні.

Усё гэта я ўспомніў, пакуль гаварыў камісар крэйсера. У вачах маіх стаяў жывы Ленін, усміхаўся, ціснуў руку.

Можа, пра тое, што я сустракаўся з правадыром і ў сэрцы жыла цеплыня яго рукі, мне, магчыма, цяжэй, чым іншым матросам, было пагадзіцца з думкай, што Ленін паранены, што жыццё яго пад пагрозай.

Ускалыхнулі камісаравы словы аб тым, што на тэрор белых мы адкажам нашым чырвоным тэрорам супраць контррэвалюцыі.

Калі спыталі, хто хоча сказаць, я першы выйшаў са строю. І сказаў вельмі коратка:

— Таварышы матросы! Прапаную паслаць ад нашага крэйсера каманду для аховы правадыра

сусветнай рэвалюцыі таварыша Леніна — Ульянава Уладзіміра Ільіча!

Чатырыста чалавек грымнулі ў адзін голас:

— Правільна! Паслаць!

Трохі разгублены ад такой прапановы, камісар паспрабаваў тлумачыць, што ў Леніна ёсць надзейная ахова, што пасылку каманды з баявога карабля, калі ніхто яе не просіць і не чакае, у Маскве не зразумеюць. Але камісару не давалі гаварыць.

— Якая там надзейная!

— Пяхтура сонная.

— Наш брат, матрос, грудзьмі загарадзіў бы таварыша Леніна.

— Галасуй, камісар!

— Без галасавання ясна!

— Начальнікам каманды назначыць Данілу Сураўца.

— Мяне, значыцца.

Супраць мяне ніхто не запярэчыў. А ўсю каманду доўга падбіралі. Каб паехала дванаццаць самых лепшых, самых адданых рэвалюцыі матросаў, перабралі, можа, сотню прозвішчаў.

Выехаць не проста было. Спрабаваў затрымаць рэўком флоту, нават камісар іх прыехаў на крэйсер, але адступіў перад воляй народа — адзінадушнасцю каманды. Ніякія тлумачэнні яго не памаглі. Спрабаваў прычапіцца да нас камендант Мікалаеўскага вакзала, калі мы садзіліся ў цягнік. Але быў ён з матросаў, і мы пагутарылі з ім па-флоцку. Зразумеў. У дарозе ўсе правяральшчыкі пачціва змаўкалі, калі даведваліся, куды і з якой задачай едуць матросы.

Да Крамлёўскіх варот мы падышлі ў страі, ажно брук гудзеў пад ударамі падкаваных матроскіх ботаў.

Хваляваўся я — на мне ж уся адказнасць. На-

ват баяўся трохі. Але па наіўнасці сваёй думаў, што без затрымкі парадным крокам уступім мы ў Крэмль і адразу ж станем там галоўнай аховай. Ва ўсялякім разе, сустрэнуць нас з радасцю і ўдзячнасцю.

Праўда, перад веліччу Крамля (упершыню ўбачыў яго), перад вышынёй сцяны чырвонай баявы настрой мой упаў. Адчуў я, што не ўсё так проста. Не адны мы, матросы, робім рэвалюцыю і гатовыя грудзьмі сваімі засланіць правадыра ад варожых куль.

Каманда мая «рассыпала гарох» і збілася ў чараду, калі ў праёме варот з'явілася постаць чырвонагвардзейца. Ён рашуча загароджваў нам дарогу. Я загадаў сваім спыніцца і, усё яшчэ адчуваючы знявагу да пяхоты, якая не здолела ўберагчы Ільіча, рашуча патрабаваў:

— Мядуза, выклікай начальніка каравула.

Мабыць, вартавы здалёк убачыў нас і загадзя паклікаў каго трэба. Не прайшло і дзвюх мінут, як з'явіўся цывільны, у скуранцы, з маўзерам пры баку, а з ім — два чырвонаармейцы.

Я адразу сцяміў, што з гэтым чалавекам трэба гаварыць інакш, чым з вартавым, і адрапартаваў па форме:

— Каманда з крэйсера «Алег» прыбыла для аховы Старшыні Савета Народных Камісараў таварыша Леніна. Камандзір атрада матрос Суравец.

Чалавек ледзь прыкметна ўсміхнуўся і заклапочана пашкроб патыліцу, ссунуўшы скураную фуражку на лоб.

— Давай, таварыш Суравец, сваім арлам «вольна», хай адпачнуць на мурагу ў садзе, а сам хадзем са мной.

Камендант Крамля сустрэў не вельмі прыветліва. Не даслухаўшы рапарта, спытаў хмура:

— Хто паслаў?

— Каманда крэйсера паслала. Як адзін, прагаласавалі.

— А камандзіры што думалі?

— Камандзіры выканалі волю народа.

— Анархісты.

Быццам ударыў ён мяне гэтым словам. Абразіў. Каб якая-небудзь несвядомая сухапутная халява кінула такое слова — чорт з ім, можна было б прайсці міма, а гэта ж — адказны таварыш. Такому нельга змаўчаць! Не мог я змаўчаць, не меў права, бо не за сябе абразіўся — за ўвесь рэвалюцыйны флот.

Патрабаваў:

— Вазьмі сваё слова назад! І запомні: каманда «Алега» — не анархісты. Не ведаю, дзе ты быў, а мы дваццаць пятага стаялі побач з «Аўрорай» і штурмавалі Зімні. І цяпер не за тоўстымі сценамі сядзім.

Не пакрыўдзіўся камендант. Палагоднеў. Усміхнуўся:

— Добра, бяру сваё слова назад,— і тут жа пачаў званіць па тэлефоне.— Уладзімір Дзмітравіч. Атрад матросаў для аховы Ільіча. Але, яшчэ адзін. Трэці.

Пачуў я гэта — і ажно горача мне зрабілася! Крыўдна было, што не адны мы прыехалі, што не мы першыя, і сорамна, што паводзіў сябе так, быццам узнагароды патрабаваў за прыезд. А тут, выходзіць, людзі ўсё ўжо бачылі, для іх гэта звычайная справа.

Сапраўды, не адны мы робім рэвалюцыю — правільна я падумаў перад Крамлёўскай сцяной. Адразу стаў я цішэй вады. Нават камендант убачыў перамену ў маім настроі і суцешыў:

— Нічога, таварыш, не перажывай. Усё прывядзём да ладу.

Трох нас, матроскіх камандзіраў, прыняў кіраўнік справамі Саўнаркома Бонч-Бруевіч. Добра запомніўся мне гэты барадаты мужчына са стомленымі вачамі, інтэлігентны, але просты, з такімі людзьмі прыемна гутарыць.

Ён падзякаваў камандам нашых караблёў за ініцыятыву, у якой так глыбока, так яскрава праявілася любоў матросаў да таварыша Леніна. Ад імя Савецкага ўрада падзякаваў. Але растлумачыў, што цяпер няма патрэбы ва ўмацаванні аховы Крамля. Ахова надзейная. Расказаў, дзе і як быў ранены Уладзімір Ільіч. Падвёў размову да баёў на Волзе, дзе чырвоныя войскі ў адказ на раны правадыра з патроенай сілай б'юць контррэвалюцыю. Ідуць баі за родны горад Леніна — Сімбірск. Вось там трэба падмацаванне — вопытныя байцы і камандзіры, асабліва на караблях волжскай флатыліі.

Я адразу сцяміў, што мае на ўвазе Бонч-Бруевіч, і, падняўшыся з крэсла, першы па-вайсковаму абвясціў:

— Каманда з «Алега» гатова сёння ж адбыць на Волгу!

1970

ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

(нарадзілася ў 1916 г.)

ЗЯМЛЯ З БЛАКІТНЫМІ ВАЧАМІ

Зямля з блакітнымі вачамі —
Раздолле рэчак і лугоў!
Тут называюць Васількамі
На Беларусі хлапчукоў.

Звіняць крыніцы, як цымбалы,
Сцяжынкі свецяць у лясах.
Палі, узгоркі, перавалы —
Прасторны шлях, далёкі шлях!

Краіна славы партызанскай,
Краіна міру і даброт!
Ты — наша гордасць,
Наша казка,
Як сонца, шчодры твой народ.

Твае сыны,
Твае унукі,
Мы любім гул тваіх бароў.
І рэкі цягнуцца, як рукі,
Да цёплых, верных рук сяброў.

1976

ПІЯНЕРСКАЯ ГАМА

До-бры дзень вам, песні гаю!
— ДО! — у першым гуку горна.
Я з палаткі выбягаю.
Чыста, сонечна, прасторна!

Рэ-чка жыва адгукнецца:
— РЭ! — падкіне срэбра ў гаму.
І на беразе, здаецца,
Вербы ўтораць ёй таксама.

Мі-ла, люба ў звонкім краі!
— МІ! — пачуеш каля бору:
На трубе сасна іграе,
Галаву падняўшы ўгору.

Фа-нтастычныя сцяжынкі!
— ФА! — са мной яліны згодны.
Незабыўныя хвілінкі,
За спіной рукзак паходны:

Ёсць з сабою ўсё, што трэба.
Соль да хлеба не забылі?
Разам з намі — вецер, неба.
— СОЛЬ! — і кроплі зазванілі.

— ЛЯ! — лінуў зялёны лівень.
Я ля-чу з хлапцамі ўсімі.
Эх, вось гэтак бы імкліва
Паляцець у космас сіні!

Сі-ла ў целе прыбывае
У паходах, за работай.
— СІ! — сініца сагравае
Гаму цёплай, светлай нотай.

До-ма ўспомнім гай прасторны,
Поўны ягад і арэхаў.
— ДО! — і верхні гук мажорны
Пракаціўся ў лесе рэхам.

1962

АЛЕНЬ

У таты — умелыя,
спрытныя рукі,
Не ведаюць рукі ніякай прынукі —
Працуюць таму,
што працуецца,
Майструюць таму,
што майструецца.

Мой тата з бярозы зрабіў цвыркуна,
На скрыпцы іграе цвыркун давідна.
З кавалачка бляхі
удаўся вятрак —
Ён крыламі круціць і гэтак, і так.

А корань асіны, усім на здзіўленне,
Зрабіўся рагатым і лёгкім аленем.
Зусім як сапраўдны,
гарэзлівы.
Хто скажа,
што з дрэва вырэзвалі?

Алень прымасціўся ў мяне на акне,
Зімою трубіў, сумаваў па вясне.
Як толькі зацінькаў бярозавы сок,
Алень мой учуў
і на волю уцёк.

Цяпер ён у пушчы гуляе, шчаслівы,
Мы з татам выдумваем новыя дзівы:
Працуем таму,
што працуецца,
Майструем таму,
што майструецца.

1974

АЛЕСЯ

У яркіх цюбецейках,
У сонечных панамах,
Шумлівыя, смуглявыя
ідуць сябры твае.
Крычаць на пераходзе ўсе разам:
— Цёця-мама!
І ім руку ласкавую Алеся падае.

— Смялей, не адставайце!
Ідуць сыны і дочкі
Пад вернаю аховаю
на тратуар другі.
Здзіўляюцца, смяюцца
задзіры-чарнавочкі —
Яны адкрылі новыя
На свеце берагі.

Арык ля плошчы плешча
І скача, несціханы,
Спяшаецца, стараецца
таполі напаіць.
У шапачках чырвоных
схіляюцца цюльпаны.
І колерамі рознымі
уся зямля гарыць.

Па вуліцах Ташкента
Дзіцячы сад гуляе.
— Матуля, мама! Мамачка! —
Скрозь галасы чутны.
Дзіцячы сад не знае,
што некалі здалёку
Алесю-«маму» вывезлі
З пажарышча вайны.

Бялявую дзяўчынку —
трысціначку з Палесся —
Дачкой назвалі добрыя
Узбекскія сябры.

І я люблю той горад,
Дзе выросла Алеся,
Дзе сонца над чынарамі
Купаецца ўгары.

1966

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

(1906—1963)



ЛЯСНАЯ БАЙКА

Вырас пад асінаю
Грыб
Архіп.
На дзіва ўсім,
На ім
Прыгожы капялюш:
Ружовы,
Адмысловы
На ўсю лясную глуш.
Стаіць і задаецца
Грыб
Архіп.
Не можа наглядзецца
Край зялёны
На капялюш ягоны.

Шэпча мошка-басаножка:
— Ах, які грыбок харошы!
Крыллем плясне матылёк:
— Ах, які капелюшок!

Зайка скача, плешча ў лапкі.
— Я такой не бачыў шапкі!
Нават жаба выхваляе:
— Ква-ква-ква, ква-ква-ква,
Раз такую шапку мае,
Дык якая ж галава!..

Раптам вецер тут з'явіўся,
Грыб
Архіп
Закалаціўся;
Капялюш яго на дол
Пакаціўся колам.
І глядзяць усе наўкол:
Грыб
Архіп
Стаіць, як кол,
Голы, безгаловы...

Ператапталі ўсю траву,
Шукалі, звалі галаву.
І зразумелі, што дарма
Шукаць таго, чаго няма.

1956

ІВАН АНОШКІН

(нарадзіўся ў 1928 г.)

ЛЕНУС-ХРАНІКАЛЮС

Не Іванка, а сам Міша на каньку-гарбунку лясцеў у трыдзевятае царства. Ды раптам лямпачка хліп — і пагасла. Важаты выключыў. Яму, бачыце, шкада, калі хто лішнюю старонку прачытае. Распарадак дня! Ну, то чакайце! Заўтра ўсе калгаснае сена пойдуць сушыць, а Міша — «Канька-гарбунка» дачытае...

«Тра-ля-ля... Тра-ля-ля...» — зайграў пабудку, разбудзіў празрысты ранак піянерскі горн. Дзеці хуценька засцілалі ложкі, беглі да ўмывальніка.

— Міша! Спознішся на фіззарадку!..

Міша асцярожна выглянуў з-пад коўдры і заенчыў:

— Во-о-ой!.. Жы-ыво-от!.. Во-о-ой!..

Хлапчукі спалохаліся, кінуліся за лагерным урачом. Праз хвіліну ў пакой убегла Алена Сцяпанаўна.

— Дзе баліць?

— Тут,— скруціўся абаранкам Міша.— І вось тут... І тут...

— Пакажы язык.— І Алена Сцяпанаўна пачала тыцкаць пальцам у хлапчукоў жывот.— А тут не баліць?

— Баліць! — стагнаў Міша.— Бы агнём пражыць.

— Так і ёсць: ленус-хранікалюс,— распазнала хваробу Алена Сцяпанаўна.

— Цяжкая? Небяспечная? — захвалявaліся ў пакоі.

— Вельмі небяспечная... Асабліва калі своечасова не лячыць.

— То, можа, банькі? Або ўкол?

— Не трэба мне банькі! — задрыжаў Міша.— І ўколу не трэба... Лепей якую таблетку...

— Можна і без таблеткі,— усміхнулася Алена Сцяпанаўна.— Але пасцельны рэжым... Поўны спакой... Строгая дыэта...

Вось дык пашанцавала! Хай варушаць на лузе сена... А Міша будзе песціцца ўвесь дзень у ложку, чытаць «Канька-гарбунка».

Але не справіўся разгарнуць кніжку, як дзяжурная санітарка Ліза прынесла сняданак: каву з пернікамі. Сама села на табурэце, ласуецца марожаным.

— А мне?! — вырвалася ў Мішы, бо марожанае для яго найлепшы ласунак.— Няўжо адным дзяўчынкам?

— Не, усім. Ух, якое салодкае!..

— То дзе маё? Можа, сама злізала? Нездарма Лізай завешся.

— Кінь выдумляць! — пакрыўдзілася Ліза.— Марожанае ўсім, хто здаровы... А ў цябе ленус-хранікалюс... Небяспечная хвароба... Сам чуў, як Алена Сцяпанаўна казала: строгая дыэта... Дык табе замест марожанага — кава...

— Навошта мне кава! — бунтаваў Міша.— Навошта мне дыэта!

— Бо ў цябе, Міхасёк, ленус-хранікалюс,— угаворвала Ліза.— Алена Сцяпанаўна сказала, што хворым марожанае супрацьпаказана...

— Які хворы?! — крыкнуў Міша, але схамянуўся, прыкусіў язык.

Ён не стаў піць каву і пернікі адсунуў. Выцягнуў з-пад коўдры кніжку.

— Чытаць?! Нельга! Рэжым! — І Ліза порстка выхапіла з ягоных рук кніжку.— Хіба не чуў? Патрэбен поўны спакой!..

— Аддай! — саскочыў з ложка Міша.

— Не аддам! — І Ліза апынулася каля парога.— Бо рэжым!

— Вось я табе як урэжу! — сціснуў кулакі Міша.

— Не ўздумай біцца! А не то гукну Алену Сцяпанаўну. Яна цябе супакоіць. Такі ўкол дасць...

Пачуўшы пра ўкол, Міша адразу ўгаманіўся. Ну і Ліза! Ну і падліза! Міша ёй ніколі не даруе. Але покуль нічога не сказаў. Адно застагнаў. Не ад болю — ад вялікай крыўды.

А Ліза села на табурэт каля дзвярэй, разгарнула кніжку. Ну дзе тут справядлівасць?!

— А дзяжурным можна чытаць?

— Канечне, можна! Усе на экскурсію, а мне нудзіцца?

— На якую экскурсію?! — ажно падскочыў Міша.

— Хіба не ведаеш? Сёння, пасля работы, калгасны шафёр дзядзька Фёдар павязе ўсіх спачатку на электрастанцыю, потым на пасеку... Затым...

Але Міша ўжо не слухаў. Міша падскочыў, сігануў праз акно.

— Міша!.. Міхасёк!..— кінулася да акна Ліза.— Куды ты! Ты ж хворы...

А Міша імчаў без аглядкі цераз увесь пляц туды, дзе яго сябры памагалі калгаснікам сушыць сена.

Хай яна згіне, тая хвароба — ленус-храніка-люс!..

1969

ЛІДЗІЯ АРАБЕЙ

(нарадзілася ў 1925 г.)



ЗЕРНЕТКА І ВЕЦЕР

Віхор наляцеў на ліпку, і яна густа зашумела, ссыпаючы долу чорныя зернеткі насення. Адно зернетка падхапіў вецер і панёс у белы свет. Гушкаў яго, круціў пад самым небам, ды раптам сціх, нібыта надакучыла яму гульня такая. І пачало зернетка падаць. Страшна яму было ляцець з вышыні, баялася, што разаб'ецца, загіне, хапалася за пылінкі, за смяцінкі, што круціліся каля зямлі, але і тыя асядалі.

Моцна выцялася зернетка аб камень, што ляжаў на полі, адскочыла і ўпала на шашу.

Ператрывала боль, аддыхалася, пачало азірацца. Блізка не было ні дробачкі зямлі, не сачылася ні кропелькі вады, і зернетку зрабілася сумна. Доўга ляжала яно, не ведаючы, як адсюль выбрацца, як уцячы. Ды раптам зноў вецер! Спачатку падзьмуў ціхенька, зернетка ад яго подыху толькі варухнулася, потым пажвавеў, а далей зноў разышоўся, адным махам закінуў зернетка пад воблакі, панёс над палямі, балотамі. «Куды я лячу, што са мною будзе? — ледзь не плакала зернетка.— Дзе ты, родная ліпка, чаму кінула сваё дзіця на пагібель?»

А характар у ветру быў несур'ёзны, ветраны, то ён дзьмуў з усяе сілы, то заціхаў. Зноў надакучыла яму гойсаць пад воблакамі, і зноў ён пакінуў зернетка пасярод неба. І пачало яно

зноў апускацца. Так хацелася яму ўпасці ў мяккую раллю, каб не пабіцца яшчэ раз, ды не шанцавала зернетку. Унізе плыла рака, шырокая, як мора, і падступала — усё бліжэй, бліжэй...

«Загіну! Патану!» — сцялася зернетка.

Некалькі хвілін яно ляжала, не ведаючы, ці жыве, ці ўжо загінула. Потым зразумела, што жыве. Яно ўпала на лісток, што трымаўся ў вадзе на тонкай сцяблінцы, як на якары. Тут зернетку было крышку лепш, чым на шашы, крышку мякчэй, ды і кропелька вады ляжала на лістку, з яе можна было напіцца. Але жыць тут зернетка ўсё роўна не магло б. Як можна жыць без зямлі? Яе маці, вялікая ліпа, трымалася карэннямі за глебу, так вучыла яна і дзяцей.

Ляжала зернетка на лістку, гайдалася, як дзіця ў калысцы, і заснула. Прачнулася ад буры на вадзе. У чорным небе гарэлі яркія зоры, а рака пад лістком кіпела, бурліла, лісток то падлятаў на хвалях, то ападаў уніз, вада залівала зернетка. Унізе пачуўся трэск, зернетка моцна падкінула, а потым лісток паплыў, як карабель, што сарваўся з якара. Ён плыў усю ноч, пакуль пад раніцу не зачапіўся за вярбіны корань.

Над рэчкаю ўзыходзіла сонца — вялікае, чырвонае і цёплае. Добра было б цяпер пагрэцца, абсушыцца, адпачыць, ды тут зноў адкуль ні вазьміся — вецер. Схапіў зернетка разам з лісткам і пакаціў па полі.

Ведала ўжо зернетка злосны нораў ветру, дабра ад яго не чакай, можа, зноў пад хмары закіне. І як ад яго адчапіцца, як гэты вецер абхітрыць! Толькі падумала, а тут у зямлі шчылінка — тоненькая, быццам пёркам на зямлі нехта рыску напісаў. Злаўчылася зернетка — скок у тую шчылінку. Вецер і не заўважыў, далей пусты лісток пагнаў. А зернетка затаілася, ляжыць.

І так яму добра аказалася ў той шчылінцы — цёпла, мякенька, і крынічка недалёка цурчыць.

Стомленая ад сваіх прыгод, зернетка заснула. Яно не чула, як засыпала шчылінку зямля, як закідала дол жоўтым лісцем, як пайшлі халодныя дажджы, як укрылася зямля белым снегам.

Спала зернетка да вясны. Прачнулася і здзівілася. Аказваецца, яно тут не адно, у зямлі поўна іншых зернетак, і жоўтых, і зялёных, і чырвоных, і ўсе, адно перад адным, спяшаюцца, працуюць, прарастаюць. І наша зернетка ўзялося за работу. Пачало белы карэньчык выпускаць ды ім у зямлю тачыцца, а зялёным парасткам прабівацца ўгару, да неба. Гэта была вельмі цяжкая работа, зернетка аддавала ёй усе свае сілы: скора яно вельмі схуднела, а далей і зусім знікла, растала, ператварылася ў карэньчык і парастак. Цяпер карэньчык ужо моцна трымаўся за глебу, а парастак прабіўся да святла. Азірнуўся навакол, і вельмі тут яму ўсё спадабалася. Недалёка плыла рэчка, за ёю сінеў лес, на краі якога раслі высокія ліпы.

Пачаў парастак лісткамі прыбірацца. Спачатку вылузаў адзін — светла-зялёны, ліпкі, за першым — другі, за другім — трэці. Ужо зверху ўніз пазіраў ён на пралеску, якая тут нядаўна расцвіла. А пралеска, відаць, вельмі хацела пазнаёміцца з парасткам. Аднойчы раніцою, умыўшыся туманам, яна нясмела загаварыла:

— Добрай раніцы! Мяне завуць Пралеска... Я суседка ваша, я тут расту. А вы хто?

— А я — ліпка,— адказаў парастак.— Бачыце высокія дрэвы на ўскраі лесу? Такая буду я...

— Вельмі прыемна... Я рада з вамі пазнаёміцца,— і Пралеска схіліла сваю сінюю галоўку.

1974

АНАТОЛЬ АСТРЭЙКА

(1911—1978)

МОЙ БРАТ КАМСАМОЛЕЦ

Мой брат камсамолец,
А я піянер.
Мой брат трактарыстам
Працуе цяпер.

Я ў школе вучуся,
Я гальштук нашу,
Чытаю, малюю,
Лічу і пішу.

Мой брат камсамолец,
Удзельнік вайны.
На грудзях у брата
Зіхцяць ордэны.

Ад самае Волгі
Да сівых Карпат —
Паўсвету на танку
Аб'ехаў мой брат.

Пра бітвы, паходы,
Пра грозны той час
Мой брат камсамолец
Расказваў не раз.

Увечар да брата
Прыходзяць сябры,

Гамоняць аб справах
Да позняй пары.

І брата ўсе хваляць,
Што працаю ён
Заўжды праслаўляе
Свой родны раён.

Рад бацька і маці,
І я вельмі рад,
Што ёсць такі слаўны
Ў мяне родны брат.

Я школу закончу,
Навукі прайду,
Клянуся, за братам
Я следам пайду.

1948

РАЗМОВА АБ ПРАФЕСІЯХ

Раз сышліся на двары
Юныя рамеснікі
І пачалі гаварыць
Аб сваіх прафесіях:
Што каштоўней, што важней
Для краіны і людзей.

— Я шліфую, я тачу
Рэчы далікатныя,
Справу токара лічу
Самаю выдатнаю.
Нават трактар без мяне
Кола з месца не скране.

— Муляр з цэглы дом кладзе,
Сценка ў сценку роўныя.
Вы не знойдзеце нідзе
Працы больш шаноўнае.
Дзе ні вуліца, ні пляц,
Як паглядзіш — мой палац.

— Што ты нам ні гавары —
Вушы не развешу я,
Я за слесара, сябры,
Вось дзе дык прафесія.
Ні замок, ні нож, ні крук
Без маіх не зробіш рук.

— За варштатам я стаю,
Тку адменнай пражаю,
Я прафесію сваю
Лічу самай важнаю.
Апранаю я народ
У бастон і каверкот.

— Ты залішняе ўзяла.
Пасмяшыла жартамі,
А сякера, а піла
Нікуды не вартыя?
Без сякеры, без пілы
Не зрабіць і чапялы.

— А вось справа швейная
Самая надзейная:
Абыходзіць голка свет,
Кожны голкаю адзет.

— А шавец? Браток, уваж!
Чым жа не выдатны я?
Вы без ботаў, без гамаш
Ні на што не здатныя:

А ў абутку — любата,
Ці мароз, ці хлюпата.

— Дайце слова, мне пара,
Марна вокал ходзіце,
Лепшай, чым у друкара,
Працы вы не знойдзеце.
Без кніжок ды без газет
Не абходзіцца ўвесь свет.

Слаўны наш савецкі край,
Моладзі жыць весела,
Ты любую выбірай
Сам сабе прафесію:
Навучайся і працуй,
Толькі сілы не шкадуй.

1948

МІКОЛА АЎРАМЧЫК

(нарадзіўся ў 1920 г.)



СВЯТЛАНЕ

Дык ты кажаш: у школе
За гэта імя
Ад свавольнікаў болей
Праходу няма?..

Бо чарнявая надта
Твая галава,
А цябе нехта жартам
Святланай назваў.

Ты даруй мне за тое,
Што некалі я
Даў табе не такое,
Як хочаш, імя.

Не заўважыў я нават,
Шчаслівы тады,
Што ты трошкі чарнявай
Была сапраўды.

Светлы дзень, што быў святам
За нашым сталом,
Што ўвесь свет, а не хату
Запоўніў святлом;

Колер поля, што ланам
Зваў друг франтавы,
Без пары пахаваны
Ля самай Масквы;

І пачуцце адданай
Бацькоўскай любві
Падказалі: Святланай
Яе назаві.

Быццам позірк твой ветлы
Казаў мне ў цішы:
— За мяне будзе светла
Ў цябе на душы.

Зразумець жа яшчэ ты
Павінна сама,
Што імя табе гэта
Далі недарма.

1954

* * *

Вось яны, прывольныя прасторы
Роднае зямлі спакон вякоў!..
Паабапал аржаное мора
Ледзь не хлыне на бальшак з бакоў.

Па-над абеліскамі-слупамі
Дуб-асілак з гордай галавой,
Тройчы расстраляны перунамі,
Выглядае вежай вартавой.

А як пеўні абвясцяць світанне,
Разам з дбайным сонцам аглядаць
Гэтыя бяскрайнія ўладанні
Бусел падымаецца з гнязда.

Апячэ дзяўчына ранкам буднім
Ногі аб расу на мураве,
Ледзяной вады глыне са студні
І курлыкне хрыпла журавель.

Калі бачыў ты, як тут шугае
Бэз ліловым полымем ля хат,
Ад якога сполахі мільгаюць
Ў шыбах вокан і ў вачах дзяўчат;

Як кіпіць перад пачаткам лета
Квецень перагрэтая садоў
І ружовай пенай белацвету
Пырскае на разамлелы дол;

Калі чуў, як салаўі тут хорам,
Захлынаючыся ад красы,
Прапалоскваюць, бы лудзяць, горлы
Срэбнымі крупінкамі расы;

Калі звечара пасля змяркання
Адчуваў, душою малады,
Як у сэрцах спее тут каханне,
А ў садах — духмяныя плады;

Калі бачыў, як святлом барвовым,
Азарыўшы да вяршынь лясы,
Незгасальным полымем ліловым
Тут гараць увосень верасы;

І калі не днямі, а гадамі
Адчуваў ты зблізку і здаля,
Як тут хлебам, мёдам і грыбамі
Пахне навакол сама зямля,—

Зразумееш ты тады, магчыма,
Не пражыць чаму мне без яе
І чаму ўсё тут перад вачыма
У ружовых фарбах паўстае.

1958

ЗІНАІДА БАНДАРЫНА

(1909—1959)

ХАЧУ ЧЫТАЦЬ

(З аповесці «Ой, рана на Івана»)

Бацька вазіў снапы пану, малаціў. Маці паставіла кросны. Яны занялі ўсю хату — ад печы да вокнаў. Маці ткала посцілку і спявала:

Зарасла мая дарожанька
Дро-о-бным ельні-ічкам, бя-рэз-ні-і-чка-ам!

Янка заглядаў ёй у вочы, баяўся, ці не плача. А яна заводзіла:

Ты й ха-а-ро-шая, ты й пры-ы-го-о-жая,
То-о-лькі-і до-о-ля ліха-а-я-я!

Спяваючы, маці не адрывае вачэй ад кроснаў. Там расцвітаюць пышныя ружы і няспынна туды-сюды лётае чаўнок...

У нядзелю бацька быў на кірмашы ў Радашковічах, прывёз гасцінцы дзецям і купіў каляндар.

Гэта была першая руская кніжка, якую ўбачыў Янка. Як узрадаваўся ён! Узяў у рукі, пачаў разглядаць малюнкі. Здзівіў яго надпіс: «Разрешено цензурой». Літары тут былі не падобны на польскія.

— Тата, я хачу чытаць!

— Зямля — твая навука, а не кніга. Кнігі не для нас, а для паноў пішуцца...— адказаў бацька і закашляўся, прыціснуў да грудзей жылістыя рукі.— Ці ж я не хацеў вывесці цябе ў

людзі, вучыць... Ды ці выходзіць так, як хочаш? Куды ні кінь — усюды клін... Лепш ужо, Ясь, і не заглядайся на кнігі. Паслухай мяне. Не будзе з гэтага толку... Вучыся лепш гаспадарыць. Купім зямлі, пабагацеем. Будзеш мець уласны фальварак, то і без навукі станеш панам.

На досвітку, як заўсёды, устаў Ясь, каб гнаць у поле жывёлу. Бацькі ўжо не было ў хаце. На стале, прыкрытыя краем чыстага настольніка, стаялі збаны з сырадоем. Ля печы завіхалася маці. Янка залез на покуць, дастаў з-за абраза кніжку, якую прывёз бацька, і схаваў яе за пазуху. Як хацелася яму навучыцца чытаць па-руску! Толькі як гэта зрабіць? Хто пакажа, навучыць? Маці? Добрая, ласкавая маці, яна ахвотна спявала яму песні, але не ўмела чытаць і не магла дапамагчы... Бацька? Да яго лепш не звяртацца. Яму сваіх клопатаў хапае...

Янка засмуціўся. Гадзінамі праседжваў у полі над кніжкай. Некаторыя літары траплялiся знаёмыя, іншых ён зусім не ведаў і слоў скласці не мог. Сядзеў, вадзіў пальцам. Нічога не складзеш з гэтых літар, нічагуткі.

Паслаў аднойчы бацька няньку, каб паглядзела, дзе скаціна пасецца. Яна падышла да Янкі, дзівіцца з яго:

— Што з табою, Ясю?

Хлопчык збянтэжыўся, апусціў галаву, потым, не тоячыся, расказаў аб сваім горы.

— Па такой бядзе жыць можна. Не бядуй, Яначка! Як я маладая была, адзін паніч — студэнтам ён быў — трошкі вучыў мяне грамаце. Пашукаю ў сваім куфэрку, там недзе буквар ёсць. Вывучыш літары і пачнеш чытаць...

Праз тыдзень Янка чытаў. Прачытаў каляндар, буквар. З таго часу ніколі не расставаўся з кнігай.

Аднойчы позна ўвечары, вярнуўшыся з работы, бацька ўбачыў, што сын сядзіць над кнігай, і забурчаў:

— Панская выдумка, так і газы не набярэшся...

Тады хлопчык стаў чытаць пры лучыне. Маці прадзе, а ён, прыхіліўшыся да прыпека, чытае...

Бывала і так. Пасецца ў лесе жывёла, Янка раскладзе невялічкі агеньчык у зацішку, пакладзе туды корч, каб даўжэй гарэў, сам — за кнігу.

Калі дома збіраліся на абед, Дамінік Ануфрыевіч заўсёды напамінаў жонцы:

— Пашлі дзяўчынак, няхай паглядзяць, дзе каровы. Чуе маё сэрца, што ў шкоду ўбіліся.

— Дык там жа Ясік! — усміхнецца Бянігда Іванаўна.

А сама ўжо не раз пасылала дзяўчынак. Тыя пойдуць, адгоняць кароў ад гароху, выганяць авечак з аўса. А Янка так зачытаўся, што не бачыць і не чуе. Сёстры вельмі любілі старэйшага брата і не скардзіліся бацьку.

1956

РЫГОР БАРАДУЛІН

(нарадзіўся ў 1935 г.)

ЯК БЫЦЬ?

Колькі будзе
Пяць на пяць?
Слон не можа ўцяміць.
Значыць,
Трэба завязаць
Вузялок на памяць.

І не доўга думаў слон,
Завязаў хобат.
Раніцой прачнуўся ён —
Мае новы клопат.

П'юць ваду
Вярблюд, індык,
Слон у перапудзе:
Як развяжа хобат,
Дык
Множанне забудзе.

Хто параду можа даць?
Млосна ад развагі:
Лепей ведаць
Пяць на пяць
Ці канаць
Ад смагі?!

1973



Мастак Г. ПАПЛАЎСКІ

В. Быкаў «Абеліск»



Мастак І. ДАВІДОВІЧ

Зборнік «Ніколі не забудзем»

ЖАРТ

Проста жах —
Гарыць калодзеж,
Аж пад неба полымя.
Чым астудзіш, ахалодзіш?
Не рукамі голымі!

Што рабіць?
Бяда
Адна.
Выгарыць вада
Да дна.

Што рабіць
І што рашыць?

Як ваду
Вадой тушыць?

1973

ШТО БЫЛО Б ТАДЫ Б, КАЛІ Б?

Што было б тады б,
Калі б
З'еў бы воўк
Ваўчыны грыб,
Далічыў мядзведзь
Да двух,
Паляваў арол
На мух?

Што было б тады б,
Калі б

Рос бы ў хаце
Эўкаліпт,
Выйшаў бы
Слімак на крос,
Пасвіў слон
Бадлівых коз?

Хто хутчэй з вас
Дасць адказ,
Першы
Той засне якраз.
Гэта ў сне
І ў небыліцы
Можа збыцца
І адбыцца!

1974

КУДЫКАЛА-ІНДЫКАЛА

Ішоў я ўслед за гаманой,
А ўслед за мной,
А ўслед за мной
Ішло і цяжка дыхала
Кудыкала-індыкала:

— Ты куды?
Ты куды?
— Да вады
Па жалуды.
На вярбе
Натрасу
І табе
Прынясу!

Ды,
Не сцішаючы хады,

Кудыкала:
— Куды-куды?

Ажно скакаў яго кадык,
Нібы кульгаў,
Кудык-кудык...

1979

РАСКІДАЧ

А да Ланы —
Хоць ты плач! —
Часта ходзіць Раскідач.
Нежаданы гэты госць
Раскідае ўсё як ёсць.
На падлозе мішкі,
Кніжкі,
На падлозе міскі,
Лыжкі.
Небарачка-качка
Крача.
Пад канапу скача мячык.
І злятае са стала
Бедны певень без крыла.
Давядзецца выгнаць з хаты
Шкоднага
Раскідача.
Каб на радасць
Мамы, таты
Мчаўся ён наўцекача!

1964

НА ШАШЫ І ЛЯ ШАШЫ

Штохвіліны ля шашы
Шумна, як на кірмашы.
Шоргат,
Шорах,
Шум птушыны.
За машынаю машына.
Нешта шэпча шына шыне.
Шпак шыкуе на шыпшыне.
А пад шатамі ў цішы
На ляшчыне спарышы.
У капелюшы спарыш,
Пашукай спарыш, малыш!
Шпарка па шашы ў кашы
Пашыбуюць спарышы.
Шэпча шустрая шаша:
— Не спяшайцеся, ша-ша...

1970

ПІЛЬНАЯ ПРОСЬБА

На тэлестудыю цяля
Прыбегла з просьбай пільнай,
Каб выпусцілі ўрэшце для
Цялятак
ЦЯЛЯфільмы!

1974

БАСАЛАПКІ

У адным жывуць двары
Тры Рыжулі,
Тры сястры.

Неяк раз
Абулі кошкі
Басалапкі —
Басаножкі,
Бо за ножкі,
Бо за лапкі
Можа ўцяць
Барбос з-за лаўкі.

Тут жа муркнулі
Рыжулі,
Тэпці мулкія
Разулі —
Басанож
Яно ж
Цішэй
Падкрадацца да мышэй!

1979

ФАРФОР

Кот вясёлы са стала
Скінуў вазу на падлогу.
На стале адна была,
На падлозе
Стала многа.
Ды аб тым,
Што скінуў вазу,
Кот прызнаўся не адразу.
Зараз,
Гледзячы на двор,
Муркае:
— Фар-фор,
Фар-фор...

1981

РОБЯЦЬ ГОРАДУ НУТРО

Робяць гораду нутро —
Робяць
МІНСКАЕ МЕТРО.

Хуткія, як скразнякі,
Паімчацца цягнікі!

Кіламетры гулкіх сцен
Мае
МЕТРАПАЛІТЭН.

Янка, Генка і Змітро —
Мы хаваемся ў метро.

У метро ўсіх літар пяць.
Пачынаем мы шукаць.

Раз,
Два,
Тры,
Разбяры,
Мы наверсе ці ўнутры?

Пад зямлёй бяжыць пячора —
Уцякае ў заўтра ўчора.

1981

ІЛАРЫЁН БАРАШКА

(1905—1968)

ЗАЛАТЫЯ АРЭХІ

Ад вёскі да вёскі хадзілі шэпты-перашэпты, што блукае па свеце Блазан і дзівы-дзіўныя людзям расказвае. А Блазан той і сапраўды блукаў па свеце — ад вёскі да вёскі, ад краю да краю і дзівы-дзіўныя людзям расказваў, незразумелыя часам дзівы былі ў Блазна. Адным ён казаў, што ёсць у цёмных водах мора-акіяна ключы залатыя, якімі можна ваду замкнуць, і спыняцца тады рэчкі срэбна-вадзяныя; другім казаў, што ў дзікіх лясах-дубровах жывуць людзі не людзі, звяры не звяры, птушкі не птушкі, якія хутчэй за звера бегаюць, хутчэй за птушку лётаюць, хутчэй за мужыка працуюць; трэцім казаў, што да сонца яснага ў блакітным небе далучыцца шмат, ой як шмат сонейкаў, якія па начах асвятляць і ацяпляць зямліцу нашу будуць, ды людзі ад іх дачакаюцца карысці вялікай.

І хадзілі ад вёсак да вёсак, ад двароў да двароў шэпты-перашэпты, што Блазан той хутка і да нас прыйдзе.

— А мо што цікавае і нам раскажа? — цешыліся мужыкі.

Неяк аднаго разу, калі сонца за лесам схавалася, а жанкі з паншчыны ў двор прыйшлі ды песню дажынкавую перад палацам панскім заспявалі, нечакана-неспадзявана з'явіўся Блазан, той, абшарпаны ды абадраны з кійком у руцэ, босы га-

лалытнік. Прывітаў мужыкоў, паглядзеў навакол, крутнуў кійком, заплакаў, засмяяўся ды спытаў:

— Чые вы?

— Панскія,— адказалі мужыкі.

— А пан чый?

— Наш,— адказалі жанкі.

— Ну, а ты хто такі будзеш, небарака?— спыталі мужыкі.

— Я — Блазан, а завуць мяне Цімох. Захачу, усю зямлю скручу ў рог, захачу — па-над вамі палячу.

— Ха-ха-ха! — смяюцца дзяўчаты-маладзіцы.— Вось дзе дурань...

— Я хоць і дурань, як кажаце вы, а ўсё ж мы — браты. Я босы, а ў вас адны атосы, а конь у пана, у пана й сала, а ў вас — патала, у вас хлеб ды вада, такая, браткі, ваша яда...

— Глядзі ты — дурань, а праўду кажа! — здаволена смяяліся мужыкі. А Блазан жартаваў, плакаў і пацяшаўся, дзівы-дзівосныя, казкі таемныя сялянам расказваў.

Слухаюць мужыкі, дзівяцца, веры не даюць. А Блазан апавядае пра краіны заморскія, пра гарады мармуровыя, пра воды нязмерныя, пра палацы рымскія,— слухаюць мужыкі не наслухаюцца, дзівяцца не надзівяцца.

— Ай-яй-яй, ай-яй-яй! — галовамі ківаюць. Раптам вазьмі ды спытайся Блазан у мужыкоў:

— Што б то вы хацелі, людцы мае міленькія?

— Што й хацелася, дык перахацелася! — адказвалі мужыкі.

— Ведаю, ведаю,— згаджаўся Блазан,— волі хацелася...

Дзівяцца мужыкі, скуль гэта Блазан думкі іхнія адгадвае.

— Ці не той ты Блазан, што па свету ходзіш,

дзівы-дзіўныя расказваеш? — пыталіся мужыкі.— Чулі мы пра такога.

— Казалі, што ты шчасця жадаў мужыкам, можа, што і нам пажадаеш?

Задумаўся Блазан. Спахмурнеў. Шкада яму нашых мужыкоў стала. Глянуў наўкола — адно балота. І раптам кажа:

— Золата ёсць у вашым балоце! Залатыя арэхі! Толькі адшукаеце гэта золата тады, калі ўсе гуртам шукаць яго будзеце!..

Сказаў гэта Блазан, развітаўся з мужыкамі і пайшоў у свет-вялік.

Ноч у ноч хадзілі мужыкі на балота залатых арэшкаў шукаць. Прыйдуць на балота — углядаюцца. Бачаць, блішчыць недзе ў глыбіні балота залаты арэшак. Падыдуць да яго, возьмуць у рукі,— не золата, а трухляк... І пану сказаць баяцца, а што, калі сапраўды знойдуць золата!

Лета шукалі — не адшукалі, два шукалі — не адшукалі, тры шукалі — не адшукалі аніводнага залатога арэшка...

Злуюцца адзін на аднаго мужыкі,— няма залатых арэхаў. А знайсці золата ой як хочацца, ды ў пана выкупіць сябе з сямейкай...

А іншы раз пойдзе хто шукаць залатых арэхаў на балота, дык і не варочаецца дамоў. Тады кажуць: праглынула яго балота... Вечны яму пакой... Так не аднаго мужыка засмактала балота, а золата ўсё не было ды не было.

А слава пра Блазна тым часам усё расце. Ад вёсак да вёсак ходзяць шэпты-перашэпты, што Блазан самы разумны чалавек на свеце.

— Што б то было? — дзівяцца мужыкі.

— Быць не можа, каб Блазан няпраўду казаў. Ёсць у нашым балоце залатыя арэхі, адно толькі цяжка адшукаць...

А пасля здагадаліся:

— Блазан жа казаў, што толькі тады мы адшукаем у балоце золата, калі ўсе гуртам шукаць будзем. Мы вось самі ўсе на балота ходзім, а пан наш і нагой ступіць баіцца, у двары спачывае, і таму адшукаць золата не можам...

А казаць пану баяцца,— што, калі знойдуць?

І парашылі мужыкі забіць пана.

Але як ты пана заб'еш, калі ў пана з паняй замкі ды завалы сталёвыя — і зубамі не перакусіш. Не падступіцца да пана.

Так пана й не забілі. І арэхаў залатых у балоце не адшукалі. Адно толькі казку гэту пра Блазна склалі ды з роду ў род, для ўцехі дзіцячай, Блазна ўспаміналі...

Ды і я, як быў хлапчуком, на балота лётаў — золата шукаць, добра памятаючы дзедаву казку пра залатыя арэхі, пра Блазна. Ды так усе чыста з мужыкоў нашых арэхаўскіх золата ў балоце дзецьмі шукалі.

Ад таго, кажуць, і вёска наша Арэхамі завецца...

А ў вёсцы Арэхі зараз будуецца вялікая-вялікая Асінаўская электрычная станцыя. І гэтая станцыя будзе працаваць на торфе, здабытым з навакольнага арэхаўскага балота, дзе былі схаваны залатыя Блазнавы арэхі...

1930

АЛЕСЬ БАЧЫЛА

(нарадзіўся ў 1918 г.)

МНЕ КУПІЛІ САМАКАТ

Каб вы зналі, як я рад:
Мне купілі самакат!

Не абы які папала —
Новы, з тормазам, сігналам.

Хоць у ім і лёгкі ход,
Ды не страшны паварот.

Не бяда і перакоп...
Калі што: на тормаз — стоп!

Толькі раз, як мчаўся шпарка,
Ледзь не збіў бабульку ў парку.

Парк густюсенькі, што лес,
А яна — наперарэз.

Даў сігнал — яна шыбуе,
Даў другі — ізноў не чуе.

Прасігналіў тры разы
Ды што сіл — на тармазы!..

І паверыце ці не —
Тормаз выручыў мяне.

На яго падчас таксама
Намякае хітра мама

І дае мне зразумець:
На спакусы б тормаз мець...

Спёка, сівер, халады —
Ледзяной не пі вады.

Не зрабіў у час урок —
На гулянне ні на крок.

Меў пяцёркі ты даўно —
Забывайся пра кіно.

А няўсцерп, бярэ адчай:
Што ж, на тормаз націскай.

1978

КОЛЬКІ КОТ НАБІЎ ПАСУДЫ

Я расказваць вам не буду,
Колькі кот набіў пасуды,
Хай раскажа сам Валерка,—
Чайнік, супнік, дзве талеркі,
Ажно сем гаршкоў з-пад кветак
І ў дадатак — пяць разетак.
А спытаюць — скрывіць рот:
— Гэта ўсё праклятыя кот...
«Кот — дык кот...»
І ўсё таму
З рук сыходзіла яму.
Мо сышло б і гэтым разам —
Не змахні з серванта вазу.
Ваза ў друз — Валерка ў пот:

«Як сказаць, што скінуў кот?
Хто ж паверыць той мане —
Кот жа вазу не скране.
Вось дык гора... Вось бяда...
Ды і коціка шкада —
Зноў пратураць за парог».
Хлопчык больш ілгаць не мог.

Мама нават не журыла,
А за шчырасць пахваліла.
Рад Валерка,
Рада мама,
І, вядома, кот — таксама.
Мусіць, з радасці таé
Ён пасуды больш не б'е.

1978

УПАРТЫ СТАСЬ

Кепскі нораў — горш прастуды...
Знаравіўся раптам Стась,
Клічуць есці — ён:
— Не буду!..
— Дык хоць з грушы долу злазь.
— Не жадаю долу лезці! —
І... уверх сукоў на пяць.
— Дык скажы: няўжо ж і есці
Аж на грушу падаваць? —
Ушчувае сына маці.
Просіць злезці меншы брацік.
Стась і вокам не міргне —
А мармыча «не» і «не».
Дзе ж такому хто ўнаровіць!
Дый навошта наравіць?
Лепш яго на ўласным слове

Нам адразу падлавіць.
— Не адхопіш новай двойкі?
Не пачнеш у школе бойкі?
Не ўцячэш з урока спеваў?
Не палезеш больш на дрэва?
Не напішаш на сцяне?
Ён на ўсё адказваў «не!».
Дзіва стала з чалавекам —
Не пазнаць былога «неку».
Ані двоек,
Ані боек,
Шыбы цэлыя ў акне,
Сцены чысценькія...
Во як
Памагло адмоўе «не».

1979

ДАНУТА БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА

(нарадзілася ў 1938 г.)

ГУСКІ

Ой, ляцелі гускі з выраю
ды сваёй сямейкай шчыраю.
Ой, ляцелі на балота.
А за гускамі спякота.

Маладзенькі гусачок
з кліна выбіўся ў бачок
ды на шчасце скінуў перыйца.
Я трымаю, аж не верыцца.

Гусачок згубіўся ў кліне.
Палі гускі на даліне.
На даліне пахне зелейка.
Пачынаецца вяселейка.

1980

НАША ВЁСКА

Наша вёска,
як стракозка:
крылле — возера палоска,
журавель — стракозкі хвост.
Вокны — вочы навырост.

1981

ВОЗЕРА СВІЦЯЗЬ

У тоні Свіцязі вецер
закінуў блакітны венцер.
Хваля грукоча ў дно,
ажно за Нёмнам чутно.

Жоўтае Свіцязі донца,
шаўковыя берагі.
Возера Свіцязь і сонца —
цёплыя два кругі.

1980

БЛЫТАНКА

Аблавухая качка
пазяхае ў будзе.
Белалобы сабачка
вудзіць рыбку будзе.

Акунёк — на сучок,
кажа:
— Ку-ка-рэ-ку!
Падчапілі на кручок
пеўня-прастарэку!

1980

КАНСТАНЦЫЯ БУЙЛО

(нарадзілася ў 1899 г.)



ЛЮБЛЮ

Люблю наш край — старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.
Люблю народ наш беларускі,
Хаціны ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў.
І рэчку, што імкліва воды
Імчыць ў нязведаную даль,
І схілы берагоў пясчаных,
І яснасць чыстых яе хваль.
Люблю вясну, што ў кветкі, зелень
Аздобіць радасна зямлю,
Буслоў на гнёздах клекатанне
І спеў жаўроначка люблю.
Гарачую спякоту лета
І буру летнюю з дажджом,
Як гром грыміць, а ў чорных хмарах
Маланка зіхаціць агнём.
І восень сумную люблю я,
І першы звон сярпоў і кос,
Як выйдуць жнеі збожжа жаці,
А касары — на сенакос.
Люблю зіму з яе марозам,
Што вокны прыбярэ ва ўзор,
І белы снег, што, ўкрыўшы поле,

Ірдзіцца бляскам ясных зор.
Люблю ў пагодную я ночку
Дапозна на дварэ сядзець,
Сачыць за сініх зор мігценнем,
На месяц залаты глядзець.
І песню родную люблю я,
Што дзеўкі ў полі запяюць,
А тоны голасна над нівай
Пераліваюцца, плывуць.
Усё ў тым краі сэрцу міла,
Бо я люблю край родны мой,
Дзе з першым шчасцем я спазналась
І з гора першаю слязой.

1913

МАТРОСКА

Мне матроску сёння апранулі.
— Ты — матрос,— сказала мне матуля...
А матрос — ён не па сушы ходзіць,
Ён па моры параходы водзіць,
Цераз хвалі, што ўстаюць, як горы,
Калі вецер раскалыша мора.
Мама мне сказала:
— Лета скора,
Можа, мы з табой паедзем к мору,
Тата нас узяць з сабою хоча
На Каўказ, да мора, ў горад Сочы...

Я матулі не сказаў нічога,
Толькі думак у мяне, ой, многа:
Калі толькі траплю я ў той горад,
У матросцы падыду да мора,
У парту каля прычала стану
І скажу я гучна капітану:

— Не глядзі, што я малы і босы,
А вазьмі мяне к сабе матросам.
Падрасту я, мусіць, вельмі скора,
Калі буду плыць з табой па моры.
Памагаць у працы я ўсім буду,
Толькі мне паплаваць бы ўсюды,
Ўбачыць землі ўсіх краёў і воды,
Навучыцца весці параходы...

Маму ўзяць хацеў бы я таксама,
Ды... яшчэ й мяне не пусціць мама.
Лепш тады, калі назад прыеду,
Раскажу ёй, дзе я быў, што зведаў.

1954

ГРАДКА

Градка у Ганулі.
Там расце цыбуля,
Кожная ў кароне
Пёрышкаў зялёных.

А на схілах градкі
Светлая салатка
Туліцца к зямліцы,
Каб не прастудзіцца.

Рэпкі шмат салодкай
З хвосцікам кароткім,
Ды яна малая,
Толькі падрастае.

Ёсць там і маркоўкі,
Маку ёсць галоўкі.
На зыбучых ножках
Там стаіць гарошак.

Ад гарошку блізка
Белая радыска —
Дасць сягоння Ганя
Тату на сняданне.
Выпалата градка
І штодзень паліта,
Ураджай на градцы
Будзе знакаміты,
Бо яе шторанку
Даглядае Ганка.

1957

ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН

(нарадзіўся ў 1936 г.)

ЗАЙ І ЯБЛЫНЬКА

Адзвінелі каласы,
Адгулі дажынкі.
На самотныя лясы
Падаюць сняжынкі.

Сад ільдзінкамі прапах.
У гародзе пуста.
Адхрумсцела на зубах
Крохкая капуста.

Сівер джгне —
вастрэй ляза,
Нібы сто іголак...
Невясёлы скача Зай
Ля асінак голых.

Каля кожнае сасны
Ліска точыць зубы.
А ў яго яшчэ з вясны
Шэранькая шуба.

Як ні глянь —
з усіх бакоў
Ён відзён адразу.
Ад сабак ды ад ваўкоў
Лапы, знай, падмазвай.

І мяцеліцы вось-вось
Зашумець павінны.
На знаёмых сцежках ёсць
Толькі журавіны.

Стала Заю холадна.
Стала Заю голадна.

Ён хаваўся ў верасах
Ад вятроў і згубы.
І на колкіх маразах
Паліняла шуба.

Пасвятлеў пушысты хвост,
Пасвятлелі вушы.
Зай ужо на поўны рост
Да паляны рушыў.

Адляжаўся у цішы —
І начной парою
Ласаваўся ад душы
Вербавай карою.

Пакруціўся там і тут —
Ля слядоў ласіных.
Маладзенькія растуць
Сосны і асіны.

І рашыў шчаслівы Зай:
Добры лёс удаўся,
Днём ляжы,
не выбягай,
Ноччу — наядайся,
Слухай ціхі шум лясны,
Добра ведай сховы —
І дабудзеш да вясны
Ты жывы-здаровы.

Дзе там лепшае шукаць!
Трэба тут вясну чакаць...

Ды сарокі на хвасце
Чутку раз прынеслі,
Што салодкі сад расце
Блізенька, ля ўзлесся.

І пра гэта ж
неўпапад
Цінькнулі сініцы...
І яму салодкі сад
Стаў упарта сніцца.

Толькі сцішыцца ля пня
І заплюшчыць вочы —
Як галінкамі
вішняк
Смачна залапоча.

Толькі скруціцца ў клубок
І прыцісне вушы —
Як пачнуць калоць у бок
Яблыні і грушы.

«Кажуць, блізенька зусім
Сад той, за прыгоркам».
А яму кара асін,
Як палын, агоркла.

Небагатая зіма
Заю на прысмакі,
«Аніводнага няма,
Кажуць, там сабакі».

І хаця шаптаў,
як смоўж,

Страх:
«Там пасткі, мусіць»,—
Ды не выцерпеў усё ж,
Здаўся Зай спакусе.

Выбраўся са сховы,
Збег у сад вясковы.

Ля дамашняга цяпла
Лапы грэў азяблыя.
Ажно слінка пацякла,
Як убачыў яблыні.

Ён зусім забыў на страх,
Скочыў
што ёсць сілы,
Зубы навастрыў і —
ах!
Яблыня...
ўкусіла.

Зай агледзеўся, прыціх:
Ствол увесь абкручаны
Ад ялінак баравых
Лапкамі калючымі.

І не проста так, абы,
А ў чатыры столкі.

Тут адступіцца любы —
Колюцца ж іголкі.

Рушыў Зай далей, да груш
І да вішань тонкіх.

Ды калючкі зноў:
— Не руш.
Пашкадуеш толькі.

Лепш бяжы сабе назад,
Покуль ноч над полем.
І зусім забудзь на сад,
А не то паколем...

Зай збянтэжаны прысеў
І не плача ледзьве.

Але раптам паміж дрэў
Яблыньку угледзеў.

Каля ўскраечку,
адна,
З тонкімі галінкамі.
І не ўкутана яна
Колкімі ялінкамі...

Вочы лапамі працёр —
Можа, сон-прынада?
Не.
І месяц, як касцёр,
Паміж хмар,
над садам.

Сэрца ў шчасці скача:
Ну, нарэшце ўдача.

Зай да яблынькі падбег,
Аглядае вецце.
А яна атрэсла снег,
Кажа:
— Добры вечар.

Як у лесе, раскажы,
Шмат на елках шышак?..
Я тут змёрзла на мяжы,
Хочацца ў зацішак.

Зай бурчыць:
— Няма калі
Сёння байкі баяць.
Лепш, чым мёрзлыя камлі,
Яблынька любая.

Зай аббег яе наўкол,
Паглядзеў якая.
Змерыў хітрым вокам
ствол,
Дзе пачаць, шукае.

Узмалілася тады
Яблынька:
— Паслухай!
Не рабі ты мне бяды.
Зайка даўгавухі.

Ну чаму, Зай, не прыбег
Да мяне раней ты?
Я б натрэсла цэлы мех
Сакаўных ранетаў...

— Што тут доўга гаварыць! —
Заяц падступае.—
Мне звычайнае кары
Сёння не хапае.

А ласункаў і на зуб
Я не браў ніколі.
То сасонку пагрызу,
То таполю ў полі...

— Дык я тонкая зусім.
Што ж ты точыш зубы?..
Ты ані не пад'ясі,
А мяне загубіш.

Слухай, зайка,
слухай, Зай,
Ты мяне не абгрызай...

Як ні сніўся смачны сад,
Але Зай тут здаўся,
Сплюнуў злосна
і назад
Паміж дрэў падаўся.

Уздыхнуў сабе:
— Няхай
Вырастае дужай.
І пачуў здалёку:
— Зай!
Дзякуй табе, дружа!..

І гукнула ціха ўслед
Яблыня старая:
— Пачакай, пастой, сусед.
Слухай, што параю.

Як бы цяжка ні было,
Ведай, шчасце прыйдзе.
Не рабі ніколі зло
І слабых не крыўдзі.

Стрэсла з кроны серабро
Інею над Заем.
— Тых, хто робіць нам дабро,
Мы не забываем.

Ты нам добрым сябрам
стаў...—
І да ног ягоных
Яблык з яблыні упаў,
Круглы і чырвоны.

Гэта самы дарагі,
Самы смачны з яблыкаў.
Мы яго убераглі
Ад сарок і зяблікаў.

Мы яго хавалі ўсе
На вяршыні самай,
Абмывалі у расе,
Хуталі лістамі.
Не знайшла яго зіма,
Не заўважыў вецер.
Саладзейшага няма
Анідзе на свеце.

Яблык Зай шчаслівы ўзяў
Лапамі азяблымі,
Пакланіўся нізка Зай:
— Дзякую вам, яблыні.

Як бы цяжка ні было,
Знаю, шчасце прыйдзе.
Не зраблю нікому зло,
Вас не буду крыўдзіць.

А сяброўка ваша хай
Вырастае дужай...—
І пайшоў.
І чуе:
— Зай!
Будзь здаровы, дружа!

А як прыйдзе восень —
Зноў у госці просім!
Прыбягай, не забывай,
Добры Зай!

1973

ЯДВІГА БЯГАНСКАЯ

(нарадзілася ў 1908 г.)



МАМІН ГАЛЬШТУК

Як хутка бяжыць час! Здаецца, яшчэ зусім нядаўна да бялюткага фартушка Зосі была прышпілена маленькая акцябрацкая зорачка, а сёння яна піянерка ўжо.

Зося ідзе змалку знаёмай вуліцай, усміхаецца і шырэй расхінае паліто, каб кожны здалёк мог убачыць яе піянерскі гальштук.

— Віншую цябе, дачушка,— сустракае Зосю мама.

Зося скідае паліто, спяшаецца да вялікага люстра, што вісіць на сцяне, і доўга глядзіцца ў яго.

— Мамачка, а ты была піянеркай? — пытае раптам Зося.

— А як жа, дачушка. Вядома, была,— усміхаецца мама.

— І гальштук насіла,— адказвае мама.— Праўда, ён быў не такі прыгожы, як твой, але я захоўваю яго як самую дарагую памятку свайго дзяцінства.

— Ой, мамачка, а можна мне паглядзець на твой гальштук? — просіць Зося.

— А чаму ж нельга, дачушка!

Мама дастае з шафы скрутачак, беражна разгортвае яго і садзіцца ў крэсла. Прымошчваецца побач з мамай і Зося.

— Вось ён, мой піянерскі гальштук,— гаворыць мама, распраўляючы на каленях трохкутнік рудай, выгарэўшай ад сонца тканіны.

— Ой, які ж ён...— Зося хацела сказаць «непрыгожы», але стрымалася, каб не пакрыўдзіць мамы.

— Ты хацела сказаць «непрыгожы», праўда, дачушка? — нібы чытаючы думкі Зосі, запытала мама.

Зося пачырванела і моўчкі кіўнула галавой.

— Гэта праўда,— працягвала тым часам мама.— Але ў гальштука гэтага не зусім звычайная гісторыя. Аб ёй я і хачу расказаць табе сёння...

Мама села выгадней, прыгарнула да сябе Зосю і пачала.

— Гэта было, дачушка, у гады Вялікай Айчыннай вайны. Напалоханыя і разгневаныя атакамі партызан, фашысты пачалі паліць навакольныя вёскі разам з іх жыхарамі. Вось тады дырэктар нашай школы Апанас Фёдаравіч Апейка сабраў зарачан і сказаў:

— Ну, даражэнькія мае, чакаць, пакуль гэтыя бандыты прыйдуць паліць наша Зарэчча, няма чаго. Збірайце хуценька свае манаткі ды пойдзем у лес, на Чорнае возера. Там і будзем думаць, як нам жыць далей.

Усю ноч ішлі мы лясною чашчобай ды балатамі. А раніцай, калі першыя праменні сонца рассыпаліся срэбнымі пырскамі па травах і лісці, Апанас Фёдаравіч спыніў людзей.

— Вось тут мы і будзем жыць цяпер,— сказаў ён, зняўшы шапку і абціраючы хусцінкай свой узмакрэлы лоб.

Прайшло колькі дзён, і сярод лесу, пад старымі кашлатымі елкамі, вырас наш партызанскі лагер. Высока над лесам лёталі фашысцкія самалёты, у навакольных гарадах і вёсках гаспадарылі фашысты, а тут, у гушчары лесу, пад аховай волатаў-елак жыло наша Зарэчча, нашы савецкія людзі. І не проста жылі і чакалі, калі скончыцца

гэтая праклятая вайна, а бясстрашна змагаліся з ворагам.

Нялёгка жылося нам у лесе, дачушка. Цяжка было з харчаваннем, з вопраткай, з медыкаментамі. Улетку было яшчэ паўбяды, а зімой і зусім дрэнна. Асабліва яна давалася ў знакі нам, дзецям. Хацелася бегаць у школу, хадзіць на лыжах, гуляць у снежкі, а тут сядзі ў зямлянцы ды чакай, пакуль прыйдзе тая вясна.

Доўга цягнулася наша першая партызанская зіма. Ой, як доўга! Затое як жа радаваліся мы, калі на лясных прагалінках з'явіліся першыя веснавыя пралескі, якім вясёлым дружным «ура» віталі першую чараду гусей! У лесе было яшчэ багата снегу, калі мы пакінулі свае змрочныя зямлянкі і высыпалі дружна на сонейка. Лес з кожным днём ажываў, напаўняўся птушыным гоманам, вясёлым веснавым шумам.

— Ну, жэўжыкі, хутка пойдзеце ў школу,— сказаў аднойчы Апанас Фёдаравіч.

Мы ажно раты разявілі, пачуўшы гэта. Глядзім на Апанаса Фёдаравіча і не ведаем, ці то ён праўду кажа, ці жартуе з нас.

— Ну чаго ж вы глядзіце на мяне? Вось падсохне крыху і пачнем будаваць сваю лясную партызанскую школу,— дадаў ён.

— А колькі паверхаў было ў вашай школе? — запытала Зося.

— Якія там паверхі, дачушка. Пад разложыстым волатам-дубам мы расчысцілі пляцоўку, абнеслі яе агароджай з тонкіх бярозавых бярвенняў, зверху на жэрдкі накідалі яловых лапак, і школа была гатова. Замест партаў наш калгасны сталяр дзядзька Сцяпан зрабіў доўгія сталы і лаўкі. Адным словам, праз якія дні тры мы пачалі займацца.

Пісалі мы на самаробных, зробленых з нейкіх

нямецкіх бланкаў сшытках, а то і проста на бяросце. Кожны аловак дзялілі на двух вучняў і бераглі, як самую вялікую каштоўнасць.

Партызаны вельмі клапаціліся аб нашай школе і, чым толькі маглі, дапамагалі ёй. Вяртаючыся з задання, яны часта прыносілі нам паперу, алоўкі, кніжкі і нават крэйду. Ды і мы не заставаліся ў іх у даўгу: вучыліся ўсе вельмі старанна, гультаёў сярод нас не было.

А напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка многія з нас пачалі рыхтавацца ў піянеры. Рыхтавалася да гэтай урачыстай падзеі і я. І ўсё ў нас ішло добра, адно толькі трывожыла: дзе ўзяць піянерскія гальштукі. З гэтым клопатам мы і пайшлі да камандзіра атрада. Апанас Фёдаравіч выслухаў нас, падумаў хвіліну і сказаў:

— Не бядуйце, што-небудзь прыдумаем. Гальштукі ў вас будуць.

А неўзабаве ён прынёс нам трафейны парашут.

— Дык ён жа не чырвоны, а белы,— заўважыла Зося.

— І мы тое самае сказалі, калі ўбачылі парашут. А Апанас Фёдаравіч, ведаеш, што нам на гэта адказаў? «На тое вы і піянеры, каб зрабіць яго чырвоным. У лесе фарбаў багата».

— І вы знайшлі яе, гэтую фарбу?

— Вядома, знайшлі. Падарыла нам яе крушына. Надралі мы з яе кары, напарылі і пафарбавалі свае гальштукі. Праўда, атрымаліся яны, як бачыш, не зусім чырвоныя, але гэта нас ніколькі не бянтэжыла. Раніцай сёмага лістапада мы давалі камандзіру партызанскага атрада Апанасу Фёдаравічу Апейку ўрачыстае абяцанне. Вось тады ён і павязаў мне на шыю гэты гальштук. З ім я не расставалася ўсю вайну і зняла толькі тады, калі ў 1945 годзе ўступіла ў камсамол. А зараз

я дару яго табе, дачушка. Хай ён напамінае табе аб маім партызанскім дзяцінстве, аб мужных і высакародных людзях, імя якім — партызаны.

— Дзякую табе, мамачка, за твой падарунак. Я пакажу яго ўсім нашым піянерам і раскажу ім пра тваю партызанскую школу.

Зося беражна ўзяла ў рукі мамін гальштук, прытулілася да яго тварам, і ёй здалося, што ў пакоі раптам запахла лесам, кастрамі і свежымі ранішнімі росамі.

1978

ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

(1886—1941)

СКАРБ

Ля рэчкі, пад вольхай, хохлік знайшоў ракавінку. Уладзіў у ёй кузню і давай чырвонцы каваць. Праца ў яго заўсёды кіпела ўночы, калі, бадай, усе жывыя істоты спалі, калі спяваў адзін салоўка і месячык рэчку фарбаваў.

У кузні ў хохліка было некалькі памочнікаў. Светлячок раскладваў агонь на горне. Цвыркун працаваў малатком пры кавадле. Жаба дзьмухала кавальскімі мяхамі.

Пад карэннямі вольхі, ля рэчкі, крот выкапаў патаемныя падзямеллі, дзе хохлік хаваў свой багаты скарб — скрыні з золатам. Разнеслася вестка па ўсёй ваколіцы ля рэчкі, што хохлік вельмі багаты і мае незлічоныя скарбы пад вольхай.

— Сама сваімі вушамі чула,— казала маленькая плотачка ў рэчцы: — цэлымі начамі куе ды куе ў сваёй кузні, грукае і стукае і нам, рыбкам, проста спаць не дае.

— Сама сваімі вачыма бачыла,— казала варона: — усё там у яго кузні блішчыць і блішчыць. Свеціць, як маланка, ажно вочы слепіць мне, старой. І я мусіла сабе купіць сёння акуляры, бо доктар драч напужаў мяне, што зусім аслепну пад старасць, калі не буду асцерагацца. Адно гора з гэтым хохлікам.

— Ку-ку! Ку-ку! Раз-два! Тры-чатыры! — кукавала зязюля на вольсе. Яна ў цёплыя раніцы

сядзела на дрэве ды ўсё лічыла багацце хохліка. Але зязюля ў лічбах надта не кемная: лічыць-лічыць, заблытаецца ды зноў спачатку пачынае, і гэтак штодня.

— З-з-з-м-м-м! З-з-з-м-м-м! — гудзеў авадзень над рэчкай.— Гэта ж проста бяда, аднаму ўсё, а другому нічога. Я лётаю-лётаю, б'юся як рыба аб лёд, і нічагуткі не маю, а хохлік увесь свет захапіў.

— Ш-ш-ш! — казаў чарот.— Не шуміце так, не грыміце ды не зайздросце. Працуйце, дык і вы будзеце мець. Я вось сведка, як хохлік з сваёй сям'ёй працуе да поту.

— Дурань, дурань, дурань! — крыкнуў дзяцел чароту.— Не лезь, куды цябе не просяць. Маўчы, ды годзе. А вось давайце, браткі, будзем дзяліць хохлікава дабро!

— Давайце! Давайце! — крыкнулі вераб'і.

— І мы, і мы да кампаніі! — загудзелі камары.

— Калі ўсім, дык і нам! — закудахталі куры.

Падняўся шум, гармідар, крыкі. Наляцелі з усіх бакоў звяры і птушкі, мухі і ўсе жывыя істоты, хто толькі даведаўся аб багацці хохліка. Усе рынуліся да хохліка ў кузню, каб яго абрабаваць.

Але хохліка таксама ўлегцы не возьмеш. Ён схаваў свае скарбы спрытна. Закопваў па ўсёй ваколіцы ў розных мясцінах — па лясах, па лугах, пад крушнямі, пад дрэвамі. Не было лапінкі зямлі, дзе не ляжалі б яго скарбы. Але ніхто іх знайсці не можа. Грабуцца куры на сметніках. Капаюцца птушкі па палях. Парыцца звяр'ё над карчамі, рыба ў вадзе. Шукаюць, шукаюць, але нічога з гэтага не выходзіць.

Наслухаўся малы Саўка ад свайго старога дзеда, каторы жыў у млыне ля рэчкі, шмат баек

аб багатых скарбах. Яны захаваны ў зямлі, іх усе шукаюць пад карчамі і знайсці не могуць.

— Іх трэба шукаць апоўначы ў купальскую ноч, калі кветка папараці цвіце,— казаў дзед.— Тады можна іх знайсці.

Вось у купальскую ноч, калі дзед спаў, малы Саўка выйшаў ціхенька з хаты. Узяў з сабою рыдлёўку і пабрыў скарбаў шукаць. Убачыў ён здалёку агеньчык, які блішчаў на полі ля крушні і вабіў да сябе.

«Гэта, пэўна, скарб!» — падумаў Саўка і пайшоў на гэты агонь. Ён да агню, а агонь ад яго далей й далей, і завёў агонь хлопчыка ў самы цёмны гушчар. Страшна і жудасна было ў гушчары. Дрэвы, як жывыя істоты, шапталіся паміж сабою і нібы дзівіліся, што такі малы хлопчык не баіцца адзін швэндацца ў лесе па начах. Тым часам агонь знік, а замест агню залаты пеўнічак заблішчаў на карчы.

— Вось дзе скарб! — узрадаваўся Саўка і трах рыдлёўкай пеўнічка па галаве. Пеўнічак запяяў і знік, а замест пеўнічка паказаўся залаты зайчык. Саўка зрабіў тое самае з зайчыкам... Паказалася залатая лісічка... Затым — залаты ваўчок... Залаты мядзведзь... Але ён дзіка раўнуў і глынуў Саўку.

Ачухаўся Саўка праз некалькі хвілін. Ажно стаіць ён пад зямлёй, а на яго глядзіць і ўсміхаецца хохлік, малюсенькі і тоненькі, як травінка, прыбраны ў шоўк і ядвабу. На галоўцы ў яго залатая карона з дарагімі каменнямі.

— Вось ты і папаўся, Саўка, у мае рукі! — сказаў хохлік.

— А я ж цябе не баюся,— загарачыўся Саўка.— Зачэпіш мяне, дык я цябе вось адным пальцам задушу! — і паказвае хохліку свой палец. Але як глянуў сам на свой палец, дык адразу анямеў

ад страху: палец цянюткі, як павуцінка. Тады давай Саўка аглядаць усяго сябе. Ажно ён сам такі ж маленькі, як хохлік. Тут Саўка спужаўся і заплакаў.

— Не плач,— сказаў хохлік.— Давай цяпер, калі ты ростам такі, як я, будзем аглядаць мае скарбы пад зямлёю.

— На волю хачу, да дзеда! — яшчэ галасней заплакаў Саўка, бо ў яго ўжо адпала ахвота скарбы глядзець.

— Вось табе і адважны,— пачаў кпіць з яго хохлік,— звяроў страшных не баяўся, а цяпер плачаш. Сорам, а яшчэ такі хлопец! Глянь, Саўка, налева і дзівіся!

Як глянуў Саўка налева, дык адразу плакаць перастаў, бо сярэбраныя палацы замігацелі пад зямлёй. Увёў хохлік Саўку ў палацы. Як заблішчалі залатыя сцены і дарагія каменні на сталах, дык Саўка аж засмяяўся з радасці і забыўся аб усім на свеце.

— Гэта мае палацы,— тлумачыў хохлік.— Я тут жыву з ўсёй маёй вялікай грамадой. Мы ўсе вельмі багатыя. Мая грамада разышлася па ўсіх кутках зямлі на працу. Кожны хохлік мае багатыя скарбы — куе і куе золата і дае багацце таму з людзей, хто шчыра працуе. Матка-зямля мае шмат багацця. Яна шчодрая да тых, хто любіць працаваць. Без мазалёў і поту ніякіх скарбаў не знойдзеш.

Раптам пачуўся шум пад зямлёй. З усіх бакоў, з усіх шчылін пачалі сыпацца хохлікі, як залатыя сняжынкі, як брыльянтавы мак, як жывы каляровы дождж. Малюсенькія-малюсенькія, драбнюткія-драбнюткія і многа-многа, ажно ў вачах мігацела, гледзячы на іх. А ўсе, відаць, працаўнікі заядлыя, майстры адукаваныя: хто з сякерай, хто з рыдлёўкай, хто з малатком, хто з мяшочкам за

плячыма, а хто з такім дзіўным інструментам, што Саўка і не ведаў, што гэта.

— Гэта мая сямейка на вячэру прыйшла... Гэй, ты! — паклікаў хохлік аднаго з кампаніі.— Як расце поле таго ратая, што раней за ўсіх у вёсцы на шнур свой выходзіць?

— Вельмі добра расце... Я сам даглядаю жытнія зярняткі, кармлю іх зямельным сокам і паю расіцай.

— А ты што сягоння зрабіў? — строга крыкнуў ён другому.

— Я глядзеў за тым, каб сад добра расцвітаў, каб вецер без пары кветак не зрываў.

— Ну, глядзі, бо гаспадар дзень і ноч у садзе капаўся, трэба, каб яблыкі былі, як гарбузы, а грушы — як кулакі.

— А ты, жэўжык, што рабіў? — звярнуўся ён да трэцяга.

— Я пільнаваў агарод з агуркамі. Лічыў і лічыў, бо трэба, каб сёлета было шмат агуркоў.— І хохлік пачаў лічыць па пальцах: — Пяць коп гаспадару; шаўцу, што яму боты шыў,— тры капы; кавалю за рыдлёўку — тры капы; хлопчыку, які ваду цягаў,— тры...

— Ах ты такі і сякі! — зазлаваўся старшы хохлік.— Чаму ты гэтакі скупы? Глядзі, каб усім было не меней як па дзесяць коп!

— Буду старацца,— пужліва сказаў працаўнік.

Падышоў новы хохлік з кнігай і пачаў чытаць аб тым, як хлопчыкі ў школах вучацца, хто стараецца, а хто толькі мух ловіць. Доўга чытаў ён аб гэтым, пералічваючы ўсіх сяброў і знаёмых Саўкі.

— Рыхтаваць старанным хлопчыкам самыя найлепшыя гасцінцы, а гультаям і абібокам нічога не даваць! — загадаў старшы хохлік.

Пасля розных распытванняў працавітыя хохлікі селі вячэраць. Чаго-чаго там ні было на вячэру: самыя найлепшыя прысмакі, якія толькі ёсць на зямлі. Саўку як госцю, вядомая рэч, пападаліся найсмачнейшыя кавалкі.

Павячэраўшы сытна, Саўка заснуў і не паспеў азірнуцца, як апынуўся на ложку сваім у дзедавай хаце.

З таго часу болей Саўка не шукаў скарбаў, бо ведаў, што матка-зямля мае іх у сябе вельмі шмат, але дае толькі тым, хто працуе. І Саўка ўзяўся за навуку, каб навучыцца працаваць.

1919

АНТОН БЯЛЕВІЧ

(1914—1978)

ВЕСНАХОД

Ён па стэпе ішоў,
Ён ішоў праз лясы,
Па далінах,
Цяснінах
І скалах.
Гэткай сілы яшчэ і такое красы
Праз вякі на зямлі не бывала.

Ракатала. Гуло...
Кажуць, гэтак было:
Браў ключы — залатыя праменні,
Адмыкаў,
Адчыняў
Дбайна дзверы ў святло,
У вялікую радасць нам Ленін.

І наперад вядзе ён паўвека амаль
На рубеж запаветны дзяржаву,
Ленін — долі каваль,
Ленін — шчасця каваль,
Ленін — нашая сіла і слава!

1966

ХРАБРЫ ЗАЯЦ

Як слупок, на задніх лапах
Стаў, лупаты, шэры:
«А хаця б ніхто не сцапаў
Мяне за каўнерык!
Запытаюць: — Грыз, лупаты,
Рэпку маладую?!
Адкажу ім: — Я ўжо тата,
Зайчанят гадую.
Мяне дбалая зайчыха
Ў агарод паслала.
А яна пад елкай ціхай
Дзетак спаць паклала.
Іх вартуе ад лісіцы,
Ад савы вартуе.
Ім спяваюць там сініцы,
Голуб ім буркуе.
Рэпе, моркаўцы жадаю
Я дабра, не ліха.
Я адзін такі між гаю
Самы ціхі, ціхі.
Самы ціхі, ды не трус я.
Ты мяне не цапай!
А палезеш — лапай хрусну,
Гэтай спрытнай лапай!..»
Расхрабрыўся — на мядзведзя
Рынуцца гатовы.
У разоры жабу ўгледзеў —
Шась у куст лазовы.
Як слупок, на задніх лапах
Стаў. Кустам не верыць:
«А хаця б ніхто не сцапаў
За каўнерык шэры!»

1966

У ЛЕСЕ

У вавёркі зухаватай
Запытаўся ў лесе я:
— Дзе, вавёрка, твая хата?
— У яліне дуплаватай
Хата цёплая мая.
— Ты не жала, не касіла,
А ўжо скора лістапад.
— Я ж арэхаў нанасіла,
Я грыбоў сабрала шмат!
— Вожык, дзе твая хаціна?
Дзе прытулішся ў мароз?
Ён, калючы, як шыпшына,
На іголках лісце нёс.
— Хатка-норка пад хваінай,
Там радзіўся, там узрос.
— А што будзеш есці, вожык? —
У адказ зачмыхаў ён:
— Лягу спаць я ў цёплы ложак —
Буду спаць да весніх дзён!
— Цецярук, а ты ў марозы
Дзе прытуліш галаву?
— Змерзну — бухнуся з бярозы
Ў снег. Пад снегам пражыву!
— А што есці?
— Дасць алешнік
Пірагоў-пупышак мне.
І бярэзнік дасць, канешне,
Хлеба ў роднай старане!

1965

ЗМІТРО БЯСПАЛЫ

(нарадзіўся ў 1936 г.)



МАЛЕНЬКАЯ МАЦІ

Нахадзіўшыся па лесе, я сеў адпачыць на сасну, якую з карэннем вывернула навальніца.

Павяваў лёгкі ветрык, прабягаў па вершалінах елак і соснаў. У лесе расплываўся ціхі шум. Каля твару надакучліва звінеў адзінокі камар. Раз-пораз нейкая птушка падавала прыцішаны голас: спявала яна нібыта без ахвоты.

Уверсе над галавою трэснула галінка. Глянуў угору. На галіне сасны, трымаючы ў лапках зялёную шышку, прытоена сядзела вавёрка. Нашы позіркі сустрэліся. Звярок адразу кінуў шышку, прабег па галіне і скокнуў на суседняе дрэва — у паветры прамільгнула вогненная паласа. Вавёрка забралася на самую вершаліну сасны і адтуль пачала назіраць за мною. Пераканаўшыся, што ёй нішто не пагражае, яна вярнулася на галіну, дзе толькі што сядзела, адарвала шышку, зручней уладкавалася і пачала вячэраць. Кінутыя ёю лускавінкі, кружачыся ў паветры, павольна ападалі на дол. Вавёрка назірала за мною. Выгляд яе нібыта гаварыў: «Ну, паглядзі, паглядзі, як я вячэраю».

Сонца павісла над лесам. У яго цёплых пяшчотных промнях пазалаціліся ствалы соснаў.

Перада мною метраў за шэсць была лагчынка, якая густа зарасла ландышамі. Пасярод стаяла невысокая купчастая елачка.

Лясная цішыня перадалася і мне: сядзеў нерухома і слухаў вечаровы шэпт дрэў. І таму, калі над самай галавою праляцела невялікая птушачка і ўпала ў ландышы каля елачкі, я ад нечаканасці аж скалануўся.

Праз нейкую хвіліну яна выпырхнула адтуль і зноў некуды заспяшалася.

Нязвыкла было назіраць, як лясная птушка, нічога не баючыся, двойчы так смела праляцела каля мяне.

Неўзабаве яна вярнулася. Я паспеў заўважыць: птушка ў дзюбцы прынесла вусеня. Значыць, там было гняздо з птушанятамі, якіх надвячоркам карміла клапатлівая маці.

Захацелася адшукаць гняздо, глянуць на птушанят. Калі птушка паляцела, я, асцярожна ступаючы, падышоў да елачкі, пачаў шукаць яго. Праз некалькі хвілін птушка вярнулася, мітуслі-ва пачала скакаць па галінках елачкі. Маленькая, амаль удвая меншая за вераб'я, зграбненькая, шэранька-сівенькая, яна хвалявалася за сваіх дзетак, якія недзе тут, побач, затоена сядзелі ў гняздзе, і чалавек мог наступіць на яго. Але ў тыя хвіліны я пра гэта не падумаў. Тады мяне даймала толькі адно: знайсці гняздо.

З паўгадзіны таптаўся каля елачкі, расхінаў ландышы, але гнязда так і не знаходзіў. Схавана яно было вельмі хітра.

Мною авалодала нейкая незразумелая ўпартасць. Зноў пачаў перабіраць ландышы. Птушка лятала побач: то скакала на елачцы, то чаплялася лапкамі за кару сасны, што расла побач, павісала ўніз галавою і трывожна, тонкім галаском ціўкала.

Паводзіны птушкі гаварылі пра тое, што я знаходзіўся каля самага яе дома.

Перабраўшы ландышы вакол елачкі, я нечакана ўбачыў каля нагі павернутае набок круглае гняздо-кошычак. У сярэдзіне яго, шчыльна прыціснуўшыся адзін да аднаго, сядзелі шэрыя птушаняткі. Яны былі амаль у два разы меншыя за маці. Маленькімі вочкамі, трошкі большымі за макавыя зярняткі, яны пільна сачылі за маімі рухамі. «Я ж мог растаптаць птушанят...»

Я падняў гняздо. Птушаняты нават не варухнуліся. Іх было шасцёра. Яны ўжо ўвабраліся ў пер'е, але не вылятвалі з гнязда, ніводнае нават не падало голасу, не адгукнулася маці, якая кружылася вакол мяне.

Сам не жадаючы таго, я ўмяшаўся ў птушынае жыццё: ледзь не абярнуў іх дом. Трэба было б паправіць гняздо, папрасіць у птушак прабачэння і пакінуць іх у спакоі. Але тут мне захацелася зрабіць здымак, хоць фотаапарата пры сабе і не было.

«Хуценька адскочу дамоў, тут блізка,— падумаў я, паклаў гняздо з птушанятамі ў шапку.— Пару кадраў зрабіць нядоўга».

Подбегам падаўся дахаты. Ускочыў на веранду і гукнуў жонцы:

— Хутчэй нясі апарат!

Яна глянула ў шапку, на птушанят:

— Што ж ты нарабіў?! Забраў у маці дзяцей... Разлучыў іх...

Толькі цяпер я па-сапраўднаму адчуў віну перад птушкамі, зрабілася не па сабе.

Не кажучы ні слова, я заспяшаўся назад у лес. Падышоў да елачкі, дастаў з шапкі гняздо. Птушаняты сядзелі ціхенька, быццам нічога страшнага і не адбылося ў іх жыцці.

І тут аднекуль збоку мне на плячо ўпала птушка. Гэта была маленькая маці маленечкіх дзетак. Але якая смелая, якая адважная!

З пляча яна пырхнула на руку, паскакала да самага гнязда: птушачка нічога не баялася, рызыкавала жыццём, каб толькі выратаваць сваіх дзетак.

Вось яна ціха піскнула. На маё здзіўленне, з гнязда вылецела адно птушаня і пырхнула ў голле сасны, другое — на крону елкі. Потым гняздо пакінула трэцяе, чацвёртае... А маці мітусліва скакала на руцэ.

Ашаломлены, я здзіўлена глядзеў то на птушачку, то на птушанят.

Калі апошняе птушаня пырхнула на дрэва, маці наблізілася да гнязда і зазірнула ў сярэдзіну, нібы каб упэўніцца, што там нікога не засталося, зляцела з рукі і знікла з вачэй.

Сонца хавалася за лесам. Лёгкія прыцемкі расплыліся па-над долам. Вечар быў ціхі і цёплы.

У лясной цішыні рассыпаўся звонкі пошчак салаўя. З адчуваннем віны перад птушкамі я павольна пайшоў дахаты. Уваччу стаяла невялікая смелая птушачка. Гэта была пеначка-цянькоўка.

1978

МІКОЛА ВАДАНОСАЎ

(нарадзіўся ў 1923 г.)

ХІТРУНЫ

Як доўга цягнулася лета! Хлапчукам ужо надакучыла пасвіць ля рэчкі гусей ды гадзінамі глядзець на паплаўкі, сядзець з вудамі, нудзіцца ад таго, што рыба ўлетку не хоча брацца. Ды і камары там, у кустоўі, вялізныя, нейкія цыбатыя. А кусаюцца, бы тыя восы, аж пухір потым ускочыць на тым месцы, дзе камар джгне. І мухі так даймаюць, што хоць бяжы дамоў.

— Хутчэй бы тая восень прыйшла,— ці раз гаварыў Васіль таварышам.— Ні табе камароў, ні мух...

І не таму Васіль чакаў восені, каб ад камароў ды мух пазбавіцца: ён жа сёлета стане школьнікам! Яму ўжо і ранец купілі, і новенькі форменны гарнітурчык...

І вось нарэшце ўсё ж надышоў той дзень, калі Васіль са сваімі сябрамі — Алесем ды Пецем — першы раз пайшоў у школу, якая была не ў Альшанцы, дзе яны жылі, а ў Зарэччы. Гэта амаль два кіламетры ад дому. Але што тая адлегласць! Гэта ж так цікава прабегчы па лузе каля гусінага войска, якое ўжо даручана іншым, а заадно падражніць Апанасавага гусака Гулю, які пры гэтым страшэнна сіпіць і развінае магутныя крылы. А каля самай рэчкі, дзе ходзяць спутаныя коні, пачаставаць цукрам ці кавалкам хлеба пярэстага, як карова, каня Лысага, на якім Васілёў дзед

Андрэй, ляснік, часам цэлымі днямі ездзіць па лесе. А за рэчкай — лес. Можна ісці борам, па сцяжынцы, а можна і дарогай — яна ідзе крыху ніжэй, паўз рэчку...

Вясёлая дарога ў школу! Вясёлая і знаёмая. Іншы раз, калі ішлі дамоў борам, то набіралі па шапцы бабак ды баравікоў...

Але вось надышла зіма. Гусі і коні — у хлявах, дарогу замяло снегам. І аднойчы намяло яго столькі, што Васілёва маці не на жарт занепакоілася:

— Як гэта хлопец сёння ў школу пойдзе? Ён жа малы, патоне ў снезе...

Дзед Андрэй зірнуў у акно і сказаў:

— Прыйдзецца запрэгчы ў сані Лысага.

Васіль ад радасці аж запляскаў у ладкі.

— І хлопцаў вазьмі, дзеду! Мы ж заўсёды разам... Не пакідай іх сёння...

— Ды ўжо ж, не пакінем.

Толькі той, хто не ездзіў у санях, не ведае, якая гэта асалода! Конь бяжыць так шпарка, што толькі снег з-пад капытоў ляціць, і здаецца, што ты і сам ляціш у паветры, як птушка, як той руды хвост Лысага... Не дзіва, што хлапчукам спадабалася ездзіць у школу. І яны, сабраўшыся раніцой да Васіля, часам крыху хітравалі, што на дварэ дужа холадна і мяцеліца разгулялася, хоць снег ледзь церушыў, а дарога была роўная, хоць бокам каціся.

Аднойчы ў такі дзень дзед Андрэй сказаў:

— Сёння ідзіце пехатою, бо Лысы нешта занядужаў. Мусіць, прастудзіўся...

Па дарозе ў школу Васіль разважаў:

— А ці можа конь прастудзіцца? Ён жа не чалавек...

Алесь прамаўчаў, а Пеця, які любіў паказаць, што ўсё ведае, сказаў:

— Можа! Прастуда ўсіх прастужвае. Трэба Лысаму даць таблетак. Калі я быў прастудзіўся, мне давалі.

— Таблеткі бываюць розныя,— зазначыў Васіль.— Дасі не тое, і Лысы зусім зляжа...

— Можа злегчы,— пагадзіўся Пеця.

— А мы спытаем у настаўніцы,— уставіў слова і Алесь.

З шматлікіх лекаў ад прастуды хлапчукі выбралі норсульфазол, бо гэтая назва лягчэй гаварылася, чым другія. Такія таблеткі знайшліся ў Пеці.

І вось трое сяброў, хаваючыся, прабраліся ў хлеў да Лысага. Конь павярнуў галаву і ціхенька заржаў, нібы вітаўся з хлапчукамі.

— Лы-ысенькі мой,— пагладзіў вільготную пысу Васіль.— Зараз мы цябе вылечым...

— Давай хутчэй таблетку! — сказаў Алесь, але Пеця растлумачыў:

— Каню трэба дзве ці тры таблеткі. Во ён які вялікі!..

Толькі ні адной, ні трох таблетак Лысы не браў. Ён раздзімаў храпу, фыркаў і адварочваў галаву.

Тады Алесь сказаў, што трэба таблеткі развесці ў вадзе, Васіль раіў сцерці іх на парашок і змяшаць з цукрам, а Пеця сказаў, што трэба іх абляпіць мякішам. Так Лысы з'еў амаль цэлы батон, пакуль тры таблеткі не зніклі за яго жаўтаватымі зубамі...

Яшчэ звечара пайшоў снег, і ўсю ноч гула і завывала завіруха. Васіль доўга не мог заснуць, а калі прахапіўся, то ўбачыў, што на двары стаіць запрэжаны Лысы, а дзед мосціць у санях-развалках свежую салому. Неўзабаве прыйшлі і Алесь і Пеця, яны былі радыя, што конь так хутка паправіўся.

— Розуму не дабяру, як гэта Лысы раптам паздаравеў,— шлегаючы каня лейцамі, дзівіўся дзед. А хлапчукі толькі хітра пераглядваліся і пасмейваліся. Яны думалі, што памаглі Лысаму іх лекі. І толькі на другі дзень, калі яны рашылі яшчэ падлячыць каня, Васіль зусім выпадкова заўважыў доле тры цэленькія таблеткі.

— Глядзіце! Лысы іх выплюнуў! — расчаравана сказаў ён.

Хлапчукі зразумелі: дзед Андрэй проста не хацеў іх вазіць у добрае надвор'е. І больш ужо не хітравалі. Лячэнне Лысага так і засталося іх таямніцай...

1973

ЭДУАРД ВАЛАСЕВІЧ

(нарадзіўся ў 1918 г.)

САМА

Вавёрачка арэшак ухапіла
І так і сяк яго на зуб бярэ,
Але ці не хапае сілы,
Ці дужа цвёрды той арэх,
Ды ён не паддаецца...
— Давай сюды! — Матуля весела смяецца.—
Малая ты яшчэ, дапамагу,
Бо кволенькія зубкі...
— Не дам! — Вавёрачка надзьмула губкі.—
Сама я раскусіць змагу!
І што б вы думалі? Хапіла сілы.
Хоць не адразу — ды сама
Арэшак раскусіла!

———

Без цяжкасцей і перамог няма!

1958

СПЕХ — КУРАМ НА СМЕХ

— Не галава ў цябе — лічыльная машына! —
Над Янкаю жартуюць дружбакі.—
Лузгаеш прыклады, як Піфагор які!

І сапраўды, хлапчына
Прыроджаны, здаецца, матэматык.
Другому і разжуй, і пакладзі ты ў рот,
І пракаўтнуць дапамажы ў дадатак...
А Яначка — наадварот —
Такую кемлівасць і хватку мае,
Што з лёту ўсё хапае!
Настаўніца ім не нахваліцца ніяк,
У прыклад вучням ставіць.
І тата цешыцца, і мама Янку славіць.
І трэба ж у галёшу сесці так...
Кантрольную работу
Ён першы ў класе палажыў на стол,
Ды, як даведаліся потым,
За працу ледзь не атрымаў ён «кол»!
Што? Янка — і не знаў задачкі?
Вядома знаў,
Аднак з-за спешкі, з-за гарачкі
Недапісаў
Ён недзе нуль...

Такія вывады адсюль:
Будзь Піфагорам ты ці Лабачэўскім, дружа,
Работу правярай, не гарачыся дужа,
Бо спех —
Курам на смех.

1958

АЛЕНА ВАСІЛЕВІЧ

(нарадзілася ў 1922 г.)

МАЯ ГАСПАДАРКА

Раніцай бабуля наліла мне шклянку малака — запіць снеданне — і сказала:

— Канчай, унучак, есці ды бярэмся за гаспадарку. Твае дзядзька і цётка напрацаваліся ўжо недзе ў полі, пакуль ты спаў.

— За якую гаспадарку? — не зразумеў я.

— А я табе раскажу.

Ну што ж, за гаспадарку, дык за гаспадарку. У нас у горадзе ніякай гаспадаркі няма. А калі ў бабулі яна ёсць — буду дапамагаць. Так мне і мама дома сказала: «Глядзі, Вова, дапамагай бабулі. Яна старэнькая».

Бабуля і кажа:

— Пайдзі, унучак, зірні, куды гэта падзеліся нашы падушачкі.

— Добра, бабуля, зараз!

Я ўсхапіўся з-за стала і хуценька пабег у «новую» хату — так называлі чысты і заўсёды прыбраны пакой, дзе мы з бабуляй спалі. Там усё было ў парадку: ложкі засланы, а падушкі, узбітыя бабулінымі рукамі, узніма́ліся ледзь не да столі. Маленькія падушачкі-думкі таксама ляжалі на месцы...

— Бабуля, яны ляжаць на ложках! — Мне нават дзіўна было з бабулінага загаду: сапраўды, куды ж ім дзецца — гэтым яе падушачкам?

— А дзіцятка ты маё! — пляснула рукамі бабуля і аж затрэслася ўся ад смеху.— А я думаю, чаго гэта ён у тую хату пабег, а ён падушак глядзець...

— Ты ж сама загадала мне,— пакрыўдзіўся я, не разумеючы, што магло так рассмяшыць бабулю.

— Дурненькі, гэта ж я сказала, каб ты пайшоў паглядзеў, дзе нашы гусяняткі ходзяць.

— Гусяняткі?.. А ты ж сказала: «Ідзі паглядзі падушачкі...»

— А з чаго ж падушачкі робяць?

— З чаго? Не з гусянят жа!..

— Ды пэўна ж — не з гусянят...— зноў засмяялася бабуля.

І растлумачыла мне, што падушкі робяць з пер'я і пуху, а пух і пер'е расце на гусях. А гусі вырастаюць з гусянят. Вось і выходзіць, што гусяняткі і сапраўды маленькія падушачкі...

Я ўсё зразумеў і другі раз ужо не ашукаўся б.

Пад вечар, як спала гарачыня, я ўзяў пужку — яе мне звіў з канапель дзед Васіль — і пагнаў на выган бабуліных свіней: старую рабую і двух чорных вепручкоў. Стаю сабе ля плота і свішчу пужкай у паветры: ж-жык! ж-жык! Цвіце жоўты, як сонейка, адуванчык — я па ім ж-жык! Паўзе па дарозе чорны бліскучы жук — я і яго ж-жык! Толькі адвярнуўся — аднекуль прыляцеў і кружыцца белы матылёк. Я і на яго замахнуўся — жжык! Але матылёк замахаў крыльцамі і паляцеў у жыта.

А я ўсё ж-жык і ж-жык у паветры!

Раптам чую, крычыць з поля цераз дарогу бабуліна суседка, цётка Ігналіха,— яна там буракі палола.

— Вова! Што ты там робіш? Паглядзі, дзе тваё сала ходзіць!

Гляну́ў я навокал: ляжыць мая торбачка з хлебам і салам, як і ляжала.

— Нідзе яно не ходзіць,— крычу ў адказ.— Ляжыць каля мяне.

— Ляжыць каля цябе?! А ты паглядзі добра, што твае свінні робяць?

Я азірну́ўся яшчэ раз. Сапраўды, свіней на выгане не было. Куды ж яны маглі падзецца? І раптам убачыў іх. Яны рылі лычамі бульбу за плотам. Я кінуўся выганяць свіней, а цётка Ігналіха стаяла са жменяй зелля ў руках і адчытвала мяне:

— Бач ты яго! Знайшоў сабе занятак з пугай. Глядзеў бы лепей свіней, калі прыгнаў пасвіць.

— А вы ж казалі — сала...— запярэчыў я і тут жа здагадаўся: дык сала — гэта ж тыя самыя свінні! Усё роўна як і падушачкі... Усё тут наадварот завецца, усё не так, як у нас дома, у горадзе...

А то аднойчы мы з дзедам Васілём вазілі ў калгасе снапы. Дзед пасадзіў мяне на воз, сам ідзе збоку, канём кіруе. А насустрач нам старшыня калгаса.

— Што гэта ты,— кажа,— Вова на хлебе едзеш?

А я адказваю:

— Я не на хлебе, я на снапах сяджу.

Ён засмяяўся і гаворыць дзеду:

— Вось, адразу відаць, горад! Вучы яго, дзед, як хлеб расце, вучы!

Усё вучы ды вучы — быццам я і сам не вучуся і нічога не разумею. Паказала мне бабуля, як прапалоць граду, дзе расла морква, дык я так чыста выпалаў, што ніводнай зялінкі не засталося... І вучыць не трэба было.

Або скажа мне бабуля: «Ідзі, Вова, стрэнь наша малачко. Яно ўжо недзе за рэчкай — ідзе дадому». Значыць, трэба ўзяць лусту хлеба ці жменю бурачнага лісту і ісці сустракаць нашу карову Белку. Яна так у бабулі прывучана: стрэнь чымнебудзь, а то міне двор і пойдзе па ўсёй вёсцы... Калі ж Белка не прыходзіць дадому, бабуля злуецца і крычыць: «Ото ж удалося малачко!»

Але мяне ўжо тут не ашукаеш! Малако, значыць, карова! А карова, значыць, малако!

Я сваю гаспадарку ўжо добра ведаю!

1959

ГАЛІНА ВАСІЛЕЎСКАЯ

(нарадзілася ў 1927 г.)



УСМЕШКА

У даўнія-даўнія часы на беразе сіняга мора стаяў блакітны казачны горад. Жылі ў ім шчаслівыя людзі. Удзень яны працавалі і спявалі песні, бо праца прыносіла ім радасць. А ўвечары з іхніх дамоў лілася музыка.

Сустракаючыся, людзі ўсміхаліся адзін аднаму: такое было ў іх прывітанне.

Пра тое, што на свеце ёсць горад, у якім усе людзі шчаслівыя, даведаўся злы чараўнік. Той самы, які ніколі не спяваў, не любіў музыкі і не ўсміхаўся. Ён рабіў толькі чорныя справы: хлусіў, прыдумваў плёткі, лаяўся.

— Я ведаю, чаму тыя людзі шчаслівыя,— сказаў сам сабе чараўнік.— Яны шчаслівыя таму, што ўмеюць усміхацца. Вось палячу я ў той горад, адбяру іхнія ўсмешкі і стану адзін шчаслівы.

Сеў ён на свой дыван-самалёт і паляцеў. Ляцеў ноччу, бо ўсе злыя чараўнікі лётаюць толькі ноччу, калі добрыя людзі спяць і бачаць харошыя сны.

Унізе паказаліся блакітныя дахі, і злы чараўнік здагадаўся, што гэта і ёсць той самы казачны горад.

Пачало світаць. З-за мора выкаціўся залаты шар сонца. Цёплыя хвалі лашчылі бераг, усыпаны гладкімі каменьчыкамі. З комінаў пацягнуўся лёгкі дымок.

Седзячы за комінам, злы чараўнік чакаў, пакуль хто-небудзь з'явіцца на вуліцы.

Нарэшце ён убачыў першага жыхара казачнага горада. Той ішоў і ўсміхаўся сонцу, якое шчодра грэла зямлю, птушкам, якія весела спявалі на дрэвах, і зялёным лісточкам, што трымцелі ад лёгкага ветрыку.

Чараўнік вылецеў з-за коміна і апынуўся перад чалавекам.

— Аддай усмешку! — крыкнуў ён страшным голасам, ад якога пасыпалася лісце з дрэў і перасталі спяваць птушкі.

Усмешка адразу знікла з твару чалавека — як яе возьмеш?

Тады чараўнік падбег да другога чалавека і гукнуў:

— Аддай усмешку!

Але зноў адабраць не змог. Яна таксама знікла.

Чараўнік паспрабаваў украсці ўсмешку, забраць яе непрыкметна, каб ніхто не бачыў. І з гэтага нічога не выйшла.

— Куплю ўсмешку,— вырашыў чараўнік.

Але ўсе, каму ён гаварыў пра гэта, толькі паціскалі плячамі.

Чараўнік заплакаў ад крыўды. Злыя слёзы градам пакаціліся па яго зморшчаных шчоках.

Адзін добры чалавек пашкадаваў чараўніка, пасадзіў яго на лаўку ля блакітнага фантана, выцер ягоны твар ад слёз і спытаў:

— Чаго ты плачаш, добры чалавек?

Ніхто ніколі не звяртаўся да чараўніка з такімі словамі, і ён заплакаў яшчэ мацней.

— Не магу больш так жыць,— усхліпваючы, прагаварыў чараўнік,— ніхто мяне не любіць, няма ў мяне сяброў... Я хачу ўсміхацца, як усе, але не магу здабыць сабе ўсмешку.

— Усмешку не купіш і не ўкрадзеш,— сказаў жыхар казачнага горада.— Яе дораць за добрыя справы. Успомні, ці зрабіў сёння што добрае. У полі працаваў?

— Не,— адказаў чараўнік.

— Дом будаваў?

— Не.

— Хлеб пёк? Адзежу шыў? Можа, дзяцей добраму вучыў?

— Не, не, не,— і чараўнік нізка апусціў галаву.

Чалавек уздыхнуў:

— Дрэнныя твае справы. Але ты можаш памагчы сабе сам. Рабі дабро.

І жыхар казачнага горада пайшоў на працу.

А чараўнік сядзеў і ўсхліпваў, бо не ведаў, як яно робіцца, тое дабро.

Маленькая дзяўчынка бегла ў садзік, спатыкнулася аб каменьчык і ўпала.

Чараўнік падхапіўся, падняў дзяўчынку і стаў дзьмуць на яе пабітае каленца, каб не балела.

Дзяўчынка, якая толькі што хацела заплакаць, раптам усміхнулася чараўніку так прыветна, што і яго губы таксама расцягнуліся ва ўсмешку. Першы раз у жыцці!

Яму стала так лёгка, так весела, што ён пацалаваў дзяўчынку ў абедзве шчакі, сеў на свой дыван-самалёт і паляцеў рабіць добрыя справы.

Цяпер ён напэўна стаў шчаслівым добрым чараўніком і сам дорыць людзям усмешкі.

1975

ВАСІЛЬ ВІТКА

(нарадзіўся ў 1911 г.)

ДОБРЫ ДЗЕНЬ

Я люблю свайго дзеда,
Хай сабе ён стары.
З ім куды ні паеду,
Скрозь і ўсюды — сябры.

Хай яшчэ не спазнаўся,
Не з усімі знаём,—
Як та рада радня ўся,
Рады кожны мне дом!

Запрасілі ў Расію —
Еду з дзедам удвух.
— Здравствуй, Вася-Василий!
Добрый день, старый друг!

Нібы маці да сына,
Мне насустрач ідзе
Дарагая Украіна:
— Добридень!
— Добры дзень!

— Добры дзень, малдаване!
А ў адказ мне: — Нарок!
Сустракае вітаннем
Кожны братні парог.

За руку вазьму дзеда,
Усю зямлю пакажу.

— Лаба дзена! — суседу
Па-літоўску скажу.

Мы на вечныя векі
Як з душою душа.
І гаворыць мне: — Свейкі! —
Кожны дом латыша.

Сінь каўказскага неба
Я бяру на ўспамін
І наказ: — Гамарджвэба! —
І сардэчнасць грузін.

Цераз горы і рэкі,
Як найлепшым сябрам,
Я таджыкам, узбекам
Пасылаю: — Салям!

Любы, родны мой дзеду,
Як жа добра ісці
Па сяброўскаму следу,
Што праклаў ты ў жыцці.

Цераз пушчы, даліны
Ажно рэха гудзе.
Гэта я ўсёй краіне
Гавару: —
— Добры дзень!

1969

ДУДАРЫК

Сеў у полі на каменьчыку,
Узяў дудку на раменьчыку.

Ду, ду, ду — дуда гудзе,
Полем водгалас ідзе.

Надакучыла іграць,
Каля дуба лёг паспаць.

Вісіць дудка на суку,
Спіць дударык на баку.

Павярнуўся дагары
І так моцна ён захроп —

Скалануўся дуб стары,
Дудка — бух у самы лоб.

Тут яму і сон не ў сон,
На ілбе гудзе ўжо гуз.

Не сабраў і трэсак ён,
Бо ад дудкі — толькі друз.

Падняў хлопец паясок,
Пайшоў з плачам у лясок:

— Куды дзецца мне цяпер?
Цікаваць пайду цяцер.

Спадцішка пад куст падпоўз
І цяцёрку — хоп за хвост.

З пёрка выразаў дуду:
— Ой, зайграю, загуду.

Што было, тое сплыло,
Пайду з дудкаю ў сяло.

Я пад першы парог,
А мне з хаты — пірог.

Я на дудцы: ту-гу-гу —
Ўсе нясуць па пірагу:

Мне і матка — пірог,
Мне і татка — пірог,

Мне і дзядзька — пірог,
Мне і цётка — пірог,

Мне і дзедка — пірог,
І суседка — пірог,

І браценік — пірог,
І пляменнік — пірог.

Назбіраў я пірагоў
Сорак восем карабоў.

Каб яшчэ адзін пірог,
Я зусім бы абнямог.

Перастань, дуда, дудзець!
Дзе мне пірагі падзець?

Сабралася ўся радня,
Памагчы ўсе рады мне.

Запрагаюць каня —
Ён і воза не скране.

Падагналі грузавік,
Для яго —
груз вялік.

Папрасілі самазвала,
Ў самазвала сілы мала.

Залучыў я камара,
Магутнага званара.

Той адразу ўзяў мой воз,
Пірагі мае павёз.

Ай камар-маладзец!
Тут і казцы канец.

1962

ДВА БРАТЫ І СОНЦА

Скрозь мукою пазасыпаны
Усе яры, лагчыны,
Бор стары прачнуўся рана,
Лыпае вачыма.

Лысай галавой панік,
Уздыхае горна:
— Што так доўга сакавік
Круціць свае жорны?

Ельнік
Белы,
Белы,
Белы.
Мельнік
Меле,
Меле,
Меле.

Выйшаў з лесу красавік:
— Хопіць, браце-чараўнік.
Лепш зірні на мой пірог,
Кагадзе што з печы.
Ты падняць бы мне памог,
Падстаўляй, брат, плечы.

Сталі падымаць удвох.
Ох, і цяжкі пірог.
Ледзь узвалаклі на дуба,
Паглядзелі — сэрцу люба.

Палажылі на сасонцы,
Глянулі, аж гэта — сонца!

1981

КАПЫЛЬСКАЯ ГОРКА

Хочаш знаць скорагаворку
Пра адну крутую горку?
Не ўзабрацца на гару
І самому камару

З незагнутым наском,
З непадкутым палазком.
Не спусціцца з гары —
Шо ты там ні гавары.

Носа, брат, не капылі,
Сані стаў на капылы
І каціся на вазку
Роўна, як па валаску.

І малы, і стары
У капылі на капылах
Стрымгалоў ляцяць з гары,
Нават глянуць проста страх.

Толькі мільгаціць зямля.
— Права, лева руля! —
Гэта нам крычаць здаля
Капыляне з Капыля.

1981

АРТУР ВОЛЬСКІ

(нарадзіўся ў 1924 г.)

ПРА КАВАЛЁЎ І КАРАЛЁЎ

Кава́лі зброю кавалі́,
каб іх кара́лі каралі́.

І думаў кожны чалавек,
што так — спрадвек,
што так — навек.

Але аднойчы кавалі
у змову тайную ўвайшлі:

— Як з'есць іржа
апошні меч,
не будзе чым галовы сеч!..

Магутна дыхалі мяхі —
кавалі ў кузнях лемяхі.

І страх напаў на каралёў:
— Што нам рабіць без кавалёў?

— Не хочуць зброю больш каваць!
— Як між сабой нам ваяваць?

— Упокат спіць без мечаў
раць!
— Чым кавалёў саміх
караць?

Праз колькі лет,
праз колькі зім
На свеце ясна стала ўсім:
нішто — кароль без каваля
і ўсё — каваль без караля.

1964

КАРАБЛІКІ

Блішчаць
на сонцы капелькі
нявысахлаю смолкаю.
Куды плывуць
караблікі
рачулкаю Вясёлкаю?

На іх запалкі —
мачтамі
пад флагамі кумачнымі.
Барты —
кара сасновая.
Работа — адмысловая.

Бяжыць,
задраўшы штонікі,
каманда карабельная.
Яшчэ не штормы —
штормікі,
яшчэ вясна суцэльная.

Нібыта чайкі,
ластаўкі
над грэбелькай праносяцца.

— Гэй, адчыняйце застаўкі,
Эскадра
ў мора просіцца!

1962

ЧАРНІЧКА

У засені сосен,
Дзе мох ды іглічка,
Расла-даспявала
Красунька-чарнічка.

Калі на світанку
Не бачыла хмарак,
Расой умывала
Свой кругленькі тварык.

А потым на сонейку
Плечыкі грэла.
Нібы негрынятка,
Яна загарэла.

Быў друг у чарнічкі —
Зялёны лісточак.
Схаваў ён яе
Ад вавёрчыных вочак.

Складала вавёрка
Грыбы на палічкі,
Але не прынесла
Чарняўкі-чарнічкі.

І вожык праходзіў
Сцяжынкаю блізкай.
Павёў у паветры
Кірпатаю мыскай.

Але і яму,
Не мяняючы звычкі,
Лісток не дазволіў
Пакрыўдзіць чарнічкі.

Шукала спажывы
Мядзведзіца ўранку.
І вось на чарнічную
Выйшла палянку.

Расселася, тлустая,
Як сярод хаты.
І сонца схавала
Спіною кашлатай.

Грабе сабе злева,
Грабе сабе справа.
І злева і справа —
Мядзведжая страва.

Няўжо для чарнічкі —
Апошні дзянёчак?
Ды не пахіснуўся
Зялёны лісточак!

Ва ўвесь свой расточак
Устаў абаронца...
І вось ужо зноў
Паказалася сонца.

Ах, што за лісточак!
Такі невялічкі,
Мядзведзіцы нават
Не выдаў чарнічкі.

1963

ВІТАЛЬ ВОЛЬСКІ

(нарадзіўся ў 1901 г.)

ЧОМГА

У ЛЯСНІЦТВЕ

Быў ясны жнівеньскі вечар, калі я падышоў да будынка лясніцтва ў вёсцы Белы Лясок.

Да пярэдняй сцяны дома, з абодвух бакоў высокага ганка, былі прыхілены ў некалькі радоў веласіпеды — верная адзнака таго, што ў доме адбываецца сход.

Я сеў на лаўку пад вязам.

На ганак выйшла з дзвярэй некалькі чалавек. Не спыняючы ажыўленай гутаркі, яны пачалі разбіраць веласіпеды ці, як тут кажуць звычайна, ровары. За імі высыпала з дому яшчэ чалавек пятнаццаць.

Сход, відаць, скончыўся. Людзі разыходзіліся і раз'язджаліся ў розныя бакі.

Крыху пачакаўшы, я ўвайшоў у хату. У пракураным, задымленым памяшканні нікога ўжо не было.

Я заглянуў у бакавы пакойчык, дзе змяшчалася канцылярыя. Першае, што кінулася ў вочы, была невялікая, дзіўнага выгляду птушка, велічынёю, можа, крыху большая за качку. Яна стаяла на падлозе каля зачыненага акна, выцягнуўшыся на ўвесь рост, і нагадвала сваёй паставай пінгвіна.

У птушкі была невялікая галава на доўгай, гнуткай шыі. На галаве тырчалі ззаду пучкі пер'я, нібы чорныя рожкі ці вушкі, а вакол

шыі тапырыўся старамодны каўнер залацістарыжага колеру з цёмна-карычневай, амаль чорнай аблямоўкай. Шчокі, шыя і ўся ніжняя частка тулава былі бліскуча-белыя, з цёмна-ржавымі і зеленаватымі паскамі па баках. Спіна ў птушкі бурая.

Асабліва характэрнымі былі лапы. Пляскатыя, цёмна-зеленаватага колеру, яны не мелі плавальных перапонак, якія мы прывыклі бачыць на лапах гуся ці качкі. Шырокія пальцы птушкі, кожны паасобку, былі нібы абшыты скуранымі шматкамі. Такіх лап, такога каўняра і такіх рожкаў няма ні ў адной іншай птушкі. Перада мной была паганка, ці, як яшчэ называюць яе, чомга.

Сваякоў чомгі — гагар — мне даводзілася бачыць у свой час на Карэльскім перашыйку. Я не раз наглядаў летнім ранкам, як гулялі гагары пасля ўсходу сонца на роўнай вадзяной гладзі. Яны ганяліся адна за адной па возеры, пакідаючы пасля сябе серабрыстую дарожку, а потым плылі чародкай, выставіўшы з вады галовы, як перыскоп падводнай лодкі. Гульні гагар на возеры Хэпо-Ярві надоўга засталіся ў маёй памяці.

Я разглядаў незвычайную птушку з усіх бакоў, а яна з пагрозай раскрывала сваю невялікую, тонкую і вострую на канцы дзюбу і кожны раз моўчкі паварочвала галаву ў той бок, з якога я набліжаўся. Тулава яе пры гэтым заставалася нерухомым. Птушка не змяняла сваёй паставы і не рухалася з месца.

Супрацоўнікі лясніцтва сказалі мне, што чомгу злавілі на балоце і што заўтра яе аднясуць у заалагічны музей запаведніка.

На жаль, чалавека, які злавіў гэтую цікавую птушку, тут не было, і я не мог пагаварыць з ім падрабязна. Між тым мне вельмі хацелася хутчэй убачыць паганку на волі.

Распытаўшы людзей пра мясцовасць, дзе была злоўлена чомга, я на другі дзень рушыў туды адзін.

НА ЛЯСНЫМ ВОЗЕРЫ

Наперадзе бліснула між кустоў вада.

Па вузкай, ледзь прыкметнай сцежцы сярод высокіх духмяных траў я выйшаў да невялікага ляснога возера, нізкія берагі якога густа зараслі лазняком, вольхаю, трысцём і асакою.

Уласна кажучы, гэта было не возера, а лясная рэчка, якая разлілася па балоцістай нізіне, утварыўшы тут невялікую, але даволі глыбокую затоку, акаймаваную з бакоў непраходнымі зараснікамі.

Цёмным колерам сваёй вады ў рамцы асакі і трысця глухі лясны вадаём нагадваў вядомую карціну Васняцова. І камень тут каля вады нібы той самы, на якім сядзела ў журботным задуменні Аленка.

Я выбраў сабе зручны назіральны пункт ля раскідзістай дуплаватай вярбы і сяджу ў засені, наглядаю за вадзяным люстрам перад сабой.

Стары лес высокай і цёмнай сцяной абступіў возера. Па чыстаму сіняму небу павольна плывуць рэдкія белыя воблачкі. Свежае і вільготнае паветра насычана гаркаватым пахам лазы і балотных зёлак.

У маленькіх затоках між асакі паверхня вады пакрыта зялёнай раскай. Крыху далей, дзе вады больш, зіхацяць на сонцы шырокія, круглыя, нібы наглянцаваныя лісты. Белыя гарлачыкі — русалчыны кветкі, апаэтызаваныя народнай фантазіяй, раскрыліся насустрач сонцу.

На адным з лістоў сядзіць нерухома зялёная жаба. Пукатыя вочы яе абведзены залацістым

абадком. Над вадою лятаюць стракозы. Яны таксама час ад часу садзяцца на бліскучыя цвёрдыя лісты гарлачыкаў.

У ціхай і цёплай вадзе кіпіць жыццё. Гэта — своеадменны, своеасаблівы свет. Плаваюць залацістыя карасікі. Слізгаюць па паверхні вадамеры. Усплывае, вяслуючы заднімі ножкамі, сур'ёзны вадзяны жук-плывунец.

Сонца пачынае прыпякаць.

Я гляджу на цёмную, але чыстую ваду, і мне ўспамінаюцца словы Мапасана: «Ваду я люблю нястрымна: люблю мора, хоць яно занадта вялікае, неспакойнае, непакорнае, люблю рэкі, яны прыгожыя, але толькі яны імчацца міма, яны цякуць, уцякаюць, і асабліва люблю я балоты, дзе трапеча невядомае нам жыццё падводных істот. Балота — гэта асобны свет на зямлі, тут сваё быццё, тут свае аселыя і вандроўныя насельнікі, свае галасы і шолахі, а галоўнае — свая таямніца... Магчыма, таямніца светабудовы! Хіба не ў застойнай, ціністай вадзе, не ў вільготнай зямлі, якая не прасыхае ад сонечнай спякоты, завару-шыўся, затрапятаўся і ўбачыў свет першы зародак жыцця?»

Пачуўся лёгкі, невыразны плёскат. Ледзь улоўны шолах трысця перапыніў мае думкі.

Па цёмнай вадзе павольна, амаль непрыкметна плыве невялікі круглы астравок — куча зламаных сцяблоў трысця.

Гэта — гняздо чомгі.

Сама чомга стаіць пасярэдзіне свайго плывучага астраўка, як капітан на палубе карабля. У яе тая самая пастава, у якой злоўленая чомга стаяла на падлозе ў доме лясніцтва.

Лёгкі ветрык падганяе астравок, які падпарадкуецца яго павевам. Павольна пасоўваецца ён па роўнай, крыху пасярэбранай гладзі.

Вось плывучы астравок прыткнуўся да сцяны чароту і спыніў свой рух. Чомга саслізнула з гнязда і знікла пад вадой. Птушаняты ў яе ўжо выраслі, і цяпер яна карыстаецца гняздом, напэўна, толькі як месцам для адпачынку.

На другі дзень я зноў убачыў гняздо чомгі, але на гэты раз без гаспадыні. На астраўку знаходзіўся другі пасажыр. Гэта быў вялізны пацук. Ён сядзеў на сцяблах, з якіх было складзена гняздо, паглядаў навокал нахабным позіркам і самаздаволена чысціў пярэднімі лапамі вусы.

Мяне гэта не здзівіла. Я чуў і раней, што вадзяны пацук выводзіць часам дзяцей у гняздзе чомгі. А можа, ён проста вылез з вады, каб таксама адпачыць на плывучым востраве?

ДЗІЎНАЯ ПТУШКА

Чомга — птушка своеасаблівая не толькі з выгляду. Сваімі дзіўнымі звычкамі яна адрозніваецца ад усіх іншых птушак.

Мне расказвалі ў лясніцтве, што калі чомга плавае па вадзе, малыя дзеці яе сядзяць на спіне ў маткі. У выпадку небяспекі чомга ныpае ў ваду разам з імі. Кажуць таксама, што разам з малымі на спіне чомга ўзлятае, калі трэба, у паветра. Такім чынам яна пераносіць сваіх птушанят з месца на месца не толькі водным, але і паветраным шляхам. Спіна маткі ператвараецца для іх з вадаплаўнага судна ў самалёт.

Жывуць чомгі парамі. Вясной пасярэдзіне плывучага гнязда, на подсцілцы з балотнай травы, самка адкладае тры ці чатыры яйкі. Калі чомга ў выпадку неабходнасці пакідае хоць на

кароткі час гняздо па сваіх патрэбах, яна заўсёды маскіруе яйкі, накрываючы іх зверху сцябламі трысця. Вада часам залівае яйкі, але гэта ім не шкодзіць. Спачатку яйкі чомгі маюць белы колер, але праз некалькі дзён, з прычыны таго, што ляжаць на гнілых раслінах, яны робяцца бурымі і, нарэшце, цёмна-зеленавата-карычневымі. Чомгі, самец і самка, сядзяць на яйках па чарзе. Пазней, калі птушаняты выведуцца і падрастуць, бацька пакіне сям'ю і будзе трымацца асобна.

Ногі ў чомгі настолькі адсунуты назад, што яна амаль не ходзіць і на зямлі можа стаяць, толькі абапіраючыся на кароткі хвост. Каб рухацца па зямлі, чомга павінна паўзці, прыпадаючы грудзьмі і абапіраючыся на крылы. Узняцца з зямлі ў паветра чомга не можа. Яна ўзлятае толькі з вады — спачатку шпарка плыве, лопаючы крыламі і высунуўшыся напалову з вады, потым, узяўшы разгон, адрываецца ад вадзяной паверхні.

Затое плавае і нырае чомга надзвычай добра, шпарка і спрытна.

З выраю чомгі вяртаюцца ў красавіку і жывуць на радзіме да лістапада. Кормяцца яны дробнай рыбай, вадзянымі насякомымі, рачкамі, жабкамі, апалонікамі. Восенню, перад адлётам, чомгі збіраюцца ў чароды.

Некалькі дзён правёў я на лясным плёсе, заўсёды на тым самым месцы каля дуплаватай вярбы. Адсюль добра было наглядаць за ўсім люстрам вадаёма, але ўбачыць яшчэ раз чомгу мне не ўдалося.

Чомга сустракаецца часта на рэках і азёрах Палесся, а гагары, блізкія сваякі чомгі, вядуцца на Князь-возеры і на Прыпяці.

1957

АНАТОЛЬ ВЯЛЮГІН

(нарадзіўся ў 1923 г.)



ПЕСНЯ ЗЯЛЁНАГА ДУБА

Падняў я сонца на галлі
пад посвіст салаўёў,
а нетры цёмныя зямлі
карэннем пераплёў.

Здаецца мне:
калі цяпер
пад бурай зашумлю,
не я трымаюся, павер,
за родную зямлю,

а на карэннях на маіх —
нябачаны цяжар! —
вісіць у кроплях дажджавых
зямлі зялёны шар.

Высокі, вечна малады,
у ззянні зор і рос,
свае гады,
як жалуды,
я на зямлю атрос.

Не помню, колькі мне гадоў.
Далёкі помню дзень:
у лесе сыты крык драздоў,
стагі ў лугах.
Сухмень...

Змарнеў ад болю і лістком
я варухнуць не мог.
Бывай, пад родным дубняком
зялёны мокры мох...

Мяне, маленькага, з лугоў,
дзе росы піў і рос,
хлапчук пад пахаю дамоў
з рыдлёўкай вострай нёс.

І на пясок упаў я з рук
пад шызым голлем сліў.
«Пасадзім тут»,—
сказаў хлапчук
на станцыі Разліў.

Ды выйшаў бацька хлапчука,
у мазалях рука,
мяне, гаротнага дубка,
падняў, нібы сынка.

Лісток завялы ён сарваў
і кінуў злосна ўбок:
«Такое дрэўца змарнаваў
дарэмна, галубок!

Не бачыў я, каб летні дуб
прыняўся ў сенакос,
няхай бы юны ветралюб
у родным лесе рос».

Хоць сок бруіўся па лістку,
падумаў я: канец...
Ужо не дуб я — на пяску
запылены дубец...

«Саджайце!.. Вырасце дубок!» —
пачулася здалёк,

не словы — кропелькі з аблок,
рашучы шпаркі крок.

Схіліўся добры чалавек
з газетай нада мной:
«У вашым садзе з веку ў век
шумець яму ліствой!»

І я, маленькі і прамы,
зірнуўшы навакол,
ступіў, ад радасці нямы,
у свой халодны дол.

Хоць плавілася над зямлёй
нябёс паўдзённых шкло,
а боль нясцерпны як рукой
з карэньчыкаў зняло.

Пасля ўначы шчаслівы кліч
не раз я чуў здалёк:
«А праўда вашая, Ільіч,—
расце, расце дубок!»

Я чуў, захутаны ў туман,
ці, можа, толькі сніў:
усё гавораць пра будан
на возеры Разліў.

У змроку добры чалавек
схіліўся нада мной:
«Дужэеш, любы? З веку ў век
шумі сабе ліствой,

краніся кронаю аблок
на досвітку, дубок!» —
І ён пайшоў, пайшоў у змрок,
рашучы, шпаркі крок...

Падняў я сонца на галлі
пад посвіст салаўёў,
а нетры цёмныя зямлі
карэннем пераплёў.

І жалудоў
і лісцяў медзь
на ўсю зямлю атрос.
Мне сотні лет і зім шумець
у бляску зор і рос.

Паломнікі з далёкіх рэк
пад кронаю стаяць.
— А дзе той добры чалавек? —
хачу я запытаць.

Па сцежках ленінскіх штогод
ад станцыі Разліў
ідзе, ідзе,
ідзе народ
з капальняў, хат і ніў.

Звіню, зялёны валадар,
дзяржаўнаю ліствой,
з нябёс крутых сумёты хмар
змятаю галавой.

Здаецца мне:
калі цяпер
пад бурай зашумлю,
не я трымаюся, павер,
за чэрствую зямлю,

а на карэннях на маіх —
нябачаны цяжар! —
вісіць у кроплях дажджавых
зямлі зялёны шар.

1956

СНЕГІРЫ

Заснулі белыя палеткі.
Мароз загрукаў на двары.
Зірнеш з акна:
нібыта кветкі,
на сініх вербах снегіры.

Надзьмуты важна птушак воллі...
У шуме строгай сумятні
ані забудуцца ніколі
маленства снежаньскія дні.

Сіло стаяла ля дубровы.
Бяжы... узрушаны, бяры
трапёткі, вогненна-пуховы,
жывы кавалачак зары!

1945

ВЕРА ВЯРБА

(нарадзілася ў 1942 г.)



Я СТАНУ КАПІТАНАМ

Шуміць на карце мора
Сапраўдным ураганам,
Я вырашыў учора,
Што буду капітанам.

Рашаю сам задачы,
Вучуся я старанна.
Мае сябры пабачаць —
Я стану капітанам!

Вятры і штормы, дружа,
Прайду загартаваны.
Я стану самым дужым
І смелым капітанам.

Калі паклічуць горны
У далёкія туманы,
Скажу: «Бывай, мой горад,
Уперад, капітаны!»

1966

БАБУЛІНЫ КАЗКІ

У бабулі маёй
Рукі лоўкія,
У бабулі маёй
Песні доўгія.

Разматае клубок
З новай казкаю,
Прыйдзе хітры каток,
Трэцца з ласкаю.

Хоча лапкі пагрэць,
Завуркоча ён,
Ні гуляць, ні дурэць
Нам не хочацца.

Вось і ноч настае,
Ды не спіцца нам.
Бабка казкі сную
Чараўнічыя.

1966

МІКОЛА ГАМОЛКА

(нарадзіўся ў 1922 г.)

ШЛЯХ АДКРЫТЫ

Ці ж мог праспаць Алёша гэтую раніцу? Ніколі! Учора бацька расказаў, што на світанні праз іх станцыю пройдзе бронецягнік. Зусім недалёка, дзесьці за лесам, стаіць фронт. Там і ўдзень і ўначы чуваць грымоты выбухаў. Снарады немцаў ірвуцца нават і тут, на станцыі. Алёша жыве з бацькамі не ў хаце, а ў склепе з маленькімі акенцамі. Хоць там і цемнавата, затое спакойна.

Многа дзіўнага бачыць і чуе хлопчык на сваёй лясной станцыі. Па чыгунцы бесперапынна ідуць цягнікі. Раней салдат везлі на фронт, а сёння адтуль у Мінск павінен прайсці бронецягнік. Бацька гаварыў, у Мінску — рэвалюцыя, Саветы. Але буржуі зноў хочуць захапіць уладу. На дапамогу рэвалюцыі бальшавікі з фронту і паслалі бронецягнік.

Калі хлопчык прачнуўся, бацькі ў склепе ўжо не было. Убаку, ля сцяны, спала маці з маленькай сястрычкай. Алёша асцярожна адчыніў дзверы, выйшаў на двор і пабег да станцыі.

На запасным пуці, пыхкаючы парай, стаяў цягнік. Пачыналася раніца, барвовая, халодная. Вецер гнаў на дарозе жоўтае вільготнае лісце.

Нечакана з-за крутога павароту чыгункі вынырнула дрызіна. Ля станцыі яна спынілася, адтуль выйшаў чалавек у скураной куртцы і цёмных акулярах. Следам за ім выскачылі афіцэры.

Чалавек у скураной куртцы махнуў пальчаткай і сказаў:

— Захапіце станцыю! Чыгуначнікаў арыштаваць!

— Ёсць! — казырнуў высокі афіцэр і першым пабег да жоўтага будынка вакзала.

Пачуўшы гэтыя словы, Алёша здрыгануўся. «Арыштаваць чыгуначнікаў! За што? Значыць, і тату...» Хлопчык абмінуў доўгі склад, выбег на пуці. Бацька клапатліва завіхаўся ля стрэлак.

— Та-атка! — закрычаў хлопчык.— Уцякай...

Бацька пачуў крык і азірнуўся. Афіцэры былі побач. Уцякаць позна. Бацьку затрымалі і павялі на станцыю. Следам пайшоў і Алёша.

— Не плач, сынок, не плач,— суцяшаў бацька.— Я вярнуся...

У будынку станцыі было пуста. Алёша падышоў да выбітага акна. Бацьку падвялі да брудnай лаўкі, на якой сядзелі чыгуначнікі. Яны гнеўна размахвалі перад рыжым афіцэрам рукамі, аб нечым спрачаліся.

— Вы не маеце права нас арыштоўваць,— пачуў Алёша абураны голас дзядзькі Міхася, начальніка станцыі.— Мы нясём адказнасць за чыгунку.

— Вы — бальшавікі,— сказаў рыжы афіцэр.— Загадваю маўчаць!

— Вылезе ўсё вам бокам,— паволі, са злосцю адказаў дзядзька Міхась.— На станцыю ідзе бронецягнік...

Раптам Алёша пачуў у бакавым пакойчыку працяжны званок. Праз момант да слыху даляцеў сухі, надтрэснуты голас. Хтосьці размаўляў па тэлефоне.

— Так, так... Пускайце таварны на левы пуць. Станцыя Зазер'е ў нашых руках. Бальшавіцкі бронецягнік будзе затрыманы!

Размову па тэлефоне пачулі і чыгуначнікі. Дзядзька Міхась адразу падхапіўся з месца і кінуўся да дыспетчарскага пакоя. Рыжы афіцэр схапіў яго за руку, загарадзіў дарогу.

— Пусціце! Што вы робіце, панове? Гэта ж злачынства... Бронецягнік пойдзе пад адхон.

З дыспетчарскай выйшаў чалавек у скураной куртцы і ў цёмных акулярах.

— А табе што да таго? Пойдзе, бо там бальшавікі... Хе-хе-хе,— задаволена засмяяўся ён.

Алёша ўбачыў, як бацька апусціўся на лаўку. Потым падняў галаву, агледзеўся. Позіркі іх сустрэліся. Хлопчык прачытаў на твары бацькі боль, смутак і спалох. І вось вочы яго раптам бліснулі, загарэліся. Ён перахінуўся праз лаўку і сказаў:

— А ты, Алёша, чаго тут не бачыў? Ідзі і зараз жа перавяжы казу. Чуеш?

Цяпер і афіцэр заўважыў хлопчыка. Ён павярнуўся да акна, замахаў чорным рэвальверам.

— Ану, прэч адсюль! Прэч!..

Алёша адбег ад акна і паволі пайшоў па перону. Далёка над лесам закурыўся белы дымок. «Ідзе бронецягнік,— падумаў Алёша і радасна ўсміхнуўся.— Бацьку вызваляць... А навошта ён сказаў пра казу? Яе ж няма. Тыдзень назад прадалі...» Ззаду Алёша пачуў грукат. Павярнуўся і застыў на месцы: да станцыі падыходзіў таварны састаў.

«Перавязаць казу... Перавязаць казу...» — напомніў далёкі стук колаў хлопчыку. Алёша ледзь не прысеў ад страху. Як не зразумець гэтых слоў? Ён не раз чуў, як бацька, ідучы пераводзіць стрэлкі, жартаўліва казаў: «Пайду перавяжу казу». Значыць, бацька даў яму даручэнне. І не дзіўна, два цягнікі ідуць адзін аднаму насустрач.

Яны сутыкнуцца, і адбудзецца крушэнне... Бронецягнік не пройдзе да Мінска.

Хлопчык, як віхор, паляцеў па насыпу туды, дзе сыходзіліся сталёвыя ніткі рэек. З-за лясного павароту наганяў яго пагрозлівы грукат пушчанага без машыніста таварнага састава. А з другога боку таксама набліжаўся цягнік. Ён гукнуў на ўвесь лясны прасцяг, абвяшчаючы аб сваім падыходзе да станцыі.

Алёша яшчэ раз азірнуўся, але спатыкнуўся аб шпалу і ўпаў. А рэйкі ўжо дрыжалі, перадаючы магутны поступ цяжкіх колаў... Хлопчык падхапіўся і пабег шпарчэй. Вось і стрэлкі. Цяжкі чыгуначны рычаг... На стойцы — ліхтар... Алёша адкінуў клямку замка, налёг грудзьмі на рычаг.

Таварны састаў зусім блізка. Ужо добра відаць, як мітусяцца ля паравозных колаў шатуны.

Яшчэ крыху... Яшчэ... Рэйкі зарыпелі, пасунуліся і шчоўкнулі з вясёлым металічным звонам.

Хлопчык выцер рукавом твар. Ну, вось і мінулася бяда! Побач ужо мільгалі чырвоныя вагоны таварняка.

А з лесу поўным ходам ішоў бронецягнік. Ён каціўся па рэйках, нязграбны, цяжкі, з агністым сцягам, які высока развяваўся над пярэдняй браніраванай вежай.

Алёша радасна замахаў шапкай. Каля яго з грукатам, набіраючы хуткасць, прамчаўся бронецягнік.

1957

ВІСАРЫЁН ГАРБУК

(нарадзіўся ў 1913 г.)



ГОРАД БЕЗ ПАПУГАЙЧЫКАЎ

Валодзя, худзенькі хлопчык з вялікімі задуменнымі вачыма на бледным твары, апрануты ў цёплы пушысты гарнітур застаўся дома адзін. Бацька з маці пайшлі на работу, а сястрычку адправілі да бабулі. Валодзя доўга хварэў, і ў школу яго пакуль што не пускалі.

Каб не адстаць у вучобе, Валодзя рыхтаваў урокі, чытаў, маляваў. Ён прыбіраў кватэру, сам на электрычнай плітцы падаграваў яду, але ўсё надакучыла. Захацелася да дзяцей на вуліцу, у Дом піянераў. Калі б з ім у гэтыя дні былі хто-небудзь з птушак або звяроў. Але вожык і чарапаха спяць у склепе, а кошка і рыбкі ў акварыуме надакучылі.

Хлопчык марыў аб незвычайным. У далёкай Бразіліі ў кожнай сям'і жыве анаконда — да дзесяці метраў даўжыні. Без яе ні адно дзіця кроку не ступіць. Яна — смерць для ўсіх ядавітых змей. Пяшчотная, нібы кацяня. Валодзя сядзеў бы з ёю на тахце і забаўляўся.

Вядома, пра анаконду можна толькі марыць. Надзеі ніякай. Але ў аўтобусе аднойчы ён бачыў дзядзьку, які трымаў на каленях клетку. У клетцы сядзелі два папугайчыкі — зялёны і блакітны. Дзядок падрабляў голас, свіркаў. Птушкі дружна адгукваліся. Было вельмі весела. Гаварыў, што папугайчыкаў вязе ўнучцы.

Не можа быць, каб ні ў кога ў горадзе не было гэтых дзіўных птушак...

Хлопчык зручней прымасціўся ля тэлефона, паклаў перад сабой кнігу абанентаў і адшукаў спіс хатніх адрасоў.

Абакалін Н. В — 29-47, Абакрын В. С — 74-91, Абалкін Ю. Ю. Можа, лепш пачаць з канца? Вось Яшчук І. І.— 22-00, Якарчэня Н. В. ... І тут нейкія незнаёмыя, строгія прозвішчы. Не, ні з пачатку, ні з канца, а лепш з сярэдзіны...

Доўгія гудкі з перапынкамі ідуць адзін за адным: ту-у-у- — цішыня, зноў — ту-у-у... ту-у-у... Ніхто не падыходзіць.

Валодзя ўявіў: недзе ў горадзе на другім або трэцім паверсе ёсць кватэра. Кухня, спальня і пакой, калідор і ванна. У пакоі — стол, шафа з кнігамі, тэлевізар, у спальні — канапы, шыфаньер з люстэркам. І нідзе нікога. Толькі вада з крана на кухні: пюнь, пюнь, пюнь.

Хлопчык смялей набраў наступны нумар. Кароткія гудкі: ту-ту-ту. Хтосьці размаўляе.

У газетах пішуць, што хутка тэлефоны заменяць відэатэлефонамі. Ля кожнага апарата — экран, бачыш, з кім гаворыш. Тады нельга будзе розным недарэкам свавольнічаць па тэлефоне: «Дайце трыццаць тры сігналы праверкі» або «У вас прышчэпкі ёсць? Павесьце адну сабе на язык».

21-21. Лёгка запомніць. І прозвішча не страшнае: Папчанка М. М. «Ту-у-у», і адразу — «Я слухаю». Сярдзіты гучны бас. Валодзя ўздрыгнуў. «Я слухаю»,— нецярпліва паўтарыў бас.

«Высачэзны, тоўсты, у шэрым, з гальштукам, лысіна, бровы чорныя... Сядзіць за сталом, нібы дырэктар у школе, піша»,— уявілася Валодзю. Але чаго маўчаць? Смялей!

— У вас папугайчыкі ёсць?

— З падобнымі пытаннямі належыць звяртацца да адміністрацыі адпаведных устаноў,— адказаў бас і паклаў трубку.

Расхацелася пытацца.

На шэрай зямлі брудныя плямы снегу. Воддаль за акном рыжаватая сцяна шматпавярховага дома. Цёмныя прамавугольнікі акон. У адным чамусьці ўсе дні гарыць лямпачка. І нідзе нікога.

Пазваніць яшчэ...

Пасля першага гудка цікаўнае, нясмелае: «Хто там?»

Дзіцячы голас. Відаць, дзяўчынка. Адна ў пакоі. Бабуля, відаць, пайшла ў магазін або сядзіць на кухні ля пліты і вяжа.

— У вас папугайчыкі ёсць?

— А хто пытае: хлопчык ці дзяўчынка?

— Хлопчык.

— Мне мама забараніла гаварыць з хлопчыкамі.

— Чаму?

— Бо яны ўсе хуліганы.

Валодзя не ведаў, што адказаць. Дзяўчынка трубку не клала.

І зноў цікаўнае:

— А навошта табе папугайчыкі?

— Гуляць з імі.

— Ты адзін?

— Але.

— Як цябе завуць?

— Валодзя.

— А мяне — Зіна. А што ты робіш?

— Хварэю.

— І я хварэю. Мне вельмі сумна.

— І мне.

— У цябе таксама нікога — ні брата, ні сястры?

— Сястру адаслалі да бабулі.

— А я зусім адна.

Валодзя пачуў, як дзяўчынка ўздыхнула.

— Ой, нехта зараз зойдзе! — заспяшалася Зіна. — Дзе ты жывеш? Скажы нумар! Заўтра пазва...

Не дагаварыўшы, яна паклала трубку.

Валодзя ўсміхнуўся. Размова па тэлефоне яму падабалася.

На наступны выклік доўга ніхто не адгукаўся, але хлопчык не клаў трубку — слухаў песню, якая гучала па лініі:

Зайчык маленькі,
Чым ты жывенькі?
— Я і сам дзіўлюся,
Чым я жыўлюся.
Пасаджу капусту
Ні рэдка, ні густа.
Пайду я рана,
Капуста парвана,
Пайду я позна,
У капусце...

Рэзкае і кароткае «Алё-ё!» абарвала песню.

— У вас... скажыце, калі ласка... папугайчыкі ёсць?

— Што?

— У вас папугайчыкі ёсць?

— Не паспеў навучыцца трубку трымаць, а ўжо хуліганіш. Вось паклічу міліцыю, і твайго бацьку аштрафуюць, а тэлефон абрэжуць.

Голас хрыпаты. Нейкая зласлівая старая, відаць, падобная на тую, што жыве ў суседнім пад'ездзе. Курыць і крычыць на хлапчукоў, а з пераносся пудра сыплецца.

— Якіх табе, хлопча, папугайчыкаў трэба? — здзівіў Валодзю пявучы голас невядомага Памяранцава А. А. Хтосьці, падобны да чарадзея з казак.

— Аўстралійскіх.

— А навошта?

— Навучыць размаўляць.

— Эге, мілы! А тыгра або гіпапатама табе не хочацца? Кракадзіла ці кобру? Во гэта дзіва. А лепш за ўсіх, ведаеш, каго?

— Не-а.

— Нашага верабейку. Ты толькі прыгледзься да яго. Якая ва ўсім незалежнасць! Вось дзе характар! А што такое папугаі і папугайчыкі? Трашчаць, на ўсе галасы паўтараюць даўно паўторанае... Вось яно як, хлопча.

Валодзя засмяяўся, хоць і не зусім зразумеў, што сказаў гэты Памяранцаў.

Пры наступных выкліках хлопчыку зноў не шанцавала. Або не адгукаліся, або адказвалі «Не, няма» і адразу клалі трубку. Валодзю абрыдла званіць.

— Ніяк не магла дазваніцца! — здзівілася маці, вярнуўшыся з працы.— Усё занята. Ты з кім размаўляў?

— Я папугайчыкаў пытаў,— адказаў Валодзя.

— І на цябе не сварыліся? — строга сказала маці.— Глядзі, а то нам тэлефон выключаць.

Назаўтра Валодзя ўспомніў пра папугайчыкаў толькі тады, калі ўбачыў праз акно дзяўчынку з партфелем. Пазваніць Зіне? А нумар забыўся. Здаецца, гэты. Вось узрадуецца.

Далікатны жаночы голас: «Я вас слухаю» выклікаў у хлопчыкавай памяці твар тоўстай жанчыны з цырульні, якая падстрыгала яго і ўсё распытвала, кім працуе бацька, маці, дзе яны жывуць.

— Скажыце, калі ласка, у вас папугайчыкі ёсць?

— Як вы сказалі?

— У вас папугайчыкі ёсць?

— Даруйце — не разумею. Зараз падыдзе муж.

Валодзя ў здзіўленні пачуў прыглушанае:

— Ідзі сюды!.. Я не магу... Там пытаюцца пра нешта незразумелае... Ды не, пад дзіцячы голас.

— Я слухаю,— насцярожаная, але паспешлівая інтанацыя, нібы ў настаўніка па арыфметыцы.

— У вас папугайчыкі ёсць?

— А каму вы звоніце?

— Вам.

— Нам! Як прозвішча і па якім тэлефоне?

Валодзя назваў прозвішча і нумар тэлефона.

— А адкуль вы даведаліся?

— З нашай кніжкі.

— Вось што, малады чалавек,— раззлаваны голас гучаў так рэзка, што аж затрымцела ў трубцы.— Я такімі глупствамі не займаюся! І вам не раю!

— Перапужаліся,— уголас сказаў Валодзя.

Ён чамусьці ўспомніў пра вочка, якое ўставіў іх сусед у сваёй кватэры. Перш чым пусціць каго, гаспадар доўга глядзіць у вочка. І ў гэтых, мабыць, тое ж самае. А дзверы на тры замкі. І на паштовай скрынцы нумарны замочак.

— Дзяўчаткі, ціха! — пачулася ў трубцы пасля таго, як хлопчык набраў новы нумар.— Што-што? Папугайчыка? Можа, лепш папугайку? У нас ёсць. Марынка, цябе запрашаюць! Хочуць пазнаёміцца.

Валодзя ціхенька націснуў на рычажок.

Табе з заамагазінам трэба б сазваніцца. Але шкада, у нашым горадзе такога магазіна няма,— пачуў ён спакойны голас мужчыны, як набраў яшчэ адзін нумар.— Што ж прыдумаць? Магчыма, што ў каго ёсць папугайчыкі, у таго няма тэлефона. Ты даўно шукаеш?

— Даўно.

— Але, брат, задача нялёгкая. Не вырашыць адразу. Настойлівасць і час патрэбны. Мабыць, хварэеш, калі ўзяўся за такія пошукі?

— Я паправіўся, а ў школу не пускаюць.

— У майго пляменніка акурат такая непрыемнасць. Але ён без тэлефона,— з людзьмі ніякіх кантактаў... Ну, вось што. Ты дай свае каардынаты, адрас, тэлефон... На рабоце ў мяне заўтра выхадны. Я ў сяго-таго распытаю і заўтра пазваню. У гэты ж час — у пятнаццаць нуль-нуль. Дамовіліся?.. Запісваю. Ого, брат, мы, аказваецца, цёзкі! Мой нумар не забудзеш? А пошукі працягвай.

— А кім вы, дзядзька Валодзя, працуеце?

— Ну, брат, не ўсё адразу. Пры сустрэчы пагаворым. Ясна?

— Ясна! — адказаў хлопчык.

Ён паклаў трубку. Уявіў сабе дзядзьку Валодзю. Спачатку дзядзька Валодзя быў падобны на марака Жору, які мінулым летам вярнуўся са службы. Усе хлапчукі гужам хадзілі за ім. Шкада, паехаў вучыцца. Потым успомніўся дзядзька Мікола — машыніст электравоза. Потым... Хутчэй бы пазваніў. Калі б ён жыў у гэтым доме...

Шукаць папугайчыкаў расхацелася. Пазваніла маці, потым Соня, шэф з іх піянерскага звяна. Дзяўчынка расказала, што ў школе, што задалі на заўтра. Валодзя запісаў. Радасць не пакідала яго ні на хвіліну.

Соня, а мне папугайчыка абяцалі. Я па тэлефоне пазнаёміўся. Каб ты ведала, які гэта чалавек! Мой цёзка! Вось убачыш, ён з ваенных. Нядаўна дэмабілізаваўся. Так і кажа: «Заўтра ў пятнаццаць нуль-нуль».

Хлопчык ледзь дачакаўся заўтрашняга дня.

Ён баяўся, што на іх лініі раптам абарвецца сувязь ці сапсуецца тэлефон у дзядзькі Валодзі. Баючыся забыць, паўтараў нумар. Рупіла пазваніць самому. Ён набіраў першую лічбу, другую, трэцюю, а на апошняй спыняўся. Калі дамовіліся, нельга непакоіць.

У пятнаццаць нуль-нуль пачуўся званок.

— Я слухаю.

— Вітаю цябе, цёзка. Як здароўе?

— Добрае.

— Ты скажы, да цябе можна зайсці?

— А як жа! Я і маме, і тату пра вас казаў.

— Вельмі добра. Хвілін праз дваццаць буду.

Дзядзька Валодзя быў не падобны ні на марака Жору, ні на дзядзьку Міколу. Значна старэйшы, з кіёчкам і накульгваў.

— Праходзьце!.. Сядайце!.. А я думаў...

— Ты думаў — я зусім малады,— засмяяўся дзядзька Валодзя.

— Вы франтавік, як і мой дзядуля? З «кацюш» стралялі? Праўда? І Берлін штурмавалі?

— Так, брат, адгадаў,— усміхнуўся госць.— Артылерыстам быў. А да Берліна не дайшоў. Пад Варонежам параніла. А дзе твой дзядуля?

— У шпіталі. Яму кожны год трэба лячыцца.

— Знаёмая гісторыя. Ну дык бліжэй да справы.

З кішэні пінжака дзядзька Валодзя выцягнуў невялічкую кардонную каробачку, напакаваную ватай, і дастаў з яе...

— Што гэта?

Хлопчык разгубіўся і не ведаў, што сказаць.

Ну... курынае яйка.

— Зусім правільна! —узрадаваўся дзядзька Валодзя.

Ён асцярожна паклаў яйка на стол пасярод не-

вялічкага кальца, якое зрабіў з вяровачкі, што выцягнуў з кішэні. Потым устаў, адышоў ад стала да дзвярэй і прытуліў абедзве далоні да рота.

— Кр-ру, кр-ру! — пачуўся далёкі, нібы крык крумкача, гук.— Кр-ру, кр-ру, кр-ру!

Яйка само нібы зварухнулася на стале, падкацілася да вяровачкі.

— Такога дзіва ніколі не бачыў? — спытаўся дзядзька Валодзя.

— Не-а,— адказаў хлопчык.

— І не ведаеш, чаму яно круціцца?

Валодзя пакруціў галавой.

— Скора здагадаешся. А не здагадаешся — скажу... Ну, вось што, брат. Папугайчыкаў няма. Але, я мяркую,— гаварыў дзядзька Валодзя,— і без іх абыдземся. Сваіх цудаў вакол нас — поўным-поўна... Вось што. Я пакіну яйка са скрыначкай. Давай паставім ля батарэі. Табурэтка ёсць? Цудоўна! Праз паўгадзінкі паслухаеш. А гадзіны праз дзве-тры будзеш сведкам... Не будзем забягаць наперад. Тады мне пазвоніш. Дамовіліся? А пакуль — бывай!

Не прайшло і дваццаці хвілін, як Валодзя, прытуліўшы вуха да скрыначкі, пачуў выразнае:

— Тук-тук. Тук-тук-тук. Тук-тук.

— Жывое! — узрадаваўся хлопчык.— Куранятка!

А калі з дзірачкі ў шкарлупіне паказалася дзюбачка, Валодзя кінуўся да тэлефона, хуценька набраў нумар і на момант збянтэжыўся, пачуўшы надта ўжо далікатны жаночы голас:

— Я вас слухаю.

«І зноў тыя самыя баязліўцы,— падумалася хлопчыку.— Бедная Зіна. І як я да іх трапіў?»

— А папугаі ў вас... Я ведаю, ведаю! — неяк само сабою вырвалася ў Валодзі.— І ў дзвярах — вочка. А дзверы зачыняюцца на тры замкі з ланцужком!

— Хто гэта? Хто гаворыць? Хто гэ...

Валодзя больш не слухаў. Ён зразумеў, што замест двойкі набраў тройку. І Валодзя нанава круціў дыск.

— Дзядзя Валодзя! Куранятка прадзяўблося! — крычаў хлопчык.— І я здагадаўся, чаму яйка пакацілася...

1973

ВІКТАР ГАРДЗЕЙ

(нарадзіўся ў 1946 г.)

ДАПАМОГ

Брат сядзіць і ледзь не плача —
Не рашаецца задача.
Вось бяда, такое гора:
Як знайсці квадратны корань?

Віцька бачыць роспач брата
І бяжыць у сад з лапатай.
Тут зямля ўся пад нагамі
Заплялася каранямі.

Ён дзірван зразаў да зморы:
Дзе ж ты, дзе, квадратны корань?
Гроб зямлю і потым ціха
Кажа Віцька:
— Шо за ліха?
Карані, дзе ні капаю,
Толькі круглыя вымаю.

1981

ЧАСНОК

На градзе сядзеў часнок
Пасярод гароду.
У расе сцюдзёнай мок,
Мёрз у непагоду.

Тонкі быў.
Ды вось чаго
Сталі пухнуць шчочкі?
Паглядзелі, а ў яго
Выраслі зубочкі.

1981

НІЛ ГІЛЕВІЧ

(нарадзіўся ў 1931 г.)

СНЕЖНЫ ДЗЕД

Колькі шуму, колькі смеху:
Лепім дзеда мы са снегу!
Задала зіма работы —
Па двары кацілі ўтрох —
І паставілі ля плоту.
Дзед стаіць, хоць і без ног.
Замест рук — уткнулі палкі,
Вочы — вугалю кавалкі,
Нос — чарэпак з гладыша,
Барада — шматок кудзелі,
А на лысіну надзелі
Кош замест капелюша.
Ну і дзед! Відаць, яму
Тут стаяць усю зіму.
Будзе ён тут па начах
Наганяць на зайцаў страх,
Каб не бегалі сюды
Сад псаваць наш малады!

1954

СЯБРЫ Ў ПАХОДЗЕ

Як выходзіла з двара
У дарогу дзетвара —
Брала яна рэчы,
Клала іх на плечы:

Грышка ўзяў палатку,
Цішка — коўдраў скатку,
Стась — тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

Толькі выйшлі за сяло,
Цішку муляць пачало.
Стаў прасіць ён Грышку:
— Памажы, брат, крышку!
Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
Стась — тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

І гадзіну не ішлі —
Стася колікі ўзялі.
Стаў прасіць ён Грышку:
— Памажы, брат, крышку!
Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

Як мінулі вёрстаў пяць,
Стала сонца прыпякаць.
Просіць Лёўка Грышку:
— Памажы, брат, крышку!
Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
І ўвесь клунак Лёўкаў,

А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

За гарой, дзе бор драмаў,
Раптам Янка закульгаў.
Стаў прасіць ён Грышку:
— Паднясі, брат, крышку!
Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
І ўвесь клунак Лёўкаў,
І сачкі, й бляшанку,
І... самога Янку!

1962

РАКЕТА-САМАКАТ

Рашыў зрабіць Уладзік
Ракету-самакат.
Стругаў, выпільваў, ладзіў,
Каціўся пот, як град.

Аж да змяркання корпаўся,
Пакуль прыбіў канькі,
І вось — сядзіць у корпусе,
Што касманаўт які!

Ляціць, не перакуліцца
З высокае гары.
За Ўладзікам па вуліцы
Гуртом бягуць сябры.

І ледзь не кожны просіцца
Прамчацца хоць разок,

Бо як яна праносіцца —
Тут санкі ўсе набок!

Нібы між зор дарожачкай
Імчыцца ўніз яна.
Вось толькі недаробачка
Ў ракеце ёсць адна:

Калі ракета спыніцца —
За павадок бяры:
Сама назад не ўздымецца,
Ляціць адно з гары!

1965

МІКОЛА ГІЛЬ

(нарадзіўся ў 1936 г.)

МЫ БАЧЫМ СОНЦА

Ён быў салдатам.

Салдатам ён стаў у тысяча дзевяцьсот сорак першым годзе, калі на нашу Радзіму напалі фашысцкія захопнікі.

Ён быў не проста салдатам. Ён быў сапёрам. Любая салдацкая служба нялёгкая, а сапёрская — ці не самая цяжкая і небяспечная. Бо сапёр — заўсёды наперадзе, там, дзе цяжэй. Там, дзе пойдуць у наступленне танкі, а за імі пяхота, перш пройдуць сапёры. Яны павінны размініраваць пастаўленыя ворагам міны, пракласці шлях танкам і пяхоце.

Вялікую смеласць і мужнасць павінен мець сапёр. А яшчэ — моцныя нервы і ўмелыя рукі. Бо задрыжыць рука, і лічы, няма сапёра — у дрыжачых руках міна можа ўзарвацца. І памыляцца не павінен сапёр. Нездарма ж кажуць: сапёр памыляецца адзін раз. Памылка яго варта жыцця.

Ён быў смелы і мужны, наш салдат, у яго былі моцныя нервы і ўмелыя рукі. Ён не памыляўся. Сотні, а мо і тысячы мін абясшкодзіў ён сваімі рукамі, мосцячы доўгую дарогу да Перамогі. А дарога гэтая і сапраўды была доўгая. Ажно на чатыры гады расцягнулася яна. Да 9 Мая 1945 года. Завяршэнне яе азарылася векапомным пераможным салютам.

Салдат думаў, што служба яго скончылася. Ён

прыехаў дадому, спадзеючыся, што будзе араць зямлю, касіць траву, жаць збажыну. Ды дома яго чакала бяда. На варожай міне, што засталася ў нашай зямлі, падарваўся яго сын-падлетак. І не толькі яго сын. Уся зямля была ўсеяна мінамі, бомбамі і снарадамі — гэтым жахлівым насеннем вайны, і падрываліся на іх дзеці, звяры, птушкі.

Асабліва пакутаваў салдат праз тое, што гінуць дзеці. На вайне ён бачыў нямала смерцяў, але ссівеў у трыццаць пяць гадоў, перажыўшы смерць сына.

Аднойчы ён пачуў: у гарадку, у бальніцы, ёсць цэлая палата падлеткаў, што падарваліся на мінах. Іх палату так і называлі: «Палата мінёраў». Гэта быў жорсткі жарт. Салдат зазірнуў у тую палату. І быў уражаны не меней, чым смерцю сына. Асабліва запомніўся яму хлопчык, у якога замест вачэй былі чорныя правалы. У сэрца салдата запалі словы хлопчыка: «Я не бачу сонца...»

І салдат зноў апрануў шынель. І зноў ачышчаў зямлю ад фашысцкіх мін, снарадаў, бомбаў. Абяскшкодзіўшы чарговую міну, з агідаю адкідваючы яе прэч, быццам забітую гадзюку, ён шораз прыгаворваў: «Больш ты не зможаш нікому патушыць сонца...»

Шмат гадоў рабіў салдат гэтую сваю небяспечную і высакародную работу, каб па зямлі маглі вольна хадзіць людзі і звяры, каб маглі, дзе хочуць, гуляць дзеці.

Але не толькі на нашай зямлі была вайна. Шмат гадоў шугала яна і ў далёкай Афрыцы, на зямлі спякотнага Алжыра. І там таксама паастаўваліся міны, бомбы і снарады, і там таксама гінулі людзі, звяры і птушкі, і там таксама былі «палаты мінёраў».

І калі ўрад Алжыра папрасіў нашу краіну памагчы ачысціць іх зямлю ад рэшткаў вайны, сал-

дат сеў на цеплаход і паплыў у гэтую краіну. Бо ён быў Савецкі салдат, друг, заступнік і абаронца ўсіх сумленных людзей на зямлі.

Ён ні разу не памыляўся, наш салдат. У яго ніколі не дрыжалі рукі. Тысячы мін і снарадаў абяскшкодзіў ён. І там, у далёкім Алжыры, адкідваючы прэч «гадзюку з вырваным джалам», ён гэтак жа, як і дома, прыгаворваў: «Больш ты нікому не патушыш сонца...»

У Алжыры ён на ўсё жыццё запомніў адну невялікую вёсачку. Яго, Савецкага салдата, віталі ўсе яе жыхары. Ён запомніў дзяўчынку, якая падала яму букецік палявых кветак. Дзяўчынка была смуглявая, ажно чорненькая, толькі адна ўсмешка ззяла белізной на яе круглым тварыку. У гэтай вёсачцы ён павінен быў размініраваць поле, якое паспела ўдзірванець. Сяляне спрабавалі яго араць, але некалькі чалавек не вярнулася з таго ворыва — падарваліся на мінах. І вось цяпер сяляне чакалі, што Савецкі салдат верне ім іхняе поле. І смуглявая дзяўчынка падала яму букецік палявых красак.

Ён амаль ачысціў поле. Засталося праверыць зусім невялікі лапік. Але, пэўна, салдат занадта стаміўся...

Надвячоркам наваколле той алжырскай вёсачкі скалануў выбух. Сяляне ўсё зразумелі. Яны прынеслі ў вёску Савецкага салдата. Ён быў жывы, толькі для яго назаўсёды патухла сонца. Ён чуў яго, спякотнае алжырскае сонца, але не бачыў...

Нездарма ж кажуць, што сапёр памыляецца раз у жыцці.

У далёкім Алжыры яго праводзілі дадому тысячы людзей. І тая смуглявая дзяўчынка зноў падала яму букецік кветак, і ён, не бачачы, угадаў, што гэта яна, і правёў па яе шорсткіх валасах

сваёю дужаю рукою. Яго рука мо ўпершыню дрыжала...

А дома даведаўся, што зрабіўся дзедам, што яго дачка нарадзіла яму ўнучку. Унучка была бялявенькая, з блакітнымі вачанятамі, але ён, на здзіўленне ўсіх хатніх, зваў яе чамусьці смуглянкаю. Мо таму, што апошняй у сваім жыцці бачыў тую смуглявую, з белазубай усмешкай алжырскую дзяўчынку?..

Усе мы бачым сонца.

Бачу я.

Бачыш ты.

Бачыць ён.

Бачаць яны.

А па нашай ціхай вуліцы няспешна, намацваючы кійком дарогу, крочыць высокі сівы чалавек. Крочыць былы салдат. Крочыць былы сапёр.

Сонца свеціць яму ў твар, але ён не бачыць сонца.

Затое бачым яго мы.

Бачу я.

Бачыш ты.

Бачыць ён.

Бачаць яны.

Паклонімся ж салдату!

1975

ПЯТРО ГЛЕБКА

(1905—1969)



КАНЕЦ ЛЕТА

Яблыкі даспелі...
У ярах глыбокіх
Дацвітае лета
Цветам журавін.
Адспявалі жнеі
На палях шырокіх.
Заспяваюць скора
Ў небе журавы.

Заўтра нам у школу...
Развітацца трэба
З тымі, з кім гулялі
Летняю парой:

З нашым шумным лесам,
З нашым сінім небам,
З нашаю блакітнай,
Быстраю ракой.

Мы ідзём на поле...
Тонкім павучыннем
І расой халоднай
Крыецца прастор.

Мы ідзём у пушчу...
Быццам у кручыне,
Галаву схіляе

Старадаўні бор.
Мы ідзём да рэчкі...
З намі па дарозе —
З поўначы сцюдзёны
Подых вецярка.
І пад ім на воды
Ліст раняюць лозы,
І шуміць маркотна
Нашая рака.

Чуе, скора лёдам
Будзе ўся адзета,
На палях закружаць
Белыя снягі...
Да спаткання ж, рэчка!
Да другога лета,
Дарагія пушчы,
Нівы і лугі!

Заўтра нам у школу...
За сталы, за парты
Сядзем мы па класах,
Будзем працаваць,
Будзем весяліцца
І вучыцца ўпарта,
Будзем вечарамі
Лета ўспамінаць.

1940

НАШ СЦЯГ

Гарачы, як сонца,
Крылаты, як вецер,
Наш сцяг пурпуровы,
Адзіны на свеце.

Ён кроўю байцоў
За свабоду абмыты,
Ён кулямі ў бітвах,
Як сэрца, прабіты.

Але прамінулі
Нягоды ліхія,
Загоены раны
Яго баявыя.

І ў знак перамогі
Над цемраю горкай
На ім пяцікутная
Свеціцца зорка.

А ў знак, што народы
Пад ім згуртаваны,
У золаце молат
І серп вышываны.

Гарыць ён, над вежай
Крамлёўскай узняты,
Пад ім у паход
Выступаюць салдаты.

Пад ім піянеры
Прыходзяць на зборы,
Пры ім, на бязмежным
Савецкім прасторы,

Заўсёды стаіць
Каравул ганаровы.
А ён развяваецца,
Сцяг пурпуровы,

Гарачы, як сонца,
Крылаты, як вецер,
Свяшчэнны, любімы,
Адзіны на свеце.

1948

ІВАН ГРАМОВІЧ

(нарадзіўся ў 1918 г.)

ВЫПАЎ СНЕГ

Неяк раніцай я прахапіўся і ад нечаканасці аж прысеў на ложку. «Няўжо заспаў?» — мільганула маланкай трывожная думка.

У хаце было зусім светла.

Гэтымі асеннімі досвіткамі, доўгімі і цёмнымі, я прывык раненька ўставаць, паўтараць урокі і выходзіць з дому так, каб паспець на заняткі.

Яркае святло дня мяне напалохала. Няўжо спазніўся ў школу?

Але над ложкам гадзіннік з паржаўленай гірай, якую я, устаючы, заўсёды падцягваў, мерна чэкаў, і стрэлка яго паказвала яшчэ не позні час. Ад чаго ж гэта пабялела столь, ляжанка і печ, і сцены адсвечваюць, як люстэрка? Я прынік да шыбы падвойнага акна і ўсё зразумеў.

На дварэ ўчарашнія змрочныя будынкі, сад, платы стаялі аснежаныя, і ў хату ад іх лілося белае мяккае святло. Зямля, стрэхі, агарод накрыліся белым пакрывалам. Лёгкія пушынкі ляталі, кружыліся ў паветры і асядалі на дрэвы, на аголены куст бэзу ў нашым агародчыку пад акном.

Мяне адразу пацягнула з хаты: я надта люблю гэту часіну...

Я хуценька сабраўся, схапіў кніжкі і пабег.

Яшчэ з парога на мяне дыхнула зіма спакойным халодным дыханнем. Наўкол сцішылася ўсё. Сырыя вятры доўгай восені, якія заўсёды надакучліва шумелі ў галлі бярозы і секлі мне ў твар кроплямі дажджу, сёння замоўклі. Шчокі цяпер прыемна шчыпаў бадзёры марозік. А усюды снежная бель адбірала вочы, і на сэрцы ад гэтага рабілася светла і радасна.

Сам сабою набег у думках і завярцеўся на языку верш — леташні ўрок, які наша настаўніца, Ліда Васільеўна, загадвала вывучыць на памяць. Я вывучыў яго і дэкламаваў. І цяпер ніколі не забуду словы:

Мяккі снег лятае пухам,
І канца яму няма.
І нясе сярдзітым духам,
Дзікім сіверам зіма...

З кніжкамі пад пахай я спяшаўся ў школу і глядзеў, як кружацца гэтыя белыя пушынкі, і чамусьці мне яшчэ ўявілася тое, што было летась.

Летась зіма была надта снежная. На вуліцы намяло вялікія гурбы. Платы схаваліся пад снегам, і стрэхі зраўняла з сумётамі.

Я аднае раніцы ішоў у школу па тых гурбах, што вышэй акон, вышэй брамаў. Ішоў на ўзроўні са стрэхамі хат, дзе дымелі коміны, разносячы прыемныя пахі снедання. А дарослыя выходзілі на ганак з вёдрамі і глядзелі на мяне, малога, знізу ўгору. Крочыў з кніжкамі вышэй за ўсіх...

Я нават зачапіўся шапкай за сук Мікітавай ліпы. А Мікітава ліпа стаяла высачэзная, як хмара, над усім сялом. Улетку яе разлапістых галін нельга было дастаць, нават праязджаючы па вуліцы з высокім возам сена. Яна пышна ўздымалася ўгору, а ў той самы дзень пасля мяце-

ліцы ніжняй галінай сарвала з мяне аблавушку...

У класе Ліда Васільеўна чытала нам па кнізе пра першы дзень зімы. А я сабе, паглядаючы ў акно, дзе відаць была Мікітава ліпа, сядзеў і думаў, што гэта ж учора была яшчэ восень. А сёння ўжо зіма. Гэта ж ніколі так не адчуеш перамену, як у гэты дзень. Як вясну лета змяняе, не заўважыш. Як лета восень — таксама. А вось як настае зіма — адразу відно з самага світання... Выпаў снег!..

Мы вярталіся са школы, а снег не пераставаў буйнымі пушынкамі сыпацца на дол. Кругом было прыволле белых палёў і прастораў. Мае сябры крычалі пра санкі, пра лыжы. Мы кідаліся снежкамі, смяяліся. Нам было весела разам з гэтай мяцеліцай, і мне ад радасці хацелася пад разгалістай ліпай спяваць пра снег, пра зіму...

Зіма, зіма! Ідзі хутчэй, сцялі снягі на поле, на дарогі, на нашу вуліцу! Сып, мяцеліца, круці гурбы, каб я зноў даставаў шапкай дрэвы. Вось якія яны высокія, а заўтра мы памераемся!.. Ідзі, зіма-матуля, каб я хутчэй пабольшаў, каб я падрос!..

Вось так я думаў, бегучы са школы, у той дзень, калі выпаў першы снег, калі ўжо сэрцам адчуў, што нешта мінуў, перажыў, а сустракаю хоць знаёмае, але штосьці такое новае-новае...

1958

СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

(нарадзіўся ў 1913 г.)

ЧАПАЕЎЦЫ

Тры трашчоткі б'юць трывогу,
І трубач стаіць на пні,
Вылятае на дарогу
Сам Чапаеў на кані.

Бурка ўецца, свішча вецер,
Раздаецца шабляў звон.
— Пачакай,— гаворыць Пеця,—
Расцягнуўся эскадрон.

Замаўкаюць свіст і крыкі,
Камандзіры ў рад стаяць.
Карабіны ёсць і пікі,
Толькі «белых» не відаць.

Кожны хоча быць «чырвоным»,
Або пешым, або конным,
І адважны Віця Белы
Болей быць не хоча «белым».

Перабеглі «белякі»
Да Чапаева ў палкі.

Кожны дужы, кожны смелы,
Кожны быць заўжды гатоў,
Як Чапаеў, як Гастэла,
Як Гагарын і Цітоў.

1979

ХТО ВІНАВАТЫ?

Запытала мама ў мышкі:
— Хто тут лазіў у гладышкі,
Паздымаў усе вяршкі,
Панадкусваў піражкі?

Мышка маме адказала:
— Я смятаны не лізала,
Можа, нехта з'еў другі
І вяршкі і пірагі.

Пацягнуўся шэры кот:
— Я не браў смятаны ў рот,
Нават скажуць столь і сцены,
Што зрабіўся я сумленны.

— Ку-ка-рэ-ку! —
Тут дарэчы
Певень выскачыў з-пад печы:
— Вам хлусіць і я не стану,
Кот даўно не еў смятану.

А тым часам вострыць вуха
Каля той гладышкі муха.
Мышка скача, мышка рада:
— Гэта ж муха вінавата.

Не гаворыць толькі Янка,
Дзе падзелася смятанка.

1979

ДЗЯЦЕЛ

Я на елку палячу —
І галінкі палячу:
Дзюба ў мяне доўгая,
Буду стукаць доўга я.

Пазіраю я гады,
Як буяюць ягады:
З журавін зрабіў каралі —
Журавы мяне каралі,
А суніцы ледзь паспелі,
Іх дразды скляваць паспелі.
Я спалохаў іх як след,—
І прапаў адразу след.
Прахаплюся я са сну
І на елку ці сасну
Зноў на досвітку лячу —
Дрэва хворае лячу.

1979

У ЛЕСЕ

Хто, гуляючы па лесе,
На высокі дуб палезе?
Хто, прыйшоўшы у лясы,
Не заўважыў след лісы?
А малодшы брат Алісы
Бачыў, як гуляюць лісы,
Я б таксама бачыць мог,
Каб не лёг на мяккі мох.
Пад бярозаю ляжу
І цукерачку ліжу:
Смага паліць, а вады —
Ані дзе, і авады,
Быццам хмара, наляцелі —
Пухіры гараць на целе.
Я другі надзену ўбор.
І пайду ізноў у бор.

1979

АНАТОЛЬ ГРАЧАНІКАЎ

(нарадзіўся ў 1938 г.)

КРЫЎДА

У Алесі
Дзве касы,
Нібы з шоўку
Паясы.
Іх Алеся заплятае,
Расчасаўшы іх
Спярша.
І я чую,
Як спявае
Радасна яе душа.
Раптам бачу,
Што Алеся
У слязах
На ложак лезе,
Зарываецца
Ў падушку...
Ціха клічу я
Дачушку:
— Што з табою?
Што з табою? —
Толькі
Круціць галавою.
— Загубіла я
Прыколку.
Нехта, мабыць,
Падабраў...
— У слязах

Ці многа толку? —
Спачувальна
Я спытаў.
— Знаю, татка,
Толку мала,
Ды такой мне
Не знайсці.
Я ніколі
Не губляла
Шчэ нічога
У жыцці...
Свет
Дзіцячай
Прыгажосці
Сэрца мне
Ускалыхнуў.
Я дачушцы
Пазайздросціў,
Нават моўчкі
Уздыхнуў.

1981

ПАВУЧОК

Кросны
Выткаў павучок.
Сам схаваўся
За сучок.
Замаркоціўся ён
Трошкі:
Ані мухі,
Ані мошкі
Сёння ў сетку
Не ляцяць.
Зноў галодны

Будзе спаць.
Толькі
Што гэта за грук?
Уляцеў
У сетку жук.
Аж наліпла
Павуцінка
На даўжэзныя
Вусы.
Аж пасыпала
Асінка
Долу
Кропелькі
Расы.
Што рабіць
Цяпер жуку,
Бо павіс ён
На суку?
— Чуеш, чуеш,
Павучок,
Не хавайся за сучок.
Лепей
Вызваль
Мае крылы
З гэтай ліпкай
Павуціны.
З ёю я
Дадому з лугу
Па траве
Не дапаўзу.
Я табе
За гэта
Муху
На вячэру
Прывязу.

1981

ЛЯНІЎЦЫ

Два селішчы
Сваіх ляніўцаў мелі.
Аднойчы
Паспрачацца захацелі
І грамаду
Відовішчам пацешыць:
Усё-ткі
Чый лянівец лянівейшы.
Як кажуць зараз,
Выбралі журы,
І тое
Аж да ранішняй зары
Усё сядзела,
Думала-гадала,
Як пераможцу вызначыць —
Не знала.
Рашылі так:
Зрабіць два буданы,
Пакласці ў іх ляніўцаў.
Хай яны
Ляжаць у буданах,
Нібыта дома,
Бо ні на што не здатныя,
Вядома.
Пасля —
Адначасова падпаліць.
З буданчыка хто першы пабяжыць,
Калі агонь
Пад носам запалае,
Той і прайграе...
Ды пераможцаў
Так і не займелі:
Ляніўцы ў буданах сваіх
Згарэлі.

1981

АЛЕСЬ ГУРЛО

(1892—1938)



НАШЫ ПТУШКІ

У нашым краі — Беларусі —
Ёсць буслы, сарокі, гусі,

Качкі, чыбісы, саколкі,
Чаплі, совы, перапёлкі,

Каршуны, сіваваронкі,
Жаўранкі, шчыглы і слонкі,

Галкі, крумкачы, вароны,
Галубочкі нахахлёны,

Дзятлы, чыжыкі, зязюлі,
Кулікі, сяўцы, жаўнулі,

Шпакі, зяблікі, цяцеры,
Курапаткі пер'ем шэры,

Ластаўкі, і верабейкі,
І сініцы, салавейкі,

Сойкі, пігліцы, удоды,
Што лятаюць без ахвоты.

Каля рэчак, на лужайках
Ёсць глушцы, стрыжы і чайкі,

І вядуцца на балотах
Жураўлі ў густых чаротах;

Па надворку, каля хаты,
Ходзяць куры й кураняты.

Хто сакоча, хто кудахча,
Хто па стрэхах спрытна скача,

Хто на кусціку ў садочку,
Хто на полі, хто ў лясочку,

Хто высока ў паднябессі
Моўчкі ўецца або з песняй:

Пачнуць хорам — не здзівіцца.
Ёсць дзе пець і весяліцца!

1921

ВІКТАР ДАЙЛІДА

(нарадзіўся ў 1930 г.)

ДОБРАЯ ФЕЯ

Надыходзіў Новы год. Людзі ставілі ёлкі, упрыгожвалі іх бліскучымі рознакаляровымі цацкамі. Юля разам з мамай таксама прыбірала сваю ёлачку, чапляла на яе шышкі, жалуды, шары, пеўнікі, цукеркі, яблыкі. На самы вяршок мама прымацавала бліскучую чырвоную зорку, а пад ёлкай пасадзіла вялікага Дзеда Мароза ў кажуху з калматым каўняром, абсыпаным «снегам», і ў чырвоным башлыку. Дзед быў падпяразаны шырокім вышываным поясам з кутасамі. За плячамі — вялікі мяшок.

— Заўтра табе, Юлечка, Дзед Мароз прынясе падарунак,— гаварыла мама, калі яны вешалі гірлянды з электрычнымі лямпачкамі. — Толькі не гэты Дзед, а сапраўдны, жывы. І яшчэ, калі ты будзеш харошай, паслухмянай дзяўчынкай, падарунак табе прынясе і Добрая Фея.

А хто такая Добрая Фея? — не зразумела Юля.

— А гэта ёсць такая цётка, называецца яна Фея,— адказала мама.— Яна ноччу перад Новым годам усім харошым дзецям падарункі прыносіць.

— А адкуль яна ведае, хто харошы, а хто брыдкі? — зноў спытала Юля.

— Ведае. Яна ўсё-ўсё ведае. Усё бачыць, усё чуе, усіх-усіх разумее. Прыходзіць Фея ноччу,

калі спяць не толькі дзеці, але і дарослыя. Ціхенька адчыняе дзверы, нячутнымі крокамі падыходзіць да ёлкі і кладзе пад яе падарунак. А на падарунку нават надпіс ставіць: Юльцы, Наташы або Іванку ці Мішу.

— Няўжо?! — здзівілася Юлька.

— Праўда. Толькі прыносіць падарункі яна таму, хто рукі чыста з мылам мые, хто зубы кожны дзень чысціць, хто палец у рот не бярэ, у каго кніжкі і сшыткі хораша складзены, хто маме посуд мыць памагае, хто спаць у дзевяць гадзін кладзецца. Ну, а хто мурза і неслух, Фея да таго не заходзіць...— махнула рукой мама.

Вечарам Юля хораша прыбрала на сваім стале, дзе рыхтавала ўрокі — сёлета яна ўпершыню пайшла ў школу,— роўненька паскладала ўсе свае школьныя прылады, кніжкі і сшыткі, потым чыста, з мылам вымыла рукі, а павячэраўшы, пачысціла зубы. І калі не было яшчэ і дзевяці гадзін, пачала класціся спаць.

— Нешта ты сёння рана? — спытала мама.

— А Фея ж падарунак прынясе...— адказала дзяўчынка.

— Ах, праўда ж...— спахапілася мама.— А я і забылася. Ну, спі, спі, дачушка.

— Добрай ночы, мамачка,— пажадала Юля маме і дадала:— Я заўтра і косы сама запляту, і хусцінкі свае вымыю, і ў магазін збегаю.

— Ну малайчына...

Юля доўга ляжала, не магла заснуць, усё думала, думала, а што ж гэта за такая Добрая Фея, якая ўсё бачыць і ўсё чуе і якая так любіць харошых дзяцей.

А раніцой, прачнуўшыся, Юля адразу кінулася да ёлкі. Зірнула, а там сапраўды ляжыць вялікі пакунак. І на ім напісана: «Сямашка Юліі».

А ў тым пакунку цукеркі, арэхі, шакаладкі, фінікі і... тапачкі.

— Мамачка, а адкуль Фея ведала, што мне патрэбны новыя тапкі? —спытала Юлька.

— О... яна ўсё ведае...— адказаў за маму тата, які выйшаў з кухні.— Яна ведала, што твае старыя тапачкі знасіліся, і прынесла новыя. Ды паглядзі, якія прыгожыя — цёплыя, мяккія, нібы пуховыя.

Юля надзела новыя тапачкі і зарадавалася. Ах, якія мяккія!..

— А яны і падпісаны нават,— сказаў тата.— Паглядзі, на адным вышыта літара С, а на другім Ю. Сямашка Юліі.

— Праўда, татка...— Юля зірнула і здзівілася яшчэ болей. Але прыкмеціла, што тата падміргнуў маме, усміхнуўся, і раптам не паверыла:
— Ой, вы, мусіць, жартуеце?

— Ды не, што ты...

— Э-э... А чаму ж літары на тапках вышыты якраз такімі ніткамі, якімі мама вышывала мне кофтачку? — Юля ледзь не пакрыўдзілася.

— Правільна, Юлечка,— усміхнуўся тата,— бо кофтачку і тапкі вышывала адна і тая ж Добрая Фея. А хто гэтая Фея, адгадай?

— Гэта мая мама...— засмяялася Юля.

— Правільна, малайчына, адгадала.

Тады Юля падбегла да мамы, абхапіла яе за шыю рукамі і моцна-моцна пацалавала:

— Дзякуй табе, мамачка!.. Дзякуй, Добрая Фея.

1978

МІХАСЬ ДАНІЛЕНКА

(нарадзіўся ў 1922 г.)

МАМА

Лёнькаў тата прывёў новую маму — прыгожую, з бліскучымі завушніцамі жанчыну.

— Гэта твая новая мама,— сказаў ён Лёньку.— Так і клікаць яе заўсёды будзеш.

Ды вось бяда: ніяк не можа Лёнька назваць яе «мамай»: не забыўся ён родную маці, якая год назад памерла. Нават, здаецца, помніць, як прыемна пахнуць яе густыя мяккія валасы.

— Хачу есці,— просіць Лёнька. І мачыха ставіць на стол талеркі.

— Задача нешта не выходзіць,— гаворыць Лёнька.

Новая маці перапыняе сваю працу, садзіцца каля хлопчыка і цярпліва вучыць яго, як лепей рашыць задачу.

Нічога не скажаш: добрая новая маці ў Лёнькі. Але мамай чамусьці ён назваць яе не можа.

Аднойчы пайшоў Лёнька з мачыхай у лес па грыбы. Зусім мала пахадзілі, а ўжо ў Лёнькавым кошыку і баравікі, і падасінавікі, і грузды паявіліся. Зверху хлопчык прыкрыў іх лісцем папараці, галінку з буйнымі чырвонымі ягадамі рабіны паклаў. Азірнуўся, а мачыхі нідзе няма.

— Гэй! — спалохана закрычаў Лёнька.

— Эй! — данеслася ў адказ.

Гэта рэха так адгукнулася — нібы знарок насміхалася з хлопчыка.

— Ого-го! — зноў падаў голас Лёнька.

— Го-го-о-о! — даляцела здалёк.

Заблішчалі слёзы на вачах у хлопчыка. Страшна падалося яму ў лесе: усюды гушчар, мясціны нейкія незнаёмыя.

— Мама! — у роспачы закрычаў Лёнька што было сілы.

— Чаго ты, маленькі? — пачулася праз момант у адказ.— Я тут. Не бойся.

З-за кустоў выйшла новая Лёнькава маці і моцна прытуліла да сябе бялявую галоўку сына.

1979

АВЯР'ЯН ДЗЕРУЖЫНСКІ

(нарадзіўся ў 1919 г.)

РАЗМОВА Ў КОСМАСЕ

Разгорнутая кніга...
Колас.
Нібы чуваць
Знаёмы голас
Палёў зялёных
І лясоў
І шэпт жытнёвых каласоў,
Зямлі далёкае
Дыханне,
Спеў салавейкі
Летнім раннем,
Такі, што сэрца
Замірае...
А космас
Ціхенька люляе.
Прыходзяць думкі,
Думкі-мроі,
І сэрца
Ў радасным спакоі,
Які навеяны паэтам.
Нібыта чуецца
Над светам:
«Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!»

1980

АВЕЧКІ

Я пасу авечкі
Каля самай рэчкі,
Воўна ў іх
Бялюткая,
Мяккая,
Танюткая,
Будзе
На валёнкі,
Будзе на панчошкі,
І на рукавічкі
Застанецца трошкі.

1981



Мастак А. ЛОСЬ

М. Янчанка «Лета ў серванце»



Мастак Т. БЕРАЗЕНСКАЯ

А. Грачанікаў «Казка пра Івана-ганчара і пачвару-цара»

ГЕНАДЗЬ ДЗМІТРЫЕЎ

(нарадзіўся ў 1943 г.)

ГАДЗІННІК

Вісіць гадзіннік на сцяне.
Ён не гадзіны лічыць, не.
Ён ціха цікае:
— Цік-так.—
Нібы пытаецца:
— Ці так?

Я сёння рана-рана ўстаў,
Старанна ложак свой заслаў,
Памыўся я,
Наеўся ўсмак...
А ён — сваё:
— Ці так? Ці так?
Прыбраць у хаце дапамог
І смецце вынес за парог...
А ён — не выцерпіць ніяк —
Пытае зноў:
— Ці так? Ці так?

— Ты што,— гадзінніку крычу,—
За мной цікуеш?!
Не хачу!..
Злазь са сцяны хутчэй, лайдак!
А мне ў адказ
— Цік-так! Цік-так!

1975

УЛАДЗІМІР ДУБОЎКА

(1900—1976)

ПЕРШЫ ЗАРАБОТАК

1

Бацька і маці выхоўвалі сына.
Сын быў уцехай, надзеяй адзінай.

Толькі, на жаль, у падобных выпадках
Часам бывае не вельмі ўсё гладка.

Бацька гаворыць, што хлопцу да працы
Трэба памалу хадзіць прывучацца.

Матчына думка зусім не такая:
«Тая работа яшчэ пачакае.

Можа здарыцца якое няшчасце.
Можа з няшчасця сыночак прапасці...»

Час не чакае. Хлапчына — дарослы.
Стаў паглядаць на дзявочыя косы.

Бацька гаворыць:
— Гультайства даволі!
Так працаваць не пачнеш ты ніколі!

Заўтра выходзь, мой сынок, на работу.—
Сын і пайшоў, але ўсё ж без ахвоты.

2

Ды не паспеў ён прайсці і два крокі —
Хлопца гукаюць сябры-абібокі.

З тымі сябрамі гуляў ён у карты,
З тымі сябрамі ўсялякія жарты...

Вечарам трэба вяртацца дахаты.
«Што зарабіў ты?» — спытаецца тата.

Матка чакае сыночка ля брамы:
— На табе, сынку, рубель серабраны.

Бацька спытаецца пра заработкі,
Вось і адказ яму будзе кароткі...

3

Бацька на сына зірнуў толькі вокам,
Скеміў, што сын быў ад працы далёка.

Але пытае:
— Ну як, галубочак,
Папрацаваў ты свой першы дзянёчак?

Сын падае той рубель серабраны.
Бацька узяў, на рубель і не глянуў.

Зразу рубель у агонь ён укінуў.
— Не зарабляў ты яго,— кажа сыну.

Матка зірнула на сына маўкліва:
«Як ён пазнаў? Гэта нейкае дзіва!»

4

Раніцай зноў, толькі выйшаўшы з дому,
ён напаткаў учарашніх знаёмых.

Зноў абышоў ён работу далёка.
Так дачакаўся і шэрага змроку.

Вечарам трэба вяртацца дахаты.
«Што зарабіў ты?» — спытаецца тата.

Матка спаткала сыночка ля брамы:
— На табе, сынку, рубель серабраны!

Бацька спытаецца пра заработкі,
вось і адказ яму будзе кароткі...

5

Бацька дахаты вярнуўся не рана.
Сын падае той рубель серабраны.

Бацька зірнуў і — ў агонь зноў з размаху!
Сын да сцяны прытуліўся са страху.

— Не працаваў ты ізноў! — кажа сыну.
«Як пазнае ён?» — здзівіўся хлапчына.

6

Досвіткам сын зноў падняўся на ногі,
сэрца смылела ў яго ад трывогі.

Сорамна бацьку ўжо глянуць у вочы:
ён спрабаваў ашукаць яго двойчы.

Зразу пайшоў на работу хлапчына.
Ён працаваў, як сапраўдны мужчына.

Дзень ён цалюткі варочаў каменне,
муляр з каменя выводзіў скляпенне.

Тут ён не бачыў сваіх абібокаў,
тут працавалі ўсе людзі навокал.

Вечарам, толькі заходзіла сонца,
майстар прыйшоў і падзякаваў хлопцу.

— На табе,— кажа,— рубель серабраны,
шчыраю працай тваёй зарабляны...

Сын патрымаў той рубель на далоні:
— Тата здаволіцца, пэўна, сягоння!

7

Матка спаткала сыночка ля брамы:
— На табе, сынку, рубель серабраны!

Сын адказаў ёй:
— Пакінь, мама, клопат!
Маю рубель я сягоння з работы.

Думаю, ім задаволіцца тата.—
З добрым настроем ідзе ён у хату.

8

Бацька сядзіць ля стала і чакае:
— Дзе ж ты так позна, сыночак,
гуляеш?

Сын падае свой рубель серабраны,
шчыраю працай што быў зарабляны.

Бацька узяў і ў агонь яго кінуў.
Як падхапіўся адразу хлапчына!

Выграб з агню яго голай рукою.
— Што ты тут робіш, татуля, такое?

Гэта не жарты! Ад золку да змроку
я працаваў, і было мне нялёгка.

Бацька смяецца, бо сынам здаволен:
— Веру табе я, сыночак, сягоння!

Веру, што ты зарабляў яго шчыра,—
голай рукою з агню нават выграб!

Будзе ляжаць ён асобна, бо першы —
ён і цяжэйшы,
але і мілейшы.

1958

АЛЯКСЕЙ ДУДАРАЎ

(нарадзіўся ў 1950 г.)

БУСЛЫ

Ідучы з лесу, Андрэйка з мамай адпачывалі ля сцірты саломы. Жмурачыся ад сонца, Андрэйка глядзеў у неба. Яму здавалася, што пад канец лета яно зрабілася незвычайна высокім, усё адно як паднялося і стала шырэйшае і большае.

— Мама! — усклікнуў раптам хлопчык.— Глянь: журавы лётаюць! Вунь, над фермай.

Мама сумна сказала:

— Гэта не журавы, сынок, гэта буслы з суседніх вёсак. Кожны год, збіраючыся ў вырай, яны над нашай клёнаўкай кружаць. А ў нас не жывуць...

— Чаму? — спытаў хлопчык.— Ім бы добра ў нас жылося.

— Некалі жылі,— сказала мама,— а цяпер не хочуць.

— А чаму?

— Пакрыўдзіліся. Яшчэ тады, калі я была такая, як ты цяпер.

У першы месяц вайны прыкацілі ў нашу вёску фашысты... Памятаю, як кароўку нашу забіралі, за курамі па двары ганяліся. Пазней гэтыя вылюдкі ўсё спалілі: і хаты, і сады, і дрэвы...

У нашым двары рос вялізны разгалісты дуб. На ім, колькі вёска стаяла, буслы сабе жытло рабілі. Дык вось. Вайна ідзе, а ў буслоў свой

клопат: дзяцей гадаваць, каб да восені іхнія крылы дужымі сталі. І не заміналі ж нікому, а адзін фашыст прыцэліўся ды па буслу з аўтамата часануў... І забіў. Ляжыць бедны птах, дзюба ў пыле. Немцы сабраліся ля яго, гергечуць, смяюцца. Бусліха магла б уцячы, але як жа было ёй сваіх дзетак кінуць? Кружылася над гняздом, пакуль той самы ірад і па ёй не бабахнуў...

Забітая бусліха ляціць на зямлю акурат на немцаў з іх машынамі. І — ці паверыш? — спужаліся яны. Сыпанулі з дарогі да агароджы, прыціхлі нават. Ну, а калі яны паехалі, мы, малыя, збегліся, паплакалі і пахавалі буслоў. А дзед твой злазіў на дрэва і дастаў з гнязда асірацелых буслянят. Мы іх да восені жабамі кармілі. Восенню яны паляцелі ад нас. Пэўна, расказалі ўсім буслам, што тут адбылося, і з таго часу не селяцца яны ў нашай вёсцы.

Мама ўздыхнула і паднялася з саломы:

— Ну, пойдзем, сынок.

Ішлі моўчкі. Андрэйка ўсё глядзеў у неба і думаў. Няўцям яму было, як гэта людзі маглі забіць такую прыгожую птушку... А буслы кружыліся, кружыліся...

І раптам усхвалявана і з радаснай надзеяй хлопчык спытаў:

— Мама, а мо, калі восень пройдзе і снег, і калі я падрасту і ў садзік не буду хадзіць... мо яны прыляцяць да нас? Я іх таксама карміць буду. Я жаб не баюся...

— Мо і прыляцяць,— уздыхнула мама.

— Няхай бы прыляцелі!

Неба з буслами здавалася хлопчыку вельмі прыгожым, ласкавым і спакойным.

1978

МАР'ЯН ДУКСА

(нарадзіўся ў 1943 г.)

ПІЯНЕРСКІ ЛАГЕР «ЗУБРАНЯ»

Аж сто сяброў
адразу
раптоўна знойдзеш тут.
Зноў паўтараем фразу:
«Які цудоўны кут!»

Сінее зверху восень,
Смалісты пах нясе.
Спяць у абдымках сосен
будынкі нашы ўсе.

Ад тых усіх будынкаў,
дзе песня, смех жывуць,
бясконцыя сцяжынкі
у гонкі лес бягуць.

Даўно бягуць —
ніколькі
не зарастуць травой,
прысыпаныя толькі
ігліцай баравой.

На тых сцяжынках вузкіх,
дзе шастае кара,
зямлі ўсёй беларускай
сышлася дзетвара.

У векавечных нетрах,
дзе рушацца грамы,
між старадрэвін ветлых
спазнаем дружбу мы.

І дружба стане святам.
Заўважым неўпрыкмет:
Яна з сасновых шатаў
памкне за намі ўслед.

1980

АЛЕСЬ ЖАЎРУК

(1910—1942)

АНДРЭЙ УШАКОЎ

(1912—1942)



ПРА МАЙГО КАТКА

Ў доміку маленькім
Пад крутой гарой
Я жыву з любімай
Бабкаю сваёй.
У мяне ёсць жвавы
Шэранькі каток,
Жэўжык, непаседа,
Вечна — скок ды скок!
Кожны дзень кацёнку,
Як іду ў дзетсад,
Слухацца бабульку
Я даю загад.
Вечна абяцае
Слухацца каток,
А пасля ў бабулькі
Схопіць з рук клубок...
І давай па хаце
З ім скакаць блазень,—
Бедная бабулька
Ловіць цэлы дзень.
Ўвечары з детсада
Я прыйду сама,—
Знік клубок бабульчын,
Мячыка няма.
Я крычу са злосці,
А каток: «Мяў-мяў,
Я клубка не бачыў,

Мячыка не браў!»
Хвосцікам паводзіць,
Гнецца у дугу,
Трэцца шэрым бокам
Аб маю нагу.
Я ад цёці ўчора
Ўвечары ішла,
На сцяжынцы ў садзе
Вожыка знайшла.
Як мяне убачыў
Хітранькі звярок,—
Ўраз схаваў ён рыльца,
Звіўся у клубок.
Вострыя іголкі,
Быццам бы штыкі,
Натапырыў спрытна
Ў розныя бакі.
— Ну-ка, хто ахвочы —
Падыходзь, герой,—
Нас, браток, не возьмеш
Голаю рукой!
Я яго хусцінкай
Ціханька ўзяла,
Ў дом к сабе прынесла,
Спаць сама пайшла.
Раніцой прачнуўся
Мой блазень-каток,
Бачыць, што такое —
Мячык ці клубок?
Бачыць і не верыць
Ён сваім вачам:
Як жывы, за ложак
Мячык скокнуў сам!
І хутчэй схаваўся
Ад катка ў кутку.
Вось пацеха будзе
Нашаму катку!

Зараз яго лапкай
Ён адкіне ўбок.
Ой жа, як балюча
Колецца клубок!
— Вось табе за гэта! —
Кінуўся ён зноў
І яшчэ балючай
Лапы накалоў.
Запішчаў, заенчыў
Жаласна: «Мяў-мяў!
Гэткіх я ніколі
Цудаў не страчаў,
Каб клубок ці мячык
Мог калоцца так».
І яго панюхаць
Хоча мой бядак.
Не паспела скочыць
З ложка я далоў,
Як блазень цікаўны
Пыску накалоў.
І цяпер сядзіць ён,
Па сваёй віне,
Ўвесь забінтаваны,
Ціхі на акне.
А на панадворку
Сёння за акном
Весела і шумна,
Хораша кругом.
Там вунь трусяняты
Дражняць індыка,
Ловяць кураняты
Майскага жука.
Вераб'ям прывольна
Па двары гуляць —
Некаму сягоння
Вераб'ёў ганяць!
Бусел стаў паважна

На адной назе,
Костку Жук ля будкі
Смачную грызе.
Толькі ён пакінут,
Па сваёй віне,
Ўвесь забінтаваны,
Ў хаце на акне.
Перад ім лякарствы
Горкія стаяць,
Ў дзень па чайнай лыжцы
Трэба іх прымаць.
Тут каток ад гора
Плакаць захацеў,
Ў гэты час на дровы
Певень узляцеў.
Закрычаў штосілы
Ён: «Ку-ка-рэ-ку!
Так табе і трэба
Блазнюку-катку!»

1940

ВАСІЛЬ ЖУКОВІЧ

(нарадзіўся ў 1940 г.)

ПЕРШЫ СНЕГ

Янка ўстаў асеннім ранкам,
на гадзіннік глянуў Янка.
«Сем гадзін, ды — што такое? —
пасвятлела у пакоі».
Хлопчык да акна падбег:
вось дык дзіва — выпаў снег!
— Тата, мамачка, не спіце,
у акно хутчэй зірніце...
Першы снег, бялюткі снег,
колькі ён прысыпаў стрэх,
і сцяжынак, і дарог,
на варотах нават лёг,
двор старанна абяліў,
наваколле асвятліў.
Першы снег, бухматы снег!
Дзе ўжо болей тут заснеш...
Не паспеў паснедаць Янка,
кажа тату:
— Хачу санкі.
(Акурат была нядзеля,
дома ўся сям'я сядзела.)
Тата саначкі прынёс,
а каб хлопчык не замёрз,
малахай дастала мама,
шубку лёгкую таксама.
Цэлы ранак, цэлы ранак
Янка наш правёў ля санак.

І гулялі разам з ім
Ніна, Галя і Яўхім.
А яшчэ на снежны двор
выйшлі Петрык, і Рыгор,
і маленькі Васілёк —
дзеці зблізку і здалёк.
Дружна дзеці снег ляпілі,
крэпасць моцную рабілі.
Там пайшлі ў атаку снежкі,
за разведкай — перабежкі,—
там гарачыя баі
«нашых» з «белымі» былі.
Завадатарам галоўным
Янка быў — ён быў няўлоўны.
Першы снег — усім на ўцеху:
мора гоману ды смеху...
А тым часам пацяплела:
крыху сонейка прыгрэла,
пацякло з высокіх стрэх,
стаў, як мокры цукар, снег.
Крэпасць грозная асела,
горка мігам палысела.
І прыціхлі каля горкі
Янка, Петрык і Рыгорка,
Ніна, Галя і Яўхім...

Першы снег, пусці дадому:
боты мокрыя зусім.

1977

САКАВІК

Крадзецца ў ноч і там блукае
двухградусны слабак-мароз.
Абозу белага чакае,
ды ў воблаках прапаў абоз.

Вясна імкнецца ў наступленне,
рашучы фронт, надзейны тыл.
А на ўзбраенні ўсе праменні.
Трашчаць зімовыя масты.

Сакавіка адчулі сілу
гракі:
— Ура, ура, ура!
Прыслухайся — і ў шуме крылаў
жыве ўжо новая пара.

1979

НЕ ЎМЕЮ, ПАСПЕЮ...

— Сяргей, засцялі свой ложак.
— А я не ўмею.
— Урокі вучы, Сярожа.
— Яшчэ паспею.
— Сыночак, пачысці боты.
— Ай, шмат работы.
— Сяргейка, ідзі паглядзі кіно.
— Вось так бы, мамка, даўно!..
І — на марожанае заадно...

1975

ЯНКА ЖУРБА

(1881—1964)



ПАСТУШОК

Сонца толькі што ўзышло,
Шле наўкол сваё святло.

Над палямі птушак хор:
Спевам поўніцца прастор.

Абуджаецца калгас,
каб паспець на працу ў час.

Выйшаў з хаты пастушок,
І зайграў ён у ражок:

«Тру-гу-гу-гу, тру-гу-гу!..»
Добра будзе на лугу

Сёння статку пагуляць,
Роснай траўкі пашчыпаць».

І кароўкі ўміг яму
Адказалі: «Му-му-му!..

Будзем цэлы дзень гуляць,
Траўку смачную шчыпаць.

Каб спачыць нам у цяньку,
Пабываем і ў гайку.

Там рачулка ўдаль бяжыць;
Мы ваду ў ёй будзем піць.

А як скончыцца дзянёк,
Сонца сядзе за лясок,—

У калгас мы вечарком
Прыйдзем з смачным малаком».

1922—1936

ДЗЕД МАРОЗ

У вопратцы белай,
Шырокай, даўгой,
З вялікай пушыстай
Мятлой-барадой

Прыйшоў к нам здалёку
Дзядуля Мароз,
Завеі і холад
З сабою прынёс.

У бель апранае
Ён дрэвы, кусты,
На рэчках, азёрах
Будуе масты.

Па вуліцы ходзіць
Ды снегам хрушчыць,
Вятры з сабой водзіць,
У дрэвах трашчыць.

Ён грукае ў сцены
І хат, і сяней
Ды голасам гулкім
Склікае дзяцей:

«Выходзьце, рабяты!
Час ладзіць каток.
Дык жыва ж за працу,
Шумлівы гурток!»

1921

ХВЕДАР ЖЫЧКА

(нарадзіўся ў 1927 г.)

У МАМЫ НА РУКАХ

Спіць у мамы на руках сынок,
залюляны мараю салодкай,
нібы склаўшы крыльцы матылёк
спіць пад ласкай сонца на пялёстках.

На руках у мамы хлопчык спіць.
А на ганку летні ветрык лёгкі
ходзіць, хоча брамку адчыніць
у нязнаны свет, у свет шырокі.

Хлопчык спіць у мамы на руках...
Можа, сніць сябе дарослым надта
у прыгожай форме марака
ці ў бліскучым шлеме касманаўта.

Пройдзе час —
і стане явай сон:
выйдзе ў мора, узляціць пад хмары,
працай рук нястомных будзе ён
маладзіць вясновыя абшары.

А пакуль — маленечкі сынок
на руках у мамы спіць салодка.
І жывы трапеча матылёк
над ягонай ільняной галоўкай.

1974

ХІТРЫЯ ГРЫБОЧКІ

Сыраежкі, маслякі,
ці не бачыце, які
я прынёс вам кошык —
новенькі, харошы,
кругленькі, як сонца,
выгнутае донца,
абадочак звіты
з дубчыкаў ракіты?
Лезьце ў кошык новы,
панясу з дубровы.
— Не! — крычаць грыбочкі
з-пад густых кусточкаў.—
Добра нам і ў лесе,
ў кошык не палезем.

І хаваюцца яны.
Вось якія хітруны.

1965

РЭГУЛІРОЎШЧЫК

На скрыжаванні
у форме параднай
стаіць паставы
і наводзіць парадак.

Ён толькі адзін
мае гэткае права —
адкрыць для машын
шлях налева, направа,
пусціць напрасткі іх,
а потым спыніць,
каб пешаходам
дарогу адкрыць.

Дождж, ці туман,
ці буран снегавы —
на скрыжаванні
стаіць паставы.

Наводзіць парадак
на вуліцы ён.
Сігналы яго
для ўсіх нас — закон.

1973

ЯЗЭП ЗАЗЕКА

(1907—1977)

УЛАДАР ПУШЧЫ

У той халодны лістападаўскі дзень сям'я зуброў не прыйшла на падкормку. Гэта вельмі ўстрывожыла даглядчыкаў.

— Што магло здарыцца? Чаму зубры аб'явілі галадоўку? — дзівіліся яны.

Нарэшце вырашылі паклікаць зуброў. І праз хвіліну далёка ў лесе пачуўся моцны голас старшага даглядчыка Сяргея Фёдаравіча.

— Оп, оп, оп!..— клікаў ён і моцна стукаў у парожняе вядро.

Звычайна пасля такога запрашэння на абед у лесе адразу ж чуліся тупат, трэск, шум. Да кармушак з усяе сілы беглі зубры.

Але на гэты раз лес глуха маўчаў. Толькі часамі ў ельніку чуваць было, як выстукваў дзяцел ды цінькалі сініцы.

Мінула больш за гадзіну напружанага чакання, а зуброў усё не было.

Раптам пачуўся цяжкі тупат. На палянку выйшла чарада зуброў. Толькі чамусьці іх было мала. Наперадзе — важак Пум. У яго была высокая гарбатая спіна і дужы шырокі карак.

Зубры падышлі да кармушак, ухапілі трохі корму і заспяшаліся назад у лес.

Сяргей Фёдаравіч непрыкметна, пераходзячы ад аднаго куста да другога, назіркам пайшоў за зубрамі. Ён ведаў, што падыходзіць у лесе да

зброю небяспечна — могуць падняць на рогі. Ён зірнуў у той бок, дзе рэчка рабіла круты павароот і гублялася ў глухіх зарасніках, і застыў ад здзіўлення. На невялічкай палянцы, у кустах, цесным колам стаялі зубры. Яны цягнуліся сваімі пысамі да маленькага зубраняці, з ноздраў іх валіла пара. Нованароджаны быў мышастай масці, пушысты, у завітках. Ён нясмела стаяў на тонкіх ножках. Зубры дыхалі на малога, баючыся, каб ён не змёрз.

Пум стаяў побач з зубранём, трос кудлатай галавой, адганяў тых, хто хацеў дакрануцца да малога.

Назаўтра раніцай зубры зноў спазніліся на падкормку. Сяргей Фёдаравіч заклапочана глядзеў у лес. Марозік пакусваў твар. «Як там зубраня?» — думаў ён.

У гэты час паказалася чарада лясных волатаў. Уперадзе ішоў Пум, за ім — маленькае зубраня. Маці асцярожна і ласкава падштурхоўвала яго. За малышом ішлі астатнія зубры.

— Вядуць, вядуць! — зарадаваўся Сяргей Фёдаравіч.

Прагаладаўшыся, чарада дружна накінулася на корм. Зубраня ўвесь час прыставала да маці, штурхала сваім лобікам пад бок і перашкаджала есці.

* * *

Настаў студзень.

Снег сыпаў і сыпаў, даверху пазасыпаў кусты, замёў дарогі і сцежкі. Лес прыбраўся ў бель.

За гэты час зубраня падрасло, падужэла. Малыш змяніў мышастую поўсць на гладка бурую, на спіне з'явілася гарбінка, на лбе прарэзаліся рожкі — надзейная і грозная зброя зброю.

Пум пачаў вучыць малога гнуць дрэвы і здабываць сабе ежу. Стары зубр наваліцца ўсім целам на граб або рабіну, прыгне дрэва да зямлі і трымае яго пад сабою, а зубраня ад'ядае галіны.

Зубраня было вельмі вясёлае, жвавае і любіла забаўляцца з Пумам. Стары зубр стаіць, як бурая скала, прыгнуўшы магутную шырокую шыю, а малы ўпіраецца ў яго шырокі лоб сваім вузенькім лобікам. Доўга яны дужаюцца. Калі малы заўзята пачынае наступаць, Пум адыходзіць, нібы паддаецца, і нарэшце кідаецца наўцёкі. Тады зубраня радасна бяжыць за ім, каб дагнаць.

* * *

Надышоў люты. Пабольшаў дзень. Палымнела на захадзе пурпуровая зара.

У зброўніку рыхтаваліся да вячэры. Даглядчыкі накладалі ў кармушкі сена і вецце.

Цяпер зубры не пазніліся. Яны спяшаліся да кармушак. Малы чамусьці не хацеў падыходзіць да корму. Ён стаяў каля агароджы, фыркаў, у вачах было нешта затоенае і дзікае. Толькі Сяргей Фёдаравіч выйшаў з зброўніка, малы наляцеў на яго і стукнуў ілбом так, што даглядчык распластаўся на снезе. Здавалася, зубраня адчула сябе пераможцам. Яно шалела ад радасці, бегала вакол кармушак. Сяргей Фёдаравіч паспрабаваў устаць, але зубраня зноў падбегла да яго і нагнула галаву для новага ўдару. У гэты момант Сяргей Фёдаравіч схапіў яго левай рукою за правую нагу крыху вышэй капыта, а правай — за рожкі і звалiў на снег. Зубраня не чакала гэтага. Яно ўмомант усхапілася на пругкія ногі і здзіўлена пазірала на даглядчыка. Малое, відаць, адчула сілу і спрыт чалавека.

1967

ВАЛЯНЦІН ЗУБ

(1915—1980)

ЯК ТОЛІК ПРАСЛАВІЎСЯ

Толя Касцюковіч ужо не маленькі хлопчык. Ён вучыцца ў чацвёртым класе. І вельмі любіць чытаць кнігі, асабліва пра хлопчыкаў і дзяўчынак, якія праславіліся ў час вайны. Толік упэўнены, што калі б ён жыў у той час, дык таксама зрабіў бы які-небудзь подзвіг. Забіў бы якога фашысцкага генерала ці ўзарваў бы склад з боепрыпасамі. Або прабраўся ў варожы штаб... Ён і сам добра не ведае што, але абавязкова зрабіў бы нешта гераічнае. Такая ўжо ў яго натура...

Толік не раз думаў аб тым, як жа праславіцца цяпер, у наш мірны час. Яму так хацелася, каб аб ім напісалі хаця б заметку ў піянерскай газеце. І каб яе прачытаў гэты задавака Жора, які мае веласіпед «Арлёнак», носіцца на ім па вуліцы і нікому не дае пакатацца.

Але што можна прыдумаць, калі цябе не бяруць ні на цаліну, ні ў экспедыцыю ў Антарктыду...

Аднойчы Толік валяўся на ложку і абдумваў розныя планы. Раптам у адчыненае акно заляцеў шпак. Толя ўмомант падхапіўся і зачыніў акно. Шпак быў яго палоннікам.

Зусім нечакана слава сама прыляцела ў Толевы рукі. Так, так, хлопчык не сумняваўся, што

гэты шпак прынясе яму славу. Якраз нядаўна ён прачытаў у кнізе, што адзін чалавек навучыў шпака гаварыць некалькі слоў. Вось і ён навучыць шпака размаўляць. І пойдзе аб ім слава! Спачатку загавораць у школе, потым напішуць у газеце, і ён стане вядомы на ўсю рэспубліку. Цяпер жа перш за ўсё трэба было зрабіць для шпака клетку, каб яму было дзе жыць. А затым паступова прывучаць яго да сябе, да людзей і пакрысе вучыць гаварыць.

Бацька Толі вельмі здзівіўся, калі ўбачыў сына ў калгаснай майстэрні, дзе працаваў сталяром. Колькі разоў ён гаварыў яму: «Заходзь да мяне, прыглядайся, як і што я раблю. У жыцці ўсякае рамяство спатрэбіцца». Але Толя і слухаць не хацеў.

— Навошта мне. Я хачу быць лётчыкам, а не сталяром,— адказваў ён.

А вось цяпер прыйшлося ісці да бацькі і прасіць яго, каб дапамог зрабіць клетку. Але бацька адмовіўся.

— Рабі сам! Мне няма часу. Трэба было прыходзіць, калі запрашаў.

Аднак бацькава сэрца не камень. Ён усё ж даў сыну сякія-такія парады, паказаў, як і што рабіць. І Толя ўзяўся за работу.

Ён выстругаў палачкі, планачкі на каркас для клеткі. Паступова работа захапіла яго. У майстэрні прыемна пахла смалістай сасной. Здавалася, быццам ты знаходзішся ў лесе. А як прыемна, калі шурпаты, нязграбны кавалак дрэва — варта толькі прайсціся па ім гэблікам, а потым фуганкам — ператвараецца ў тваіх руках у роўненькую, гладзенькую планачку.

Два вечары Толя рыхтаваў палачкі і планачкі, потым награваў у печы тонкі дроцік і прапальваў ім дзірачкі ў планках. Яшчэ два вечары

ён абрашэчваў каркас дротам. Нарэшце клетка была гатова.

Толя паказаў сваю работу бацьку. Той доўга, уважліва аглядаў клетку, потым заўважыў:

— У цябе ёсць здольнасці да сталяркі. Дарэмна ты цураешся гэтай работы.

— Ат! — махнуў рукой хлопчык і хутчэй пабег у хату, каб пасадзіць шпака ў клетку.

Але птушкі ў пакоі нідзе не было.

— Мама, дзе мой шпак? — усхвалявана спытаў Толя.

— Шпак? А я яго выпусціла. Вельмі ж ён біўся ў акно. На волю прасіўся. Мне шкада яго стала, я і выпусціла.

— Усё, усё, загінула! — заплакаў Толя.

Тут якраз у хату зайшлі Дзіма і Пеця, каб разам ісці гуляць на вуліцу, і Толя хуценька выцер вочы. Не будзе ж ён ліць слёзы пры сваіх школьных таварышах.

Сябры адразу ўбачылі клетку і спыніліся ля яе, як зачараваныя.

— Толік, дзе ты ўзяў такую клетку? — спытаў Дзіма.

— Сам зрабіў! — буркнуў Толя.

— Сам? Не можа быць! — не паверылі хлопчыкі.

— Чаму не можа? Я чатыры вечары на яе патраціў.

І Толя расказаў сябрам, як да іх заляцеў шпак і яму прыйшлося рабіць для яго клетку. Аб сваіх надзеях, аб тым, як ён збіраўся праславіцца з дапамогай шпака, Толя, вядома, змоўчаў.

— А цяпер мама выпусціла яго...

— Дык аддай клетку на нашу школьную выстаўку «Умелыя рукі». Ты ж ніколі не ўдзельнічаў. А там многа прыгожых рэчаў ёсць.

І хлопчыкі, не чакаючы Толевай згоды, схапілі клетку і памчалі проста ў школу.

Назаўтра ўсе аднакласнікі віншавалі Толю з цудоўнай клеткай. А калі выстаўка закрывалася і падводзілі вынікі, Толю прысудзілі першую прэмію. Хутка пра яго напісала і піянерская газета.

Так зусім нечакана да Толі Касцюковіча прыйшла слава.

Вось і ведай пасля гэтага, дзе і як можна праславіцца.

1962

ВАСІЛЬ ЗУЁНАК

(нарадзіўся ў 1935 г.)

БЫЎ ГАДЗІННІК...

Быў гадзіннік у Антося,—
Як і ўсім яму жылося:
Стрэлкі весела хадзілі,
Беглі весела гадзіны.

Падымаўся роўна ў сем,
Быў у школе, як і ўсе.
Адсядзіць сабе — а потым
Пачынаецца работа!

Быў гадзіннік рыбаком,
Быў гадзіннік грыбніком:
Кожны дзень — гадзіны тры
То на рэчцы, то ў бары.

Быў гадзіннік футбалістам,
У «дзявятку» біў са свістам,
Дзве гадзіны біў з ахвотай,
Аж хісталіся вароты.

Быў гадзіннік тэле-мальцам,
Знаў праграму як два пальцы:
Перакуліцца на бок —
Пяць гадзін — кіно ды бокс.

Быў гадзіннік вундэркіндам,
На пытанні быў не жмінда:

Сто пытанняў — маме, тату,—
Клуб цікаўных, а не хата!

Дзве гадзіны на развагі,
На размовы-перамовы —
І гадзіннік больш не цягне,
Стрэлкі спаць даўно гатовы.

Ну й гадзіннік! Ну й гадзіннік:
Паглытаў усе гадзіны,
А на ўрокі для Антося
Ні адной не засталося...

1965

ЛІМОН

У акно глядзіць Лявон:
На катку і смех, і звон!
— Надзявай хутчэй канькі! —
Клічуць хлопца сяброкі.
А Лявон — ні за парог,
Бо Лявон жыццё бярог.
Ноччу ў горле чуўся хрып,—
Ну а раптам — гэта грып?!
Сціхла мама, сумны тата,
Пазіраюць вінавата,
Нават снедаць не змаглі,
Што дзіця не ўбераглі.
І каб вірус той не вырас,
Каб здароўе не падсек,
Дзед-сусед параіў шчыра:
«Хай лімонаў пасасе...»
Тата мігам з магазіна
Лекаў выпісаў карзіну.
Пачалося ў тое ж ранне

З хіжым вірусам змаганне!
Слаўна хлопцам на катку,
Чырванец — на ўсю шчаку!
Жарты там, і смех, і звон.
А Лявон сасе лімон.
Дзень сасе і два сасе,
Нішчыць лекі пакрысе...
Покуль скончыўся запас —
Дык вясновы грымнуў час.
Налімоніўся Лявон:
Ходзіць жоўты, як лімон.

1974

КАЧАН НА П'ЕДЭСТАЛЕ

— Цуда бачылі ці не?! —
Дзівяцца ўсе чыста.
«Два пуды»! —
На качане
Надпіс залацісты.

Выступае важна Стась:
Той качан —
Каб зналі —
Ён расціў.
І можа стаць
З ім на п'едэстале!

Аж на пяць вакольных сёл
Хлопец пахваляўся,
Ды на выстаўку казёл
Вечарам забраўся —

Да капусты акурат...
Хоць было і ўлішку —



Мастак В. СЛАВУК

Р. Барадулін «Кошкі ў кошыку»



Мастак Я. ЖЫЛІН

П. Прануза «Фарбы восені»

З'еў рэкордны экспанат,
Нават з качарыжкай!

Мы да Стася — як адзін —
Ранкам прыімчалі:
— Ты ж на выстаўку, глядзі,
Зноў прынось качанне...

«Зноў прынось!»
А возьмеш дзе? —
Пуста ў Стася
На градзе...

Ён рэкорда цэлы год
Мужна дабіваўся:
Хоць быллём зарос гарод,
А качан удаўся!

Ды такая вось бяда
Стрэла рэкардыста:
Памаўзлівы барадач
Славу згрыз начыста!

1965

ВОЛЬГА ІПАТАВА

(нарадзілася ў 1945 г.)

МАСТАЧКА

Раніца —
Мастачка слынная.
Любіць прыгожасць дарыць.
Яркай стужкаю малінавай
Небакрай ужо гарыць.

І зялёныя, і сінія
Там, удалечы, лясы.
А чырвоны
Падасінавік —
У жамчужынках расы.

Вельмі раніца
Стараецца:
Возьме пэндзаль свой
Лясны —
Жоўты промень загараецца
На вяршаліне сасны.

Ды найбольш
Ружовы колер ёй
Даспадобы, да душы.
Вось таму і сны ружовыя
Бачаць ранкам
Малышы.

1982

ДРОЗД МІХЕД

Абляніўся дрозд Міхед:
Не ўстае ён рана,
А палюе на абед
Ў садзе ля фантана.

Што, нібыта дождж густы,
Палівае там кусты.

Дрозд упэўнены такі,
Што чакаць — хвілінку.
Даждж авыя чарвякі
Падстаўляюць спінкі.

Ім здаецца — дождж ідзе,
Зацягнула неба.
А дразду пры той хадзе
І лятаць не трэба.

Тут на спрыт, на гарт — забудзь!
Спі — хоць да абеда!
...Хутка крылы адпадуць
У ленага Міхеда...

1982

БРАЗГОТКІ

Пад дугой вісяць бразготкі.
Не чуваць ад іх ні ноткі.
Панясецца конь наўскач —
А яны маўчаць,
хоць плач.

— Што маўчыце вы, бразготкі?
— Мы жывём у прагнай цёткі,

Не дае яна ніколі
Ані хлеба,
Ані солі.

Ані мяса,
Ані круп.
Надрываць навошта пуп?

Забяру хутчэй бразготкі
Я ад гэтай
Прагнай цёткі.
Дам хутчэй ім смачнай кашы,
Напаю іх сыраквашай.

Іх пад новенькай дугой
Конік павязе з сабой.
І няхай тады ў ахвотку
Цэлы дзень
Звіняць
Бразготкі!

1982

ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ

(нарадзіўся ў 1912 г.)

ДЗІВА-ПТУШАЧКА

Больш месяца ў нас на Гомельшчыне стаяла такая гарачыня, што станавіцца босымі нагамі на зямлю было горача. Пякотнае паветра, здаецца, звінела як нацятая струна. Сонечныя праменні апоўдні былі падобны на раскалёныя іголкі. Кветкі пачалі вянуць і засыхаць, лісты на гародніне пажоўклі, а на дрэвах скручваліся ў маленькія трубачкі.

Дзядуля наш Мацвей сказаў нам, унукам:

— Яй, яй, такой гарачыні і не памятую...

Днём збіраліся мы, я — Даша, мой брацік Юрачка і яго сябар Віталік, у зацемненых сенцах і сядзелі сабе там ажно да вечара. Віталік, праўда, як старэйшы пераказваў казкі.

К вечару гарачыня спадала, і мы выходзілі на дзедаву сядзібу, углядаліся ў заціхлае наваколле, у тое, што робіць наш дзед Мацвей. Нам з Юрачкам, гарадскім яго ўнукам, якія прыехалі адпачыць на свежым паветры, цікава было ўсё, што тут на вёсцы адбываецца. А дзед, калі рабілася халаднейшы, то бульбу акучваў, то агуркі паліваў, то яшчэ што рабіў. У такую пару дня ён не сядзеў у хаце.

І вось сёння выйшлі мы на падворак. Глядзім туды-сюды, а дзеда не відно. Пайшлі за брамку, што адгароджвала каліткаю падворак ад усяе сядзібнае зямлі. Прыглядаемся. А наш дзед

са шлангам у руцэ стаіць пад самай большай яблыняй і струмень вады, якую падае з калодзежа насос, накіроўвае на самую сярэдзіну галін яе. Цікава нам стала. Такога мы яшчэ не бачылі. Ціха набліжаемся да дрэва, падыходзім да дзеда бліжэй і бліжэй.

А вось і ён нас заўважыў. Чуем ціхі, нават нейкі патаемны яго голас.

— Дашачка, Юрачка, Віталік, хадземце да мяне... Во, сюдой...

І ён паказаў нам, з якога боку падыходзіць да яго.

Віталік як старэйшы пайшоў першы... І ішоў ён па градках, ціха і асцярожна ступаючы якраз туды, куды паказваў наш дзед. Мы з Юрачкам ішлі след у след, прадчуваючы нешта такое таемнае, невядомае.

Калі падыходзілі бліжэй, дзед наш Мацвей прыклаў пальцы адной рукі да вуснаў, маўляў ні гуку, і рукою паказваў станавіцца ўсім за яго спіною. Мы паслухаліся. А ён вышэй і вышэй падымаў шланг, і струменістыя пырскі вады тым часам стваралі своеасаблівы дожджык, які дасягаў галін яблыні.

— Глядзіце туды,— ледзь чутныя былі яго словы. Вочы свае ён скіраваў следам за струменем вады.

Пачалі і мы ўглядацца. Заходзячае сонца тым часам злучала свае праменні з пырскамі дзедавай вады, і нам паказаліся прыгожанькія срэбныя крышталі, якія вось-вось паяўляліся на лісточках і дробных галінках і тут жа знікалі.

І тут дзед Мацвей не маўчаў:

— Глядзіце, глядзіце,— ледзь не шаптаў ён і вачыма клікаў нас сачыць за струменьчыкам вады, які ён накіроўваў у самую густэчу галінак яблыні.

— І не варушыцеся! — сам дзед стаяў як застыглы на адным месцы, аніякіх рухаў не рабіў, то падымаў крыху, то апускаў шланг, асцярожна трымаючы яго ў руках.

— Ой,— войкнуў Юрачка.

— Ціха,— пачулася ад дзеда.

Мы ўсе ўжо адначасна заўважылі ў срэбных крышталіках на галінцы варухлівую маленькую-маленькую птушку-камячок. Яна гойсала на адным месцы, імгненна паварочвалася з боку на бок, падстаўляючы пад пырскі вады ўсю сябе. Крыльцы яе трапяталіся, галоўка хісталася, ножкі ажно танцавалі. Ва ўсім гэтым была такая радасная здаволенасць, такая пекната ад купання, што дзіва-птушачка нікога з нас і не заўважала. І вось добра змачыўшы свой пуховы ўбор, птушачка гайсанула прама дзеду на галаву і, жвава крутануўшыся, борздзенька паляцела ў суседні з вёскаю лес.

А дзед глядзіць на нас і так радасна ўсміхаецца.

Глядзім, усё яшчэ маўклівыя і непарушныя, і мы на дзядулю нашага. Чакаем, што ён скажа.

— Бачыце,— пачулася нам,— пакупалася ў мяне, падзякавала і паляцела. Гэта ж ад такой пякельнай пагоды ў нас у наваколлі ўсе раўчукі і рэчачкі перасохлі... Дзе ж ёй, беднай, калі не ў мяне, асвяжыцца, бадзёрасці займець...

Здзіўленыя, убачыўшы такое, моўчкі глядзелі мы на нашага дзеда Мацвея.

1980

ВАСІЛЬ КАВАЛЬ

(1907—1937)

НОВЫ ЧЫРВОНААРМЕЕЦ

(З аповесці «Санька-сігналіст»)

У нашым ударным палку было адзінаццаць маленькіх чырвонаармейцаў. Іх называлі выхаванцамі. Служылі яны ў музычнай камандзе. Вучыліся на медзяных трубах, кларнетах і флейтах па нотах іграць песні і паходныя маршы.

Без музыкі і песняў цяжкімі здаюцца баявыя паходы. Мы любілі музыку, і песні, і гучныя маршы. За гэта мы таксама любілі нашых адзінаццаць маленькіх чырвонаармейцаў.

Аднойчы вясною ваенком прывёў дванаццатага.

Яму было год чатырнаццаць, быў ён худзенькі, невялічкі і спрытны, як лісіца. Ён стаяў сярод казармы — замурзаны, у вялікіх чаравіках на босую нагу, у шэрай паношанай куртачцы.

— Гэта новы чырвонаармеец,— сказаў ваенком і загадаў старшыні нашай роты звадзіць яго ў лазню і выдаць шынель, боты і шлем.

— Слухаю, таварыш ваенком,— адказаў наш старшыня Савонька.

Хлапчук уздрыгнуў і скоса паглядзеў на свае мокрыя чаравікі. Тут усё было дзіўным. Навокал у казарме была такая чыстата і такі ўзорны парадак, што хлапчуку, можа, у першы раз, стала сорамна за свае брудныя рукі.

— І-іш ты! — ціхенька свіснуў ён, схаваў рукі ў кішэні і ўжо смялей агледзеўся па баках.

У куце, у пірамідзе, стаялі новенькія вінтоўкі, бліскучыя кулямёты. Ложкі, якія стаялі каля белай сцяны адным стройным радам, былі гладка засланы шэрымі коўдрамі. Хлапчук асабліва здзівіўся, калі ўбачыў на вокнах кветкі — чырвоныя, сінія, яны цвілі, як летам! На сценах былі плакаты з вялікімі літарамі, чорнымі і чырвонымі. Літары чамусьці заскакалі перад вачыма ў хлапчука. Ён перавёў позірк на партрэты.

Хлапчука абступілі плячыстыя рослыя чырвонаармейцы, аглядалі яго і ветліва ўсміхаліся. Хлапчук таксама пазіраў на іх знізу ўгору. Вочы ў яго блішчалі з-пад крутога лба, часта міргалі бялёсымі раснічкамі.

— А ў вас тут до-обра! — здзівіўся ён і, матнуўшы галавою на партрэты, весела прагаварыў: — А я іх усіх ведаю. Вось гэты, што на кані,— Варашылаў, а гэты — з вялікімі вусамі і ромбамі — Будзённы. Гэта пра іх спяваюць песні.

— Глядзі ты! Які баявы!

Адзін плячысты і высокі чырвонаармеец нагнуўся і запытаў:

— А як жа цябе, сарока-варона, зваць?

— Завуць — Санька, а па прозвішчу не сарока-варона, а — Шпак. А цябе як? — у сваю чаргу спытаў Санька.

Чырвонаармеец, усміхаючыся, ступіў крок наперад, выцягнуўся перад Санькам у струнку і з размаху прыклаў руку да круглай, коратка пастрыжанай галавы.

— Эге, пастой,— перабіў яго Санька,— да голай галавы рукі не прыкладаюць!

— Вінават! — нібы спалохана, выгукнуў чырвонаармеец, зняў з галавы ў таварыша шлем, надзеў яго і пад дружны рогат аддаў Саньку «рапарт».

Потым Санька надзеў белую сарочку і паверх

яе гімнасцёрку, якраз на яго ўзрост. А потым надзеў новыя боты і шынель, якраз не на яго ўзрост.

— Што велікаваты — гэта яшчэ лепш: навыраст будзе,— заўважыў Савонька.— Ты ж у нас будзеш расці хутка.

Санька ўсім быў задаволены.

— Няхай навыраст! Затое які шынель, якая шапка!

Ён доўга круціўся на адной назе перад вялікім люстрам і сам сабе падміргваў:

«От, які ты стаў, Санька! Замест старых чаравікаў у цябе новыя боты. Замест шапкі з аблупленым казырком новая, ды яшчэ з чырвонаю зоркаю. А пра шынель і гаварыць няма чаго: гэта не шынель, а шынелішча! Ну і Санька! Яго ніхто не пазнае з дзетдома».

Старшыня і Санька выйшлі з лазні і плячо ў плячо ішлі па шырокім двары на кухню. Санька выцягваўся на дыбачках і закідваў галаву, але ўсё роўна даставаў Савоньку толькі да пляча. Калі іх па дарозе напаткаў камандзір палка, старшыня прывітаўся і ўзяў пад казырок. Санька таксама прывітаўся, сказаў: «Добры дзень» і прыставіў да казырка руку — толькі не правую, а левую.

— У вашага камандзіра,— шэптам заўважыў Санька,— чорныя вусы і шрам на лбе. Ён, відаць, сярдзіты?..

— Калі правінішся, бывае, сярдзітым, а так — добры,— растлумачыў Савонька.— А шрам у яго ад варожай шаблі, ён многа ваяваў.

— Можа, і ордэн мае?

— Вядома, мае,— з гордасцю адказаў Савонька.— І ваенком таксама мае ордэн. Яны, брат, разам на грамадзянскай вайне былі. У адным палку служылі.

— І-іш ты...

На кухні чырвонаармеец у белым фартуху наліў з вялікага катла міску баршчу з мясам. Санька еў, боўтаў пад сталом нагамі і падміргваў кухару. Кухар стаяў з медным чарпаком у руках каля стала, глядзеў на Саньку і дапытваўся.

— Можа, яшчэ хочаш кашы?

— Ух, я баюся, ці з'ем гэтую. У мяне жывот зрабіўся тугі як барабан.

Старшыня Савонька моўчкі сядзеў за сталом, абапёршыся на руку. Глядзеў ён на худы, з дробнымі вяснушкамі Санькаў твар. Такі сур'ёзны Савонька, усё думае, пра ўсё клапоціцца...

А Санька адсунуў ад сябе міску з недаедзенай кашаю, аблізаў лыжку, кашлянуў і пахваліў кухара і старшыню.

— Кормяць у вас добра! Але кажуць, строга ў вас. Толькі — мне не страшна. Калі строга — можа, я і ўцяку.

Савонька палажыў яму руку на плячо і строга сказаў:

— Нікуды ты не ўцячэш. Няма куды табе ўцякаць. Эх ты!.. Лепш пойдзем — завяду ў музычную каманду.

— Гэта я пажартаваў,— хітравата ўсміхаючыся, адказаў Санька.— Уцякаць я не буду. Мне тут добра.

1934

ВІКТАР КАЗЬКО

(нарадзіўся ў 1940 г.)

ХЛОПЧЫКІ І КОНЬ

Пасля поўначы дзіцячы дом моцна спаў. Драмаў у кабінеце дырэктара дзяжурны выхавацель. Спалі ў палатах усе хлопчыкі і дзяўчынкі. У гаспадарчых будынках глыбока ўздыхалі і варочаліся валы і час ад часу ржаў конь, якога нашы салдаты пакінулі ў час наступлення: ён тады быў паранены і вельмі слабы. Ад будынка да будынка чорнымі ценямі праляталі кажаны.

Спаў разам з усімі хлопчыкамі ў сваёй палаце і Васька-Капун. Спаў — і раптам, невядома чаму, прачнуўся. Хлопчык намагаўся зноў заснуць, угаворваў сябе, што ноччу не спяць толькі зладзеі, але гэта не памагло. І тады ён сеў на ложак і пачаў думаць: чым бы заняцца? На вуліцу ісці не хацелася — там, напэўна, выпала ўжо раса. А чаравікаў у яго не было. Каб хлопчыкі не паўцякалі з дзіцячага дома, чаравікі на лета ў іх пазабіралі. «Нічога,— думаў Васька,— прыйдзе восень, выдадуць новыя, і тады ўсё роўна ўцяку».

Капун злез з ложка, падышоў да расчыненага акна. Яго абдало вільгаццю і густым водарам кветак. Васька чхнуў і вярнуўся на ложак.

«Пагутарыць бы з кім?» Аднак гутарыць яму не было з кім. Ён не меў у дзіцячым доме ніводнага сябра. Ён быў адзін, зусім адзін на свеце. Нават не ведаў, ці былі ў яго калі бацькі.

У акно зазірнуў месяц. Ён асвяціў палату: нікеляваныя ложкі, белыя просціны, шторы на дзвярах. Васька падцягнуў калені, паклаў на іх падбародак і прыціх. Ён глядзеў з-пад ілба на месяц і адчуваў, як па ягоным твары мільгацяць цені рухавых лісткоў і галінак дрэў. Яму было маркотна.

А побач хроп Лёнька-Мыса. Хроп і нават прысвістваў. Васька саскочыў з ложка і сцягнуў з Лёнькі-Мысы коўдру. Лёнька прачнуўся і сеў.

— Чаго табе? — спытаў ён у Ваські, жмурачыся ад месячнага святла.

— Давай пагаворым...

— Ты лунацік? Ноччу па даху ходзіш?

— Не, не спрабаваў.

— Тады спі,— пазяхнуў Мыса.— Спі.

— Хочаш, я зараз з могілак крыж прыцягну? — перайшоў на шэпт Васька. І сам спужаўся: а раптам Лёнька скажа адчэпнае: «Ну, цягні». А на могілках было жудасна нават днём.

На шчасце, Лёнька не захацеў.

— Я спаць буду. Крыж — гэта нецікава,— сказаў ён.

— Нецікава? Го! — асмялеў Васька. — Ты ідзеш, а мярцвяк за табой: «Аддай мой крыж!» — І Васька працягнуў растапыраныя пальцы да горла Мысы. Мыса злосна адпіхнуў Ваську:

— Хочаш, каб я цябе зноў адлупцаваў. Забыўся?

— Сёння ты мяне не адолееш. Сёння свеціць месяц. А пры месяцы я дужы. Мы з ім заадно,— сказаў Капун і зноў сцягнуў з Мысы коўдру.— Ведаеш, колькі ў мяне цяпер сілы... Дам табе шчалбана, і твой лоб — напалам, як грэцкі арэх.

— Бі! — падставіў свой лоб Мыса.— Толькі глядзі, каб пасля не шкадаваў.

— Ты мне не верыш. А я праўду кажу. Месяц мне памагае. Я ўвесь жалезны! Твой лоб ураз трэсне.

І Васька верыў, што так будзе.

— А ты не маніш?

— Не...— Васька чамусьці здрыгануўся і змоўк.

— Ну, чаго ты? — сказаў Мыса.— Давай гаварыць, а то страшна.

Капун пачаў хутка хадзіць паміж ложкаў.

— Ты вось не паверыў. А са мною было ўжо раз такое. Я тады ледзь зямлю не раскалоў. Немцы свіран з людзьмі падпалілі. Я бачыў, як ён гарэў... Страшнае вогнішча... Месяц быў на небе, ён даў мне велізарную сілу. Я тупнуў нагою — і зямля трэснула. Я раскалоў бы яе, каб усе фашысты правaліліся. Але не мог другі раз падняць нагу. Упаў... А калі ачуняў, быў ужо дзень. Месяц знік — і сіла прапала.

— У тым свірне была твая маці? — спагадліва спытаў Мыса.

— Не ведаю...

Яны ўжо сядзелі, прытуліўшыся адзін да аднаго, на Васькавым ложку і глядзелі на месяц.

— Я таксама зараз такі дужы, як і ты... Ну, можа, крыху слабейшы,— сказаў Лёнька.— А Мысай мяне клічуць таму, што калі мяне з братам прывялі ў дзіцячы дом, я не выгаворваў яго імя — Міша. Бегаў за ім і гікаў: Мыса! Мыса! Так і пайшло.

— А я не ведаю, хто назваў мяне Капуном,— уздыхнуў Вася.— Не помню. Як гарэў свіран, помню, а пра сябе — нічога... Зямлю я капаць люблю. Рабіў падкопы пад клеці, адкуль пахла смачным. Аднойчы добра зрабіў. Заставалася трошачкі падкапаць, і быў бы ў клеці. А мяне за ногі выцягнулі — і ў дзіцячы дом. Каб не гэта,

я б падсілкаваўся і на фронт уцёк. Можа б, там з таткам сустрэўся...

— А ў нас з Мішам ёсць бабуля. А цяпер і конь. Я яго першы ў лесе ўбачыў. «Кось, кось!» — пазваў. І ён пайшоў, кульгаючы, за мной. Слёзы ў яго вачах. Баліць рана, а ідзе. Ведае — без людзей загіне ў лесе. Бабуля прывяла ў дзіцячы дом нас з Мішам, а я — каня. Я люблю коней.

— Давай будзем сябраваць,— сказаў Капун.

— Давай. Назаўсёды,— сказаў Мыса.— Ты, я і конь.

— А зараз пойдзем зробім што-небудзь такое, каб ніколі не сварыцца. Можа, падкоп? А?

— Не трэба,— папрасіў Мыса.— Лепш сходзім у слівы.

Хлопчыкі ціхенька шмыгнулі з палаты. Азіраючыся на дзверы, за якімі спаў дзяжурны выхавацель, пракраліся ў двор і пайшлі па вясковай вуліцы.

На ўскраіне, далей ад дзіцячага дома, яны выбралі лепшы сад, узлезлі на дрэва і набілі пазухі слівамі.

Вярталіся не спяшаючыся. Пасля роснай травы іхнія босыя ногі скалелі, і пясок на вуліцы здаваўся ім асабліва цёплым і мяккім.

Кідалі ў рот слівы. Яны былі слізкія і халодныя, як рыбкі, выцягнутыя з вады. Мялі слівы языком, паднябеннем і асцярожна зубамі. Размяўшы, надкусвалі і цягнулі сок. Хутка набілі аскому, але не зважалі на гэта. Ім было добра.

— Слухай,— схамянуўся раптам Капун,— слухай, Лёня, а пра каня мы забыліся. Самі лопаем, а конь?

І яны пайшлі да каня. Слівы, аднак, каню не спадабаліся. Ён нават не ўзяў іх у рот. Паказы-

таў толькі мяккімі губамі хлапечыя далоні і чагосьці ўздыхнуў.

— Мы цяпер удвух з Васем даглядаць цябе будзем,— сказаў каню Лёнька.— Ты прывыкай да нас, прывыкай. Вайна ўжо скончылася. Араць на табе будзем. У нас вунь колькі малых у дзіцячым доме, усіх накарміць трэба...

Конь заржаў, як быццам усё зразумеў і пагадзіўся з Лёнькам.

Хлопчыкі выйшлі са стайні, узялі з калёсаў па бярэмю накошанай травы і паклалі каню. Прынеслі яшчэ па бярэмю, растрэслі каля стойла і ляглі на яе. Хутка заснулі.

Конь, падняўшы галаву, стаяў над імі, як вартавы. Месяц праз шчыліны высвечваў яго чуйныя вушы.

1975

МІХАСЬ КАЛАЧЫНСКІ

(нарадзіўся ў 1917 г.)

РАЗМОВА З ЖУРАЎЛЁМ

— Жораў шэры, журавель,
Ты з якіх ляціш зямель?

— Я пакінуў край заморскі
І лячу ў свой прыдняпроўскі.

— Добры жораў, раскажы,
Што ж там бачыў, як там жыў?

— Бачыў розныя я дзівы,
Пальмы, тыграў, кракадзілаў.

— Можа, свой сабраўшы род,
Бавіў час ля цёплых вод?

— Быў на водах, ды не вельмі
Палюбіў пяскі пустэльні.

— Ад чужых зямель, нябёс
З чым ляцеў ты, што ж ты нёс?

— Ад Сахары і ад Ніла
Смутак нёс я ў шлях на крылах.

— Там жа сонца, сінява,
Дык чаго ж ты сумаваў?

— Сумаваў я па айчынных
Поймах, рэках, балацінах.

— Дзе ж ты спынішся? Куды
Вабіць шлях цябе заўжды?

— Шлях у родны край бацькоўскі,
Ён мілей зямель заморскіх.

— Праўда?
— Праўду гавару.
Кр-р-ру! Кр-р-ру!

1971

ХАЧУ ПАДРАСЦІ

Ходзяць чуткі між дзяцей,
Што з дажджом усё расце.

Пойдзе ён —
На паплавах
Густа выскачыць трава.

Лес палье —
Глядзі, й дубок
Новы выкіне сучок.

Пусціць воды
Долу ўглыб,
І палезе ўгору грыб.

Дождж, я верыў, дабрадзей,
І чакаў яго штодзень.

Дачакаўся
І — на двор,
З галавы здымаю ўбор.

Дожджык капае —
Стаю,
Шапку зняў хутчэй сваю.

Дождж мацнее,
Дождж сячэ,
Я ж на месцы ўсё яшчэ.

Тата выскачыў:
— Сынок,
Марш у хату! Ты ж прамок.

Я ў адказ:
— Ды не бяда,
Льецца ж цёплая вада...

Я стаю,
Бы на пасту,
Ды не бачу, як расту.

1971

ЗМЕЙ НА НІТАЧЦЫ

За вёскаю пад ветрамі
Плыве мой змей паветраны.

Да сонейка ўзнімаецца,
На нітачцы трымаецца.

Спускае нітку яркую
Мой карабок запалкавы.

Яна за змеем гоніцца
Над сонечнай ваколіцай.

Сышла, руку ўсёй сілаю
Ірве ў бязмежнасць сінюю.

Ды карабочак лоўка я
Трымаю — справа лёгкая.

Высока змей, мне мроіцца —
Там дзіўнае штось робіцца.

Свой карабок да вуха я
Прыклаў і пільна слухаю.

Сябры ў мяне пытаюцца:
Ну, як там неба маецца?

Мой змей па-над прасторамі
Вядзе размову з зорамі.

— Вядзе,— кажу адразу я,—
І радасць нам прадказвае.
Сцвярджае ён, што заўтра мы
Ўжо будзем касманаўтамі.

1971

КЛАЎДЗІЯ КАЛІНА

(нарадзілася ў 1925 г.)



КАСМАНАЎТ

Аўтобус, якім мы ехалі ў раённы цэнтр, вельмі часта спыняўся, падбіраў усё новых пасажыраў. Час цягнуўся марудна, стаяла летняя гарачыня, і дарога здалася ўсім цяжкай і доўгай.

Нарэшце паказаліся першыя будынкі пасёлка. Пасажыры з палёгкай уздыхнулі. Але нечакана шафёр зноў затармазіў, ды так рэзка, што людзі, якія стаялі, паваліліся адзін на другога.

— Што там такое?! — пачуліся незадаволеныя галасы.

Пасярод дарогі стаяла жанчына без хусткі, з раскудлачанымі валасамі. Гэта яна спыніла аўтобус. Побач на абочыне дарогі сядзеў хлапчук гадоў васьмі, босы, у трусах і майцы, і толькі праз меру вялікая галава яго была абвязана цёплай хусткаю да самых вачэй. Жанчына схапіла хлапчука за руку і пацягнула да адчыненых дзвярэй аўтобуса.

— Ну, лезь хутчэй! — груба штурханула яна малога. Але той спыніўся ля самых дзвярэй і, як сляпы, пачаў намацваць прыступку. Нехта з пасажыраў падхапіў хлопчыка за руку і памог увайсці ў аўтобус, які адразу ж крануўся з месца.

— Навошта яму памагаць, узлезе і сам! — замест падзякі сярдзіта сказала жанчына і пачала папраўляць валасы. Пасажыры здзіўлена пераглянуліся.

— Што гэта за маці такая? — пачулася ціхае здзіўленне.— Дзіця хворае, а яна крычыць на яго ды яшчэ ў плечы таўчэ...

— Не маці, а, напэўна, мачыха,— зазначыў стары дзед і пасунуўся, каб даць месца малому.— Ідзі, унучак, сядзь са мною...— запрасіў ён.

Але хлапчук прытуліўся галавой да жанчыны і жаласна захныкаў.

— Ну садзіся ўжо! — строга загадала жанчына малому і, павярнуўшыся да пасажыраў, дадала: — Не хвалюйцеся, людзі добрыя, не хворы ён... А дома я яму яшчэ не так усыплю. Будзе ведаць, як ад працы адрываць. Самае жніво, работы столькі ў калгасе, а ён... Насіся тут з ім! — і жанчына ў злосці пляснула далоняй па вялізнай хлапчуковай галаве. Пачуўся глухі звон.

— Давай развяжу, а то задыхнешся,— ужо больш лагодна сказала яна і пачала развязваць хустку на хлапчуку.

Ад цікаўнасці пасажыры нават падняліся са сваіх месц, каб лепш убачыць, што такое з малым.

Хлапчук не даваўся, трымаючыся рукамі за галаву. Але маці сцягнула хустку з сына:

— Вось, калі ласка, палюбуйцеся!

На галаве малога быў круглы чорны чыгун, і толькі з выбітай шчыліны выблісквалі жывыя дзіцячыя вачаняты.

— У-у-у! — загуло ў сярэдзіне чыгуна, і хлапчук зноў уткнуўся ў матчын фартух.

— Сціхні! Чуеш? Вось прыедзем у бальніцу, там табе знімуць твой шлем. Выдумаў сам сабе на бяду. Цяпер маўчы.

Пасажыры стрымана заўсміхаліся. Ніхто не адважыўся вясёлым рогатам пакрыўдзіць цярплівага пакутніка.

Аўтобус спыніўся якраз насупраць амбулаторыі. Жанчына з хлапчуком выйшлі. А за імі

высыпалі і ўсе астатнія пасажыры. Праз адчыненае акно амбулаторыі было відаць, як у прыёмным пакоі доктар пстрыкнуў пальцамі па чыгуну і весела сказаў, заглядваючы ў шчыліну:

— Што, браток, надзець змог, а зняць не можаш? Ну, нічога, здымем. Пацярпі...— Ён падышоў да дзвярэй і гукнуў: — Данілавіч! Ідзіце сюды! Гэта па вашай часці...

На парозе прыёмнага пакоя паявіўся вусаты санітар. Ён пакруціў галавой, пацмокаў языком, узяў хлопчыка за руку і павёў за сабой.

Пасажыры не разыходзіліся. Усе быццам забыліся пра свой клопат. Кожнаму было цікава, як жа ўсё скончыцца.

Неўзабаве на ганак выскачыў наш герой. Увесь спацелы, перамазаны сажай, ён трымаў у руках дзіравы чыгун.

Хлапчук вінавата азірнуўся. Бачачы, што ён ніяк не можа расстацца са сваім злашчасным шлемам, маці выхапіла чыгун з яго рук і шпурнула ў прыдарожную канаву.

Вусаты санітар выйшаў на ганак, закурыў.

— Ну і цярплівы ж... — задаволена сказаў ён.— Гэтак я яго прыціснуў, аж самому горача стала, а ён хоць бы што — толькі сапе... Такі напэўна будзе гэтым... як яго...

— Касманаўтам! — у адзін голас падказалі пасажыры і пайшлі садзіцца ў аўтобус.

1966

КАЗІМІР КАМЕЙША

(нарадзіўся ў 1943 г.)

ЛЯ КАРТЫ РАДЗІМЫ

Азёры,
рэкі
і лясы,
І гарады,
і вёскі.
Усё змясцілася на ёй,
На карце той,
шматвёрстцы.
Прасторы з кветак і вясны,
І з сонца,
і з блакіту.
Сады паўсюль.
Як акіян,
Тут каласуе жыта.
Тут нафта Рэчыцы цячэ,
Пласты зямлі свідруе.
Шахцёрскі горад
Салігорск
Тут дзень і ноч працуе.
Чыгункі грукат,
гул шашы,
Птушыны спеў чароўны...
Усё змясцілася на ёй,
На карце нашай роднай.
І нават вёсачка мая,
Пушчанская,
малая

Сваёю назваю на ёй —
Прыслухайся —
Спявае!

1980

ДЗЯТЛАВА КУЗНЯ

«Тук-тук-тук»,—
грыміць наўкола,
Аж з кары паўзе дымок.
Так грукоча адмыслова
Той дзюбаты малаток.

Ствол сасновы перамераў,
Сук сярдзіта надкалоў.
Падкаваў ён спраўна
дзверы
У вавёрчына дупло.
А пасля
на сук рагаты
Сыпануў з крыла агню.
Малаточкам тым
заўзята
Падкаваў ён цішыню.
«Тук-тук-тук»,—
грыміць над борам.
Па кавадле скокі зор.
І жыве,
не знае гора
З кузняй дзятлаваю
бор.

1980

АЛЯКСАНДР КАПУСЦІН

(нарадзіўся ў 1924 г.)

МІРНЫ ЛЁТЧЫК

Было свята — Дзень Перамогі. Зырка свяціла сонца. Гучала музыка. Па праспекце да плошчы Перамогі, як вокам ахапіць, ішлі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Ішлі на ўсю шырыню праспекта. У кожнага на святочным адзенні блішчалі баявыя ўзнагароды.

Апанас Якімавіч і Андрэйка стаялі на тратуары, віталі ветэранаў. Рухавы Андрэйка раз-пораз ускліквaў:

— Паглядзі, дзядуля, які гэта ордэн? А медаль вунь той, на стужачцы? Мо замежны які?

Апанас Якімавіч слухаў шчэбет унука, углядаўся ў твары ветэранаў. Раптам ён страпянуўся і аж падаўся наперад. Андрэйка здзіўлена глянуў на дзеда. Апанас Якімавіч паклаў яму на плячо руку.

— Паглядзі, унучак. Бачыш высокага палкоўніка? Вунь ён, у форме марскога лётчыка!

Андрэйкавы вочы перабягалі з адной постаці на другую. Дзе ж ён, той лётчык?

— Андрушчанка! Мікалай! — крыкнуў Апанас Якімавіч. Адной рукой ён моцна абапёрся на кій, другую ўскінуў высока над галавой, пачаў махаць.

І тады Андрэйка ўбачыў палкоўніка: той, пачуўшы дзедаў вокліч, стаў азірацца па баках.

Аднак таго, хто яго паклікаў, не знайшоў: з тратуара ветэранам махалі рукамі многія.

— От жа шкада — не заўважыў! — узрушана сказаў Апанас Якімавіч.— Але я знайду цябе, Мікалай. Цяпер знайду...

— Дзядуля, хто гэта?

— Мой баявы таварыш, унучак.

Апанас Якімавіч глядзеў на ветэранаў і ўспамінаў.

...Быў цёплы ліпеньскі надвячорак. Пад невысокім разгалістым дубам сабраліся маладыя партызаны — хлопцы і дзяўчаты. Жартавалі, смяяліся. Апанас Якімавіч, тады проста Апанас, камсамольскі сакратар, папрасіў, каб сціхлі, і сказаў: «Таварышы, у нашу камсамольскую арганізацыю паступіла заява ад падрыўніка Мікалая Андрушчанкі. Просіць Мікалай, каб прынялі яго ў камсамол. Ёсць дзве рэкамендацыі: камандзіра падрыўной групы Барыса Фісенкі і мая. Думаю, Андрушчанку ўсе вы добра ведаеце. Ці, можа, будуць пытанні?.. Няма?.. Можа, хто сказаць нешта мае?» — «Што тут гаварыць? — выгукнула чарнявая,' як цыганка, медсястра Зіна.— Няхай раскажа, як б'е фашыстаў!»

Мікалай збянтэжыўся, ціха сказаў: «Я ж толькі адзін раз на чыгунку хадзіў. І вы пра гэта ведаеце».— «Можа, і чулі, а ты сам раскажы»,— настойвала Зіна.

І Мікалай пачаў расказваць.

Група залягла на ўзлеску. Тым часам трэба было пайсці ў разведку. Вызваўся Мікалай. На чыгунцы ён пахадзіў, прыгнуўшыся, туды-сюды, паслухаў — нікога нідзе не заўважыў, нічога падазронага не пачуў. Вярнуўся да хлопцаў, і яны сталі чакаць. Міну вырашылі ставіць перад самым поездам. Падумалі: паставіш яе загадзя, а вартавыя будуць рабіць абход і знойдуць.

Поезд быў яшчэ далёка — ледзь-ледзь чуўся. Нарэшце Барыс Фісенка таўхануў Мікалая пад руку: рушылі! І яны кінуліся да чыгункі.

Сапёрныя лапаткі разварушылі пад рэйкаю зямлю. І ў гэты момант з другога боку чыгуначнага палатна шалёна застрачылі аўтаматы. Гітлераўцы, аказваецца, прытаіліся ў засадзе, чакалі ўсю групу. Над галовамі падрыўнікоў злосна зазумкалі кулі. А поезд ужо недалёка. Тады Мікалай сарваў з рэменя гранату-лімонку, шпурнуў яе за насып, у фашыстаў. Калі пачуўся выбух, ён зноў схапіў сапёрную лапатку, пачаў ліхаманкава капаць.

Паставіўшы міну, падрыўнікі пабеглі ад чыгункі. Тугая выбуховая хваля паваліла іх на зямлю...

«Таварышы памаглі нам падняцца, і мы вярнуліся ў лагер. Вось і ўсё...— закончыў свой расказ Мікалай і, памаўчаўшы, дадаў цвёрда, як пакляўся: — Абяцаю гэтак жа знішчаць фашыстаў і далей...»

...А калоны ўсё ішлі і ішлі па праспекце. Задумаўшыся, Апанас Якімавіч загаварыў:

— Ты стрымаў сваё слова, Мікалай: падарваў дваццаць тры варожыя эшалоны...

Андрэйка, які стаяў наперадзе, азірнуўся.

— Што ты, дзядуля, сказаў?

— Успомніў, унучак, што пасля вайны Андрушчанка скончыў лётнае вучылішча, пільна ахоўваў мірнае неба.

— Не, дзядуля, ты не гэта гаварыў...

Вочы іх сустрэліся. Апанас Якімавіч прытуліў Андрэйку да сябе, паабяцаў:

— Прыйдзем дадому — усё табе раскажу пра мірнага лётчыка.

1980

УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

(нарадзіўся ў 1930 г.)

КАЦЁЛ З КАМЕНЬЧЫКАМІ

Давай з табой сядзем і пагаворым. Ты што, спаць збіраешся ці хворы? Тады заставайся ў цёплым ложку. А калі ты здаровы і ты здаровая, то давайце сядзем на пашчапаныя бярвенні, ля прызбы, на лаўкі, а каму зручна — той і проста на падлозе.

І ўявім мы, што памчалі мы на нашым дыване-самалёце ў вясёлкавы наш з табою край, у сівую нашу з табой даўніну.

Ці бачылі вы паўночныя нашы ўзгоркі? Яны не дужа высокія, але ўсё ж верас на іх на некалькі дзён раней робіцца сівы. Ад падмарозкаў.

І сівыя робяцца старадаўнія валуны, камяніскі, камні, каменьчыкі. А пасля пачынаюць пакрывацца шкляным, ружовым на ўсходзе лядком — заберагам, шматлікія нашы з табой азёры. А выкапаную бульбу даўно ўжо звезлі ў хаты і свірны, звалілі ў капцы.

Дык вось было гэта даўно, вельмі даўно, так даўно, што ў нашай з табой краіне яшчэ не было тады бульбы.

Стаялі тады на беразе маленькага чыстага возера — існае вочка зямлі — дзве хаты. У адной, багатай ды ганарлівай, жыў мужык Ігнат. Нядобры ён быў чалавек, жонку замарыў работай, дзеці ад хатняга рабства ў свет пайшлі. А гаспадар усё не ўтаймоўваецца, усё пад сябе грабе. Усё наваколле прыдушыў, глытай.

— Забыўся, што ў труны кішэняў няма,— горка пажартавала добрая Мар'я, бліжэйшая суседка. Бо яе хата бліжэй за ўсіх стаяла. Хата яшчэ з дзядоў, моцная, але зусім недагледжаная. Бо гаспадара ўзялі на вайну і засталася жанчына адна з маленькімі дзецьмі. Аж пяцёра, і кожнае на пстрычку ніжэй за другое. І кожнае ўвесь час галоднае.

Пакуль бацька быў, сяк-так перабіваліся, а тут...

Словам, запанаваў на нашай зямлі самы страшны, самы подлы грэх, імя якому **Несправядлівасць.** Гэта калі адзін не можа заснуць, бо аб'еўся, а другі — бо галодны. А дзеці — дык тыя нават плачуць з голаду. Кепска. Ніколі не дапамагай **Несправядлівасці.** За іншае, можа, і даруюць. За гэтае — не.

...Позняя, халодная была вясна. Такое самае лета. А восень яшчэ горай. Завылі вятры, уздзьмуліся рэкі, пашалелі азёры. Сатлелі травы на паплавах. Ад бацькі чуткі няма. Прыйшла чарга Мар'і ісці па дапамогу да суседа. А той сядзіць, далоні пад азадак паклаў ды пыхкае, як вожык. Нажэрся свіння-свіннёю.

— Ну што?

— Пазыч мне, суседзе, меру ячменю ды меру фасолі. Я табе за гэта вясной адраблю.

— Адро-обе. Вясно-ою. Вясной усё наваколле адрабляць прыйдзе. А ты да таго часу ледзь ногі цягаць будзеш, а шчанюкі твае, можа, і не пацягнуць зусім. А можа, ты і ўдава цяпер. То й ён не адробіць. Не дам.

Рабіць няма чаго. Прыйшла бедная жанчына ў сваю халупу і, не запаліўшы нават лучынкі, упала на ўслон.

Цёмна. Цёмна за акном. Цёмна. Нізкія чорныя хмары і выхаду няма.

Да іншых суседзяў бегчы? Памаглі б, але і там тое самае. А дзецям што? Дзеці не ведаюць, як дарослым хлеб дастаецца. Цяжкай працай, часам — прыніжэннем. Калі зразумеюць — пашкадуюць. А тут плачуць толькі на розныя галасы: «Сільна і слёзна», як у старых кнігах пісалі:

— Матухна!

— Зязюленька!

— Пакармі нас!

— Хлебца дай!

— Аклаец!

Што рабіць беднай Мар'і. Вырашыла яна дзяцей падмануць.

— Вы ляжце зараз. Засніце. А я пайду бабоў назбіраю. Навару ды буду вас карміць.

Дзеці не засынаюць. Тады пайшла кабета, назбірала на полі дробных каменьчыкаў (а іх было сапраўды як бобу), высыпала ў кацёл і паставіла на агонь. Настолькі бедная была хата, што і печкі няма.

Варацца каменьчыкі. Паснулі дзеці. Супакоіліся. Разбудзіць матка — наядуцца. Варацца каменьчыкі — да канца свету ім варыцца. Да канца свету плакаць матцы.

Ажно ўваходзіць у хату нейкі чалавек. Сам доўгі, кашчавы, з кіем, торбай, адкуль нейкія травы тырчаць. І вочы пранізлівыя:

— Добры вечар у хату. Пусціце абагрэцца.

— Грэйся, добры чалавек. Толькі пачаставаць цябе няма чым.

— А што ж у катле варыш?

— Гэта, добры чалавек, каб дзяцей прысыпіць да заўтра,— і прыўзняла крышку катла.

— Гэт-та што такое?

— Камні. Муж у войску — можа, й забілі. Праціла ў суседа чагосьці — не даў. Толькі й засталося на гэтай зямлі беднаму чалавеку каменьчыкі есці.

— Што ж ён?! Дзецям не даў?! Проста дзецям?!

— Не даў.

— Д-добра,— сказаў незнаёмы.— Бяры кацёл. Пайшлі.

Прыйшлі на надзел. Незнаёмы паставіў кацёл, азірнуўся: ля хаты Ігнат стаіць. Цікуе. А што гэта яны там робяць? Чаго кацёл прынеслі?

А незнаёмы той быў Вялікі Чараўнік. Толькі чараваць яму ў жыцці дадзена было тысячу разоў і засталіся лічаныя разы. І нічога ён тым сваім чараўніцтвам не дабіўся. Як дагэтуль ішло, так і пасля.

«Але тут,— думае,— здужаю».

Узяў ён з катла жменю каменьчыкаў і са свістам, як з сявенькі, сыпануў па раллі. І яшчэ, і яшчэ, і яшчэ.

— Што ж ты,— паскардзілася Мар'я.— Так загон благі, а ты яшчэ й каменьчыкамі, што сабрала, падсяваеш.

— Маўчы,— сказаў той.— Глядзі, што будзе.

— Так ёй,— сказаў Ігнат.— Таксама мне, дзеці. Ва ўсіх дзеці. Муж на вайне. Гм, таксама мне, страшная штука вайна.

А незнаёмы сыпе і сыпе. Увесь вагон каменьчыкамі засеяў. Россып. Дзецца няма дзе.

Мар'я плача. Ігнат смяецца. Балаган на кірмашы, і толькі.

— Глядзі, жанчына,— сказаў незнаёмы.

Тая зірнула — і вачам не паверыла: растуць каменьчыкі. Вунь ужо камяні сталі. Памерам з два кулакі.

— Збяры частку, пакладзі ў кацёл,— сказаў незнаёмы.— Пастаў варыць дзецям.

У Ігната вочы на лоб палезлі. А жанчына панесла кацёл з камянямі ў хату. Прыйшла — камяні яшчэ падраслі.

— Глядзі, жанчына, за адзін дзень я табе ўсё пакажу. Заўтра будзеш капаць. А ва ўсе наступныя разы будзе гэта цягнуцца цэлае лета. Глядзі.

І тут камяні пачалі зарывацца ў зямлю. Як ружовыя, жоўтыя і белыя парсючкі. Ігнат аж счумеў. Вачыма толькі водзіць, нібы ў чужы гарох залез, а яго, злодзея, заспелі.

Пачакалі яны крыху — з'явіліся з зямлі парасткі, гусцець пачалі.

— Прынясі, кабета, матыку,— сказаў незнаёмы.

Тая прынесла. Расточкі ўжо ў кусцікі ператварыліся.

— Пацяпай вось так. Загарні ім ножкі ў кажушок... І яшчэ раз загарні.

А кусцікі ўжо амаль кусты.

І вось ужо на кустах заззяла мора кветак. Белыя, ружовыя, лілаватыя, ружова-белыя зорачкі. І ўсе з жоўтым сэрцайкам.

— Вось цяпер можаш яе памацаць на выбар,— сказаў незнаёмы.— Гэта як дзеці галодныя.

І выняў два камяні з-пад куста.

Пасля засумавалі кусты, паблякла іх лакіравана-шурпатая, зялёная зверху і матавая спадыспаду паверхня, пасохла гікаўё.

— Ну вось, заўтра будзеш капаць. На ўсю зіму хопіць,— сказаў незнаёмы.— І з суседзямі падзяліся.

— Ясна,— сказала Мар'я, бо ўжо далятаў з хаты сыты, некаменны дух.— З суседзямі найперш.

— Мне! Мне! — кінуўся Ігнат.— Мне перш за ўсё! Мне! Я іх кармлю-паю!

— І на работу наймаеш? — спытаў незнаёмы. Выняў адзін камень, і той закурэў у ягоных руках, а чалавек разламаў яго, пасаліў і стаў

есці.— І не адмовіў ім у ежы, калі галадалі?

— Мне! Мне! Наймаю, кармлю.

— Добра,— сказаў незнаёмы.— Набяры мне кацёл каменьчыкаў са свайго поля. Ды хутчэй.

Ігнат чуйдух прыляцеў з катлом. Самых буйных, з кулак, камянёў нацягаў.

— Во! Во! У мяне ж і каменьчыкі. Во ў мяне, дык камні з кулак. А гэтыя ж лайдакі, хіба ў іх камні. Слёзы, а не камні.

— Слёзы,— сказаў незнаёмы.— Дык хочаш, каб у цябе яшчэ больш стала? Усё ж ёсць. Што даў — такі і плод.

— Мне! Мне! У мяне і камні.

— Глядзі-і,— сказаў незнаёмы і сыпануў камяні па Ігнатавым полі. І яшчэ. І яшчэ. Засеяў усё поле.

— Ну вось. Даў сёння хлеба яе дзецям?

— А што? Галадранцы. Самога з'ядуць, як мяккі будзеш.

Незнаёмы махнуў рукой.

Камні пачалі расці. Усе трох стаялі і глядзелі, як яны растуць: каменьчыкі — камні — камяні — камяніскі. Усё поле закрылі — Ігнат аж падскокваў.

— Ну чакайце, за такімі вы яшчэ й да мяне ўсе прыбяжыце. Прыйдзеце, любенькія, як прыпрэ.

Паглядзеў на яго незнаёмы, плюнуў.

— Ну вось, маеш,— сказаў.

— А чаму яны не зарываюцца?

— А таму, што вечна ім заставацца на вачах у людзей, як кожнаму скнарству, як кожнай жорсткасці, як кожнай нелюбові да людзей, як кожнай Несправядлівасці.

І пайшоў з жанчынай да яе хаты.

Кінуўся шчаслівы гаспадар да поля — не поле, а суцэльная каменная крушня. Валуны велічы-

нёю з хату. На тысячу год наперад з зямлі вылезлі.

Пакуль дзеці, незнаёмы і жанчына елі ў хаце «камяні» — усё наваколле чула з-за каменнага мура дзікі рык і выццё. Выў і рыкаў Ігнат.

А пасля незнаёмы ўстаў.

— Пайду,— сказаў ён, закінуўшы за плечы торбу.

— Чым мне табе аддзячыць?

— Нічым. Дабрынёю да людзей. Ды гэтага дабра ў цябе заўжды хапала.

— Пайду пагляджу, як сусед. Звар'яцеў, пэўна.

— Нічога. Я ж кажу... дабра ў нас хапала. Залішне.

І пайшоў у свет, абапіраючыся на кій. Пад касыя асеннія хмары. Насустрач пералётам, што, калючыя, каціліся яму пад ногі. Ужо зводдаль азірнуўся — Мар'я і дзеці глядзелі яму ўслед, маленькія на чорнай раллі.

— Гэй! А імя ёй будзе — Бульба! — крыкнуў ім незнаёмы.

І так з'явілася на Беларусі Бульба.

1978

ЯЎГЕН КАРШУКОЎ

(нарадзіўся ў 1932 г.)

БОМБА Ў ЖЫЦЕ

Мы з галавой хаваемся ў высокіх каноплях — ідзём цёплай разорай і размаўляем: Шурка, я і Сцёпка кульгавы.

— Ох і драпаў я ўчора ад Панасіхі! — кажа са смяшком Шурка.— Толькі падкраўся да бомбы, а Панасіха — за мной... Ох і драпаў! Думаў, ужо зловіць.

— Дык ты ж казаў, што яна спала,— не верыць Сцёпка.

— «Спа-а-а-ла»! — перадражнівае Шурка.— Яшчэ як спала, а потым прачнулася і — за мной...

Недаспелыя каноплі пахнуць саладкавата і духмяна. Ад іх вострага паху ды спякотнага летняга сонца хочацца хутчэй схавацца куды-небудзь у цень. Блізка, адразу ж за поплавам, бярэзнік. Адтуль цягне прыемнай сырасцю. Але цяпер мы нізашто не звернем з разоры — страшэнна хочацца абдурыць сярдзітую Панасіху: падпаўзці да бомбы ў жыце і пакратаць рукой яе гладкае, нагрэтае сонцам цела.

Канечне, гэтую бомбу не раскурочыш, як якінебудзь снарад. Бомбу цяжка, чарцяку. От снарад — справа іншая. Заклаў паміж штыкецін у плоце, туды-сюды, туды-сюды і — гатова... Галоўку ў адзін бок, медны бліскучы стакан — у другі. А потым даставай са стакана чорныя доўгія саломінкі пораху.

Але бомба ёсць бомба. Яна нам не дае спакою.

Яшчэ вясной нямецкі самалёт некалькі бомбаў скінуў. Усе паўзрываліся, а гэтая ўрэзалася ў зямлю, ды так і тырчыць цяпер у жыце.

Вось мы і крадзёмся да яе.

— Падай! — шэптам загадвае Шурка.— Вунь Панасіха сядзіць...

Мы бухаемся ў шэры цёплы пясок мяжы: недалёка ад нас, у жыце, чарнее постаць Панасіхі. Сэрца ў мяне тахкае так моцна, што, здаецца, нават Шурка чуе.

— Што, струсіў? — кпіць ён.— Паўзі, паўзі. Панасіха дрыхне!

— А калі... не спіць?

Але Шурка больш не размаўляе. Ён пагардліва цыркае праз рэдкія зубы слінай і першы перапаўзае мяжу. Мы — за ім. Жыта драпае голыя рукі. Але мы паўзём услед за Шуркам. Вунь і бомба чарнее. Недалёка ад яе — Панасіха. Шурка падпаўзае да бомбы, прыўзнімаецца і махае нам рукой: паўзіце хутчэй...

Але Сцёпка і я ляжым, як прышытыя, не варушымся, пазіраем на Панасіху: а што, як прачнецца?

Толькі яна сядзіць нерухома. Прама на зямлі, абхапіўшы рукамі вострыя калені. Спіна выгнулася абручом. Галава, прыкрытая белай хусцінкай, звесілася ўніз. Твару не відно. Адны ногі — вялікія босыя ногі — тырчаць з-пад доўгай сіняй спадніцы. Панасіха спіць.

Шурка ўжо ўзлез на бомбу, усеўся, нібы на пень, і немаведама што вытварае: крывіць морду, паказвае нам язык, круціць кукішы... Сцёпка не можа стрымацца, зацiскае рот рукой і хіхікае. А Шурка раптам закладвае ў рот два пальцы і... свішча!

— Палундра! — крычыць ён, кідаючыся нацянькі да вёскі.

Імчымся і мы за ім што ёсць духу. Хутчэй, хутчэй! Каласы балюча хвошчуць па твары, шыі, руках.

— Ой-я-ёй!

Нага мая слізгае некуды ўбок, і я з разгону плюхаюся носам у пясок. Учэпістыя пальцы хапаюць і моцна сціскаюць маю руку. Гэта — Панасіха... Страшная Панасіха! Крычаць — няма сілы. Яна ўжо апускаецца побач, яна паднімае мяне, прыціскае да сябе, і я чую, як яна хутка-хутка гаворыць:

— Віцечка, сынок, родненькі мой... Ну, чаму ж, чаму ж ты мяне не слухаеш? Чаму? Ці ж я не прасіла, ці ж я не маліла цябе — не лезь ты да етых снарадаў... От дурненькі, от непаслухмянец! Ты ж адзін у мяне, а-дзі-ін...

Панасіха плача. Плача і ўсё мацней прыціскае мяне да грудзей.

— Не хадзі ты болей сюды, чуеш, Віцечка? Не хадзі, хлопчык мой!

Я цішэю, перастаю шморгаць носам: што гэта яна гаворыць? Панасіха называе мяне Віцькам! Яна прымае мяне за свайго Віцьку... Віцьку, якога разбамбіла ў хаце, якога пахавалі той жа вясною!..

— Ну, паабяцай мне, Віцечка, што ты сюды ніколі-ніколі не прыйдзеш... Не прыйдзеш, сынок, а? І хлопцаў не прывядзеш? Не прыйдзеш, а? — ласкава просіць Панасіха і ціхенька трасе мяне за плечы. — Скажы...

— Не прыйду-у...

— Ну і разумнік, ну і малайчына...

Яна адпускае мяне.

— Бяжы, сынок, дамоў, а я пасяджу яшчэ тут.

Я раблю крок, другі і — зрываюся з месца. Імчуся, нібы за мной зноў гоніцца Панасіха. Толькі на мяжы спыняюся, каб аддыхацца. Не, змроч-

ная Панасіха стаіць нерухома ў жыце. І ўжо нават не глядзіць на нас...

Шурка і Сцёпка вылазяць з канапель, баязліва падпаўзаюць да мяне.

— Ты чаго равеш? Біла? — спалохана пытаюцца яны.

— Не-е, не біла...

— Дык чаго ж ты?

— Яна думала... што я... разбомблены Віцька...

— Ну-у...

А сонца смаліць. Залівае залацістым святлом усё навокал, хоць вочы заплюшчвай. Але мы стаім і доўга пазіраем у той бок, дзе ў спелым жоўтым жыце чарнее постаць Панасіхі.

1961

УЛАДЗІМІР КАРЫЗНА

(нарадзіўся ў 1938 г.)

ЛІСЦЕ ПРЫЛЯЦЕЛА

Раненька,
На зорцы, на зары
Прыляцелі
Цёплыя вятры,

Сонца на блакіт снягоў
Прынеслі,
Зазвінелі ручаі,
Як песні.

Прыляцелі жаўранкі
Здалёк,
Кожны галасок,
Нібы званок.

І шпакі за імі
Прыбылі,
Свіст парассыпалі
На палі.

Вось і лісцікі
Нарэшце прыляцелі,
Густа на галінках дрэў
Паселі,

Птушкі слухаюць,
Паветра п'юць
І, здаецца,
Зараз запяюць!

1975

ДА БАБУЛІ

На лета да бабулі
Прывезла сына мама,
З ім цэлы воз адзежы —
Больш, чым у іншай краме.

І паліто, і боты,
Бо раптам дожджык будзе,
І хлопец тады ногі
У лужынах застудзіць.

Прывезла акуляры
З зялёным шклом
прыгожым
І парасон —
ад сонца
Схаваць заўсёды зможа.

Калі ўсе клункі мама
Свае распакавала,
Дык многаму бабуля
І назвы нат не знала,

Але затое тут жа
Бабуля раскусіла,
Чаму хвароба ўнука
У горадзе любіла.

1975

ЧЫСТАЯ ГРАДКА

Бабуля пагнала
Гусей да ракі,
А Вова рашыў
Прапалоць буракі.

Ён гэтак стараўся,
Што нават спацеў,
Бо працу адкладваць
На дзень не хацеў.

Бабуля прыйшла,
Хлопец проста аж ззяў,
Хоць чорна-зялёны,
Як градка,
Стаяў.

— Чаму гэта брудны
Ты, ўнучак, такі?
— А я прапалоў
Табе ўсе буракі.

— Травы там няма,
Дурыш мне галаву.
— Дык я ж бурачкі прапалоў,
Не траву.

І праўда,
Бабуля на градку пайшла —
Ні аднаго бурачка
Не знайшла.

1975

КАСТУСЬ КІРЭЕНКА

(нарадзіўся ў 1918 г.)

РАДЗІМА

Лепей за ўсё мне на свеце мясціна
Тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос.
Бэз пад акном і на полі каліна...
Ціхае сонца, блакіты нябёс...

Можа, другому не скажа нічога
Сціплая смолка на ўзлессі ў траве.
Мне ж у ёй радасць гучыць і трывога,
З ёю маё захапленне жыве.

Любы мне бору сасновага звоны,
Пошум прысадаў, што ўзбеглі на шлях.
Там, дзе бязмежна пралеглі загоны,
Сэрца ўбірае прыволле ў палях.

Выйдзеш за вёску — жытнёвыя хвалі
Коцяцца, цёплыя, плыняць наўсцяж...
Клічуць дарогі ў бясконцыя далі...
Самы ты вольны, край бацькаўскі наш!

Колькі мне маці тут песень спявала,
Колькі радзілася ў сэрцы тут мар,
Колькі мне ласкі жыццё аддавала,
Позіркам шчасця тут гледзячы ў твар.

Тут я быць верным і чулым вучыўся,
Сілу здабыў тут, якой не зламіць.

І сваёй роднай зямлі, дзе радзіўся,
Мне аніколі нідзе не забыць.

Дзе ні жыву, ўспамінаю да рыскі
Усё, аб чым слова ў душы берагу,
Кожны куточак, знаёмы і блізкі,
Усюды са мной.
Не згадаць не магу

Рэчкі люстранай, між лозаў і вязаў,
Што па лугах быстра воды нясе,
Поля, дзе смутак забудзеш адразу,
Сэрцам аддаўшыся светлай красе.

Матчыных слоў не забуду ніколі.
Дружбу шаную, што з вамі ствараў,
З вамі, сябрамі, якіх яшчэ ў школе
Роднымі сэрцу навечна абраў...

1960

СЛОВА ДА ХЛОПЧЫКАЎ

Хлопчыкі,
Не крыўдзіце дзяўчынак,
Хлопчыкі,
Вы ж будучыя воіны.
Помніце:
Без дружбы немагчыма
Перайсці
Праз ростані і войны.
Запытайце ў тых,
Каму вядом быў
Кожны бой,
Колькі раз
Выносілі пад бомбамі
Іх з агня

Сяброваk мужных рукі.
Там, дзе на шляхах
Слупкі барвовыя
Сон магіл
Вартуюць
Днём, уночы —
Побач з болем воіна
Суровым
Пахаван
І светлы сум дзявочы...
Хлопчыкі,
Вазьміце кветкі мая
І за ўсіх,
Хто лёг пад абеліскі,
Падарыце кветкі
Ленам, Маям,
Верам, Валям,
Светачкам і Раям,
Што сябруюць з вамі
Ад калыскі.
Будзьце ўсюды ў свеце
Абаронцамі
Перасмешніц
Ласкавых —
Дзяўчынак.
Помніце:
Без дружбы —
як без сонца,
З дружбаю —
Ўсё лёгка і магчыма.

1965

РАЗМОВА З КАПІТАНАМІ

Капітаны, капітаны
З рачулачак сініх,
На якія акіяны
Вас жыццё закіне?

Дзе вам выпадзе пранесці
Флаг,
Высока ўзняты?
Чым вас буры стрэнуць
Дзесьці
Далёка ад хаты?

Капітаны, час настане
Для адвагі хвацкай.
Дык прыміце ж на расстанне
Вы наказ дружбацкі.

Пад любой зарой паходнай,
У любой краіне
Не забудзьце, хлопцы, родных
Рачулачак сініх.

Не забудзьце той прывабнай,
Той ласкавай хвалі,
На якой вы свой караблік
Першы раз пускалі.

І заўжды нясіце строга,
Каб не згасла сіла,
Тое слова, што ў дарогу
Маці падарыла,—

Слова ласкі да Айчыны,
Слова мовы любай.
Слова бацькаўскай сцяжыны —
Слова славы трубнай.

Адплывае флот вясновы,
Доўга плыць ён будзе...
І ў адказ я чую словы:
— Помнім,
Не забудзем!..

1965

ВЯСЁЛКА

Ад ліўня вострага
аж колка
Было,—
не ступіш басаножж...
Ды раптам яркая вясёлка
Так цёпла
Ўспыхнула
Паўз Сож...

І лівень стаў цішэць.
Зарніца
Стрымала тупат перуноў.
Хоць з хмар не перастала ліцца,
Ды неба ўжо яснела зноў.
Ля сцежак вабна пахла квецень.
Дужэлі ногі на бягу.
І пад вясёлку мчалі дзеці —
Як пад вясёлую дугу.
І нехта ім крычаў:
— Бяжыце,
Там сонца вунь, там лівень сціх!..
І васількі званілі ў жыце
Званамі сінімі для іх...

1960

АНАТОЛЬ КЛЫШКА

(нарадзіўся ў 1935 г.)

АДКАЖЫ, ЧАМУ ЗАГАДКІ МАЮЦЬ ГЭТКІЯ АДГАДКІ

РУКА І ПАЛЬЦЫ

Вось вам быль-небыліца:
у пяці чалавек — адна паясніца.

ТРАКТАР

Учапіўшыся за мядзведзя,
гайня сабак едзе.
Мядзведзя не ірвуць,
толькі зямлю дзяруць.

БУЛКА ХЛЕБА

З белай зрабілася бураю,
у печ без скуры пайшла,
а выйшла — са скураю.

ВАГА

Хістаецца-вагаецца,
ўсё праўды дамагаецца.
Нікому не змане,
а скажа: так ці не.

ПІСЬМО

Усё, што мае перадаць,
на твары у яго відаць.

А язык у таго,
хто глядзіць на яго.

МАЛАКО ЦІ СОК

Гэты прысмак
ведае кожны:
жаваць няма як,
а глытаць можна.

БУЛЬБА З ЛУПІНКАЮ

Адгадай загадку гэтую:
у лазні парыцца ў вопратцы,
да стала ідзе — раздзетаю.

ВЫМЯ

Дагары дном
збанок з малаком.

ШКЛЯНКА

Стаіць пястунчык —
за кожны глытунчык
просіць пацалунчык.

МЕХ

Толькі рот ды жывот —
вось які ён жываглот!
Як няўежна,
ляжыць лежма,
Як наесца —
устане на месцы.

ХАЛАДЗІЛЬНІК

Набраўшы ўсяго ў запазухі,
аж ледзь не пухне,—
вурчыць зіма на кухні.

ЦЭБАР

Ненаедны таўстун, усё глытаць ахвочы,—
большы рот, чым жывот, а ў вушах — вочы.

ПАРАСОН

Ці бачыў такое, суседзе? —
Пад дажджом
на парашуце
пагода едзе.

ШАПКА

Ну і дзіўны посуд
носіш, браце, ты:
дагары дном — поўны,
дном уніз — пусты.

ШАРСЦЯНАЯ ШКАРПЭТКА

Пухнатае ягнятка — хто ж падумаць мог? —
днём яно — з нагамі, а ўначы — без ног.

ПАДУШКА

Пер'я наелася,
у кашулю адзелася,
і спіць у ахвоту
начная істота.
Ляжыць, дзе і ты —
чатыры вухі, два жываты.

САБАКА

Твой сябар блізкі:
сядзіць — высокі,
а ўстане — нізкі.

КАМАР

У якой малечы
калені вышэй за плечы?

ЦЫБУЛЯ

Між агуркамі, буракамі —
каза
з зялёнымі рагамі.

ДЗЯДОЎНІК, ЛОПУХ

Стаіць дзед пры дарожцы,
усім чапляе па брошцы.

ГРЫБ

Што за навінка:
пад елкай вырасла сланінка!

ГЭБЛІК

Па драўляным мосце
бегае кабыліца:
сякераю скубе,
выкідвае патыліцай.

СЯКЕРА

Бліскучая выжла
скакаць у бор выйшла.
Звонка дрэва чэша,
на ўвесь лес брэша.

ЛАНЦУГ

Побач, поплеч, поручкі
узяліся подручкі.

МЯТЛА

У кутку —
барада на кійку.

ДЗВЕРЫ

Цэлы дзень толькі тым і заняты,
што праводзяць то ў хату, то з хаты.

ЛЕСВІЦА

Вось праява — ну і ну!
Кульгавая дарога палезла на сцяну!

ЧАЛАВЕК І ЦЕНЬ

Што гэта такое?
Сеў — адзін, а ўсталі — двое.

1979

ГЕНАДЗЬ КЛЯЎКО

(1932 — 1979)

БАЛАДА ПРА ЧЫРВОНЫ ГАЛЬШТУК

Расказвае бор,
Як стары ветэран.
...Спяшаўся ў разведку
Хлапчук-партызан...

На ім пашарпаны
Стары кажушок.
На выгляд — звычайны
Малы пастушок.

На ўзлеску спыніўся,
Задумаўся ён:
«Мне трэба ў варожы
Прайсці гарнізон.

Заданне адказнае.
Тут не да жартаў —
Фашысты нядаўна
Падвоілі варту.

Ды гальштукам нельга мне
Разыкаваць,
Яго я на ўзлеску
Павінен схаваць».

І зняў беражліва
Свой гальштук любімы,
Схаваў асцярожна
Пад гонкай рабінай.

Наперад пакрочыў
Падпасак-падлетак.
Назад азірнуўся:
«Запомню прыкметы...

Запомню як след —
Не забуду мясціну —
У квецені белай
На ўзлеску рабіну».

І голлем рабіна
Яму замахала,
Нібыта удачы
І шчасця жадала...

І вечар прайшоў,
Заірдзелася ранне...
Разведчык назад
Не вярнуўся з задання.

Яго катавалі
Фашысцкія каты,
Ды ён не збаяўся
Суровай расплаты.

Не выдаў фашыстам ён
Словам ніводным
Сяброў баявых сваіх —
Мсціўцаў народных.

Калі ж неўзабаве
Фашыстаў прагналі,
Хлапчук апынуўся
Ў армейскім шпіталі.

Любілі яго ўсе,
Як роднага сына.
З гвардзейскім палком
Ён дайшоў да Берліна.

З тых пор прамінула
Шмат зімаў і вёснаў.
Былы піянер
Стаў даўно ўжо дарослым.

Ды ў памяці
Дзён тых суровых не сцерці.
Ён носіць партыйны білет
Каля сэрца.

І часта прыходзіць
Туды, задумёны,
Дзе гальштук калісьці
Схаваў свой чырвоны.

І скрозь, дзе праходзіць
Знаёмай мясцінай,
У гальштуках яркіх
Палаюць рабіны...

1964

ЯЛІНКА

На мяккім імху,
Дзе гараць журавінкі,
Нібыта квактуха,
Прысела ялінка.
Зялёныя крылы
Ў бакі распусціла.

Здаецца, вось-вось
Прыбягуць яляняткі
І будуць дзяўбці
Каля купін зярняткі.

1963

АЛЕНА КОБЕЦ-ФІЛІМОНАВА

(нарадзілася ў 1932 г.)

КРОПЕЛЬКА

Жыла-была дажджавая Кропелька. Яна нястомна працавала. Капне з хмары на зямлю. Напоіць яе. А потым выпарыцца і зноў у паветра ўзляціць. Збяруцца такія кропелькі ў адно воблака. Калі іх стане вельмі многа, воблака цямнее ад цяжару, ператвараецца ў хмару — і ўсе кропелькі, не ўтрымаўшыся, падаюць уніз праліўным дажджом.

Аднойчы Кропелька не паспела даляцець да зямлі: яе падхапіў Паўночны Вецер. Пачаў ён насвістваць пра незвычайную казачную краіну, з якой прыляцеў. Пачаў упрошваць Кропельку кінуць родны кут і паляцець разам з ім. Згадзілася Кропелька.

Тады Паўночны Вецер сарваў з бярозы лісцік і панёс на ім Кропельку ў далёкі край.

Прыляцела Кропелька. І што ж?

Убачыла яна шэрае, халоднае неба. І такое ж халоднае сонца. І такую ж халодную заснежаную зямлю. Пачала Кропелька замярзаць. Яшчэ крыху — і стала б яна ледзяшом.

Спалохалася Кропелька, што загіне. І пачала прасіць Паўночны Вецер аднесці яе назад на радзіму.

Зжаліўся Паўночны Вецер. Аднёс яе.

Кропелька не магла дачакацца, калі прызям-

ліцца бярозавы лісцік. Яна скацілася з яго на родную цёплую зямлю гарачай слязой, каб ніколі больш не расставацца.

1966

ЗЯЗЮЛЬЧЫНЫ СЛЁЗЫ

Жыла ў лесе Зязюлька. Яна была лянівая і бесклапотная. Цэлымі днямі лятала па лесе і ела калматых вусеняў. А іншы раз прыляціць да ляснога ручая, сядзе на галінку і глядзіцца ў ваду, як у люстэрка,— сабой любуецца. І нават яйка яна падкінула ў чужое гняздо. Таму што лянілася сваё звіць.

Прайшло шмат часу. Састарылася Зязюлька. Цяжка ёй стала адной на вусеняў паляваць. І паляцела яна да чужога гнязда, у якое некалі яйка падкінула. А ў тым гняздзе Малінаўка сядзела. Зязюлька ў яе і пытае:

— Ці не ведаеш, дзе маё птушанятка? Я ўжо састарылася, і цяпер мне цяжка адной на вусеняў паляваць.

І расказала ёй Малінаўка, як яна выгадавала яе птушаня. А калі яно стала дарослым, паляцела ад яе назаўсёды. А куды — ніхто не ведае.

Паляцела Зязюлька шукаць сваё птушаня і да гэтай пары шукае.

— Ку-ку! Ку-ку! — гукае яна і плача. І слёзы яе капаюць на зямлю. А на тым месцы, дзе яны капаюць, вырастае траўка. І называюць усе гэтую траўку — зязюльчыны слёзы.

1963

УЛАДЗІМІР КОРБАН

(1910—1971)

АБ ПРАФЕСІЯХ, ЯКІЯ ЗНІКЛІ

ЛАКЕЙ

Лакей — прафесія была
Такая ў час праклятый.
Аб ёй і чутка не дайшла
Да вас, мае рабяты.

Бывала, пан яшчэ ляжыць
Пад коўдраю уранку,
А ўжо, глядзіш,— лакей бяжыць,
Падносіць кавы шклянку.

А потым порткі надзяе
На пана ён старанна,
А пан у твар яму плюе —
Благі настрой у пана.

Абраза, лаянка і крык,
А часам і лупцоўка...
У афіцэра быў дзяншчык,
У пані — пакаёўка.

Але настаў вялікі дзень.
Рукою, з працай звыклай,
Панам далі мы у каршэнь —
Прафесія і знікла.

1962

АБ ПРАФЕСІЯХ, ЯКІЯ ЗНІКНУЦЬ

КАНДУКТАР

Аўтобус вуліцай імчыць.
— Білеты, грамадзяне! —
Кандуктар раз у раз крычыць,
Аўтобус едзе, стане...

Ізноў на вуліцы гудзе,
Стаіць зіма ці лета.
Кандуктар жа адно вядзе:
— Прашу набыць білеты!

Было нядаўна гэтак скрозь.
Ды вось пара настала,
І без кандуктара ўжо ёсць
Аўтобусаў нямала.

Манету ў касу апусціць
Сумее кожны шчыра.
А хто забудзе заплаціць —
Падкажуць пасажыры.

А цераз нейкія гады
Бясплатна ездзіць будзем.
І пра кандуктара тады
Напэўна ўжо забудзем.

1962

АБ НОВЫХ ПРАФЕСІЯХ

КАСМАНАЎТ

Прабіцца ў космас чалавек
Спрадвеку меў імкненне.
І вось нарэшце перасек
Зямное прыцягненне.

Узняўся ў неба,— шар зямны
Прад ім як на далоні.
Злуюць заморскія паны,
Ім дужа крыўдна сёння.
Паноў хвалюе наш узор,
І точыць сэрца праўда:
Не іхні, бачыце, маёр
Быў першым касманаўтам.

Мы ж касманаўтаў будзем мець
Без ліку, не хаваем,
Бо, як у космасе ляцець,
Мы добры вопыт маем.

У нас Гагарын і Цітоў
У космасе, як дома.
Ляцець у космас будзь гатоў,
Як вырасцеш, вядома.

1962

МІКОЛА КОРЗУН

(нарадзіўся ў 1934 г.)

ЯБЛЫНЬКА

(З маленства народнага паэта Беларусі Янкі Купалы)

Росны луг свяціўся на сонцы ледзь прыкметнымі дзівоснымі колерамі: і чырвоным, і блакітным, і аранжавым. А воблачкі туману, нібы дзікія гусі, узнімаліся ля босых ног Яся, што ішоў па сцежцы да маёнтка. Яму хацелася спыніцца і доўга-доўга любавацца гэтымі малюнкамі раніцы, але ён спяшаўся. Хлопчык з учарашняга вечара не быў дома. Усю ноч пасвіў панскіх коней. Бацька не змог. Ужо трэці дзень не ўстае з ложка. Пэўна, і цяпер яму блага, бо маці ноччу не выйшла на поплаў праведаць Яся. Відаць, не змагла адысціся ад бацькі.

Хлопчык быў стомлены. Але спаць не хацелася. На начлезе пры святле вогнішча ён прачытаў невялічкую кніжку вершаў рускага паэта Някрасава. Кніжка і цяпер ляжала ў яго за пазухай. Яму ўспомніліся радкі з аднаго верша:

Вижу я в котомке книжку.
Так, учиться ты идешь...
Знаю: батька на сынишку
Издержал последний грош.

І Ясю хацелася вучыцца. Вельмі. Але грошы — не грыбы, не назбіраеш у лесе, каб заплаціць за вучобу. Бацька ад цямна да цямна працуе як чорны вол, а пан яму за гэта плаціць грашы. Хапае толькі на бульбу ды на зацірку. Аднаго разу бацька з болем у голасе сказаў

Ясю: «Сынок, у паноў усё: і заводы, і зямля, і школы. А ў нас, беднякоў, нават сваёй хаты няма...»

Са сцежкі хлопчык скіраваў у панскі сад. Пры самай дарозе ўбачыў пашкоджаную маладую яблыню. На ствале віднелася свежая рана. Унізе валяўся кавалак яблыневай кары і быў след кола. Цяпер усё зразумела: ездавы няўмела скіраваў каня, і брычка пакалечыла дрэўца.

Агледзеўшы яблыньку, Ясь накіраваўся на гаспадарчы двор. Адтуль — зноў да яблынькі. Глінай замазаў рану. Перавязаў кудзеляй ствол. Ножыкам-складанчыкам зрэзаў зламаную галінку, на якой вісела звялае лісце і два-тры маленькія зялёныя яблычкі.

Хлопчык так захапіўся, што не заўважыў, як да яго падышоў пан. Пан быў задаволены, паклаў Ясю на худзенькае плячо пухлую руку і спытаў:

— Як цябе завуць?

— Ясь.

— А колькі табе гадоў?

— Восенню споўніцца адзінаццаць.

— Сапраўдны працаўнік будзе з цябе, як вырасцеш. Добра даглядаеш мой сад.

Раптоўна чырвань заліла Ясеў твар.

— Я...— з хваляваннем у голасе выдыхнуў ён.— Я не для вас гэта зрабіў. Мне яблыньку шкада!

1980

ВАЛЯНЦІНА КОЎТУН

(нарадзілася ў 1946 г.)



ЦВІЧОК

Хоць маленькі сам цвічок,—
Падстаўляе свой бачок:
— Ты па мне не бойся біць,
Мне ніколі не баліць,
Вастрадзюбы я, жалезны,
Як у масла, ў дрэва лезу.
Малаток бяры у рукі
І, як тата, моцна стукай.
Хочаш — заўтра,
Хочаш — сёння
У сцяну мяне загоніш.
Цяжка толькі навічку,
Малому гультайчыку.
Раз ударыць па цвічку,
А другі —
па пальчыку!

1981

УСЕВАЛАД КРАЎЧАНКА

(1915—1961)

ЯК ПЕТРУСЁК ВУЧЫЎСЯ ЧЫТАЦЬ

Колькі, вы думаеце, было гадоў Петруську, калі ён навучыўся чытаць? Не ўгадаеце? Пяць гадкоў усяго толькі. Цёця Даша, суседка па кватэры, казала Петрусёвай маме, што гэта шкодна — так рана забіваць галаву дзіцяці навукай. «Усякай справе свой час,— гаварыла яна.— Няхай цяпер хлопчык гуляе сабе ў цацкі, а пойдзе ў школу, там яго навучаць і чытаць, і пісаць». Маці згаджалася з цёцяй Дашай, бо цёця Даша працавала прыбіральшчыцай у школе і сёе-тое ведала пра выхаванне дзяцей.

Але дзе там было ўтрымаць Петруся! Маці спачатку і адгаворвала яго, і сварылася,— нічога не дапамагала. Ад старэйшага брата, другакласніка Міхася, Петруську застаўся буквар. Дык ён разгорне яго і давай пальчыкам вадзіць ад літары да літары: мы-а-мы-а, мама, бы-а-бы-а, баба... Маці глядзела, глядзела ды і рукой махнула,— ат, няхай сабе вучыць. Гэта для яго ўсё роўна як і гульня, пазабаўляецца ды і кіне.

Але час ішоў, а настойлівы Петрусёк і не думаў кідаць навуку. Усё ходзіць і ходзіць з букваром. Падгадае, калі Міхась у добрым гуморы са школы вернецца, падкоціцца да яго гэтакай хітрай лісічкай:

— Міхаська, брацік мой, а гэта што за кручок намаляваны?

— Кручок! — звысоку глянуўшы на брата, усміхнецца Міхась.— Сам ты кручок!.. Гэта ж літара «гэ» так пішацца. Гаўрыла, грыб, голуб...

— Гаўрыла, грыб,— бязгучна паўтараў за братам Пятрусь.

Ён вельмі зайздросціў брату, які, здавалася яму, ведаў ужо ўсе таямніцы навукі.

— А вось гэта, калі ты ўжо так хочаш ведаць, літара «дэ»,— тлумачыў далей Міхась, увайшоўшы ў ролю настаўніка.— Дрэва, долата, дарога...

— Дрэва, дарога,— паўтараў услед Петрусёк.

І такі дасціпны быў Петрусёк, што ніхто і азірнуцца не паспеў, як ён ужо ўсе літары вывучыў назубок. Нават мяккі знак ведаў. Узяўшы азбуку, Міхась наўгад торкаў пальцам у любую літару, і Петрусёк адразу ж называў яе, ды яшчэ ў дадатак і некалькі розных слоў прыдумляў на гэтую літару.

Вось толькі адно ў Петруся не ладзілася — ніяк ён, небарака, не мог уцяміць знакаў прыпынку. Што азначае, скажам, гэтая ледзь прыкметная кропачка або загагулінка, якая раптам, ні з таго ні з сяго, сярод слоў трапіць табе на вочы? Тут, шчыра кажучы, пасаваў ужо і сам «настаўнік». Яго тлумачэнні былі расцягнутыя і незразумелыя.

— Гэта не загагулінка, а коска завецца. А гэта — кропка.

— А іх таксама чытаць трэба? — пытаўся Пятрусь.

— Чытаць іх не трэба, іх трэба маўчаць.

— Як маўчаць? Навошта ж тады іх пішуць?..

— Ну, разумееш, як табе сказаць? — моршчачы лоб, тлумачыў Міхась.— Так трэба. Сустрэнецца табе на дарозе вось такая коска, ты спыніся, перадыхні і гані далей... А ўбачыш кропку,

ну, тут ты, брат, ужо зусім змоўкні і стой. А потым зноў чытай... А вось гэты цвічок,— расказваў Міхась далей, жадаючы адбыць усю бяду разам,— азначае клічнік. Тут ты, разумееш, павінен павысіць голас, крыкнуць, ну, скажам, як мама на нас крычыць, калі мы, бывае, занадта разгуляемся...

Спыніцца, перадыхнуць, памаўчаць, крыкнуць — усё гэта неяк не ўкладвалася ў галаве Петруся. Ну, добра, спыніцца, а колькі ж трэба стаяць каля гэтай коскі, каб затым ісці далей? На гадзіннік трэба паглядаць, ці што?.. А калі стаіць клічнік, то крык падымаць трэба ў самым пачатку ці перад клічнікам? І як крычаць — маці ж на іх па-рознаму крычыць, бывае, на ўвесь голас, а часам толькі так, ушчувае...

І вось неяк увечары, у вольны час, калі ўся іх невялікая сям'я сабралася ў сталовай, Петрусёк падсеў на канапу да бацькі і ласкава папрасіў:

— Татка, хочаце, я вам з мамай кніжку пачытаю.

— А ці ж ты, сынок, ужо ўмееш чытаць? — пагладзіўшы Петруся па галаве, спытаў бацька.

— Умею. Вось паслухай...

А акурат перад гэтым маці купіла ў падарунак Петрусю цікавую кніжку з малюнкамі.

Петрусёк разгарнуў кніжку, і ўсе — бацька, маці, Міхась — падрыхтаваліся слухаць. Петрусёк пачаў чытаць. Чытаў ён даволі добра, але прачытаў першы сказ да канца і спыніўся. Усе маўчаць, слухаюць, і Петрусёк маўчыць, толькі вочкамі зіркае вакол.

— Ну, што ж ты замоўк? Чытай далей,— сказаў бацька.

— Які ты нецярплівы, татка. Тут жа кропка

стаіць, дык мне трэба спыніцца і памаўчаць. Ці ж ты не ведаеш?

Не паспелі яшчэ бацька з маці зразумець, у чым тут справа, як Петрусёк зноў пачаў чытаць, але на гэты раз не сваім звычайным голасам, а закрычаў на ўсю хату.

— Цішэй, Петрусёк, чаго ты так крычыш? — жартаўліва затыкаючы пальцамі вушы, прамовіў бацька.

Але Петрусёк глянуў на яго з дакорам:

— Эх, татка, нічога ты не разумееш. Тут жа ў канцы клічнік стаіць!..

Мелькам глянуўшы на пачырванелага і збянтэжанага Міхася, бацька і маці адразу здагадаліся, хто быў за настаўніка ў Петруся. Яны пераглянуліся між сабой і не ўтрымаліся ад вясёлага смеху.

Ну, але ўсё гэта нічога, і Петрусёк не асабліва крыўдзіўся на бацькоў. Як бы там ні было, а ён усё ж чытаць умеў. А ўмець чытаць — вялікая справа! Ідзе сабе, скажам, Петрусёк з бацькам ці маці ў выхадны дзень па горадзе, чытае на сценах дамоў розныя шыльды, надпісы, афішы і ўсё ведае, дзе што робіцца. «Хлеб» — значыць, у гэтым магазіне прадаюць хлеб, булкі, піражкі. «Кіно» — тут паказваюць кінакарціны; а вось на рагу магазін — «Кнігі»...

Не, што там ні кажыце, а добра, калі ўмееш чытаць. І наогул добра ўсё ўмець. Нездарма пра гэта і прымаўка складзена: умець — за плячыма не насіць!

1957

ЯЎГЕН КРУПЕНЬКА

(нарадзіўся ў 1936 г.)

У МАГАЗІНЕ ЗАЙКА БЫЎ

У магазіне зайка быў
І падушку там купіў,
А прынёс дадому,
Дык лёг спаць, вядома.
На падушцы — галава,
А пасцелька — трава.
Ляжыць зайка пад кустом,
Куст — яго цудоўны дом,
Мяккая падушка,
Ды звісае вушка.
Што рабіць? Што рабіць?
Трэба новую купіць!
Зайка новую купляе,
Зноў няўдача спасцігае:
З новае падушкі
Зноў звісаюць вушкі.
Зай пакупцы
Сам не рады —
Хто у гэтым
Вінаваты:
Зай або падушкі?
Не,— даўгія вушкі!

1970

ВЯСНЯНА

Сёння рана-рана
Крочыла Вясняна,
З прамяністых рукавоў
Выпускала сакалоў:
Там, дзе яны селі,
Травы зелянелі,
Там, дзе яны палі,
Кветкі выраставалі,
І звінелі песні
Ў сінім паднябессі.

1970

АЛЯКСЕЙ КУЛАКОЎСКІ

(нарадзіўся ў 1913 г.)

СТАРЫ МЛЫН

— ...Хто табе сказаў, што з такой вышыні не відзён Слуцак?.. Я ж добра ведаю, што відзён. Нават калі ўзлезці вунь на той ганачак, адкуль ланцуг спускаецца, дык і то можна ўбачыць мураваныя дамы. А калі праехацца на крыле — не толькі Слуцак убачыш, а мо і Бабруйск. Петрык колькі разоў лятаў...

— Чаму ж ты не спытаў у Петрыка?..

Дзеці сабраліся ля старога млына. Гэта было самае любімае месца іх гулянак. Вакол зялёны мурог, а крыху далей з усіх бакоў жыта, густое і высокае, амаль у два разы вышэйшае нават за Антося, хоць ён у сваім гурце самы большы.

Тут добра гуляць у хованкі. Пад млынам можна схавацца за стаян, прытуліцца дзе-небудзь за штандарамі, а то можна крокаў на пяць ад краю прылегчы і ў жыце.

Антось не вельмі любіць гуляць у хованкі, бо яго хутка знаходзілі. Дзе ён ні схаваецца, дык усё ногі тырчаць. Таму яго і завуць даўганогі. Затое калі дзеці пачнуць бегаць кругом млына навыперадкі, то ніхто Антося не апярэдзіць.

Побач з ім, але ўсё ж крыху паводдаль, можна паставіць маленькага віхрастага Міколку. Гэты як схаваецца, гуляючы ў хованкі, дык ніхто яго не можа знайсці, пакуль сам не абзавецца, ды і тады не адразу ўбачыш, дзе ён схаваўся.

Любяць дзеці сядзець пад млынам у час навальніцы. На млын налятае сярдзіты вецер, упіраецца ў крылы, свішча праз шчыліны і запарушвае пылам вочы. І скрыпяць, і жудасна стогнуць тады шмыгі, стаян проста аж ходырам ходзіць, здаецца, што млын не вытрымае такога націску, узмахне крыллямі, як чалавек рукамі, і бразнецца аб зямлю патыліцай. Тады робіцца крыху страшнавата пад млынам, але ж і цікава: можна сабе ўявіць, што ты ляціш на самалёце над тайгой, над высокімі снежнымі гарамі, а можа, плывеш на караблі ў часе шторму.

Потым дождж як зашуміць, як шугане на крыллі... Пыл адразу ападае, становіцца так прыемна і лёгка дыхаць...

А як толькі зноў выблісне сонца, хочацца тады пабегаць па мокрай траве ды па лужынах,— вада ў іх цёплая-цёплая, як у печы нагрэтая.

Каля млына магілка Петрыка. Пасля дажджу яна неяк прыгожа свяжэе, а ад мяты, што густым вяночкам расце на магілцы, ідзе прыемны пах.

Петрык — сын калгаснага млынара — быў блізкім прыяцелем Антося і Міколкі. Пры немцах ён часта хадзіў да свайго бацькі ў партызанскі атрад — быў сувязным, а Міколка і Антось сталі самымі лепшымі яго памочнікамі. Яны былі самымі лепшымі, а наогул-то, Петрыку дапамагалі і другія, у яго быў свой сапраўдны атрад. І Петрык ведаў, хто на што больш здольны і што каму можна было даручыць. Як Антось шпарчэй за ўсіх бегае, то яму даваліся найбольш спешныя заданні: што-небудзь хутка перадаць у атрад, каго-небудзь папярэдзіць, а як было вядома, што Міколка лепш за ўсіх умее хавацца, то на яго абавязку ляжала што-небудзь падглядзець, падслухаць, высачыць.

Пад млынам быў іх штаб. Тады яны збіраліся ля млына таксама нібы для гулянак; гулялі ў курмышку, у хованкі, бегалі навыперадкі, але ўсё гэта рабілася больш для адводу вачэй. У кожнага з іх была важная справа: мімаходзь, як бы неўзаметку, яны атрымоўвалі ад Петрыка заданні, дакладвалі, што паспелі зрабіць за мінулы дзень.

Аднаго разу Петрыку трэба было прасачыць, калі будзе ісці карны атрад у іх вёску са Слуцка. Петрык пільнаваў з самага ранку, на гэтую справу быў сабраны ўвесь яго атрад, а пад вечар, калі ўжо ўсе думалі, што немцы ў той дзень, можа, і зусім не паявяцца, прыбег са свае засады Міколка і паведаміў, што за ўзгоркам паказаўся вораг.

Петрык хутка ўскочыў на ганак млына, але адтуль нічога не ўбачыў, падняўся па ланцугу на самы верхні ганак, куды мяшкі цягаюць, і адтуль не відно было. Тады ён узабраўся на страху, стаў на ўвесь рост, прылажыў далонь да вачэй і пачаў глядзець у бок Слуцка, туды, за ўзгорак, дзе Міколка заўважыў немцаў. Так Петрык прастаяў, можа, з хвіліну, потым яго далонь раптам неяк здрыганулася, рыўком апусцілася да грудзей — хлопчык хістануўся і паляцеў дадолу...

У тую хвіліну, калі Антось і Мікола падбеглі да Петрыка, ён ледзь-ледзь дыхаў. Твар яго пасінеў, а з правага боку грудзей тонкім раўчуком цякла кроў. Спачатку ён ляжаў зусім нерухома, потым раптоўна здрыгануўся, замахаў рукамі, мабыць, хацеў штосьці сказаць, ды не мог выдыхнуць. Тады, сабраўшы ўсе намаганні, ён прыпадняўся на левы локаць, крануў Антося за руку і паказаў яму на лес.

Антось пабег што меў сілы...

* * *

Ноччу таго ж дня Петрык памёр. Стаяла тады ціхая летняя пагода, толькі ў самым канцы верхняга крыла слабы ветрык ледзь чутна пасвістваў у свежых кулявых дзірачках.

З таго часу стары млын стаў падобны на велізарны помнік на магілцы Петрыка, з таго часу зялёны мурог ля млына стаў самым запаветным і дарагім месцам для дзяцей усёй вёскі.

Хлопцы прынеслі сюды вянкі з прыгожых палявых кветак і аблажылі імі ўсю магілку.

— Не пытаў жа ты ў Петрыка,— усё пярэчыў Міколка,— мо ён і не бачыў Слуцка.

— А вось я сам,— сказаў Антось і палез на млын.

Спачатку ён, як і некалі Петрык, узлез на нізшы ганак, потым па ланцугу ўзабраўся на верхні, а адтуль — на страху млына. З вышыні Петрыкава магілка здалася Антосю маленькай, як птушынае гняздзечка, а далёка-далёка, аж там, адкуль узыходзіць сонца, і сапраўды быў відзён Слуцак.

1945

ЯЎГЕН КУРТО

(нарадзіўся ў 1924 г.)



НА НАЧЛЕЗЕ

Ярка палае вогнішча. Дзядзька Хвёдар, каржакаваты, з абветраным тварам і пышнымі вусамі мужчына, час ад часу варушыць суком падгарэлыя паленні. Тады разам з агністымі языкамі над вогнішчам узвіваецца цэлы рой залатых іскрынак. Яны ціха кружацца і, падняўшыся высока, адна за адной гаснуць, знікаюць у чорным небе. Якімка праводзіць іх доўгім позіркам. Прыгожа!

Воддаль, за светлым кругам ад вогнішча, разпораз фыркаюць ды гулка бухкаюць спутанымі капытамі па лузе коні. Там пасецца табун.

— Дык цябе, значыцца, цікавіць, ці страшна было ў разведцы? — пасля доўгага маўчання перапытвае Якімку дзядзька Хвёдар і, не чакаючы адказу, працягвае: — Тут, браце, штука такая, што адразу і не раскажаш.

Ён паволі падымаецца з купіны і бярэцца за капшук з тытунём.

— Вось гляну коней, тады пра гэтыя самыя страхі як след пагаворым.

Якімка імкліва падхопліваецца.

— Я, я коней пагляджу! — У голасе яго просьба. — Не гуляць жа я на начлег прыехаў.

— Так і быць. — Конюх дастае з кішэні вялікі гадзіннік. — Да дванаццаці ты дзяжурны, а там я заступлю.

Якімка робіць некалькі шырокіх крокаў ад вогнішча і ў нерашучасці спыняецца. Наперадзе — цемень. Ды такая густая, што здаецца, пальцам не праткнеш.

— Каля балотца там прайдзіся,— кідае ўслед дзядзька Хвёдар.

Гэтыя звычайныя словы чамусьці адразу надаюць хлопчыку бадзёрасці. Ён рашуча ідзе ў ноч.

І дзіўна. Не такая ўжо яна цёмная, як гэта здавалася там, ля агню. Вунь і коні відаць, і кусты па-над Альхоўкай. А зорак на небе колькі!

Адышоўшыся, Якімка спыняецца і ўважліва прыслухоўваецца да начных гукаў. Стрымана булькоча ў карчах Альхоўка, дзесь непадалёк рэзка крычыць дзяргач.

«На холад крычыць»,— успамінае хлопчык дзядзькавы словы.

З боку вёскі, дзе слаба ружавее нешырокая палоска неба, даносяцца натужлівае рыхканне паравіка на цеплацэнтралі і вясёлая музыка. Праўду хлопцы казалі, што іхні рэпрадуктар самы лепшы ў аколіцы. Вунь як далёка чуваць!

Але няма чаго стаяць. Трэба да балотца ісці. А то, чаго добрага, возьме ды завалачэцца ў дрыгву конь ці жарабя. Тады рабі што хочаш. Быў жа, кажуць, такі выпадак некалькі год назад.

Асцярожна, каб не спатыкнуцца аб якую купіну, Якімка ідзе ў той бок, дзе ціха шастае высокая балотная асака. У вёсцы гэтае месца празвалі «скулай». І сапраўды, яно быццам тая скула ў баку. Вакол луг як луг, а ў самай сярэдзіне — пятаком дрыгва. Праўда, хутка яе абгародзяць. Ужо і жэрдак прывезлі. Тады не трэба будзе непакоіцца за жывёлу... Наблізіўшы-

ся да першых кустоў, што абступілі балотца, Якімка раптам замірае і міжвольна робіць некалькі крокаў назад. З густой асакі да яго слыху далятае не то слабы стогн, не то жаласнае ржанне. Па спіне хлопчыка прабягаюць халодныя мурашкі, на лбе выступае буйнымі кроплямі пот. Што гэта?! Мо звер які? Хаця не. Адкуль тут можа ўзяцца звер? Ды і не так скуголіць звяр'ё... звяр'ё...

«Трэба хутчэй дзядзьку сказаць»,— мільгае думка. Перад вачыма Якімкі на момант паўстае ўтульная пасцель з пахучага сена каля вогнішча, ён нібы зноў бачыць вясёлыя іскрынкі ў небе і спакойны позірк дзядзькі Хвёдара. І так хочацца быць зараз там, побач з ім, адчуваць яго надзейную блізкасць! Але хлопчык намаганнем волі адганяе гэтую думку. Ну і што? Прыбяжыць ён, а дзядзька скажа: «Эх ты, баязлівец, нічога як след не дазнаўся і прыбег. Герой, называецца. А што б было, каб цябе ў разведку на вайне паслалі? Таксама задрыжаў бы ды назад?»

Бегчы да дзядзькі ні ў якім разе нельга. Трэба самому аб усім даведацца. Вось толькі зброі ў яго няма, нават нажа з сабой не ўзяў. Як скроб печаную бульбу ля вогнішча, так і пакінуў яго на крывым палене.

Якімка нагінаецца, паспешліва мацае рукамі вакол сябе, і натрапіўшы на доўгую палку, падымае яе. Хай хоць яна будзе. Ці мала што можа здарыцца.

Цяпер уперад. Толькі ўперад. Назад ходу няма.

Ідзе Якімка асцярожна, крадучыся, трымаючы перад сабой палку.

А стогн паўтараецца. Слабы, безнадзейны. Быццам трапіла ў бяду малое дзіця, выплакала ўсе слёзы і цяпер толькі бездапаможна ўсхліпвае,

не ведаючы, адкуль яму чакаць дапамогі і ці прыйдзе яна наогул.

Ногі Якімкі спыняюцца і самі хочуць зноў павярнуць назад. Але хлопчык стрымлівае сябе, некаторы час прыслухоўваецца і раптам радасна ўскрыквае:

— Ды гэта ж жарабя!.. Яно! А я ледзь да дзядзькі не пабег. Вось дурны.

Якімка рашуча прадзіраецца праз кусты. Звальваецца з галавы шапка, штосьці пякучае, мабыць крапіва, абпальвае твар, рукі. Ды нічога! Ён не адступіць. Яшчэ некалькі крокаў, і ён будзе каля жарабяці.

Але тут ногі правальваюцца ў нешта вязкае. Хлопчык падае нібы падкошаны. Дрыгва!

— Дзя-а-дзька-а!..— крычыць Якімка і змаўкае. Перад самым яго тварам слаба варушыцца над дрыгвой галава жарабяці з белай зорачкай на лбе.

Ластавачка! Вось каго засмактала праклятае балота. Хлопчык пяшчотна гладзіць мокрую галоўку жарабяці, а яно шумна дыхае Якімку ў твар.

— Не бойся, дурненькае. Зараз выручу...

Але як? Якімка абмацвае жарабя і з радасцю пераконваецца, што пярэднія ногі ў яго яшчэ наверсе. Значыць, перш за ўсё трэба падкласці пад іх палку. Атрымаецца нібы мосцік. А потым? Што рабіць потым самому без палкі? І яго ж можа засмактаць багна...

— Якімка-а-а! — далятае здалёк глухаваты дзядзькаў голас.

— Сюды, дзядзечка, сюды-ы! — што ёсць моцы крычыць хлопчык і рашуча вырывае з-пад сябе палку. Цяпер да прыходу конюха ён пратрымаецца.

Крыху разгробшы пад Ластавачкай гразь,

Якімка падкладае палку. Жарабя, здаецца, з палёгкай уздыхае. А цела хлопчыка пачынае павольна апускацца ў халодную твань. Якімка робіць парывісты рух, каб вырвацца з багны, але яна не адпускае яго...

— Дзе ты? — зноў, ужо бліжэй, чуецца дзядзькаў голас.

— Тут. Хутчэй!..— хрыпла крычыць Якімка.

Затрашчалі кусты, і вось ужо дзядзька Хвёдар побач з Якімам. Дзядзька наламаў алешніку і падсоўвае яго пад Ластавачку. Нарэшце, нездаволена хлюпнуўшы, дрыгва выпускае жарабя са сваіх смяротных абдымкаў.

— Трымайся за мяне,— спакойна гаворыць конюх Якімку.— Ды мацней.

Да вогнішча яны ідуць плячо ў плячо, як роўныя. Якімку прабіраюць дрыжыкі, ён да ніткі вымак. А дзядзьку, напэўна, горача. На руках ён нясе, як дзіця, Ластавачку. Трэба, каб абсохла ля цяпла. Інакш захварэць можа.

— А малайчына ты, не разгубіўся, не збаяўся,— гаворыць дзядзька Хвёдар.

Якімка маўчыць. Яму карціць сказаць, што гэта не так, што ён і разгубіўся быў, і баяўся. Але ж хіба можна гаварыць пра гэта былому партызанскаму разведчыку, які, напэўна, у самыя небяспечныя часіны не ведаў страху?

Маўчыць і дзядзька Хвёдар. У яго свае думкі. Калі яму было столькі гадкоў, як зараз малому, ён нізашто не пайшоў бы адзін на балота, ды яшчэ ў поўнач...

Так, моўчкі, думаючы кожны пра сваё, яны і ідуць па начным лузе туды, дзе заманліва свеціцца вогнішча.

1966

УЛАДЗІМІР ЛІПСКІ

(нарадзіўся ў 1940 г.)

ГАСЦІНЕЦ

Позна ноччу тата прыехаў з камандзіроўкі. Раніцай Марынка перабегла са свайго ложка да таты пад коўдру. Лашчыцца. Расказвае навіны. Раптам пытаецца:

— Што мне прывёз?

— О, прывёз табе незвычайны гасцінец.

— А які ён? Пакажы мне.

Тата падняўся з ложка. Дастаў з партфеля чырвоны яблык і падаў Марынцы. Яна схапіла рукамі гасцінец, але радасць у яе вачах патухла: вялікае дзіва — яблык!

— Гэта гасцінец ад цёткі Зіны,— пачаў тлумачыць тата.

— Якой цёткі? — зацікавілася Марынка і бліжэй падсела да таты.

— Яна жыве ў горадзе, адкуль я толькі што прыехаў,— пачаў расказваць тата.— Цётка Зіна на вайне з фашыстамі была цяжка паранена... У яе няма рук...

Марынка аберуч ашчаперыла яблык і прытуліла да грудзей. Прыціхла, глядзіць на тату, чакае працягу.

— Цётка Зіна вельмі доўга была ў бальніцы. Аднойчы ўзімку, калі яшчэ ішла вайна, ёй у палату прынеслі гасцінец — вялізны чырвоны яблык. Цётка Зіна вельмі ўзрадавалася. Нават, здаецца, раны перасталі гэтак балець.

— Гэта той самы? — спытала Марынка і ўжо з большай цікавасцю паглядзела на сакавіты яблык.

— Не, вядома, не той,— усміхнуўся тата і расказваў далей: — Цётка Зіна паправілася. Яна папрасіла, каб пасадзілі каля яе дома яблыньку. Вось з тае пары кожную восень у яе ёсць чырвоныя яблыкі. Цётка Зіна любіць частаваць імі ўсіх сваіх гасцей. І мяне пачаставала. А вось гэты яблык папрасіла перадаць табе,— закончыў свой расказ тата.

Марынка сядзела моўчкі. Твар яе зрабіўся сур'ёзны. Губы падцяла, вочы патухлі. Дзе і падзеліся тыя гуллівыя агеньчыкі!

— Як падрасту,— урэшце сказала Марынка,— паеду да цёткі Зіны і завязу ёй сваю Жану.

Жана — самая любімая лялька Марынкі.

Тата прытуліў дачку да сябе і спытаў:

— А не шкада?

— Ані не шкада,— адказала Марынка.— Я ёй падару ўсе свае цацкі.

Тата не пытаўся, навошта цётцы Зіне такі падарунак. Сваім позіркам Марынка выказала шчырае жаданне: дапамагчы цётцы, каб ёй заўсёды было добра і весела.

— А яшчэ, як пайду ў школу...— дачка падумала і рашуча дадала: — Я напішу цётцы Зіне пісьмо. Скажу ёй, што таксама хачу вырошчваць яблыкі, якія вылечваюць людзей!

Цэлы дзень гуляла Марынка з чырвоным яблыкам — дарагім гасцінцам незнаёмай цёткі.

1974

АЛЕГ ЛОЙКА

(нарадзіўся ў 1931 г.)

ДЗЕ НАЧУЕ СОНЦА

Ветрык ціха гушкаў
Сойку на сасонцы.
Сакаталі птушкі:
— Дзе начуе сонца?..

— Ды ў цырку, няйначай,
Бо ўвесь дзень не плача,
А весела скача,
Як чырвоны мячык!..

— Не ў цырку, а ў склепе
Фар і батарэек,
Бо чаму так слепіць,
Бо чаму так грэе?

— Не! За агародам,
У маку агністым,
Там, дзе пчолкі мёдам
Пахнуць залацістым!..

Толькі задрамала
Сойка на сасонцы:
Спала і не чула,
Дзе начуе сонца!..

1975

ЯК ЯЙКІ НЕСЛА БАБКА ДА МАЙКІ

Курка сакатала,
Курка несла яйкі,
Бабка іх збірала
Для ўнучанькі Майкі.

Беленькія яйкі
Ў хустачку ўвязала,
Панесла да Майкі
Памалу, памалу.

Ды чаравік быў слабкі,
А слабей — шнурочак,—
Брала ў зубкі бабка
Белы вузялочак.

Вось-вось вузел слабкі
Нанова завяжа,
Ды тут дзед ля бабкі
Спыніўся і кажа:

— А ты не да Майкі?..
— Да Майкі, канечне!..

. . . . . .

Былі ў хустцы яйкі,
Сталася яечня.

1981

ЯК ДЗЕД АЯЯЙ ЗБІРАЎ ГРЫБЫ

Пайшоў дзед Аяяй
З рэшатам па ваду,
Вымыў твар і віламі
Расчасаў бараду.

А тады ўзяў
Кошык лазовы,—
Пайшоў у маліннік па дровы;
А тады ў аглоблі
Запрог туман рабы,—
Паехаў фурманкаю
Па грыбы.
А грыбы выбіраў
Без ніякае драпінкі,
Ды каб з чырвонымі капялюшыкамі,
Ды каб у белыя крапінкі!
Напіхаў іх у кішэні,
Нашмаргаў у шапку,—
Вось дзе парадуе
Старэнькую бабку!
А бабка ручкі белыя
Заламала да змору,
За плот, асалавелая,
Выкідвала мухаморы:
— Запрагай,— крычала дзеду,—
Гушчэйшы туман рабы
І едзь ты па сапраўдныя
Па грыбы!

1981

ЕЎДАКІЯ ЛОСЬ

(1929—1977)

КАЗКА ПРА ЛАСКУ

Ціха, дзеці,
Паслухайце казку
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку!

Дзе жыве яна,
Як выглядае,
З кім сябруе,
Каму памагае.

* * *

Неяк Ласку угледзеў
Сяргейка,
Хоць і слёзы блішчалі
На вейках.

Захварэў неўспадзеўкі
Хлапчына.
Сінява залягла
Пад вачыма.

Парашкі ён глытаў
І пілюлі,
Смеху хлопчыка
Доўга не чулі.

І тады да ягонага
Ложка
Падышла, нібы цень,
Басаножка.

Падышла неўзаметку
Малая,
За плячыма —
Каса залатая.

— Ты Сяргейка? —
Пытае ласкава
І плыве каля ложка,
Як пава.

— Ты хварэеш?
Замучылі лекі?
Пацярпі,
Не хвалюйся, маленькі!

Хочаш — коўдру тваю
Я папраўлю!
Хочаш — кветак у шклянку
Пастаўлю!

Каля хворага
Без адпачынку
Завіхаецца
Тая дзяўчынка.

Лоб малога пагладзіла,
Бровы,—
І Сяргейка заснуў,
Як здаровы.

І ў сне ўжо,
Што быў нібы казка,

Ён пытае:
— Скажы, калі ласка,
Хто ты?
— Ласка.
— Якая?
— Такая,
Што маленькім
Заснуць памагае.

— Дык застанься са мной,
Мая Ласка!
— Я спяшаю ў калгас,
Да Тараскі!

І, махнуўшы хусцінкаю
Белай,
Неўпрыкметку пайшла,
Паляцела.
Ціхі хлопчык
Ажно засмяяўся:
Ён з хваробай сваёй
Развітаўся!

* * *

Пасварылася з Надзяй
Ларыска.
І за што?
З-за малочнай ірыскі!
Да дзяўчынак прыходзіла цёця.
Надарыла цукерак блазноце.
І дражэ, і «падушак» і «мішак»...
Немалое багацце ў малышак!

Адно цешся з салодкіх
І еш
Ды сябровак частуй ты...
Дык не ж!

Стала крыўдна старэйшай —
Ларысцы,
Што ў Надзеі —
Яшчэ і ірыскі!

Вось старэйшая,
Каб не журыцца,
Адабрала ірыскі
Ў сястрыцы.

Хто паможа
Надзейцы ціхмянай?
Хто ёй верне
Прысмак адабраны?

Можа, цёця?
Яна на рабоце.
Можа, мама?
На працы таксама.

Памагла ёй
Дзяўчына-краса,
За пляч́мі —
Залатая каса.

І адкуль яна толькі
Ўзялася,
Як пазнала,
Што спрэчка ўзнялася?

На маленькіх нагах
Неабутых
Падышла да дзяўчынак
Надзьмутых.

Белай хусткаю
Твар абмахнула,

На сястрычак
Лагодна зірнула.

— Я завуся,— гаворыць ім,—
Ласкай.
Вы паслухайце
Простую казку!
Я прыйшла
Ад Сяргейкі-
Хварэйкі,
Я прыйшла
Ад Тараскі-
Падпаска.

Сумаваў той без ласкі
За статкам,
Калі ў поле падаўся
За таткам.

А пасля пабыла я
За морам,
За бязмежным
Блакітным прасторам.

Там чакаў мяне
Бедны, пануры
Хлопчык з чорнаю-
Чорнаю скурай.

У краіне,
Дзе сонца багата,
Гэты хлопчык
Застаўся без таты.

Тату ворагі злыя
Забілі,
Бо змагаўся ён
Супраць насілля.

Супраць гора змагаўся
Адважна,
Клікаў волю
Ў свой край неабсяжны...

Пацямнелі,
Як быццам ад ночы,
Васільковыя
Ласчыны вочы.

Залатую касу
Запляла,
Пацішэлых сястрыц
Абняла.

І тады запытала
Ларыса:
— А як хлопчыка клічуць?
— Патрысам.

І ўжо шэпчуцца ціха
Дзяўчынкі...
Ім цяпер
Не да прыкрых учынкаў!

Трэба другу
Пісьмо напісаць,
Падарунак яму
Пераслаць.

І пачула тут госця:
«Патрысік!
Шлём табе мы салодкіх
Ірысак.

І дражэ,
І «падушак»-малышак,

Толькі з'елі мы
Некалькі «мішак».

З падарункам прымі,
Калі ласка,
Нашу светлую
Шчырую Ласку!

Не гаруй,
Мы цябе не забудзем
І пра татку
Раскажам мы людзям.

Будзем дружныя мы
Між сабою
І навек
Пасябруем з табою!..»

* * *

Вось вам, дзеці,
І ўся мая казка
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку.

Ласка ўсіх вас
Пабачыць жадала,
Але часу ў яе
Дужа мала.

А таму покуль стрэнецца
З вамі,
Будзьце, дзеці,
Ласкавыя самі!

1962

МАКСІМ ЛУЖАНІН

(нарадзіўся ў 1909 г.)

ВЯТРЫСКА

Напачатку жарабя
Было ростам з вераб'я,
Бегла, бегла пры абозе
Ды змарылася ў дарозе.

Перш трымалася пры матцы.
Потым стала аставацца,
А пасля набок сышло,
Пастаяла і лягло.

Заірзала звонка маці
Па прапаўшым жарабяці.

Ды хіба ў яе пыталі?
Не, вядома,
Паганялі.
Доўгі, доўгі быў абоз,
Аж на дзесяць нейкіх вёрст,—
Я не знаю, што ён вёз,—
Немцы блізка не пускалі.

Пачакаўшы, я з сябрамі
Жарабя прывёў дамоў
І гукнуў, зайшоўшы ў браму:
— Паглядзі, што я знайшоў!

Маці кажа:
— Адбяруць,

Ды яшчэ ў каршэнь дадуць.
Я кажу ёй:
— Я схаваю!
Я кажу ёй:
— Не аддам!
Я ў фашыстаў не спытаю,
Што рабіць — я знаю сам.

Конь слабы — адна загана,
А падправіцца — цішком
Пададзімся ў партызаны,
Прымуць:
Я — з сваім канём.

Цэлы месяц цёплым пойлам
Я каня свайго адпойваў,
Было клопату, але
Хутка ён павесялеў:

Як паставіць хвост трубою,
Як заржэ ды паляціць,
А махнеш яму рукою,—
Нібы ўкопаны стаіць.

Вось удаўся конь які:
Белазоры,
Беланогі,
Бег за мной ва ўсе дарогі.

Ад ракі і да ракі
Заўжды нас ішло чацвёра:
Я,
Мой конь і шчанюкі.
Пёс адзін мой зваўся Лыска,
А другі — за голас — Звон,
Я каня назваў Вятрыска,
А за тое, што спрыцён.

Стаў мой конь у сілу брацца,
Трэба недзе з ім хавацца,
Дзе — ладу не дабяру!

Як прыедуць немцы конна,
Мне на сэрцы неспакойна —
Прыйдуць зараз, забяруць.

Я хаваў яго ў таку,
За саломаю, ў кутку.

Так заўжды перадрыжыш,
За аброць яго трымаеш
І паціху размаўляеш:
— Стой, Вятрыска,
Вораг блізка,
Галубочак, не заржы.

Пачакай, калі сцямнее,
Нас тады не ўсцеражэш.—
Ён жа мову разумее,
Хоць і хоча, а не ржэ.

Тут пачаў я рыхтавацца,
Каб хутчэй у лес падацца,
Стаў харчы прыдабываць,
А мяне за руку —
Хваць!
Маці кажа:
— Ты куды?
Я адказваю:
— Туды...
Маці зноў:
— А як жа я?
Ты ж уся мая сям'я?
Бацька недзе на вайне,
А ты кідаеш мяне.

Я слязіны не ўраніў,
Але губу прыкусіў.
У зімовы адвячорак
Маці выйшла ў хмызнякі,
А за ёю нас чацвёра:
Я,
Мой конь і шчанюкі.
Лес я знаў, шляхі знайшоў,
Далажыў:
— Я к вам прыйшоў!
Паглядзеў на нас адзін,
А пасля як зарагоча:
— Будзе з хлопца камандзір,
Хоць і з мамай ходзіць ноччу.
Што ж, будуй сабе жытло,
Каб цяплейшае было.
Мы зіму празімавалі,
Каня ў сані запрагалі.
Праўду кажучы, хамут
Не да смаку быў яму,
А затое пад сядлом
Конь смаліў, як перуном.
З ім было мне ўсюды блізка,
Ратаваў мяне ў бядзе.
Партызанскі конь Вятрыска,
Куды скажаш, завязе.
Ды на гэтым коніку
Кожны быў бы коннікам.
Ваяваў атрад наш лоўка,
Толькі я не меў вінтоўкі,
Не давалі аўтамат,
Гаварылі:
«Малават».
Але часта у разведках
Мы былі з сваім канём,
Я адзначаны за гэта
Партызанскім медалём.

Так прыйшоў канец вайны,
Мы вярнуліся дахаты,
А з наступнае вясны
Прычакалі свайго тату.
Зноў яго у мірны час
Старшынёй абраў калгас.

Мы сябруем з ім лагодна,
З медалямі мы абодва,
Хоць па колькасці адзнак
Мне не ўгнацца аніяк.
А цяпер мой конь далёка,
Не пабачыш простым вокам,
Я аддаў яго байцам,
Маладым кавалерыстам:
— Партызанскі конь Вятрыска
Хай цяпер паслужыць вам.
Ну, перад дарожкаю
Тупні, сівы, ножкаю!
Мне байцы пісьмо прыслалі,
Аб сваім жыцці пісалі
І падзякавалі:
— Конь —
Самы жвавы, як агонь.
Я вучуся, я спакойны,
За каня я вельмі рад,
Бо на гэткім ехаць конна
Мог бы нават сам Будзённы
Хоць куды, хоць на парад.

1946

ВАЛЯНЦІН ЛУКША

(нарадзіўся ў 1937 г.)



КРЫНІЧКА

Блакітныя прасторы
Радзімы дарагой.
Крынічкі пераборы
У лесе
пад сасной.

Сплыло сутонне ночы...
Пагоднай раніцой
Я ціхай сцежкай крочу
Да песенькі тваёй.

Утульная палянка,
А там,
у гушчары,
Стаілася зямлянка
Яшчэ з тае пары...

На гэтую палянку
Прыходзілі тады
Героі-партызаны
Папіць
тваёй вады.

Набраць яе
ў біклагу,
Параненым падаць...
Як спаталяла смагу

Гаючая
вада!

А колькі ты,
крынічка,
Абмыла цяжкіх ран!
Была ты,
як сястрычка,
Для мужных партызан!

Блакітныя прасторы
Радзімы
дарагой.

Крынічкі пераборы
У лесе
пад сасной.

1977

ТЭЛЕФОН

— Нараджэння дзень — як свята! —
Мне з усмешкай кажа тата.
Падарыў мне сёння ён
Дзіва-цацку —
Тэ-ле-фон!

Ало!.. Ало!.. Ало!..
Здзіўлю я ўсё сяло.

Трубку смела я здымаю,
Сябра Віцьку выклікаю.
Даручэння не міне —
Верш хай вучыць за мяне.

Ало!.. Ало!.. Ало!..
Крычу на ўсё сяло.

Ганарыстай нашай Тані
Хітрае задам пытанне:
«— Дзе зімуюць камары?»
Хай гадае да зары.

Ало!.. Ало!.. Ало!..
Прыціхла ўсё сяло.

Татка вернецца дадому,
Раскажу яму, вядома,
Як я з цацкаю гуляў —
З дому ўсімі кіраваў.

Ало!.. Ало!.. Ало!..
А шчасце адплыло.

Зазірнуў у дзённік тата:
— Цацка ў «двойках» вінавата...

Хоць і сцюжа, і мароз,—
Цацку ў краму ён аднёс.

Ало!.. Ало!.. Ало!..
Спакойна спіць сяло.

1976

ПІЯНЕРСКІ ЗБОР

Па-над стромай лес бухматы
Голле ўскрыльвае да зор.
Каля вогнішча — рабяты,—
Піянерскі збор!

Вечаровае сутонне
Абуджае дружны хор.

Песня ў чыстым небе тоне —
Піянерскі збор!

Мы бацькоў памножым славу,
Хай звініць агністы горн.
Наша слова — наша справа,—
Піянерскі збор!

Па-над стромай лес бухматы
Голле ўскрыльвае да зор.
Весялей спяём, рабяты,—
Піянерскі збор!

1979

УЛАДЗІМІР ЛЯЎДАНСКІ

(1911—1973)

ДЗЯДУЛЕВА ТАЙНА

Па даўно не езджанай дарозе, што пятляе па-над прыпяцкім борам, крочылі два чалавекі — стары Хведар Чаўнок і яго самы малодшы ўнук Петрык. Стары нёс на плячах звязаныя ў пук вудзільны, а малы — адмысловы ракітавы кошык з вечкам, у якім былі дзве бляшанкі з чарвякамі, параны гарох, рагулькі, лёскі, адным словам, уся неабходная рыбацкая драбяза.

Наблізіўшыся да лугавіны, якая доўгім языком уразалася ў лес і падзяляла яго на дзве няроўныя часткі, пешаходы перайшлі яе па намошчаных жэрдках і хутка апынуліся на высокім грудку ў сасонніку. Стары зняў сваю вылінялую ад часу вушанку, з якою і летам не расставаўся, выцер ёю рэдзенькія сметанковыя валасы, павярнуўся да Петрыка і запытаў:

— Можа, перадыхнём крыху?

Петрык моўчкі кіўнуў галавою. Стары прысланіў да сасны вудзільны і памаленьку апусціўся на замшэлы пень.

Навокал панавала ўрачыстая цішыня. Толькі сасновы бор злёгку шумеў верхавінамі, шаптаў аб нечым. Петрык стаяў, удыхаў хвойнае паветра і любаваўся стромкімі дрэвамі, якія ледзь прыкметна кланяліся адно другому. Стары глядзеў не міргаючы ўдалячынь, потым кашлянуў і засмяяўся.

— Чаго вы смеяцеся, дзядуля? — пацікавіўся Петрык.

— А нічога,— адказаў стары і зручней прыладзіўся на пяньку.— Успомніў даўнейшае смешнае здарэнне на гэтым грудку.

— Якое?! — загарэўся Петрык і прысеў каля дзеда.

— Бач ты, які цікаўны,— хітравата зірнуў на яго стары.— Гэта, дзяціна, мая тайна. Пра яе яшчэ ніводная жывая душа не дазналася... Так што і табе не варта, мусіць, ведаць...

Петрык нахмурыўся, памаўчаў, а потым недаверліва паглядзеў дзеду ў вочы і запытаўся:

— Здагадваюся, нешта благое?

— Не, не благое, а смешнае,— адказаў стары.

— Ну дык чаму ж тады тайна, калі не благое? — здзівіўся Петрык.

— Таму што і неблагое бывае часамі такім, што людзям не раскажаш — засмяюць.

Петрык са здзіўленнем глядзеў на дзеда. А стары прыжмурыўся, зірнуў на сонца і заспяшаўся:

— Пайшлі, браце, хутчэй, а то акуні без нас занудзіліся. Да кручы ж яшчэ добрая гадзіна хады.

У Петрыка не выходзіла з галавы дзедава тайна і праз усю дарогу, і на беразе ракі.

Толькі надвячоркам, калі пачала добра брацца рыба, а ў дзеда шчупак рагульку сарваў, якую яны так і не знайшлі, Петрык на некаторы час забыўся пра тайну. Але як толькі расклалі агонь, ён зноў пачаў прыставаць:

— Дзядуля, раскажыце пра тайну, што здарылася на грудку.

— Ну і смала ж ты,— пакруціў галавой стары.— Я ж сказаў, што і табе не варта ведаць.

— Чаму?

— Смяяцца будзеш.

— Значыцца, вы мне не верыце,— пакрыўдзіўся Петрык, адышоўся ад дзеда, сеў і ашчарэпіў рукамі калені.

І дзед, і ўнук маўчалі некаторы час. А калі павячэралі, стары ўстаў, падкінуў у агонь ламачча, выпрабавальна паглядзеў на панурага Петрыка і запытаўся:

— Ну дык што, вельмі хочацца даведацца аб здарэнні на грудку?

Петрык маўчаў.

— А нікому не раскажаш? — зноў запытаўся стары.

На гэты раз Петрык так паглядзеў на дзеда, што нельга было не паверыць яго шчырасці.

— Ну дык слухай жа: на гэтым грудку я некалі карову з рук выпусціў.

— Вырвалася, значыцца?! — спачувальна ўздыхнуў Петрык.

— Ды не, сам выпусціў.

Петрык з неразуменнем пазіраў на дзеда. А стары пераламаў сухі сук, падкінуў у агонь і працягваў:

— І было гэта, дзяціна, даўно... Табе колькі цяпер гадоў?..

— Дванаццаць!

— Ну вось, а мне тады было шаснаццаць... У бацькі нас дзевяцера, я самы старэйшы...

— І вы, мусіць, кароў пасвілі? — перабіў Петрык.

— Пачакай, пачакай, не спяшайся... Ну дык слухай: дзе цяпер наша галоўная сядзіба калгасная — даўней фальварак панскі быў. Паны, праўда, у ім не жылі ўвесь час, а толькі прыязджалі калі-нікалі... Вось аднаго разу ўлетку і прыехала пані са сваімі сынамі. Старэйшы паніч, якога звалі Ромусь, быў ужо ў вайсковым

чыне і вельмі любіў паляванне. А тут яму аканом і далажыў, што ў Задуброўі некалькі разоў запар бачылі казулю. Той і загарэўся застрэліць яе.

На другі дзень паклікаў леснікоў, узяў з сабою аканома, і падаліся яны ўсім кагалам у Задуброўе, дзе казуля амаль кожную раніцу выходзіла на канюшыну. Расставіў аканом леснікоў, паніча, вядома, на самым адказным месцы паставіў і запусціў ганчакоў. Сабакі паднялі казулю і пачалі ганяць. А праз некаторы час выгналі на паніча... Бабахнуў паніч па казулі перш з аднаго, потым з другога ствала, а тая пырснула ўбок і пабегла цалюсенькай у лес. Сабакі зноў уляглі за ёю, але неўзабаве згубілі і вярнуліся да паляўнічых. Адным словам, першы дзень скончыўся для паніча няўдачай...

Назаўтра ўся хеўра зноў выехала на казулю. І зноў яна выскачыла на паніча. Аднак і на гэты раз паніч прамахнуўся. А страляў жа ён на такую блізкую адлегласць, што не вытрымаў і са злосці пабіў стрэльбу аб пень. А ўвечары сабраў дваровых і аб'явіў: хто застрэліць казулю, таму на выбар стрэльбу аддасць, а калі хто часамі жывую даставіць — самую лепшую карову атрымае... Ну, а характар паніча людзі добра ведалі: ужо калі ён сказаў што-небудзь, ці то благое, ці добрае,— абавязкова выканае.

Так што назаўтра ж усе мужыкі і кінуліся ў лес — хто са стрэльбай, а хто і так, з пустымі рукамі. Каму ж не хацелася атрымаць новенькую панскую стрэльбу!.. На карову, праўда, ніхто не спадзяваўся, бо нікому і ў галаву не прыходзіла злавіць жывую казулю. Дый паны аб гэтым таксама добра ведалі. А ляпнуў жа паніч проста так — можа, дзеля форсу, а можа, і каб з дурных людзей пасмяяцца.

Ну дык вось, хадзілі людзі дзень, хадзілі другі, трэці, а казулі ніхто і ў вочы не ўбачыў. Як скрозь зямлю правалілася. А праз тыдзень ужо і надзею страцілі, і шукаць перасталі. Рашылі, што яна сышла недзе далёка. Толькі ўсе цмакалі, што не ўдалося стрэльбу ў пана ўзяць...

Стары на хвіліну змоўк і пачаў папраўляць агонь.

— А пры чым жа тут вы? — не ўцярпеў Петрык.

— Пачакай, пачакай, браце, са мной яшчэ будзе,— адказаў стары і, зручней усеўшыся пад кусцікам, працягваў далей: — Калі прайшло тыдні са два і гарачка ўжо ўляглася, я рашыў схадзіць у казёншчыну і надраць лазы на лапці. Перабраўся цераз раку па кладцы, мінуў панскі сенакос і падаўся ў казённы лес...

Прайшоў вялікі бор, а потым павярнуў на Рапы, дзе былі непралазныя дзялянкі лазы і вязу... Прабіраюся сабе гушчаром, на малінавыя кусты напароўся, ягад паеў і далей пайшоў. На пагорку два цецерукі з-пад самых ног вылецелі, каршуна ўзагнаў, які на пні сойку трыбушыў, потым пастаяў ля здаравеннага вужа і панаглядаў, як ён жабу заглытваў, і падаўся далей...

Раптам у лагчынцы за кустом нешта мільганула. Зірк я, ажно казуля стаіць і пазірае на мяне. Дыханне ў мяне так адразу і заняло ад нечаканасці... Паглядзелі мы нейкі момант спакойна адзін на аднаго, а потым казуля давай тузацца. Бачу, задняя нага ў яе ўшчамілася. Вось тут я кінуўся вопрамеццю да казулі. Схапіў яе за шыю, паваліў і накінуўся ўсім целам. Казуля тузаецца, грабе пярэднімі нагамі, галавой б'ецца аб зямлю, а я трымаю, і ў вачах маіх ужо мільгаюць і новенькая стрэльба, і карова...

Неўзабаве казуля прымірылася, відаць, са

сваім лёсам і супакоілася. Тады я паціхеньку выцягнуў пояс са штаноў, звязаў ім пярэднія ногі, а потым вызваліў з-пад кораня заднюю і заднія прыкруціў да пярэдніх, узваліў казулю на плечы і гайда дадому...

Ад радасці я і ног пад сабой не чуў, а казуля мне здавалася лёгкай, як пярынка, і ламачча нават знікла пад нагамі. Адным словам, я не ішоў, а нейкая неймаверная сіла мяне несла. А ў думках блытаніна страшэнная: што ж лепей узяць за казулю — карову ці стрэльбу?.. Мне тады вельмі ж хацелася панскую дубальтоўку атрымаць і стаць сапраўдным паляўнічым. Але ж як гэта зрабіць? За жывую ж казулю паніч карову абяцаў! І бацька ж ні ў якім разе не згодзіцца на стрэльбу...

І вось тут у мяне прамільгнула думка: а што, калі забіць казулю і нежывую прынесці?! Тады стрэльба забяспечана!..

Узрадаваны сваёй здагадкай, я выйшаў на гэты грудок, паклаў казулю на зямлю, а сам выцер пот, які заліваў мне вочы, сеў і мяркую: чым жа яе лепш прыкончыць — нажом ці палкай? Сяджу, выціраюся кашуляй і пазіраю на сваю ахвяру. Казуля таксама глядзіць на мяне сваімі неміргаючымі, крыху ашклянелымі вачыма. Не помню, колькі прайшло часу ў такім роздуме, як раптам казуля ўзмахнула рэзка галавою, застрыгла вушамі і так страпянулася, што аж застагнала. У гэты ж момант з-за елачак выскачыла казлянё і стала як укопанае. Казуля яшчэ раз тузанулася, потым супакоілася і павярнула ў мой бок галаву. І тут я ўбачыў, як у яе з вачэй сыплюцца слёзы...

Стары на хвіліну прыціх, потым сцішка працягваў:

— Вось тут, дзяціна, і адбылося са мною самае

смешнае. Нешта так моцна здушыла мне горла, што я некаторы момант і дыхнуць не мог. А калі казуля яшчэ раз паглядзела на мяне сваім сумным, безнадзейным позіркам, я ўжо не вытрымаў: усхапіўся, падбег да яе і пачаў развязваць ногі. А яна, небарака, мусіць, зразумела, што я раблю, і два разы цёплым шурпатым язычком лізнула маю руку...

І на душы ў мяне раптам стала лёгка-лёгка. Я нават пра панскае абяцанне забыўся на нейкі час. А калі, вяртаючыся дадому, успомніў, то і рашыў нікому аб гэтым не расказваць. Бо гэта ж вельмі смешна, праўда?

— Што вы, дзядуля, ніколечкі! — са шчырасцю прамовіў Петрык.

— А каб з табой такое здарылася, ты пусціў бы казулю? — раптам запытаўся дзядуля.

— Абавязкова! — падхапіўся Петрык.— Хіба ж можна інакш?!

Стары доўгім ласкавым позіркам паглядзеў на ўнука, потым паклаў галаву на памошчаны аер, паляжаў трохі і заснуў. А Петрык яшчэ не скора лёг. Ён усё слухаў ціхае шаптанне бору, спевы салаўя за ракою, углядаўся ў твар дзядулі і думаў: «Не, гэта зусім не смешна. Толькі дзіўна, чаму ён дагэтуль нікому не расказаў?..»

1969

ПЯТРУСЬ МАКАЛЬ

(нарадзіўся ў 1932 г.)

ГОЛАС ВЕЧНАГА ХЛОПЧЫКА

Я — з грознай былі,
Я — з гнеўнай песні.
Я — хлопчык вечны,
Я — ваш равеснік.
Мяне таксама
Бацькі любілі,
Але чужынцы
Мяне забілі.
Ляцелі ў дыме,
Ляцелі ў гуле
Наперагонкі
Са мною кулі.
Хоць бег я хутка —
Аж дых займала,
Усё-ткі куля
Мяне дагнала...
Вам пакідаю
І ўзлёт, і песні
Я, вечны хлопчык,
Я, ваш равеснік.

1979

КАЛЯ МАЙГО АКНА

Каля майго акна
вайна
не моўкне
зранку дацямна.

Тут — шум, і крык,
і гул пагонь,
і галасы:
— Агонь!
— Агонь!

— Бабах! —
гармата
з-за куста,
трэск аўтамата:
— Тра-та-та!

Асколкаў шоргат.
Посвіст куль.
Пагроза — хмараю...
Адкуль?

Каля майго акна
штодня
гудзе
дзіцячая гульня.

Свае вышыні
у цішы
гуртом штурмуюць
малышы.

На плот,
на лінію дратоў
з іх кожны кінуцца
гатоў.

Гатоў грудзьмі
агонь закрыць —
бацькоўскі подзвіг
паўтарыць.

Каля майго акна
вайна
грыміць ад ранку дацямна.
Трашчыць
нямоўчна
кулямёт...
А Перамозе —
столькі год.

1979

КАЛЯРОВЫЯ АЛОЎКІ

У каробцы спяць алоўкі —
Каляровыя галоўкі.
І буджу я на зары:
— Прачынайцеся, сябры!
Нас чакае спраў бясконца...
Жоўты глянуў у акно:
— Намалюю зараз сонца,
Каб свяціла ўсім яно!
Слова ўзяў аловак белы:
— Я вясной не дужа смелы,
А зімой усю зямлю
Снежнай коўдрай засцялю...
— Апрану,— сказаў зялёны,—
Ліпы, яблыні і клёны,
Іх на свой улік прымай,
Паважаны месяц май!
— Ну, а што,— гукнуў чырвоны,—
На парад нясуць калоны?

Чыркану я — і ў прасцяг
Паляціць крылаты сцяг.
...Так прачнуліся алоўкі —
Каляровыя галоўкі.
І запелі на зары
Працавітыя сябры:
— Мы самой вясёлкі дзеці,
Сем алоўкаў — сем братоў.
Маляваць усё на свеце
Кожны з нас заўжды гатоў!

1979

МІКОЛА МАЛЯЎКА

(нарадзіўся ў 1941 г.)

АТЭЛЬЕ «ПРАМЕНЬ»

Пяць гадоў вучыўся ў цырку
На краўца Мядзведзь.
Спаў з машынай упрыцірку,
Каб дыплом займець.
І адкрыў нарэшце ўдала
Ў лесе атэлье:
Пад ялінай, як пад дахам,
Цёпла, дождж не лье.
На галлі вісяць тканіны,
Стол — шырокі пень.
Строчыць швейная машына
Ў атэлье «Прамень».
І пры месяцы, бывае,
Не засне кравец:
Спец адзіны,
Абшывае
Лес з канца ў канец.

У чарзе парадак строгі.
Да чаргі глухі,
Лось — разгалістыя рогі —
Лезе без чаргі,
Лезе са слязамі,
Лезе ледзь жывы —
Абляпіла заедзь
З ног да галавы.
Стогне Лось каля машыны:

— Я трываю ледзь!
Плашч-накідку з мешкавіны
Мне пашый, Мядзведзь.
Бачыш сам, гарачым роем
Заедзь смокча кроў.
Рогі грозныя —
Не зброя
Супраць камароў.

Прыцягнуўся Воўк з кульбакай
У трусах адных,
Вые: — Леснікоў сабака
Мне спусціў штаны!
Голы, як у лазні,
Галадаю зноў:
Сорамна вылазіць
З лесу без штаноў.
Дык пашый другія, дружа,
Не завузь, аднак:
Цяжка будзе ў модных дужа
Бегаць ад сабак.

Выхадная, не палюе
На курэй Ліса.
Тут, у атэлье, хвалюецца:
Дзе яе краса?
Быццам з перламутру,
Ззяюць зубкі ўсе.
Не да твару футра
Толькі ёй, Лісе:
Выцерлася ў лесе.
Страх, як мох, расце —
Хутка поўсць аблезе
Нават на хвасце.

І стаіць на задніх лапах
З просьбаю цяпер:
— Футра мне пашый, Патапыч!

Выкрай на каўнер,
Выкрай хвост абавязкова,
Каб не знаць бяды:
Будзе чым ля хат вясковых
Замятаць сляды.

Прыкусіў ад страху, мабыць,
Тонкі язычок,
Заікаецца без мамы
Заяц-шарачок:
— П-покуль з морквай дзялак
Не заслаў с-сняжок,
Мне п-пашыйце, дзядзя,
Белы к-кажушок,
Ш-шапку-невідзімку —
Каб б-было лягчэй
Р-ратавацца ўзімку
Ад л-ліхіх вачэй.
С-сам у белым,
В-вецер белы,
Белая з-зямля.
П-перастану, можа, бедны,
З-заікацца я.

Прыкаціўся і калючы
Вожык-калабок.
Ён на днях сарваўся з кручы,
Без калючак бок.
Жаліцца Мядзведзю:
— Выручце хутчэй —
Камізэлька з'едзе,
Бачыце, з плячэй.
Я баюся вос пякучых
І змяіных джал.
Спадзяюся, ў вас калючы
Ёсць матэрыял.
Ён цяпер у модзе,

Дайце паглядзець.
— Не завёз,— разводзіць
Лапамі Мядзведзь.—
Маю замшу, драп дабротны,
Ёсць сукно, паркаль.
А калючага, як дроту,
Не завёз, на жаль.
Буду мець на ўвазе,
Памагу: на базе,
У хваінах, у ялінах,
Ёсць матэрыял —
Ад асіных,
Ад чмяліных
І змяіных джал...

Ходзіць слава пра Мядзведзя.
Бедны, аж зароў:
Паспявае майстра ледзьве
Абшываць звяроў.
І пыляць лясныя сцежкі,
Сцежкі мурашоў.
Нават з пушчы Белавежскай
Зубр пяшком прыйшоў.
Ад заказчыкаў адбою
Не было, няма.
Добра, што з вятроў гурбою
Едзе ў лес зіма.
Дзеркачом падмёў абрэзкі,
Склаў начынне ў клець
І ў бярлогу лёг нарэшце
Адпачыць Мядзведзь.
А на пні аб'яву крыва
Выразаў за дзень:
«Да вясны закрыта
Атэлье «Прамень».

1981

ПАВЕЛ МАРЦІНОВІЧ

(нарадзіўся ў 1954 г.)

ПІЛА

З братам Янкам
Да сняданку
Мы пілуем дровы
Ўранку.
Хоць не ела,
Не піла —
Весела пяе
Піла.

Ну, а што ж яна
Пяе?
Лепш паслухаем
Яе:
— Хто пілуе
Др-ровы,
Будзе той
Здар-ровы.

Гэта спр-рава,
Бр-ратка,—
Добр-рая
Зар-радка.

1978

ТАНЦЫ

Дзень быў золкі,
Дзень быў хмуры.
Церушыўся дождж
Пануры.

Гэткім днём
Уцехі мала!
Нават... рыбам
Сумна стала.

— Патанцуем,—
Кажуць плоткі,—
Весялей нам будзе
Ўсё-ткі!

Вось дзівосы!
Вось прыгоды!
Плоткі водзяць
Карагоды!

З краснапёркай
Акунёк
Стаў кружыць
Непадалёк.

З верхаводкай
Скача язь,
Прыпявае:
«Касіў Ясь...»

Толькі нешта
Вусачы
Не танцоры —
Гледачы.

Прасіпелі
Вусачы:
— Калі хочаш —
С-сам с-скачы.

Вось прыкмеціць
Рыбачок,
Дык пас-скачаш
«Крыжачок»!

Прыпаўзлі на танцы
Ракі,
Захацелі,
Небаракі,
Станцаваць...
Ну, хоць бы
Польку.
Слаба ў іх выходзіць
Толькі!

Ёрш убачыў:
— Смех, дый годзе!
Вам таўчыся, ракі,
Годзе!
Гэткія
Няўмекі
Баламуцяць
Рэкі.

Раззлаваўся дужа
Лешч:
— Хто танцуе горш,
Хто лепш,
Хто танцуе лепш,
Хто горш,
Не перашкаджай нам,
Ёрш-ш!

Лепш схавайся
Ля карча,
Каб не ўпёк табе
Ляш-шча!

А вялізарны
Шчупак
Танцаваць пачаў
Гапак.

Толькі рыбы —
Убаку,
Бо не вераць
Шчупаку:

— Ты на хітрыкі
Мастак,
Знаем твой
Гапак-хапак.

Доўга рыбы танцавалі,
Аж ляцелі ў скокі хвалі!

1978

ЯНКА МАЎР

(1883—1971)



ВАСЬКА ЖУКАЎ

Васька Жукаў, чатырнаццацігадовы хлопчык, аддадзены тры месяцы назад у рамеснае абутковае вучылішча, вярнуўшыся з работы, сеў у куток і пачаў пісаць:

«Мілы дзядуля Іван Сцяпанавіч! — пісаў ён.— І пішу табе пісьмо. Вітаю цябе з надыходзячым святам Кастрычніка і жадаю табе ўсяго добрага. Няма ў мяне ні таткі, ні мамкі, толькі ты ў мяне адзін застаўся».

Васька зірнуў у акно, дзе калыхалася дрэва з рэшткамі пажоўклых лісцяў, і ўявіў, як жывога, свайго дзеда Івана Сцяпанавіча. Высокі, з шырокімі плячамі і вялікай белай барадой, ён, здаецца, ніколі не злаваў, не крычаў, а толькі жартаваў. Ён быў калгасным вартаўніком, і ўсе ставіліся да яго з павагай як да гаспадара. Удзень ён спаў ці поркаўся каля сваёй хаты, а ноччу хадзіў на «сваіх уладаннях» ад «элеватара», як ён называў свіран са збожжам, да «універмага» — сельскай крамы. Калі пачуе якую трывогу ў кароўніку, дык пабудзіць цётку Палагу. Часам зойдзе на агеньчык у праўленне, дзе зацягнулася на ноч пасяджэнне, і прыме ўдзел у абмеркаванні калгасных спраў.

Васька ўздыхнуў, памачыў пяро і стаў пісаць далей:

«А ўчора ў нас была самадзейнасць. Я на сцэне

танцаваў «Крыжачок». Але я хачу перайсці ў аркестр. Нашы хлопцы вельмі добра іграюць на розных інструментах. Мне хочацца навучыцца іграць на баяне. А ёсць такія, што добра малююць, і ім даюць паперу і фарбы. І яшчэ хочацца мне ўдзельнічаць у тэатральным гуртку. Учора ў нас ставілі п'есу. Мілы дзядуля, прыязджай. Я не ведаю, што мне рабіць,— хочацца і туды, і туды.

Сплю я ў спальні, і ў мяне ёсць асобны чысты ложак. Даюць мне і чай, і катлеты, і манную кашу. Хаджу я ў сіняй форме, штаны навыпуск, а на спражцы літары — «РУ». Адзін дзень мы вучымся ў класах, а другі — у майстэрні. На другі год мы будзем працаваць на фабрыцы. А наш майстар мяне хваліць, кажа, што добра працую. Раней, у школе, у мяне не было вялікай ахвоты вучыцца, а цяпер у класе атрымліваю толькі чацвёркі і пяцёркі».

Васька спыніўся, задумаўся, а потым зноў стаў пісаць:

«А Мінск — горад вялікі, ды толькі зруйнаваны. Гэта фашысты яго так знішчылі. Але ўсюды ідзе будоўля. Дамы будуюцца вялікія, прыгожыя. Я часта бачу на будоўлях такіх самых хлапцоў, як я. Яны і цэглу кладуць, і атынкоўку робяць, і майструюць, як дарослыя. Ад іхняй работы ёсць вялікі знак. Але і мая праца мне таксама падабаецца, асабліва на машынах. А хлопцы з мяне смяюцца, што я хачу вывучыць усе навукі і ўсе майстэрствы. А чым жа я вінаваты, што ўсё так цікава?»

Васька пакрывіў рот і пацёр кулаком вочы.

«Прыязджай, мілы дзядуля, паглядзі сам і скажы, што мне рабіць. А яшчэ фізкультурнікам вельмі весела: яны выступаюць на спаборніцтвах і парадах. А каб ты ведаў, якая цікавая гульня — шахматы! Адзін з нашых хлопцаў, Сёма Шугай,

абыграў студэнта універсітэта, і яго ўсе хвалілі. Заўсёды ў нас весела і цікава, але часу не хапае на ўсё... Прыязджай паглядзець на наша жыццё і скажы, што мне рабіць. Застаюся твой унук Васіль Жукаў».

Васька палажыў ліст у канверт і напісаў адрас: «БССР, Бабруйская вобласць, Асіповіцкі раён, калгас «Перамога», Івану Сцяпанавічу Жукаву».

Ноччу яму снілася, як дзед у акулярах сядзіць за сталом, чытае яго пісьмо і весела смяецца. Каля яго сядзіць сабачка Уюн і круціць хвастом.

Праз некаторы час Васька атрымаў ліст: Старэчай дзедавай рукой было накрэмзана:

«Дарагі ўнучак Васілёк! Твой ліст я атрымаў і прачытаў з вялікай ахвотай. І смешна, і радасна мне зрабілася, як ты там пакутуеш. Трымайся, браток, цярпі, пакуль я прыеду. А прыеду я да цябе на Новы год, як той дзед-мароз. А што табе рабіць,я і цяпер магу сказаць — трымайся свайго рамяства. З ім ты можаш ісці куды хочаш, і ўсюды табе будзе месца і павага. З ім ты можаш скакаць і спяваць колькі ўлезе. З ім ты можаш вучыцца і далей, хоць на прафесара. А што ты цяпер лепей вучышся, як у школе, то я разумею так: чалавеку патрэбна перамена — і рукамі папрацаваць, і галавой. А хто думае працаваць толькі адной галавой, то з яго выйдзе, як з таго Петрыка Сухаверхага: рамяству вучыцца не захацеў, а на вучонага здольнасцей не хапіла; круціўся-круціўся, а цяпер квіткі піша і думае, што ён вялікі пан.

Чытаючы твой ліст, я ўспомніў, як калісьці сам пісаў свайму дзеду Канстанціну Макарычу. Пазней я даведаўся, што мой ліст перахапіў адзін пісьменнік, Чэхаў называецца, і надрукаваў у

газеце. Шкада, што ён памёр, а то я паказаў бы яму і твой ліст: глядзі, як піша мой унучак, калі хочаш, можаш таксама надрукаваць. Твой дзед Іван Сцяпанавіч Жукаў».

1947

ШЧАСЦЕ

Быў адзін з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі на Беларусі. Сонца пячэ як мага, а гарачыні няма: лішак яе паглынаюць і рака, і зараснікі аеру ды чароту, і густыя паплавы, і непралазны алешнік ды лазняк, і бярозы, і хвоі, і ўсялякая зеляніна, што жыве навакол, дыхае, шамаціць і запаўняе не толькі прыроду, але і душу чалавека. Не відаць людзей, не чуваць, але гоману досыць і без іх: адны конікі сваім цырыканнем могуць заглушыць усіх людзей, а тут яшчэ кукуюць жаўтабрухія лягушкі, заліваюцца мітуслівыя птушкі ды гудуць мясістыя чмялі.

Усім радасна ў такі дзень. Радасна і мне. Радасна і вунь таму хлапчуку год васьмі, што спускаецца з гары, падскакваючы на адной назе ды махаючы белым дубцом.

Мы сустракаемся з ім на мосце. Ён прыпыняецца і глядзіць на мяне так, нібы хоча нешта сказаць. Радасць, шчасце так і пырскаюць з яго блакітных вачэй. Я разумею яго. Калі і я гатоў усіх абняць у гэты жыватворны дзень, дык што ж павінна адбывацца ў яго маленькім чыстым сэрцы? Я лагодна ўсміхаюся яму, ківаю галавой і кажу:

— Добра жыць на свеце, браток, га?

Тварык хлопчыка засвяціўся яшчэ больш, але ён нічога не сказаў. Ды і што ён мог сказаць? Мы і без слоў разумелі адзін аднаго.

Я паціху ішоў міма, а хлопчык, нібы той сланечнік, паварочваў следам за мной свой круглы тварык. І з вачэй яго таксама пырскала шчасце, і таксама здавалася, што ён вось-вось нешта скажа. Скажа, што надта прыемна ў такі дзень басанож скакаць на мосце ды махаць свежым дубцом, што ў грудзях яго цяпер вельмі цесна і адтуль нешта выпірае, што ўвесь свет вельмі прыгожы і добры, ды і наогул усе дзядзькі і цёткі прыгожыя і добрыя... Ён нічога не казаў толькі таму, што не ўмеў выказаць такіх думак і пачуццяў. Ды яно і не трэба было — я і так усё разумеў. Хіба я сам калісьці не быў такім, як ён? Хіба я сам не адчуваў радасці жыцця? Асабліва ў такі цудоўны дзень.

Я яго разумеў. Але ён, відаць, гэтага не ведаў, бо ўсё глядзеў мне ў вочы, нібы чагосьці чакаючы ад мяне. Ён заліваў мяне сваім шчасцем, а я ў адказ нічога не мог яму даць. Для яго маёй шчырай і ветлівай усмешкі было мала. Мне трэба яму нешта сказаць. Але што? Што яму сказаць, каб перадаць усю тую цеплыню, якую я да яго адчуваю? А мне засталося ступіць толькі адзін крок — і мы размінёмся. Размінёмся, можа, навекі.

— Як цябе зваць? — сказаў я нарэшце, каб толькі не маўчаць.

Сказаў — і зараз жа пачырванеў ад сораму: хлопчык нічога мне не адказаў. Сваім дзіцячым інстынктам ён, відаць, зразумеў, што словы гэтыя сказаны так сабе, абы сказаць. Мала таго: твар яго перастаў свяціцца, нават неяк балюча скрывіўся. А потым... потым з грудзей яго вырваўся крык!..

Не адзін год прайшоў з таго часу, а голас хлопчыка і цяпер гучыць у маіх вушах. Гэта быў шчыры, мімавольны крык дзіцячай душы. У ім

былі і крыўда, і расчараванне, і надзея, і горкі папрок да нас, дарослых і разумных людзей.

Два словы толькі было ў гэтым крыку:

— Дзядзя!.. Шапка!..

Але гэтага было досыць, каб зразумець, хоць і са спазненнем, усю тую трагедыю, якая адбылася тут, на мосце, у гэты радасны летні дзень.

У хлопчыка на галаве была новая шапка, якую ён надзеў, відаць, першы раз. Добрая шапка, шэрая, каляная. Яна ахапіла не толькі галаву хлопчыка, але ўсё цела і душу. Гэта ж праз яе сёння такі цудоўны дзень, а я гэтага не ведаў. І сонца так шчодра свеціць толькі дзеля таго, каб усе здалёк маглі бачыць шапку, а я не заўважыў яе і зблізку. Адзін, усяго толькі адзін крок заставалася зрабіць — і ўся сустрэча пайшла б прахам. Ці магла чулая дзіцячая душа сцярпець такую несправядлівасць, такое халоднае бяздушша?

І яна не сцярпела... Я адчуў сябе вельмі вінаватым і кінуўся выпраўляць сваю віну.

— Ах, якая цудоўная ў цябе шапка! — крыкнуў я.— Пакажы, пакажы!

Вочы хлопчыка зноў засвяціліся радасцю.

Я зняў з яго галавы шапку. Яна сапраўды хрусцела, як бляшаная.

Хлопчык глядзеў на мяне ўдзячнымі вачыма, як на свайго збаўцу.

— Які казырок! І шнурок! І гузікі два! — стараўся я.— А падкладка якая цудоўная! Хто купіў?

— Мамка! — з гордасцю адказаў хлопчык.

Несправядлівасць была выпраўлена.

І мы абодва, зноў шчаслівыя, разышліся кожны сваім шляхам.

1947

АЛЕСЬ МАХНАЧ

(нарадзіўся ў 1922 г.)

ЮНЫЯ АБАРОНЦЫ

Непрытомнага байца асцярожна знялі з насілак і паклалі на цагляную падлогу.

— Яго моцна кантузіла... Выбухам...— пакідаючы лазарэт, сказаў Пеця Васільеў.

У пагранічнай крэпасці над Бугам трэці дзень лютавала вайна. Усе, хто мог трымаць у руках зброю, былі там, наверсе, дзе несціхана грымеў бой.

У падвальным лазарэце было цесна. Не хапала матрацаў, шынялёў, і параненых клалі на голую падлогу.

Палоска святла, што скупа прабівалася ў лазарэтнае акенца-байніцу, пацямнела ад дыму. Каб не хадзіць вобмацкам, піянеркі Валя Зенкіна і Нюра Кіжаватава запалілі самаробную газоўку — з гільзы артылерыйскага снарада.

— Загадваю! Не дазваляць цяжкараненым займаць абарону! — прагучаў з цёмнага праёма дзвярэй голас лейтэнанта Андрэя Кіжаватава. Да вайны лейтэнант быў начальнікам пагранічнай заставы, а цяпер разам з іншымі камандзірамі кіраваў абаронай аднаго з участкаў Брэсцкай крэпасці.

Нюра здагадалася: бацька прыходзіў, каб сказаць, што ён жывы і здаровы. І, вядома, глянуць на яе, дачку: як яна тут, у гэтым пекле?

Тым часам Валя Зенкіна ўзяла газоўку, падышла да байца, якога прынеслі Пеця Васільеў і яго сябры — юныя санітары.

— Пагранічнік...

Гэта слова балюча, як стрэмка, кальнула Нюру. Яна кінулася да кантужанага байца, глянула ў твар і пазнала пасыльнага, які часта прыбягаў да яе бацькі.

— Бабронак!.. З нашай заставы...

Дзяўчынкі прыўзнялі пагранічніка, далі яму вады. Баец застагнаў, расплюшчыў вочы, затрымаў здзіўлены позірк на Нюры.

— Вы ў лазарэце,— сказала Нюра.— Вас не параніла, толькі кантузіла...

Пагранічнік заварушыўся, пачаў абмацваць рукамі падлогу вакол сябе. Дзяўчынкі адразу здагадаліся, што яго так непакоіць.

— Ваша вінтоўка тут, не трывожцеся,— загаварыла Валя.— Вось яна... Толькі вам нельга ўставаць, ляжыце...

Баец, здавалася, не чуў, што кажуць дзяўчынкі. Ён усё яшчэ не мог здаўмецца, як трапіў сюды, у гэты цёмны падвал. Дзе яго баявыя таварышы? Ён з цяжкасцю падняўся і, абапіраючыся на вінтоўку, ступіў крок-другі да вузкай палоскі святла ў сцяне. І пахіснуўся. Вось-вось упадзе, зноў страціць прытомнасць. Валя падтрымала яго, давяла да акенца-байніцы.

Бой працягваўся. Спакойна, каб не прамахнуцца, баец пачаў страляць па фашыстах, якія наступалі ад Цярэспальскай брамы. Яму цяжка было трымацца на нагах, і, каб не асунуцца на падлогу, ён яшчэ болей падаўся наперад, высунуўся з акенца. Непадалёку ўпала міна, і моцным выбухам адкінула байца назад, у падвал.

Дзяўчынкі схіліліся над пагранічнікам, які ляжаў, нібы мёртвы. Пульс ледзь праслухоўваў-

ся. Сэрца білася з перабоямі. Каб не трывожыць двойчы кантужанага байца, сяброўкі не сталі пераносіць яго на ранейшае месца, у глыб падвала. Знайшлі шынель, згарнулі, паклалі пад галаву.

Валя была ў роспачы. Выходзіць, яна парушыла загад камандзіра: памагла цяжка кантужанаму пагранічніку дабрацца да акенца-байніцы. Ён сам не змог бы дайсці, заняць абарону. Ці выжыве ён цяпер?

Нюра Кіжаватава моўчкі абняла сяброўку: словы дакору тут былі лішнія. Яна і сама парушала суровы загад камандзіраў: «Дзецям сядзець у падвалах!»

1980

НІНА МАЦЯШ

(нарадзілася ў 1943 г.)

НА ЎРОКУ ГЕАГРАФІІ

Што тлумачыць там настаўнік
Пра хрыбты далёкіх гор,—
Лісы белымі хвастамі
Падмятаюць школьны двор!..

Знізу ўверх, уніз звысоку —
Кружыць, кружыць першы снег!..

— Слухай, змыемся з урокаў! —
Саньку штурхае Алег.—
Пакатаемся на санках,
Крэпасць вылепім!.. Айда?

Горасна ўздыхае Санька:
— Што ты, знойдуць па слядах!..

1982

СНЕГІРЫ

Можа, хто паслухаць хоча,
Што я сёння чуў уночы?

Сплю сабе...
Аж на зары
Прыляцелі снегіры.



Мастак У. САВІЧ

Н. Мацяш «Казка пра суседзяў, змяю і мядзведзя»



Мастак В. ШАРАНГОВІЧ

Янка Купала «Адвечная песня»

Селі шумнай чарадой,
Скардзяцца наперабой:

— Ох і падвяла ж зіма!
Снегу белага — няма.

Снежань мусіць гразь мясіць:
Дождж, бы ўвосень, марасіць.

Што, як раптам Новы год
Адкладзе свой надыход?!.

І рашылі снегіры:
— Мы склюём календары!

Як у іх лісткоў не будзе,
Новы год паклічуць людзі.

Хоча ён таго ці не —
Прыйдзе з ёлкай на спіне!

Можа, й снегу прынясе,
Густа-густа натрасе.

Без яго ж, мяркуйце самі,
Як нам звацца снегірамі?!

Вось пра што ў маім двары
Гаманілі снегіры.

З Новым годам вас, сябры!

1981

МІХАСЬ МАШАРА

(1902—1976)



КАЛЫХАНКА НАЧЫ

Ноч ціхенька гутарыць
з лісцем і травой:
— Я зямлю ахутаю
цёплаю імглой.

Буду над абшарамі
ціха напяваць,
залатымі хмарамі
сны людскія ткаць.

Стану над азёрамі,
дзе шуміць чарот,—
загарыцца зорамі
гладзь азёрных вод.

Косы на бярозавым
распляту галлі
і абсыплю росамі
травы на зямлі.

Пабрыду дарогаю
між лагчын і гор,
ціхаю знямогаю
ахіну прастор.

Хай крычаць злавесныя
совы у гаю,
калыханкай-песняю
крык іх адганю.

1937

ЛІПЕНЬ

Звіняць над ліпай пчолы,
і пахне свежы мёд.
У жыце — ветру шолах,
а жыта — як чарот.

У лузе сыплюць косы
сталёвы перазвон.
Сіней за сінь нябёсаў
цвіце на полі лён.

Ідуць на луг дзяўчаты
узлессем праз кусты
і песняю крылатай
калышуць гай густы.

А дзень такі прыгожы,
крышталем ззяе даль.
У моры жоўтым збожжа
зазвоніць хутка сталь.

А ў вёсцы? Там парадак
ў руках у дзетвары:
сады пад іх наглядам,
і хаты, і двары.

Звіняць пад ліпай пчолы,
і пахне свежы мёд.
У жыце — ветру шолах,
на полі — працы пот.

1937—1938

УЛАДЗІМІР МЕХАЎ

(нарадзіўся ў 1928 г.)

КНІЖКА ПРА ТАТУ

Сяргейку тры гады. Гэта многа. Болей, чым думаюць тата і мама. Калі яны прыходзяць з завода, Сяргейка заўсёды просіць:

— Пачытаем?

Мама цалуе яго і адказвае:

— Ох, сынок, пагуляў бы ты лепш з цацкамі. У мяне яшчэ столькі работы!

А Сяргейка якраз і не любіць гуляць з цацкамі. Болей яму падабаецца слухаць кніжкі. Ён пакрыўджана надзімае губы.

Тата ўсміхаецца:

— Ну, ідзі сюды, чытальнік! Пра што сёння будзем?

Сяргейка радасна крычыць:

— Пра Муху-цакатуху! І пра Гагарына! І пра зубра! — І сам пачынае шукаць патрэбныя кніжкі.

Сяргейка іх знаходзіць адразу, хоць і не ўмее чытаць. Усе свае кніжкі ён пазнае па малюнках.

Пачула аднойчы суседка, як тата чытае Сяргейку, і сказала:

— Малайчына вы, Мікалай Іванавіч. І на заводзе вы лепшы работнік, і дома такі харошы. Кніжку пра вас трэба напісаць, чэснае слова!

Тата засмяяўся:

— Прыдумаеце, Кацярына Пятроўна!

А Сяргейка папрасіў аловак і паперу.

— Што ты будзеш маляваць? — спытала Кацярына Пятроўна.— Домік?

— Не,— адказаў Сяргейка,— кніжку пра тату.

Праз некалькі дзён тата мяняў касцюм. Ён выняў з кішэні розныя паперы, маленькія кніжачкі і паклаў іх на стол. Потым выйшаў на кухню, каб узяць прас.

А Сяргейка тым часам узлез на крэсла і пачаў разглядаць татавы рэчы.

— Вось яна! — закрычаў ён раптам.— І тата на малюнку!

Тата і мама прыбеглі на гэты радасны крык.

— Што тут, Сяргейка?

— Кніжка пра тату! — сказаў сынок.— Маленькая! — І паказаў на заводскі пропуск — чырвоную кніжачку, у якую была ўклеена татава фатаграфія.

Мама засмяялася, махнула рукою. А тата зусім сур'ёзна падтрымаў Сяргейку:

— Правільна, сыночак, гэта кніжка пра твайго тату. У ёй гаворыцца, што тата твой рабочы чалавек. А рабочы чалавек варты самай цікавай кніжкі на свеце.

1962

ПАВЕЛ МІСЬКО

(нарадзіўся ў 1931 г.)

СТАРАМОДНЫ ЗАЯЦ

Вельмі даўно гэта было. Тады яшчэ зусім не было зімы, а ўсё лета і лета.

І вось прайшла чутка, што ўжо вечнага лета не будзе, а так: палавіна года цёплая, палавіна халодная. У іншых краях даўно гэтак заведзена, і ніхто не крыўдуе. Нават радуюцца марозу, спраўляюць на зіму абноўкі — белыя, пад колер снегу, футры.

На ўзлеску, пад узгоркам-абрывам, жыла сям'я Зайца-краўца. Звычайная сям'я: тата, мама, пяцёра зайчанят. Бедна жылі, бо рэдка хто са звяроў заказваў Зайцу абновы — бегалі ў лёгкай летняй вопратцы. Толькі калі прашмуляе хто локці, падзярэ калені — ідуць да Зайца, каб наклаў латку.

Дачуўся аднойчы Заяц, што будуць такія перамены ў прыродзе, прыбег дадому.

— Чула, Зайчыха? І хто б мог прыдумаць такое! Во калі зажывём! Во калі заказаў будзе!

Паскакалі з радасці, пабегалі, пакуляліся.

Спраўдзіліся чуткі: прыйшлі халады, закружыліся ў паветры белыя-белыя сняжынкі. Заяц паспешліва выграб пад абрывам нару, уставіў дзверы, вокны — зацішна зрабілася, цёпла. Зайчыха з зайчанятамі падмяла, прыбрала ў хаце, панесла выкінуць смецце. І раптам прыбягае ў хату, ад страху зуб на зуб не пападае.

— Там!.. Там!..

А ў вокнах пацямнела ўжо, як перад навальніцай. Спалохаўся Заяц, але ўхапіў капялюш і — за дзверы. Бачыць: навіс над імі, як цёмная хмара, Мядзведзь, спрабуе ў вокны зазірнуць.

— Тут... гэты самы жыве... шавец?

— Тут, тут! Я і ёсць... Толькі не шавец, а кравец, кажушнік,— пакланіўся Заяц, капелюшом перад сабою памахаў.

— Ну — той, што шые і пора...— Мядзведзь гэпнуў вобзем цяжкі мех.— Пашый мне гэта самае... Як яго... Футра, во! З матэрыялу заказчыка.

Заглянуў Заяц у мех: шыкоўны матэрыял, нятканы, поўсць белая, густая і доўгая.

— Добра пашыеш — добра заплачу. Сапсуеш — з самога шкуру спушчу! Го-го-го! — зарагатаў Мядзведзь, задаволены сваім досціпам, і ўлёгся.— Абмервайце!

Хоць і лёг Мядзведзь, але як быў аграмадзінай, так аграмадзінай і застаўся. Прывалок Заяц лесвіцу, прыставіў да яго. І Зайчыха з зайчанятамі асмялелі, высыпалі на помач. Усім хапіла работы: Заяц Мядзведзеву галаву абмяраў, Зайчыха — тулава, зайчаняты — лапы. Самае малое зайчаня мерала Мядзведзеў хвост і не ўтрывала:

— Хі-хі! Сам такі вялікі, а хвосцік маленькі!

Паварочаўся незадаволена Мядзведзь.

— Ты гэта... як цябе... шпінгалет, маўчы. А ў самога які? Крытык знайшоўся.

Намералі ўдаўжкі, ад носа да хваста, паўтара метра.

— Як гэта паўтара?! — узвіўся Мядзведзь на дыбы.— Як паўтара, калі я два метры важу?! Не важу, а гэта... як яго... Даўжыню такую маю! — Забраў у Зайца цыратовы «метр», прыклаў, стоячы, да носа.— Ну-у?!

— І праўда — два метры.

— Праз месяц прыйду па шкуру. Го-го-го! — зарагатаў на ўвесь лес і павалюхаў прэч, нават не развітаўся.

Ох і было шэрым работы! Пакуль раскроілі — семдзесят сем патоў сышло. А машын швейных тады не было, усё ўручную, усё іголкай трэба было шыць. Зайчыха ніткі ссуквала, а Заяц ведаў адно: шыў і шыў, шыў і шыў ды ўсё зайчанят хваліў, што добра ніткі навашчылі, трывалыя будуць, моцна футра сшыецца. На сон і на яду забыўся Заяц, схуднеў, небарака, як шкілет...

Прыйшоў Мядзведзь праз дваццаць дзён на прымерку, а футра ўжо гатовае.

Назбягалася ўсякіх звяроў, як у тэатр, пасталі кругам: хочуць паглядзець на Мядзведзя ў новым футры. І ў кожнага ў лапах ці пад пахаю торбачка або клунак, таксама заказы прынеслі.

Апрануў Мядзведзь футра — як на ім і было! Быў буры, а стаў белы ад носа да кончыка хваста. Загаманіла, заскакала звярыная грамада: «Ура Зайцу-краўцу! Ура!»

— Душна! Дзе той... як яго... снег? Душна ў новым футры! — зароў Мядзведзь, хоча скінуць абноўку.— Памажыце расшпіліць... гэтыя... як іх!!! О-о-о!!!

Пырснулі звяры ад страху ў розныя бакі, баяцца трапіць Мядзведзю пад гарачую лапу. А Заяц з Зайчыхаю і зайчанятамі ў хату схаваліся ды дзверы калом падперлі.

— Душна-а-а-а-а-а-а-а!!! — яшчэ страшней зароў Мядзведзь і памчаўся на Поўнач. Боўць з крыгі ў Ледавіты акіян: «А-ах, добранька!»

І застаўся там жыць.

— Тата, а ён жа нам за работу не заплаціў! — вылезла з-пад ложка самае малое зайчаня.

— Ліха з ім, хай яму на памяць будзе,—

уздыхнуў Заяц і вылез з-пад другога ложка.— Добра, што самі ўцалелі.

— Добранькі знайшоўся,— пачала папікаць Зайчыха.— А дзяцей чым карміць? Каб браў наперад плату!

— Пасаромейся...— толькі і паспеў сказаць Заяц. Бо ў дзверы пастукалі, і ў шчыліну прасунулася галава Лісы.

— Добры вам дзянёк!

— Каму добры, а каму і не,— буркнула Зайчыха.— Калі прынесла шытво — плату наперад!

— Зайчыха, пасаромейся!.. — зніякавеў Заяц, прабачліва развёў перад Лісою лапамі: маўляў, даруйце ёй, яна ў нас у гарачай вадзе купаная.

— Ды я такое моркаўкі навыбірала! Адна ў адну! І намыла, і ў торбу склала! А сало-о-одкая — ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць! — спявала-залівалася Ліса.— Але ж самі падумайце: аддам наперад — схрумстаеце, а пра футра і забудзеце. Дый нашто вам спяшацца? Зіма ж, кажуць, доўгая будзе, паспееце з'есці.

— Тады ідзі са сваім заказам куды хочаш! Нас саміх Заяц будзе абшываць, самі вунь у чым ходзім! — спрабавала сваё права правіць Зайчыха.

Але Заяц працягнуў ужо лапу да Лісінае торбы:

— Паказвайце матэрыял...

Агледзеў і вымераў Заяц матэрыял, абмераў Лісу.

— Праз два тыдні прыходзьце.

А Зайчыха зноў пілуе Зайца:

— Лапавухі ты быў, лапавухі і застаўся! Хто ж гэта вымервае цюцелька ў цюцельку? З Мядзведжага і лісінага матэрыялу можна было яшчэ і мне на футра выштукаваць. Зусім пра сям'ю не думаеш!

— Адчаліся! — Заяц адчыніў дзверы.— Наступны хто?

І ў хату порстка ўскочыў Гарнастай. А няўрымслівы, а вёрткі!

— І ў мяне новае футрачка будзе! — радуецца, як дзіця.

— Ды пастой ты, бо іголкаю ўкалю,— нібыта сярдуе на яго Заяц. А сам мерае, прыколвае, дзе трэба, усміхаецца: і яму ўцешна — столькі шчасця ў малога!

Абмераў яго Заяц — не хапае матэрыялу, самы кончык хваста чорны застанецца.

— Такое бяды — не перажывай! Гэтак нават прыгажэй — з чорным кончыкам,— суцяшае Зайца Гарнастай.— Самі сябе хоць знойдзем у белым снезе! — і шмыг за дзверы.

Выглянуў за Гарнастаем Заяц — бацюхны, а снегу ўваліла! Усё белае... І цэлая чарга зайцоў-шаракоў: каторыя сядзяць, як пянькі, са снежнымі шапкамі на галовах, каторыя падскокваюць, грэюцца. А маладзейшыя коўзанку зрабілі — скочваюцца бокам з абрыву, з'язджаюць на спінах і хвосціках — віску, рогату!

— Заўтра прыходзьце! — крычыць ім Заяц.— Набраў ужо многа заказаў.

— Як — заўтра? А футрачкі? Бессаромны ты! Чужым шыеш, а сваякам — не?! — кінуліся зайцы да краўца, ледзь за вушы яго не валтузяць.

— Ну — добра! Ну — ціха! Ну — чакайце! — ледзь адцерабіўся Заяц — і ў хату.— Зайчыха, ідзі знімай меркі!

І пачаў шыць.

Шые Заяц, завіхаецца, шые-завіхаецца... А Зайчыха ўсё мерае і мерае. Па-свойму мерае: каб большыя абрэзкі былі. А зайчаняткі кроіць налаўчыліся — толькі ножанкі ляскаюць... Дзень і ноч, дзень і ноч — арцель-карусель!

А тут і Ліса прыйшла па футра. А моркаўкі не прынесла!

— Мне сёстры сказалі, каб спачатку прыйшла ў футры ім паказацца! Калі яны пахваляць работу — у дзвюх торбах плату прынясём! — Апранулася ў новае белае футра і пайшла.

І па сённяшні дзень яе няма. Кажуць, каб не спаткацца з Зайцам-краўцом, ажно ў тундру заджгала, на Поўнач. І нават імя памяняла, каб не пазналі. Пясцом стала звацца.

Тры месяцы прайшло ўжо, зіма канчаецца. А чарга каля Зайцавай хаты не меншае.

— Калі ты ўжо сабе пашыеш? Калі нам? — гневаецца Зайчыха.

— Хутка ўжо! Вось-вось... Нам у хаце і так цёпла, а яны вунь па снезе бегаюць,— адгаворваецца Заяц.

— Хто — па снезе? Аслеп ты ад гэтай работы... Снегу ўжо нідзе няма. Вясна прыйшла!

— Калі вясна, дык нашто нам тыя новыя футры? Будзем у старамодных хадзіць,— адмахнуўся Заяц.

...Шмат гадоў прайшло з таго часу. А як было многа зайцоў-шаракоў, так многа і засталося. Толькі прыгледзьцеся: у некаторых на жываце, на хвасце бялеюць латкі, што паспела прышыць сабе і сваім дзецям Зайчыха з абрэзкаў. А каго абшыў Заяц-кравец, тыя ўбіраюцца на зіму ў белыя футрачкі, фарсяць: «Мы — белякі!»

А футрачкі добрыя, зносу ім няма. Перадаюць іх дзяды бацькам, бацькі — дзецям. І гэтак з пакалення ў пакаленне перадаецца памяць пра добрага Зайца-краўца.

А пра Зайчыху забылі начыста.

1979

СЯРГЕЙ МІХАЛЬЧУК

(нарадзіўся ў 1925 г.)

МОЙ СУСЕД ЮРКА

Упершыню я сустрэўся з ім у той дзень, як засялялі суседні новы чатырохпавярховы дом.

Адзін за другім пад'язджалі грузавікі з навасёламі. З машын здымалі канапы і сталы, крэслы і ложкі, чамаданы і клункі з розным дамашнім набыткам. Не сонечны зайчык — само сляпучае сонца ўварвалася ў мой пакой, калі пад акном праехала яшчэ адна машына з люстранай шафай наверсе. Я выйшаў на двор.

Чатыры дзядзькі асцярожна спускалі з кузава МАЗа па дошках чорнае бліскучае піяніна. На кожны штуршок яно адгукалася знутры басавітым гудзеннем. Я падбег і таксама падставіў плячо, упёрся ў адпаліраваны да зіхацення бок «музычнай скрыні», але неўзабаве, калі піяніна ўкацілі ў пад'езд, вымушаны быў адступіцца: на лесвіцы было занадта цесна, і кожны лішні чалавек толькі замінаў.

Наўкол панавала радасная мітусня. Дарослыя і дзеці з вясёлым гоманам пераносілі ў новы дом свае рэчы.

І тут я ўбачыў яго.

Па лесвіцы на двор выкаціўся бялявы хлапчук гадоў дванаццаці, у школьнай форме, з чырвоным гальштукам на грудзях. Быў ён, можа, нават малы для сваіх год, але шустры і рухавы.

Хлапчук падбег да пажылой жанчыны, што намагалася і ніяк не магла адразу падняць з зямлі вазон з калючым кактусам і клунак, у якім былі завязаны кубкі, сподкі, лыжкі, разлівачка з доўгай ручкай і іншае кухоннае начынне.

— Бабуся, пачакай! — закрычаў хлопчык.— Дай я!

Ён схапіў аберуч гаршчок з кактусам і знік у пад'ездзе. А жанчына нагнулася зноў, збіраючыся на гэты раз узяць у другую руку вязку кніжак. Каля сцяны на асфальце стаяла не менш двух дзесяткаў акуратна перавязаных пакункаў з кнігамі і часопісамі.

Ды жанчына зноў не паспела.

Хлапчук, нібы метэор, вылецеў з расчыненых насцеж дзвярэй, пад якія хтосьці, каб яны не зачыняліся, падклаў цагліну, і ледзь не з плачам выгукнуў:

— Бабуся, не чапай! Я іх сам звязваў, сам і насіць буду! Мы ж дамовіліся...

Жанчына махнула рукой і патупала ў калідор.

— А мне можна дапамагчы? — спытаў я, падыходзячы бліжэй.

Хлапчук узняў на мяне зеленавата-шэрыя вочы і крыху сумеўся. Заміргаў светлымі вейкамі, яшчэ больш паружавеў.

— Ды ты не бойся,— сказаў я. Я вось у гэтым доме жыву, па суседству.

— А я і не баюся,— шырока ўсміхнуўся ён.— Вам можна. Вы вунь які здаровы! — І ціха, быццам па сакрэту, растлумачыў: — У бабусі хворае сэрца. Ёй няможна па лесвіцы часта падымацца.

За чатыры разы мы перанеслі ўсе кнігі на другі паверх у кватэру Юркі — так звалі хлопчыка,— і я пазнаёміўся з яго бабуляй Аленай Мікалаеўнай.

Бабуля сказала, што бацькі Юркі паехалі дру-

гім рэйсам па астатнія рэчы, і павяла мяне аглядаць кватэру. Яна ніяк не магла нацешыцца выгодамі новага жылля: і ацяпленне паравое, і газавая пліта ажно на чатыры канфоркі ды яшчэ з духоўкай, і ванная. І магазін — рукою падаць...

Прыкмеціўшы, што ўнук зноў збіраецца выслізнуць за дзверы, Алена Мікалаеўна перагарадзіла яму дарогу.

— Ты куды гэта? Адсапіся хоць крыху...

— Ой, бабуся,— Юрка шмыгнуў ёй пад руку,— хіба ты не бачыла: там нейкай цётцы столькі рэчаў згрузілі, а яна адна з малым...

Я развітаўся з Аленай Мікалаеўнай і выйшаў. На лесвічнай пляцоўцы паміж першым і другім паверхам мне давялося адступіцца ў самы кут: насустрач падымаўся Юрка. Разам з чарнявым, трошкі большым за яго хлопчыкам ён цягнуў наверх дзіцячую каляску, якая нагадвала глыбокія ночвы на колах. Следам ішла маладая жанчына з дзіцем, несучы ў адной руцэ чамадан.

Не паспеўшы яшчэ сам перабрацца на новую кватэру, Юрка ўжо дапамагаў сваім суседзям.

Дні праз два мне давялося стаць сведкам сутычкі Юркі з Дзімам Казловым.

Дзіму на нашым двары ведаюць усе. І дзеці і дарослыя. Калі вы ўбачыце, што на сцяне намаляваны крэйдай смешны чалавечак або што ўвесь двор засмечаны папяровымі самалёцікамі, можаце не сумнявацца — гэта работа Дзімы. Сарамаціць яго, гаварыць, што рабіць так непрыгожа, што пасля гульні трэба навесці парадак,— бескарысна. На ўсе дакоры ў Дзімы адзін адказ:

— А што?

Або:

— Цётка Даша заўтра ўсё роўна будзе падмятаць.

На гэты раз Дзіма з'явіўся на двары з перагарэлай электрычнай лямпачкай у руцэ. Ён круціў ёю над галавой і пагрозліва крычаў на малых, што гулялі пад вокнамі:

— Разыдзіся! Зараз бомбу кіну!

І, доўга не думаючы, запусціў лямпачкай у сцяну.

Вухнула сапраўды здорава. Асколкі шкла са звонам сыпанулі ва ўсе бакі. На гэты шум і крык я і азірнуўся, выходзячы з дому.

І тут на Дзіму наляцеў Юрка.

— Зараз жа прыбяры! — загадаў Юрка Дзіму, паказваючы на асколкі.

— А што? — агрызнуўся той.

Дзіма быў большы за Юрку і, вядома, дужэйшы. І калі б яны схапіліся біцца, перавага была б на яго баку. Але Юрка не адступіўся.

— Прыбяры,— паўтарыў ён.— Бачыш, колькі тут малых гуляе. Яшчэ хто рукі аб шкло парэжа...

У гэты час на заасфальтаваную дарожку паміж дамамі, смешна тэпаючы кароценькімі ножкамі, выбегла дзяўчынка. Было ёй годзіка паўтара-два, не больш. Яна спынілася пасярод дарожкі, нагнулася і штосьці падняла.

— Дзіма, ца-ца! — паклікала малая.

Гэта была Дзімава сястрычка Ніна. За ёю Дзіма павінен быў наглядаць, гуляючы на двары.

— Кінь! Дай сюды! — рынуўся да сястры Дзіма.

Але тая і не збіралася аддаваць сваю знаходку. Яна яшчэ мацней сціснула ў руцэ пакручасты цокаль ад разбітай лямпачкі са шкляной палачкай і вусікамі-драцінкамі.

Дзіма на момант разгубіўся, не ведаючы, што рабіць. Адбіраць сілком? Ніна можа парэзаць

пальцы аб вострыя шкляныя аскалёпкі, што тырчалі з-пад цокаля...

І тут яго выручыў Юрка.

— На́,— хуценька дастаўшы з нагруднай кішэні куртачкі маленькае круглае люстэрка, сказаў ён Ніне.— Бачыш? Вунь там дзядзька ідзе. А дзе ён? Ну? Вунь дзе!..

Пакуль Юрка гаварыў, пакуль малая шукала ў люстэрку «дзядзьку», Дзіма паспеў непрыкметна разняць Нініны пальцы і забраць у сястрычкі небяспечную цацку.

Яшчэ праз хвіліну абодва хлопчыкі старанна збіралі на асфальтавай дарожцы і ля сцяны дома асколкі разбітай лямпачкі.

А сёння вяртаюся з работы і чую каля суседняга дома (не новага, а таго, дзе на першым паверсе «Гастраном») — гамана, шум, крыкі. Не менш дзесяці хлапчукоў і дзяўчынак падымаюць і падвязваюць да калка маладую ліпку. Маладымі ліпкамі сёлета высадзілі ўвесь наш квартал. Ды ўчора нейкі нядбайны шафёр вёз малако ў магазін і зачапіўся за крайняе дрэўца, паваліў яго.

І хто б, вы думалі, быў завадатарам усёй гэтай работы? Юрка і Дзімка.

Усяго тры разы сустракаўся я з Юркам. Але ўжо і зараз магу смела сказаць: «Добры сусед пасяліўся побач са мною».

Вось пра гэта і захацелася мне расказаць усім.

1965

ІВАН МУРАВЕЙКА

(нарадзіўся ў 1921 г.)



ЛЯСНЫЯ СКАРБЫ

Я часта і доўга па лесе блукаю,
Дзівосныя скарбы яго сабіраю:
Зязюль кукаванне
І песні драздоў,
Грыбное маўчанне
І звон ручайкоў,
І смутак ракіт,
І крынічак блакіт,
І водар сасновы,
І пах чабаровы,
Рабіны цяпло
І бярозак святло...
Я самы шчаслівы, багаты,
Вяртаюся з лесу дахаты.

1981

ВЕСНАВОЕ ЗДАРЭННЕ

Скакаў гарэза верабей
З галінкі на галінку.
Прасіў ён: — Сонейка, пагрэй
І крыльцы мне, і спінку.

Пацешна, добра вераб'ю
Пад промнямі ў зацішку.

І клюнуў жартам: — Ой, заб'ю!
Набухшую пупышку.

І сам, збянтэжаны, убок
Адскочыў. Як не сорамна!..
З пупышкі выпырхнуў лісток,
Як птушаня зялёнае.

1972

ПРА МЫШКУ І КНІЖКУ

Мама Мыш
Купіла кніжку
Для сваёй дачушкі
Мышкі.

— Час табе
Ужо за парту.
На, грызі
Навуку ўпарта.

Мама Мыш
Прыйшла з работы.
— Без мяне рабіла
Што ты?

Адказала маме
Мышка:
— Натамілася
Я з кніжкай.
Гэтулькі было
Мне мукі,
Але згрызла ўсю
Навуку.

1974

УЛАДЗІМІР МЯЖЭВІЧ

(1907—1982)

ТЭЛЕГРАФІСТ ЛЕНІНА

Міхась першы раз пабачыў тэлеграфны апарат, і яму адразу захацелася стаць тэлеграфістам.

Кожны дзень пасля школы ён забягаў на чыгуначную станцыю, дзе працаваў яго тата.

— Кастусь, зноў твой сын пад акном,— казаў хто-небудзь з тэлеграфістаў.

А Міхась, затаіўшы дух, глядзеў, як на падлогу з апарата Морзэ паўзла бясконцая стужка з кропкамі і працяжнікамі.

Хутка на тэлеграфе спатрэбіўся вучань. Узялі Міхася Новікава.

Ішлі гады. Хлопчык вырас і навучыўся добра працаваць на апараце.

Аднойчы па дарозе да родных на станцыю Негарэлае завітаў Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі. Ён пазнаёміўся з маладымі чыгуначнікамі, якія стварылі гурток «За сацыялістычную рэвалюцыю». Сярод іх быў і Міхась Новікаў. Дзяржынскі паглядзеў, як працуе Міхась, і пахваліў яго.

У пачатку кастрычніка 1917 года Дзяржынскі папрасіў сваіх негарэльскіх землякоў паслаць аднаго з лепшых тэлеграфістаў у Петраград. Таварышы параілі ехаць Новікаву.

Так напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі

Міхась апынуўся на Цэнтральным тэлеграфе сталіцы.

У дні паўстання адзін з юнкераў, пакідаючы тэлеграф, ударыў прыкладам вінтоўкі па апарату, на якім працаваў Новікаў. Трэснула вечка.

Неўзабаве на тэлеграф забег Дзяржынскі. Ён сказаў Міхасю:

— Вам, зямляк, прыйдзецца выконваць найважнейшыя даручэнні. Спадзяюся на вас.

— Жыцця не пашкадую для рэвалюцыі! — адказаў Новікаў.

У той жа дзень Новікаў перадаў у Беларусь паведамленне аб перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. А следам — першыя Ленінскія дэкрэты аб міры, зямлі, аб утварэнні Савецкага ўрада на чале з Леніным.

На тэлеграфе было шмат работы. Не разгібаючы спіны, сядзеў ля апарата Міхась: адну за другой перадаваў тэлеграмы Леніна.

Самлела рука ад напружанай працы ключом. Міхась паварушыў пальцамі, падняў галаву. Перад ім стаяў камісар тэлеграфа, а з ім незнаёмыя людзі. Толькі сабраўся пачаць перадачу, як пачуў словы камісара:

— Я вас слухаю, таварыш Ленін...

Ад нечаканасці Міхась аж здрыгануўся: «Каторы ж Ленін?»

Да апарата ішоў сярэдняга росту чалавек з рыжаватай бародкай, прамяністымі, ласкавымі вачыма. Міхасю запомніліся крышачку прыжмуранае правае вока, заклапочаны твар і ветлівая ўсмешка.

Ленін сказаў:

— Добры дзень, таварыш!

Новікаў у момант адстукаў на апараце гэтыя словы і спыніўся, чакаючы працягу.

— Гэта я вам сказаў — «Добры дзень!»,—

ласкава заглянуў у вочы тэлеграфісту Уладзімір Ільіч.

Новікаў усхапіўся з крэсла, абцягнуў гімнасцёрку і, хвалюючыся, адказаў на прывітанне.

— Сядайце, таварыш, будзем з вамі працаваць.

Ленін дыктаваў, а Новікаў перадаваў словы Уладзіміра Ільіча ў далёкія гарады краіны. Калі скончылі, Ленін сказаў:

— А вы здорава працуеце, таварыш!

Аднаго разу Леніну давялося доўга чакаць, пакуль на другім канцы провада да апарата падыдзе патрэбны чалавек. Заклапочаны, хадзіў ён па апаратнай, потым спыніўся каля тэлеграфіста і стаў пільна сачыць за яго пальцамі.

— А ведаеце што, навучыце мяне працаваць на вашым апараце,— раптам папрасіў Уладзімір Ільіч.

— Можна,— сказаў Новікаў.— Толькі спачатку трэба засвоіць азбуку Морзэ.

— А колькі часу трэба на гэта?

— Прыкладна паўгода.

— О, вельмі многа, я пастараюся вывучыць хутчэй,— сказаў Ленін. Ён дастаў з кішэні кніжачку і пачаў запісваць літары, а супраць іх кропкі і працяжнікі азбукі Морзэ.

— А вы хутка працуеце, таварыш! — зноў сказаў Ленін.

— Тэлеграфісты такіх называюць сыпачамі,— заўважыў Міхась.

Ленін засмяяўся:

— Трапна сказана — сыпач!

Пры далейшых сустрэчах Уладзімір Ільіч часта жартаваў: «Ну, таварыш сыпач, будзем працаваць».

Аднойчы Новікаў трапіў пад халодны дождж і вярнуўся на тэлеграф мокры да ніткі. У апа-

ратную зайшоў Ленін. Ён спяшаўся, і перагаворы былі кароткія. Пакідаючы тэлеграф, Уладзімір Ільіч паглядзеў на Новікава:

— Вам холадна, таварыш?

— Нічога, Уладзімір Ільіч, вунь колькі работы, сагрэюся,— Міхась паказаў на пачак тэлеграм.

— Трэба сябе берагчы... Вы мне даруйце, але я не ведаю вашага прозвішча.

Міхась назваў сваё прозвішча.

Гадзіны праз дзве яго выклікалі ў гаспадарчы аддзел Саўнаркома і выдалі новы скураны касцюм.

Калі Уладзімір Ільіч завітаў на тэлеграф, Міхась падзякаваў яму за падарунак.

— А я тут ні пры чым,— усміхнуўся Уладзімір Ільіч.— Гэта вас узнагародзіў урад. Насіце на здароўе.

Новікаву выдалі спецыяльны пропуск для наведвання кватэры Леніна. Позна ўвечары ён насіў Уладзіміру Ільічу стужкі тэлеграм. Ленін чытаў іх з дапамогай азбукі Морзэ. Жылі яны тады з Надзеждай Канстанцінаўнай на другім паверсе ў двух невялікіх пакоях Смольнага.

Хваляваўся Міхась, калі першы раз ішоў да Леніна. Пастаяў пад дзвярыма, пазваніў. Адчыніла Надзежда Канстанцінаўна.

— Да Уладзіміра Ільіча?— ласкава спытала яна.

— Нада,— сказаў Міхась і асекся. Ці так ён сказаў? Беларускую мову Новікаў ведаў лепш, чым рускую. Каб не зрабіць памылкі, ён рашыў падмацаваць сказанае сваім родным.— Трэба нада тэрмінова перадаць Уладзіміру Ільічу тэлеграмы.

Надзежда Канстанцінаўна ўсміхнулася. З другога пакоя выглянуў Ленін.

— Як, як вы сказалі, таварыш Новікаў?

Міхась паўтарыў свае «трэба-нада». Уладзіміру Ільічу вельмі спадабаліся гэтыя словы. Ён іх часта ўжываў пры гаворцы з Новікавым. Надзежда Канстанцінаўна кожны раз сустракала Міхася вясёлым запрашэннем:

— Трэба-нада выпіць вам шклянку чаю...

Толькі праз сорак гадоў Новікаў адшукаў свой апарат Морзэ. Пазнаў па разбітаму вечку. Цяпер гэты апарат у музеі Леніна ў Маскве. Там жа і фота Новікава. Ён засняты ў скураным касцюме, які атрымаў па загаду Леніна.

1969

ІВАН НАВУМЕНКА

(нарадзіўся ў 1925 г.)

СУСТРЭЧА З МАРШАЛАМ

Як толькі Алёшка прыйшоў у свой трэці клас, ён адразу адчуў незвычайнае. Вучні гучна размаўлялі, і ніхто не вымаў з сумкі кніг.

Галіна Андрэеўна абвясціла, што школа сёння пойдзе на плошчу: там будзе выступаць Маршал Савецкага Саюза — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета. Алёшка аж задрыжаў ад узбуджэння. Ён ведае гэтага маршала — чытаў у кнігах пра грамадзянскую вайну, дый партрэт ягоны змешчан у падручніку па гісторыі. І якое шчасце, што ён, Алёшка, убачыць на ўласныя вочы такога выдатнага чалавека!

Пасля другога ўрока Галіна Андрэеўна загадала выходзіць на двор — там вучняў ужо ставілі ў калону.

— Дзяжурны астанецца ў класе,— сказала Галіна Андрэеўна, і Алёшка ў першую хвіліну проста анямеў. Ён зусім забыў, што сёння дзяжурыць і што перад пачаткам урокаў сам памыў анучку і выцер дошку.

Бачачы замяшанне хлопчыка, настаўніца хацела яму памагчы. Галіна Андрэеўна паважала Алёшку, бо ён добра паводзіў сябе і старанна вучыўся.

— Можа, ты, Каця, астанешся? — звярнулася яна да бялявай дзяўчынкі, якая сядзела побач з Алёшкам.— Ты прастудзілася, кашляеш, і доўга

на вуліцы табе быць нельга. Алёшка заўтра за цябе падзяжурыць.

Каця ўткнулася тварам у парту і адразу заплакала. Алёшку зрабілася няёмка.

— Раз мая чарга, буду дзяжурыць,— сказаў ён і адышоўся да акна.

Ён стаяў, стараючыся не глядзець на шумлівую, галасістую калону, якая са сцягамі, транспарантамі ў хуткім часе выбралася са школьнага двара. Двор быў пусты і нязвычна ціхі. Доўгімі радамі стаялі голыя таполі, каля якіх кружкамі ляжала апалае жоўтае лісце.

Алёшка хутка супакоіўся. Яму нават стала прыемна ад думкі, што ён як бы служыць усяму класу. У партах ляжаць сумкі, партфелі, ранцы, і некаму трэба за іх адказваць.

Выцягнуўшы з парты кніжку і прымасціўшыся ля цёплай грубкі, Алёшка пачаў чытаць. Так прайшло з паўгадзіны ці, можа, трошкі болей.

Раптам у калідоры пачуліся крокі, дзверы адчыніліся, і ў пакой зайшло некалькі чалавек. Наперадзе стаяў каржакаваты, немалады ўжо вайсковец. Яго твар падаўся Алёшку трохі знаёмым.

Вайсковец агледзеў клас, рудыя падцёкі на сценах над століу, пабітую на дзіркі падлогу.

— Трэба новую школу будаваць,— сказаў ён, павярнуўшыся да старшыні сельсавета.

Яшчэ праз хвіліну вайсковец звярнуўся да Алёшкі:

— Чаму сядзіш адзін?

— Я дзяжурны. Школа пайшла маршала сустракаць.

— Я, брат, маршал і ёсць. Вось зайшоў паглядзець, якая ў вас школа. Сам некалі ў такой вучыўся.

У Алёшкі ад радасці перахапіла дыханне — будзе што расказаць хлопцам.

— Вучышся як? — спытаўся маршал.

— Чацвёркі толькі па пісьму і маляванню. А так пяцёркі.

— Малайчына. Старайся і надалей трымаць такі курс. Кніжкі любіш чытаць?

— Люблю. І яшчэ птушак умею лавіць. У мяне кожны дзень новая сініца.

Маршал зноў усміхнуўся:

— Вось гэта, брат, дарэмна. Птушкі любяць волю. Абяцай мне, што кінеш гэты занятак.

— Я іх і так выпускаю. Магу зусім не лавіць.

— Значыць, дамовіліся.

Маршал працягнуў Алёшку руку. Далонь у яго цвёрдая, пастава дужая, а твар звычайны, добразычлівы. Нават не верыцца, што маршалы могуць быць такія простыя.

1974

УЛАДЗІСЛАЎ НЯДЗВЕДСКІ

(1929—1973)

СТО БРАТОЎ І СЯСЦЁР

Хто расклаў там, на ўзлессі,
Свой паходны касцёр?
— Мы спяваем тут песні —
Сто братоў і сясцёр.
Хто высаджваў ля бруку
Сотні дрэўцаў густых?
— Мы, Мічурына ўнукі,
Тут вырошчваем іх.
Хто палеткам калгасным
З краю ходзіць у край?
— Мы з дарослымі разам
Множым тут ураджай.
Хто на лыжах нястомна
Мерыць снежны прастор?
— Мы, спартсмены з дзетдома —
Сто братоў і сясцёр.
Хто вясною па хвалях
Свой пусціў карабель?
— Мы яго змайстравалі,
Гэта — наша мадэль.
Хто пад сцягам крылатым
Крочыць міма азёр?
— Мы, з дзетдома рабяты —
Сто братоў і сясцёр!

1957

РЫГОР НЯХАЙ

(нарадзіўся ў 1914 г.)



КАСАЧЫ-ВУСАЧЫ

Я садзіў вясною сад,
Агародчык, палісад.
Там дванаццаць касачоў,
Там дванаццаць вусачоў
Павылазілі з зямлі,
Падраслі і расцвілі.
Каля іх клянок высокі —
Ён узняўся аж да вокан,
Цень прыносіць касачам,
Хоць малы яшчэ і сам.
Іх купаю я ў вадзе,
Паліваю кожны дзень.
Падрастаюць вусачы,
Расцвітаюць касачы,
Клён жа стаў такі цыбаты —
Хутка будзе роўны з хатай.
Вось які цяпер мой сад —
Агародчык, палісад.

1957

БЕЛАЯ БЯРОЗКА

Белая бярозка,
Дробная раса.
Ў полі каля вёскі
Пасадзіў я сам.

— Ты расці, бярозка,
Белая кара,
Тоненькая ножка
Быццам з серабра.

Вырасту дарослым —
Станем мы сябры.
Калі ранкам росным
Выйдуць трактары.

Загудуць за вёскай,
Зацвіце зямля,
Так і знай, бярозка,
Буду там і я.

А калі настане
Спёка ў летні дзень,
Ты прыкрый лістамі,
Прынясі нам цень.

Каб не знаць нам стомы
У рабочы час,
Як у родным доме,
Прыгалубіш нас...

Скажа падарожны:
— Адпачыць бы час.
Ты адкажаш: «Можна
Пада мной якраз».

Паміж кветак сініх
Сядзе ў халадку,

А цябе пакіне,
Скажа ўсё ж:
— Пакуль!

Гэтак добра будзе
Нам з табой тады.
Не ламайце ж, людзі,
Дрэўцаў маладых.

Дык расці ж, бярозка,
Дробная раса,
Што вясной ля вёскі
Пасадзіў я сам.

1957

АЛЕСЬ ПАЛЬЧЭЎСКІ

(1905—1979)

ДОБРАЕ СЛОВА

У трамвай праз пярэднія дзверы ўваходзіў старэнькі дзядок. Хлопчык убачыў, як цяжка падымацца старому чалавеку з нізкай прыступкі. Ён усхапіўся з лаўкі і падаў руку.

Дзядуля падзякаваў.

— Сядайце, калі ласка, на маё месца,— паказаў хлопчык на лаўку.

— Сядзі-сядзі. Мне недалёка ехаць.

Хлопчык быў настойлівы:

— Ну я вас прашу, дзядуля, сядайце.

Прыйшлося паслухацца. Дзядуля сеў, прыхіліў хлопчыка да сябе і спытаў:

— Як жа цябе зваць?

— Юра.

— Харошае імя,— пахваліў дзядуля.

— Я ў той дзень нарадзіўся, як Юрый Гагарын паляцеў у космас.

— Вунь што. Тады яно двойчы харошае... У якім жа ты класе, хлапчына, вучышся? — зірнуў дзядуля на Юраў партфель.

— У трэцім.

— Малайчына. Старайся, старайся. Я ў твае гады і аднаго класа не скончыў. Толькі і ўмею распісацца. Ды і то навучыўся, калі мне было дваццаць гадоў.

— Дык вы і казак гэтых не чыталі? — Юра дастаў кніжку з партфеля.

— Не. Казкі расказвала мне маці.

— Ой, дзядуля, колькі цікавага вы не ведаеце! — пашкадаваў хлопчык.— Каб жылі блізка ад нас, я і вам чытаў бы... Тату і маме я кожны вечар чытаю.

Дзядуля ўздыхнуў: у яго свае такія ўнукі ёсць, могуць пачытаць, ды не вельмі дружаць яны з кнігай. Ён паглядзеў у акно і сказаў:

— Ну, мне скора выходзіць. Ты куды — у школу ці са школы едзеш?

— У школу, на другую змену. Мы пераехалі ў новы раён, а трэці клас я канчаю там, дзе жылі раней.

— Настаўнік ці настаўніца вучыць цябе?

— Настаўніца.

— Сядай на маё месца,— устаў дзядуля,— і перадай настаўніцы дзякуй. Скажы — ад дзядулі Сцяпана Міхайлавіча.

— Вы ведаеце нашу Вольгу Пятроўну?! — здзівіўся Юра і сеў на лаўку.

— Не. Але ты перадай ад мяне дзякуй, прашу цябе! — ужо з прыступкі гукнуў дзядуля.

«А за што перадаць дзякуй незнаёмай настаўніцы? — паціснуў плячамі Юра.— Прывітанне і тое знаёмым толькі перадаюць, а тут — дзякуй...»

Настаўніца ўвайшла ў клас, і Юра перадаў ёй дзядулеву падзяку. Вольга Пятроўна распытала, дзе і калі гэта было, трошкі захвалявалася і падзякавала вучню за прынесенае добрае слова.

А за што ўсё ж дзякаваў дзядуля настаўніцы? Можа, ты ведаеш?

1969



Мастак У. БАСАЛЫГА

У. Рабкевіч «Ад зімы да зімы»



Мастак Н. ПАПЛАЎСКАЯ

Беларуская народная казка «Залатая яблынька»

СЯРГЕЙ ПАНІЗНІК

(нарадзіўся ў 1942 г.)

ВОЖЫК І БЕЛЫ ГАРОШАК

Чамусьці Вожык
Не выцер ножак
І лёг у ложак.

Спаў дрэнна Вожык,
Бо многа крошак
Прынёс у ложак.

— Мой дружа Вожык,—
Сказаў Гарошак,—

З усіх дарожак
У свой жа ложак
Прынёс ты крошак.

Нашто ж парожак,
Дзе можа з ножак
Не толькі Вожык

Натрэсці крошак,—
Каб легчы ў ложак
Як я, Гарошак?

1979

15 Зак. 2563

КРОПКА

Бегла таропка
Дробненькая кропка.
А за ёю цэлы сказ
Бег да вас.
А за сказам — радкі,
За радкамі — кніжка...
Бегла кропка таропка,
Кропка — не лішка,
Бо паставіць кропку ў час —
Ратаваць і сказ, і вас.
Кропка — гэта сіла!

Пачыталі?
Пагуляць
Вас яна прасіла.

1980

МІХАСЬ ПАРАХНЕВІЧ

(нарадзіўся ў 1934 г.)

САМАЯ ВЫСОКАЯ ГАРА

Алымбек вельмі любіць свайго дзядулю Біліма. Вечарам, калі Алымбек вяртаецца з дзіцячага садзіка, дзядуля расказвае яму казкі. Асабліва любіць хлопчык слухаць розныя гісторыі пра вайну. Тады яму здаецца, што разам з дзядулем едзе ён у танку і вызваляе людзей з палону.

Алымбек ведаў усе дзядулевы ўзнагароды: ордэны і медалі. Адным ордэнам дзядуля асабліва ганарыцца. Яго ўручаў сам генерал — за вызваленне Мінска. На ордэне ярка палымнее сцяг — такі ж чырвоны, як і цюльпаны, што цвітуць за іх кішлаком.

Аднойчы дзядуля сказаў Алымбеку:

— Заўтра паляцім, унучак, у Мінск, да майго баявога сябра.

Алымбек ад радасці кінуўся дзядулю на шыю, пачаў яго цалаваць. А раніцай, прачнуўшыся, ён не пазнаў дзядулі; той быў у новым касцюме, на грудзях святочна зззялі баявыя ўзнагароды.

Да аўтобуса іх праводзіў увесь кішлак. Потым Алымбек з дзядулем ляцелі на самалёце, высока-высока, аж за воблакамі. У Алымбека ад такой вышыні моцна білася сэрца, кружылася галава. А дзядуля туліў яго да сябе, падбадзёрваў:

— Хутка будзем у Мінску, унучак. Нядоўга засталося ляцець.

Неўзабаве Алымбек сапраўды ўбачыў унізе

вялікі горад. Самалёт пачаў зніжацца, кранўся коламі зямлі і пабег па гладкай дарожцы.

Выйшлі з самалёта. Дзядуля паправіў на пінжаку ўзнагароды, выцер хусцінкай твар і павёў Алымбека да белага будынка.

— Мінск,— уголас прачытаў Алымбек.

— Малайчына, унучак,— пахваліў дзядуля.— Ты ўжо добра чытаеш...

Насустрач ім, трымаючы за руку дзяўчынку, таропка ішоў сівы чалавек. Дзяўчынка прыціскала да грудзей букет яркіх цюльпанаў.

— Добры дзень, Білім,— радасна сказаў сівы чалавек і абняў дзядулю.

— Салям алейкум, Антон Іванавіч! Салям алейкум!

Павітаўшыся з дзядулем, Антон Іванавіч падхапіў на рукі Алымбека, весела ўсклікнуў:

— Які ты ўжо вялікі, Алымбек!

Алымбек здзівіўся: адкуль гэты незнаёмы чалавек ведае яго?

Антон Іванавіч усміхнуўся:

— Пра цябе мне дзед твой пісаў... А гэта мая ўнучка. Знаёмцеся!

— Наташа,— назвала сябе бялявая дзяўчынка і падала цюльпаны дзядулю Біліму.

— Чаго ж мы тут стаім? — спахапіўся Антон Іванавіч.— Наташа, запрашай гасцей дадому.

Назаўтра ўсе разам паехалі на Курган Славы. У легкавушцы Алымбек сядзеў побач з Наташай. Па дарозе яна паказала свой дзіцячы садзік, які казачным церамком бялеў сярод зялёных дрэў.

— А вакол нашага садзіка — высокія горы,— сказаў Алымбек.— На іх і ўлетку снег ляжыць. Белы-белы!

Выехалі за горад. За вокнамі легкавушкі пабеглі палі, лугі, пералескі. Алымбек не паспеў агледзецца, як машына спынілася каля высокай

гары. На яе вяршыню вяла крутая лесвіца. А там, у блакітным небе, Алымбек убачыў бліскучыя пікі.

— Глядзі, Наташа, чатыры пікі на гары!..

— Гэта не пікі, Алымбек, а салдацкія штыкі,— сказаў Антон Іванавіч.— І стаяць яны на Кургане Славы. Некалі тут было роўнае поле. Потым на гэтым месцы людзі рукамі насыпалі гару, Курганом Славы назвалі. Мы з тваім дзядулем тут на адным танку ваявалі. Дзядуля твой быў камандзірам. А я з гарматы па фашыстах страляў...

Наташа ўзяла Алымбека за руку, павяла па лесвіцы. З кожнай прыступкай яны падымаліся ўсё вышэй. Вось і вяршыня Кургана. Адсюль, з вышыні, далёка-далёка адкрываліся вясновыя краявіды. Алымбеку здавалася: варта адпусціць Наташыну руку — і ён, як стэпавы орлік, паплыве над зямлёю.

— Прыязджай да нас, Наташа,— папрасіў Алымбек.— Я цябе на самую высокую гару завяду.

Алымбек ніколі не быў на вяршынях гор, нават на тых, што побач з яго садзікам, у родным кішлаку. Горы здаваліся яму недаступнымі, таямнічымі і страшнымі. Цяпер, пабыўшы на Кургане Славы, Алымбек бачыў сябе разам з Наташай на вяршыні самай высокай гары.

1980

МАКАР ПАСЛЯДОВІЧ

(нарадзіўся ў 1906 г.)

СТО ЧАЦВЁРТЫ КВАРТАЛ

Адшумеў, адспяваў свае песні сто чацвёрты квартал... Так сказаў наш настаўнік Аркадзь Пракопавіч. Ён заўсёды гаворыць хораша. Але цяпер нам зрабілася неяк вельмі сумна...

А пачалося ўсё ў марозную раніцу. Я збіраўся ў школу і раптам пачуў, што каля нашай хаты прыпынілася легкавая машына, якую чамусьці называюць «козлікам». З машыны вылезлі лясніч Пятро Максімавіч, поўны, ружовашчокі мужчына, і другі, невядомы мне чалавек. Гэты чалавек у чорным доўгім кажусе і коцікавай вушанцы быў, можа, на цэлую галаву вышэйшы за лясніча. Перад тым як зайсці ў хату, прыезджыя прыпыніліся. Лясніч паказаў рукою на бор і нешта пачаў тлумачыць чалавеку ў коцікавай вушанцы. Я ўбачыў праз акно, як высокі крыху нават схіліў набок галаву, нібы яму было так лепш слухаць. Яго буйны твар, доўгі цяжкі нос і вялікія цёмныя вочы здаліся мне крыху знаёмымі. Дзе я мог бачыць гэтага чалавека? Праўда, як я помніў, ён ні разу не заходзіў у нашу хату. Пятро Максімавіч заязджае часта. Часта наведваюць нас паляўнічыя, рыбаловы. Я сябраваў з імі, выбягаў ім насустрач, каб адчыніць вароты для аўтамашыны ці матацыкла. Ведаю я і інжынера-інспектара па ахове прыроды — дзядзьку Косцю. Ух і баяцца ж яго браканьеры! У час

вайны дзядзька Косця быў ваенным лётчыкам. Ваяваў з гітлераўцамі недзе каля Мурманска. І ўсё, што дзядзька Косця расказваў, застаўшыся начаваць у нашай хаце, было надзвычай вельмі цікава.

Дзядзька Косця такі ж высокі, як і гэты незнаёмы чалавек. Такія ж у яго шырокія плечы. На ім у благое надвор'е заўсёды скураное паліто, палявая сумка і стары лётчыцкі шлем.

— Тата,— гукнуў я ад акна бацьку.— Прыехаў ляснічы.

— Ну што ж, прыехаў дык прыехаў,— адказаў, падыходзячы да акна, бацька.— Ого, і купец з ім. Ну, відаць, хутка тут усё загрыміць і загудзе...

Тым часам прыезджыя прамільгнулі за акном, якое выходзіла на двор, і неўзабаве затупацелі на ганку.

Як я заўважыў, бацька не асабліва ўзрадаваўся гэтаму ранішняму візіту. Ён прывітаўся з прыезджымі, паціснуў аднаму і другому руку, але зусім не ўсміхаўся, зусім не спяшаўся запрасіць гасцей сесці. Твар у яго быў нейкі напружаны, і ў добрых сініх вачах яго я не бачыў ніякай ласкавасці.

— Апранайся, Мікалай Данілавіч,— ціха прамовіў ляснічы.— Васіль Майсеевіч хоча зірнуць на сто чацвёрты квартал.

— А чаго яго там глядзець? — глуха адказаў бацька.— Калі ёсць пастанова зводзіць няспелы лес, дык можна было адразу ляцець туды з электрапіламі і аўтапрычэпамі!.. Вы самі казалі, што сто чацвёртаму трэба яшчэ расці не менш як дзесяць год!

— Пра што ён гаворыць? — кіўнуўшы на майго бацьку галавою, запытаўся ў ляснічага Васіль Майсеевіч.— Хіба ў лясгасе сядзяць неразумныя

людзі, якія не ведаюць сваёй гаспадаркі? Хіба краіне ўжо не патрэбна драўніна?

— Краіне ўсё патрэбна. Але добры гаспадар заўсёды чакае, калі яблыкі паспеюць, а не акалочвае іх зялёнымі. Усюды мы крычым, што трэба берагчы лес, гадаваць яго да поўнай спеласці, не падпускаць браканьераў да жывога дрэва. І адразу ж забываемся на свае пропаведзі! Самі іх парушаем, як самыя злосныя парубшчыкі!

Васіль Майсеевіч ступіў да майго бацькі, узяўся за гузік яго пінжака і загаварыў, пазіраючы вока ў вока:

— Люблю такія размовы, мой сынок. Ты разважаеш правільна, як сапраўдны гаспадар. Толькі, я сказаў бы, трошкі аднабока. З-за сваіх кварталаў ты не бачыш вялікіх рыштаванняў нашай краіны. Мне здаецца, ты нічога не чуў і не ведаеш пра Салігорскія шахты, Бярозаўскую электрастанцыю, Полацкі нафтаперапрацоўчы завод. Табе няўцям, што будуецца ў Баранавічах, у Гродна.

— Бачыце, Васіль Майсеевіч,— заступіўся за майго бацьку ляснічы.— Са сто чацвёртым кварталам у Мікалая Данілавіча звязана шмат асабістага... Я вам ужо расказваў пра тайнік каля старога дуба. Потым апошні бой з гітлераўцамі. Такое ніколі не забываецца, пакуль чалавек дыхае...

— Ну дык і што?— нецярпліва адказаў Васіль Майсеевіч.— Мы, здаецца, дамовіліся, што дуб застаецца? Няхай сабе вартуе Міколаў тайнік хоць тысячу год. Пайшлі.

Чалавек у чорным кажусе спяшаўся. Калі ўсе мужчыны выйшлі з хаты і селі ў машыну, я запытаўся ў маці:

— А хто гэты Васіль Майсеевіч?

— Дырэктар леспрамгаса,— адказала маці.— Абыдзе дзялянкі, агледзіць дарогі ды прышле сюды лесавозы.

Адшумеў, адспяваў свае песні сто чацвёрты квартал...

Так сказаў былы партызан Аркадзь Пракопавіч, наш настаўнік.

Мне таксама шкада было прывычна дарагога бору. Не раз бачыў я тут ласёў. Некаторыя з іх не вельмі палохаліся людзей. Аднойчы здаравенны лось з цяжкай каронай на галаве бязбоязна выйшаў са сто чацвёртага квартала і неўзабаве апынуўся каля калгаснага статка. Бліжэйшыя да ляснога асілка каровы нават перасталі скубці траву і паднялі галовы. А лось стаяў, выцягнуўшы шыю і ледзь паварушваючы ганарыстай гарбатай мызай, нібы гаварыў: «Глядзіце, які я прыгажун! Усе глядзіце!»

Потым ён нават паспрабаваў паласавацца травою пашы. Але, відаць, яна яму не спадабалася на смак, бо лось нездаволена памыляў губамі і, не спяшаючыся, падаўся ў хмызняк.

А колькі было ў сто чацвёртым чарніц, там, дзе раслі елкі! А баравікоў на сасновай градзе! Пад восень палянкі аж гарэлі ад брусніц. Усюды звісалі цяжкія гронкі рабін, рубінавыя чапцы каліны, з якіх, здавалася, вось-вось пырсне церпкі сок... А якія вялікія арэхавыя шышкі рвалі мы з ляшчынніку! Які ты быў шчодры на пацеху людзям, сто чацвёрты квартал! Які ты быў шумны і вясёлы, калі толькі адтайвала зямля і на бярозках з'яўляліся першыя, яшчэ празрыстыя зялёныя лісткі! Дзе яшчэ так наўзахапкі могуць спяваць салаўі і задзірыста цокаць вавёркі!

Цяпер гэтага нічога не будзе.

На другі дзень пасля прыезду дырэктара леспрамгаса з'явіліся лесарубы. Яны прывезлі

з сабою паходную электрастанцыю, разматалі і расцягнулі на белым снезе чорныя тоўстыя жылы правадоў, падключылі да іх пілы. Густа пырснулі жоўтыя іскры пілавіння. І неўзабаве першая сасна з глухім стогнам грымнулася сваёй зялёнай галавою на белую зямлю.

Крышку пазней, ляскаючы стальнымі тракамі гусеніц, прыйшоў у сто чацвёрты тралёвачнік, за ім аўтакран, цяжкія лесавозы. Вяртаючыся са школы, мы падоўгу разглядалі магутныя машыны, даверху нагружаныя стваламі сосен і елак. Ад іх хады ўздрыгвала і ўгіналася дарога.

Усё грымела і трашчала ў сто чацвёртым квартале. Адна за адною падалі сосны, елкі, бярозы. Густыя дымы ад лаўжоў часам уздымаліся вышэй лесу, а часам, калі дзьмуў моцны вецер, плылі над зямлёю амаль да самай вёскі. Тады настаўнік Аркадзь Пракопавіч паволі падыходзіў да акна і, нібы забыўшыся на свой урок па геаграфіі, доўга ўглядаўся ў бок ахутанага дымам сто чацвёртага квартала. Аднойчы ён нават не заўважыў, што самы гультай і хлус Грышка Бабыр, выкліканы да карты, пачаў плесці кашалі з лапцямі пра галоўныя рэкі Афрыкі, зблытаў Ніл з Амазонкай. Увесь клас так зарагатаў, што Аркадзь Пракопавіч аж уздрыгнуў.

— У чым справа? — ідучы да стала, строга запытаўся настаўнік.— Чаго яны, Грыша, смяюцца?

— Я, Аркадзь Пракопавіч, адказваў урок і нічога не ведаю,— бойка прамовіў Грышка і з уздымам працягваў: — Пасля Вікторыі самы вялікі вадаспад у Афрыцы Ніягара...

— Хвіліначку,— перапыніў натхнёныя Грышкавы байкі Аркадзь Пракопавіч.— Хто падкажа, які самы буйны вадаспад Афрыкі?

Угору дружна шугануў лес рук.

— Антон Радзеўскі,— выклікаў мяне настаўнік.

Я падхапіўся і адказаў:

— Вікторыя, Аркадзь Пракопавіч! А вадаспад Ніягара знаходзіцца ў Паўночнай Амерыцы.

— Правільна. Сядай. Сядай і ты, Грыша. Дрэнна, калі чалавек не запамінае нават самага галоўнага. Вашы настаўнікі, і я ў тым ліку, таксама былі калісьці вучнямі. Але я не магу ўявіць, як можна забываць такія простыя рэчы, што да ўрокаў трэба рыхтавацца добрасумленна. Гэта ж вы робіце для саміх сябе...

Трэба сказаць, што гэта была для Грышкі не першая лекцыя аб карысці ведаў і навукі. Ён пакорліва выслухваў словы настаўніка, а сам тым часам, відаць, думаў пра іншае. Усе славутыя рэкі, шалёныя вадаспады, страшныя львы і кракадзілы былі недзе далёка, за многія тысячы кіламетраў ад родных Навасёлак, а ўсё цікавае, што ён мог убачыць альбо выкарыстаць на сваю пацеху,— тут, побач!

Перад заняткамі і на перапынках Грышка расказваў, што і як робіцца ў сто чацвёртым квартале. Хваліўся, нібыта лесарубы нават давалі яму электрапілу, і ён лёгенька, ну, проста гуляючы, абваліў дзве тоўстыя яліны. За адзін учарашні дзень Грышка паспеў пабываць у кабіне магутнага тралёвачнага трактара і пакіраваць лесавозам. Грышка ўжо ведаў, як завуць машыніста паходнай электрастанцыі і брыгадзіра лесарубаў. Усе яны простыя людзі і не саромеюцца часам запытацца ў яго, Грышкі, у які бок лепш валіць тое ці іншае дрэва... Мінула яшчэ два дні, і Грышка, сам сябе залічыўшы ў лесарубную брыгаду, ужо расказваў, што работы ў сто чацвёртым квартале ідуць паспяхова.

— Толькі за адзін учарашні дзень мы пагрузілі і адправілі на станцыю цэлую гару кубікаў,— тлумачыў нам Грышка.— Заўтра я паеду пасля ўрокаў са Сцёпкам на станцыю і пагляджу, як ідзе пагрузка ў вагоны...

— А хто такі Сцёпка? — нясмела запытаў нехта з хлопцаў.

Грышка пагардліва цыркануў слінай праз зубы.

— Адразу відаць — цемната. Сцёпку ўсе лесарубы ведаюць. Калі ўбачыш машыну БН дзевяноста чатыры — сорак тры, дык ведай, што на ёй едзе Сцяпан Іванавіч Маладзік. Але мы, лесарубы, называем яго проста Сцёпкам.

Мінуў тыдзень грукату і шуму ў сто чацвёртым квартале, і Грышка, азірнуўшыся, нібы баючыся, каб яго часам хто не падслухаў, паведаміў хлопцам:

— Вы чулі, што робіцца ў лесе?

— Не-е...

— Поўная аварыя! — зашаптаў Грышка.— Усе электрапілы выведзены са строю.

— Мані больш! — не стрымаўся я.— Вельмі шмат ты пра ўсё ведаеш!

— А от жа і ведаю! Вы бачылі калі-небудзь такія цацкі?

Грышка сунуў у кішэню руку і дастаў адтуль некалькі звенняў з ланцужка электрапілы. Амаль усе пласцінкі стальных зубоў былі пакрышаны альбо звахтаваны. Грышка тым часам яшчэ папароўся ў сваіх кішэнях. На далоні ў яго апынуліся два рудыя асколкі.

— Ну, хто здагадаецца, што гэта такое?..

— Дай сюды,— працягнуў я руку.— Гэта асколкі міны ці бомбы. Дзе ты іх узяў?

— Выкалупаў з аднаго камля. Там ёсць такія жалязякі, што, можа, па кілаграму важаць! Як

толькі піла чыркане па ім — канец! Дзы-ын, і зубоў няма! Вось як на гэтых звеннях. Васіль Майсеевіч загадаў прыпыніць атаку на сто чацвёрты і тэрмінова правесці разведку...

Грышка ведаў усё, апрача таго, што яму патрэбна было ведаць у першую чаргу. Таму ў яго дзённіку апынулася чарговая тройка, а ў руках Аркадзя Пракопавіча — некалькі звенняў электрапілы і два злашчасныя асколкі, якімі мы забаўляліся ў час урока.

— Там, у сто чацвёртым, шмат гэтага ліха,— сурова пачаў Аркадзь Пракопавіч, кідаючы на стол асколкі.— Бадай, ці знойдзецца хоць адно дрэва, у якім не засела б жалеза. Гітлераўцы стралялі па сто чацвёртым з кулямётаў, закідвалі яго мінамі. Потым наляцелі самалёты і пачалі валіць бомбы. Усе палянкі, якія вы там ведаеце,— на месцы вырваных з карэннем альбо перабітых дрэў. Праўда, бацька Тоніка, Мікалай Данілавіч, навёў там пасля вайны парадак. Пазразаў знявечаныя дрэвы, прыбраў завалы, засыпаў і зараўняў варонкі. А вось асколкаў не мог выбраць. Сотні, а можа, і тысячы іх паўпіваліся ў дрэвы ды там і засталіся. А няма для пілы большага ворага, як жалеза ў калодзе ці дошцы... Я хачу расказаць вам, якім добрым другам для нас і грозным ворагам для чужаземных захопнікаў быў сто чацвёрты квартал у час вайны. Там, пад густымі шатамі сосен, адбываліся сустрэчы падпольшчыкаў і іх сувязных з партызанамі. Там, каля старога дуба, у гушчары маладых елачак, Тонікаў дзед Даніла Карпавіч зрабіў тайнік, у які прыносілі батарэі для партызанскіх прыёмнікаў і радыёперадатчыкаў, патроны, толавыя зарады, вінтоўкі, кулямёты. У цяжкую хвіліну верныя людзі, падняўшы добра замаскіраваную накрыўку, знаходзілі там дарагія тады запасы солі, хле-

ба, сала... Маглі нават адпачыць, не апасаючыся ворага...

Аркадзь Пракопавіч змоўк і паволі падышоў да акна, з якога быў відаць лес. Там сёння ўсё заставалася нерухомым. Не віліся ў неба дымы, не падалі на дол дрэвы, не пад'язджалі на пагрузку лесавозы. Відаць, усё, пра што расказаў Грышка, была чыстая праўда. Лесарубы, напэўна, рамантуюць свае пілы альбо перайшлі ў іншае месца, дзе няма гэтых праклятых слядоў вайны. Аркадзь Пракопавіч адвярнуўся ад акна і загаварыў зноў:

— Сто чацвёрты квартал лічыўся ў нас нібы варотамі ў партызанскую зону. Увесну тысяча дзевяцьсот сорак трэцяга года гітлераўцы прарваліся ў нашу вёску. Праўда, усе людзі, папярэджаныя партызанамі, паспелі схавацца ў лесе. Карнікі знайшлі толькі пустыя двары і адразу ж, як гэта яны рабілі ўсюды, пачалі падпальваць хаты і хлявы...

Потым Аркадзь Пракопавіч расказаў пра шматлікія атакі гітлераўцаў на сто чацвёрты квартал. Спярша яны ішлі адкрыта, у поўны рост, з аўтаматамі і кулямётамі. Некаторыя салдаты вялі на павадку сабак аўчарак. Метраў за дзвесце ад лесу гітлераўцы, не прыпыняючыся, распачалі шалёную страляніну. Трэба было мець вялікую храбрасць, жалезную, як сказаў Аркадзь Пракопавіч, вытрымку, каб сядзець у акопах і падпускаць ворага ўсё бліжэй і бліжэй. І сярод тых, хто не спалохаўся, не падаўся баязліва ў гушчар, былі мой дзед і мой бацька. Яны павінны былі затрымаць наступленне немцаў, прыкрыць адыход жанчын і дзяцей у глыбіню лесу, забяспечыць спакойную пераправу іх цераз раку, за якою знаходзіліся галоўныя партызанскія сілы. Гітлераўцы былі ўжо за сто крокаў, калі

партызаны адкрылі прыцэльны агонь, які ашаламіў гітлераўцаў. Фашысты пападалі на зямлю, жывыя пачалі адпаўзаць назад. Адступіўшы за вёску, гітлераўцы распачалі шалёны мінамётны абстрэл сто чацвёртага квартала. За дзень партызаны адбілі тры атакі, знішчылі шмат захопнікаў. Пяць партызан загінула ў няроўным баі. Сярод іх і мой дзед Даніла, кулямётчык. У нашай хаце вісіць яго партрэт. Дзед вельмі падобны на майго тату. Побач з партрэтам вісіць такі ж партрэт бацькі, дык здаецца, што гэта не бацька і сын, а два браты...

За той бой у сто чацвёртым квартале бацька мой быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У яго ёсць яшчэ ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, але гэтую ўзнагароду ён атрымаў пасля вайны за добры парадак у лесе.

Тата мой чамусьці не любіць расказваць пра вайну, Грышкаў бацька, дзе толькі збяруцца людзі, заўсёды хваліцца, якога пытлю даваў ён гітлераўцам. Відаць, Грышка па ім удаўся. А мой тата найбольш слухае, што гавораць людзі. Ён кожны дзень заглядае ў мой дзённік і пасля ляпае мяне сваёй добрай рукой па плячы і гаворыць:

— Ты ў мяне сапраўдны мужчына! Сапраўдны партызан!

Так было і той раз. Праверыўшы дзённік, бацька прапанаваў:

— Давай, брат, сходзім у сто чацвёрты. Паглядзім, што там зрабілі за дзень нашы лесарубы.

Работы ў сто чацвёртым зноў аднавіліся. Але я не ўбачыў тут ніякай электрастанцыі з доўгімі жыламі правадоў, не было ўжо і электрапіл. Бацька сказаў, што лесарубы атрымалі больш дасканалы інструмент — пілы з бензінавым рухавіком. Яны куды зручнейшыя за электрапілы.

Апрача таго, рабочыя атрымалі колькі трэба запасных пільных ланцугоў. Як толькі тая ці іншая піла выходзіла ад жалезных асколкаў са строю, на яе хутка ставілі новы ланцуг і падразалі дрэва з другога боку.

Сто чацвёрты квартал, як сказаў бацька, выразаўся не ўвесь. Была адведзена паласа толькі на сто метраў шырынёю. Астатні лес пакуль што павінен расці. Ну, а свежую высечку, як толькі растане снег і прагрэецца зямля, з краю ў край запоўняць маладыя сасонкі. Будзе ўвесну тут работы і нам, школьнікам! У гадавальніку недзе спяць пад снегам тысячы і тысячы двухгадовых сасонак. Мы павінны перасадзіць іх сюды, на іх сталае месцажыхарства. Каб зноў зашумеў і заспяваў высокі бор.

Бацька расказваў мне, колькі пойдзе з гадавальніка каліваў на пасадку, і вочы ў яго былі такія цёплыя, такія ласкавыя. І раптам яны спахмурнелі і адразу зрабіліся жорсткімі. Дастаўшы з-за пояса сякеру, ён хутка і злосна пачаў абсякаць кару са свежага яловага пня. Сякера мільгала ў паветры, як маланка.

— Глядзі там, можа, яшчэ дзе застаўся неакараны пень? Гэта ж самае гняздо для лясных шкоднікаў.

— Вунь яшчэ адзін! — узрадавана закрычаў я, нібы знайшоў вялікі скарб.

— Радасць тут невялікая,— панура прамовіў бацька.— Ніяк не прывучыш хлопцаў, каб не праміналі ніводнага пня, каб рабілі ўсё як след. Ім абы хутчэй і — бывайце здаровы. Нібы гэта не наш, не дзяржаўны лес. Во, і галлё не чыста падабралі!.. Нясі яго на агонь!..

Бацька акуратна сабраў у прыпол абсечаную з пня кару і падаўся да лесарубаў, якія кідалі ў агонь ацярэбленае голле.

З вёскі, віхляючы па снежнай дарозе, у сто чацвёрты імчалася легкавая машына. Неўзабаве яна спынілася непадалёку ад лесарубаў, і з яе вылезлі наш ляснічы Пятро Максімавіч і дырэктар леспрамгаса, які ў першы свой прыезд сказаў бацьку, што ён далей сваіх кварталаў нічога не бачыць. Дырэктар чамусьці не адыходзіў ад машыны, а, трымаючы дзверцы расчыненымі, зазіраў у сярэдзіну «козліка». Адтуль паказаўся стары лётчыцкі шлем, скураное паліто...

— Дзядзька Косця! — не стрымаўся я.— Дзядзька Косця!..

— Здарова, Тонік! — прабасіў дзядзька Косця і памахаў мне рукою.— Ты што тут робіш? Хочаш, каб я і цябе запісаў у пратакол за парушэнне закону аб ахове прыроды? Пра тое, што робіцца ў сто чацвёртым квартале, ведаюць ужо ў Мінску. Малайчына твой бацька, ведае, куды пісаць! Сто чацвёрты яшчэ будзе красавацца не менш як дзесяць год. Такі загад са сталіцы. А вы, Васіль Майсеевіч, не крыўдуйце. Вам знойдуць больш прыгодныя дзялянкі, і там, калі ласка, бушуйце хоць з атамнымі піламі.

Ух і малайчына дзядзька Косця! Наш дзяржаўны інжынер-інспектар. Мой бацька, як высветлілася тут, таксама інспектар. Толькі не інжынер-інспектар, а грамадскі інспектар па ахове прыроды!

Вясною ўся школа выйшла на пасадку лесу. Да нас прыехаў ляснічы Пятро Максімавіч, дзядзька Косця. Яны заставаліся ў нас, пакуль мы не перасадзілі ўсіх сасонак. Мне здавалася, што ніколі мой бацька не быў такім вясёлым, як у тыя дні.

Можа, гэта таму, што вакол было шмат сонца, цяпла, ці, можа, таму, што сярод лысых пнёў зелянелі тысячы і тысячы кволых сасонак, з якіх

вырастуць прыгожыя меднаствольія сосны. Бор! Такі ж, як той, што стаіць побач і ўвесь аж звініць ад свежых птушыных галасоў.

— Тата,— сказаў я свайму бацьку, калі мы пасадзілі апошняе дрэўца.— Я хачу, усе нашы хлопцы хочуць, каб ты паказаў нам партызанскі тайнік.

— Ага, дзядзька Коля, пакажыце! — закрычалі, абступіўшы бацьку, мае таварышы.

Бацька адразу спахмурнеў, але прагаварыў нейкім прачулым голасам:

— Не магу, дарагія дзеткі!.. Я яго разбурыў і зараўняў тую мясціну адразу пасля вайны. Каб хто часам не ўваліўся і не пакалечыўся, калі прагніе насціл. Хадзем, я пакажу толькі тое месца. Ну, а што мы там хавалі, вам ужо расказваў Аркадзь Пракопавіч, мой былы камандзір...

1964

УЛАДЗІМІР ПАЎЛАЎ

(нарадзіўся ў 1935 г.)

КОЛЬКІ ГУСЕЙ УБАЧЫЎ ЯЎСЕЙ?

На Беларусі
Ляцелі гусі.
Малы Яўсей
Убачыў гусей.
І столькі многа,
Здзівіўся што:
— Ой, гусі, гусі,
Вас, мабыць, сто?!
Важак малому
Тады ў адказ:
— Правільна злічыш
Усіх ты нас,
Калі дадасі
Яшчэ столькі,
Паўстолькі,
Чвэртку столькі
Ды разам з намі
Сам паляціш.
Тады і будзе
Што-нішто,
А роўна сто!

Колькі гусей
Убачыў Яўсей?

1980

ПІЛІП ПЕСТРАК

(1903—1978)



АЎДОЦЦЯ І ЯЕ ЎНУЧАК

І нашто такое харство на свеце? Сонца ўзышло над лесам вогненнае, трапяткое... Лес ціхі, бадзёры, свежы. Кожны лісточак на дрэве п'е росную свежасць ранку. А сіняя дымка тонка спавівае ўвесь лес, які непраглядную гушчынёю абступае вёску.

Нашто такое харство? Нашто яно, калі ў хаце на лаве сядзіць старая Аўдоцця і ціха плача. У печы палаюць дровы. Хата і сенцы чыста падмецены. Дзверы парасчынены насцеж. На ложку каля печы відаць з-пад коўдры русая галава хлопчыка. Гэта ўнучак Аўдоцці. Хлопчык, прыпаўшы да падушкі, спіць так соладка, што здаецца, і не дыхае. Аўдоцця час ад часу паглядае на яго і ціха выцірае слязінку за слязінкай канцамі хусткі.

Неяк незвычайна ціха ўсюды: не чуваць ні мычання кароў, ні бляяння авечак. Толькі часам убяжыць у сенцы певень і, асцярожна зірнуўшы адным вокам у хату, палахліва адскоквае.

Але гэта мо так здаецца Аўдоцці, што ўсюды ціха? Яна толькі ўчора цёмным вечарам прыйшла дадому. Два тыдні хавалася ад немцаў. Пачула, што яны забілі нявестку, вывеўшы за калгасны хлеў, што сын-партызан Кастусь прыходзіў дадому, але ўцёк, падстрэлены, у лес, і рашыла вярнуцца дамоў.

«І вось няма сям'і. Што цяпер будзе? Галава ты мая няшчасная!»

Ад старасты прыйшоў суровы наказ Аўдоцці — з'явіцца ў жандармерыю. Яна насіла партызанам есці ў лес. Нечае варожае вока падгледзела, і паліцыя шукала старую Аўдоццю.

Аўдоцця ўстала з лавы, глянула ў печ, адсунула вілкамі ад агню гаршчочак з маладою бульбай, які пачаў закіпаць, і выйшла ў сенцы.

Глянула на свет, і сэрца заныла ад болю. Дымы з комінаў — гэтыя свежыя дымы — напомнілі ёй аб іншым. Прад вачыма ўявілася поле. У якой буйной расе цяпер стаіць нерухома залатое жыта, якое просіць сярпа! І занылі рукі Аўдоцці па працы. Як жа прайшлася б яна цяпер расянай дарожкай па вільготным пясочку, як бывала, калі ўсё табе ўсміхаецца — і поле, і лес, і неба. Недзе срэбнымі званочкамі пераліваецца па лесе песня дзяўчат. Усе спяшаюцца на поле, усе бадзёрыя, смяюцца, жартуюць, і здаецца, што сонца і лес красуюць толькі для іх.

А цяпер? Не чуваць ні смеху, ні песень. Маўчыць лес. Аўдоцця, сумная, вярнулася ў хату. Заплакала на ўвесь голас, заліўшыся гарачымі слязамі.

«І нашто такое харство на свеце? Для каго яно цяпер? Для злыдняў? Ворагаў ліхіх? Хай бы лепш спусцілася вечная ноч, то лягчэй было б...»

Ад зычнага плачу Аўдоцці прачнуўся Юрачка.

— Чаго ты, бабка, плачаш?

— А як жа, унучак, не плакаць... А ты спаў бы яшчэ, спі... Яшчэ рана. Зараз зварыцца бульба, я цябе збуджу.

Але Юрачка не мог спаць... Ён ляжаў, і сумна рабілася яго дзіцячаму сэрцу. Юрачку восьмы год. Ён шмат разумее. Ён плакаў па маме дзень і ноч, і ніхто не мог яго ўцешыць.

Яго дзіцячыя, заўсёды жывыя вочы былі цяпер сумнымі, сур'ёзнымі.

Ён устаў, апрануўся і пайшоў да вядра з вадою, каб памыцца, як вучылі яго тата і мама.

Бабка Аўдоцця наліла яму кубачак пазычанага малака (іх карову забралі паліцаі), насыпала бульбы ў міску. Сталі есці абое. Аўдоцця праганяла бульбу вадою.

«І што цяпер рабіць? Ці ісці на поле жыта жаць, ці павесіцца дзе на суку?»

Цяжкія крокі пачуліся на падворку, і ў хату ўвайшоў староста. Даў «добры дзень». Боты скрэблі на падлозе, пакуль дайшоў да лавы і сеў. Вачыма ўскідваў на Аўдоццю і Юрачку, соп у нос, скручваючы цыгарку. Усе маўчалі.

Аўдоцця чакала. Пусціўшы клубок дыму і закідваючы нагу на нагу, староста прамовіў:

— Учора прыйшла?

— Учора.

— Дзе была? У сястры?

Аўдоцця ўскінула вачыма на старасту, думаючы, сказаць ці не.

— Які там чорт — у сястры? Збірала кожны дзень ягады ў лесе і насіла ў мястэчка прадаваць. А цяпер прыйшла дадому, бо фашысты гвалтам адбіраюць ягады, абы толькі хто з'явіўся ў мястэчка.

Староста пляснуў губамі і заварушыўся на месцы.

— Гм... Дык вось што... Ёсць строгі наказ табе, каб з'явілася ў жандармерыю.

— А чаго я туды пайду? Чаго я там не бачыла?

— Чаго — я не ведаю, не мая справа. Мне загадана цябе паслаць. Не пойдзеш — будзе горш.

— Нікуды я не пайду. Хай ідуць і забіваюць тут. Забілі ж нявестку... Іх жа ўлада.

— Хто цябе там будзе біць? Каму ты патрэбна? Каб хацелі забіць, то прыехалі б і забілі. А калі патрабуюць, каб ты прыйшла, значыць, толькі на які-небудзь допыт.

Стараста кінуў недагарак цыгаркі, устаў, ступіў пару крокаў да парога і, аглянуўшыся, буркнуў цераз плячо:

— Каб я больш не хадзіў... Ясна?..

Аўдоцця сурова глянула на старасту.

— Яшчэ і як ясна... Ясней быць не можа.

— Ну, то глядзі,— буркнуў зноў стараста і выйшаў з хаты.

Аўдоцця жавала бульбу і аб нечым ціха думала. А пад грудзі лезла трывога. Яна праймала сэрца. У які-небудзь соты раз змушала ўсведаміць сабе, што сталася з жыццём і з усім светам.

Яна баялася глянуць на Юрку, а той напружана сачыў за сваёй бабкай, як бы намагаючыся адгадаць яе настрой, яе намеры.

Дапіваючы малако, Юрка нарэшце спытаў:

— То пойдзеш, бабка, ці не?

Аўдоцця не адразу адказала. Працягнула руку да міскі, каб узяць бульбіну... Мімаволі глянула ў акно, зусім спакойна, як заўсёды, і нарэшце знайшла ў сабе сілу сказаць суровым тонам:

— А цябе з кім пакіну, Юрачка?

Юрка апусціў вочы і ціха сказаў:

— Я не хачу адзін заставацца...

— Вось у тым-то і рэч, унучак...— як бы сама сабе сказала Аўдоцця.— Што ж... пойдзеш са мною. Будзем разам. Будзеш бачыць і чуць, што са мною будуць рабіць злыдні. Як мяне не пусцяць дахаты — прыйдзеш і раскажаш людзям аба мне. Цябе яны, можа, не крануць...— Аўдоцця змоўкла, стрымаўшы гарачую слязу: «Раз яны самі выклікаюць у раён, значыць, можа, адпусцяць».

Уздыхнуўшы лягчэй, яна ўстала. Прыбрала міску са стала, змахнуўшы ў яе крошкі.

— Ну, Юрачка, абувайся, пойдзем...

Затым адчыніла скрыню, стала перабіраць рэчы. Дастала новую спадніцу, новы каптан і жоўтую хустку з вішнёвымі кветкамі. У скрыні ляжала і адзежа нявесткі. Патрымала яе ў руках, паківала галавою.

— Ох, мая саколка... не будзеш больш убірацца...

Выняла кніжкі сына, паглядзела і палажыла назад.

«Нічога больш не трэба... Ўсё злыдні патаптралі...»

Пырснула сабе вады на твар, уцерлася, умыла ўнучка, стала апранацца. Завязваючы хустку, нават зірнула ў люстэрка.

У апошнюю хвіліну паглядзела, ці ўсё ляжыць на сваім месцы ў хаце. Падкінула пад печ апошняе палена дроў, лепш павесіла ручнік, паправіла коўдру на ложку і толькі тады пайшла за парог. Юрка падаўся за ёй.

Замкнуўшы дзверы на ўнутраны замок, яна паклала ключ пад страху.

Сонца паднялося над лесам, але пясчаная дарога была яшчэ сырой. Хутка выйшлі з вёскі. Ішлі праз сасновы лес, дзе шчабяталі птушкі. А потым міналі верасовыя паляны са старымі бярозамі.

Гэтыя дзве постаці — адна большая, а другая маленькая — здаваліся ціхімі, згубленымі ў велічы лесу.

Адзінока і ціха плывуць думкі Аўдоцці, палахліва бягуць дзіцячыя думкі Юркі.

Хоць няма ветру, а ўсё роўна лес шуміць. Ён шуміць аднастайна, роўна, пявуча. Потым гэты шум пераходзіць у цягучы тонкі звон. Ён,

здаецца, і вядзе за сабою падарожных далёка-далёка...

Многае праплывала ў галаве Аўдоцці. І маладосць яе, і старасць.

Як чабаровыя кветкі пры дарозе, так смяяліся некалі яе вочы. Мяккі мох пад нагамі... З ёю Ігнат... Яны бегаюць па лесе... У яе распушчаныя валасы... звонка нясецца іх раскацісты смех у гушчыні...

— Ах, Ігнат, Ігнат, шчаслівейшы ты за нас, ляжыш у сырой зямлі і нічога не бачыш,— гаворыць сама сабе Аўдоцця.

— Што ты, бабка, гаворыш?

— А, так сабе... Вось бачыш гэтую яму?— ткнула Аўдоцця пальцам убок.— Як я ехала вянчацца з тваім дзедам Ігнатам, то былі вывернуліся ў яе.

Ледзь прыкметная ўсмешка заблукала на вуснах Аўдоцці, і вочы жыва глянулі ўдаль.

— Коні неслі нас тады, як віхор,— дакончыла Аўдоцця і задумна змоўкла...

— Як твая мама цябе нарадзіла,— зноў пачала яна ўспамінаць,— быў такі самы ранак, як сягоння... Помню, ездзілі па дохтара ў мястэчка для мацеры і для цябе, бо ты быў слабенькі. Дохтар сказаў выносіць цябе на паветра. І я ішла палоць лён вось гэтай дарожкай, несучы цябе на руках. Ты спаў і дыхаў вольна. Аж бачу — зусім недалёка наперадзе выбег на дарогу воўк... Такі сівы, стары, калматы... Я стала, атрупянеўшы... Што рабіць? Ісці назад боязна, каб не пагнаўся, ісці наперад немагчыма... І я стаяла... Глядзела на ваўка, а ён на мяне... Я прасіла бога, каб ён адвярнуў яго ад нас. Воўк стаяў, стаяла і я... Ты прачнуўся і стаў плакаць тоненькім галаском... І сталася дзіва, унучак, воўк адвярнуў ад нас сваю калматую галаву і трухам пабег у лес.

Я пачакала трохі і пайшла далей. Ішла не сваімі нагамі, нейкі вецер мяне нёс... Я думала: «Што ж гэта сталася ваўку, што ён пабег у лес?» Я здагадалася... Мусіць, воўк пашкадаваў цябе, калі пачуў твой тоненькі галасок...

Аўдоцця змоўкла, адганяючы нейкія думкі. Вочы яе сталі злоснымі. Ізноў сама сабе мармытала:

— А цяпер ваўкі не такія, ох не такія... Двухногія...

Цяжкую думу неслі ў сабе Аўдоцця і Юрка. І калі ж будзе той шлях? Стала неяк крыўдна і горка на душы ў Аўдоцці — ці то ад наплыву ўспамінаў, ці то ад таго, што думкі павярнулі да нямілага сягонняшняга дня.

— Ах, хутчэй бы той шлях — можа, лягчэй было б.

А шлях віўся таксама лесам, толькі дзе-нідзе перасякаў прагаліны поля. То ўздымаўся на ўзгорак, то ападаў у даліне, то ўрываўся ў імшары або ў ціхія, паважныя дубровы. Пераразалі яго цяністыя крынічныя рэчкі. На іх былі мосцікі, у некаторых месцах ужо разбураныя. Ціхі, глухі шлях. Не гудуць тэлеграфныя правады — яны вісяць паабрываныя. Людзі цураюцца шляху цяпер. Не чуваць на ім чалавечага гоману. Толькі ідуць па ім маўкліва бабка Аўдоцця і ўнучак Юрка.

Праводзяць іх лясныя шумы, трывожныя неспакойныя шумы. Яны, здаецца, хочуць спытацца ў бабкі Аўдоцці і ўнучка: «Куды ж вы ідзяце, такія адзінокія? Ці вы ведаеце, куды вы ідзяце?» І параіць: «Вярніцеся, вярніцеся...»

...Кастусь прыйшоў у цёмную ноч, калі вёска спала ў мяккай цішыні. У яго за плячыма паблісквaў аўтамат. Ягоныя чатыры таварышы, таксама ўзброеныя аўтаматамі, ішлі за ім. Прыпыніліся

на сярэдзіне вуліцы, якраз там, дзе яе перасякала дарога. Паглядзелі ва ўсе бакі. Цішыня, нікагуткі.

— Самы добры час,— сказаў Кастусь.— Ідзіце. Пяты дом ад вугла на левым баку вуліцы. Толькі асцярожна. Будзеце пытаць Сцяпана Кавальчука. Двое пойдуць у хату, а двое застануцца на двары. Ідзіце, а я падыду да сваёй хаціны.

Яны разышліся ў процілеглыя бакі.

Кастусь ішоў, і яго сэрца напаўняла не то радасць сустрэчы, не то нейкая трывога.

Вось і хата, ахутаная цемраю, таемна ціхая, адзінокая. Весніцы зачынены. У агародчыку вырысоўваюцца з цемры фасольныя тычкі, а ля самага акна пад подыхам вецярка шапоча высокая статная таполя.

Кастусь стукнуў у дзверы. Замкнёны. Падышоў да акна і прыхіліўся да шыбіны. Ніхто не варушыцца ў хаце, ніхто не аклікае, як раней.

Кастусь бліснуў батарэйкай у акно і з трывогаю стаў разглядаць сваю хату. Хата падмецена — усё прыбрана, усё не кранута. Толькі няма нікога.

Кастусь падаўся на вуліцу. Ступіў пару крокаў і прыпыніўся: таполя то зашэпча густа, то сціхне, то нахіліць сваю вострую вяршыню, то зноў яе выпрастае і шуміць неяк трывожна-трывожна...

Кастусь мімаволі заслухаўся. У парывістых шэптах таполі, у яе прылівах трывогі і задумы ён пачуў, што яго маці і сын не вернуцца ніколі...

А праз хвілін дваццаць у густым лесе каля глыбокага рова ля ног Кастуся поўзаў стараста Сцяпан Кавальчук.

У адказ на яго просьбы і прычытанні цішыню лесу злосна прарэзала чарга аўтамата.

1945

ПАЎЛЮК ПРАНУЗА

(нарадзіўся ў 1918 г.)



ВЯСЁЛКА

У сяброўкі Лены
Верачка пытае:
— А чаму вясёлка
Столькі фарбаў мае?

Збажыной лагодна
Зашумела поле:
— Аддаю вясёлцы
Свой зялёны колер.

Гаманілі ціха
На рачулцы хвалі:
— Свой блакіт вясёлы
Мы падаравалі.

Муравей азваўся
І лужок тым часам:
— І я для вясёлкі
Не шкадую красак.

І сказаць нарэшце
Сонца захацела:
— Без мяне б вясёлка
Так не зіхацела.

1976

РУЧАЁК

Нядаўна снег бялеў, іскрыўся,
Мільгалі лыжы і канькі,
Ды ручаёк тут нарадзіўся —
Маленькі, кволенькі такі.

Вясне і сонцу дзеці рады,
Глядзяць на стужку-ручаёк.
Мікола кажа: — Гэй, рабяты,
Я затрымаю, каб не ўцёк.

Пад смех і жарты праз хвіліну
Хлапечай спрытнаю рукой
Пясок зграбае для плаціны
І ручаю гаворыць: — Стой!

А ручаёк і не зважае
На перашкоду і далей
Сабе дарогу прабівае,
Звініць, булькоча весялей.

Бяжыць наперад і наперад.
Вось у лагчыну збег з гары,
Нясе караблікі з паперы,
Чаўны з сасновае кары.

Дужэйшым робіцца, віецца
Між вольх і маладых ракіт.
Маленькім, кволенькім здаецца,
Але праб'ецца да ракі.

1978

ЛЕАНІД ПРОКША

(нарадзіўся ў 1912 г.)

КРЫЎДА

Маці накрычала на Янку і адвяла ў кут:

— Вось тут будзеш стаяць, пакуль не папросіш прабачэння,— сказала сярдзіта і, узяўшы заплаканую Кацю на рукі, пайшла на кухню.

«Якраз, чакайце. Зламала — такі самалёцік. Я тры гадзіны яго клеіў і яшчэ буду прасіць прабачэння? Ніколі! Хоць сто гадоў прастаю»,— абураўся Янка, стоячы ў куце.

Потым прыйшла крыўда: «Ніхто мяне не любіць, не шкадуе. Усе — і тата, і мама — носяць Кацю на руках...»

Да з'яўлення «гэтай агіднай дзяўчынкі» ўвага бацькоў была звернута да Янкі. Хто б ні зайшоў у хату, мама і тата не прамінуць парадавацца: «А наш Янка...» І пачыналася гаворка пра Янку: які ён вершык вывучыў, што ён сказаў дасціпнага, што прыдумаў, як цудоўна ўмее клеіць самалёцікі. А цяпер, калі гэтая адназубая скажа «гу-гу-гу», усе ў захапленні. Падумаеш! Янка можа сказаць не такое — і ніякай увагі.

Калі ім не шкада Янку — хай сабе, будзе стаяць вечна. Памрэ. Вось тады яны пашкадуюць. А прыедзе з вёскі дзед Спірыдон, ён ім дасць. Скажа: «Праз нейкую бяззубую дзяўчынку вы загубілі хлопчыка. Што ён такое зрабіў? Ну, піхнуў яе. Хай не лезе і не псуе добрыя рэчы. Хай паспрабуе сама такое зрабіць!»

А вось бы ўзяць ды ўцячы да дзядулі ў вёску! Дзядуля добры, любіць Янку. І не будзе, узяўшы за вуха, адводзіць у кут. Заўсёды, калі дзед прыязджае, ён прывозіць Янку яблыкі, мёд і гарбузікі. У дзеда сад і вуллі з пчоламі ў садзе. Яны зусім не кусаюцца і носяць мёд у соты. А мёд смачны, асабліва са свежымі агурочкамі...

Дык чаму не перабрацца да дзеда? Да вёскі Загор'е, дзе ён жыве, будзе, можа, сто кіламетраў. Тым лепш. Чым далей ад дому, ад дакучлівай Каці, тым спакайней. І ніхто не будзе ведаць, дзе ён. А дзеда Янка папросіць, каб не паведамляў бацькам...

— Ну, урэшце, ты папросіш прабачэння? — чуе Янка аднекуль здалёку, як праз сон, голас маці.— Ці будзеш стаяць, уткнуўшыся лбом у сцяну? Ну, стой...

Янка і не думае прасіць прабачэння. Лепей пойдзе зараз жа да дзеда, не марудзячы, хоць ужо вечарэе і наперадзе ноч. Яму зараз усё роўна. Якая розніца: загінуць у дарозе ці памерці ў гэтым кутку? Янка незаўважна, ціха, каб не рыпнулі ні дзверы, ні маснічыны, шмыгнуў на вуліцу...

Дарогу ён ведае. Калі не было яшчэ гэтай брыдкай Кацькі, Янка з мамай і татам ездзілі ў вёску да дзеда. У таты быў адпачынак. Ён узяў напракат машыну, і паехалі. Якія гэта былі цудоўныя дні! Тата вёў машыну. Ён умела ёю ўпраўляе, бо сам працуе на аўтарамонтным заводзе.

Янка сядзеў побач з бацькам і глядзеў праз ветравое шкло на дарогу. Яна імчалася яму насустрач праз палі, гаі і лясы з высокімі соснамі. А маці сядзела ззаду і ўсё непакоілася: «Ці добра ты, Міхась, зачыніў дзверцы?» «Ды не бой-

ся...» — адказваў бацька і правяраў дзверцы, каб Янка не вываліўся з машыны.

«Тады яны мяне шкадавалі,— з крыўдай думае Янка,— а цяпер...»

Ідзе Янка па дарозе. Усё на ёй так, як было. І ісці амаль таксама лёгка, як тады, калі ехалі на машыне, і амаль таксама хутка бяжыць насустрач дарога.

Усё ж трэба адпачыць, хоць бы пад гэтай ялінай. Янка апускаецца на зямлю. Здаецца, пад гэтай елкай яны з бацькам знайшлі баравік. Янка першы заўважыў грыб, а татка не ўбачыў. А яго ўбачыць было не дзіва. Вялікі, бронзавага колеру шапка на белай ножцы.

Мама пахваліла:

— Ты вось не заўважыў грыб, а Янка яго знайшоў...

Бацька паціснуў плячыма і сказаў Янку:

— Не заўважыў. Ты ж меншы за мяне. Зямля да цябе бліжэй...

І вось Янка сядзіць пад елкай адзін. Навакол цёмны бор, ціха. Так ціха, што чуваць, як у вушах звініць. А што ж там, дома? Тата, відаць, прыйшоў ужо з работы. Спытаў маму, так, між іншым: «А дзе Янка?» — «У кутку стаіць»,— адказвае маці. «А, пакараны, ну, няхай стаіць»,— гаворыць бацька і ідзе, усміхаючыся, да Каці. А яго, Янкі, няма дома. Могуць сабе колькі хочуць цешыцца з Каці...

Над галавой трэснула галінка. Янка ўздрыгнуў. Акурат таксама было, калі яны па дарозе да дзеда спыніліся ля гэтай елкі на начлег. Але тады ўздрыгнуў не Янка, а маці. І тады яшчэ толькі змяркалася.

— Гэта вавёрка,— сказаў тады тата.

І сапраўды гэта была вавёрка. Янка бачыў, як яна, крутануўшы рудым пушыстым хва-

стом, пераляцела, як страла, на другую яліну.

Ноччу крычаў пугач, і лес напаўняўся таямнічымі гукамі і шорахамі. А недзе далёка нават завыў воўк. І тады мама сказала насцярожана:

— А раптам ён сюды прыбяжыць?

— Ну і што,— адказаў бацька,— мы ж у машыне. Апрача таго, для ваўка — чалавек самы страшны звер...

Тады яны былі ўтраіх, а цяпер Янка адзін. І лес напаўняецца загадкавымі гукамі. Можа, воўк і баіцца дарослага. А малога? Трэба ісці. Чаго сядзець і чакаць?.. Ён спрабуе падняцца і не можа. Не дзіва — столькі прайшоў. А сядзець аднаму ў лесе страшна. Вось тады ён не адчуваў страху. З аднаго боку была маці, а з другога — тата.

Зноў трэснула над галавой галінка. Янка падняў галаву і ўбачыў вавёрку. Яна неяк смешна, такім голасам, як у мамы, сказала:

— Спі, Кацечка, я табе песеньку заспяваю...

Нават вавёрка блытае яго з Кацяй...

Вавёрка не звяртае ўвагі і ціхусенька спявае маміным голасам.

Янка павярнуўся на другі бок. Якое страхоцце: з цемры выпаўзае воўк! Ляскаючы зубамі, набліжаецца да Янкі.

— Ты чаго бадзяешся па лесе? — чуе Янка голас ваўка.— Цябе паставілі ў кут — ну дык і стой. Лес мой...

І тады — хто б мог падумаць — паміж Янкам і ваўком з'явілася на сваіх крывых ножках Каця. Адкуль толькі яна ўзялася? Яна ж яшчэ і хадзіць як след не ўмее, і слова, апрача нейкага там «гу-гу», не скажа, а тут як крыкне:

— Не чапай Янку! Ён мой брацік.

— Ён дрэнны хлопчык,— вурчыць воўк,— ён крыўдзіць сваю малую сястрычку...

— І няпраўда. Ён добры!..— расплакалася Каця.

— Ідзі прэч! — груба адпіхнуў воўк Кацю, і яна пакацілася, як тады, калі Янка яе штурхнуў за тое, што паламала самалёцік...

— Не дам крыўдзіць маю сястрычку! — крыкнуў Янка і пайшоў у наступ на ваўка.

Янка недзе чуў, што звер не вытрывае, калі яму ў пашчу сунуць кулак. Для поўнай гарантыі запхнуў у зяпу ваўка два свае кулачкі.

Звер пачаў задыхацца, абмяк... І, невядома адкуль, па ўсім лесе паплыла ціхая чароўная музыка. Так бывае, калі тата ўключае вечарам радыёпрыёмнік. Стомлены, Янка расцягнуўся ля нерухомага ваўка...

Невядома, колькі б ён так праляжаў, але раптам чуе голас мамы:

— Заснуў. Упарты. Пакрыўдзіў малую і не папрасіў прабачэння. Аднясі яго, Міхась, на ложак...

— А дзе Каця? — праз сон спытаў Янка, баючыся, каб яе адну не пакінулі ў лесе.

— Спіць Каця ў сваім ложку,— пачуў Янка голас бацькі і ўздыхнуў з палёгкай.

1980

ПЯТРО ПРЫХОДЗЬКА

(нарадзіўся ў 1920 г.)



СІНЕНЬКІЯ ВОЧЫ

Нібы дзве расінкі
Ціхай светлай ноччу,
Свецяцца ў Ірынкі
Сіненькія вочы.

Пасвятлее ў хаце —
Толькі усміхнецца.
Паўшчувае маці —
Ўся слязьмі зальецца.

Ды цяпер да плачу
Стала не ахвочай,
Бо ўсё хочуць бачыць
Сіненькія вочы.

Як вясна ў раздоллі
Белым снегам тае,
Як травінка ў доле
Ціха прарастае...

1981

Я МАЛЮЮ...

Краю роднага прасторы
Маляваць люблю я.
Ранак,

Поўдзень,
Адвячорак,
Нават ноч малюю,

Ясны месяц, што з-за хмары
Зазірае ў хаты.
— А чаму чырвонай фарбай? —
Запытаўся тата.

— А таму, што ярка гэтак
Ззяюць ноччу зоркі
І суніцы цёплым летам
Спеюць на пагорку.

Не хачу я хмару злую
Маляваць над нівай.
А таму заўжды малюю
Фарбаю шчаслівай.

1981

ПАВЕЛ ПРУДНІКАЎ

(нарадзіўся ў 1911 г.)

У ПАРКУ

У Андрэйкі сёння свята:
Сам у парк хадзіў, без таты...

Сустракалі яго дзеці:
Таня, Ала, Вова, Пеця.

Падлічыла мігам Таня
Ўсе струменьчыкі ў фантане.

На асфальце крэйдай Ала
Сонейка намалявала.

Шар на нітцы каляровы
Запусціў у неба Вова.

А пасля Андрэйка з Пецем
Пакаталіся ў ракеце.

І пра гэта ўсё, вядома,
Расказаў ён тату дома.

Пляскаў тата у далоні:
Свята сынава сягоння!

А калі ў Андрэйкі свята,
Значыць, свята і у таты!

1981

АЛЯКСЕЙ ПЫСІН

(1920—1981)



КАРУСЕЛЬ

Карусель,
Карусель,
Хто баіцца — той кісель,
Той не лётчык, не марак,
Хоць на выгляд — здаравяк.
Карусель —
На дваццаць пар,
З намі кружыцца ўвесь парк.
Мчацца дрэвы і кусты,
Едуць кладкі і масты.
Мы разгон такі ўзялі —
Не відаць ажно зямлі.

1963

ВЯСЁЛКА НАД ПЛЁСАМ

Ад пасёлка да пасёлка
Ехаў гром.
Заірдзелася вясёлка
Над Дняпром.
Гэта — арка, гэта — арка
Да нябёс.
А пад аркай ходзіць хмарка,
Плешча плёс.
Яркіх колераў багата —

Сем якраз.
Што за свята, што за свята
Сёння ў нас?
Дожджык добры, працавіты
Сёння быў.
І пшаніцу ён і жыта
Напаіў.

1964

СЛАНЕЧНІК

Над сцяжынкаю
Ля дуба
Ўзняў сланечнік
Жоўты бубен.
Пачынаецца
Ўжо з ранняя
Тут чмялінае
Іграннe.
Б'юць чмялі
У звонкі бубен:
— Танцаваць
Мы з дубам
Будзем!

1958

ПІСЬМО ПТУШАК

Лёг сняжок пушысты,
Белы, як папера,
А на снезе птушкі
Ў каляровым пер'і.
Снегіры, сініцы,

Галкі-забіякі
На паперцы гэтай
Пакідаюць знакі.
Цэлую гадзіну
Дзеці прастаялі:
«Што гэта за знакі?» —
І не адгадалі.
Падышоў дзядуля,
Акуляры — ў рукі:
— Зараз адгадаем,
Дарагія ўнукі.
Гэта ж пішуць птушкі:
Ў іх няма кармушкі,
Просяць хоць бы трошкі
Зерняў, хлебных крошак.

1957

ІМЯНІНЫ

У Алёшкі імяніны:
Віншаваць яго павінны.
Будзе ўжо яму чатыры.
Не, не з тых ён, хто задзіры.
Ён спакойны, ён увішны,
Любіць яблыкі і вішні.
Працавіты ён, свядомы
І не ведае утомы.
Добра вершы дэкламуе,
Крышку піша і малюе.

Тэлефон звініць уранні:
Віншаванні, віншаванні.
Падарункі і паштоўкі
Шлюць яму сябры, сяброўкі.
З калідора выйшла мама:
— Вось ад дзеда тэлеграма!

— Мама, дзед мой у Сібіры
Ведае, што мне чатыры?
І адказам на пытанне
Стала дзедава пасланне:
«Мой унучак з Прыдняпроўя,
З днём тваім
Цябе вітаю
І сібірскага здароўя
Ад усёй душы жадаю.
З юбілеем, Аляксей!
Я, твой дзед, і Енісей».

— Енісей, ён дзед таксама?
І ён добры чалавек?
— Енісей,— сказала мама,—
Дзед усіх сібірскіх рэк.
Ён прыгожы, ён магутны,
На сабе нясе ён судны,
Круціць дзе́нь і ноч турбіны.
І дае ён для краіны
Шмат энергіі, святла,
Добрай рыбы
да стала.

— Дзякуй Енісею й дзеду,
Вырасту —
ў Сібір паеду.

1981

ЧАРАВІКІ

Стук і грукат,
Стук і грукат,
Дом дрыжыць,—
То Аленка ў чаравіках бяжыць.

У чаравіках
Вялікіх,
Самых модных,
У чаравіках вельмі моцных
І грымотных.
І дзівілася з Аленкі
Бабуля:
— Як жа ножкі ў чаравікі
Ты абула?
Як жа гэта ў чаравікі
Ты ўлезла?
— А я скокнула,
скокнула
з крэсла.
Ледзь бабуля Аленку
Дагнала,
Чаравікі ў яе
Адабрала.
— Чаравікі схаваю,
Не прасі,
Табе трэба да іх
Дарасці!

1981

ЯЗЭП ПУШЧА

(1902—1964)

ЗАШУМІ, ЗЯЛЁНЫ!

На пагорку, каля рэчкі,
У вясёлым школьным садзе
Вішні, слівы і парэчкі,
Яблынькі, ігрушы садзім.

Поім светлаю вадзіцай,
Што прынеслі у дайніцах
З быстрай рэчанькі-крыніцы.
Не лянуйцеся, расціце!

Атрасе туман расу —
Шэпча ліпа клёну:
— Ты красуй, наш сад, красуй
І шумі, зялёны!

Каб вятры не гнулі долу,
Не зрывалі з вас хусцінак,
Паяскамі светлай долі
Вас падвяжам да тычынак.

Цёплы дожджык, пырсні, пырсні
На парэчкі, і на вішні,
і на яблынькі, ігрушы,
З хмаркі пырсні, спорны, дужы!

Атрасе туман расу —
Шэпча ліпа верасу:

— Ты красуй, наш сад, красуй
І шумі, зялёны!

Дожджык мёдам сад апырскаў,
Напаіў карэнні сокам,
Усміхнуліся пупышкі
На галінках на высокіх.

На уцеху і на дзіва
Упрыгожым мы Радзіму.
Піянерскімі садамі
Зашумяць яны над намі.

Атрасе туман расу —
Шэпча ліпа клёну:
— Ты красуй, наш сад, красуй
І шумі, зялёны!

1957

ЗОСЬКА І АНТОСІК

Вышывае шоўкам Зоська
Браціку свайму Антоську
На сарочцы каласкі
І між імі — васількі.

Каласкі жаўцеюць, спеюць,
Васількі ўсё больш сінеюць.
Як жывыя, каласкі,
І смяюцца васількі.

Хвалі ходзяць, як на ніве,
І блакіт плыве над імі.

Пад блакітам — каласкі
І між імі — васількі.

І праменьчык зіхатлівы,
Як струменьчык мігатлівы,
Поіць сонцам каласкі,
І смяюцца васількі.

І Антоську ў той сарочцы
Не пазнаюць, пэўна, хлопцы:
На сарочцы — каласкі
І між імі — васількі.

1957

МІХАСЬ ПЯНКРАТ

(нарадзіўся ў 1918 г.)

КОЛЬКА

На нашым двары — Колька самы галоўны завадатар. Не таму, што ён старэйшы з усіх дзяцей дваровай «брыгады»,— наадварот, ён адзін з меншых. Справа тут у іншым. Колька вельмі кемлівы хлопчык. Ён аўтар амаль усіх тэхнічных збудаванняў: ветрака, папяровага дырыжабля, касмічнай ракеты...

Колькаў бацька — шафёр. Раніцою ён прыязджае на сняданак і ставіць машыну ў канцы двара. Тут ужо Колька ведае сваю справу. Ён сядзіць за рулём і пільна ахоўвае бацькаву тэхніку. У гэты адказны момант сяброўскія адносіны з таварышамі часова абрываюцца.

— Гэй ты, рыжая, не торкай пальцамі ў фары!

Рыжая дзяўчынка хавае рукі за спіну. Колькаў аўтарытэт дзейнічае.

Бывае, бацька паднімае капот у машыне і поркаецца ў маторы. Колька таксама лезе пад капот. Увесь час, пакуль бацька нешта наладжвае, Колькавы сандалікі ўпарта тырчаць з-пад капота.

Зайздрасці дваровай дзетвары няма меж!

Ёсць, праўда, у Колькі і адна непрыемнасць. Амаль кожны дзень, калі Колька гуляе з дзецьмі на двары, адчыняецца акно на першым паверсе, і Колькава мама гукае адно і тое ж:

— Колька, вытры нос! — і зачыняе акно.

Дзецям гэта спадабалася, і яны пачалі дражніць хлопчыка: «Колька — Вытры Нос».

А Кольку, вядома, гэта не падабаецца, хоць, па праўдзе кажучы, ён сам вінаваты — выцірай нос без напамінку.

Аднойчы раніцою я ўбачыў, як Колька на двары прыладжваў да свайго самаката бляшанку ад кансерваў. Вакол яго тоўпіліся дзеці: невядома, што там будзе з Колькавай выдумкі, а таму і цікава. Колька ўсхвалявана соп. Пад носам, як заўсёды, неспакойная бурбалка.

— Колька,— кажу я,— ты тут старэйшы механік, аўтарытэт на ўвесь двор заваяваў, а нос у цябе адмакае. Можа, часу ў цябе няма падсушыць яго? Чалавек ты заняты...

Колька незадаволена паглядзеў на мяне, шмаргануў рукавом пад носам і зноў засоп над бляшанкай: маўляў, не да носа, не перашкаджай.

Ідучы з працы, я заўважыў на сваім двары незвычайнае ажыўленне. Дзеці аж пішчалі ад захаплення. Аказваецца, Колька вырашыў прымацаваць да свайго самаката рухавік. Праўда, не ўнутранага, а знадворнага згарання. У бляшанку ад кансерваў палажыў кавалак смалы, бляшанку прымацаваў да самаката, смалу падпаліў і... паехаў. Дым, агонь, захапленне!

Ці доўга ехаў Колька на адной назе пры дапамозе рухавіка знадворнага згарання — невядома. Вядома адно: Колька загладжваў рукою прапаленую штанінку і ад радасці ўвесь аж засвяціўся.

А яшчэ мне кінулася ў вочы — Колькаў нос быў чырвоны, як моркаўка. Відаць, доўга ён цёр яго да поўнай спраўнасці. Аўтарытэт абавязвае.

1973

ПЯТРО РУНЕЦ

(нарадзіўся ў 1911 г.)

ЛІПКА

Дзед Даніла разам з унукам Валерыкам гулялі ў садзе. Хоць дзень быў і спякотны, але тут панаваў прыемны халадок. Пахла садавінай і травамі. У густой засені ціха шчабяталі птушкі. Ідучы ўслед за дзедам, Валерык уважліва прыглядаўся да дрэў, на якіх віселі падобныя на зялёныя званочкі грушы, яблыкі-наліванкі, слівы.

У канцы саду, на ўзмежку, расла маладая купчастая ліпка. Валерык раптам спыніўся і, паказваючы на яе, сказаў:

— Дзед, бачыш, ліпка! Давай ссячом...

Дзед здзіўлена паглядзеў на ўнука.

А навошта яе ссякаць? Яна ж, здаецца, нікому не замінае.

— А што з ліпкі за карысць? На ёй жа нічога не расце,— растлумачыў Валерык.

— Гэта праўда, што на ёй нічога не расце,— згадзіўся дзед. І, крыху падумаўшы, дадаў: — Калі так, то бяжы ў хату і прынясі сякеру.

Валерык стрымгалоў памчаўся з саду. Толькі бялявая галава замільгала ў густым зялёным бульбоўніку. Неўзабаве ён вярнуўся.

— На, дзед, секані яе пад самы корань,— сказаў хлопчык, падаючы вострую сякеру.

— Спачатку, Валерык, давай крыху пасядзім і адпачнём. А то я нахадзіўся, ногі забалелі. А ссячы ліпку мы паспеем. Яна ж без ног і

нікуды ад нас не ўцячэ. Толькі дзе ж нам сесці? — спытаў дзед, пазіраючы на ўнука.

Валерык паглядзеў навокал і жвава адказаў:

— А вось тут, у цяньку пад ліпкай!

Яны селі пад дрэвам.

— Ну, як? — спытаў дзед, памаўчаўшы.— Добра ў халадку, га?

— Добра! — адказаў Валерык.

— То-та ж,— ухмыльнуўся дзед, вымаючы з кішэні люльку.— Нябось каб пасадзіў цябе на сонцы, ты гэтак не сказаў бы... А якое паветра?

Валерык пацягнуў носам.

— А што гэта так пахне, дзядуля?

— Хіба ты не ведаеш?

Дзед устаў, нагнуў ніжнюю галінку ліпы і сарваўшы некалькі жаўтавата-белых кветачак, падаў іх унуку.

— На панюхай.

— Ой, як соладка пахнуць! — усклікнуў здзіўлены Валерык.

— Гэта ты правільна сказаў,— згадзіўся дзед.— У ліпавых кветках ёсць салодкі, як цукар, сок. З яго пчолы і робяць мёд.

— Той, што бабуля падавала да бліноў?

— Во-во, той самы. Бачыў, які ён светлы і салодкі? Гэтым мёдам лечаць хворых.

Валерык недаверліва глянуў на дзеда:

— А хіба мёд — лякарства?

— Яшчэ якое лякарства! — адказаў дзед.— Памятаю, я быў малы, вось як ты цяпер, і ў мяне моцна балела горла. Дык мяне толькі мёдам і вылечыла маці. І наогул мёд вельмі карысны. Асабліва свежы, толькі што выняты з вулля... А вазьмі ты,— гаварыў далей дзед,— ліпавы цвет. Гэта ж ад кашлю — першае лякарства. Таму людзі яго збіраюць і сушаць. І чай, завараны ліпавым цветам, надта смачны.

Валерык слухаў дзеда так, нібы той расказваў цікавую казку. А калі стары змоўк, хлопчык тузануў яго за рукаў і пачаў прасіць, каб ён яшчэ што-небудзь расказаў пра ліпку.

Дзед выняў з рота люльку, правёў рукой па барадзе і ціха прамовіў:

— Што ж табе, унучак, яшчэ расказаць? Хіба тое, што калісьці з кары маладых ліп рабілі кошыкі, сявенькі, плялі лапці...

— А што такое лапці? — пацікавіўся Валерык.

— Абутак такі. Даўней яго людзі ад беднасці насілі... І яшчэ скажу табе, Валерык, што ліпу паважаюць не толькі ў вёсцы, але і ў горадзе. Нядаўна я быў у Мінску. Дык там ліпамі абсаджаны цэлыя вуліцы. Вельмі прыгожа глядзець!

Дзед дакурыў люльку і рашуча прамовіў:

— Ну, адпачылі мы з табою, цяпер можна і за работу брацца. Давай сякеру, звалім гэтую паганую ліпку.

— Дзедка, не трэба яе сячы! — усклікнуў Валерык.

— Чаму?

— Шкада,— прашаптаў хлопчык.— Ты столькі добрага расказаў пра яе.

— Вось як! — прыжмурыўся дзед і ўсміхнуўся.— Мне, унучак, таксама шкада. Я ж калісьці сваімі рукамі яе пасадзіў...

У гэты час дыхнуў ветрык. Ліпка весела зашумела, зашапацела лісцем. Валерык паглядзеў на дрэва, потым на дзеда і сур'ёзна спытаў:

— Дзядуля, а чаго яна шуміць?

— Радуецца, што мы яе не ссеклі,— гэтак жа сур'ёзна адказаў дзед.

— А хіба яна разумее?

— Добрае, унучак, усе разумеюць...

1955

АДАМ РУСАК

(нарадзіўся ў 1904 г.)



АРЛЯНЯТЫ

Быць крыніцы — рэчкай шумнай,
Жалудам расці — дубамі,
Каласамі быць — зярнятам,
Арлянятам быць — арламі.

Арлянятам, арлянятам
Ўся галакціка відаць,
Дзе арлы не далятаюць,
Арляняты даляцяць.

У сустрэчы з навальніцай
Гартавацца дужым крыллям,
Ператвораць арляняты
Сон у яву, казку ў былі.

Да высокіх ясных зорак
Вольным птушкам уздымацца,
А з вышыняў на Радзіму
З перамогаю вяртацца.

Арлянятам, арлянятам
Ўся галатыка відаць,
Дзе арлы не далятаюць,
Арляняты даляцяць.

1970

МОЙ СЯБРА

З ім я ў працы, адпачынку,
На уроку, перапынку.

З ім я ў полі, з ім у школе,
З ім не сумна мне ніколі.

З ім вандрую я па свеце,
З ім лятаю у ракеце,

Чаго сам не адгадаю,
У яго я запытаю.

Ён усё на свеце знае,
Мне ва ўсім ён памагае.

З ім я гутарку вяду,
З ім нідзе не прападу.

— Хто ж ён гэтакі, скажы?
Нам яго ты пакажы.

— Нездагадлівы ты, Мішка...
Сябра мой, вось бачыш,— кніжка.

1981

АЛЕСЬ РЫБАК

(нарадзіўся ў 1934 г.)



СЁННЯ ПРЫЕДЗЕ ТАТА

Ірынчын тата робіць у вялікім-вялікім горадзе, дзе ходзяць трамваі, тралейбусы і адкуль ён кожную пятніцу прывозіць усялякія гасцінцы.

Ірынка з мамай, як толькі стала цёпла, прыехалі ў вёску, да сваёй бабкі. Ірынцы падабаецца тут усё: і вуліца, дзе так многа пясочку і дзе можна смела гуляць, бо па ёй не ездзяць машыны; і бабчын агародчык, у якім можна ўсяго-ўсяго пакаштаваць; падабаецца Ірынцы і яе сяброўка Люда, з якой яны разам ловяць жукоў і матылькоў і на сонейку пякуць з пясочку аладкі.

Адно не даспадобы Ірынцы — класціся ўдзень спаць. Ды яшчэ тады, калі надта ж не хочацца спаць, бо сонца вісіць аж на саменькім версе клёна, а на вішні, што расце пад акном, так весела ціўкаюць нейкія птушкі.

Але Ірынка кладзецца. Мама, калі Ірынка не будзе слухацца, усё раскажа тату. І тата, як прыедзе з горада, не возьме яе з сабою ў лес і не зробіць свістка. Ірынцы ж вельмі хочацца ўсюды бываць разам з татам.

Узяўшыся за рукі, яны пойдуць далёка за вёску, і яна раскажа тату пра ўсё, пра ўсё: і як моцна драпануў яе коцік за руку, што аж во які шрам астаўся, і як яны з Людай знайшлі такое шкельца, што, калі глядзіш праз яго, усё здаецца зялёным-зялёным. Нават Людчын твар і само сонейка.

А яшчэ Ірынка раскажа, як сумавала без таты і як ёй вельмі хацелася цукерак, тых, дзе намаляванa вавёрачка.

Толькі вось тата надта доўга не прыязджае. Аж цэлы тыдзень. Ірынка не ведае яшчэ, як называюцца дні вось гэтага самага тыдня. Але яна добра ведае, калі прыедзе тата. У той дзень мама будзе купаць яе ў вялікіх драўляных начоўках.

Ірынка калісьці не любіла купацца. Ды і цяпер не вельмі што любіць. Але ж калі мама купае — значыць, прыедзе тата. О, гэта Ірынка добра запомніла...

Вось і сёння ёй вельмі трэба бачыць тату.

Яшчэ з самага ранку яна пасварылася з Людай. Ірынка сказала, што ведае гняздо з маленькімі птушаняткамі.

— Паказы,— сказала Люда.

Але Ірынка не паказала, бо, сказаць праўду, і сама не ведала такога гнязда. Вось таму яны і пасварыліся. Люда назвала Ірынку манюкай, а Ірынка Люду ніяк не назвала, бо не прыдумала ніводнага крыўднага слова.

Эх, каб быў цяпер тата! Яны пайшлі б разам у лес і знайшлі б сапраўднае гняздо... Тады Ірынка сказала б Людзе, што яна ніколечкі нават не манюка... Вось каб сёння прыехаў тата!

Раптам Ірынка нешта ўспомніла і нават перастала капаць лапатачкай пясок. Падумаўшы яшчэ трохі, яна аж засмяялася і пабегла ў хату.

— Ну што? — спытала мама.

— Купай мяне хутчэй у начоўках,— Ірынка зняла з галавы белую панамку і пачала расшпільваць сандалікі.

Мама аж рукамі ўсплясnула:

— Ды ты ж яшчэ чысценькая! Я цябе нядаўна купала. Ідзі вось гуляй.

Ірынка нікуды не пайшла і нечакана разрумзалася на ўсю хату.

— Што з табою, дачушка? — занепакоілася мама.

— Я хачу, каб прыехаў тата. А ты мяне не хочаш купаць, вось...

Мама нічога не зразумела:

— Тата ж быў зусім нядаўна. Ён толькі ў пятніцу прыедзе.

Ірынка нават пакрыўдзілася.

— А ты ж сама заўсёды казала, што як мяне пакупаеш і я пасплю, то адразу прыедзе тата.

Мама засмяялася і ўзяла Ірынку на рукі.

— Ах ты, мая маленькая няўцяміца! — яна прытуліла дачку і пачала чытаць ёй кніжку пра коціка, што забыўся, як папрасіць есці, і ва ўсіх, нават у жарабяці, пытаўся пра гэта.

Толькі сёння кніга не цешыла Ірынку. Сцішыўшыся, яна думала. Думала, чаму мама назвала яе няўцяміцай, думала і пра многае іншае. Нават пра тое, як гэта мог коцік гаварыць з жарабяткам. Ён жа — Ірынка гэта добра ведае — ніколі яшчэ не сказаў ні аднаго слова, а толькі мяўкаў. Трэба, мусіць, спытаць пра ўсё ў мамы...

Але Ірынка не спытала. Яна непрыкметна заснула на маміных каленях.

1972

АЛЕСЬ РЫЛЬКО

(1923—1967)

КАСІ, КАСА, ПАКУЛЬ РАСА!

(З аповесці «Мядовыя краскі»)

Міхаська прачнуўся сёння раней, як заўсёды. Кот разбудзіў яго — лёг на падушку і мурлыча ў самае вуха. Спрасонку адштурхнуў ад сябе нязванага госця раз і другі, а ён усё адно лезе, убіваецца ў ласку сваёй аднатоннай песенькай: мур-мур, мур-мур...

Сон зусім прайшоў, як Міхаська пачуў, што дзед на двары кляпае касу: чок... чок!.. — ажно рэха нясецца. У печы сквірчыць сала, у сенцах мама ганяе курэй... Сястрычкі Маня і Таня яшчэ спяць, а таты ў хаце няма.

У хату зайшла маці, сказала:

— Спі, спі, сынок. Яшчэ рана...

— А дзе тата?

— Даўно на рабоце. Паехаў касіць.

— А ў яго ж касы няма! Дзед не асаджаў яму касы.

— Для яго касу на заводзе зрабілі. Касілку. На трактары косіць цімафееўку, у Залужжы.

— О-о,— захныкаў Міхаська,— а ён жа казаў, што мяне з сабою возьме!..

— І добра, што не ўзяў. Я табе заўсёды кажу, што не трэба да машын лезці. Лепш пільнуйся дзеда,— сказала маці.— Бяжы вось паглядзі, што ён змайстраваў табе.

Хлопчыка нібы ветрам здзьмула з ложка. Падцягнуў штонікі і — дрыб-дрыб-дрыб!.. — бягом на

двор. Дзед надоечы зрабіў усім чатыром дружбакам па грабельках. Цікава, што ён яшчэ змайстраваў?

Убачыўшы ўнука, дзед прывітаў яго:

— Здарова, касец! Хадзі-тка прымеру табе! — і паказаў асаджаную маленькую касу.

— Мая?! — узрадаваўся Міхаська.

— Усёй вашай брыгадзе. На змену будзеце касіць. І сёння ж пойдзем на луг.

— А хто будзе цялят пасвіць?

— Ёсць каму. Я дамовіўся з бабкай Аленай. А мужчыны ўсе пойдуць касіць.

Міхаська падумаў: «Праўда, бабка Алена касіць не можа, бо яна старая. Заўсёды кіем пасабляе сабе хадзіць. А я дужы! Дзед казаў, што я — мужчына!»

— Дзед, паглядзі, які я дужы! — І ўнук, абшчапіўшы, падняў калоду, на якой стары кляпаў касу.

— О, і праўда — асілак! — згадзіўся дзед.— Я ж і кажу — табе сама што ў пракос станавіцца!

Узрадаваны Міхаська, забыўшыся на сваю мужчынскую сталасць, заскакаў на адной назе, прыпяваючы:

— Пойдзем касіць! Пойдзем касіць!

— Гэ, выбрыкваеш! — пасмейваўся дзед.— Цябе, як таго бычка, хоць на вяроўку навязвай, каб не збег куды-небудзь.

Міхаська трохі засаромеўся і спыніў свае скокі. Потым успомніў, што пра касьбу трэба папярэдзіць сяброў, а то яны, чаго добрага, могуць праспаць, і адразу ж пабег да іх з гэтай радаснай навіной.

...Праз якую гадзіну па вуліцы на луг ішла самая маладая брыгада касцоў, якую ўзначальваў сівабароды Нупрэй. Праўда, у гэтай брыга-

дзе на пяць чалавек было толькі дзве касы — у дзеда і Васіля Кузьміча. Васілёк нёс касу, паколькі ён быў старэйшы. Затое мянташкі былі ва ўсіх, новенькія граблі — таксама. Галя несла яшчэ маленькі вулей, той, што зрабіў дзядзька Рыгор. Гэта на выпадак, калі знойдуць земляных пчол, каб было ў што агрэбці іх. Першыя пчолы будуць Галі, бо яна ж — самая адважная, не пабаялася голай рукой палезці ў гняздо шэршняў...

Дзед са сваёй брыгадай касцоў трохі спазніўся — на лузе ўжо звінелі косы. Луг тут быў куп'істы, з глыбокімі равамі, таму касіць яго прыходзілася ўручную.

— Вось тут мы размахнёмся! — сказаў дзед Нупрэй, аблюбаваўшы месца побач з іншымі касцамі. Уторкнуў кассё ў зямлю, абхапіў касу левай рукой, у правай — мянташка, і лёгкімі ўзмахамі пачаў вастрыць бліскучую сталь.

— Далям-далям!.. Далям-далям!.. — заспявала каса.

Навастрыўшы, дзед размахнуўся: ш-ша!.. ш-шах!..

Касі, каса,
Пакуль раса!
Раса далоў —
Мы косім зноў! —

памагалі дзеці вясёлай песняй.

Потым малыя па чарзе спрабавалі сваю коску. Праўда, пракос у іх атрымліваўся вузенькі, курыца пераскочыць, і кудлаты, бо трава грывамі заставалася.

— Гэта не бяда! — супакоіў дзед.— Як кажуць, першая аладка скача са скаварады не зусім гладка... Касіць таксама трэба ўмець, без навукі і тут не абыдзешся.

Сагнаўшы ахвоту на касьбе, дзеці пачалі разбіваць пракосы. Як управіліся за дзедам, пабеглі

да суседніх касцоў. Спрытна растрасалі маленькімі грабільнамі зялёныя пракосы свежаскошанай травы — работа спорылася. Дзень быў сонечны, з ветрыкам, так што, глядзіш, на лузе да вечара вырастуць копы сухога, духмянага, як чай, сена. З коп праз колькі дзён паставяць высокія стагі. Многа мурагу будзе калгаснай жывёле!

Маладыя хлопцы, якія часам не ўмелі добра наводзіць косы, прасілі, каб дзед ім памог. Дзед кляпаў ім косы, папраўляў асадку, раіў, як лепш вастрыць. Тым часам каса яго таксама не гуляла. Пракосы за дзеда гналі тыя касцы, чые косы ён наводзіў. Ва ўзаемнай дапамозе дарослых удзельнічалі і дзеці, наперахопкі варушачы пракосы. Калі не было чаго рабіць, бегалі навыперадкі, куляліся на мяккай пакошы. Пра земляных пчол, здавалася, яны ўжо і забылі. Нарэшце пашчаслівіла.

— Гэй, малыя! — крыкнуў дзядзька Хвядос.— Бяжыце сюды! Мёдам пачастую!

Дзеці з усіх ног кінуліся да дзядзькі Хвядоса, які разграбаў рукамі ледзь прыкметную купінку сухога моху. Над ім кружыліся пчолы, здавалася, вось-вось пачнуць яго джаліць, але ён не звяртаў на іх увагі. Аднак дзяцей папярэдзіў:

— Вы ад іх не адмахвайцеся, а то закусаюць. Стойце спакойна, і яны вас не крануць.

Дзядзька дастаў скрылік мёду і падзяліў яго паміж дзецьмі. Пры гэтым сказаў:

— Больш не дам, і не прасіце. Пакінем трохі сотаў з мёдам пчолам на разжытак. Яны яшчэ не раіліся — мёд трэба будзе іхнім маленькім дзеткам...

Галя ўпрошвала:

— Дзядзечка, памажы нам асадзіць іх у наш вулей! Ім там будзе лепш. Зацішна, і дождж іх не залье!

— Не ведаю, ці атрымаецца што. Пчолы гэтыя — дзікія, напэўна, не захочуць жыць у вулеі...

— Мы іх прыручым! — запэўнілі хлопчыкі.

— Каб жа яно ўдалося! Але, як кажуць, колькі ваўка ні кармі, ён усё адно ў лес глядзіць... Гэтаксама і земляныя пчолы...

Пагадзіліся на тым, што гняздо можна перанесці ў вулей толькі ўвечары, калі пчолы супакояцца і ўсе збяруцца з лёту. А пакуль што зазначылі месца, каб потым лёгка было знайсці, лазовай тычкай.

Да вечара часу было многа — сонца бралася толькі на поўдзень,— і дзед Нупрэй папрасіў дзяцей збегаць да бабкі Алены памагчы ёй прыгнаць на паўранкі цялят. Аваднёў цяпер многа, і сляпні сякуць жывёлу, дзікаўкі з'явіліся, дык, чаго добрага, каб не разбегліся куды каторыя цяляты.

— Заадно і паабедаеце дома,— напомніў дзед.

Памагчы бабцы Алене — таксама цікавая работа, і дзеці пабеглі да рэчкі, туды, дзе каля кустоў чаромхі пасвіліся цяляты.

1959

АЛЕСЬ САВІЦКІ

(нарадзіўся ў 1924 г.)

ДАРОГА Ў ШКОЛУ

У школу Данік ішоў разам з бацькам.

Усё было незвычайным у гэты вераснёўскі ранак: і зіхатлівае сонца над галавой, і густая сінеча неба, і ласкавыя позіркі бацькавых вачэй, і ласкавы, мяккі і напеўны голас маці — яна праводзіла іх да старога клёна ў канцы саду і раіла Даніку добра паводзіць сябе ў школе, уважліва слухаць настаўнікаў на ўроках. А болей за ўсё радаваў Даніка новы карычневы ранец з шырокімі бліскучымі спражкамі на рамянях. Бацька пажартаваў, што ранец малаваты для пяцёрак. Аднак гэта, маўляў, не бяда: у калгасным універмагу ёсць большыя, купіць няцяжка. Былі б пяцёркі!

На школьным двары Даніка запыніў Міхась. Жылі яны на адной вуліцы, але не вельмі сябравалі: Міхась любіў задзірацца.

— Глядзіце! Данік без кветак ідзе,— крыкнуў Міхась.— Ты што, згубіў іх!

Данік адбіў наскок весела, але стала крыўдна. Кветкі ў яго былі, калі ён выходзіў з хаты,— вялікі букет вяргіняў, якія маці падрыхтавала, нават абкруціла сцябліны ў празрысты і хрумсткі цэлафан. Ды на паваротцы дарогі, што выводзіць з вёскі на асфальтаваную шашу, бацька спыніўся ля абеліска, што стаіць у засені таполяў і клёнаў.

— Пакладзём кветкі, сынок, ім, героям нашым,— сказаў бацька.— У такі вось дзень, першым вераснем, у вайну наша вёска гарэла. Якраз ранкам, сонечным вось гэткім. Партызаны тады і паляглі тут...

Данік паклаў вяргіні да абеліска. Дарогаю да школы бацька расказаў пра бой партызанаў з фашыстамі. Партызаны прынялі няроўны бой, іх было толькі пяць чалавек, а фашыстаў шмат. Па-геройску біліся партызаны, усе яны загінулі, але ўратавалі вяскоўцаў: тыя паспелі схавацца ад карнікаў у лесе...

Данік не сказаў пра гэта Міхасю. А той заскакаў на адной назе, задудзеў:

— Ішоў, разявака, кветкі згубіў...

Міхасёва прыпеўка пакрыўдзіла Даніка. Яшчэ большую крыўду давялося перажыць у класе. Празвінеў званок, у клас зайшла настаўніца. Яна назвалася Вольгай Пятроўнай, пазнаёмілася з усімі і, ласкава ўсміхаючыся, спытала, ці не было якіх здарэнняў па дарозе ў школу, ці не стаміліся яны, першакласнікі, несучы ранцы.

— А Данік кветкі згубіў,— абвясціў Міхась.

Данік не сцярпеў, наважыўся быў устаць і расказаць, як усё было. Але яго апярэдзіла Зіна.

— Няпраўда! — голасна заступілася яна за Даніка.— Я ведаю, чаму Данік прыйшоў без кветак.

Зіна, аказваецца, усё бачыла, бо ішла ў школу следам за Данікам. Перад пастраеннем на школьным двары Зіна дала Даніку ружу з свайго букета, каб было што ўручыць дзесяцікласнікам, і цяпер ён канчаткова вырашыў, што будзе сябраваць з Зінаю. Выслухаўшы Зіну, настаўніца падышла да стала, на якім ляжалі кветкі, і сказала:

— Першы ўрок у нас, дзеці,— урок Памяці. Бярыце кветкі і пойдзем да абеліска. А потым зноў вернемся ў клас.

Абеліск нябачны са школьнага ганка — яго шчыльна атуляюць таполі і клёны. Але як толькі перайшлі шашу, Данік адразу ўбачыў гранітную пірамідку.

Настаўніца скіравала гаманлівую чародку дзяцей да агароджы ля брацкай магілы, папрасіла:

— Ты, Данік, ведаеш, хто тут пахаваны. Раскажы нам.

— Тут пахаваны партызаны. Яны выратавалі людзей ад смерці...

Данік хацеў падрабязна расказаць пра ўсё, што пачуў ад бацькі. Але позірк яго спыніўся на вяргінях. Побач з яго букетам ляжала шмат іншых кветак: чырвоныя гваздзікі і ружы, белыя рамонкі... А ўранні — ён добра памятае! — іх не было. «Бачыш, Міхась,— хацелася крыкнуць Даніку,— не адзін я прыйшоў у школу без кветак».

— Так, дзеці,— сказала Вольга Пятроўна,— тут пахаваны партызаны, іх народ наш назваў народнымі мсціўцамі. Яны загінулі па-геройску, аддалі самае дарагое, што ў іх было,— жыццё, каб мы жылі шчасліва. Запомніце іх імёны: Мікола Дубко, Кайрат Жумагаліеў, Іван Санько, лейтэнант Сакалоў...

Настаўніца чытала імёны герояў, а дзеці падыходзілі да абеліска і клалі кветкі. І Данік, і Зіна, і Міхась, і ўсе першакласнікі. Удалечыні, за галінамі клёнаў, што нізка схіліліся над абелiскам, сінела азёрная роўнядзь; вада зырка зіхацела, пералівалася, і Даніку нечакана падалося, што зіхатлівае святло вады, сонечнага ззяння ляціць ад возера сюды, скочваецца з лістоты на чырвоную зорку, якая вянчае абеліск, і зорка ад гэтага свеціцца незвычайна ярка, як бы з агню злітая.

1980

ЭДУАРД САМУЙЛЁНАК

(1907—1939)

ДАЧКА ЭСКАДРОНА

Пачатак гэтай кароткай гісторыі сумны.

...Быў ясны летні дзень. Сонца высока ішло ад краю да краю, падступаючы да самых агародаў маленькай вёскі. Жаўранкі, вясёлыя і нястомныя песняры поля, плавалі ў затуманеным гарачынёй паветры. Зямля млела пад сонцам, на дарогах вецер замятаў пыл. Вось у такі час поўдня прыйшла бяда ў маленькую і ціхую вёску, што ляжала між палёў, на ўзбярэжжы вялікай сажалкі.

Старыя вербы нахіліліся над зялёнай вадой, дзе плавалі вёрткія тоўстыя жукі. Яны ўсплывалі на паверхню і спрытна давалі нырца. Маленькая Марыся любіла глядзець на гэтых вясёлых жукоў, якім добра было жыць у цёплай вадзе, у зялёнай засені пад старымі вербамі, у прыемным суседстве з пахучымі жоўтымі кветкамі стаўбункоў і прыгожымі белымі лілеямі. Глыбей, ведала Марыся, жылі карасі, лянівыя і тлустыя рыбы. Іх жыццё было для Марысі невядомым і недаступным. У таямнічых глыбінях сажалкі былі русалкі, і далей, за памост, на якім бабы мылі бялізну і бялілі палатно, ісці было нельга.

У гэты дзень Марыся ад самай амаль раніцы была ля сажалкі. Іншыя пайшлі ў поле шукаць на межах ягад, а Марысі было добра тут,

на памосце, пад вербамі. Жукі гулялі як ніколі, і раз нават Марыся на ўласныя вочы бачыла карася. Ён недалёка ад берага бліснуў залатой луской і знік пад шырокім лісцем лілей.

Раптам як бы гром прагрымеў недзе за лесам. Потым зусім блізка гаўкнулі нейкія злыя сабакі:

— Гаў-гаў-гаў!..

І Марыся ўчула гул далёкі і працяглы, як бы шмат раёў пчаліных ляцела над сажалкай, як бы віхор ішоў над полем... і тады — цёмны слуп зямлі ў зялёным бляску нябачанага, страшнага полымя ўзняўся на агародах, там, дзе высокая расла канапля, і павольна апаў. Воблака цёмнага дыму паплыло над берагамі сажалкі.

Марыся, дранцвеючы ад страху, збегла з памоста і прытулілася да вярбы. Зноў брахнулі басавітыя сабакі, і тады прыўзняўся дах адной з хат, хмара дыму ўсплыла над вёскай, высока ў паветра ўзляцела салома і жэрдкі, і ўсё адразу ахапіў агонь.

Марыся закрычала і заплакала, тонкі дзіцячы голас зазвінеў і сціх, бо ў гэты момант снарад ударыў у памост, высачэзным фантанам узляцела ўгару вада, затрашчала старое дрэва, расшчапляючыся напалам, і ў гэтым громе і гуле загінулі маленькая Марыся, старое дрэва і вясёлыя тоўстыя жукі.

* * *

Марыся ляжала на стале, тоненькая і спакойная. У прыгалоўі гарэла свечка. Белыя Марысіны валасы былі прыбраны ў кветкі. Іх шмат расло ў жыце, у пахучай цеплыні, пад бярозкамі на ўзмежжах. Кветкі прынесла Зося, старэйшая сястра Марысі, і яна стаяла цяпер ля стала, на якім ляжала Марыся. Зося трымала за руку

малодшую сваю сястру Надзю і плакала паціху, слёзы цяклі па яе бледных шчоках, слёзы збалелага дзіцячага сэрца, якое ўпершыню пазнала цяжар няшчасця. Трохгадовая Надзя нічога не разумела. Яна глядзела на спакойную Марысю, на кветкі і жоўты агеньчык свечкі, і ў яе шырока адкрытых сініх вачанятах было здзіўленне.

Суседка моўчкі стаяла ля парога. Змарнелая ад гора, маці Марысі ляжала на ложку. У хаце было ціха. Надыходзіў вечар, сонца зайшло, і зара ў дыме пажарышча была крывавай і страшнай. На вуліцы порскалі ад дыму коні, гаманілі чужыя і злыя людзі. На пажарышчы тлелі галоўні, вецер перавейваў попел, і ад попелу былі шэрымі дарога, зеляніна садоў і агародаў, стрэхі і сцены будынкаў, якія засталіся цэлымі. У дыме і попеле, у крывавым бляску зары прыходзіў пануры, журботны вечар, згасаў нешчаслівы дзень.

— Мой ты саколік, Яначка...— зашаптала маці Марысі.— Ляжыш ты ў чужой зямельцы, на чужой старонцы, сатлелі твае костачкі, і не ведаеш ты, родны мой, што сталася з тваімі дзетухнамі... А-ах, божа, божа!..

Жанчына, параненая няшчасцем, плакала аб сваім дзіцяці, аб сваім мужы, які загінуў недзе на палях Галіцыі, аб сваім гаротным, бяздольным жыцці...

Але няшчасце не хацела пакідаць цёмных, пракураных сцен хаціны. Яно было ў вёсцы і не выходзіла з яе. З вуліцы даносілася рэзкая і кароткая каманда, іржалі коні, тупалі цяжкія салдацкія боты, п'яныя галасы спявалі працяглую і незразумелую песню.

Нехта прыйшоў у сені, наткнуўся на вядро, прабурчаў нешта і доўга намацваў засаўку. Су-

седка адчыніла дзверы. На парозе стаяў салдат, перавязаны рамянямі, з вінтоўкай у руцэ. Ён быў велізарны і шыракаплечы, ён быў грозны і страшны ў маленькай хаціне, асветленай трапяткім агеньчыкам свечкі. Салдат мутнымі, цяжкімі вачыма агледзеў усіх, затрымаў погляд на кветках, на жоўтым спакойным тварыку Марысі, пераступіў з нагі на нагу і пахіснуўся. Салдат быў п'яны.

— Крова!..— сказаў ён.

Жанчына ўзнялася з ложка і са страхам глядзела на салдата.

— Крову...— растлумачыў салдат.— Для плютону...

І звярнуўся, каб выйсці з сяней. На дварэ, каля абгарэлага хлява, прывязаная да плота, стаяла карова. Толькі цяпер зразумела жанчына, у чым справа.

— Не дам каровы! — закрычала яна, кідаючыся ў сені.— Не дам! Паночак, даражэнькі, што робіце!..

Салдат адпіхнуў яе плячом і выйшаў на двор. Ён падышоў да каровы і спрытным, гаспадарскім рухам скінуў вяроўку з рог. Карова адышла ад плота, жанчына пабегла да яе і схапіла карову за рогі. Салдат, не спяшаючыся, падышоў, павольна адвёў руку і кароткім ударам у грудзі збіў жанчыну з ног.

— Ма-а-ама! — закрычала Зося з парога. Суседка, лямантуючы, пабегла з двара. Жанчына хутка ўзнялася на ногі і кінулася на салдата.

— Я табе вочы паганыя выдзеру! — крычала яна.— Не дам каровы! Пусці...

Яна схапіла за рамяні, якімі быў перавязаны салдат, яна трасла яго за грудзі, у яе быў скарэжаны грымасай адчаю твар, расшорханыя, ускудлачаныя валасы. Яна была незвычайнай і

страшнай. Такой яна засталася ў памяці Зосі назаўсёды. Салдат зноў, без усякага высілення, павольным і моцным штуршком збіў яе з ног, ускінуў вінтоўку, паглядзеў на затвор і прыцэліўся ў карову, якая бегла па двары да варот. Жанчына ўскочыла і зноў кінулася на салдата. Салдат азірнуўся і зноў прыцэліўся. У гэты момант ён пахіснуўся. Жанчына схапілася за вінтоўку. Салдат паспрабаваў адпіхнуць яе ўбок, і зараз жа грымнуў стрэл.

Карова выбегла за вароты, жанчына, прыціскаючы рукі да грудзей, пахіснулася, зрабіла дватры павольныя крокі і са стогнам лягла на зямлю. Працяглы, звонкі дзіцячы крык запоўніў раптоўную, жудасную цішыню. Салдат зноў азірнуўся і, утуліўшы галаву ў плечы, хутка пайшоў з двара.

Назаўтра на могілках, за разбуранай вёскай, хавалі загінуўшых яе жыхароў. Прыбітыя горам, нешчаслівыя людзі апусцілі ў адну шырокую яму маленькую труну дзіцяці і вялікую труну яе маткі. Людзі плакалі і бедавалі над сваім і чужым горам. Над свежым насыпам стаялі двое сірот. Зося выглядала дарослай. Смутак змяніў дзіцячы твар. У шырока раскрытых сініх вачах Надзі па-ранейшаму было спакойнае здзіўленне. Яна нічога не разумела. У яе быў свой, асаблівы свет, у які яшчэ не прыходзілі няшчасці.

У той жа дзень пачаўся бой за маленькую вёску над сажалкай. У полі, у жыце і на агародах вёскі, дзе была засень канаплі, у садах, пад разветлымі яблынямі стагналі і паміралі людзі. Вёска згарэла дашчэнту, жыхары паразбегліся. Зосю і Надзю разам са сваёй сям'ёй, калі сціх бой, увечары сусед павёз у мястэчка.

Яны прыехалі туды раніцой. Скрозь па дарозе ішлі фурманкі. Ваенныя абозы скідалі з дарогі

ў канавы нагружаныя ўбогім скарбам падводы ўцекачоў. Ліхія панскія уланы спявалі песні, гойдаючыся ў сёдлах, стогн і лямант, лаянка і крыкі стаялі над мястэчкам, дзе здарыўся затор, трашчалі аглоблі, іржалі і храплі коні. Уланскі полк пракладаў сабе дарогу.

Тады здарылася нечаканае. Ліхія уланы раптам пачалі з'язджаць з дарогі. Яны пераскоквалі праз канавы і, азіраючыся, шпорылі коней. Адны ляцелі ў поле, другія ўзбоч дарогі імчалі ў мястэчка. Некаторыя з іх завязлі між падвод і працавалі клінкамі. Узмацніліся трэск, грукат і крыкі, каманда і лаянка. Афіцэр на рыжым жарабку махаў шабляй, склікаючы сваё войска. Недзе застукаў кулямёт, затрашчалі стрэлы вінтовак.

Моцны гул набліжаўся аднекуль, як надземны гром. Людзі ўбачылі з дарогі нешта падобнае да чорнай хмары, што хутка імчала па полі.

— Чырвоныя! — закрычалі людзі.— Чырвоныя ідуць!

У фланг уланскаму палку, які расцягнуўся на дарозе і заблытаўся ў падводах, шырокім велізарным поўкружкам, ахопліваючы поле, са страшным гулам конскіх капыт, без адзінага стрэлу і выкрыкаў, бліскаючы клінкамі, ішла ў атаку чырвоная конніца, і над ёй шматком чырвонага полымя трапятаў сцяг.

Гул узмацняўся, чутно было храпенне коней. Па дарозе каціласа частая, бязладная страляніна. І тады, пакрываючы стрэлы і крыкі, загрымела над полем:

— Ур-р-ра-а!..

Зося памятае кавалерыста, які першым дасягнуў дарогі. З выскаленай зяпы каня падала пена, конь храпеў, раздзімаючы ноздры, налітыя крывёй вочы былі вачыма звера. Коннік дагнаў афіцэра, які махаў шабляй і склікаў салдат. Сталася

нешта такое, ад чаго шыкарны улан адкінуўся назад і, схапіўшыся за галаву, недзе знік. Больш нічога не захавала дзіцячая памяць Зосі.

Не памятае яна і таго, якім чынам яна апынулася ў мястэчку, з якога былі выбіты белапалякі адным ударам будзёнаўцаў. Не памятае яна і таго, дзе падзеліся суседзі і, галоўнае, дзе і калі знікла маленькая Надзя. Зося захварэла ў той-жа дзень, і калі паздаравела, прайшло два тыдні. Змарнелая, дзяўчынка доўга хадзіла па мястэчку, распытваючы пра сястру. Ніхто нічога не мог ёй сказаць. Была вайна, людзі з'яўляліся і знікалі назаўсёды, былі пажары, і разбурэнне, і смерць.

Зося не ведала, што Надзю знайшоў на дарозе чырвоны камандзір і ўзяў яе да сябе на сядло. Ён даведаўся ад дзіцяці толькі імя. Больш Надзя нічога не магла яму расказаць. Ён гладзіў сваёй жорсткай рукой светлыя валаскі дзіцяці, у вачах якога быў сіні і чысты спакой. Байцы насілі дзіця на руках, здабывалі для яго прысмакі, і калі часць выходзіла з мястэчка, камандзір зноў узяў Надзю на сядло. Ён аддаў яе потым у дзіцячы дом пад сваім прозвішчам, і ад імя байцоў папрасіў добра даглядаць дзіця. У тым жа выпадку, калі дзіця згубіцца, ён сказаў, што знойдзе вінаватых хоць бы на дне мора. Пасля гэтага камандзір сеў на каня, і часць пайшла цяжкімі сваімі баявымі дарогамі.

А гаротныя дарогі сірот, адзінокіх і абяздоленых, прывялі б іх у горкае, беспрасветнае жыццё, якім жылі іх дзяды і бацькі. Але год, у які разлучыліся Зося з Надзяй, быў апошнім годам цярпення і пакут народа.

Гэта быў 1920 год.

* * *

Прайшло шмат гадоў... Краіна, на палях якой некалі грымеў пажар вайны, расквітнела бязмерным багаццем здабыткаў, вялікай радасцю свабоднага жыцця. У сталіцы рэспублікі адкрыўся з'езд Саветаў, для таго каб прыняць закон, вышэйшы за ўсе чалавечыя законы...

Аднойчы група дэлегатаў наведала дзяржаўны тэатр. Артысты з захапленнем сустрэлі сваіх гасцей. Канцэрт, утвораны для іх, быў выключным па таленавітасці выканання, па сіле мастацтва. Асаблівым было выступленне маладой спявачкі. Стройная, яснавалосая дзяўчына спявала некалькі разоў, яе выклікалі і зноў прымушалі спяваць.

— Артыстка Вароніна,— сказаў дырэктар тэатра,— у заключэнне праспявае ўласную сваю песню «Дачка эскадрона». Тэкст напісаны самой артысткай, музыку напісаў кампазітар...

Прозвішча кампазітара ўчулі не ўсе. Словы дырэктара патанулі ў шуме апладысментаў. Артыстка пачала песню. Гэта была песня радасці і ў той жа час поўная лёгкага смутку, калі высокі голас спявачкі гаварыў людзям аб тых, хто аддаў жыццё за шчасце свайго народа. Калі артыстка скончыла — некаторы час у велізарнай зале тэатра была цішыня. Гул авацыі нізрынуўся ў гэтую цішыню, як горны абвал.

Пасля артысты запрасілі сваіх гасцей на абед. Артыстка Вароніна сядзела за сталом побач з нейкім пажылым камандзірам. Ён не адносіўся да дэлегатаў і тым больш да акцёраў. Спявачка была ў цэнтры ўвагі. Хутка ўсе даведаліся, што пажылы камандзір — бацька артысткі.

Калі абед заканчваўся, з падзякай ад імя дэлегатаў з'езда выступіла жанчына. Яна была ся-

рэдніх гадоў, апранутая проста. На яе грудзях быў ганаровы знак краіны.

— Я не магу без хвалявання ўспомніць песню артысткі Варонінай,— сказала дэлегатка.— Гэтая праўдзівая песня ўзята з жыцця нашай таленавітай спявачкай і паэтэсай... Гэта — чыстая праўда, таварышы... Савецкія жанчыны былі і байцамі і дзецьмі байцоў. Мы дорага заплацілі за сваю свабоду, мы шмат памятаем ахвяр!.. Наша шчаслівае і творчае жыццё мы здабылі ў цяжкіх баях, коштам вялікіх утрат... І калі вораг памкнецца ступіць сваёй паганай драпежніцкай нагой на нашу дарагую зямлю, мы, свабодныя жанчыны Краіны Саветаў, дзеці байцоў, станем побач з нашымі бацькамі, мужамі і братамі. І мы яшчэ раз адплацім ворагу за пагібель нашых дзяцей, матак і сясцёр... Я хвалююся, таварышы, але я хачу вам расказаць аб тым, што навеяла на мяне песня артысткі Варонінай...

— Гэта дырэктар фабрыкі,— гаварылі пра дэлегатку за сталом.

І яна пачала расказваць. Яна не заўважала, як пад канец яе расказа змяніўся твар Варонінай, як усхваляваўся спакойны, нават флегматычны камандзір.

— ...так я згубіла сваю маленькую Надзю...— задумана, у глыбокай цішы гаварыла жанчына з ордэнам,— і мне хочацца думаць, што яе ўзяў да сябе на сядло камандзір, што яна была дачкой эскадрона і засталася жывой і шчаслівай, бо ў нашай краіне няма нешчаслівай жанчыны.

У гэты момант нехта дакрануўся да пляча дэлегаткі. Перад ёй стаяла артыстка Вароніна. У сініх, шырока адкрытых вачах спявачкі былі слёзы, і радасць, і боль.

— Сястра!..— ціха сказала яна.— Сястра мая!

1937

БАРЫС САЧАНКА

(нарадзіўся ў 1936 г.)



ХЛЕБ

Было гэта даўно. Адразу ж пасля вайны. ...Маці прынесла аднекуль акрайчык хлеба. Доўга-доўга любавалася ім, паварочвала і так і гэтак, нюхала, разглядала, нібыта не верыла вачам сваім, што на далоні ў яе ляжыць хлеб — сапраўдны жытні хлеб, спечаны з чыстай, без ніякае домесі, мукі, на подзе печы, на свежым дубовым лісці, прожылкі якога так прыгожа адбіліся на скарынцы. Потым яна нейк, як мне падалося, аж надта борзда і неахайна разламала акрайчык напал: адзін кавалак падала мне, а другі палажыла на стол, пад абрус.

— Гэта Толіку... Вернецца з лесу — то павячэрае...

Сама ж, узяўшы ў камешніку капаніцу, пайшла на гарод акопваць бульбу.

Я вельмі хацеў есці. І той кавалачак хлеба, што дала мне маці, з'еў, праглынуў мігам. І, вядома, ані не наеўся, толькі растравіў яшчэ больш свой голад. Хвілін колькі я не мог нідзе знайсці сабе месца — чамусьці лазіў на печ, пад ложак, выбягаў на двор і зноў — каторы раз! — вяртаўся назад у хату. Потым усё ж не вытрымаў. Падсеў да стала, адгарнуў абрус, узяў у сваю руку той кавалачак хлеба, што пакінула была маці Толіку, майму старэйшаму брату. Не есці ўзяў. Проста так, паглядзець. Палюбавацца хлебам, як любава-

лася кагадзе маці. І тады раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла, брату пакінула хлеба намнога больш, чым дала мне. Ад братавага кавалачка я адшчыпнуў крошачку. Толькі крошачку. Адну маленечкую, малюпасенькую крошачку. Укінуў яе ў рот. Пачаў жаваць. Калі пракаўтнуў жованае, не заўважыў, як пальцы мае самі, не пытаючы ў мяне на тое згоды, адшчыпнулі яшчэ крошачку. Зноў маленечкую, малюпасенькую крошачку...

...Схамянуўся я тады, калі на маёй далоні асталася абшчыпаная з усіх бакоў скарыначка. Што я нарабіў? Што скажуць маці, брат, калі вернуцца дахаты?..

Хуценька-хуценька я палажыў скарыначку на стол, акрыў яе абрусам. Але спакуса з'есці хлеб увесь, каб і духу яго не было ў хаце, каб ім і не пахла нават, была такая вялікая, такая неадольная, што я не выцерпеў — зноў падсеў да стала, узяў скарыначку ў рукі і ўкінуў яе ў рот...

Брат вярнуўся з лесу, як заўсёды, позна, на змярку. Ён цэлы дзень абсякаў на леспрамгасаўскай дзялянцы сучча, зарабляў грошы, каб было за што нашай сям'і жыць. Дома есці ў нас не было нічога, хоць вазьмі ды хату запалі. І спаць брат лёг у той вечар галодны. Ён доўга варочаўся на пасцелі, не засынаў: няйнакш, яму мроіўся той кавалачак хлеба, які пакідала яму маці і які з'еў я...

Ніхто — ні маці, ні Толік — ні ў чым не папракнулі. Ні ў той вечар, ні пасля. Яны былі старэйшыя, я меншы, і яны мяне вельмі любілі, шкадавалі...

Але калі я цяпер успамінаю той хлеб, які належала з'есці брату і які з'еў я, і той вечар, калі брат лёг праз мяне спаць галодны, мне робіцца не па сабе. Здаецца, аддаў бы ўсё, каб толькі не

было ў мяне такога ўспаміну, каб як-небудзь пазбыцца, выкінуць яго са сваёй галавы. Лепей бы я быў тады галодны, лепей бы я лёг спаць не еўшы! Хай бы не я, а брат з'еў мой хлеб!..

Ды не! Таго, што было, не вернеш, не пераробіш. І з памяці сваёй, як бы ні хацеў, не выкінеш. Не, не выкінеш!..

1969

СОНЦА

Раніцою мяне будзіць голас. Ціхі, пяшчотны, быццам гуд руплівай пчалы, ён то вісіць над самым маім вухам, то раптам кудысьці знікае на нейкі час. Праз сон да мяне даходзяць словы:

— Максімка, сыночак... Ці ж гожа так позна мужчыне спаць?.. Уставай...

Я неахвотна расплюшчваю вочы. Нада мною схілілася маці.

— Прачнуўся,— радасна ўсміхаюцца яе тонкія бледнаватыя вусны...— Малайчына... А я і снедань не табе прыгатавала. Чуеш?..

Павекі такія непаслухмяныя, цяжкія, што самі насоўваюцца зноў на вочы. Але ўставаць трэба. У хаце я ды маці. Адна яна ніяк, ніяк не ўправіцца. Перамагаючы салодкую дрымоту, я выскокваю з-пад клятчастай посцілкі на халаднаватую падлогу. Пацягваючыся хвілін колькі, працiраю вочы. Потым умываюся, сядаю за стол. Тут мяне ўжо чакаюць цёплы сыradой у меднай конаўцы, луста пахкага, спечанага на дубовых лістах хлеба, тры-чатыры беласнежныя драбкі цукру. Я, амаль не адчуваючы смаку, ем і выбягаю на панадворак.

Сонца толькі-толькі пачынае запальваць агні

ў шыбах суседскай хаты. Прыпалая расою, зямля абдае золкай прахалодай ногі, ліпне між пальцаў, да ступні. На страсе хлява шчабеча ластаўка. Кудахтаюць і квохчуць на гародзе куры. Брухаты рабы парсючок, скруціўшы абаранкам хвост, і белая свінка згрызваюць паўз платы шызую ад расы мураву.

Я адчыняю весніцы і з крыкам выганяю на вуліцу свіней. І адразу ж падаюся назад.

Проста на мяне, збіваючы да крыві аб каменне і груды босыя ногі, бяжыць цыбаты Гараська. Гараська Бусел. Крыссе старой, шмат дзе парванай і прапаленай ватоўкі, расхлістаны. Валасатая, рабрыстая грудзіна, нічым не прыкрыта. Адна калашына штаноў, забруджаных так, што не пазнаць ні колеру, ні самога матэрыялу, закасана па калена. Бяльматыя вочы, з якіх так і б'е неўтаймаваны жах, палахліва скіроўваюцца назад, на сонца. Яно чырвоным іскрыстым шарам выкочваецца з-за засмужанай сінявы лесу. Гараськавы рукі хапаюцца за астрыжаную галаву. Плечы яго прыгінаюцца ніжэй, а вусны ў адчаі шэпчуць:

— Сонца... Сонца... Сонца...

Я добра ведаю, куды імчыць Гараська. На полі, за вёскаю, на стыку трох дарог трасецца на ветры абсмаленая з камля груша-дзічка. Адна яе галіна прыпадзе ледзь не да самай зямлі. Непадалёку ад грушы, на пагорку, сівеюць два вялізныя камяні. Гэта рэшткі старога ветрака, што спалілі ў вайну немцы. Камяні папсавала агнём: адзін, ніжні, лопнуў пасярэдзіне, у другога адкалоўся ад боку даволі-такі ладны кавалак. Тут і прыпыняецца Гараська. Доўга ходзіць вакол, пільна ўглядаецца сабе пад ногі, нібы нешта шукае. А вусны яго ўвесь час варушацца, нешта шэпчуць.

Аднойчы я падкраўся пшанічным клінам

да грушы і падслухаў Гараську. Ён паўтараў:

— Няма сонца... Няма сонца...

Пад позняе снеданне мы гонім назад у вёску свіней. Звоняць да болю ў вушах конікі. Весела ляскочуць па полі, адвозячы на працу калгаснікаў, запрэжаныя ў паркі коней калёсы. У гэты час вяртаецца з-пад дзічкі і Гараська. У руках у яго заўсёды што-небудзь жывое: авадзень, муха ці божая кароўка. Ён спявае:

А чаму ж ты, мушка, не ляціш?
А чаму ж ты, мушка, не бяжыш?
А таму я, сватка, не лячу,
А таму я, сватка, не бягу,
Што без крылляў я-а-а.. Хі-хі...

Ён смяецца спачатку ціха, хіхікае, пасля рагоча. Хоць мы, свінапасы, не першы раз чуем яго нялюдскі смех, але нам робіцца страшна. Гараська ніколі нікога не зачапіў і пальцам, але мы ўсё роўна баімся яго. Без жалю сцёбаем дубцамі свіней па тлустых азадках і бяжым, уздымаючы шэрыя воблакі пылу, бяжым у вёску.

Старэйшыя людзі расказваюць: да вайны Гараська быў зусім не такі. Наадварот, яго розум і дапытлівасць здзіўлялі нават настаўнікаў. Пяты і шосты класы хлопец закончыў у адзін год на «выдатна». Ён маляваў, і адна яго карціна пабывала на абласной выстаўцы і атрымала не то другую, не то трэцюю прэмію.

А сталася непапраўнае з Гараськам у той дзень, калі фашысты палілі нашу вёску. Усю моладзь яны загналі ў стайню. Страчылі з кулямётаў і аўтаматаў у расчынёныя вокны і дзверы, пакуль не змоўклі крыкі. Пасля аблілі сухія вуглы і чаротавую страху бензінам і падпалілі...

Гараську Буслу аднаму з усёй вясковай мо-

ладзі ўсё ж неяк удалося ўцалець ад кулі і выскачыць з ахопленай агнём будыніны. Узмежкам, паўз высокае жыта, ён дабег аж у канец вёскі. Там якраз дагараў млын. Распаленыя камяні падаліся яму, відаць, сонцам, якое апусцілася і спаліла ўсё навокал.

Там выпадкова натрапілі на Гараську назаўтра партызаны. Кажуць, што ён адчайна адбіваўся нагамі, кусаў усіх, хто да яго падступаў, за рукі і нема крычаў:

— Сонца! Не хачу сонца...

1959

ІВАН СІНЯЎСКІ

(нарадзіўся ў 1919 г.)

СУСЕДСКІЯ ДЗЯЎЧЫНКІ

Бабка Мар'я некалі мела сям'ю: мужа і трох сыноў. Але пачалася Вялікая Айчынная вайна, і ўсіх мужчын забралі на фронт.

Чатыры гады чакала бабка Мар'я сваіх з вайны. Ды так і не дачакалася. Засталася яна адна. Пакуль магла, хадзіла ў калгас на работу. А як аслабела, пайшла на пенсію. Старасць — не радасць. Цяжка ёй адной. А трэба ж за ўсім прыгледзець: і ў агародзе, і на двары, і ў хаце.

І вось бабуля пачала заўважаць, нібы яе работа сама сабой робіцца. Праўда, як і здароўе, так і памяць старой аслабелі. Але ж, здаецца, яна памятала, што збіралася ў гэты панядзелак выпаласць кветнік. Пасля апошняга дажджу трава ў ім пазаглушала кветкі. Пра тое, што збіраецца палоць кветнік, бабка Мар'я нікому не гаварыла. А прыйшоў панядзелак, пайшла бабка ў кветнік і вачам сваім не паверыла: каб дзе травінка! Пачала ўспамінаць, калі гэта яна кветнік палола. І ніяк не магла ўспомніць.

Неўзабаве зноў здарылася ў бабкі Мар'і дзіва. Сабралася яна ісці па ваду, глядзіць, а вёдры паўнюсенькія. Не паспела яна забыцца пра гэта, як зноў нечаканасць — двор чысты, хоць кашу кладзі. А чаго толькі не было ў яе на двары: і трэсак, і смецця рознага. Вядомая рэч — гаспадыня нямоглая. Сагнуцца цяжка, дзе ўжо за

чыстатой двара глядзець. У хаце падлогу памыць і то няма сілы. Бабка Мар'я толькі плячыма паціскала.

Аднойчы старая вырашыла наведаць даўнюю сяброўку — бабку Акуліну. Жыла тая ў гэтай вёсцы, толькі ў другім яе канцы. Хацела старая дзверы замкнуць, але не знайшла замка.

«Ат, хто ў маю хату палезе»,— падумала яна і выйшла на вуліцу.

Непадалёк гулялі ў класікі суседскія дзяўчынкі.

— Паглядзіце за маёй хатай,— папрасіла яна.— Я да Акуліны схаджу. Даўно не бачылася з ёю...

— Добра, добра, паглядзім,— у адзін голас сказалі дзяўчынкі.

Акуліну бабка Мар'я дома не застала і вярнулася дамоў. Зайшла на двор — дзверы хаты зачынены.

— Хто ж гэта там? — занепакоілася старая.

Заходзіць у хату, а там суседскія дзяўчынкі Анька, Валька і Танька падлогу мыюць.

«Вось хто мне памагае,— з удзячнасцю падумала бабка Мар'я.— Якія слаўныя дзяўчынкі!»

1968

МІХАСЬ СКРЫПКА

(нарадзіўся ў 1907 г.)



«ЦЕПЛАВОЗ»

Сцяжынкай у парку
Між ліп і бяроз,
Ахутаны парай,
Паўзе «цеплавоз»

У шубе аўчыннай,
У шапцы зайчынай,
У валёнках новых,
Пальчатках пуховых.

З-пад матчынай хусткі
Тырчыць толькі нос.
Куды ж сцежкай хрусткай
Паўзе «цеплавоз»?

На полюс, магчыма,
Сабраўся, дзівак?
Нашто ж за плячыма
Канькі і рукзак?

. . . . . .

А вы не пазналі?
То ж мамчын сынок —
Распешчаны Алік
Паўзе на каток.

1973

ШЧУПАК

Рэчка, сажалка, рака
добра знаюць шчупака.
Ён плыве за ўсіх шпарчэй,
рыбкам гора: не ўцячэш.
Ды пражэрлівы такі
сам трапляе на кручкі,
На жыўца,
часамі ў нерат —
ні назад тады, ні ўперад.

1975

КАРАСЬ

Я люблю ў затоках гразь,
а імя маё — карась.
У гразі на самым дне
шчупакі не страшны мне.

1975

ДАІР СЛАЎКОВІЧ

(нарадзіўся ў 1932 г.)



СЯРГЕЙКА

Сяргейка выйшаў на вуліцу пагуляць. Спыніўся ля веснічак. У адзін канец вуліцы паглядзеў, у другі.

Куды падацца? Налева, праз тры дамы, стаіць трактар «Беларусь». З прычэпам. І нікога побач.

Пайшоў да трактара. Трактар — не навіна, кожны дзень можна ўбачыць. Але ўсё ж такі цікава.

Толькі Сяргейка вакол прычэпа абышоў, да кола пальцам дакрануўся, як з дома выйшаў дзядзька Іван, трактарыст.

— Скончыў тэхнічны агляд? Ехаць можна? — пытаецца.

— Я не правяраў,— засаромеўся Сяргейка. Потым узняў галаву і запытаў: — Вы куды цяпер, дзядзька Іван?

— У кар'ер. Па пясок. А што?

— Можна мне з вамі?

— Фіў! — прысвіснуў дзядзька Іван.— А што ты там рабіць будзеш?

— Слухацца буду,— паабяцаў Сяргейка.

— Слухацца? А дома на цябе не насварацца?

— Я папалуднаваў ужо. І трэсачкі пад паветку паскладаў.

— Ну, калі паскладаў... Тады, бадай, можна. На адзін рэйс.

Кабіна ў «Беларуса» высока ад зямлі. Дзядзька Іван падсадзіў Сяргейку.

Рухавік зачмыхаў, запрацаваў. Паехалі.

На выбоінах Сяргейку трасе, падкідае, а ён быццам не заўважае.

— Дзядзька Іван, я магу памагаць вам.

— Няўжо?

— Праўда.

— І чым жа?

— Руляваць.

Сяргейка падсунуўся бліжэй, ухапіўся за руль. Пачалі яны руляваць у тры рукі: дзве вялікія — дзядзькі Івана, адна маленькая — Сяргейкава. Да самага кар'ера гэтак ехалі.

Кар'ер — вялізная шырокая яма, адкуль пясок бяруць. Там працуе экскаватар са стралою і вялікім зубатым каўшом. Да яго пад'язджаюць па чарзе грузіцца самазвалы. Толькі цяпер чарга не рухаецца: сапсавалася нешта ў экскаватары. Экскаватаршчык сагнуўся ля матора, шукае няспраўнасць. Шафёры стаяць паблізу, перагаворваюцца.

— Давядзецца «пазагараць»,— нахмурыўся дзядзька Іван.

Ён вылез з кабіны і пайшоў да экскаватара.

А Сяргейка што — прывязаны? Хоць і высока, скочыў на зямлю.

Агледзець кар'ер з пагрызенымі жалезным каўшом берагамі шмат часу не трэба. Абабег яго Сяргейка, некалькі гладзенькіх каменьчыкаў падняў. На хвойкі маладыя, што растуць над саменькім абрывам, падзівіўся. Больш нічога цікавага не знайшоў.

Падаўся туды, дзе экскаватаршчык, шафёры ды дзядзька Іван у маторы корпаюцца. Патупаў, патупаў вакол і палез па прыступках на экскаватар. Да самай кабіны. Усеўся Сергей на сядзенне,

разглядацца пачаў. Колькі тут рычагоў, ручак розных! Раптам матор запрацаваў. Шафёры пайшлі да машын. Экскаватаршчык залез у кабіну, убачыў Сяргейку, пытаецца:

— Ты адкуль узяўся?

— На трактары прыехаў.

— Сам прыкаціў?

— Не, з дзядзькам Іванам. А вы цяпер у самазвалы пясок насыпаць будзеце?

— Буду.

— Доўга?

— Вокам міргнуць не паспееш.

— Я правым вокам хутка міргаю, а левым не навучыўся яшчэ.

Экскаватаршчык за рычагі пацягнуў. Страла адразу ўбок і ўніз паехала, а коўш угрызся ў пясок! Потым страла паплыла назад, спынілася над самазвалам — шух! — цэлы коўш пяску высыпаўся ў сталёвы кузаў.

— Здорава! — здзівіўся Сяргейка.

Хутка загрузілі ўсе машыны. Самазвалы паехалі, а дзядзька Іван высунуўся з кабіны, кар'ер аглядае.

— Ты каго шукаеш? — смяецца новы Сяргейкаў знаёмы.— Напарніка?

— Яго. Згубіўся недзе,— адказвае дзядзька Іван.

— Тут ён, у мяне. Зараз уніз спушчу.

...З пяском ехалі цішэй, чым паражняком, затое без бразгату. Па дарозе Сяргейка спытаў у дзядзькі Івана:

— А я трактарыстам змагу стаць?

— Чаму ж не? Зможаш, як вырасцеш.

— А дзе на іх вучацца?

— Вучылішча спецыяльнае ёсць. Толькі спачатку буквар і яшчэ шмат падручнікаў асіліць трэба.

— Буквар мне мама купіла... А мо лепш экскаватаршчыкам? — раіцца Сяргейка.

— Табе відней. Але — куды ні кінь — вучыцца спачатку ў звычайнай школе.

— Я ведаю. Сам увосень у першы клас пайду. У новую школу. Яе на суседняй вуліцы канчаюць будаваць.

— Канчаюць,— згадзіўся дзядзька Іван.— І мы вязём пясок якраз туды.

1975

МАРК СМАГАРОВІЧ

(нарадзіўся ў 1927 г.)

ПОДЫХ ВЯСНЫ

Узнялі пупышкі крыльцы
Пад акном маім,
Быццам пчолкі на галінцы,
Кволыя зусім.

Будзіць наваколле ўранку
Вераб'іны грай...
Смела, брат, граку вушанку
На гняздо аддай!

1980

ЖУРАЎЛІНАЯ ТРУБА

На нябёсах — хмарак вата.
Ледзь чуваць «курлы» здалёк.
— Хтосьці трубіць! Чуеш, тата?
— Гэта журавель, сынок...

З цвёрдай вераю ва удачу
Хлопчык лезе на вярбу.
— Хоць не зблізку, але ўбачу
Жураўліную трубу...

1981

АЛЕСЬ СТАВЕР

(нарадзіўся ў 1929 г.)

САЛАЎІ

Як толькі вясновы
Засвеціцца дзень,
Дзядуля з кіёчкам
Па вёсцы ідзе.

Вялікую кайстру
Нясе ён з сабой.
І дзеці
Яго абступаюць
Гурмой.

— Дзядуля!
Свісткі пакажыце!—
Крычаць.
Павольна ён кайстру
Здымае з пляча.

І з кайстры
таропка
Бяруць хлапчукі
Гліняныя цацкі —
Малыя свісткі.

...Яшчэ на бярозах
Не выбіўся ліст,
А ўжо салаўіны
Разносіцца свіст.

Старыя глядзяць
На сады і гаі:
— Адкуль узяліся
Зімой салаўі?

А трэлі разносяцца
Ў кожным двары...
Нарэшце адкрылі
Сакрэт жыхары:

— Дык гэта ж
Ганчар зарачанскі,
Хвядос,
Малым непаседам
Забаўкі прынёс.

Не будзе цяпер ім
Спакою і сну...
Раздаў ім Хвядос
Не свісткі,
А вясну.

1970

ЯК ЗРОБЛЕНЫ ЦАЦКІ?

У Дзяніскі сёння свята —
Цацак дзед прынёс багата:
Верталёцік, самаходку
І пластмасавую лодку,
Матаролер і машыну
З размалёванай кабінай.
Рад Дзяніска, вельмі рад,
Ён паставіў цацкі ў рад.
Перш узяўся за машыну —
Адвінціў ураз кабіну,

Потым колы паздымаў.
Верталёцік паламаў.
Разабраў на дзіва скора
Самаходку, матаролер.
Дзед убачыў, забубніў:
— Што ты з цацкамі зрабіў?
Не купляў бы я, каб ведаў,—
А Дзяніска кажа дзеду:
— Мне карцела разабрацца,
Як жа зробленыя цацкі.
А ва ўсім як разбяруся —
Цацкі зноў збяру, дзядуся!

1981

ІВАН СТАДОЛЬНІК

(нарадзіўся ў 1941 г.)



БОТЫ

Калі быў хлапчуком я дасужым і смелым,
Вельмі часта на кут заглядаўся употай,
Дзе, ахутаўшы дбайна хусцінкаю белай,
Маці моўчкі павесіла бацькавы боты.

Я прасіў, каб дазволіла ў іх мне матуля
Пафарсіць хоць разок прад сябрамі сваімі,
А яна, як заўжды, мяне к сэрцу прытуліць,
І слязінкі бліснуць у яе пад вачыма:

— Не чапай мех, сынок! Можа, вернецца бацька,
Можа, дзесь ён ужо дабіраецца з фронту,
І тады ў цябе будуць такія, як цацка,
Па назе — адмысловыя, новыя боты.

Час ішоў. Я падрос. І лісток пахавальны,
Можа, сотню разоў прачытаў разам з ёю,
А яна — памаўчыць, за навуку пахваліць
Ды кране пасівелыя скроні рукою.

Тыя боты даўно мне малыя памерам...
Акружаюць мяне у жыцці ўсе даброты,
Але нават цяпер, як хто стукае ў дзверы,
Маці позірк кідае на бацькавы боты.

1963

ІВАН СЯРКОЎ

(нарадзіўся ў 1929 г.)



САНЬКА АБЯЗЗБРОЙВАЕ ВОРАГА

(З аповесці «Мы з Санькам у тыле ворага»)

Ляціць над лугам на павуцінні бабіна лета. Адцвітаюць у траве апошнія краскі. Сонца прыпякае, як у жніўні.

А Санька нічога гэтага не хоча заўважыць, усю дарогу ён праклінае сваю збродлівую казу.

Пад самай вёскай на балоце, у густых зарасніках лазы, мы наткнуліся на незнаёмага чалавека. Ён выйшаў нам насустрач з-за куста так нечакана, што ўцякаць ужо было позна. Першае, што нам кінулася ў вочы, гэта перавязаная акрываўленай анучай рука. Разглядзелі больш уважліва — юнак гадоў васемнаццаці, абарваны, стомлены, мурзаты і худы.

— Вы з гэтага сяла? — спытаў ён.

— З гэтага,— насцярожана адказаў Санька.

— Немцы ёсць?

Мы з Санькам пераглянуліся: чаму гэта ён пра немцаў пытае? Хто ж ён такі?

— Не ведаем. Мы кароў у Плёсах пасвім,— растлумачыў я незнаёмцу.

— А хлеба ў вас не знойдзецца?

Хлопец акінуў нас галоднымі вачыма і, відаць, зразумеўшы, што пытанне гэта лішняе, уздыхнуў і сеў на купіну.

Крыху асвоіўшыся, мы асмялелі, і Санька спытаў:

— А ты хто такі?

— Аніхто, — адказаў хлопец. — Прынясіце лепш хлеба. І паглядзіце, ці ёсць немцы ў вёсцы.

— Ты, можа, партызан? — пытаецца Санька.

— Можа,— паціснуў плячыма хлопец і загадаў: — Ану, хутчэй!

— А нас возьмеш з сабой? — таргуецца мой сябар.

Хлопец крытычна агледзеў нас з галавы да ног і адрэзаў:

— Без зброі не бяром.— А потым пужнуў: — Ну?!

Мы пусціліся з усіх ног выконваць яго даручэнне. Нарэшце такі мы сустрэлі сапраўднага партызана! Цяпер трэба не ўпусціць моманту і прасіцца ў атрад, трэба штосьці такое зрабіць, каб паказаць, што мы баявыя, геройскія хлопцы. Тады нас прымуць без размоў, не паглядзяць, што няма і па трынаццаць.

Немцаў у вёсцы амаль у кожным двары. Толькі нашу хату абмінулі. Затое ў Санькавай размясціўся афіцэр. Цётку Марфешку выгналі ў сенцы, але ў сенцах па начах холадна, і яна спіць у суседзяў.

Мы аббеглі ўсе вуліцы, ткнулі насы ва ўсе двары, у завулкі. Санька налічыў дзесяць грузавікоў, а я дванаццаць і дзве легкавыя машыны. Санька збегаў і да палявой кухні, дзе салдаты атрымлівалі абед. Праўда, тут яго заўважыў повар і адразу ж запрог — прымусіў цягаць з калодзежа ваду. Хлопцу гэта не спадабалася. Ён прывалок два вядры і, як толькі немец адвярнуўся, даў драла.

Дамоў ён прыйшоў апоўдні. Каза спакойна стаяла ў хлеўчыку і ела траву. У сенцах нікога не было. Затое, калі Санька сунуў нос у пярэднюю хату, адтуль рыкнула:

— Цурык!

Відаць, гэты афіцэр — важная птушка, калі пад вокнамі ў двары ўвесь час таўчэцца вартавы, а ў пярэднюю хату не толькі што Саньку і яго маці нельга заходзіць, самі немцы заходзяць баязліва.

Што робіцца за зачыненымі дзвярыма, не можа бачыць ніхто. Ніхто, апрача Санькі. Дашчаная перагародка калісьці была аблеплена каляровымі паперкамі і старымі газетамі. Аднак клей, звараны з мукі, вельмі спадабаўся мышам. Цяпер сцяна абшарпаная не горш за Санькавы штаны.

У адной з дошак, якраз супраць печы, быў калісьці невялікі смаляны сучок. Санька неяк раней прабіў у сучку дзірку, накрышыў у яе серкі з запалак, заткнуў зверху цвіком і агрэў як мае быць абухом. Хацеў, каб пеканула. А яно не пеканула. Сучок разам з цвіком выскачыў у пярэднюю хату, і атрымалася добрая, гладкая, круглая адтуліна. Праз яе відаць усё на свеце.

Спачатку за перагародкай нічога цікавага не было. Здаравенны афіцэр з шырокай чырвонай патыліцай, якая складваецца над каўняром гармонікам, разглядае карту. Другі сухі, як кіёк, перавязаны рэменем, стаіць побач і робіць выгляд, што яго карта таксама цікавіць. Спачатку яны мірна паміж сабой гергеталі, затым таўсташыяму штосьці не спадабалася, і ён закрычаў, пырскаючы слінай. Чым далей, тым больш яго разбірала. Нарэшце ён грымнуў па стале кулаком, і сухі немец выскачыў за дзверы чырвоны, быццам печаны рак.

«Ух і злосны ж»,— падумаў Санька. У яго ўжо здранцвелі ногі і самлела спіна. Сядзець, сагнуўшыся ў крук, вельмі нязручна.

Па падлозе прагрукаталі салдацкія боты, гэта немец панёс белы эмаліраваны тазік і ручнік.

Начальнік, зняўшы з сябе мундзір, таксама пайшоў на двор — будзе мыцца.

На стале побач з тоўстай скураной сумкай паблісквае чорнай халоднай сталлю пісталет. У Санькі ёкнула сэрца. Вось яна, зброя.

— Узяць, узяць, узяць,— застукала кроў у вісках.

— А калі зловяць? — на нейкі момант завагаўся Санька. Але без зброі і ў партызаны не бяруць.

Гэта адбылося на працягу адной хвіліны. Санька хуценька выскачыў з-за мяшка з просам, на пальцах падбег да дзвярэй і ўзяўся за ручку. З-за коміна саскочыў кот, якога маці прынесла замест павешанага радыстам Паўлем. Саскочыў, быццам кованы конь. Санька аж уздрыгнуў.

Ніхто ніколі не чуў, каб дзверы ў гэтай хаце рыпелі. А тут, калі трэба прашмыгнуць ціха, яны рыпнулі старымі, нямазанымі варотамі. Аж у грудзях пахаладзела.

Тры хуткія крокі, і пісталет у руках. Куды яго? З пісталетам на вачах у немцаў не выскачыш. Ён адцягнуў кішэню так, што штаны трэба трымаць рукамі. Загнаным зверам Санька аглянуўся на дзверы, на вокны. У двары маячаць каска і штык. Акно на вуліцу прыадчынена. За вокнамі дашчаны плот, яблыня і густы высокі бульбоўнік.

— Шух-х! — зашамацеў бульбоўнік, і пісталет знік пад пажаўцелым ужо лісцем.

Санька глянуў на дзверы.

— Шух-х! — паляцела наўздагон за пісталетам і палявая афіцэрская сумка.

У сенцах Санька схаваўся за ступу і прыціх. Сэрца калоціцца, нібы злоўлены верабей. Нават у пот кінула. Нават дыхаць перастаў. А немец фыркае на двары маржом.

«Чыстаплюй!» — са злосцю падумаў Санька. Глянцавыя хромавыя боты прагрукаталі за два крокі ад Санькі. Таўсташыі фашыст, асвяжыўшыся, быў у добрым настроі. Ён на хаду выціраў свае гладкія ружовыя шчокі і напяваў вясёлую песеньку.

Як толькі ляпнулі дзверы, Санька выскачыў з-за ступы, але на парозе сутыкнуўся з салдатам і выбіў у яго з рук эмаліраваны тазік. Немец вылаяўся і паддаў нашаму камандзіру кованым ботам. Той куляй зляцеў з ганка і расцягнуўся пад самымі нагамі вартавога, які заржаў так, быццам яго казыталі пад пахамі. У сваю чаргу ён даў Саньку дабаўкі і закрычаў услед:

— Русь, русь!

У нашым двары Санька ніяк не мог аддыхацца.

— Пойдзем, калі добра сцямнее,— сказаў ён мне.— Трэба забраць пісталет і сумку.

Зразумела, што ні мой сябар, ні я нікому і не заікнуліся пра тое, хто нас чакае ў лазе на балоце і куды мы збіраемся. У такіх выпадках лепш трымаць язык за зубамі.

1967

НІНА ТАРАС

(нарадзілася ў 1916 г.)

НА ПАЛЯНЕ

На паляне повар Маша
Піянерам варыць кашу.
У вядры вада ўскіпела —
Наліла крыху вады,
Круп усыпала нясмела,
Солі кінула туды.
Ёй здалося, што замала —
Нахіліла з кацялка
І мяшалкай так мяшала,
Што самлела ёй рука.
А над вухам Міша зудзіць,
Стаў да Машы прыставаць:
— Колькі раз мяшаць ты будзеш?
— Адчапіся — дваццаць пяць.

У дзяўчыны твар праменны —
Стала поварам адменным.
І мяшала, і варыла,
Масла ў кашу палажыла.
Бачыць наш старанны повар —
Каша быццам бы гатова.
Толькі штосьці пацямнела,
Мабыць, трохі прыгарэла...
Ды якая вышла каша!
На здзіўленне проста наша.
Запах нейкі ядлаўцовы,
Нават крышачку смаловы —

18 Зак. 2563

Проста дзіва, што за смак,
Не нахвалішся ніяк!
Праўда, трохі многа солі,
Але гэта не бяда —
Ёсць крынічанька у полі,
Ёсць крынічная вада,
Налівай ды запівай...
— Маша, кашы дабаўляй!
Вось дык каша, вось дык каша,
Малайчына повар Маша!

1970

РАМАН ТАРМОЛА

(нарадзіўся ў 1936 г.)



КАГО БАЯЦЦА Ў ЛЕСЕ?

Свет зялёнага бязмежжа —
Белавежа... Белавежа...

У дзяўчынкі сэрца б'ецца.
— Баязліўка ты ў мяне...—
Кажа тата і смяецца.—
Звер малую не кране.

Напалохалася Вера,
Не трапляе зуб на зуб:
На яе з-пад елкі шэрай
Пазірае грозны зубр.
Самавіты, барадаты,
Акурат як дзед Яўхім.
Асмялела Вера: — Тата,
Гаварыць хачу я з ім:

— Ты добры цар у гэтай старане?

— Усё, што ёсць, навокал,
Усё, што ты акінуць можаш вокам,
Належыць мне.
Не крыўджу я маленькіх і слабых,
Ніколі я драпежнікам не быў,
Як даўні продак мой,
Люблю траву, люблю спакой.
Вось і цяпер іду я на спачын,
Пад елкаю з зубрыхай памаўчым.

— Пастой, скажы, каго баяцца мне?

Ды зубр нібыта страціў зрок і слых.
Тут побач заяц коса як зірне
І закрычыць: «Усіх баюся, ўсіх!»

Раптам побач шышка ўпала
І спалохала нямала
Нашу спадарожніцу,
Веру-асцярожніцу.
Падняла угору вочы —
На сасне агню клубочак
Па галіне коціцца,
Так злавіць і хочацца...

— Я — вавёрка, самая вёрткая.
Бегаю хутка, не сяджу ні мінуткі.

— Вавёрачка, я — Вера.
Якога мне баяцца звера?

Вавёрка страсянула ігліцу з галавы,
На дрэва сіганула і крыкнула: «Савы!
Бойся яе ўначы асабліва...»
І клубочак рыжы знік імкліва.
Як не было пышнахвостай рыжухі —
Быстрыя вочкі — хуткія рухі!

Вера з татам далей крочаць.
Камарыны ўсюды звон.
Бацька жмурыць хітра вочы:
— Паглядзі... Вось і загон!

Вера следам напрасткі.
Зірк туды — а там дзікі,
Шэрсць на хібе, як цвікі.
У рашучай сталі позе,

На яе кіруюць позірк.
Побач з імі парасяткі,
Быццам зебры-паласаткі,
Доўжанькімі рыльцамі
У канаве рыюцца.
Іх пільнуюць кабаны,
Злосна рохкаюць яны.

— Мы дзікі-секачы,
Маем іклы, як мячы.
Мы іх точым на ваўкоў,
Бо яны з усіх бакоў
Дзень і ноч пільнуюць статак,
Каб пакрасці парасятак.

Больш няма чаго пытацца:
Ведама, каго баяцца.

Пад ялінаю густой
Хтось храпе...
— Чакай! Пастой!
Гэта ж, мусіць, касалапы
Смачна спіць, падклаўшы лапы?!

Задрыжалі ў Веры ногі:
— Што, як выскачыць з бярлогі?

— Вось дык цуд! Вось дык дзіва!
Ты навошта разбудзіла?

— Што ты, Мішка-баламут?
Я прыйшла адно спытацца:
Мне каго баяцца тут?

Перастаў мядзведзь таптацца
І зароў страшэнна, дзіка:

— Бойся цырка! Бойся цырка!
Там, гавораць, не падрэмлеш.
Там не мёд, а цукар дрэнны!

...Нечы позірк працінае
Веру быццам бы наскрозь...
Што рабіць — сама не знае.
Ды нарэшце вось ён, вось...

— Дзень добры, дзяўчынка!
Я — рыжая ліска...
Што хочаш пытай,
Не падходзь толькі блізка...

Я зараз не ў форме...
Як бачыш, ліняю.
А ты гавары,
Слых цудоўны я маю...

— Жывеш ты ўсюды —
у казках, у лесе.
Табе ззяе сонца, і зоркі, і месяц.
Скажы, калі ласка,
зрабі гэту міласць:
Каго мне баяцца?

— Страшней за ўсё хітрасць!

Ліса замахала
Пушыстым хвастом
І ў момант растала
Між дрэў і кустоў...

Як вярталіся дахаты,
Вера бацьку вінавата
Тузанула за рукаў:
— А чаму, скажы мне, тата,
Не сустрэлі мы ваўка?

— Ай, дачушка! От сініца!
Воўк у пушчы у любой
Больш за ўсё людзей баіцца,
Гэта значыць — нас з табой.

* * *

Вера спіць. Плыве двухрогі
Ясны месяц у акне.
— Не баюся я нікога,—
Прашаптала Вера ў сне...

1973

ПАВЕЛ ТКАЧОЎ

(нарадзіўся ў 1930 г.)



НАКАЗ

Зранку Уладзімір Ільіч праводзіў пасяджэнне Савета Працы і Абароны. Яно зацягнулася. Адразу ж пасля пасяджэння Ленін паехаў на сход рабочых аднаго маскоўскага завода. Некалькі дзён назад рабочыя папрасілі Уладзіміра Ільіча выступіць перад імі.

Вярнуўся з завода, нават не паспеў у кабінет прайсці — тэлефаністка паведаміла:

— На провадзе камандуючы Заходнім фронтам. Просіць некалькі хвілін.

Ільіч цікавіўся ў камандуючага ўсім: ці ёсць зброя, як з харчаваннем, вопраткай... Пад канец сказаў:

— Галоўнае — людзей беражыце.

Затым пайшлі хадакі ад сялян. Наперадзе стары з сівой вялізнай барадой.

— Праходзьце, таварышы. Сядайце,— запрасіў Уладзімір Ільіч.

— Ды мы... прабачце, пастаім,— камечачы ў руках шапку, адказаў сівабароды.

— Ну, гэта вы дарэмна. У нагах праўды няма. Хіба не так кажу? — звярнуўся Ленін да сялян.

Усе засмяяліся. Прыселі на крэслы.

Гутарку пачаў стары, звалі яго Іванам Андрэевічам.

— Прыйшлі да вас, Уладзімір Ільіч, са скаргай на свой Савет. Цэглу мы падрыхтавалі на

новую царкву... Дык тую цэглу забралі ў нас...

— Так. Кажаце, забралі... А вам вельмі патрэбна новая царква?

— Як вам сказаць...

— Проста і кажыце. Як думаеце.

— Старым памаліцца недзе ж трэба, а маладыя... тыя не надта ходзяць. Ім кніжкі давай.

— Вось бачыце — кніжкі. Царква хоць старая, але ёсць. А школы — няма. Маладыя пакрыўдзяцца на вас.

— Яно, вядома...

Пад канец гутаркі вырашылі: Ленін аддасць Савету распараджэнне вярнуць сялянам цэглу, а сяляне ўсе разам, талакой пабудуюць школу.

— Значыцца, разам! — сказаў стары селянін.— Разам яно і пана лягчэй біць. Прыказка ў нас такая.

— Вельмі правільная прыказка.

Ленін цёпла развітваўся з сялянамі, правёў іх да дзвярэй.

Потым зайшоў Кржыжаноўскі па пытанню электрыфікацыі краіны. І толькі а чацвёртай гадзіне Уладзімір Ільіч сеў за пісьмовы стол. На аркушы паперы роўнымі радкамі клаліся словы:

«... мне хацелася б сёння пагутарыць на тэму аб тым, якія асноўныя задачы Саюза камуністычнай моладзі...»

На слове «моладзі» Уладзімір Ільіч спыніўся. Адвёў позірк ад паперы. Задумаўся. Міжволі ўспомніліся дзяцінства, школьныя гады. Вось ён вяртаецца з гімназіі дамоў. Вясёлы ўбягае ў калідор. Дзверы бацькоўскага кабінета адчынены — Ілья Мікалаевіч працуе. Праходзячы міма кабінета, ён, Валодзя, скорагаворкай дакладвае: «З грэчаскай пяць! З нямецкай пяць! З алгебры пяць!»

Бацька задаволены.

— З алгебры пяць! — услых гаворыць Ленін і ўсміхаецца, не, голас не той...

Падняўся з крэсла, падышоў да акна, дзе стаяла разложыстая зялёная пальма. Адзін ліст пажоўк. Ленін абышоў пальму, стаў бліжэй да акна. Адсюль відны Троіцкая вежа, двор Крамля. Добра пабудавана вежа — на вякі. Залюбаваўся Ільіч яе прыгажосцю, прыгажосцю восеньскага дня і нават не пачуў, як увайшла сакратар.

— Прабачце, Уладзімір Ільіч,— пошта.

— Калі ласка, Лідзія Аляксандраўна, пакладзіце на стол. Я зараз,— сказаў Ленін, не адрываючы позірку ад акна.

Здавалася, Ільіч забыўся на ўсё. Адышлі ўбок дзяржаўныя турботы. Харство вежы прыцягнула ўвагу, захапіла думкі. Але не, не так гэта. Глядзеў Ільіч на вежу, а думаў пра пачатыя тэзісы свайго выступлення на з'ездзе камсамола, пра задачы юных камуністаў. Ім — сённяшнім хлопцам і дзяўчатам — даводзіць да канца справу, пачатую старэйшымі ў кастрычніку 1917 года, ім будаваць камунізм. І поспех залежыць...

Думкі перапыніў стук у дзверы. Зноў увайшла Лідзія Аляксандраўна.

— Уладзімір Ільіч, званіла Надзежда Канстанцінаўна: час абедаць.

— Абедаць? — здзівіўся Ленін і дастаў кішэнны гадзіннік. Пятая гадзіна. Папрасіў Лідзію Аляксандраўну: — Перадайце, што хутка буду, зараз іду.

Прыпыніўшыся ля стала, Ільіч прагледзеў пошту. Увагу прыцягнуў вялікі канверт з шэрай паперы. На канверце дзіцячым почыркам напісана:

«Масква, дзядулю Уладзіміру Ільічу Леніну».

А крыху ніжэй:

«Ад Васіля Адамчыка з Магілёўскай губерні».

— Гм. Та-ак. Дзядуля...

Усміхнуўся Ільіч і ўзяў канверт і газету «Правда» з сабою.

— Калі што — званіце на кватэру,— папрасіў Лідзію Аляксандраўну.

Пасля абеду — некалькі вольных хвілін. Ільіч разгарнуў «Правду» і перасунуў крэсла да акна: цемнавата ў пакоі. Але тут жа адклаў газету: успомніў пра пісьмо. Акуратна раскрыў нажніцамі канверт. Дастаў пісьмо і — малюнак. Чалавек-асілак з мячом на кані. Ад асілка ўцякаюць ворагі. І няма ім ратунку. Хвіліна, другая — блісне маланкаю меч...

Пад малюнкам — подпіс: «Ленін-асілак».

— Надзюша,— паклікаў Ільіч Надзежду Канстанцінаўну.

— Ты толькі глянь! Я — асілак!

Ленін засмяяўся. Паглядзела Надзежда Канстанцінаўна малюнак і таксама засмяялася. Потым сказала:

— А здольнасць у мастака ёсць. Вучыцца яму трэба.

— Так, так, вучыцца...

— Адкуль ён? — Надзежда Канстанцінаўна ўзяла канверт.

— Тут толькі губерня ўказана. Поўнага адраса няма.

— Кажаш — няма. А мо ў пісьме? — Ленін разгарнуў пісьмо і пачаў чытаць:

«Добры дзень, дарагі дзядуля Ленін!

Піша гэтае пісьмо Васіль Адамчык з Магілёўскай губерні.

У першых радках, дарагі дзядуля, прымі паклоны ад маці маёй, Ганны, ад сялян нашай вёскі і ад мяне. І яшчэ — малюнак пасылаю. Маці кажа, што ён вельмі добры. Старшыні Савета дзядзьку Сцяпану і яго жонцы цётцы Аўдолі

малюнак таксама спадабаўся. Дзядзька Сцяпан нават пахваліў мяне, сказаў: «Малайчына, Васілёк. На тваім малюнку Ленін сапраўдны». А дзядзька Сцяпан маніць не будзе, бо ён бачыў цябе. Было гэта ў Петраградзе. Тады ты з браневіка выступаў. Я хацеў і такі малюнак зрабіць. Ды ніколі браневіка не бачыў.

Я вельмі прашу, дарагі дзядуля Ленін: напішы такую паперу дзядзьку Сцяпану, каб ён запісаў мяне ў Чырвоную Армію. Багацеяў хачу біць. А то ў нашай вёсцы гаворка ідзе, нібыта хутка вернецца тутэйшы пан Ліснянскі. Зямлю адбярэ, кніжкі мае і алоўкі папаліць...

Я прасіў дзядзьку Сцяпана. А ён кажа: «Трэба падрасці, а цяпер самы час вучыцца. Хутка школу адкрыюць — вось там і ваюй з кніжкамі». Дык, калі ласка, напішы нашаму старшыні дзядзьку Сцяпану, няхай пашле мяне ў Чырвоную Армію. Бывай здаровы, дзядуля Ленін!

Васіль Адамчык».

Кончыў чытаць Ільіч пісьмо і сказаў:

— Правільна робіць старшыня Сцяпан: цяпер галоўная задача моладзі — з кніжкамі ваяваць. Шкада, што адраса няма... Надзюша, мне пара.

У кабінеце Уладзімір Ільіч адразу прысеў да стала і пачаў пісаць далей.

Да позняй ночы гарэла святло ў вокнах кабінета Леніна. Уладзімір Ільіч рыхтаваў наказ беларускаму хлопчыку Васільку, мільёнам такіх хлопчыкаў і дзяўчынак, іх старэйшым братам і сёстрам, усім будучым пакаленням:

«... задачы моладзі наогул і саюзаў камуністычнай моладзі і ўсякіх іншых арганізацый у прыватнасці, можна было б выказаць адным словам: задача заключаецца ў тым, каб вучыцца».

1980

НЭЛЯ ТУЛУПАВА

(нарадзілася ў 1938 г.)

ДЗІНА-СМЯЮШКА І КОЗЛІК-БРЫКУШКА

У таты і мамы —
Малая дачушка,
завуць яе весела:
Дзіна-Смяюшка.

Дзіна-Смяюшка
У класікі скача,
Ніколі не дзьмецца,
Ніколі не плача.
А сябар ў Смяюшкі —
Козлік Брыкушка.
Гуляюць сябры сабе
Ў лузе і полі,
Уволю смяюцца,
Сваволяць на волі.

Аднойчы на луг
Прыскакала Лама:
— Вам тэлеграма
Ад Васьміногa:
«Трывога! Трывога!
Аб'явіўся ў моры Дракон стары,
Стогаловы Чорны Дракон,
Сто вякоў спаў без просыпу ён...
Зараз вылез, выплыў з нары,
Прылятайце хутчэй,
сябры!»

І пабеглі сябры да Пілота,
І сказалі:
— Нам трэба злётаць на далёкае мора,
Каб адвесці ад мора гора.
— Калі ласка! — гаворыць Пілот,—
Дазваляю ўзлёт!

...Выпаўз Чорны Дракон з вады,
Зірк — туды, зірк — сюды:
Белым-бела!
У вачах драконавых пацямнела.
А ў яго сто вачэй,
А ў вачах — сто начэй...
Раззлаваўся Дракон,
Б'е хвастом па вадзе,
Ажно гул па зямлі ідзе.

Разгойдалася мора:
— Ой, насланнё, ой, морак!
Кіт прыкінуўся востравам,
Марскі вожык — асокай востраю.
А Дэльфін горка-горка плача:
— Як на хвалях цяпер паскачаш?
Стала мора ад слёз салёнае,
Пачарнела вада зялёная,
Мора нібыта сажа.
А Дракон аблізнуўся і кажа:
— Ты цяпер Драконава мора,
Адпачну, прымуся за горы.
Як дыхну на іх сто агнямі,
Сто маланкамі, перунамі,
Застанецца вуголля груда,
Чарапах на ім смажыць буду.
І разлёгся Дракон на вадзе...
— Быць бядзе! —
Закрычалі
Марскія чайкі.

Кіт маўчыць, бо вады поўны рот...
Раптам бачаць:
Ляціць самалёт!
А ў ім нашы сябры сядзяць,
На Дракона пільна глядзяць,
І склікаюць яны братоў:
Васьміногаў,
Дэльфінаў,
Кітоў,
І — марскіх катоў.
Рыбу-меч не адну,
А — восем,
Зразу восем галоў мы скосім!
— Насядай!
— Налятай!
— Наплывай!
Гэй, Дракон, галоў не хавай!

Лямантуе Дракон,
На вачах мяняецца ён:
Абчапляўся марской травой:
— Вой-вой-вой!
Я ж нічога,
Жартую так,
Я — маленькі марскі чарвяк,
Я — зялёная мушка,
Адпусці ты мяне, Смяюшка!

Засмяялася ўголас Смяюшка:
— Паглядзі на яго, Брыкушка,
Пралівае драконавы слёзы — о-го-го!
Трэба ў цырк адаслаць яго.
Трэба!

1980

ТАРАС ХАДКЕВІЧ

(1912—1975)

АЛІКАЎ СШЫТАК

Як можна быць спакойным, калі табе пайшоў восьмы год і ты ўпершыню ў жыцці сеў за школьную парту! Усё для цябе новае — і гэты чысты, утульны клас, і настаўніца, якую ты бачыў да гэтага, магчыма, толькі здалёк, і твае новыя сябры-аднакласнікі, і ранец з кнігамі і сшыткамі, які ты паклаў у парту,— усё, чаго ты раней не ведаў і не разумеў і што адкрывае перад табой шырокія нязведаныя далі.

Не мог быць спакойным і Алік, калі настаўніца Галіна Рыгораўна рассадзіла першакласнікаў за парты. Ён перш за ўсё паглядзеў у бок суседа — гэта быў незнаёмы хлопчык з чужой вёскі, паўнатвары, тоўсты і, як здалося Аліку, непаваротлівы.

Іх парта была трэцяй у радзе і стаяла ля самага акна — варта было толькі крыху прыўзняць галаву, і адразу ўбачыш школьны двор, а за ім, залітае вераснёвым сонцам, узаранае поле.

Класны пакой зззяў свежапафарбаванымі, бялюткімі сценамі; яны ажно вочы сляпілі. На падаконніках цвілі кветкі. Чорная дошка, што стаяла ўмацаваная на трыножніку, блішчала, нібы наглянцаваная. А за расстаўленымі ў тры рады партамі сядзелі хлопчыкі і дзяўчынкі, аднагодкі Аліка. Многіх з іх Алік ведаў.

Сумятня ў класе паступова ўляглася. Галіна

Рыгораўна расказала, як дзеці павінны сябе трымаць у школе, як і калі яны будуць займацца. Потым яна спытала, хто з вучняў ведае літары.

Настаўніца была ў цёмным плацці з белым карункавым каўнерыкам, з косамі, завязанымі на патыліцы ў тоўсты вузел. Вочы ў яе былі чорныя, строгія. Дома Аліку гаварылі пра настаўніцу, што яна добрая. І аднак жа цяпер ён падумаў пра яе: «Непадобна ні на маму, ні нават на цётку Ганну. Чужая цётка...» І павярнуўшыся да суседа, Алік злёгку штурхнуў яго локцем і паўшэптам спытаў:

— А ты адкуль?

— З Селішча,— не варухнуўшыся, шапнуў той.

— А як завуць?

— Борка...

— Алік! — аклікнула настаўніца, пачуўшы гаворку на трэцяй парце.— Размаўляць на ўроку нельга.

Алік страпянуўся, абапёрся локцямі на вечка парты і, унурыўшыся, змоўк. У гэты час Борка глянуў у акно — воддаль відаць быў узгорак з істужкай шэрай палявой дарогі. Некалькі фурманак, гружаных мяшкамі, з'язджалі з узгорка. Борка ўсміхнуўся і ўрачыста сказаў Аліку ледзь не на поўны голас:

— Вунь нашы з току збожжа павезлі...

— Так ужо і вашы,— запярэчыў Алік.— Як быццам адсюль можна ўбачыць — вашы ці не...

— А вось і нашы,— Борка падняўся, нахіліўся да акна.— Вунь і дзядзька Марцін на першай фурманцы, па шапцы відаць.

Белавалосая дзяўчынка, якая сядзела ззаду і якую Алік не ведаў дагэтуль, таксама зірнула ў акно і пацвердзіла:

— Ага, дзядзька Марцін...

Тое, што ў размову ўмяшалася дзяўчынка, не спадабалася Аліку, і ён хацеў ужо быў прыкрыкнуць на яе.

Але тут падышла Галіна Рыгораўна і паклала яму на плячо руку.

— Што ж вы, хлопчыкі,— прамовіла яна з дакорам.— Усе слухаюць настаўніцу, а вы размаўляеце...

Голас яе гучаў роўна і мякка, у ім Алік не заўважыў той строгасці, якой чакаў.

— Вы ж не дашкольнікі ўжо, а вучні,— сказала яна, адыходзячы да свайго стала,— і знаходзіцеся ў школе.

Позіркі ўсіх першакласнікаў былі накіраваны на Аліка і Борку. Хто-колечы з вучняў ціха пасмейваўся, а вочы іншых як бы казалі: «Вось яны і выяўляюцца, недысцыплінаваныя. У першы ж дзень заўвагу ад настаўніцы атрымалі...» Аліку стала няёмка. Ён збянтэжыўся, і хоць нічога не адказаў Галіне Рыгораўне, але да канца ўрока сядзеў спакойна, не зводзіў з настаўніцы вачэй. Борка таксама не варушыўся. Ён нават адвярнуў галаву ад Аліка, і можна было падумаць, што яны пасварыліся.

Сціпла трымаў сябе Алік і ў час перапынку. З галавы яго не выходзілі словы настаўніцы аб тым, што ён цяпер не які-небудзь дашкольнік-ветрагон, а сапраўдны вучань.

«Вучань — гэта ясна,— з гонарам думаў Алік,— і не абы-які». Ён ведае ўсе літары і большасць з іх піша, як вучыў яго старэйшы брат, пяцікласнік Міколка. У ранцы, што ляжыць у парце, побач з букваром, пеналам і чыстымі сшыткамі ў касую лінейку ёсць сшытак, амаль увесь спісаны Алікам. Алік прынёс яго сюды спецыяльна, каб паказаць настаўніцы,— няхай ведае, што ён яшчэ і да школы старанна займаўся і ця-

пер абавязкова будзе адным з лепшых вучняў у класе.

Але паколькі Галіна Рыгораўна нічога не сказала аб такіх сшытках і на наступным уроку, а вывесіла на дошцы таблічкі з літарамі, Алік паказаў свой запаветны сшытак Борку.

Нельга сказаць, каб сшытак зрабіў на таго моцнае ўражанне. Літары ў ім былі напісаны няроўна: адна вялікая, другая маленькая, трэцяя вось-вось паваліцца, чацвёртая ляжала зусім на баку. Ды і ні адна старонка тут не была спісана да канца, а ў сярэдзіне сшытка паўстаронкі займаў малюнак — нешта накшталт жывёліны з круглым тулавам, доўгімі нагамі, кароткім хвастом і вушамі, вельмі падобнымі на рогі. Борка доўга разглядаў малюнак, потым ткнуў пальцам у яго і запытальна паглядзеў на Аліка:

— Што гэта такое?

— Хіба не бачыш? — пакрыўджана адказаў Алік.

— Можа, казёл, але чаму без барады? — пачаў разважаць Борка.— Баранчык — не інакш...

— Ну і сказаў! — зазлаваў Алік.— Бара-анчык... То ж наш Тузік... Звер, а не сабака — ого!...

— А-а,— няпэўна вымавіў Борка і заціх, бо настаўніца насцярожана зірнула ў іхні бок.

«Борка мог і не разабрацца ў маім майстэрстве,— зрабіў вывад Алік.— Ды ён, відаць, ні адной літары не ведае. А што ён разумее ў малюнках, калі нават не пазнаў у сшытку славутага Тузіка. Іншая справа — настаўніца, яна такі разбярэцца, як толькі гляне».

Але нечакана для Аліка ў адзін з наступных дзён, калі ўсе падрыхтаваліся да пісьмовых заняткаў і Алік разгарнуў свой стары сшытак, Галіна Рыгораўна ўзяла гэты сшытак у рукі,

перагарнула старонкі, усміхнулася і вярнула яго Аліку, прамовіўшы без захаплення:

— Добра, Алік, што ты ведаеш літары. Але зараз ты вазьмі з ранца новы сшытак, а гэты пакінь дома...

Не літары загадала яна пісаць у новым сшытку, як таго жадаў Алік, а зусім іншае — спачатку палачкі, потым розныя кручочкі.

Да Аліка пакуль не даходзіла, што з гэтых палачак, кручочкаў, завіткоў можна потым скласці літары, роўныя і прыгожыя. Скажам, з двух злучаных кручочкаў атрымаецца літара «м», а з завітка і кручочка — літара «а». Калі паставіць абедзве літары побач, выйдзе «ма». Яшчэ адно такое «ма» — і мы будзем мець слова «мама» — першае з усіх слоў, якое кожны з нас прамовіў у жыцці. Ад гэтага слова ляжа шлях і да іншых, спярша такіх жа простых і знаёмых, а потым больш складаных і невядомых Аліку.

Словы зліюцца ў сказы, і сшытак Аліка — не першы, вядома,— у недалёкім будучым загаворыць гэтак жа, як гаворыць буквар, калі Алік адольвае яго, старонку за старонкай...

Усё ж іншы раз надакучвала доўга пісаць адно і тое ж. У Аліка не хапала такой цярплівасці, якой валодаў Борка. Ад празмернага старання ў таго кончык языка павольна пасоўваўся па вуснах у той бок, куды пасоўвалася пяро.

Старонак шэсць новага сшытка Алік спісаў акуратна, а на сёмай старонцы — гэта было ў канцы аднаго з урокаў — здарылася прыгода. Неяк міжвольна ён вывеў літару «Т» і тут жа прыгадаў свайго любімца Тузіка — здаравеннага рудога дварняка, які кожны раз пры сустрэчы з Алікам падаваў яму правую лапу. У момант Алік накідаў абрысы Тузіка, паўтарыўшы малюнак з таго сшытка, які ляжаў цяпер дома.

Аднак, калі хлопчык прыладжваў сабаку галаву, з пёрка капнула чарніла. Замест галавы атрымалася клякса ў форме прадаўгаватай сіняй зоркі. Галіна Рыгораўна хадзіла паміж партаў, назіраючы за тым, як пішуць вучні. Яна падыходзіла ўжо да парты Аліка. Алік жахнуўся і, забыўшыся, што ў яго ёсць прамакатка, злізаў кляксу языком. Ад гэтага клякса крыху пасвятлела, але адначасова пабольшала. Настаўніца схілілася над Алікавым сшыткам, як бы раздумваючы нейкі момант, затым засмучана сказала:

— Як ні шкада, Алік, але за такую працу ты не заслугоўваеш лепшай адзнакі,— і яна чырвоным алоўкам акуратна вывела ў канцы старонкі двойку.

Прыўзняў галаву ад свайго сшытка і Борка. Ад здзіўлення ў яго ўзняліся бялявыя бровы і схаваўся ў роце кончык языка. А белавалосая дзяўчынка, зірнуўшы цераз плячо Аліка на двойку, вымавіла шэптам:

— Ух, як прыгожа напісана!..

Празвінеў званок, абвясціўшы канец заняткаў. Алік хуценька паклаў у ранец сшытак, прыладзіў ранец за плечы і, не ўступаючы ў размову з сябрамі, выбег са школы. Ён не стаў чакаць суседніх хлопчыкаў, а памчаў адзін нацянькі дахаты. «Двойка — гэта яшчэ не самае страшнае,— суцяшаў ён сябе па дарозе.— Міколка казаў, што самае страшнае — адзінка, або, як ён кажа, кол. Двойка ж большая за адзінку...» Калі Алік увайшоў у свой двор, руды Тузік звонка забразгаў ланцугом, прысеў і выцягнуў насустрач хлопчыку калматую правую лапу. Але Алік прайшоў міма, нават не зірнуўшы на свайго старога сябра.

Бацька, які прыйшоў з калгаснай канторы на абед (ён быў у калгасе рахункаводам), і маці

сядзелі за сталом. Міколкі яшчэ не было, ён прыходзіў са школы пазней.

— Распранайся, Алік, ды сядай з намі, абедаць будзеш,— сказала маці, устаючы з-за стала.

— Чым жа ты пахвалішся сёння, сынку?— запытаў бацька.

— Адзнаку атрымаў,— шчыра прагаварыў Алік.

— Ну-ну, што за адзнака?— Бацька ўзяў пададзены Алікам сшытак і, праглядзеўшы яго, заківаў галавой: — Ох і ўзрадаваў жа ты мяне, Алік!.. Ніяк не чакаў...

— Дык гэта ж двойка, а не кол, татка...

— Усё роўна дрэнна,— пахмура сказаў бацька.— Я спадзяваўся, ты будзеш выдатнікам, а ты двойку прынёс...

— Затое я ўжо добра чытаю...

— Што ж з таго... Чытанне чытаннем, а з пісьмом у цябе, браце, вельмі блага...

— А мы не літары пішам, а адны палачкі і кручочкі,— спрабаваў апраўдацца Алік.

— Пішаце тое, што патрэбна,— перапыніў яго бацька, на гэты раз ужо больш строга,— тое, з чаго мы ўсе пачыналі. Без цярплівасці і старання вучыцца нельга, Алік. Запомні гэта.

— Запомню, татка,— даў абяцанне Алік.

З бацькам гаворка была скончана, але яшчэ больш строга распачаў яе, прыйшоўшы са школы, Міколка. Ён вучыўся ўжо ў шостым класе, і яго лічылі адным з лепшых вучняў. Хлопец ён быў рослы і на Аліка глядзеў як на свайго падапечнага: рыхтаваў яго ў першы клас, паказваў літары, вучыў пісаць. І вось усе Міколкавы намаганні аказваліся марнымі. Уволю пакпіўшы з Аліка, Міколка ў заключэнне з усёй суровасцю наказаў:

— Выпраў двойку, Алік! А то праз цябе і на

мяне пляма ляжа. Ты выдатнік, скажуць мне, а твой брат?..

Не задумацца над усім гэтым нельга было, але і двойку выправіць не так проста. Борка, дык той адно толькі і карпее над сшыткам у час урока па пісьму. З усіх сіл выводзіць ён тое, што скажа настаўніца, і бясконца аблізвае кончыкам языка вусны, пакуль хто не зверне ўвагу на гэта. Ён і на Аліка ў гэты час не пазірае. А Алік нервуецца — хочацца яму хутчэй зарабіць добрую адзнаку, і ён спяшаецца, а памылкі і кляксы, як вядома,— неадлучныя спадарожніцы паспешлівасці. І вось з'яўляецца то клякса, то крывуля, якая ніяк не жадае стаць на лінейцы, хоць ты яе малатком разгінай.

Алік памкнуўся быў памяняць свой няўдалы сшытак на новы, але і Галіна Рыгораўна і бацька сказалі, што замяняць яго не трэба, сшытак павінен быць дапісаны да канца.

Гора было Аліку з гэтым першым сшыткам — тут былі і чыста спісаныя старонкі, і старонкі з крывулямі і кляксамі, і злашчасны Тузік, і прыгожа выпісаная двойка — усё тут было. Аднак ніякае гора не вечнае. Не вечным яно было і ў Аліка.

Сшытак ужо канчаўся — Алік перайшоў на апошнюю старонку, і задання на тым уроку хапіла ўсяго да палавіны яе. Галіна Рыгораўна падышла да Аліка, уважліва праглядзела напісанае ім, і добрая ўсмешка асвятліла яе твар.

— Цяпер, Алік,— сказала настаўніца ўзрадавана, нібы гэта датычылася не Аліка, а асабіста яе,— я магу табе з поўнай падставай паставіць «выдатна»,— і яна ранейшым сваім акуратным почыркам вывела чырвоную лічбу «5».

Які гэта быў цудоўны дзень для Аліка! Яму здалося, што не толькі ён і Галіна Рыгораўна

радуюцца яго поспеху, але і ўвесь клас асветлены прыветлівымі ўсмешкамі. Вераснёвае сонца не халоднымі прамянямі, а па-веснавому цёплымі і ласкавымі запаўняе праз вокны класны пакой, і ветрык нясе ў расчыненую фортку пах палёў і позніх антонавак. Борка ўжо не надзьмуты і важны, ён не карпее над кнігай ці сшыткам, а шчыра ўсміхаецца, паказваючы пальцам на гэтую выдатную адзнаку ў канцы Алікавага сшытка. А белавалосая дзяўчынка, што сядзіць ззаду Аліка, ледзь не пляскае ў далоні.

Неяк незвычайна хутка скончыліся ўрокі ў гэты дзень. Алік паклаў кнігі і сшыткі ў ранец, упарадкаваў іх, а гэты сшытак з выдатнай адзнакай усё яшчэ ляжаў разгорнутым на парце. Няхай паглядзяць сябры, няхай палюбуюцца, няхай ведаюць, на што ён, Алік, здольны!.. Гэта ж толькі першая пяцёрка, а колькі яшчэ такіх пяцёрак будзе ў яго сшытках і дзённіках!.. Дахаты Алік на гэты раз пайшоў разам з суседскімі хлопчыкамі ў вясёлай гаманлівай купцы і размаўляў з імі спакойна, нібыта ў яго нічога і не адбылося. Ён нават прапанаваў схадзіць сёння на рэчку ці ў лес па грыбы, і калі нехта з хлопчыкаў заўважыў, што наўрад ці пусціць Аліка маці, Алік спакойна, упэўнена адказаў:

— Як гэта не пусціць? Пусціць, канечне...

Дома Аліка, як і заўсёды, сустрэў Тузік і па звычцы працягнуў лапу. Алік у апошні час не асабліва лашчыў яго, але цяпер узяў лапу абедзвюма рукамі і па-сяброўску патрос яе, прыгаворваючы:

— Віншуеш, га? Двойку ж праз цябе зарабіў...

Сабака як быццам разумеў свайго маладога гаспадара — вінавата апусціў галаву і павольна памахваў рудым хвастом.

— То-та ж,— урачыста зазначыў Алік.

У хаце было чыста прыбрана, але пуста — бацька і Міколка, відаць, яшчэ не прыйшлі на абед, а маці, напэўна, была на агародзе. Алік скінуў ранец і выбег на двор, каб пашукаць маці, але тут ён сутыкнуўся з бацькам і Міколкам. Яны крочылі побач, размаўляючы, як роўныя. Убачыўшы Аліка, яны спыніліся. Хлопчык стараўся не выдаваць у першую ж хвіліну свайго настрою, але не змог. Яго круглы твар, расчырванелы і ўзбуджаны, і задорныя вочы, у якіх палыхалі іскаркі радасці, гаварылі больш, чым словы. Бацька схапіў Аліка на рукі і панёс у хату.

— Не падвёў нас Алік,— важна, па-даросламу, сказаў Міколка, глянуўшы на Алікаву адзнаку.

— Я і не сумняваўся ў гэтым,— адказаў бацька.— Нічога не даецца лёгка, сынку,— праказаў ён да Аліка.— А гэты сшытак захавай. Няхай ён застанецца як успамін аб тваіх першых крокаў у жыццё і навуку.

1954

МІКОЛА ХВЕДАРОВІЧ

(1904—1981)



ДОЖДЖЫК

Дожджык, дожджык, секані,
Мы паедзем на кані,
На кіях драўляных,
З вербаў наламаных.

Але дожджык не сячэ,
Сонца майскае пячэ,
Ў полі ні расінкі,
Ў небе ні хмурынкі.

Дожджык, дожджык, секані,
Гром, маланкаю мільгні
З-за бору густога,
З лесу маладога.

На калгасныя палі
Хмаркі лёгкія пашлі —
Граду нам не трэба,
Не пашлі нам, неба.

Цёплы дожджык,
ў добры час
Ты парадуй наш калгас,
Хай растуць на славу
Збажына і травы.

Дожджык, дожджык, секані,
Мы паедзем на кані

Пад дажджом без шапак,
Не баімся крапак.

Гром маланкаю мільгнуў,
Вецер хустачкай махнуў,—
Хмара дажджавая,
Чорная такая.

Вось і сонца не відаць,
Бо залегла ў хмарах спаць,
Будзе навальніца,—
Хоча піць зямліца.

Кроплі сыплюцца ў пясок,
Свой зялёны туясок
Падстаўляюць лозы,
Клёны і бярозы.

Сонца зараз не пячэ,
Дожджык цёпленькі сячэ...
Дзеці на паводку
Запусцілі лодку.

1960

ПРАЛЕСКІ

На сонечным узлеску
Апошні снег растаў.
Вясёлыя пралескі
Зірнулі з-пад куста.

Празрыста зяюць вочы,
Нібы блакіт нябёс.
Халоднай весняй ноччу
Іх не кране мароз.

Пралескі на пагорку
Пад леташняй травой
Зіхочуць, быццам зоркі,
Агністай сінявой.

Хоць часам вецер рэзкі
Махне сваім крылом,
Але цвітуць пралескі
Ў зацішку пад кустом.

Дарослыя і дзеці
Вітанне шлюць вясне...
Пралескавы букецік,
Як госць наш, на акне.

1974

ВАСІЛЬ ХОМЧАНКА

(нарадзіўся ў 1919 г.)

ТРУБАЧ

Над маім ложкам вісіць труба — медны музычны інструмент ваеннага аркестра. Век трубы доўгі, колькі ёй гадоў, ніхто не ведае. На ёй шмат умяцін, драпін, слядоў куль і снарадаў. Адно вядома: у грамадзянскую вайну яна была трубой чырвонага кавалерыйскага эскадрона.

Апынулася труба ў нашым доме летам дваццатага года. Вяртаўся эскадрон з вайны і спыніўся ў нашым сяле. Да нас на пастой прыйшлі пяцёра байцоў. Усе дарослыя былі ў полі, а я сядзеў на прызбе, калі яны пад'ехалі да хаты. Баец, які ехаў наперадзе, маладзенькі, з бялявым віхрастым чубам, падміргнуўшы мне, прывітаўся:

— Здароў, гаспадар! Гасцей прымеш?

— Прыму,— узрадаваўся я і пабег адчыняць вароты.

Байцы пасаскаквалі з коней і павялі іх пад павець. Пасля цяжкага і далёкага маршу былі стомленыя і коні, і байцы.

Увесь той першы дзень я не разлучаўся са сваімі кватарантамі. Байцы вярнуліся з фронту, шмат чаго пабачылі, перажылі, і я распытваў іх пра вайну. З захапленнем разглядваў іх шаблі, карабіны, сёдлы з выцертай да белізны скурай, боты са шпорамі.

Асабліва пасябраваў я з Піліпам Астрэйкам —

так звалі таго чубатага хлопца. Ён вешаў мне на плячо шаблю, падсаджваў на свайго Перуна, гнядога, амаль чырвонага, каня з белымі падпалінамі на пярэдніх нагах, і я на зайздрасць сябрам-равеснікам гарцаваў па вуліцы. Праўда, шлях майго выезду быў кароткі — ад двара да бліжэйшай студні, але ж якая гэта была для мяне радасць!

Эскадрон меў двух трубачоў. Першым быў ардынарац камандзіра. А Піліп быў запасны трубач. У яго была свая бліскучая медная труба.

Труба — голас камандзіра. Яна сваімі сігналамі перадае ўсе яго каманды. Скажам, трэба сабраць байцоў, і трубач трубіць збор. Каманда ісці ў атаку падаецца другім сігналам, на марш — трэцім. Самая вясёлая і прыемная мелодыя для байцоў — сігнал на абед. Байцы як пачуюць яго, так і пачынаюць падпяваць:

Бяры лыжку, бяры бак,
Няма лыжкі — ідзі так...

Піліп вучыў мяне гэтым сігналам. Яго навуку я адольваў хутка. Сігнал трывогі вывучыў першым. А каб у час маёй навукі байцы не палічылі мае сігналы за сапраўдныя, я залазіў у склеп і там займаўся сваёй музыкай.

— Трам-та-та-та! Трам-та-та-та!..— дзьмуў я з усяе сілы.

Неўзабаве байцы пачалі называць мяне трубачом. А камандзір эскадрона, пачуўшы мае практыкаванні, сказаў:

— Падрастай хутчэй, вазьму ў эскадрон першым трубачом.

Больш двух тыдняў стаялі ў нас коннікі. Аднойчы па трывозе яны некуды з'ехалі. Вярнуліся з двума параненымі чырвонаармейцамі. Сказалі, што нейкая банда прарвалася ў нашы лясы і быў

з ёю бой. Банда ўцякла. Пасля гэтага выпадку пачалі выстаўляць байцоў на ахову станцыі, мастоў, тэлеграфнай лініі. Паехалі некуды і нашы кватаранты на чале з Піліпам.

Праз дзень пасля гэтага паслаў мяне бацька ў мястэчка за сем кіламетраў да сваякоў па соль. Я ўзяў торбачку і пайшоў. Пад вечар быў у мястэчку. Праходзячы па станцыі, я сустрэўся з Піліпам і яго байцамі. Аж да самага змроку я не разлучаўся з імі.

Начаваў у цёткі, якая жыла паблізу станцыі. Уначы я падхапіўся ад стрэлаў. Выскачыў праз акно і, не раздумваючы, пабег на станцыю. Праз некалькі хвілін быў каля пакгауза. Недалёка ад станцыі нешта загарэлася, святло пажару асвяціла станцыю, як пражэктарам. Байцы і некалькі чалавек цывільных занялі абарону вакол пакгауза. Камандаваў імі Піліп.

— Бандыты? — спытаў я ў байца.

— Бандыты,— адказаў той.

Я пабег да Піліпа. Каля яго на бервяне ляжала граната. Убачыўшы мяне, Піліп строга сказаў:

— А ты чаго тут? Ану, марш адсюль! Хочаш пад бандыцкую кулю трапіць?

Гулкая кулямётная чарга заглушыла Піліпавы словы. Я ўпаў на зямлю. Следам за кулямётнай чаргой шуганула на дах склада белая ракета. Россып яркіх іскраў, згасаючы на ляту, сыпануўся з даху ўніз.

— Падпаліць хочуць,— сказаў Піліп.— А тут збожжа.

Я вызірнуў з-за бярвенняў і ў святле пажару ўбачыў, як некалькі бандытаў зрабілі кароткую перабежку.

У гэты час мяне аклікнуў Піліп.

— Слухай, трубач. Табе ўсё роўна трэба адсюль уцякаць. Дык бяры майго Перуна і скачы

ў вёску, падымі эскадрон па трывозе. Зможаш гэта зрабіць? Не баішся?

Я сказаў, што змагу, не баюся.

Асядланыя коні стаялі каля сцяны склада. Я адвязаў Перуна, узлез на сядло.

— Скачы ўздоўж плота,— паказаў мне дарогу Піліп і ляпнуў далонню каня па крыжы.— Не падвядзі, Пярун.

Пярун, быццам разумеючы, якая адказная задача выпала яму і мне, бег асцярожна, нібы хацеў, каб я не зваліўся з сядла. Ён сам і дарогу выбіраў, усё бачыў сваімі зоркімі вачамі.

Увесь час дарога ішла праз лес. Толькі за які кіламетр я заўважыў, што да сядла прытарочаны невялікая скураная сумка і труба. Бляск зорак адбіваўся на ёй.

Вось і вёска. Спіць. Хоць бы які агеньчык мільгануў.

Я закрычаў:

— Гэй, людзі, уставайце!

Але людзі спалі, і ніхто не чуў майго слабага дзіцячага голасу. Тады я ўзяў трубу, набраў поўныя грудзі паветра і зайграў:

— Та-та-та-тра-та-та!

Сігнал трывогі ўзарваў, скалануў начную цішыню.

Парасчыняліся вароты, дзверы, з двароў выбягалі людзі, выязджалі на конях байцы і станавіліся ў строй. А я ўсё трубіў і трубіў. Камандзір эскадрона крыкнуў мне:

— Што здарылася?

Я расказаў яму, што на станцыі бандыты, і камандзір адразу працягла, па-кавалерыйску скамандаваў:

— Эскадро-он, за мно-ой ма-а-рш!..

Дружны гулкі тупат капытоў віхурай пакаціўся па вуліцы.



Мастак Ю. ГЕРАСІМЕНКА

В. Вітка «Мы будуем метро»



Мастак А. КАШКУРЭВІЧ

П. Броўка «Донька-Данізль»

Я не паспяваў за эскадронам, адстаў. А калі прыехаў на станцыю, ужо развіднела і бой скончыўся. Чырвоныя коннікі бандытаў разграмілі, многіх узялі ў палон. Станцыя была ўратавана.

З шасці байцоў, абаронцаў станцыі, уцалела чацвёра. Адзін быў забіты, а Піліп паранены ў грудзі. Ён ляжаў на шынялі з заплюшчанымі вачамі. Каля яго прыселі местачковы доктар і санітар эскадрона. Піліпаў твар быў збялелы, завостраны.

Я падышоў да яго, трымаючы Перуна за повад. Пярун, убачыўшы свайго гаспадара, застрыг вушамі, тупнуў капытом і ціхенька заржаў. Піліп расплюшчыў вочы. Убачыў мяне, усміхнуўся:

— А, трубач... Выручыў, малайчына...

Яго труба вісела ў мяне на плячы.

Піліп рукой паклікаў да сябе камандзіра. Калі той прысеў каля яго, нешта яму сказаў. Камандзір устаў, прыклаў руку да фуражкі, крыкнуў:

— Эскадрон, смірна! — І калі байцы выканалі яго каманду, сказаў: — Ад імя Чырвонай Арміі за геройскі ўчынак выношу Міхасю Кавалёнку падзяку і ўзнагароджваю яго эскадроннай трубой.

Ён зняў з майго пляча трубу і падаў яе мне ў рукі. І ўжо ціха, аднаму мне дадаў:

— Будзь заўсёды, Міхаська, такі мужны і смелы.

Піліпа павезлі ў шпіталь, а яго Перуна аддалі байцу, у якога ў баі забілі каня. У гэты ж дзень эскадрон паехаў ад нас назаўсёды. Больш нікога з байцоў мне сустрэць не давялося.

Вось і ўся гісторыя маёй баявой трубы.

Вісіць яна на сцяне, паблісквае начышчанай меддзю і маўчыць. Часам унук возьме яе і пратрубіць сігнал трывогі, якому я навучыў яго — на ўсякі выпадак.

1979

КАСТУСЬ ЦВІРКА

(нарадзіўся ў 1934 г.)

ЗАЙЧЫКАЎ ХЛЕБ

Заяц полем бег між бабак,
Каласоў сабраў ахапак,
На шырокім пні яловым
Змалаціў іх адмыслова,
А зярняты ноччу зорнай
Размалоў цішком на жорнах.
Раніцой з лясной крыніцы
Зачарпнуў жывой вадзіцы
І ў ліповай дзежцы белай
Рашчыніў свой хлеб умела.
Замяшаў яго, руплівы,
На густым тумане сівым,
На касцянак паху вінным
І на ягадзе рабіны.
А счакаўшы, з голля, шустры,
Разлажыў агонь пад кустам
І на трох лістах дубовых
Пасадзіў хлябок на дровы.
Аж да змроку з лесу ў высі
Смачны дым струменем віўся.
Калі ж бохан стаў румяны,
Зайка выняў хлеб старанна
І, абмыўшы ў белых росах,
З ім пабег да сенакосу.
Там, з касцамі сеўшы, заяц
Тату ў торбу даў акраец.
Ну, а тата мне, вядома,

Гэты хлеб прынёс дадому.
Ён на выгляд — як і ў нас,
Ды смачнейшы
У сто раз!

1964

СПРЭЧКА ЗВЯРОЎ

Заспрачаліся звяры:
— Хто дужэйшы у бары?
— Я! — ускочыў зайка з куста
І падняў качан капусты.
— Я! — вавёрка адказала,—
Я не гэта падымала.
— Я дужэйшая, сястрыца,—
Умяшалася лісіца.—
Я ўначы праз лес вялікі
Несла з вёскі аж індыка!
Тут янот узняўся ў хвілю:
— Я абедзвюх вас асілю!
— Вы не слухайце — ён брэша:
Я ў бары яшчэ дужэйшы! —
Крык пачуўся барсука:
— Я падужаў і ваўка!
Не ўстрымаўся тут мядзведзь:
— Хопіць вам ужо гудзець!
Паглядзіце на мяне ўсе:
Я дужэйшы самы ў лесе!
Вось вялізны гэты камень
Падыму я перад вамі!
— Не хваліся лепей, мішка,—
Выйшаў грозны зубр з зацішку.—
Каб пакончыць гэту спрэчку,
Скіну плот вялізны ў рэчку!
Толькі зубра ўжо ў бары

І не слухалі звяры:
— Я дужэй!
— А я ўдвая!
— Не, няпраўда — я!
— Я!
— Я!
Так раўлі яны — аж змоклі,
Ды раптоўна ўсе замоўклі.
Між травы якраз памалу
Тут мурашка прапаўзала.
На спіне без крыку й гулу
Доўгі сук яна цягнула.
Ну, а ён — няма цяжэй —
За яе ў сем раз даўжэй!
Тут звяроў такі ўзяў сорам —
Хоць вазьмі залазь у норы!
Неўпрыкметку разышліся
І дадому падаліся.
І ніколі з той пары
Не спрачаюцца звяры.

1964

ЛАДКІ-ЛАДУШКІ

(Па народных матывах)

Ладкі-ладушкі,
Прыляцелі птушкі,
Селі на варотах
У чырвоных ботах,
Сталі шчабятаць,
Каму хлеба даць.
— Петрыку — даць?
— Даць!
Ён і з татам араў,
І каменне збіраў,

І пужаў вераб'ёў,
І палетак палоў!

— А Паўліку — даць?
— Даць!
Ён снапы падаваў,
Перавяслы зрываў,
Малаціў да рос
І трасянку трос!

— А Юзіку — даць?
— Даць!
Ён і зерне збіраў,
Ён і крупы драў,
І цеста мясіў,
І ваду насіў!
— А Саўку — даць?
— Не даць!
Ён і з татам не араў,
І каменне не збіраў,
Не пужаў вераб'ёў,
Палетак не палоў,
Снапы не падаваў,
Перавяслы не зрываў,
Не малаціў да рос,
Трасянкі не трос,
Зерне не збіраў,
Круп не драў,
Цеста не мясіў,
Вады не насіў!
Не для Саўкі хлябок,
Бо Савось — абібок!

Ладкі-ладушкі,
Паляцелі птушкі.

1964

АРКАДЗЬ ЧАРНЫШЭВІЧ

(1912—1967)



ДЗВЕ ТАНІ

У мяне ёсць унучка Таня. Вельмі прыгожая дзяўчынка. У яе русая галоўка, вялікія шэрыя вочкі і трошкі кірпаты носік. Яна вельмі любіць рысаваць і слухаць казкі. Чытаць Таня яшчэ не ўмее, але некаторыя літары ведае і рысуе іх. Акрамя таго, яна ведае многа вершаў. Гэта мама яе навучыла. Ну і, вядома, Таня любіць расказваць іх мне.

— Слухай, дзядулька Мікулька,— кажа яна,— от што я табе раскажу. Слухай!

Яна заве мяне дзедам Міхедам, дзядулькам Мікулькам, а іншы раз проста дзядулькам. І я слухаю, як яна расказвае:

Надышлі марозы,
Рэчку закавалі,
Белыя бярозы
Інеем прыбралі.

Асабліва любіць яна расказваць пра хлопчыка:

«Мамачка, галубка,—
Просіць сын так міла,—
Можа б, ты на рэчку
Пагуляць пусціла...»

Я люблю сваю ўнучку Таню. Ды яе ў хаце ўсе любяць: і бабка, і дзядзькі, і цёткі.

— Дзядулька, дай мне чырвоны аловак.

І я даю ёй аловак, у якога адна палова чырвоная, другая сіняя.

— Дзядулька, дай мне паперы.

І я даю ёй паперы, хоць мне і шкада. Залішне многа траціць яна чыстай паперы. Кожны дзень дай ды дай то ліст, то два.

Затое Таня і мяне слухаецца. Скажу прынесці акуляры ці падаць чаравікі, яна ахвотна падае.

Усё ў нас ішло добра, ды пачаў я прыкмячаць, што на маім стале парушаецца парадак. Як толькі адлучуся з дому, нехта бярэ маю паперу, нехта ломіць завостраныя алоўкі, нехта раскідае па ўсім стале напісаныя мной старонкі. Потым нехта разліў маё чарніла.

— Гэта твая работа? — запытаў я аднаго разу ў Тані.

Маўчыць мая ўнучка.

— Значыць, твая?

Таня кіўнула галоўкаю.

— А ты хіба забыла, што я казаў, каб нічога не чапала на маім стале.

— А сам жа ты чапаеш?!

— Я не чапаю. Я працую за сталом і ведаю, дзе што ляжыць. У мяне на стале парадак, бо гэта маё рабочае месца. А ты разбураеш мой парадак, замінаеш мне працаваць.

Таня маўчала. Яна, відаць, пра нешта думала.

— Я ж не чапаю тваіх лялек,— гаварыў я далей.— Не раскідаю тваіх цацак. Дык чаму ж ты раскідаеш маю паперу?

Нічога не адказала мне Таня, і я падумаў, што яна ўсё зразумела. Але я памыліўся. Аднойчы ранкам я пачуў, што бабка загадвае Тані абуцца, а яна не хоча, бо ўчора вечарам закінула некуды панчошкі. І не хоча сама шукаць, а загадвае бабцы. Я адразу пайшоў туды.

— Таня,— сказаў я,— прынясі мае акуляры. Я забыў іх у сваім пакоі.

— Вазьмі сам! — адказала мне Таня.

Тады я папрасіў яе маму:

— Тамара, пакліч сюды нашу Танечку.

— Дзядулька, я ж тут! — засмяялася мая ўнучка.

— Мне патрэбна не ты, а другая, харошая Таня. Тая, што слухаецца старэйшых, што не бярэ сама дзедаву паперу. Пакліч мне, Тамара, харошую Танечку.

— А куды мы дзенем гэту? — запытала бабка.

— Дзядулька! — закрычала ўнучка.— У нас жа няма другой Тані! Гэта я — Таня!

— Не,— адказаў я.— Не ты. Ты — Таня непаслухмяная, лянівая. Не хочаш панчошкі свае знайсці. Чаравік некуды закінула. А ў нас ёсць Таня другая. Яна добрая і харошая. От я і клічу яе, каб яна мае акуляры прынесла ды знайшла свае панчошкі і чаравік.

— Дзядулька! Дык гэта ж я! — закрычала Таня і пабегла па мае акуляры. Потым яна знайшла свой абутак.

І от цяпер у мяне дзве ўнучкі: Таня харошая і Таня дрэнная. Але дрэнная Таня ўсё радзей і радзей бывае ў нашай хаце. Я ўпэўнены, што скора ў мяне будзе толькі адна ўнучка — Таня харошая.

1962

ЛЕАНІЛА ЧАРНЯЎСКАЯ

(1893—1976)



«МОЙ МІЛЫ ТАВАРЫШ...»

Вецер зрываў пажоўклыя лісты з клёнаў і доўга кружыў у паветры. Дзеці з крыкам: «Парашуцікі, парашуцікі!» — стараліся схапіць іх на ляту. Дзень быў хоць і ветраны, але на дзіва цёплы і сонечны.

У суседнім будынку школы, дзе зараз змяшчаўся шпіталь, вокны былі расчынены, і раненыя, цесна абсеўшы падаконнікі, грэліся на сонцы.

Паміж будынкамі школы і дзіцячага сада быў вялікі агарод. Адзін з раненых, склаўшы далоні рупарам, крыкнуў:

— Ніна! Ніначка!

У дзіцячым садзе была не адна Ніна, і ўсе яны павярнуліся на голас. А тая, якую паклікалі, узбегла на драўляную горку, каб яе лепш было відаць, і памахала пучком кляновага лісця ў знак прывітання.

Трэці год жыве Ніна ў гэтым паўночным горадзе. Ужо знікаюць паступова з памяці ўспаміны аб тым страшным летнім дні, калі яна з мамай ехала на грузавіку пад абстрэлам фашысцкіх самалётаў. Забываецца і тая доўгая цяжкая дарога, пакуль дабраліся яны да гэтага ціхага, спакойнага горада. І хоць і тут яшчэ завешваюць уночы вокны, але ніводнага налёту не было дагэтуль і не будзе, бо пагналі ўжо ворага назад на захад.

Трэці год ходзіць Ніна ў дзіцячы сад, расце,

сталее і з будучай восені пойдзе ў школу. Усё было б добра, каб толькі ведаць, дзе зараз тата, што з бабуляй.

Калі Ніна з маці выехалі раптоўна са свайго горада, тата быў у камандзіроўцы, а бабуля жыла ў калгасе. І так размінуліся іхнія дарогі, што дагэтуль Ніна з мамай не ведаюць, дзе шукаць сваіх родных, ці жывыя яны.

Дзетсадаўцы часта ходзяць у шпіталь да раненых са сваімі няхітрымі канцэртамі, і раненыя заўсёды з радасцю сустракаюць малых гасцей. Улетку дзеці насілі ў палаты вялікія букеты, але замаразкі пабілі ўсе кветнікі, і толькі дзе-нідзе свецяцца яшчэ аранжавыя галоўкі наготак. Цяпер дзеці збіраюць самыя прыгожыя лісточкі і прыносяць іх раненым.

У Ніны ў шпіталі ёсць свой падшэфны — дзядзя Віця. Ён сам назваў Ніну сваім шэфам. Яму адразу спадабалася ветлівая сінявокая дзяўчынка.

Сёння Ніна група падрыхтавала новую праграму канцэрта, і, адпачыўшы пасля абеду, дзеці пайшлі ў шпіталь. Ніна, як толькі ўвайшла ў палату, адразу заўважыла новага раненага. Ён ляжаў у кутку і, відаць, моцна пакутаваў, бо, глянуўшы на дзяцей, зноў адвярнуўся да сцяны.

Канцэрт, аднак, прайшоў з вялікім поспехам. Асабліва хвалілі Ніну за дэкламацыю. Дзядзя Віця нават папрасіў яе, калі ўсе выступленні скончыліся:

— Прачытай, Ніначка, яшчэ пра маленькага лётчыка.

Ніна паправіла вялікі белы бант у валасах, зноў выйшла на сярэдзіну палаты, падняла галаву і звонка прамовіла:

— «Хлопчык і лётчык», верш Янкі Купалы.

Мой мілы таварыш, мой лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне!..

Пры першых яе словах новы ранены страпянуўся, прыўзняўся на ложку і ўжо не зводзіў з дзяўчынкі вачэй, пакуль яна не скончыла чытаць.

Калі сціхлі воплескі, якімі ўзнагародзілі Ніну, ён павабіў рукой да сябе выхавацельніцу і ціха спытаў:

— Выбачайце, але сам я не магу падысці. Скажыце, як завуць дзяўчынку, што зараз дэкламавала? Яна тутэйшая?

Крыху здзіўленая, Зоя Пятроўна адказала:

— Не, яна з Беларусі, з Оршы. Прыехала разам з маці ў самым пачатку вайны, а завуць яе Ніна Грыневіч.

— Ніна Грыневіч! — паўтарыў ён узрушаным голасам.— Паклічце яе да мяне, калі ласка.

Ніну часта клікалі да сябе раненыя, якія не маглі яшчэ хадзіць. Яна адразу падбегла да ложка і ўсміхнулася незнаёмаму байцу.

— Твайго тату завуць Сяргей Пятровіч? — адразу спытаў ён.

— Ага,— адказала Ніна, нічога не разумеючы.

— Дык гэта твой тата разам са мной быў...

— Быў?..

І столькі трывогі і болю было ў голасе і вачах дзяўчынкі, што ранены сам жахнуўся і паспяшаўся хутчэй супакоіць яе:

— Жывы, жывы твой тата. Я добра ведаю, што пасля таго, як мяне раніла, нашу часць адвялі ў тыл на папаўненне. І там твой тата.

Ніна неспадзявана заплакала і ўткнулася тварам у плячо раненага.

— Ну чаго ты, чаго, малая? — туліў ён дзяўчынку да сябе.— Усё добра! Вы знайшліся. Вось узрадуецца ваш бацька! Ён думаў, што вы не паспелі выехаць...

Ніна ўжо ўся свяцілася радасцю, хоць шчокі яе былі яшчэ мокрыя ад слёз. Яна спытала:

— А як вы здагадаліся, што я татава?

— Як я здагадаўся, што ты татава? — засмяяўся ранены.— Па твару. Тата твой усё ўспамінаў, якая ў яго дачушка — беленькая, сінявокая... Я жартую. Тут, галоўнае, верш дапамог. Калі ты пачала яго дэкламаваць, я і ўспомніў: бацька твой не раз хваліўся, якая ты разумная, памятлівая, як хораша ўмееш пра лётчыка расказваць. Вось я і спытаў у тваёй выхавацельніцы, як цябе завуць, ці тутэйшая ты.

— Мы трэці год тут жывём. А верш гэты я даўно ведаю. А вас як завуць?

— Завуць мяне Андрэй Іванавіч. Ты прыходзь разам з мамай. Я з тваім бацькам амаль два гады разам быў. Мы з ім, як браты, жылі... Ну, а як вам тут?

— Нічога, добра. Мама ў школе працуе, і я на той год у школу вучыцца пайду. Я чытаю ўжо крыху па буквары і многа слоў пісаць умею, толькі друкаванымі літарамі.

— Цяпер ты сама тату пісьмо напішаш, пацешыш яго. Прыходзь з мамай, я адрас нашай паштовай скрыні дам.

— Дзядзечка,— папрасіла Ніна,— вы зараз адрас напішыце. Я сама яго маме занясу. Вось у вас тут на тумбачцы папера ляжыць і аловак.

— Пішу, пішу,— адразу згадзіўся Андрэй Іванавіч.

Неўзабаве ён падаў ёй паперку з напісаным адрасам. Ніна схавала яе і спытала:

— Вы таксама з Беларусі?

— Не, я з Украіны. Там у мяне бацькі засталіся і сястра. І я нічога пра іх не ведаю.

— Даведаецеся! — запэўніла Ніна.— Мы ж вось знайшліся.

— Каб жа тое...— уздыхнуў ранены.— І на ліха мяне раніла. Калі яшчэ папраўлюся...

— Паправіцеся,— зноў суцешыла яго дзяўчынка.— Мы зараз наступаем. Я з мамай кожны вечар радыё слухаю.

Андрэю Іванавічу прыемна было пачуць з вуснаў дзіцяці словы «мы наступаем», прыемна, што гэтая малая ўжо адчувала сябе часцінкай народа.

Дзеці збіраліся выходзіць. Ніна абняла свайго новага знаёмага за шыю і пацалавала ў шчаку. Ён неяк прасвятлеў увесь і сказаў:

— Не спадзяваўся я, што ў мяне такая мілая сястрычка знойдзецца. Заўтра абавязкова прыходзь з мамай.

Ніна развіталася з усімі, а з дзядзем Віцем асобна. Ён чуў усю яе размову з Андрэем Іванавічам і шчыра радаваўся.

— А што я табе казаў раней? — весела ўсміхнуўшыся, прамовіў ён.— Вось вазьму ў Андрэя адрас і сам напішу твайму тату пра свайго «шэфа».

Сонца ўжо хілілася на захад. Крыху пахаладала. Вецер сціх, а лісты ўсё роўна падалі і падалі з дрэў і ўсцілалі зямлю.

Дзеці зграбалі іх у кучкі, выбіралі прыгажэйшыя, плялі з іх гірлянды.

А Ніна сядзела на лавачцы насупраць дзвярэй, праз якія вось-вось павінна была ўвайсці маці. Ужо многа дзяцей павялі дамоў, а мама ўсё не ішла і не ішла. Нарэшце ўбачыўшы яе, Ніна кінулася насустрач.

— Мамачка, родненькая, наш тата знайшоўся... Вось яго адрас... Верш дапамог!

1959

МІКОЛА ЧАРНЯЎСКІ

(нарадзіўся ў 1943 г.)

ДУША Ў ПАЛОСКУ

Пусціў Ясь пагалоску,
Б'е ў грудзі кулаком:
— Мая душа ў палоску,
Я стану мараком!

На ім заўжды цяльняшка,
Далоні ў дзве — рамень.
Начышчаная спражка —
Аж б'е з яе прамень.

Хлапчук марскія словы
Паспеў крыху спазнаць:
Пайсці —
Аддаць швартовы,
Прыйсці —
На якар стаць.

Сталоўка ў Яся —
Камбуз,
Заве каютай клас.
Ледзь што: — Палундра! Амба!
Не компас, а кампас.

Ён да званка на ўроку
Ніколі не ўсядзіць:
— Абед гатовы ў кока,
Пара ўжо шклянкі біць!

Бяжыць абедаць потым —
Аж калідор гудзе...
Вучоба ж ціхім ходам
У марака ідзе.

Як выклічуць — адразу
Ягоны спрыт відзён,
Бо плаваць
Пры адказах
Прывык
На ўроках ён.

1973

ХАМЯКІ-ЗАЙЗДРОСНІКІ

Хоць радня,
Хоць сваякі,
Ды не ладзяць
Хамякі.

Хамяку хамяк
Па загрыўку —
Шмяк!
— У нару не лезь,
Будзеш біты ўвесь!..

Хоць радня,
Хоць сваякі,
Ды не ладзяць
Хамякі.

З выгляду —
Нязлосныя.
Сквапныя ж,
Зайздросныя.

Колькі б ім не перапала
Каласкоў —
Заўсёды мала.

І цяпер вось недавер,
Брата брат
Таўчэ ў каўнер:
— Ты пшаніцы больш урваў!
Дзе, скажы,
Яе ты браў?

Трэба час,
Дазнацца каб —
За шчакой
Хаваюць скарб!

1981



Мастак Ю. ЗАЙЦАЎ

В. Вольскі «Дзед і жораў»



Мастак М. СЕЛЯШЧУК

А. Клышка «Вярэнька загадак»

МІХАСЬ ЧАРОТ

(1896—1938)

ВЯСЕННЯЯ РАНІЦА

Гляньце, дзеткі, у аконца,
Ды пара ужо ўставаць...
Як прыгожа там бясконца!
Сорам, дзеткі, позна спаць.

Заглянула сонца ў вочкі,
Дзень прыйшоў — даволі сну!
На свет гляньце, галубочкі,
Ўсе вітаюць там вясну.

Пчолкі выпаўзлі з калоды,
Пачалі збіраць мядок,
Шпак вартуе агароды
І вішнёвы наш садок.

Зелянее траўка ў полі,
Ў небе птушачкі пяюць...
Эх, зімы не будзе болей!
Хутка кветкі зацвітуць.

Вы зірніце у аконца,
Палюбуйцеся хаця:
Колькі волі, колькі сонца,
Колькі новага жыцця!

Ўстаньце, дзеткі, пойдзем ў поле
Спевы слухаць, кветкі рваць.
Ў хаце сумна, бы ў няволі...
Ўстаньце дзеткі, годзе спаць!

1921

20 Зак. 2563

ДА МОЛАДЗІ

Ты, моладзь, смела і магутна,
Ты — волі лепшай будаўнік;
Далёка песня твая чутна,
Бо стан бязмерна твой вялік.

Ты на ўспамогу йдзеш грамадай,
На змену тым барацьбітам,
Што век таміліся за кратай
І вольны свет здабылі нам.

Нібы прамень ты пасля ночы,
Надзея свету й цеплаты,
Дзіця сялянаў і рабочых,
Ідзеш да працы, моладзь, ты!

Да працы ўсе, хто чуе сілу,
Пад сцяг, Чырвоны Вольны сцяг!
Капайце ворагам магілу,
К Камуне стройце новы шлях!

1920

КУЗЬМА ЧОРНЫ

(1900—1944)

ЮЗІК І ЯГОРКА

За горадам, на ўзгорку, абведзеная старымі платамі агародаў, стаіць вёска Агароднікі. Каля яе, пад горкаю, жаўцеюць ямы глінішча, дзе людзі бяруць гліну. У глінішчах многа і жоўтага пяску, у якім кожны дзень перасыпаюцца і купаюцца вясковыя дзеці.

А то ў іх яшчэ ёсць і другая забава. За платамі расце многа лопуху і чартапалоху, а на гэтым зеллі вельмі многа, як кажуць, ваўчкоў, якія вельмі добра чапляюцца за ўсё і за кожнага.

Вось тут і капошацца дзеці, ірвуць ваўчкі ды кідаюць адзін на аднаго ці на якога-небудзь дзядзьку, які часам пройдзе каля платоў за гумнамі.

А то часам яшчэ пазавуць дзеці якога-небудзь спакойнага касматага сабаку з вуліцы ды ўвапхнуць яго ў лопух. Дык той, небарака, як выскачыць адтуль, дык хоць ты яго тапіць вядзі — сам да сябе непадобен: увесь, як чорт, аблеплены ваўчкамі, уся шэрсць як у гузах — і ў галаве, і на спіне, і ў хвасце. Кінецца ён, перапалоханы, з усіх чатырох уцякаць, хвост падтуліўшы, а дзецям радасць. Рагочуць яны — аж агароды за гумнамі звіняць.

* * *

Разам з усімі дзецьмі заўсёды гуляе і Юзік з Аленкаю — брат і сястра. Юзік трохі большы за Аленку — яму ўжо восьмы год, а Аленцы ўсяго пяць. Часам, перасыпаючыся ў пяску, Аленка пакоціцца ды, спалохаўшыся таго, што ўпала, пачне плакаць, а Юзік тады яе паднімае ды ўгаворвае, каб не плакала. Іншыя хлапчукі памагаюць Юзіку, а іншыя смяюцца з яго. Усяк бывае.

Жывуць Юзік з Аленкаю зусім у старой хаце. А тут жа побач, у другой хаце, жыве Юзікаў таварыш па гульні і сусед — Ягорка. Ягорка старэйшы за Юзіка на два гады — яму ўжо дзесяты год.

Ягорка яшчэ таксама разам з Юзікам купаецца ў пяску ды ўцягае сабаку ў лопух, але ўсё ж Ягорка ўжо часам уздумае паказаць, што ён ужо сталы чалавек.

Каля Ягоркавае хаты ляжыць куча дзерава, дык вось Ягорка часам раніцаю, важна ўзяўшыся ў бокі, выйдзе з хаты, сядзе на дзерава ды, як стары ўсё роўна, плюне праз зубы на зямлю і заспявае важна тую песню, якую часта спяваюць старыя.

Ягорка яшчэ не можа выгаварыць акуратна гук «ч», і ў яго песня выходзіць так:

Ой, у полі-полі
Карцомка стая-а-а-ла.
Трай-рай, ра-та-тай,
Карцомка стаяла!..

А Юзік стаіць збоку ды ад зайздрасці падражніваецца:

— Думаеш, вельмі ўжо на старога падобен. Яй-права, не. Смаркач малы!..

— Маўчы, Юзік-гузік,— адказвае Ягорка і заварочваецца ў другі бок. Бо хіба ж патрэбна сталаму чалавеку гаварыць з блазнотаю?!

* * *

Пасля зімы ішла вясна. На вуліцы падсыхала гразь, па гразі шпацыравалі свінні ды куры, а пеўні гарланілі на ўсю вуліцу, палохаючы вераб'ёў. А можа, вераб'і гэтага і не палохаліся, але так адляталі, з далікатнасці.

Старыя ўжо рыхтаваліся ехаць у поле — Юзікаў бацька і Ягоркаў майстравалі драбіны ў дварах, аглядалі плугі ды кожны дзень давалі сваім конікам па гарцу аўса з сечкаю, каб моцныя сталі к рабоце.

Малым жа была адна любата на вуліцы!..

Тут табе і лужына — можна пабоўтацца, тут табе і з гусаком падражніцца; толькі бяда, што няма яшчэ лопуху — няма куды сабаку ўвапхнуць.

Сонца свеціць — усё роўна як бы смяецца зямлі. Загэтым і весна так.

І вось у такі дзень прыехалі з горада піянеры. Вясёлыя хлапчукі з чырвонымі гальштукамі. Яны зразу напоўнілі вуліцу песнямі, смехам. Цэлы атрад іх. А з імі павадыр, камсамолец.

Збіліся ўсе вясковыя дзеці, а Ягорка нават забыўся, што ён сталы чалавек, ды, падкасаўшыся, ва весь дух драпануў з дзерава к канцу вуліцы, дзе ўсе пачалі збірацца. Напрыходзілі і старыя.

Колькі было гаворак, колькі пытанняў! І нарэшце ў вёсцы арганізаваўся піянерскі атрад, і Ягорка стаў настаяшчым піянерам.

Ужо ён зусім важна пазірае вакол сябе і спявае іншую песню:

Стала восем мне гадоў —
Піянерам быць гатоў...

* * *

Юзік яшчэ не папаў у піянеры, бо малым яшчэ яго зусім прызналі. Але затое ён блізкім таварышам стаў Ягоркавым, такім, якім ніколі не быў.

Калі Ягорка, залажыўшы рукі ў кішэні, выйдзе на сонца каля хаты пастаяць ды падумаць аб сваіх піянерскіх справах, Юзік заўсёды падыходзіць да яго, і пачынаюць яны гаварыць. Ягорка растлумачвае Юзіку, як гэта трэба маршыраваць, бо сам ён ужо маршыруе не горш чырвонаармейца.

А тым часам Юзік слухае, і яму весела.

— А калі мне ўжо можна будзе запісацца ў піянеры? — пытае ён у Ягоркі.

— А колькі табе год? — пытае Ягорка.

— Увосень скончыцца дзесяць.

— Ну дык налета ўвосень ужо ты будзеш у піянерах,— гаварыў Ягорка,— будзем тады разам у атрадзе.

І Юзік зусім рад.

— Вось толькі ці дазволіць тата,— гаворыць задумлёны Юзік.

— А-я-яй, вельмі ўжо татка гэтакі знаток,— важна, як стары чалавек, адказвае Ягорка і, пачакаўшы, дабаўляе: — Пусціць, я табе кажу.

І тады Юзік бяжыць, падскакваючы, дамоў. Дома ён, гуляючы з Аленкаю, спявае песню:

Зюра-зюра-зюравей!..

А як піянерскі атрад ідзе па вуліцы, Юзік выбягае з хаты, бяжыць услед і думае: «Каб хаця скарэй тая восень, калі і я стану піянерам».

1925

МАТЧЫНА БЛАГАСЛАВЕННЕ

Прастрэленая немцамі ў грудзі, уміра́ла маці. Пакутная смерць яе ішла павольна. Часамі жанчына ўпадала ў забыццё, часамі даходзіла да яснай памяці, усё перад сабой бачыла, усё чула, пра ўсё думала. Каля яе быў трынаццацігадовы яе сын Максім. Бацька быў у арміі, недзе па той бок фронта, і з першага дня вайны не было ад яго ніякай весткі. Старэйшая сястра ўжо другі месяц недзе тулялася, каб не натрапіцца немцам на вочы. Нехта гаварыў, што яна сышла далёка, туды, дзе глушэй, дзе больш партызан і куды менш дабіваюцца немцы. І Максім адзін нудзеў і тужыў, гледзячы на маці. За гэтыя дні ён страшна схуднеў, вочы яго ад бессані сталі чырвоныя, ён часам імі міргаў і, калі маці быццам бы рабілася лягчэй, ён стараўся чым-небудзь яе разважыць. Нейкім інстынктам ён адчуваў, што яна не хоча думаць аб смерці, можа, не адчувае, што памрэ, і думка яе імкнецца да ўсяго звыклага і знаёмага. І ён часта гаварыў ёй, што робіцца на дварэ.

Перад самым вечарам ён увайшоў у хату і падышоў да маці. Яна зноў глядзела кудысьці перад сабою і, відаць, думала, думала. Ён ціха сказаў:

— Мама, а ўжо вясна скора. Ужо чорная зямля выйшла ў нас каля хаты з-пад снегу. А ў агародзе на ўзмежку відны мокрыя кусцікі травы.

Маці перавяла позірк на яго, і ён прачытаў у яе вачах вялікае імкненне.

— Ужо сёння Марцінавы дзеці капалі хрэн за нашым агародам.

— Нашто ім хрэн? — прашаптала яна сухімі губамі.

— Яны не паспелі нічога схаваць, і ў іх немцы

ўсё забралі. Яны вельмі галодныя. Яны накапаюць хрэну, натруць і паставяць у місцы, каб ён вытахся. А тады, як ён вытхнецца, будуць есці. Без нічога. Гэта іх Уладзік выдумаў.

Ён змоўк і думаў, што б яшчэ расказаць маці. Апошні прамень сонца сплыў з падлогі насупроць акна. Змяркалася, і ўсюды было так жа ціха, як і ўдзень. Людзей асталося мала, мала хто заставаўся дома. І ўвечары ў кожнага было лягчэй на душы — змрок мог схаваць чалавека ад немца.

Маці быццам пачала драмаць ці можа зноў упала ў забыццё! Яна сцішылася, але стала цяжка дыхаць. Максім адышоўся на сярэдзіну хаты і стаяў так у страшнай адзіноце, у вялікім смутку аб маці, аб сабе, аб усім жыцці.

— Мама,— сказаў ён,— мама! Ты не чуеш? Я пайду гляну на вуліцу, я адразу ж прыду. Ты не чуеш, мама?.. Мусіць, спіць...

Ён ціха падышоў да дзвярэй і спыніўся ў трывозе. На вуліцы грукаў грузавік і чуліся нямецкія галасы. «Добра, што я агню не запальваў»,— думаў ён. Але немцы ішлі ўжо ў цёмную хату. Забразгалі сенечныя дзверы. Ужо мацалі клямку хатніх дзвярэй. Святло ўпала на падлогу з электрычнага ліхтарыка. Увайшлі два немцы. Калечанай рускай мовай адзін сказаў:

— Хто тут? Усе сюды хадзі. Падымай рукі. Максім стаў перад немцамі і падняў рукі.

— Хто яшчэ ёсць?

— Я адзін. А маці, яна хворая, яна ўмірае.

Немец уставіўся ліхтарыкам у матчын твар. Яна застагнала і заварушыла губамі. Немцы абгледзелі ўсе куткі, вышнырылі ўсюды і загадалі запальваць агонь. Максім запаліў лямпу. Газы ў ёй было толькі на дне. Лямпу ён паставіў на стол. Немец сеў за стол, а другі падаў яму ўкручаную ў газету яду. Максім здагадаўся, што гэта афіцэр

і салдат. Немец раскруціў газету і пачаў штосьці рэзаць нажом.

— Дзе хлеб? — сказаў ён да Максіма.

— У нас няма хлеба,— адказаў Максім.

Афіцэр штосьці сказаў салдату, і той выйшаў. Можа, ён пайшоў даставаць хлеба, можа, чаго іншага — Максім нічога не мог ведаць. Немец сядзеў за сталом на лаве, парэзваў нешта ножыкам і клаў у рот, жаваў і чаўкаў. Чутно было, як цяжка дыхае маці. Агонь у лампе пачаў цьмець, кнот выцягваў апошнюю газу. Максім раптам устрапянуўся. Ён падышоў да стала і паказаў немцу на покуць, дзе вісеў маленькі абразок і на ім ляжаў зверху невялічкі, з даўніх год, недагарак свечкі.

— Лямпа зараз патухне,— сказаў ён,— а газы ў нас больш няма. Я запалю свечку, унь ляжыць.

— Я, я,— заківаў галавой немец.

Напружваючыся, каб суняць сваю ўзбуджанасць, Максім узлез на лаву ўздоўж другога берага стала, дастаў свечку і адчуў, як сэрца распірае яму грудзі і аддаецца стукам у вушах. Ён адвёў ад сябе недагарак, дзьмухнуў на яго і ўбачыў многа пылу ў сябе перад вачыма.

— Запальвай, што ты робіш! —нездаволена абазваўся немец.

Максім ступіў нагамі на тую лаву, дзе сядзеў немец, прыпёрся левым каленам у край стала і над сталом прыгнуўся да лампы, разаграючы над лямпай канец свечкі, каб прыляпіць яе да стала. Свечку ён трымаў у левай руцэ, і ў той жа час правай рукой дастаў з кішэні складаны нож. З свечкай ён вельмі марудзіў, бачачы, што нешта няскладна выходзіць і чакаючы нейкай зручнасці.

Немец раззлаваўся на гэтую маруду. Ён нешта замармытаў, ірвануў з Максімавых рук свечку і адным махам уляпіў яе ў стол. Максім ірвануўся

за нямецкія плечы, адным рухам раскрыў нож і даў ім у нямецкую шыю ззаду, пад самай галавой... Лямпа патухала. Максім, плюючы на рукі і атрэпаючы іх, скінуў з лямпы шкло, запаліў свечку. Стала відно. І тут ён убачыў, што маці глядзіць на яго быстрым позіркам, якога ўжо даўно ў яе не было. Яна з усіх сіл старалася прыўзняцца і не магла, і нешта хацела сказаць, і не магла выгаварыць. Адны толькі няўлоўныя рухі і шэпт сыходзілі з яе языка. Максім падбег да яе і глядзеў у яе вочы. Абяссіленая, яна ўпала галавой на падушку, і яе вочы не пакінулі свяціцца і не сыходзілі з Максіма. Ён задыхаўся і стараўся ўздыхнуць глыбей. Яна забылася аб сабе і далёка была ад думкі і адчування, што ўмірае. Уся яе істота ў апошнія свае хвіліны напоўнілася іншым. Твар і вочы яе мерклі з пячацю задавальнення, і, можа, нават тут былі адзнакі радасці. Апошнім промнем сваіх вачэй яна дзякавала свайго Максіма і благаслаўляла яго.

Праз хвілін дзесяць Максім пастукаў у акно хаты, якая стаяла бадай што на канцы вуліцы. Гаспадар, стары чалавек, і такая ж старая гаспадыня выйшлі з лучынай у сенцы і ўбачылі Максіма ў ватовай вопратцы і з торбаю за плячыма. Твар яго быў заплаканы, вочы чырвоныя і голас перарываўся.

— Дзядзюхна,— сказаў ён,— цётухна, мая мама памерла. Пахавайце яе, а пасля мне пакажаце яе магілу. Мне не можна быць тут. Пахавайце маму, пахавайце!

Ён выйшаў на сцежку і па ёй, у цёмным веснавым полі, знік з вачэй здагадлівага старога чалавека, які махнуў яму ў дарогу рукой.

1944

ХВЕДАР ЧЭРНЯ

(нарадзіўся ў 1939 г.)

АЛЁШКАВЫ СЯБРЫ

У ката замерзлі ножкі
На марозе у двары.
Неўзабаве да Алёшкі
Папрыходзілі сябры.

Раду радзяць цэлым домам,
Як сапраўдныя ўрачы:
Як жа коціку малому
У бядзе дапамагчы?

Доўга справу вырашалі,
Паспрачаліся чуць-чуць.
І нарэшце так сказалі:
— Трэба коціка абуць!

Прымяралі, шылі разам,
Выдумлялі штось яны.
А каток малы тым часам
Ціха грэўся ля сцяны.

Вось закончана работа.
І на двор усе бягом.
Шумна, весела, з ахвотай
Забаўляюцца з катом.

Пара лапак невялічкіх —
У пуховых рукавічках,

А другая пара, гляньце,—
У абутачку на ваце.

І цяпер ні так, ні гэтак
Не падступіцца мароз.
Толькі дзіўна: як і ў дзетак,
У ката чырвоны нос.

1981

УЛАДЗІМІР ШАХАВЕЦ

(нарадзіўся ў 1918 г.)

НА ЗІМНІМ ВОЗЕРЫ

Ездзіў Сяргейка ў ягады, ездзіў і ў грыбы, але ўсё неяк не здаралася пабыць за горадам узімку.

Цяпер зіма. Свежы белы сняжок ляжыць у двары, у парку, на галінах дрэў. Прыгожа, куды ні зірні. І так чыста, нібы перад якім святам.

А ў лесе? А ў полі? А на рэчцы ці на возеры? Як там цяпер?

І так захацелася хлопчыку завітаць, як кажа тата, да прыроды ў госці, што і апетыт у яго стаў горшы, і спалася не так ахвотна.

Можа, Сяргейка пачаў нават гаварыць у сне, а можа, бацька прачытаў што ў яго вачах,— ён умее гэта рабіць,— але сынава жаданне ўжо не было для яго сакрэтам.

І аднойчы бацька сказаў:

— Заўтра ў нас выхадны. Па радыё абяцалі пацяпленне. Еду на рыбалку. Бяру цябе, Сяргейка, з сабою. Згодзен?

Хіба аб гэтым трэба пытаць? Хлопчык так ускрыкнуў ад радасці, што ажно маці спалохалася. А потым пажурыла трохі бацьку і пачала абодвух сваіх мужчын збіраць у дарогу. Напакавала поўны рукзак яды, нібы яны ехалі не на возера, а сама меней на Паўночны полюс.

— Давай, давай,— з усмешкай гаварыў баць-

ка, пазіраючы на яе старанне.— На свежым паветры з усім расправімся...

Леглі спаць.

Ноч заўсёды мінае хутка, калі спіш. А гэтая дык праляцела яшчэ хутчэй. І ўсё ж Сяргейка паспеў, напэўна, выспацца, бо адразу ж пачуў, як бацька прыўзняўся на ложку, каб паглядзець на будзільнік.

— Што, пара ўжо? — устрывожыўся Сяргейка.

— Давай патрохі ўставаць.

Уставаць патрохі Сяргейка не ўмеў. Змахнуў з сябе коўдру, саскочыў на падлогу. Тут устала і маці. Трэба было самой паглядзець, як апранецца сын,— якое ні пацяпленне, а ўсё ж зіма...

На аўтобусным прыпынку было людна. Занялі чаргу, і, калі падышоў аўтобус, Сяргейка нават не паглядзеў на пярэднія дзверы. Сёння ён не малы хлопчык, а, як і ўсе тут,— рыбак.

Калі ўсе ўладкаваліся і аўтобус крануўся з месца, распачалася ажыўленая гутарка, нібы ехалі тут даўнія знаёмыя. Колькі цікавага можна было пачуць — і дзе што ловіцца, і на што лепш бярэ,— толькі слухай ды запамінай.

— Ну, а ты на што думаеш лавіць?

Сяргейка спачатку не зразумеў, што гэта звяртаюцца да яго. А як зразумеў, з гатоўнасцю адказаў:

— На матыля,— і расчыніў скрыначку, паказваючы сваю рубінавую насадку.

— Добры матыль,— сказаў дзядзька.— Будзеш з рыбай.

За размовай і не заўважылі, як аўтобус прыехаў на месца.

Навокал быў лес, увесь апушаны снегам, сіняваты на світанні, маўклівы і трохі страшны, ну

якраз як у казцы. А каб яшчэ больш было падобна на казку, ад прыпынку разыходзіліся тры сцежкі-дарожкі. Усе, хто прыехаў у аўтобусе, на нейкі час спыніліся на раздарожжы. «Налева пойдзеш... Прама пойдзеш...» — трохі пагадалі яны і, хоць не былі асілкамі, адважна рушылі наперад, па сваю рыбацкую ўдачу.

Сяргейка з бацькам пайшлі направа.

— Там я ведаю адну добрую мясцінку,— сказаў бацька.

А што сюдой было бліжэй да возера — пра гэта толькі падумаў.

Ды дарэмна ён рабіў Сяргейку палёгку. Той так бадзёра крочыў наперадзе, што снег ледзь паспяваў рыпець пад яго валёнкамі.

А калі былі ўжо недзе пасярод лесу, Сяргейка так ірвануў наперад, што бацька ажно спыніўся ад здзіўлення. Спыніўся і ўбачыў: сын бяжыць за зайцам, ды так бяжыць, што, чаго добрага, возьме і дагоніць.

Дагнаць зайца хлопчыку ўсё ж не ўдалося.

— Добра яму, ён босы,— сказаў Сяргейка, вярнуўшыся да бацькі,— а ў мяне на нагах па пуду...

— Сапраўды, апрануты ты не так, каб бегаць за зайцамі.

— А ведаеш, тата, чаму я маўчаў, калі мама накручвала на мяне хусткі і шалікі? Калі не наловім рыбы, запхнём усё ў рукзак, і ніхто не падумае, што ў нас пуста.

— Будзе з цябе рыбак,— засмяяўся бацька.

Тым часам выйшлі да возера. Як вялізнае люстэрка, там-сям запарушанае снегам, ляжала яно перад Сяргейкам, бліскучае і ў прыцемку, таямнічае і прывабнае.

Тут ужо наперадзе пайшоў бацька, раз-пораз

стукаючы пешняй па лёдзе. Ён адразу стаў вельмі сур'ёзны.

— Ты падобны на дзеда,— не вытрымаў Сяргейка.— Ідзеш з кіёчкам.

Не паспеў бацька што адказаць, як ззаду застракатаў матацыкл, на поўным ходзе ўз'ехаў на лёд і ў момант перагнаў іх, абдаўшы сіняватым дымком.

— Ну вось цяпер можна і не быць дзедам,— павесялеў бацька.— Лёд моцны.

Прайшлі яшчэ ладны кавалак возера.

— Тут! — сказаў бацька нарэшце.

Лёд усюды быў роўны, ды бацька, мусіць, нешта ведаў, калі сказаў: тут! Ён зняў рукавіцы, паплёваў на рукі і з усяго размаху пачаў біць пешняй па лёдзе, нібыта быў на яго злосны. Неўзабаве радасна забулькала вада, вырваўшыся на волю. Побач бацька прабіў другую такую ж лунку,— гэта ўжо для Сяргейкі.

І яны пачалі рыбачыць.

Праўда, Сяргейка спачатку толькі глядзеў, як бацька размотвае вуду, начэплівае ярка-чырвонага матыля, апускае яго ў лунку, бярэ ў руку кароценькае, зусім дзіцячае вудзільна. І вось ён падхопліваецца, хуценька перабірае рукамі лёску, і на лёдзе ўжо трапечацца сапраўдная, жывая рыбіна.

Тут ужо Сяргейку мала толькі глядзець. Ён паўтарае ўсё, што рабіў бацька, схіляецца над лункай і пільна глядзіць на паплавок. І раптам хлопчык зрываецца з месца, бяжыць ад лункі на ўсе ногі, як тады, калі даганяў зайца. А з лункі выскаквае, нібы хто пусціў яго са дна возера з рагаткі, залацісты, даволі-такі ладны ёрш. А ў гэты час з-за ўзгорка іскрацца першыя промні сонца, нібы вітаючы новага рыбака.

— Свой метад прыдумаў,— задаволена ўсміх-

нуўся бацька.— Можна і так лавіць, калі не хапае цярпення перабіраць лёску.

Справа ў Сяргейкі пайшла на лад. Самае горшае было — адчапіць ярша. Але нічога, хоць і пакалоў трохі рукі, налаўчыўся і гэта рабіць. А матыля ён начэпліваў хутчэй за бацьку. Вядома, кручок маленькі, матыль тоненькі,— якраз па Сяргейкавых вачах і пальцах. Праз якую гадзіну ён пачаў ужо дапамагаць бацьку, бо той забыў дома акуляры і так корпаўся над кожным чарвячком, што ажно шкада стала яго.

Пад поўдзень рыба пачала брацца горш. І не ў адных толькі іх. Можна было бачыць, як пачалі блукаць па возеры туды-сюды рыбакі, хтоніхто развязаў рукзак, каб падсілкавацца,— верная прыкмета, што рыба ўзяла адпачынак.

Пайшоў да суседняй купкі рыбакоў і Сяргейкаў бацька пацікавіцца, што чуваць у іх. Там таксама надышло зацішша. Гутарачы з рыбакамі, ён час ад часу пазіраў на Сяргейку. І раптам убачыў дзіва. Сын пачаў выкідваць з лункі яршоў аднаго за другім. Зацікавіліся гэтай незвычайнай праявай і астатнія рыбакі. А адзін з іх, відаць, самы цікаўны, падышоў да хлопчыка.

— Ну і малайчына,— сказаў той рыбак, трохі паназіраўшы за Сяргейкам.— Дык ты ж — вынаходнік!

А ўсё было проста. Сяргейку надакучыла глядзець на нерухомы паплавок, і хлопчык пачаў дробна трэсці вудзільнам. І раптам там, на глыбіні, замітусілася, паблісквaючы, мармышка з матылём, наддаючы апетыту ленаватым у поўдзень яршам. Тут і скончыўся перапынак. Як там ні было, а Сяргейка мог радавацца: хоць і выпадкова, а стаў ён вынаходнікам.

Зімовы дзень кароткі. Лавіць бы яшчэ ды лавіць, але сонца ўжо схілілася да захаду.

— Будзем збірацца дадому,— сказаў бацька.

— Адну хвіліначку,— папрасіў Сяргейка. Выцягнуўшы чарговага ярша, ён пачаў скручваць вуду.— Цяпер можна. Дваццаць і яшчэ раз дваццаць...

Да аўтобуса крочылі побач. Сяргейка ўжо так не бег. Можа, стаміўся за дзень, а можа, быў ён цяпер больш сталы, чым раніцай. А бацька? А бацька, як ён сказаў сам, наадварот — памаладзеў за гэты дзень.

1965

АЛЕСЬ ШАШКОЎ

(нарадзіўся ў 1923 г.)

ЯК ВАСЬКА БЛІН СТАЎ ГЕНЕРАЛАМ

Нас было чацвёра: Лёнька Гром, Пецька Грук, я, Міцька Верас, і Блін. Не, звалі яго Васькам Радкевічам, але для нас ён заўсёды быў проста Блін.

Ды што там Блін! Мы абзывалі Ваську самымі крыўднымі мянушкамі, а ён лыпаў чорнымі вачанятамі і — маўчаў. Маўчаў, бо ведаў: запярэч — і атрымаеш дзесятак сутак «страгача». А як жа! Мы, усе трое, яго камандзіры!

Блін жа быў радавым. Гэта ён, разгарнуўшыся ў баявы ланцуг, бег следам за «генералам», Лёнькам Громам, штурмаваў адну крэпасць за другой. Следам за ім, цяжка дыхаючы, танкам пёр напралом тоўсты Пецька Грук, наш «начальнік штаба». А потым ужо сігаў я, «камісар дывізіі». Мы з ходу выбівалі ворага з акопаў, кідалі пластмасавыя бутэлькі з вадою, уяўляючы, як кладуцца ад выбухаў нашых гранат варожыя салдаты.

Пасля кожнага такога бою мы вярталіся на сваю базу, станавіліся ў строй, і Лёнька Гром чапляў нам, сваім афіцэрам, баявыя ордэны — каляровыя значкі.

Радавы Блін стаяў анямелы. Атрымаўшы медаль — касцяны гузік,— ён упалым голасам казаў: «Зноў медаль». І безнадзейна прасіў даць яму калі не ордэн, то хоць званне яфрэйтара.

Так мінула б, відаць, яшчэ шмат дзён, калі б не адна падзея.

У той ціхі сонечны дзень мы штурмавалі варожыя ўмацаванні на другім беразе нашай ракі. Васька Блін у гэты час дапамагаў бацьку рамантаваць на хаце дах. І камандаваць нам не было кім. А таму Лёнька Гром, уздыхнуўшы, аб'явіў:

— Іду ў разведку сам. Пачуеце крык савы — зараз жа плывіце да мяне на той бераг.

Лёнька неахвотна распрануўся і, уцягнуўшы галаву ў плечы, плюхнуўся ў ваду. Аж спалохана загаманілі гусі на варожым беразе.

Мы з Пецькам заляглі ў траве і пачалі назіраць за сваім камандзірам. Але бачылі толькі яго рукі, якія мільгалі ў залацістых пырсках вады.

Раптам Лёнька заціх, выцягнуў шыю, нібы хацеў аддаць нам нейкі новы загад, і... знік пад вадою.

— Удакладняе глыбіню,— аўтарытэтна вызначыў Пецька.

У гэты момант Лёнька вынырнуў, замахаў рукамі, і мы выразна пачулі яго немае «р-ратуйце!».

З перапуду, не ведаючы, што рабіць, мы беглі па беразе і таксама крычалі. А Лёнька ўжо не крычаў. Ён то на нейкі момант з'яўляўся на паверхні вады, то зноў знікаў.

І тут мы ўбачылі Ваську Бліна. Не распранаючыся, ён сігануў у раку і шпарка паплыў туды, дзе апошні раз паказалася галава нашага камандзіра.

Ад страху, што зараз не стане і Ваські, мы з Пецькам кінуліся хто куды...

Пра ўсё, што было потым, мы даведаліся ўжо ў Лёнькавай хаце. Блін выратаваў Лёньку. Той

хутка ачуняў і зноў з'явіўся на нашай вайсковай базе. Панура загадаў:

— Марш на пазіцыю!

Апусціўшы вочы, мы неахвотна пайшлі за сваім камандзірам. Ад сораму мае вушы гарэлі, а Пецька шморгаў носам і засяроджана глядзеў на свае белыя ад пылу чаравікі.

Блін убачыў нас здалёк, падбег і, як заўсёды, стаў перад намі па камандзе «смірна».

— Адставіць,— махнуў рукою Лёнька і, павярнуўшыся да нас, сурова сказаў: — Цяпер наш камандзір — Вася Радкевіч. А мы — яго салдаты. Ясна? Стаць у строй!..

І зноў мы зацята штурмавалі варожыя крэпасці, бралі доты і бліндажы, фарсіравалі раку. Але камандаваў намі ўжо Васька Блін, наш новы «генерал». Ён чапляў нам медалі за адвагу, а мы дзякавалі і нават не адважваліся папрасіць звання яфрэйтара.

1980

ІВАН ШУЦЬКО

(нарадзіўся ў 1925 г.)

КРАН

Будавалі новы дом
Побач з тым, дзе мы жывём,
Больш за ўсіх стараўся кран,
Кран — асілак, велікан.

Цэглу, цэмент, бэлькі, блокі
Падымаў ён пад аблокі,
Адпачынку мала знаў —
Падымаў і падымаў.

І хоць ён заўжды стараўся,
На мяне не забываўся:
Толькі выйду на балкон,
Адбівае мне паклон.

І нарэшце дом гатоў,
Ён прымае жыхароў.

Ажылі ўжо ўсе пакоі.
Кран магутнаю рукою
Навасёлаў прывітаў
І ў дарогу заспяшаў...

Школу кран цяпер будуе.
І я зноўку з ім сябрую:
Як іду — не праміне,
Нізка кланяецца мне.

1963

РАЗУМНЫЯ КОЗЛІКІ

Над рэчкай вірлівай,
Як, помніце, ў байцы,
Два козлікі неяк
Сышліся на кладцы.

— Не трапіць бы, браце,
І нам у бяду,
Як тым, што калісьці
Упалі ў ваду...

— Вядома, спрачацца
З табой нам не варта.
Ты, думаю, дружа,
Не будзеш упартым?

Так козліку козлік
Доўга даводзіў,
Ды толькі з дарогі
Ніхто не сыходзіў.

І справа нарэшце
Дайшла ў іх да бою...
Разумнікі плюхнулі
Ў рэчку абое.

1963

СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

(нарадзіўся ў 1908 г.)

КАМАР-БРЫНКУН І ЖАБА-КВАКУХА

У лясной было газеце —
Жыў Камар на белым свеце...
Ехаў лесам, полем, лугам
На жучках брыклівых цугам.
Было клопату нямала,
Бо карэту падкідала,
На выбоях вельмі трэсла,
Куды ліха пана несла?..
А вяльможа, пан высокі,
Надзімаў, пузырыў шчокі.
Капялюш ён меў з кукардай
І на ўсіх глядзеў з пагардай.
У палацы ля балота
Слугам выпала работа:
Падмятаць пляцы, дарогі,
Вымыць ганак і парогі
І спаткаць пакорна пана.
Мог прыехаць нечакана...
З-за фіранкі Камарыха
Тварык высунула ціха,
І было усім вядома:
Не сядзелася ёй дома.
Праз шырокае аконца
Паглядала супроць сонца.
Служкі бегалі з трывогай,
А было іх безліч, многа.
«Едзе пан, Камар зялёны!» —

Раскрычаліся вароны.
«Едзе, едзе пан высокі!» —
Раскрычаліся сарокі.
«Едзе, едзе пан куслівы!» —
Кажа бусел клапатлівы.
Лёскат, крыкі і трывога,
Шумам поўніцца дарога.
Жаба квакае ў балоце,
Перасохла ў яе ў роце,
Выстаўляе яна вуха
І пытаецца, квакуха:
«Хто там? Хто там на памосце?
Да каго імчацца госці?»
Скача Жаба, аж спацела,
Каля вываратня села
І чакае, паглядае,
Рот шырокі разяўляе.
А пасля яна як гляне,—
Бачыць, мчацца паязджане,
Праз выбоіны, ухабы
Пралятаюць каля Жабы.
Жаба з дзіву пазяхнула
І карэту праглынула.
Раскрычаліся сарокі:
«Дзе падзеўся пан высокі?..»
Раскрычаліся вароны:
«Дзе падзеўся пан зялёны?..»
Кажа Бусел клапатлівы:
«Дзе падзеўся пан куслівы?..»
Кажа слугам Камарыха:
«Пэўна з панам стала ліха...»
Жаба рот не разяўляе,
Бо пра ўсё да кроплі знае.
Скача Жаба на балоце
З Камаром зялёным ў роце.
Паляцела вестка рэхам —
Пан дадому не даехаў.

Слугі рады. Пані плача.
Па балоце Жаба скача.
І ў лясной было газеце —
Жыў калісь Камар на свеце.

1972

ДЗЯЎЧЫНКА І БУСЕЛ

Пабягу да бусліка
Я на сенажаць,
Буду забаўляцца,
Буду з ім гуляць.

— Бусліку, бусліку,
Добры мой,
Пачакай хоць крышку,
Стань, пастой!

Задзірае дзюбу
Бусел угару.
Што ён тут клякоча,
Я не разбяру.

Бусел клёка-клёкала,
Доўгі нос,
Раптам галавою
Мне патрос:

— Не хадзі, дзяўчынка,
І не лазь,
Бачыш тут наўкола
Твань і гразь.

Жабак не палохай,
Кветак не тапчы,
Хай цвітуць званочкі,
Касачы.

1972

ЗАЙКА-ШКОЛЬНІК

Прыпусціўся зайка ў танец,
Бо купілі яму ранец,
Сшыткі, кнігі, карандаш,—
Пойдзе ў школу зайка наш.
У гушчарніку, у лозе,
Пад карчамі, у бярлозе
Баравы стары мядзведзь
Зайку вывучыць, як пець,
Як чытаць, як рахаваць —
Раз, два, тры, чатыры, пяць...
Скача зайка. Вось дык танец...
Паглядае ён на ранец,
Вымыў ножкі, носік, вушы,
Заўтра ў школу зайка рушыць.
На сасне крычаць цяцёркі:
— Ты вучыся на пяцёркі!..

1972

ГЕОРГІЙ ШЫЛОВІЧ

(нарадзіўся ў 1924 г.)

НАД СІНІМ МОРАМ

Незвычайна пачаўся гэты ўрок малявання. Не так, як заўсёды, як прывыклі шасцікласнікі. Усе чакалі, што настаўнік зноў прапануе ім маляваць нацюрморт. Прынясе ў клас гляк або талерку з яблыкамі, паставіць на стол і скажа:

— Сёння ў нас малюнак з натуры.

Так думаў і Коля Купава, загадзя рыхтуючыся да ўрока. Коля вельмі любіў маляваць. Яшчэ на перапынку ён праверыў алоўкі, некаторыя падвастрыў тачылкай. Дастаў з партфеля ватманскую паперу і паклаў на парту.

Хлопчыку не цярпелася: хутчэй бы пачаўся ўрок.

І вось у клас увайшоў настаўнік Сцяпан Сямёнавіч. На хаду ветліва прывітаўся з вучнямі і спыніўся каля стала.

Але што гэта? У руках у настаўніка — ні гарлача, ні талеркі з яблыкамі, нічога такога, што ён звычайна прыносіць з сабой. Толькі кардонная папка пад пахай ды некалькі алоўкаў у верхняй кішэньцы пінжака. «Відаць, ніякага нацюрморта сёння не будзе»,— расчаравана падумаў Коля.

Некалькі хвілін Сцяпан Сямёнавіч маўчаў, уважліва прыглядаўся да вучняў, потым падышоў да акна і ціха, але надзвычай выразна пачаў дэкламаваць:

Над сінім морам дуб зялёны;
На дубе залаты ланцуг:
І днём і ноччу кот вучоны
Па ланцугу вядзе свой круг...

Ад нечаканасці вучні так прыціхлі, што нават праз падвойныя рамы вокнаў у памяшканні стала чуваць, як на вуліцы размаўляюць дзве нейкія цёткі. Ні Коля, ні яго сусед па парце, Валік Карасікаў, ні іх сябры ў класе пакуль што нічога не разумелі. Можа, настаўнік перадумаў і вырашыў замест урока малявання правесці ўрок літаратуры?

Тым часам Сцяпан Сямёнавіч прачытаў яшчэ некалькі радкоў і спытаў:

— Чые гэта вершы? З якога твора?

— Пушкіна! — наперабой загаманілі шасцікласнікі. — З «Руслана і Людмілы»!

— Правільна. Гэта ўступ да паэмы-казкі «Руслан і Людміла», якую напісаў Аляксандр Сяргеевіч Пушкін. Гэта вы ведаеце, чыталі, — і ён шматзначна паглядзеў на вучняў. — А як вы ўяўляеце сабе зялёны дуб, залаты ланцуг на ім, ката вучонага? Можа, хто паспрабуе адказаць?

Вось тут і пачалося самае цікавае. Вучні адразу сцямілі, чаму настаўнік пачаў урок такім чынам. Не нацюрморт будзе ў іх сёння, не малюнак з натуры, а нешта больш складанае...

Казачны дуб уяўляўся ўсім магутным дрэвам з разгалістай кронай, увесь усыпаны жалудамі. Не выклікаў асаблівых пярэчанняў і ланцуг. Праўда, спачатку некаторыя думалі, што ён павінен быць тоненькім, бо, вядома, залаты, і нагадваць ланцужок кішэннага гадзінніка. Потым перадумалі і вырашылі, што такі ланцужок не адпавядае казачнаму царству. Ён таксама павінен быць незвычайных памераў, зіхацець і пераліваца на сонцы.

Затое кот выклікаў доўгія спрэчкі.

— Кот не звычайны,— горача гаварыў Валік,— а вучоны. Так? Дык я лічу, што на ім акуляры павінны быць. Ну, і барада, дарэчы, а то як жа?

— Выдумаў! — засмяяўся Коля.— Дзе ты бачыў ката з барадой? Гэта ж табе не казёл, можа?

Пасля такіх слоў нават Сцяпан Сямёнавіч не стрымаў усмешкі. Аднак ён не перабіваў вучняў і ўважліва сачыў за іх разважаннямі. Довад сябра не збянтэжыў Валіка. Ён стаяў на сваім:

— Згодзен, што ў сапраўднага ката не бывае барады. Але гэта ж казка. Разумееш? Казка... А як ты інакш перадасі яго вучонасць? Партфель на шыю пачэпіш, ці што?

— А нічога,— адказаў Коля,— намалюю звычайнага ката, і ўсё тут.

Валік не згаджаўся:

— Тады ён не будзе казачны.

Выказвалі свае і іншыя вучні. Нарэшце настаўнік сказаў:

— Няхай кожны з вас паспрабуе намаляваць на паперы ўсё так, як ён разумее, як уяўляе апісанае паэтам. Кожны самастойна. Дамовіліся?

Бадай што, ніколі ў шасцікласнікаў не было такога цікавага ўрока малявання, як гэты. І сапраўды, перад табой чысты ліст паперы, алоўкі і... вобразныя радкі паэта: «Над сінім морам дуб зялёны...» І больш нічога.

Коля ніяк не мог вырашыць, з чаго пачынаць. І так прыкіне, і гэтак. А на памяць міжвольна набягаюць вядомыя радкі:

Ідзе направа — спеў заводзіць,
Налева — казку распачне,
Там цуды скрозь: лясун там бродзіць,
Русалка між галін мільгне...

«Русалка! — задуменна прашаптаў Коля.— Цікава, як яна выглядае?.. Дуб зялёны...»

І раптам перад яго вачыма, нібы наяву, паўстала ліпка. Не дуб, а чамусьці ліпка. Тая самая ліпка, якую ён мінулай восенню пасадзіў насупраць акон школы. А побач з ёю — бярозка, клёнік і іншыя маладыя дрэўцы абапал тратуара. Коля быццам бачыць, як дрыжыць на ветры іх першае кволае лісце, як гайдаюцца галінкі. Хлопчык не чуе павольных крокаў Сцяпана Сямёнавіча, не заўважае яго. У думках ён ужо далёка адсюль, на беразе Дняпра.

Прыгадваюцца нядаўні паход, рака. Дзесьці ўдалечыні цямнее зубчасты грэбень лесу. Разам з сябрамі ён крочыць з рукзаком за плячыма. Падарожнікі спяшаюцца. Наўздагон за імі імкліва сунецца цяжкая хмара. Трэба хутчэй выбраць месца прывалу, паспець схавацца ад дажджу. Хутчэй!.. Хутчэй!..

«Успомніў! — раптам ледзь не крыкнуў Коля.— Успомніў! Іменна такі дуб апісаны паэтам!»

Ён нібы ўбачыў купчастую зялёную шапку векавога дрэва, пад якім схаваліся тады ад дажджу турысты. Дуб-асілак нават і не думаў гнуцца пад напорам ветру. Толькі нездаволена гудзеў голлем, быццам сварыўся з непагаддзю...

Коля зноў бярэцца за аловак. Цяпер яму нічога не трэба выдумляць. З-пад рукі на дзіва лёгка кладуцца патрэбныя штрыхі, ствараючы прыгожы малюнак дуба. Хлопчык цалкам захоплены сваёй работай. А недзе там, на калідоры, ужо звініць званок на перапынак.

Шкада, аж крыўдна! Так хутка праляцеў гэты ўрок.

Пасля званка Сцяпан Сямёнавіч сказаў:

— Пачатую работу, сябры, будзем працягваць наступны раз. Памяркуйце, як больш маляўніча

зрабіць сваю ілюстрацыю да казкі. Лепшыя малюнкі трапяць на школьную выстаўку.

Дома Коля адразу кінуўся да этажэркі, знайшоў паэму А. С. Пушкіна і, зазірнуўшы ў змест, адгарнуў патрэбную старонку. Цудоўная казка зноў захапіла ўяўленне хлопчыка.

Там на няведамых дарожках
Звяроў дзівосных след ляжыць...

У той вечар Коля так і не выйшаў пагуляць, як рабіў гэта звычайна. Ужо даўно былі падрыхтаваны ўсе ўрокі. Мама мыла бялізну, і Коля некалькі разоў прыносіў ёй ваду. Потым садзіўся зноў за стол.

— Ты чаму гэта не выйдзеш пагуляць? — спытала маці.— Можа, нездаровіцца?

— Не,— весела адказаў Коля і пачаў расказваць пра сённяшні ўрок малявання. Потым паказаў ёй свой эскіз казачнага дуба і паскардзіўся: — Вось ніяк не прыдумаю, як лепш ката намаляваць.

— Мне здаецца, ты дарэмна ламаеш галаву,— адказала маці.— Якім павінен быць кот? Самым звычайным.

— Як гэта звычайным? — здзівіўся Коля.— Ён жа казачны! Вучоны...

— А хіба наш Барсік не «вучоны»? — хітравата спытала маці і паклікала з кутка пушыстага шэрага ката.— Паглядзі, як ён зараз будзе мяне слухацца. Барсік, гоп! Гоп! — і яна паляпала далоняй па калене. Барсік паважна выгнуў спіну дугой, пацягнуўся, скочыў на канапу і замурлыкаў сваю няхітрую песеньку.— Бачыш? Вось ты і намалюй яго. Толькі вусы зрабі даўжэйшыя, вочы размалюй зялёнай фарбай, каб яны гарэлі казачным халодным святлом. А на шыі — раменьчык, залаты ланцуг. Зразумеў?

— Зразумеў, мама. Дзякуй! — узрадаваўся Коля.

Мінуў тыдзень. Кожны дзень у вольны ад заняткаў час Коля сядзеў над сваім малюнкам. Шчодра частаваў Барсіка вяндлінай і каўбасой, каб толькі той пазіраваў яму. Асабліва цяжка даваліся вочы Барсіка. Ніяк не хацелі яны загарацца тым казачна халодным святлом, пра якое гаварыла маці. Коля расказаў аб гэтым настаўніку, і той параіў побач з зялёнай фарбай зрабіць адзін-два чырвоныя мазкі. Эфект атрымаўся на дзіва ўдалы. Вочы ката адразу хціва загарэліся, быццам у жывога.

— Не вочы, а агеньчыкі! — здзівілася маці.

А калі на наступны ўрок малявання Коля прынёс сваю работу ў школу, сябры так і ахнулі. І дуб, і вучоны кот, і залаты ланцуг атрымаліся ў Колі, нібы сапраўдныя, і ў той жа час — казачныя. Вось толькі сіняе мора хутчэй нагадвала звычайную лукавіну Дняпра. Валік першы так і сказаў.

— Ты правільна заўважыў,— сказаў на гэта Сцяпан Сямёнавіч.— Але гэта не бяда. Коля яшчэ не бачыў сапраўднага мора. Таму яно і нагадвае ў яго раку, якую ён добра ведае...

...Крыху пазней у другой сярэдняй школе горада была адкрыта выстаўка работ юных мастакоў. І амаль усе наведвальнікі выстаўкі падоўгу затрымліваліся каля аднаго з малюнкаў, пад якім быў прыгожа выведзены надпіс: «Над сінім морам дуб зялёны».

1956

ВІКТАР ШЫМУК

(нарадзіўся ў 1933 г.)

ВІШНІ

Мы са школы выйшлі,
Глянулі навокал:
Расцвітаюць вішні
Каля школьных вокан.

Мы ж іх даглядалі,
Мы іх гадавалі.
Мы вадой крыштальнай
Дрэўцы палівалі.

І яны — глядзіце,
Як памаладзелі:
На галінкі лісце
З кветкамі адзелі.

Майскім ранкам светлым
Зелянеюць дрэвы,
Нам махаюць ветла
Пад вясны напевы.

Вішні расцвітаюць
Каля нашых вокан...
Ах, якая радасць,
Прыгажосць навокал!

1970

КАНІКУЛЫ

Ля рэчкі —
Росныя сцяжынкі,
Сцяжынкі —
Ў казачным бары.
Ў паходзе хлопчыкі,
Дзяўчынкі,
Ў паходзе
Школьныя сябры.

Яны ідуць па родным
Краі,
Яны Прынёманнем
Ідуць,
Бярозкі іх
Здалёк вітаюць,
Ім песні жаўрукі
Пяюць.

О любы край,
Ты днём і ўночы
Такі прыгожы,
Дарагі,
Як хораша
Палямі крочыць,
Пазнаць
Сцяжынкі і шляхі.

Пабыць у пушчах
Ля зямлянак,
Што параслі
Даўно травой,
Дзе мужна
Нашы партызаны
Ішлі на ворагаў
У бой.

Пабыць ля Нёмана
І Буга,
Пабыць ля Сожа
І Дняпра,
Прайсціся полем,
Лесам, лугам
І песні пець
Каля кастра...

1970

УЛАДЗІМІР ШЫЦІК

(нарадзіўся ў 1922 г.)

КІБ ЗАГАВАРЫЎ АПОЎНАЧЫ

Таў Кіта адсюль, з адлегласці мільярд кіламетраў, выглядаў нават меншым, чым Сонца з Зямлі. Але ўдзень ён палаў надзвычай ярка, і яго святло мякка клалася на горы, што высокай сцяной акружалі невялікае плато, выбранае Антонам Галаем для свайго лагера. Тады і ў скафандры, які меў тэрмаізаляцыю, было горача. А ўначы ўсё навокал скоўваў амаль касмічны холад, і чуткія сейсмографы адзначалі, як недзе ў гарах рушацца скалы, скаланаючы ваколіцы магутнымі абваламі.

Адзнак жыцця на гэтай знешняй планеце сістэмы Таў Кіта Галай не знайшоў. Ён абляцеў яе некалькі разоў, пакуль выбраў месца для пасадкі, і ўсюды былі толькі шэры пясок ды такія ж шэрыя, попельнага адцення, горы.

Таму планета і атрымала сваю назву — Попельная.

Апынуўся Галай на Попельнай невыпадкова. У апошні час многія касманаўты, вылятаючы за межы сонечнай сістэмы, пачалі прымаць невядомыя радыёсігналы. Найбольш верагодная крыніца іх таілася ў раёне зоркі Таў Кіта, якая мела некалькі планет. Людзі не маглі разгадаць сігналаў. Але даследчыкі сцвярджалі, што пасылаюць іх разумныя істоты. Гэта было падобна на праўду, бо на дзвюх-трох планетах сістэмы маглі існаваць умовы для жыцця. І калі людзі стварылі

касмічныя караблі, здольныя пераадольваць прастору ў адзінаццаць светавых гадоў, было вырашана паслаць экспедыцыю да Таў Кіта. Базу для яе на адной з незаселеных планет і павінен быў стварыць Антон Галай, які стартаваў першым.

Рухомыя робаты, паводле загадзя дадзенай праграмы, хутка сабралі жытло і дапаможныя памяшканні. К канцу першага дня на плато ўжо ўзвышаўся домік, у якім Галай мог адчуваць сябе, нібы на Зямлі, а нястомныя робаты з кібернетычнай праграмай, або проста кібы, як іх ласкава называлі касманаўты, занялі пазіцыю на пастах вакол лагера. Галай не чакаў небяспечных наведвальнікаў, не чакаў ніякай пагрозы, але такі быў закон для кожнага касмічнага дэсанта.

Першая ноч прайшла спакойна, і з раніцы Галай на ўсюдыходзе аб'ехаў бліжэйшыя ваколіцы. Горы цягнуліся далёка-далёка, як хапала вока. Голыя, скалістыя, пахмурыя, і ніякіх адзнак чагонебудзь, што магло б парадаваць позірк разнастайнасцю, уласцівай многім іншым планетам, на якіх пабываў ён раней, хоць яны таксама былі пазбаўлены жыцця.

— Ты, стары, апынуўся тут не для таго, каб цешыць вока прыгожымі краявідамі,— уголас прамовіў сам да сябе Галай.

Кіб, які суправаджаў яго, сур'ёзна заўважыў:

— Мы прыехалі працаваць.

Галай засмяяўся і павярнуў да базы. Перад сном ён яшчэ раз уважліва праверыў паказанні аўтаматычных станцый і лабараторый і паслаў радыёграму начальніку экспедыцыі. Шэсць разоў павернецца Попельная вакол сваёй восі, пакуль паведамленне дасягне раёна, дзе чакае яго сігналу падрыхтаваная да скачка і дрэйфуючая зараз у космасе экспедыцыя. Пасля пройдзе яшчэ дзесяць доўгіх мясцовых сутак, і яго адзіноцт-

ва скончыцца. Атрымаўшы вестку, экспедыцыя перабазіруецца на Попельную. Галай чакаў гэтага дня не таму, што баяўся адзіноты: да яе ён прывык за многія гады вандравання ў бязмежных прасторах космасу. Ён не выносіў бяздзеяння, а тут вымушаны быў сядзець склаўшы рукі. З гэтай прыкрай думкай ён і заснуў.

Кіб загаварыў апоўначы, парушыўшы абавязковую ў час сну чалавека цішыню. Гэта было так нязвыкла, што Галай аж сеў на ложку. А голас прыемнага тэмбру з нейкім, як яму здалося, хваляваннем паўтараў:

— Ахоўны пост бачыць чырвоныя агеньчыкі. Ахоўны пост бачыць чырвоныя агеньчыкі...

На экране тэлесувязі паказаліся вяршыні бліжэйшых гор. Раз-пораз на іх успыхвалі чырванаватыя іскаркі. Праз некаторы час яны перамясціліся на схілы.

Іскарак было няшмат. Галай налічыў іх не больш дзесяці. Але адкуль яны з'явіліся і што гэта? Кіб, які ўвесь час трымаў сувязь з ахоўнымі пастамі, паведаміў:

— Агеньчыкі рухаюцца, да лагера не набліжаюцца.

Гэта было нешта новае, і Галай, не марудзячы, вывеў усюдыход. Пагоня за агеньчыкамі была доўгай і марнай. Яны зніклі, не пакідаючы ніякага следу.

Стомлены, Галай вярнуўся на базу, калі развіднела. Ранішняе сонца Попельнай свяціла ласкава і спакойна, бы і не было халоднай ночы з таямнічымі прывідамі. Каб не разумныя кібы, Галай палічыў бы нават, што ў яго была галюцынацыя.

«Магчыма, гэта былі выпраменьванні нейкай энергіі»,— запісаў ён у вахценным дзённіку. Але гэтая няпэўнасць вываду выклікала толькі пачуц-

цё незадаволенасці сабой. Ён павінен быў дазнацца, што за агеньчыкі бачыліся яму ўначы, дакапацца да сутнасці з'явы. Устрывожаны, Галай амаль увесь дзень прахадзіў побач з вартавымі кібамі, пільна ўглядаючыся ў горныя расколіны.

А новая ноч прынесла новую загадку. Кіб, які знаходзіўся на самым далёкім пасту, раптам на паўслове спыніў перадачу. Аўтаматычны пульт адразу ж накіраваў да яго рамонтнага робата. Але і той, як толькі дабраўся да месца, перастаў адказваць на выклік. Галай счакаў хвіліну, другую. Сувязь маўчала. І ён пайшоў сам.

Кібы ляжалі нерухомыя — і той, што быў тут раней, і той, што прыйшоў на дапамогу. У абодвух апусцелі атамныя батарэі, нібы нехта адным махам выграб адтуль усю энергію, запасаў якой звычайна хапала на некалькі тысяч гадзін.

Галай агледзеўся. Ноч, густая ад чарнаты, з якой не маглі саўладаць нават яркія калматыя зоркі, падступала з усіх бакоў, хаваючы ў сабе незразумелую таямніцу, якая станавілася ўжо небяспечнай. Упершыню ён адчуў, як халодныя мурашкі папаўзлі па спіне.

Назаўтра апусцелі батарэі яшчэ трох кібаў. Стала ясна, што гэта не выпадак, што некаму, відаць, патрэбна іх энергія. Але каму? У пошуках разгадкі Галай агледзеў усе горы вакол базы і зноў не заўважыў нічога падазронага.

А неўзабаве здарылася яшчэ горшае: ураз страцілі энергію батарэі ўсюдыхода і ўсіх робатаў, якія знаходзіліся за межамі базы. Пазбаўлены памочнікаў, Галай адчуў сябе бяссільным супраць дзеяння выпадковых, а мо нават і варожых сіл, якія, здаецца, вялі на яго планамернае наступленне. І яшчэ ён падумаў, што хутка прыбудзе экспедыцыя. Таварышы высадзяцца, выгрузяць тэхніку, абсталяванне, пабудуюць абсервато-

рыю, лабараторыі. А потым аднойчы ўсё гэта замрэ, пазбаўленае крыніцы свайго жыцця — энергіі. І ніхто з іх ужо ніколі не зможа вярнуцца на родную Зямлю.

Адчуванне велізарнай віны ахапіла Галая. Ён не меў права, не ўпэўніўшыся да канца, пасылаць паведамленне, што на Попельнай для людзей няма небяспекі. І пакуль не позна, трэба папярэдзіць таварышаў. Яго сігнал яшчэ застане іх у дарозе. Аб тым, што ён сам сабе адразае шлях да вяртання, Галай нават не падумаў. Заклапочаны толькі адным — хутчэй перадаць паведамленне, ён схіліўся над радыёапаратам.

Жоўтыя індыкатары рацыі святліся, жылі і супакойвалі. Галай вывеў вонкі антэну дальняй сувязі, падключыў да рацыі на поўную магутнасць акумулятары і пачаў кадзіраваць тэкст.

Ціхі шолах прымусіў яго падняць галаву. Зірнуўшы, ён спачатку ўсхапіўся, а потым бездапаможна сеў зноў. Ад акумулятараў паверх аголеных правадоў да антэны з лёгкім шыпеннем струменіліся сінія змейкі. Галоўная энергія базы вылецела беззваротна ў прастору. Ён аказаўся адрэзаны ад Сусвету.

Гэта быў такі ўдар, пасля якога Галай не адразу апамятаўся. Абхапіўшы галаву рукамі, ён доўга сядзеў, не маючы сілы сабрацца з думкамі. Апамятацца яго прымусіў вокліч апошняга кіба, якога ён не выпускаў з памяшкання. Кіб стаяў ля незацененага акна і варушыў кароткімі антэнамі-вусікамі. Галай падышоў да яго і выглянуў у чорную ноч.

За акном у бледным мігценні калматых зорак ледзь прыкметна ўгадваўся высокі горны хрыбет. Гэты малюнак Галай назіраў не раз, у ім не было нічога незвычайнага. Але сёння, зараз, штосекунды з'яўлялася нешта новае. Вось вяр-

шыні гор зрабіліся больш акрэсленымі, пабялелі. І раптам за імі ўспыхнула светлая пляма. Яна разгаралася, ахопліваючы паўнеба, дрыжала, і гэтае дрыжанне, здавалася, хвалямі папаўзло наўкола. А яшчэ праз імгненне ярка-яркая блакітная паласа, скіраваная кудысьці ў бясконцасць, прарэзала ноч. Паласа пералівалася, зіхацела, азараючы панылы горны пейзаж мёртвым святлом, уражваючы магутнасцю і фантастычнасцю.

Відовішча працягвалася не больш хвіліны. А потым ноч зрабілася яшчэ чарнейшай. І Галай, аслеплены блакітным зззяннем, не адразу заўважыў на схілах гор колішнія чырвоныя агеньчыкі.

— Ага, зноў вы тут! — злосна ўсклікнуў Галай.— Але цяпер я злаўлю хоць аднаго! — Прыхапіўшы кіба, ён выскачыў за дзверы.

Агеньчыкі паводзілі сябе, як і мінулы раз: кружылі, снавалі, не даючы наблізіцца да сябе. І тады Галай падумаў: «А што, калі энергію кралі ў яго менавіта гэтыя няўлоўныя светлячкі?» Губляць яму ўжо не было чаго, і, каб праверыць сваю здагадку, ён паслаў наперад апошняга кіба. Яны не маглі не паквапіцца яшчэ на адну ёмістую батарэю.

Хітрасць удалася. Агеньчык раптам замігаў, спыніўся, быццам у роздуме, і рвануўся да кіба. Паблізу агеньчык ператварыўся ў бліскучы шар. Прынікшы да кіба, ён успыхнуў, наліваючыся барвовай чырванню. Галай паспеў падбегчы раней, чым шар пакінуў сваю ахвяру. Упартая лютасць авалодала чалавекам. Ён закрычаў:

— На, бяры! — І падставіў провад ад сваёй батарэі.

Шар быў калыхнуўся ў яго бок. Імгненне павісеў нерухома, нібы вагаючыся — прымаць пада-

рунак ці не, і пасунуўся прэч. Некаторы час яшчэ ў цемры чырванеў знаёмы светлячок. Потым знік і ён.

Разгублены, суцішаны, пазіраў Галай услед яму. Чаму шар абмінаў яго, чалавека, не паквапіўся на батарэю?

Неакрэсленая здагадка працяла мозг. Яна была да таго неверагодная, што Галай аж прысеў на скалісты выступ. Так, шары збіраюць на Попельнай энергію і потым, назапасіўшы яе пэўную колькасць, нейкім чынам кудысьці перапраўляюць. Можа, на трэцюю планету ўнутранага пояса, у напрамку якой знікла блакітная паласа, а можа, яшчэ куды. Ды гэта пакуль што не так ужо і важна. Галоўнае, недзе тут, зусім побач па касмічных масштабах, напэўна ёсць разумнае жыццё, прадуктамі вытворчасці якога з'яўляюцца і гэтыя шары, і тая блакітная энергетычная паласа. Але жыццё гэтае, відавочна, развіваецца на іншай аснове, незразумелай і чужой чалавеку. І таму, што Галай адчуваў сябе не толькі асуджаным, а і пазбаўленым магчымасці ўстанавіць кантакт з гэтым жыццём і разумеў, што гэтай магчымасці будзе пазбаўлена і ўся іх экспедыцыя, яму зрабілася невыносна горка і крыўдна. Прыгнечаны ўсім гэтым, Галай узваліў на плечы змярцвелага кіба і пакрочыў на базу. Ён ішоў, засяроджаны, задуменны, і зусім не звяртаў увагі на чырвоныя агеньчыкі, што не гаслі нават пад першымі дрыготкімі праменнямі тутэйшага свяціла. А шары, якіх набралася ўжо некалькі дзесяткаў, з усіх бакоў спускаліся да базы.

— Няма вам больш спажывы,— не спыняючыся, буркнуў Галай. За сябе ён проста не баяўся.

Але далейшыя падзеі прымусілі яго запаволіць крок.

Шары імкліва рынуліся да распасцёртых кі-

баў, апанавалі ўсюдыход, прыніклі да антэны. Яны на вачах гублялі свой залацісты бляск, цямнелі і адплывалі. А кібы... Кібы заварушыліся, у навушніках пачуўся трэск іх рацый. Кібы ажылі.

Не верачы вачам, Галай пазіраў на ўсё гэта, і буйная радасць гарачай хваляй залівала яго з ног да галавы. Разумныя істоты, якія жылі недзе ў межах гэтай сістэмы, даведаліся аб сустрэчы іх аўтаматаў з чалавекам і загадалі вярнуць энергію яго машынам! Як гэта было цудоўна!

Забыўшыся на кіба, што ўсё яшчэ ляжаў на яго плячах, Галай пабег да радыёрубкі.

1964

УЛАДЗІМІР ЮРЭВІЧ

(нарадзіўся ў 1916 г.)



ДЗЕ НАЧУЕ СОНЦА

Таццянка ўвесь час сябруе з дзедам. Мама і тата вельмі занятыя, з работы позна прыходзяць. Бабуля дома тупае. А дзядуля, калі забірае ўнучку з сада, возьме яе за руку ды — у парк гуляць.

Парк — праз вуліцу. Адну Таню не пускаюць і цяпер, калі ёй ужо шэсць мінула. Ведама, увесь час машыны снуюць і снуюць. Трэба выбраць момант, каб перайсці вуліцу. А гэта ўмее толькі дзядуля.

У парку дзед з Таццянай выхадзіў усе куточкі. Яны пераседзелі на кожнай лавачцы, перастаялі пад кожным дрэвам.

Надвячоркам, калі сонца збіраецца на спачын, ідуць заўсёды на горку да планетарыя. «Што такое планетарый?» — спыталася неяк бабуля ў Таццянкі. І ўнучка адказала, як магла: «Гэта такі дом, як капялюш. Толькі ён не на галаве сядзіць, а на зямлі стаіць. У гэты дом ходзяць кіно глядзець. А кіно там пра зоркі, пра месяц. Дзед кажа, што мне яшчэ рана ў тое кіно хадзіць. Трэба падрасці. А пакуль?»

— Пакуль глянем лепш, як сонца заходзіць,— гаворыць кожны раз дзядуля і прысаджваецца на лавачцы ля каруселяў.

І яны глядзяць. Бачаць заўсёды адно і тое ж. Калі садзіліся, сонца вісела над тымі дамамі,

што за паркам. А пасядзелі трошачкі, і яно ўжо да будынка опернага тэатра дакацілася. Вось-вось схаваецца ў ім.

— Дзеду, сонца ў тэатры начуе? — раптам запыталася Таня.

— Ага, унучка, у тэатры,— адказвае не задумваючыся дзед.— Тэатр жа вялікі. У ім — тысяча крэслаў.

— А тысяча гэта многа?

— Табе на цэлы дзень лічыць хопіць.

— А мы ў тэатр сходзім?

— Сходзім. Абавязкова сходзім.

І яны былі ў тэатры. І бабулю з сабой бралі. Глядзелі балет пра доктара Айбаліта. Ой, як там хораша было — малпачкі, ліска, зайчыкі, вавёрачка, жырафа высокая-высокая... Усіх іх добры доктар Айбаліць вылечыў, і ўсе яны потым танцавалі. А сонейка свяціла моцна-моцна, як улетку.

У тэатры яны былі зімой. На вуліцы ішоў снег, а на сцэне было светла-светла. «Гэта сонейка ад мяцеліцы схавалася сюды»,— думала тады Таццянка і сапраўды верыла, што сонца ў тэатры начуе.

Верыла, пакуль не ўбачыла, як сонца за лес садзіцца.

Было гэта аднойчы цёплым лётнім вечарам. У парку ціха-ціха, ні ветрыку. Дзед і кажа:

— Таццянка, хочаш падняцца высока-высока? — А сам паказвае на тое кола, што на горцы ў парку. За кола паначапляны такія лавачкі-калыскі. Садзяцца людзі і падымаюцца ўгару, а потым уніз апускаюцца.

Таццянка ведала, што маленькіх адных туды не пускаюць. А дзеда не адважылася прасіць.

І вось ён сам падахвоціўся.

Таня падумала, памаўчала, глянула на самы верх, вочкі заплюшчыла, а потым і пытаецца:

— З табой, дзеду?

— Са мной.

— Калі з табой, то паедзем.

Дзед купіў у касе два білеты. Узышлі прыступкамі на пляцоўку, аддалі білеты цётцы і пачакалі, пакуль пад'едзе чарговая лавачка. Дзядуля падняў Таццянку, пасадзіў і сам спрытна ўскочыў. Лавачка закалыхалася і неўзабаве спынілася. Кола рухалася ўперад. Таня з дзедам ехалі ўгору.

Сонца чырвоным шарам паўзло, як заўсёды, да опернага тэатра. Садзіліся на дах.

Таццянка зірнула ўніз і ўбачыла, што зямля паплыла ад яе. Яна ўхапілася за дзядулеву руку і задрыжала:

— Ой, дзеду, баюся я!

— А ты, Танечка, не глядзі долу,— супакойваў унучку дзед.— Вунь туды глянь, наперад. Якая любата!

І Таццянка ўбачыла цырк, дрэвы ў парку, музей Янкі Купалы, шэрую стужку вады — гэта рака Свіслач — і мост цераз яе.

Усё неяк паменшала, нібы ў кіно. Праз мост імчаліся маленькія, нібы цацачныя, аўтобусы, таксі, тралейбусы. Па вадзе плылі невялічкія лодкі.

Таня з дзедам падымаліся павольна ўсё вышэй і вышэй. Направа відзён помнік, што на плошчы Перамогі, а лявей — будынак тэлецэнтра, проста ж спераду — оперны тэатр.

Толькі што гэта: сонца было на самым яго даху, а цяпер стаяла над зубчастай сіняватай сцяной.

— Вунь там, бачыш, Таня, горад канчаецца. А тая сіняя сцяна ў зубчыкі — гэта лес за горадам. За той лес і садзіцца сонца,— тлумачыць дзед.

Тым часам Таццянка з дзедам паехалі ўніз. Дрэвы на зямлі большалі, бліжэлі... І было ўжо зусім не страшна.

А калі апусціліся да пляцоўкі, першы сышоў дзядуля і адразу падхапіў Таню пад пашкі.

Таня з дзедам пайшлі дарожкай уніз, бліжэй к дому.

— Дык, значыць, сонейка спіць за лесам? — раптам запытала ўнучка.

— Яно толькі хаваецца за лес, каб свяціць другім гарадам, што па той бок зямлі,— тлумачыў дзед.

Унучка глядзела на дзеда і нічога не разумела.

— А што, у зямлі два бакі?

— У зямлі шмат бакоў. Яна круглая, як мяч.

— Як мяч?

— Але.

— А чаму ж яна тут такая роўная? — І Таня прытупнула ножкай.

— Вось пойдзеш у школу, тады пра ўсё будзеш ведаць,— супакойваў дзед унучку.

— І дзе начуе сонца, буду ведаць?

— Будзеш, будзеш ведаць, што сонца ніколі не спіць. Няма яму калі спаць. Яно адно, а людзей і не палічыш колькі. І ўсім трэба свяціць, каб усе былі загарэлыя, здаровыя, вясёлыя.

1966

АЛЕСЬ ЯКІМОВІЧ

(1904—1979)

ПЕРШАЕ ЯЕЧКА

Хадзіў дзед на паляванне. Паляваў ад ранку да змяркання. Зморыцца, аж слова не прамовіць, а звярыны не зловіць. Ідзе дахаты, ледзьве не плача. Вось дык няўдача!

Баба дзеда лае, што дарма гуляе, топча лапці, рве аборы. Ну і гора!

Слухаць дзеду горка бабіну гаворку.

— Ты, баба, мяне не лай. Злаўлю табе звера: чакай!

Цэлы дзень дзед хадзіў, курку-рабку злавіў.

Рада баба, скача, а курка кудахча: «Куд-куды, куд-куды! Дайце грэчкі і вады!»

Бабка курку накарміла, вадою напаіла. Села курка на вечка ды знесла яечка.

Бегла мышка пад скрынку, цягнула скарынку, хвастом вільнула, яечка скранула.

Яечка скацілася — трах! — і разбілася...

Убачыла баба, загаласіла ды з жалю ўсе гаршкі пабіла. Паламала і вечка, што не дагледзела яечка. Сама сярод хаты села і — абамлела...

Тут дзед стрэльбу схапіў, порахам набіў. Кінуўся да мышкі, а мышка — на вышкі.

Дзед за ёю:

— Лжэш! Ад мяне не ўцячэш!

За парог зачапіўся — плясь! — і паваліўся.

Набіў дзед гузак з добры кулак. Ляжыць, уздыхае, мышку лае.

Ішлі бабы па ваду, пабачылі тую бяду, пачалі рукамі махаць, людзей на дапамогу склікаць.

Прыбеглі старыя, за старымі — малыя. Дзеда паднялі, бабу вадой адлілі. Крычаць, бядуюць, яечка шкадуюць. Ну, вядома, і дзеда з бабай шкада.

Вось дык бяда!

А пакуль там крычалі ды бедавалі, курка села ў падпечку ды знесла другое яечка. Круглае, белае, моцнае, спелае. Яшчэ лепшае за першае!

Рада баба, рад і дзед: будзе яечня на абед!

Баба патэльню ўзяла, яечню спякла. Паклікала гасцей — старых і дзяцей.

Усе елі колькі хацелі. З-за стала ўсталі, песні заспявалі. Узяліся ў бокі, пусціліся ў скокі.

Скакалі, скакалі ды годзе сказалі.

Вось вам і казка. Чытайце, калі ласка!

1957

СМЕЛЫ ВАСЬКА

Цёплы летні дзянёк. На небе ні хмурынкі. Цішыня. Нават лёгкі ветрык-сухавей дыхне сядытады ды зноў надоўга задрэмле ў бліжэйшым гаі.

На зялёнай лугавіне каля дачнага доміка пасвіцца чародка белых курэй бабкі Ганны. Яны спакойна шпацыруюць узад і ўперад, вышукваючы розных кузурак ды толькі ім адным вядомую смачную траву. Іх ніхто не пасвіць. Хіба што кот Васька. Ён круціцца тут, недалёка, каля гаю, вынюхваючы мышыныя норкі.

Бабка Ганна корпаецца на агародзе. Дзед яшчэ зранку сышоў рыбачыць.

Раптам, адкуль ні вазьміся, каменем звалiўся

на лугавіну чорны вялікі каршун. Схапіў белую чубатку, што першая трапіла ў кіпцюры, і рвануўся ўгору. Астатнія куры з трывожным крыкам шуганулі да доміка.

«Гвалт, ратуйце!» — лёгка разабрала бабка Ганна курыную мову.

«Ці не каршун на іх напаў?» — глянула яна ў неба.

Палічыла курэй: адной не хапае! Ды самай лепшай нясушкі. Яна ж сёння яшчэ не знеслася!

Не першы раз гэты каршун жывіцца тут, каля яе дачы. Нядаўна апошніх дзедавых галубоў са свету звёў.

І бабка Ганна кінулася шукаць курыцу.

Тым часам каршун разняў у паветры кіпцюры — курыца пляснулася вобземлю і разбілася. Каршун нырнуў за ёю, адцягнуў у зараснік і сабраўся ўжо баляваць, як бачыць — перад ім нібы з-пад зямлі вырас рыжы кот Васька...

Кот Васька, як і ўсе яго сваякі, вядома ж, палюе не толькі на мышэй. Любая птушка для яго таксама нядрэнны ласунак. Не цікавілі яго з птушынага царства як ласунак хіба адны бабчыны куры. Прывык ён да іх і лічыў іх за лепшых сваіх прыяцелек. Дружба ў іх была моцная і непарушная.

Ну, а каршун — справа іншая. І ў ката Ваські адразу ж загарэліся вочы і выскачылі з мяккіх лап вострыя кіпцюры.

Каршун падумаў, што кот збіраецца адабраць у яго здабычу. Ён пакінуў курыцу і схапіўся з катом. З гарачкі нават падняў яго над кустамі. Ды не ўтрымаў: кот быў цяжкі.

Бойка распачалася не на жыццё, а на смерць. Каршун усё сіліўся яшчэ раз падняць свайго ворага ў паветра і шпурнуць з вышыні, каб за-

біць. А кот Васька ўпарта дабіраўся да каршуновага гарляка.

Калі бабка Ганна прыбегла да месца адчайнай бойкі, Васька ўжо даў рады драпежніку: той ляжаў распластаўшыся і ледзь варушыў крыламі.

— Ну і малайчына ж ты, Васька! — пахваліла бабуля свайго рыжага ката.— Такі ты ў мяне смелы. Так яму, разбойніку, і трэба!

1974

МІКОЛА ЯНЧАНКА

(нарадзіўся ў 1931 г.)



ГАРЛАЧ МАЛАКА

У Ленкі ангіна. Прыходзіў урач. Паглядзеў у роцік. Параіў піць кіпячонае малако з мёдам.

І вось сядзіць татка з кубачкам таплёнкі з мёдам. Упрошвае Ленку выпіць.

— Не хачу! — хныкае дзяўчынка.— Там плеўкі плаваюць.

— Якія плеўкі? То ж пеначкі. Смачныя ружовыя пеначкі...

— Не хачу,— капрызіць Ленка.— І ты, калі быў маленькі, таксама не піў малака...

— Не піў,— неяк сумна прамовіў татка. Ён паставіў кубачак на стол і задумаўся. Ленка таксама прыціхла. Маўчанне зацягнулася. Дзяўчынцы стала сумна, і яна загаманіла зноў.

— Так і не піў ніколечкі?

— Не,— задумліва сказаў татка,— аднойчы напіўся ўволю. І сястрычку сваю напаіў...

У галодны пасляваенны год было гэта. Немцы не то што кароў, курэй апошніх забралі. І не толькі курэй... Прысядзібны ўчастак мы неяк засеялі, бульбу пасадзілі. А самім ні зярнятка, ні бульбіны не засталося. Увесь чэрвень на адным шчаўі сядзелі. Пазелянелі аж.

І ў гэты час суседка наша ад свайго бацькі карову прывяла. Цяпер яе дзеці малако пілі. А мы зайздросцілі. Бывала, у поўдзень прыдзе карова з пашы. Цётка Аксіння возьме даёнку і

пачынае даіць Лыску. А мы са свайго двара ў шчыліны паглядваем. Як белыя струменьчыкі ў даёнку са звонам льюцца. Аж пакуль ружовая шапка пены над ёй не ўзнімецца.

Падаіўшы карову, цётка Аксіння несла малако ў хату. Потым ішла ў стопку з вялікім гарлачом у руках. Паставіўшы гарлач, стопку замыкала...

Пры гэтым асабліва цяжка маёй двухгадовай сястрычцы даводзілася. І я, дармо што малы, а не мог пераносіць, як яна галоднымі вочкамі на гэта малако глядзела. Аж сэрца ў мяне ад жалю заходзілася. І адна думка-мара займала: як хоць разок напаіць малаком маленькую Надзьку. І я ўсё-ткі прыдумаў.

...Назаўтра я разам з сястрычкай крадком прабраўся ў адкрытую стопку суседкі. Асцярожна апусціў малую ў цёмны засек. І сам туды ўскочыў. Надзька дрыжэла ад страху.

— Пойдзем адсюй! Тут ноць, мыські,— плакала яна.

— Не бойся,— угаварваў я малую.— Ніякіх мышэй тут няма. А каб цёмна не было, вочкі закрый. Зрабі так, быццам спіш.

Надзька прыціснулася да мяне, супакоілася...

Марудна цягнуўся час. Але, нарэшце, пачуліся крокі. Цётка Аксіння паставіла гарлач. Потым закрыла дзверы і замкнула стопку.

— Ну, Надзька! — радасна зашаптаў я.— Ідзём малако піць!

Я высадзіў сястрычку з засека. Вылез сам. Вочы нашы прызвычаіліся да змроку, і я без цяжкасці адшукаў гарлач.

Першай піла Надзька. Яна стала на каленцы, нагнулася да гарлача і хлябтала з яго, бы маленькае кацяня.

— Цёп'енькае, сяёдзенькае,— шаптала яна, адрываючыся ад гарлача, і хлябтала зноў і зноў!

Потым піў я. Праўда, Надзька час ад часу спыняла мяне:

— Пакінь мне т'ёсецькі.

— Пакіну, пакіну,— супакойваў я малую.— Тут яго многа. Не пап'ём усё.

І мы сапраўды не папілі, хоць напіліся ўволю.

Цяпер трэба было дачакацца вечара. Вечарам цётка Аксіння заўсёды заходзіла ў стопку за халодным малаком. «Вось тут,— думаў я,— і трэба мне хуценька вышмыгнуць. Інакш цётка вушы надзярэ. А малую Надзьку яна не кране».

Я паклаў на зямлю два мяшкі. Лёг, прыгарнуўшы да сябе Надзьку. Яна хутка заснула. Непрыкметна заснуў і я.

Прачнуўся, пачуўшы прыглушаныя галасы маці і цёткі Аксінні. Прачнуўся, але ляжаў затаіўшы дыханне.

— Даруй, Аксіння,— плакала маці.— Гэта яны ад голаду на такое пайшлі.

— Кінь ты, Анеся,— супакойвала яе цётка Аксіння.— Ці ж я не разумею. Прыйшла, а яны згарнуліся клубочкам і спяць. Малако амаль усё выпілі. Хацела я разбудзіць іх, ды, думаю, спрасонку спалохаюцца яшчэ. Вось цябе і паклікала. Ты іх асцярожненька...

Маці пяшчотна, як умеюць толькі маці, дакранулася да майго пляча. Я ўстаў і апусціў галаву. Мне было сорамна перад цёткай Аксінняй. Маці ўзяла Надзьку на рукі, і мы пайшлі дадому.

Раніцою цётка Аксіння зноў прыйшла да нас. Яна прынесла міску жыта і баначку малака.

— Вось прапусці праз жорны, каб сечка атрымалася, ды крупеню малым вары. Малака я цяпер кожную раніцу прыносіць буду.

— Дзякую! Дзякую, суседачка! — узрадавалася маці.— Ніколі тваёй дабраты не забуду!

На гэтай крупені мы і дацягнулі да новага хлеба. Хоць была яна рэдкая і сівая. Бо маці з баначкі малака і жмені сечкі вялізны чыгун крупені варыла. Ды ўсё ж, у параўнанні з надакучыўшым шчаўем, была яна сапраўдным цудам...

— А дзе ж тваё малако?— спахапіўся татка.

— Я ўжо выпіла. Пакуль ты расказваў,— адказала Ленка.

— Ну і малайчына! — пахваліў ён Ленку.

1978

ЗМЕСТ

Ад самай калыскі... Максім Танк — 5

Янка Купала
Дзень добры, Масква!.. Хлопчык і лётчык. Алеся. Юрачка. Бай. *Вершы* — **9**
Якуб Колас
Ленінскім шляхам. *Верш.* Два Маразы. *Казка* —**16**
Францішак Багушэвіч
Калыханка. *Верш* —**19**
Цётка
Сірацінка. *Верш.* Журавель і чапля. *Казка* — **21**
Максім Багдановіч
Мушка-зелянушка і Камарык-насаты тварык. *Паэма* — **24**
Пятрусь Броўка
Мая Айчына. Родныя словы. Гарніст. А ты хоць дрэва пасадзіў?.. *Вершы* — **30**
Янка Брыль
Сняжок і Волечка. *Апавяданне* —**33**
Васіль Быкаў
Сваякі. *Апавяданне* —**42**
Кандрат Крапіва
З Новым годам. *Верш.* Жаба ў каляіне. Сава, Асёл ды Сонца. *Байкі* —**52**
Аркадзь Куляшоў
Камсамольскі білет. Слова невядомага салдата. Воблака. *Вершы* — **56**
Міхась Лынькоў
Васількі. *Апавяданне* — **60**
Іван Мележ
Здарэнне. *Апавяданне* — **69**
Пімен Панчанка
Я ўнука вяду ў Маўзалей. Салодкая лячэбніца. Дзеці над возерам. Заўсёды гатовы. *Вершы* — **79**
Максім Танк
Піянерскі гальштук. Іграй, гарніст. Ехаў казачнік Бай. *Вершы.* Галінка і верабей. Жук і слімак. *Казкі* — **85**
Іван Шамякін
Матрос з «Алега». *Апавяданне* — **91**
Эдзі Агняцвет
Зямля з блакітнымі вачамі. Піянерская гама. Алень. Алеся. *Вершы* — **105**
Андрэй Александровіч
Лясная байка. *Верш* — **110**
Іван Аношкін
Ленус-хранікалюс. *Апавяданне* — **112**
Лідзія Арабей
Зернетка і вецер. *Казка* — **115**
Анатоль Астрэйка
Мой брат камсамолец. Размова аб прафесіях. *Вершы* — **118**

Мікола Аўрамчык
Святлане. ***Вось яны, прывольныя прасторы... *Вершы* — **122**
Зінаіда Бандарына
Хачу чытаць. *З аповесці «Ой, рана на Івана»* — **125**
Рыгор Барадулін
Як быць? Жарт. Што было б тады б, калі б? Куды-кала-індыкала. Раскідач. На шашы і ля шашы. Пільная просьба. Басалапкі. Фарфор. Робяць гораду нутро. *Вершы* — **128**
Іларыён Барашка
Залатыя арэхі. *Казка* — **135**
Алесь Бачыла
Мне купілі самакат. Колькі кот набіў пасуды. Упарты Стась. *Вершы* — **139**
Данута Бічэль-Загнетава
Гускі. Наша вёска. Возера Свіцязь. Блытанка. *Вершы* — **143**
Канстанцыя Буйло
Люблю. Матроска. Градка. *Вершы* — **145**
Генадзь Бураўкін
Зай і яблынька. *Казка* — **149**
Ядвіга Бяганская
Мамін гальштук. *Апавяданне* — **157**
Змітрок Бядуля
Скарб. *Казка* — **162**
Антон Бялевіч
Веснаход. Храбры заяц. У лесе. *Вершы* — **168**
Змітро Бяспалы
Маленькая маці. *Апавяданне* — **171**
Мікола Ваданосаў
Хітруны. *Апавяданне* — **175**
Эдуард Валасевіч
Сама. Спех — курам на смех. *Байкі* — **179**
Алена Васілевіч
Мая гаспадарка. *Апавяданне* — **181**
Галіна Васілеўская
Усмешка. *Казка* — **185**
Васіль Вітка
Добры дзень. Дударык. Два браты і сонца. Капыльская горка. *Вершы* — **188**
Артур Вольскі
Пра кавалёў і каралёў. Караблікі. Чарнічка. *Вершы* — **194**
Віталь Вольскі
Чомга. *Апавяданне* — **198**
Анатоль Вялюгін
Песня зялёнага дуба. *Балада.* Снегіры. *Верш* — **204**
Вера Вярба
Я стану капітанам. Бабуліны казкі. *Вершы* — **209**
Мікола Гамолка
Шлях адкрыты. *Апавяданне* — **211**
Вісарыён Гарбук
Горад без папугайчыкаў. *Апавяданне* — **215**
Віктар Гардзей
Дапамог. Часнок. *Вершы* — **225**

Ніл Гілевіч
Снежны дзед. Сябры ў паходзе. Ракета-самакат. *Вершы* — **227**
Мікола Гіль
Мы бачым сонца. *Апавяданне* — **231**
Пятро Глебка
Канец лета. Наш сцяг. *Вершы* — **235**
Іван Грамовіч
Выпаў снег. *Апавяданне* — **238**
Сяргей Грахоўскі
Чапаеўцы. Хто вінаваты? Дзяцел. У лесе. *Вершы* — **241**
Анатоль Грачанікаў
Крыўда. Павучок. Ляніўцы. *Вершы* — **244**
Алесь Гурло
Нашы птушкі. *Верш* — **248**
Віктар Дайліда
Добрая фея. *Апавяданне* — **250**
Міхась Даніленка
Мама. *Апавяданне* — **253**
Авяр'ян Дзеружынскі
Размова ў космасе. Авечкі. *Вершы* —**255**
Генадзь Дзмітрыеў
Гадзіннік. *Верш* — **257**
Уладзімір Дубоўка
Першы заработак. *Паэма* — **258**
Аляксей Дудараў
Буслы. *Апавяданне* — **263**
Мар'ян Дукса
Піянерскі лагер «Зубраня». *Верш* — **265**
Алесь Жаўрук, Андрэй Ушакоў
Пра майго катка. *Верш* — **267**
Васіль Жуковіч
Першы снег. Сакавік. Не ўмею, паспею... *Вершы* — **271**
Янка Журба
Пастушок. Дзед Мароз. *Вершы* — **274**
Хведар Жычка
У мамы на руках. Хітрыя грыбочкі. Рэгуліроўшчык. *Вершы* — **276**
Язэп Зазека
Уладар пушчы. *Апавяданне* — **279**
Валянцін Зуб
Як Толік праславіўся. *Апавяданне* — **282**
Васіль Зуёнак
Быў гадзіннік... Лімон. Качан на п'едэстале. *Вершы* — **286**
Вольга Іпатава
Мастачка. Дрозд Міхед. Бразготкі. *Вершы* — **290**
Павел Кавалёў
Дзіва-птушачка. *Апавяданне* — **293**
Васіль Каваль
Новы чырвонаармеец. *З аповесці «Санька-сігналіст»* — **296**
Віктар Казько
Хлопчыкі і конь. *Апавяданне* — **300**

Міхась Калачынскі
Размова з жураўлём. Хачу падрасці. Змей на нітачцы. *Вершы* — **305**
Клаўдзія Каліна
Касманаўт. *Апавяданне* — **309**
Казімір Камейша
Ля карты Радзімы. Дзятлава кузня. *Вершы* — **312**
Аляксандр Капусцін
Мірны лётчык. *Апавяданне* — **314**
Уладзімір Караткевіч
Кацёл з каменьчыкамі. *Казка* — **317**
Яўген Каршукоў
Бомба ў жыце. *Апавяданне* — **324**
Уладзімір Карызна
Лісце прыляцела. Да бабулі. Чыстая градка. *Вершы* — **328**
Кастусь Кірэенка
Радзіма. Слова да хлопчыкаў. Размова з капітанамі. Вясёлка. *Вершы* — **331**
Анатоль Клышка
Адкажы, чаму загадкі маюць гэткія адгадкі. *Загадкі* — **336**
Генадзь Кляўко
Балада пра чырвоны гальштук. Ялінка. *Вершы* — **341**
Алена Кобец-Філімонава
Кропелька. Зязюльчыны слёзы. *Казкі* — **344**
Уладзімір Корбан
Аб прафесіях, якія зніклі. Аб прафесіях, якія знікнуць. Аб новых прафесіях. *Вершы* — **346**
Мікола Корзун
Яблынька. *З маленства народнага паэта Беларусі Янкі Купалы* — **349**
Валянціна Коўтун
Цвічок. *Верш* — **351**
Усевалад Краўчанка
Як Петрусёк вучыўся чытаць. *Апавяданне* — **352**
Яўген Крупенька
У магазіне зайка быў. Вясняна. *Вершы* — **356**
Аляксей Кулакоўскі
Стары млын. *Апавяданне* — **358**
Яўген Курто
На начлезе. *Апавяданне* — **362**
Уладзімір Ліпскі
Гасцінец. *Апавяданне* — **367**
Алег Лойка
Дзе начуе сонца. Як яйкі несла бабка да Майкі. Як дзед Аяяй збіраў грыбы. *Вершы* — **369**
Еўдакія Лось
Казка пра Ласку. *Казка* — **372**
Максім Лужанін
Вятрыска. *Паэма* — **379**
Валянцін Лукша
Крынічка. Тэлефон. Піянерскі збор. *Вершы* — **384**
Уладзімір Ляўданскі
Дзядулева тайна. *Апавяданне* — **388**

Пятрусь Макаль
Голас вечнага хлопчыка. Каля майго акна. Каляровыя алоўкі. *Вершы* — **395**
Мікола Маляўка
Атэлье «Прамень». *Казка* — **399**
Павел Марціновіч
Піла. Танцы. *Вершы* — **403**
Янка Маўр
Васька Жукаў. Шчасце. *Апавяданні* — **407**
Алесь Махнач
Юныя абаронцы. *Апавяданне* — **413**
Ніна Мацяш
На ўроку геаграфіі. Снегіры. *Вершы* — **416**
Міхась Машара
Калыханка начы. Ліпень. *Вершы* — **418**
Уладзімір Мехаў
Кніжка пра тату. *Апавяданне* — **420**
Павел Місько
Старамодны заяц. *Казка* — **422**
Сяргей Міхальчук
Мой сусед Юрка. *Апавяданне* — **428**
Іван Муравейка
Лясныя скарбы. Веснавое здарэнне. Пра Мышку і кніжку. *Вершы* — **433**
Уладзімір Мяжэвіч
Тэлеграфіст Леніна. *Апавяданне* — **435**
Іван Навуменка
Сустрэча з маршалам. *Апавяданне* — **440**
Уладзіслаў Нядзведскі
Сто братоў і сясцёр. *Верш* — **443**
Рыгор Няхай
Касачы-вусачы. Белая бярозка. *Вершы* — **444**
Алесь Пальчэўскі
Добрае слова. *Апавяданне* — **447**
Сяргей Панізнік
Вожык і Белы Гарошак. Кропка. *Вершы* — **449**
Міхась Парахневіч
Самая высокая гара. *Апавяданне* — **451**
Макар Паслядовіч
Сто чацвёрты квартал. *Апавяданне* — **454**
Уладзімір Паўлаў
Колькі гусей убачыў Яўсей? *Верш* — **467**
Піліп Пестрак
Аўдоцця і яе ўнучак. *Апавяданне* — **468**
Паўлюк Прануза
Вясёлка. Ручаёк. *Вершы* — **476**
Леанід Прокша
Крыўда. *Апавяданне* — **478**
Пятро Прыходзька
Сіненькія вочы. Я малюю... *Вершы* — **483**
Павел Пруднікаў
У парку. *Верш* — **485**
Аляксей Пысін
Карусель. Вясёлка над плёсам. Сланечнік. Пісьмо птушак. Імяніны. Чаравікі. *Вершы* — **486**

Язэп Пушча
Зашумі, зялёны! Зоська і Антосік. *Вершы* — **491**
Міхась Пянкрат
Колька. *Апавяданне* — **494**
Пятро Рунец
Ліпка. *Апавяданне* — **496**
Адам Русак
Арлянятам. Мой сябра. *Вершы* — **499**
Алесь Рыбак
Сёння прыедзе тата. *Апавяданне* — **501**
Алесь Рылько
Калі, каса, пакуль раса! *З аповесці «Мядовыя краскі»* — **504**
Алесь Савіцкі
Дарога ў школу. *Апавяданне* — **509**
Эдуард Самуйлёнак
Дачка эскадрона. *Апавяданне* — **512**
Барыс Сачанка
Хлеб. Сонца. *Апавяданні* — **521**
Іван Сіняўскі
Суседскія дзяўчынкі. *Апавяданне* — **527**
Міхась Скрыпка
«Цеплавоз». Шчупак. Карась. *Вершы* — **529**
Даір Слаўковіч
Сяргейка. *Апавяданне* — **531**
Марк Смагаровіч
Подых вясны. Жураўліная труба. *Вершы* — **535**
Алесь Ставер
Салаўі. Як зроблены цацкі? *Вершы* — **536**
Іван Стадольнік
Боты. *Верш* — **539**
Іван Сяркоў
Санька абязбройвае ворага. *З аповесці «Мы з Санькам у тыле ворага»* — **540**
Ніна Тарас
На паляне. *Верш* — **545**
Раман Тармола
Каго баяцца ў лесе? *Казка* — **547**
Павел Ткачоў
Наказ. *Апавяданне* — **552**
Нэля Тулупава
Дзіна-Смяюшка і козлік-брыкушка. *Казка* — **557**
Тарас Хадкевіч
Алікаў сшытак. *Апавяданне* — **560**
Мікола Хведаровіч
Дождж ык. Пралескі. *Вершы* — **570**
Васіль Хомчанка
Трубач. *Апавяданне* — **573**
Кастусь Цвірка
Зайчыкаў хлеб. Спрэчка звяроў. Ладкі-ладушкі. *Вершы* — **578**
Аркадзь Чарнышэвіч
Дзве Тані. *Апавяданне* — **582**
Леаніла Чарняўская
«Мой мілы таварыш...» *Апавяданне* — **585**

Мікола Чарняўскі
Душа ў палоску. Хамякі-зайздроснікі. *Вершы* — **590**
Міхась Чарот
Вясенняя раніца. Да моладзі. *Вершы* — **593**
Кузьма Чорны
Юзік і Ягорка. Матчына благаславенне. *Апавяданні* — **595**
Хведар Чэрня
Алёшкавы сябры. *Верш* — **603**
Уладзімір Шахавец
На зімнім возеры. *Апавяданне* — **605**
Алесь Шашкоў
Як Васька Блін стаў генералам. *Апавяданне* — **611**
Іван Шуцько
Кран. Разумныя козлікі. *Вершы* — **614**
Станіслаў Шушкевіч
Камар-Брынкун і Жаба-Квакуха. Дзяўчынка і бусел. Зайка-школьнік. *Вершы* — **616**
Георгій Шыловіч
Над сінім морам. *Апавяданне* — **620**
Віктар Шымук
Вішні. Канікулы. *Вершы* — **626**
Уладзімір Шыцік
Кіб загаварыў апоўначы. *Фантастычнае апавяданне* — **629**
Уладзімір Юрэвіч
Дзе начуе сонца. *Апавяданне* — **637**
Алесь Якімовіч
Першае яечка. *Казка*. Смелы Васька. *Быль* — **641**
Мікола Янчанка
Гарлач малака. *Апавяданне* — **645**



СБОРНИК

ВЕСНЯНКА

Стихи, рассказы, сказки

Для детей младшего школьного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Рэдактар *А. В. Вольскі*. Мастак *Г. Р. Малышаў*. Мастацкі рэдактар *М. Р. Казлоў*. Тэхнічныя рэдактары *Г. Ф. Дуброўская, Н. П. Дасаева*. Карэктар *Л. С. Зіза*.

ІБ № 104

Здадзена ў набор 06.05.82. Падп. да друку 17.11.82. Фармат $60\times90^{1}/_{16}$. Папера афс. № 2. Гарнітура часопісная. Афсетны друк. Ум. друк. арк 41+1 арк. укл. Ум. фарб.-адб. 86,75. Ул.-выд. арк. 25,10. Тыраж 35 000 экз. Зак. 2563. Цана 1 р. 30 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005. Мінск, Чырвоная, 23.

1 р. 30 к.

МІНСК, «ЮНАЦТВА» 1983



ВЯСНЯНКА